ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ХРОНІКІ ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ ВЫДАННЕ СТВАРАЕЦЦА ПАВОДЛЕ РАШЭННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ПАНЯЦЬ

МІЁРСКІ РАЁН

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ НАВУКА»
1998

УДК 947.6(476.5)
ББК 63.3(4Беи)
П 15

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Г. М. МАНЯК, В. І. МАРЦІНОВІЧ, Л. А. МАТЭЛЕНАК,
А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ, Л. І. ПЯТРОВА, Б. В. УЛЬЯНКА

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ
ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

К. А. БЛАЖЭВІЧ, М. М. БУДО, А. В. ВАСІЛЁНАК, В. І. ВЯЛЬ,
М. І. ДЗЕХЦЯРОНАК, В. А. ЕРМАЛЁНАК, І. В. ЗАРУДНІЦКІ, Ч. С. КАШКУР,
М. І. ЛАТЫШАЎ, В. П. МАКАРАНКА, Г. М. МАНЯК (старшыня камісіі),
Л. А. МАТЭЛЕНАК (намеснік старшыні камісіі), В. С. МЯДЗЮХА,
А. В. ПРАКОФ'ЕЎ, С. С. СКАВАРОДКА, В. І. СТАЦЭВІЧ, Т. А. ЦЫРКІНА,
М. М. ШЧАВЯЛЁЎ

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР ПА ВЫДАННІ
ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК ПАМЯЦІ
ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ДРУКУ:

Б. В. УЛЬЯНКА (кіраўнік цэнтра),
У. І. ЛЕМЯШОНАК (галоўны рэдактар),
М. З. БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст)
Р. А. ЧАРНАГЛАЗАВА (рэдактар)

Укладальнік Л. А. МАТЭЛЕНАК

Рэдактар
В. І. МАРЦІНОВІЧ

Мастак Э. Э. ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В. А. РАГАЛЕВІЧА

ISBN 985-08-0260-X

© Выдавецтва «Беларуская навука», 1998

Рэшткі дзісенскага Ніжняга замка ў сутоках Заходняй Дзвіны і Дзісны

14—15 тыс. гадоў назад на тэрыторыі сучаснага раёна з'явіліся першыя пасяленні людзей.

XI ст. Заснавана паселішча Дзісна ля ўпадзення р. Дзісна ў Дзвіну.

1301 г. Тэрыторыя сучаснай Дзісеншчыны ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага.

1461 г. Першае пісьмовае ўпамінанне Дзісны.

«Фартэцыя» Вята — старажытнае гарадзішча каля в. Пруднікі

1504 г. Дзісеншчына ўвайшла ў склад Полацкага ваяводства.

1514 г. Першае пісьмовае ўпамінанне «места» Мёры.

1563 г. Староста дзісенскі Баркулаб Іванавіч Корсак пабудаваў замак на востраве (Верхні замак, Капец), Дзісна перанесена на левы бераг ракі (Ніжні замак).

1566 г. Дзісна атрымала права бяспошліннага гандлю.

Вадаспад на р. Вята

1567 г. Кароль Жыгімонт Аўгуст даў Дзісне новыя льготы і герб «тры вежы з муру».

1569 г. Дзісна атрымала магдэбургскае права і новы герб «ладдзя».

1571 г. Кароль Жыгімонт Аўгуст даў магдэбургскае права «вольнаму гораду» Перабродцзе.

1633 г. Першае пісьмовае ўпамінанне пра царкву і манастыр у Дзісне, якія «по преданию» існавалі адпаведна з XIII і XV стст.

Царква Багародзіцы Адзігітрыеўскай у Дзісне

1644 г., 25 мая. Судзя земскі браслаўскі Севасціян Святаполк Мірскі заснаваў праваслаўны манастыр у Міёрах.

1654 г., 25 ліпеня. Дзісенцы здалі горад рускім войскам В. П. Шарамецева.

1654 г., верасень — 1655 г., сакавік. Аблога Дзісны войскамі Вялікага княства Літоўскага.

1661 г. Антырасійскае паўстанне ў Дзісне.

Сядзібны дом у Лявонпалі

1700 г. Вялікі пажар у Дзісне, які вынішчыў увесь горад.

1712 г. Эпідэмія чумы ў Дзісне.

1728 г. У Дзісне пабудаваны драўляныя Уваскрэсенская і Затрапезна-Уведзенская цэрквы.

1750 г. Пабудаваны Белы палац у Лявонпалі.

Успенскі касцёл у Міёрах

1775 г. Пабудавана драўляная Троіцкая царква ў Лявонпалі.

1793 г. У выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай Дзісеншчына ўвайшла ў склад Расійскай імперыі.

1796 г. Кацярына II надала Дзісне новы герб — «на зялёным полі залаты сноп ільну».

1798 г., 1 студзеня. Зацверджаны план развіцця Дзісны.

Паром у Дзісне

1831 г., 23 красавіка. Пачатак актыўных ваенных дзеянняў у Дзісенскім павеце пад час нацыянальна-вызваленчага паўстання ў Польшчы і Беларусі.

1865, 1872, 1882 гг. Вялікія пажары ў Дзісне.

1870, 1878 гг. Вялікія паводкі ў Дзісне.

1901 г. Хваляванне сялян у Дзісенскім павеце ў сувязі з межаваннем зямлі.

Удзельнікі клуба народных майстроў «Святліца»

1905 г. Пачатак правядзення вечарын беларускай нацыянальнай культуры ў Дзісне.

1917 г., 4—6 чэрвеня. Першы сялянскі з'езд Віленскай губерні ў Дзісне.

1917 г., лістапад. Утвораны валасны ваенна-рэвалюцыйны камітэт у Міёрах.

1919 г., ліпень. Дзісенскі павет акупіраваны палякамі.

Цэнтральная плошча ў Міёрах

1921 г., 18 сакавіка. Паводле Рыжскага мірнага дагавора Дзісенскі павет адышоў да Польшчы.

1926—1927 гг. Перыяд актыўнай дзейнасці на Дзісеншчыне гурткоў Беларускай сялянска-рабочай грамады.

1940 г., 15 студзеня. Утвораны Міёрскі раён у складзе Вілейскай вобласці.

1941 г., май. Выхад першага нумара міёрскай раённай газеты «Бальшавіцкая трыбуна».

Помнік на брацкай магіле воінаў і партызан у Міёрах

1941 г., 5 ліпеня. Раён акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

1942 г., ліпень — жнівень. Зараджэнне масавага партызанскага руху на Міёршчыне.

1944 г., студзень. Дзісенскі РК КП(б)Б пачаў выдаваць газету «Кліч партызана», пазней «Народны мсціўца».

1944 г., 4 ліпеня. Міёры вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Удзельнікі мастацкай самадзейнасці калгаса «Рассвет»

1944 г., 20 верасня. Дзісенскі і Міёрскі раёны ўключаны ў склад Полацкай вобласці.

1957 г. Міёры атрымалі статус гарадскога пасёлка.

1959 г. Ліквідаваны Дзісенскі раён.

1965 г. У Міёрах на паўвостраве насыпаны Курган Славы ў гонар 25-годдзя вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 50-годдзя БССР.



Мост праз р. Дзісна

1968 г. Утварэнне гідралагічнага заказніка «Ельня».

1972 г., 15 студзеня. Міёрам прысвоены статус горада.

1975 г. Адкрыццё ў Міёрах стэлы-помніка ў гонар воінаў і партызан, якія вызвалялі раён ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

1978 г. Завяршэнне электрыфікацыі населеных пунктаў раёна.

ДА ЧЫТАЧА

Кніга «Памяць. Міёрскі раён» працягвае серыю гісторыка-дакументальных Хронік Памяці, якая выдаецца ў Рэспубліцы Беларусь па рашэнні ўрада. Створана яна на аснове навуковых даследаванняў, дакументаў з дзяржаўных архіваў, шматлікіх публікацый у газетах, кнігах, успамінаў удзельнікаў і сведак падзей, якія адбываліся ў жыцці Міёрскага раёна.

Гісторыя Міёршчыны старажытная і вельмі багатая на падзеі і на людзей — працавітых, самаадданых і таленавітых. Продкі нашы, далёкія і блізкія, прайшлі праз усе выпрабаванні і выстаялі, перамаглі. Памяць пра іх захоўвае наша зямля. Здаецца, на ёй яшчэ не астылі сляды герояў «Слова пра паход Ігаравы», абаронцаў замкаў у Дзісне і Вяце, будаўнікоў Дрысенскага ўмацаванага лагера, хлебаробаў, кавалёў, ганчароў, цесляроў, бортнікаў, тысяч і тысяч безыменных, з ася-роддзя якіх летапісы і дакументы захавалі імёны і справы Баркулаба Корсака, Генрыха Дмахоўскага, Язэпа Драздовіча, Пятра Мятлы, Генадзя Цітовіча, Сяргея Панізніка, Пятра Кандрашова...

Асаблівая ўвага ў кнізе нададзена ўвекавечанню памяці тых, хто загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны, адлюстраванню подзвігу землякоў на фронце і ў тыле ворага, пры аднаўленні разбуранай гаспадаркі. На жаль, спіс ахвяр вайны і неабгрунтаваных палітычных рэпрэсій далёка не поўны, але пошукавая работа ў гэтым напрамку не спыняецца.

У пошуку, зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў да Хронікі прымалі ўдзел мясцовыя краязнаўцы, супрацоўнікі музеяў, архіваў, бібліятэк, работнікі органаў мясцовай улады, грамадскасць раёна.

Раённая камісія па падрыхтоўцы кнігі «Памяць. Міёрскі раён» і выдавецтва «Беларуская навука» вельмі ўдзячныя ўстановам, арганізацыям і прыватным асобам, якія дапамаглі ў пошуку, зборы і ўдакладненні матэрыялаў і выданні гісторыка-дакументальнай Хронікі «Памяць. Міёрскі раён».



Міёрскі раён размешчаны на паўночным захадзе Беларусі ў межах Полацкай нізіны. Утвораны 15.01.1940 г. Плошча 1787 км². Населеных пунктаў 497, у тым ліку два гарады — Міёры і Дзісна. Колькасць насельніцтва — 34 000 чалавек (на канец 1992 г.). 11 сельсаветаў: Даўгінаўскі, Дварнасельскі, Завуццеўскі, Мікалаёўскі, Новапагосцкі, Павяцкі, Перабродскі, Туркоўскі, Узмёнскі, Чэраскі, Язненскі. Граніцай раёна на паўночным усходзе з'яўляецца Заходняя Дзвіна, на паўночным захадзе — Браслаўская града. Сярэдняя вышыня над узроўнем мора 130—150 м, на градзе — да 210 м. Карысныя выкапні: цагельная гліна, пясок і гравій, торф. Вялікія запасы азёрных адкладанняў — сапрапеляў. У раёне шмат азёраў: Абстэрна (9,35 км², глыбіня да 12 м), Ельня, Набіста, Важа, Орцы, Міёрскае. Воз. Сумаўка — адно з самых глыбокіх у рэспубліцы (29 м). Рэкі — Заходняя Дзвіна з прытокамі Волта, Вята, Мёрыца і Дзісна (яе прытокі Авута і Яльнянка). На тэрыторыі раёна два гідралагічныя заказнікі — «Ельня» і «Балота-Мох».

Сярэдняя тэмпература студзеня — 7,3°, ліпеня +17,8°. Ападкаў 554 мм за год. Безмарозны перыяд з 12—13 мая да 27—30 верасня, вегетацыйны перыяд 186 дзён. Максімальнае сярэднегадавое прамярзанне глебы 50—55 см. Сельскагаспадарчыя ўгоддзі займаюць 80,5 тыс. га, лясы — 56150 га. Глебы пераважна дзярнова-падзолістыя і дзярнова-падзолістыя забалочаныя. Якасць ворных зямель 36 балаў, сельгасугоддзяў — 35 балаў. Асушана 33,7 тыс. га пераўвільготненых зямель. Раён спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, вырошчванні зерневых і кармавых культур, лёну і бульбы. На канец 1998 г. 23 калгасы і 3 саўгасы, 40 фермерскіх гаспадарак.

У Міёрах працуюць мясакамбінат, ільнозавод, хлебазавод, камбікормавы завод, малаказавод, камбінат бытавога абслугоўвання, аўтапарк № 15, некалькі кааператываў і малых прадпрыемстваў. Патрэбы сельскай гаспадаркі забяспечваюць аграпрамтэхніка, сельгасхімія, аграпрамэнерга, аграпрамзабеспячэнне. Будаўнічыя арганізацыі — перасоўная механізаваная калона № 55, дзяржаўнае будаўнічаэксплуатацыйнае прадпрыемства меліярацыйных і водагаспадарчых сістэм, дзяржаўнае рамонтна-будаўнічае прадпрыемства «Рамонтнік», дарожнае рамонтна-будаўнічае ўпраўленне № 203.

Па тэрыторыі раёна праходзіць чыгунка Варапаева — Друя, аўтамабільныя дарогі Браслаў — Полацк, Верхнядзвінск — Шаркоўшчына, Дзісна — Лужкі, Дзісна — Германавічы. 2 паромныя пераправы праз Дзвіну — у Дзісне і Слабадзе. Праз раён праходзіць нафтаправод «Дружба».

Выдаецца раённая газета «Сцяг працы».

БАГАЦЦЕ ЗЯМЛІ МІЁРСКАЙ

Куточак беларускага Паазер'я, частка Полацкай нізіны, ускраек Браслаўскага ўзвышша, край блакітных балот — усё гэта Міёршчына. Не так багатыя тут глебы, большасць лясоў — па ўскрайках балот, мноства пераўвільготненых угоддзяў, шмат хмызнякоў, палі, засмечаныя каменнем, — гэта таксама наш край. Тут суседнічаюць верхавыя балоты карлікавых дрэў і рэліктавых раслін з чырвоным чарнічным сасоннікам на пясчаных узвышшах, крутыя пагоркі з сугліністымі раўнінамі, вялікія палі з маленькімі лапікамі ворыва, ягаднікі суніц, буякоў і журавін з багатымі рыбай і ракамі азёрамі. Некранутыя запасы торфу і сапрапелю, выпрацаваныя кар'еры гравію і пяску, запасы гліны на цэглу і кераміку для многіх пакаленняў...

Тут суседнічаюць дагледжаныя палі і запаведныя мясціны, лесанасаджэнні і векавыя дубравы, адзначаныя людской працай паркі і багна, таболкі...

Такі наш край, любы і дарагі, багаты цудоўнымі мясцінамі для адпачынку і ўгоддзямі для працы, прарэзаны рэкамі і рачулкамі, балотамі і азёрамі, злучаны асфальтаванымі трасамі, прасёлачнымі дарогамі, памятнымі з дзяцінства сцяжынкамі.

Азёры

У раёне 96 вадаёмаў, у тым ліку 83 возеры і 12 сажалак. Самыя вялікія азёры Абстэрна (9,89 км^2), Ельня (5,42 км^2), Набіста (3,75 км^2). Яны ў ліку самых чыстых. Па тыпу катлавіны найбольшая колькасць іх рэшткавыя і лагчынныя, Абстэрна, Важа і Ідолта — падпрудныя, Ворань, Запалоссе, Кацілава і Красноўскае — тэрмакарставыя.

Каля палавіны азёраў моцна зарастаюць, дыстрофныя, з вадой, беднай кіслародам. Чацей за ўсё гэта балотныя азёры. Толькі ў заказніку «Ельня» знаходзіцца каля 30 дыстрофных, мелкаводных азёр, якія ўжо адміраюць і зарастаюць. Звычайныя балотныя азёры маюць жоўта-карычневую ваду з празрыстасцю да метра, але ў некаторых празрыстасць рэкордная — да 5 м, напрыклад у возеры Лапухі. Даволі вялікае Бярэжа нават у 150—200 м ад берага мае глыбіню 10 см, а маленькае Глыбокае возера — 17 м.

Возера Ельня аднесена да дыстрофных, але зарастае слаба. Пратока паміж Ельняй і Чорным глыбінёй да 7 м (мясцовая назва Ніштак), у той час як найбольшая глыбіня саміх вадаёмаў удвая меншая. Па канавах, выкапаных невядома калі і кім, што злучаюць на балоце некаторыя малыя азёры, вада цячэ даволі хутка, хоць гэтыя азёры па тапаграфічных даных прыкладна на адным узроўні.

Дарэчы, самая нізкая мінералізацыя вады ў азёрах менавіта на верхавых балотах. Так, азёры Ельня, Чорнае, Стрэчна ўтрымліваюць 23—25 міліграмаў мінеральных рэчываў у літры вады, Вісяты — 280 мг/л, Вялікае Язна — 275 мг/л.

БАГАЦЦЕ ЗЯМЛІ МІЁРСКАЙ

Пераважная большасць азёр мае глыбіню 4—6 м, пры гэтым самыя плыткія — у гідралагічным заказніку «Ельня» (найбольшая глыбіня 2—3,5 м), а самыя глыбокія — Сумаўка (29,6 м), Орцы (19,2 м), Вісяты (14,5 м), Чурылава (14,4 м). Плошча вадазбору вагаецца ад 1 км^2 у возеры Чурылава да 114 км^2 — у Абстэрна.

Кожнае трэцяе возера з'яўляецца рыбапрамысловым. Тут водзяцца судак, сазан, сом, лешч, шчупак, акунь, гусцяра, плотка, лінь, карась, краснапёрка, мянтуз, укляя, верхаводка, сняток, ёрш, у абстэрнаўскіх азёрах — вугор. Некаторыя неаднаразова папаўняліся малькамі каштоўных парод рыб, напрыклад судаком (Абстэрна, Набіста), сазанам (Міёрскае, Кацілаўскае), таўсталобікам (Важа), шчупаком, белым амурам.

Абстэрнаўская група азёр — 13 вадаёмаў агульнай плошчай 32 км^2 — размясцілася сярод маляўнічых пагоркаў Браслаўскай грады. Побач хваёвыя лясы, поймавыя лугі. Тут цудоўная зона адпачынку.

Возера Абстэрна

Возера Ельня

АЗЁРЫ

Возера Язна

Азёры ў многіх частках раёна пераважна круглыя або выцягнутыя ўздоўж старажытных лагчын сцёку ледавіковых вод (Орцы, Чэраскае, Міёрскае). Нярэдка сустракаюцца азёрныя астраўкі.

Некаторыя азёры маюць вялікія запасы сапрапелю — Асінаўка, Красноўскае, Шчоўна і інш. Гэта ілістыя адклады са значным утрыманнем арганічных рэчываў, выкарыстоўваюцца як угнаенне, дамешак у корм жывёле, для гразелячэння. На Міёршчыне зроблена спроба здабычы сапрапелю для ўгнаення на возеры Шчоўна, дзе таўшчыня адкладаў дасягае 8 м. Пераважная колькасць сапрапелю — грубадэтрытавая.

Найбольшыя штучныя вадаёмы створаны ля вёсак Дворнае Сяло, Новы Пагост, Сіцькова, Лявонпаль.

Азёры актыўна выкарыстоўваюцца ў гаспадарчых мэтах, для рыбнай лоўлі. У калгасах «Кастрычніцкая рэвалюцыя» і «Рассвет» створаны рыбалавецкія брыгады, здабычу рыбы вядуць калгас «Баявы партызан», саўгас «Міёрскі», каапнарыхтпрам, язненскія мелія-ратары. У 1967 г. на р. Хараброўка пабудавана плаціна, якая дазволіла падняць узровень вады ў азёрах Набіста і Абстэрна на 1 м.

У апошнія гады ахове вадаёмаў надаецца значная ўвага. З водаахоўных зон выносяцца вытворчыя аб'екты, у першую чаргу жывёлагадоўчыя фермы, склады гаруча-змазачных матэрыялаў і ядахімікатаў.

Рэкі

16 рэк і 39 ручаёў працякае па тэрыторыі раёна. Буйнейшыя з іх — Заходняя Дзвіна і яе прыток Дзісна (памясцоваму Дзісёнка), які мае сярэднегадавы расход вады ў вусці 52,4 м^3 у секунду. Замярзае ў першай палове снежня, крыгалом у першай дэкадзе красавіка.

Працягласць астатніх рэк ад 14 (Улінец) да 47 км (Авута). Нахіл вадасцёкаў вагаецца ад 0,12 (Зах. Дзвіна) — 0,2 % (Дзісна) да 2,5 (Кулажка) — 2,8 % (Улінец). Сярэднегадавы расход вады ў мясцовых рачулках невялікі — 2,9 м^3 у секунду ў вусці Авуты, 2,8 — Вяты. На абедзвюх некалі стаялі млыны, а на Вяце нават працавала кардонная фабрыка, да якой сплаўлялі драўніну, затым невялікая гідраэлектрастанцыя, якая абслугоўвала райцэнтр. Да гэтага часу захаваліся рэшткі гідратэхнічных збудаванняў і вадаспад на плаціне.

Самы вялікі вадазбор у Авуты — 461 км^2, самы малы ў Вянужкі і Улінец — па 73 км^2. Лясістасць вагаецца ад 13 % (Яльнянка) да 28 % (Улінец). Азёрнасць увогуле невялікая — 1—3 %. Выключэннем з'яўляецца толькі Вята, у якой азёрнасць 8 %, яна збірае водную даніну з 36 азёр агульнай плошчай 32 км^2.

Пераважная большасць невялікіх рачулак асноўную частку гадавога сцёку забяспечвае разводдзем: 50 % — Вята, 66 % — Авута. Усе яны выкарыстоўваюцца ў якасці водапрыёмнікаў меліярацыйных сістэм. У вярхоўях цякуць па плоскай забалочанай раўніне, слабазвілістыя, у ніжнім цячэнні маюць стромкія схілы, пакрытыя хмызняком. Амаль усе рачулкі ў верхнім цячэнні, а некаторыя нават у сярэднім каналізаваны. На некаторых зроблены штучныя вадасховішчы (Яльнянка).

Усе рэкі маюць 50-метровыя ахоўныя зоны, з іх выдаляюцца або абвалоўваюцца вытворчыя аб'екты, ва ўсё большых аб'ёмах праводзіцца перазалужэнне.



Вадаспад на р. Вята

Крыніц засталося няшмат. Найбольш вядомая — Святая вада ў саўгасе «Юбілейны». На ёй пабудавана капліца, праводзяцца штогадовыя фэсты, што збіраюць сотні, тысячы людзей. Добраўпарадкоўваюцца крыніцы ў калгасе «Ленінскі шлях», Святая вада ля Лінкаўшчыны, у якой, дарэчы, знаходзілі старажытныя манеты.

Балоты

32 556 га тэрыторыі раёна займаюць 22 балоты, 216 га — торфараспрацоўкі. Багна-Мох — верхавое балота плошчай 20 тыс. га з пакладам торфу 93,3 млн т і глыбінёй залягання да 8,3 м — аб'яўлена гідралагічным заказнікам «Ельня». Тут адшуканы гідролізная сыравіна, сапрапель, адно з самых вялікіх у Беларусі радовішчаў торфу, захаваліся рэшткі пасляледніковай лесатундры (адзіныя на такой шырыні ў Еўропе) з карлікавай бярозай і марошкай.

У склад Ельнянскай базы гідролізнай сыравіны ўваходзіць верхавое балота Стрэчна, якое заканчваецца ў Шаркоўшчынскім раёне. Абодва масівы знаходзяцца ў натуральным стане.

Яшчэ адзін гідралагічны заказнік — «Балота Мох» — утвораны ў 1981 г. Яго плошча 4,84 тыс. га, паклад торфу 22,2 млн т. Тут пераважаюць хваёва-кусцікава-сфагнавыя, кусцікава-сфагнавыя згуртаванні з дамешкамі бярозы, елкі, асіны. Тут таксама ёсць пладано-сячая марошка, якой больш нідзе ў рэспубліцы няма.

Гэтыя гідралагічныя заказнікі сілкуюць большасць мясцовых рэк і рачулак, даюць штогод сотні тон журавін (агульны збор невядомы, закуп да 450 т у год), чарніц, брусніц, буякоў, з'яўляюцца прытулкам мноства рэдкіх і знікаючых раслін і жывёл, у тым ліку чорнага бусла, змеяеда, гогаля, гагары.

Наогул у раёне пераважаюць верхавыя балоты. Чыстым нізінным з'яўляецца толькі балота Буянава ў вадазборы р. Вята плошчай 1,6 тыс. га з залеганнем торфу пластом да 6 м. Значная яго частка выпрацавана.

Найбольш вялікія запасы торфу ўтрымліваюць балоты Астроўскае (1,5 млн т), часткова асушанае, Кіслоўскае 2-е (3,3 млн т), у значнай ступені выпрацаванае, Крукоўшчына (1,5 млн т). Выпрацаваны таксама балоты Жады, Асавыя і інш. Прычым на паліва торф здабываўся да 60-х гадоў, а пазней толькі на ўгнаенне (часткова спачатку на подсціл жывёле).

Карысныя выкапні

Асноўнае выкапнёвае багацце раёна — торф. Вядомы 22 радовішчы з агульнымі запасамі 148,4 млн т, найбольшыя сярод іх — Ельня, Мох, Стрэчна, Буянава, Кіслоўскае 2-е. Актыўнае ўжыванне торфу на ўгнаенне ў апошнія гады прыпынілася.

4 радовішчы глін і суглінкаў — Карашкевічы, Малаглінаўскае, Галомысленскае, Баграмянаўскае — маюць запасы 1,7 тыс. м^3. Эксплуатуюцца толькі два апошнія. Баграмянаўскае ўтрымлівае 207 тыс. м^3 стужкавых цёмна-чырвоных, бурых, слабапластычных глін магутнасцю 4,7 м, цёмна-рыжыя суглінкі магутнасцю 1,5 м. Яны выкарыстоўваюцца для вырабу цэглы.

510 тыс. м^3 чырвона-бурых, карычневых, пластычных і высокапластычных глін таўшчынёй да 3 м разведаны ля в. Малая Глінаўка. Яны прыдатныя для вырабу цэглы.

Звесткі пра пясчана-жвіровы матэрыял хутка старэюць. Зусім нядаўна паведамлялася пра 4 буйныя радовішчы з запасамі 1,7 тыс. м^3. Падгайскае выпрацавана поўнасцю, Гір'яцкае — у значнай ступені. Эксплуатуюцца драбнейшыя, вядзецца пошук новых. Запасы Падзвінскага радовішча пяскоў 15 млн м^3, прыдатныя для будаўнічых работ, магутнасцю да 6,4 м. Пяскі светла-шэрыя, шэравата-жоўтыя, розназярністыя, палевашпатава-кварцавыя, месцамі жвірыстыя.

Азёры ўтрымліваюць значныя запасы сапрапелю. Толькі ў Красноўскім возеры іх 3,5 млн м^3. Таўшчыня адкладаў да 8,5 м. Змяшчаюць 3,6 % азоту, 2,1 % вокіслаў кальцыю, 0,6 % калію і 0,2 % фосфару. Прыдатныя для ўгнаення, буравых работ, вытворчасці будаўнічых матэрыялаў.

Геафізікі знайшлі ў цэнтры раёна слаба выяўленую анамалію — магнітнае адлюстраванне горнага хрыбта, што існаваў тут мільярды гадоў таму назад, паступова разбурыўся і цяпер «закапаны» на паўкіламетровай глыбіні. Так што геалагічныя адкрыцці ў нас яшчэ магчымыя.

Глеба

Сельгасугоддзі ў раёне займаюць больш 85 тыс. га, ворыва — 63,6 тыс. га. Міёршчына ўваходзіць у Браслаўска-Міёрскі аграглебавы падраён і Шаркоўшчынска-Верхнядзвінскі аграглебавы раён. У сельгасугоддзях дзярнова-падзолістыя забалочаныя глебы займаюць 49,9 %, дзярнова-падзолістыя — 34, дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя — 9,2, тарфяна-балотныя — 5,3, поймавыя (алювіяльныя) — 1,5 %. Па механічным складзе сугліністыя глебы займаюць 75,3 %, супясчаныя — 17,5, тарфяныя — 5,3, пясчаныя — 1,9 %. 11,8 % ворных зямель завалунена.

Пад сельгасугоддзямі 47,9 % тэрыторыі (34,4 % ворных зямель, 12 % сенажацяў і пашаў). Асноўныя землекарыстальнікі — 23 калгасы, 3 саўгасы і 11 сельскіх Саветаў. Кіслых ворных глеб 25—49 %, слаба забяспечаных фосфарам і каліем — да 50 %.

На паўночным захадзе на тэрыторыі раёна знаходзяцца ўзвышшы Браслаўскай грады. Тут асноўны тып рэльефу — узгорыста-марэнны азёрны, значна расчлянёны, спалучае падоўжаныя ўзгоркі і невялікія грады з западзінамі. Найвышэйшы пункт — 211 м. Глебы дзярнова-падзолістыя на марэнных суглінках, у паніжэннях тарфяна-балотныя. Пад лесам і хмызнякамі 20 % тэрыторыі, пад ворнымі глебамі — да 60 %.

Значная частка раёна занята Дзісенскай нізінай — плоскаўвагнутая, прарэзаная далінамі рэк, прасторы паміж якімі аднастайныя і роўныя, з адноснымі вышынямі ў 3—5 м. Пераважаюць дзярнова-падзолістыя слабаглеяватыя і глеяватыя гліністыя і цяжкасугліністыя глебы.

Лясы

Пад лясамі знаходзіцца 20 % тэрыторыі раёна, размеркаваных раўнамерна. Найбольшыя масівы ў межах гідралагічных заказнікаў, па забалочаных участках, гэта значыць у цяжкадаступных мясцінах. Хваёвыя лясы складаюць 28,7 %, яловыя — 22,1, бярозавыя — 19,4, чорнаалешнікавыя — 13,1, асінавыя — 8,8, шэраалешнікавыя — 6,4, дубовыя — 0,8, ясянёвыя — 0,7 %. 12,6 % лясоў штучныя, пераважна хваёвыя.

Больш даступная Старая пушча плошчай каля 900 га на паўночны ўсход ад в. Даўгінава паміж Зах. Дзвіной і Волтай. На паніжанай раўніне з пагоркамі пераважаюць яловыя лясы кіслічнага тыпу, бярэзнікаў і асіннікаў няшмат, на ўскрайках шэраалешнікавыя зараслі. Трапляецца дуб звычайны. У падлеску ляшчына, бружмень лясны, брызгліна барадаўчатая.

Чырвоны бор — лясны масіў у 350 га ля в. Лявонпаль на супясчаных і лёгкіх сугліністых пагорках, якія вузкай паласой цягнуцца ўздоўж Заходняй Дзвіны. Пераважаюць хвойнікі імшыстага тыпу, сярод якіх 150—250-гадовыя хвоі з чырвона-бронзавымі ствалами. Імшыстыя і кіслічныя ельнікі складаюць толькі 14,3 %, арлякова-кіслічныя бярэзнікі — 8,5 %.

Значны лясны масіў ля в. Марынкі.

Унікальная з'ява — Чыстая (Язненская) дуброва плошчай 22 га. Сярэдні ўзрост дубоў каля 150 гадоў, асобным дрэвам па 200—250 гадоў.

У лясах водзяцца лось, дзік, воўк, янотападобны сабака, заяц-бяляк і заяц-русак, куніца, вавёрка, норка, выдра, андатра, бабёр, цецярук, рабчык. З жывёл, якія ахоўваюцца законам, трапляюцца скапа, белая курапатка, дзербнік, залацісты сявец, вялікі кулон, сярэдні

Чыстая (Язненская) дуброва

кулон, звычайны гогаль, шэры саракуш, з раслін — бяроза карлікавая, марошка, пералеска высакародная, сон шыракалісты, мядзведжая цыбуля, шпажнік чарапіцавы.

Па выніках зімовага маршрутнага ўліку 1997 г. у раёне на 1000 га лясной плошчы налічвалася ласёў — 2,5, дзікоў — 4,9, казуль — 7,5. У абсалютных лічбах гэта 91 лось, 187 дзікоў, 264 казулі, 418 лісіц, 351 заяц-бяляк, 899 зайцаў-русакоў, 207 баброў, 37 барсукоў, 457 вавёрак, 39 гарнастаяў, 362 цецярукі, 190 курапатак, 295 рабчыкаў.

У сувязі з тым што колькасць дзікіх жывёл у лясах далёкая ад аптымальнай, у раёне на працягу некалькіх гадоў забаронена паляванне на дзікіх капытных, устаноўлены забароненыя для палявання зоны на ўсіх дзікіх жывёл агульнай плошчай 6626 га.

Лесааднаўленнем, доглядам і эксплуатацыяй лясоў не толькі ў Міёрскім, але Шаркоўшчынскім і Глыбоцкім раёнах займаецца Дзісенскі лясгас, утвораны ў 1940 г. З 1966 г. дзейнічае на 25,6 тыс. га паляўнічых угоддзяў Новапагосцкая лесапаляўнічая гаспадарка, такія ж гаспадаркі ўтвораны ў Міёрах і Дзісне.

Стары гарадскі парк у Дзісне

Паркі

На тэрыторыі Міёрскага раёна існуе некалькі паркаў, якія былі закладзены яшчэ тады, як на Беларусі пачала развівацца сядзібна-паркавая архітэктура. Найлепш захаваўся рэгулярны парк у в. Камянполле. Ён займае роўную, злёгку паніжаную тэрыторыю. Ліпавыя алеі ўтвараюць баскеты і акружаюць парк па перыметры. У дрэвастоі пераважаюць мясцовыя пароды дрэў. Зберагліся элементы кампазіцыі, каналы, краявідная горка.

Парк закладзены ў першай палове XIX ст. і мае перспектывы для аднаўлення. Займае плошчу каля 5 га.

Парк у в. Лявонпаль закладзены ў другой палове XVIII ст. на плошчы каля 3 га. Рэгулярна-пейзажавага тыпу з сіметрычна-восевай планіроўкай, элементамі тэрасавання спуску да Заходняй Дзвіны. У дрэвастоі пераважаюць мясцовыя віды, растуць экзоты псеўдатсуга Мензіса, рабіннік рабіналісты, бэз звычайны, спірэі. Парк збярогся часткова, перспектыўны для аднаўлення.

Элементы ландшафтнага парку захаваліся ля сядзібы ў в. Дзедзіна.

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

«Беларусь — край магіл, курганоў, гарадзішчаў, замкавішчаў, замкаў, край, дзе на кожным кроку мы сустракаем сляды мінулага ў помніках, легендах, песнях», — так пісаў у XIX ст. вядомы краязнаўца А. Кіркор. Наша Міёршчына таксама не з'яўляецца выключэннем.

Першыя пасяленцы ў тутэйшых мясцінах з'явіліся ў эпоху мезаліту, больш як дзесяць тысяч гадоў назад, калі ледавік адступіў адсюль на поўнач. Паселішчаў палеаліту на тэрыторыі Міёршчыны не выяўлена. Праўда, у кар'еры непадалёку ад в. Станулева мясцовыя жыхары знаходзілі косці мамантаў.

Дзякуючы археалагічным разведкам нам вядома аб існаванні старажытных паселішчаў ля вёсак Пераброддзе, Лінкаўшчына, Краснае, Стары Пагост, Мазурына, Малая Кавалеўшчына.

Мезаліт на тэрыторыі Беларусі працягваўся з 9-га да 5-га тысячагоддзя да н. э. Людзі вялі тады вандроўны лад жыцця. Асноўны іх занятак — паляванне, рыбалоўства, збіральніцтва. Таму знаходзяць на паселішчах эпохі мезаліту скрэблы, наканечнікі стрэлаў, разцы, гарпуны. Амаль усе яны зроблены з крэменю. З-за недахопу мясцовай сыравіны большасць вырабаў невялікіх памераў — мікраліты. Выключэннем з'яўляецца сякера з крэменю, знойдзеная ля в. Вялікая Глінаўка. У той час насельніцтва яшчэ не мела сталых паселішчаў, таму не выяўлена значнага культурнага пласта гэтай эпохі. Асноўнымі прыладамі працы ў мезаліце былі лук і стрэлы, нажы, якія часта рабіліся з некалькіх пласцін, укладзеных у аправу з дрэва або косці. Пласціны ад такога нажа знойдзены ля вёсак Лінкаўшчына і Навалака.

Рассяленне плямён ішло па рэках Дзісна, Авута, Вята, а таксама па берагах перабродскіх азёраў.

Больш людным сталі паселішчы старажытнага чалавека ў эпоху новага каменя — неаліту (пачатак 5-га — 4-е тысячагоддзе да н. э.). Развіваліся прадукцыйныя сілы. У неаліце чалавек навучыўся ляпіць гліняны посуд, асвоіў новыя спосабы апрацоўкі каменя: шліфаванне, свідраванне, пілаванне. Для вытворчасці прылад працы выкарыстоўваюцца ўжо не толькі крэмень, але і граніты, пясчанікі, шпаты. Шліфаваныя і свідраваныя неалітычныя сякеры знойдзены ля вёсак Чэрасы, Узмёны, Мурашкі, Язна, Снегі і інш. Больш разнастайнымі сталі і самі прылады працы, большасць з іх прадугледжвала двайное або трайное прызначэнне. Пашыралася выкарыстанне прылад працы з дрэва, косці, рога. Тутэйшыя жыхары па-ранейшаму займаліся паляваннем і рыбалоўствам, але ў канцы эпохі неаліту асвойваюць земляробства і жывёлагадоўлю. Знаходкі ў Міёрах каменных сякер і нажа, крэмневага ўкладыша да

Гарадзішча ля в. Пруднікі

сярпа пераканаўча сведчаць аб існаванні на месцы сучаснага райцэнтра селішча старажытнага чалавека гэтага перыяду, найбольш верагодна, пры вытоку з воз. Мерыцы.

Плямёны, якія насялялі ў той час наш край і ўсё Падзвінне, вучоныя адносяць да нарвенскай і паўночнабеларускай археалагічнай культуры. Яны ўжо будавалі наземнае жыллё: каркас з жэрдак абцягваўся скурамі жывёл. Шырока ўжываўся гліняны посуд, упрыгожаны наколкамі, пасачкамі, ямкамі, адбіткамі грэбеня. Гэтыя ўпрыгожанні, па меркаваннях старажытных людзей, мелі магічнае значэнне: яны не павінны былі дапусціць у посуд злых духаў.

У пачатку 2-га тысячагоддзя да н. э. пачынаюць ужывацца ўпрыгожанні, зброя і прылады працы з бронзы, якую прывозілі з Каўказа. Але іх было мала, і знаходкі рэдкія: сякера з раскопак ля в. Язна, упрыгожанні ля в. Пруднікі. Затое вырабы з каменя становяцца яшчэ больш разнастайнымі і дасканалымі. Найбольшую цікавасць уяўляе цясло для апрацоўкі драўніны, знойдзенае ля в. Павяцце, крэмневае цясло з в. Гарані.

У пачатку бронзавага веку (канец 3-га — пачатак 2-га тысячагоддзя да н. э.) у нашай мясцовасці з'яўляюцца паселішчы плямён культуры шнуравой керамікі. А ў VII—VI стст. да н. э. тутэйшыя жыхары навучыліся здабываць жалеза і выраблять з яго зброю, прылады працы і ўпрыгожанні. Для гэтага выкарыстоўвалася балотная руда, якая была вельмі распаўсюджана. Праўда, людзі тады яшчэ не ўмелі плавіць метал, таму яго «варылі» ў прымітыўных домніцах. Кавалкі руды абпальвалі, а атрыманую порыстую масу — крыцу — кавалі. Не



План гарадзішча ля в. Пруднікі

дзвінскай культуры Паддубнікі ў 1956 г. выявіў і пачаў археалагічныя раскопкі А. Р. Мітрафанаў. Узнікла яно ў VIII ст. да н. э. на высокім пагорку левага берага р. Авуты. Высокі мыс быў абнесены чатырма равамі і пяццю валамі вышынёй да 36,5 м. Такая складаная сістэма ўмацаванняў створана ўжо на апошнім этапе існавання гарадзішча. На ім пры раскопках выяўлены рэшткі жылля і кавалкі ляпнога посуду, жалезныя наканечнікі стрэл, дзідаў, нажы, вырабы з касцей і мноства касцей свіней, быкоў, коней, ласёў, мядзведзяў, казуль, баброў, куніц, вавёрак. Гэта гаворыць аб тым, што паляванне з'яўлялася галоўным заняткам насельніцтва. У верхнім гарадзішчы знойдзе-

выпадкова, відаць, у раёне захаваліся назвы Рудня, Рудакі, Крычава, Жалезны ручай, Домніца і інш.

З'яўленне жалеза дало вялікі штуршок развіццю прадукцыйных сіл і паяўленню маёмаснай няроўнасці. Пачасціліся сутычкі паміж плямёнамі, людзі пачалі сяліцца ў цяжкадаступных мясцінах на стромкіх пагорках, на выспах сярод азёраў і балот, на абрывістых берагах рэк. Паселішчы дадаткова ўмацоўваліся валамі, парканамі, акружаліся глыбокімі равамі.

На тэрыторыі Міёршчыны жылі балцкія плямёны. Іх культура атрымала назву днепра-дзвінскай. Яна выяўлена ў гарадзішчах ля вёсак Паддубнікі, Язна, Шарагі, Субачава, Сабалеўшчына, Панізова, Гвардзейскія, Пруднікі, Востраў. У апошні час члены гуртка «Арганаўты мінулага» з Міёраў знайшлі падобныя гарадзішчы ля вёсак Гарані, Вусаўцы, Федарцы.

Найбольш ранняе гарадзішча днепра-

Раскопкі гарадзішча ля в. Пруднікі



Знаходкі з могільніка ля в. Лясная

ны жалезныя сякеры, сярпы, шылы. Знаходкі каменных зерняцёрак сведчаць, што ў III—II стст. да н. э. тут займаліся земляробствам і выплаўкай жалеза.

Класічным гарадзішчам днепра-дзвінскай культуры можна назваць Язненскае, размешчанае на беразе воз. Малое Язна. Яго працягласць ледзь не кіламетр. Людзі пасяліліся тут у сярэдзіне III ст. да н. э. Спачатку паселішча было ўмацавана толькі адным валам і абарончай сцяной на поўдні, пазней з'явілася яшчэ некалькі валоў. Выяўлена ляпная гладкасценная кераміка, сустракаецца таксама арнаментаваная ямкамі і хвалістымі лініямі. Людзі тут жылі абшчынамі, кожны дом дзяліўся на некалькі жылых пакояў. Толькі вырабаў з касцей знойдзена менш, чым у Паддубніках, а жалезных — больш: маленькія сярпы са слаба выгнутай сярэдзінай, шпількі з завітком, наканечнікі дзідаў, стрэл і шылы. Усе яны мясцовай вытворчасці, аб чым сведчаць рэшткі пячэй-домніц і кавалкі шлаку. Знойдзены нават асколкі тыгля для плаўкі бронзы.

На тэрыторыі сучаснага раёна існавалі яшчэ паселішчы штрыхаванай і так званай паліванай керамікі. Асаблівасць яе ў тым, што зроблены посуд перад абпальваннем палівалі вадкай глінай. Найбольш характэрнае гарадзішча і селішча гэтай культуры выяўлена ля в. Пруднікі. Размешчана яно на беразе р. Вята, стромкія схілы ўзнімаюцца на 10 м, з поўдня ўмацавана земляным валам шырынёй да 20 м і вышынёй 4,2 м. Культурны пласт дасягае 3,2 м. Даследаванні гарадзішча і селішча праводзілі А. Р. Мітрафанаў (1974, 1978, 1980) і В. І. Шадыра (1977, 1981—

1991). Раскопкі паказалі, што жыццё працягвалася тут ад II да XVII ст. н. э. Культурны пласт падзяляецца на два храналагічныя гарызонты: II—X і XI—XVII стст. У раннім, ніжнім, гарызонце знойдзены рэчы, тыповыя для латышскіх гарадзішчаў паліванай керамікі. Шмат рэчаў з косці, шылы, праколкі, гліняныя і каменныя прасліцы, вырабы з бронзы, жалеза, каменныя сякеры. Знаходка зерняцёркі сведчыць аб існаванні земляробства, а шматлікія косткі дамашняй і дзікай жывёлы — паляўніцтва і жывёлагадоўлі. Жыллё мела зрубную канструкцыю. Унутры знаходзіліся печы-каменкі.

Матэрыяльная культура селішча нічым істотным не адрозніваецца ад ніж-



Знаходкі з могільніка ля в. Кублішчына

ніх слаёў гарадзішча. Знойдзены каменныя ліцейныя формачкі, упрыгожанні — трапецападобныя падвескі, пацеркі з белага, жоўтага, блакітнага шкла.

У верхніх слаях гарадзішча знойдзены рэчы, якія сведчаць аб з'яўленні тут славян — крывічоў. Памянялася матэрыяльная культура. Знойдзены жалезныя наканечнікі стрэл, у тым ліку і для арбалетаў, нажы, цвікі, сярпы, шылы, пярсцёнкі, пранізкі, бранзалеты, пацеркі з бронзы. Значную цікавасць уяўляюць ліцейныя формачкі, якія пацвярджаюць, што бронзавыя ўпрыгожанні і іншыя рэчы выраблялiся непасрэдна на месцы. Знаходкі арабскіх манет сведчаць аб гандлёвых сувязях з Усходам. Шмат аб чым гавораць бронзавая выява жывёлы, кафля з арнаментам, рымская манета. Археалагічныя знаходкі даюць падставу сцвярджаць, што тут існаваў замак-крэпасць Полацкага княства. Пранікненне крывічоў сюды пачалося ў VII—VIII стст.

Умацаванне крывічоў XI ст. было ў Дзісне. Адно з найбольш ранніх паселішчаў славян знойдзена ля в. Кухцінцы Завуццеўскага сельсавета. Але самымі значнымі археалагічнымі помнікамі гэтых плямён з'яўляюцца курганныя могільнікі, якія выяўлены ля вёсак Кублішчына, Лясная, Чамяры, Чурылава, Вята, Паддубнікі, Лявонпаль, Снегі.

Найбольш вывучаны даследчыкамі курганныя групы ля в. Кублішчына. Захаваліся 62 насыпы, астатнія паглынуў кар'ер. Іх дыяметр ад 3 да 10 м, вышыня 0,4—1,2 м. Самы вялікі курган меў дыяметр больш 17 м і вышыню 1,5 м. Авальныя насыпы выцягнуты з захаду на ўсход на 7—8 м, іх шырыня 5—6 м.

Кандыдат гістарычных навук Л. У. Дучыц раскапала ў 1977—1978 і 1986 гг. 21 курган. Выяўлены тры тыпы рытуалаў: 3 трупаспаленні, 13 трупапалажэнняў і 5 без пахаванняў. Аднак ва ўсіх насыпах ёсць попельна-вугальная праслойка на мацерыку або ў паглыбленні ў 0,1—0,2 м. Даследчыкі лічаць, што вогнішча ўваходзіла ў абрад ачышчэння пляцоўкі для курганнага насыпу.

Курганныя могільнікі ля в. Лясная датуюцца X—XIII стст.

І ля Лясной, і ля Кублішчына раскапана некалькі курганоў без пахаванняў, толькі з характэрнымі попельна-вугальнымі праслойкамі. Аналагічная сітуацыя і з насыпамі ля Вяты, Снегаў, Чамяроў. Толькі тут на мацерыку знойдзены кавалкі керамікі XIV—XV стст.

У 1987 г. пры распрацоўцы кар'ера ля в. Казлоўцы выяўлены грунтовыя могільнікі X—XI стст. Пры раскопках знойдзены грыўня з гранёнымі канцамі, сярэбраныя драцяныя бранзалетападобныя скроневыя колцы, сінія пацеркі, бранзалеты з зааморфнымі часткамі, пласцінчаты медны бранзалет, пасярэбраны пярсцёнак, наканечнік дзіды і іншыя рэчы. Усё сведчыць аб змешаным складзе насельніцтва гэтых мясцін.

В. А. Ермалёнак

Вывучэнне сівой мінуўшчыны

Дапісьмовая гісторыя здаўна прыцягвала цікавасць людзей. Ніхто не заставаўся абыякавым, знайшоўшы каменныя прылады працы, старажытныя рэчы, рэшткі даўніх збудаванняў, складаліся легенды аб загадкавых камянях з надпісамі, аб курганах-валатоўках, гарадзішчах, урочышчах.

Аднак упершыню не толькі звярнуў увагу на археалагічныя помнікі, але і даў ім апісанне вядомы летапісец XVI ст. Мацей Стрыйкоўскі. У сваёй «Хроніцы» ён апісаў эпіграфічныя помнікі на р. Заходняя Дзвіна — так званыя Барысавы камяні, выказаў першую гіпотэзу наконт іх з'яўлення. Па яго меркаванні, надпісы былі зроблены па загаду полацкага князя Барыса.

У 1773 г. рэчышча Заходняй Дзвіны і Барысавы камяні вывучаліся экспедыцыяй акадэміка І. І. Ляпёхіна. У 1810—

1812 гг. пад час будаўніцтва Дрысенскага лагера таксама праводзілася вывучэнне помнікаў археалогіі. Вялікую ролю ў пошуку археалагічных аб'ектаў і вырабаў каменнага веку ў нашым краі адыграла праца краязнаўца з Віцебска А. Н. Семянкоўскага-Курылы. У сярэдзіне XIX ст. вялікую цікавасць да старадаўняй гісторыі Міёршчыны праяўлялі мясцовыя памешчыкі: Клоты, Мірскія, Плятары. Сабраныя матэрыялы яны перадавалі ў музеі Вільні, Пецярбурга, Масквы, Варшавы, Кракава і іншых гарадоў.

У 1864 г. на Падзвінні працавала экспедыцыя Імператарскага археалагічнага таварыства, у ходзе якой мастак Зброевай палаты Д. М. Струкаў зрабіў 150 малюнкаў, прысвечаных помнікам даўніх гадоў. У канцы XIX ст. у нашым краі праводзіў пошукі археолаг, заснавальнік Віленскага музея старажытнасцей Ф. В. Пакроўскі. Ён упершыню склаў археалагічныя карты Паазер'я.

Плённым было вывучэнне старажытнасці вядомым беларускім гісторыкам-краязнаўцам А. П. Сапуновым. У кнізе «Гісторыка-геаграфічны нарыс Дзісенскага павета» ён шмат увагі ўдзяляе апісанню археалагічных помнікаў і прылад працы першабытнага чалавека. На пачатку XX ст. шмат зрабіў па вывучэнні мінулага нашага краю В. Ластоўскі, які запісаў мноства паданняў.

Пад час панавання панскай Польшчы ў 30-я гады археалагічныя даследаванні на Міёршчыне вялі супрацоўнікі археалагічнага музея Віленскага універсітэта А. Цэгак-Галубовіч і У. Галубовіч. З 1933 па 1938 г. імі былі абследаваны ў басейнах рэк Віліі і Дзісны 194 помнікі, складзена з дапамогай інжынера Дзісенскага лясніцтва П. Пякарскага і настаўніка гімназіі Л. Пякарскага археалагічная карта. Яны раскопвалі курганныя могільнікі ля вёсак Чамяры, Падубнікі.

Помнікі мінуўшчыны не маглі не прыцягнуць увагі вядомага мастака, разьбяра, пісьменніка Я. Драздовіча, які маляваў іх не толькі на сваіх карцінах, але занатоўваў у дзённіку. Настаўнік-гісторык Браслаўскай гімназіі Отан Гедэман у кнігах «Дзісна і Друя гарады магдэбургскія» і «Гісторыя Браслаўскага павета» таксама не мінуў увагай археалагічныя помнікі краю. Аб знаходках манет расказаў у сваёй працы Р. Якімовіч.

Навуковае даследаванне помнікаў археалогіі Міёрскага раёна разгарнулася пасля Вялікай Айчыннай вайны. У 1955—1956, 1961 гг. гэтым займаўся старшы навуковы супрацоўнік, кандыдат гістарычных навук А. Г. Мітрафанаў. Ён вёў раскопкі гарадзішчаў ля вёсак Язна і Паддубнікі.

Археалагічная разведка некаторых помнікаў у 1964 г. была праведзена П. Д. Побалем, у 1965 г.— К. А. Шутам. У 1974 г. на Заходнім Падзвінні створаны атрад Беларускай археалагічнай экспедыцыі. З 1977 г. і па сённяшні час вядзе раскопкі гарадзішча ля в. Пруднікі кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі В. І. Шадыра. Адначасова з ім пачала даследаванні курганных могілак у нашым раёне Л. У. Дучыц. Археалагічныя разведкі па вывучэнні помнікаў каменнага веку рабіў Э. М. Зайкоўскі — кандыдат гістарычных навук, супрацоўнік НАН Беларусі. У 1986—1987 гг. раскопкі ў Дзісне праводзіла В. М. Зайцава — супрацоўнік НАН Беларусі і могільніка XII ст. ля в. Казлоўцы — малодшы навуковы супрацоўнік НАН Беларусі Г. М. Семянчук. Вялікую дапамогу вучоным-археолагам на працягу 15 гадоў аказваюць члены археалагічнага краязнаўчага гуртка «Арганаўты мінулага» Міёрскага Дома піянераў на чале з В. А. Ермалёнкам, настаўнікам Міёрскай СШ № 3. Яны не толькі займаліся раскопкамі, але і збераглі для навуковага вывучэння курганы ля вёсак Лясная, Махіроўка, Казлоўцы. Юныя краязнаўцы выявілі гарадзішчы ля вёсак Вусаўцы, Гарані, Раж-

ні, курганныя могільнікі ля в. Снегі, на выспе Яс, паселішчы першабытнага чалавека ля вёсак Лінкаўшчына, Навалака, Снегі.

В. А. Ермалёнак

Помнікі археалогіі на тэрыторыі Міёрскага раёна

Каменны век

В. Мазурына, Завуццеўскі с/с. Селішча, стаянка эпохі неаліту, існавала ў сярэдневякоўі.

Жалезны век

В. Блізкае Чурылава, Павяцкі с/с. Гарадзішча днепра-дзвінскай культуры.

В. Востава, Новапагосцкі с/с. Гарадзішча на балоце.

В. Гвардзейская, Даўгінаўскі с/с. Гарадзішча днепра-дзвінскай культуры.

В. Завуцце, цэнтр с/с. Селішча тыпу верхняга пласта Банцараўшчыны, існавала і ў раннім сярэдневякоўі.

В. Касабукі, Туркоўскі с/с. Гарадзішча.

В. Ліпанты, Туркоўскі с/с. Селішча.

В. Мазурына, Завуццеўскі с/с. Гарадзішча днепра-дзвінскай культуры.

В. Паддубнікі, Язненскі с/с. Гарадзішча днепра-дзвінскай культуры.

В. Панізова, Туркоўскі с/с. Гарадзішча позняга этапа днепра-дзвінскай культуры.

В. Прудніки, Павяцкі с/с. Гарадзішча балтаў, у сярэдневякоўі парубежны аст-рог Полацкага княства, пазней — фартэцыя Вята; селішча балтаў.

В. Сабалеўшчына, Новаполацкі с/с. Гарадзішча днепра-дзвінскай культуры.

В. Субачава, Язненскі с/с. Гарадзішча 1 днепра-дзвінскай культуры; гарадзішча 2.

В. Шарагі, Язненскі с/с. Гарадзішча днепра-дзвінскай культуры.

В. Язна, цэнтр с/с. Гарадзішча днепра-дзвінскай і банцараўскай культуры.

Сярэдневякоўе

Г. Дзісна. Замчышча ў сутоках рэк Дзісна і Заходняя Дзвіна.

В. Блізкае Чурылава, Павяцкі с/с. Курганны могільнік культавага прызначэння XIV—XVIII стст.

В. Вята, Павяцкі с/с. Курганны могільнік.

В. Казлоўцы, Завуццеўскі с/с. Могільнік X—XI стст.

В. Кублішчына, Новапагосцкі с/с. Курганны могільнік балта-славянскага насельніцтва X—XII стст.

В. Лясная, Новапагосцкі с/с. Курганны могільнік балта-славянскага насельніцтва.

В. Снегі, Новапагосцкі с/с. Курганны могільнік.

В. Стары Пагост, Новапагосцкі с/с. Гарадзішча-сховішча.

В. Чамяры, Павяцкі с/с. Група рытуальных курганоў.

Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыкл. Мн., 1993.

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Віцебская вобл. Мн., 1985.

Таямніцы могільніка Казлоўцы

Унікальны помнік археалогіі выявілі члены гуртка «Арганаўты мінулага» ў 1987 г. ля в. Казлоўцы. Тут пры распрацоўцы кар'ера былі знойдзены пахаванні ў ямах. У 1987—1990 гг. археалагічны помнік даследавалі археолагі Л. У. Дучыц, Г. М. Семянчук. Пад час раскопак было ўскрыта 510 м^2 могільніка, які знаходзіцца на правым беразе р. Дзісна паміж вёскамі Казлоўцы і Шніткі, у 12 км ад г. Дзісна. Невядома, якая частка яго знішчана кар'ерам, але нават даследаванае дало змястоўны навуковы матэрыял. Выяўлены два тыпы пахавальнага абраду: крэмацыя і інгумацыя. Значная колькасць авальных ямаў памерам ад 1 да 3 м запоўнена



1



2



3

4

Знаходкі з могільніка ля в. Казлоўцы

шэрай зямлёй з перамешанымі вуголлем і попелам, без знаходак, толькі ў адной з іх была галава каня. Падобны рытуал існаваў у суседніх балцкіх народаў, у першую чаргу літоўцаў. Рэшткі двух трупаспаленняў знойдзены ў ямах на адлегласці 3 м адно ад аднаго. Абодва пахаванні не ўтрымлівалі знаходак.

Пад час раскопак выяўлена 8 пахаванняў з трупапалажэннем: тры дзіцячыя, тры жаночыя, два мужчынскія. У двух дзіцячых пахаваннях засталіся толькі дробныя костачкі, у трэцім — часткова шкілет, арыентаваны на паўднёвы ўсход. Захаваўся пласцінчаты бронзавы спецыяльна паменшаны бранзалет на правай руцэ з вельмі пагнутымі канцамі.

Жаночыя пахаванні досыць багатыя на пахавальны інвентар, што не характэрна для вясковых могільнікаў. Так, у адным з пахаванняў на скронях памерлай жанчыны было па тры сярэбраныя бранзалетападобныя колцы з завязанымі канцамі. Падобныя ўпрыгожанні характэрны для полацкіх і смаленскіх крывічоў X—XIII стст. На шыі — жалезная кручаная грыўня, а таксама каралі з бразготак з бронзы з крыжападобнай праразью. Тут жа знойдзена 14 пацерак з блакітнага шкла. Але найбольш рэдкія знаходкі для Беларусі ў гэтым пахаванні — вочкавыя і касцяныя пацеркі. Выяўлена шмат пранізак, шырока распаўсюджаных у Падзвінні. На правай руцэ былі бронзавы пярсцёнак і бранзалет з дроту з завужанымі канцамі. Ля тазавых костак знаходзіўся ляпны гаршчочак, перавернуты донцам уверх. У пахаванні ў нагах знойдзены бронзавы пасярэбраны пярсцёнак, цыліндрычная пасярэбраная пацерка, а на поясе з правага боку — рэшткі нажа. На левай руцэ — пласцінчаты бранзалет з бронзы з пашыранымі канцамі і цісненым геаметрычным арнаментам, на правай руцэ на запясці — другі бранзалет, літы з бронзы, з канцамі ў выглядзе змяі. Гэтыя два віды бранзалетаў былі шырока распаўсюджаны ў балтаў у X—XIII стст. На грудзях ляжаў яшчэ адзін нож, пад левай рукой рабрыстая пазалочаная пацерка, з левага боку чэрапа цыліндрычная пазалочаная пацерка. Невялікая колькасць пацерак і іх бессістэмнае размяшчэнне сведчаць, магчыма, аб іх рытуальным прызначэнні.

Трэцяе шматінвентарнае пахаванне ўтрымлівала ганчарны груба вылеплены гаршчок, жалезны нож, па тры бронзавыя бранзалетападобныя скроневыя колцы. Вакол галавы размяшчаліся 6 блакітных і 11 жоўтых пацерак. На правай руцэ на запясці знаходзіўся бронзавы віты з двух дротаў бранзалет.

Пад час археалагічных пошукаў гуртком «Арганаўты мінулага» сабрана шмат рэчаў, многія з якіх сапраўды унікальныя. Перш за ўсё гэта тры медныя падвескі ў выглядзе арабскіх дырхемаў X—XI стст. У Полацку выяўлена толькі формачка для адліўкі імітатараў дырхемаў, саміх манетападобных дырхемаў не знойдзена. Унікальнымі былі і тры скроневыя пярсцёнкападобныя колцы з бронзы з сярэбранымі арнаментаванымі зернем пацеркамі. Падобныя скроневыя колцы з'яўляюцца тыпова гарадскімі ўпрыгожаннямі.

Акрамя таго, у кар'еры ў час пошукаў знойдзены дзве шыйныя грыўні, пласцінчатыя і вітыя бранзалеты, шкляныя блакітныя і пазалочаныя пацеркі, бронзавыя і білонавыя бразготкі, дзве ўтулкавыя дзіды, каменная і жалезная сякеры, фрагменты ляпнога і ганчарнага посуду. Большасць знойдзеных рэчаў можна аднесці да полацка-смаленскіх крывічоў. Частка знаходак характэрная для балцкіх народаў. Час пахаванняў датуецца X—XII стст. Помнік сведчыць аб змешаным насельніцтве нашага краю ў той час.

В. А. Ермалёнак

Праз стагоддзі

Сярод курганных груп вылучаюцца курганы перыяду позняга сярэдневякоўя. Яны размешчаны непасрэдна на берагах Заходняй Дзвіны і ўяўляюць сабой насыпы з попельна-вугальнай праслойкай, часта маюць выбрукоўку і разбітую кераміку (Вята, Чамяры, Чурылава).

Храналагічна вылучаюцца пахаванні VII — IX стст. (Вята), якія адносяцца да культуры доўгіх курганоў, курганы X — XI стст. і XI — XII стст.

Для пахавальнага інвентару ранніх курганоў характэрны ляпны посуд, нажы, крэсівы ў выглядзе жалезных трубачак, падковападобныя жалезныя фібулы са спіральнымі канцамі, пранізкі, В-падобныя спражкі, шыйныя грыўні, пацеркі-лімонкі, пацеркі з сіняга і цёмна-чырвонага шкла, зрэдку цуглі.

Курганы X — пачатку XI ст. характарызуюцца бірытуальнасцю пахаванняў. У пахаваннях, зробленых па абраду трупаспалення, сустракаецца кругавая кераміка (Укля), а ў пахаваннях з трупапалажэннем — частыя ляпныя гаршкі (Лясная, Укля), ідэнтычныя посуду з курганоў з трупаспаленнем.

Курганам гэтага часу ўласцівы калачападобныя крэсівы з язычком, вузкапласцінчатыя скроневыя колцы з кручкападобнымі канцамі, вяночкі са спіральных пранізак з раздзяляючымі пласцінкамі, пацеркі-лімонкі і рубленыя бісерныя пацеркі.

У курганах XI — XII стст. пахаванні зроблены па абраду трупапалажэння на мацерыку ці ў яме. Ямныя пахаванні характэрны для басейна р. Авуты і для правабярэжжа Заходняй Дзвіны.

Пахавальны інвентар гэтага часу прадстаўлены рэчамі побыту, прыладамі працы, зброяй, упрыгожаннямі, прыналежнасцямі адзення, кругавым і ляпным посудам.

Вылучаюцца чатыры групы пахавальных помнікаў з уласцівымі кожнай з іх лакальнымі адрозненнямі: дзісенская, браслаўска-міёрская, асвейская і богінская.



Бронзавыя падвескі з гарадзішча ля в. Язна

У Дзісенскім мікрарэгіёне ў параўнанні з іншымі знойдзена вялікая колькасць нажоў і калачападобных крэсіваў.

Курганы браслаўска-міёрскай групы характарызуюцца наяўнасцю зброі, а таксама мужчынскімі пахаваннямі са шматлікім інвентаром. Для жаночых і мужчынскіх пахаванняў характэрны падковападобныя фібулы са спіральнымі канцамі, а таксама грушападобныя бразготкі. Сярод раскапаных курганоў няма ніводнага пахавання ў яме. Комплексы жаночых упрыгожанняў маюць рэчы ад славянскага і балцкага касцюмаў. Асабліва выразна гэта прасочваецца ў пахавальным інвентары курганнага могільніка каля в. Лясная.

У агульным жа пахавальныя помнікі даследаванага рэгіёна блізкія да курганоў Себежскага Паазер'я і да курганоў ваколіц Полацка. Па наяўнаму матэрыялу можна папярэдне акрэсліць шляхі славянскай каланізацыі на паўночным

захадзе Беларусі. Зыходзячы з датавання курганоў, ёсць падставы меркаваць, што першапачатковае прасоўванне славян ішло па левабярэжжы Заходняй Дзвіны, а на правабярэжжа яны прыйшлі пазней. Першая хваля славянскага рассялення адносіцца да часу не раней VII — VIII стст. Прычым гэта былі носьбіты культуры доўгіх курганоў, якая ўжо склалася.

Разгляд пахавальных помнікаў паўночна-заходняй Беларусі паказвае, што гэту тэрыторыю ў VII — XII стст. насялялі славяне, якія асвоілі элементы балцкай культуры, — крывічы.

Ступень узаемаўплыву ўсходнепрыбалтыйскіх плямёнаў і славян была рознай. На балцка-славянскае аблічча пахаваных указваюць таксама антрапалагічныя даныя. Адзінаццаць чарапоў з раскопак у Лясной, Кублішчыне, Кузьмаўшчыне і іншых вёсках маюць краніялагічныя рысы як балтаў, так і славян. Марфалагічнае іх аблічча бліжэй да паўднёвай групы палачанска-дрыгавіцкага сумежжа, чым да латгалаў.

...Варта адзначыць цікавую гіпотэзу, выказаную Д. А. Мачынскім адносна ўпамянутай у «Аповесці мінулых часоў» наромы (наровы). Грунтуючыся на даных тапанімікі (тапонімы *Нарова, Наравец, Няроўка, Нарва* і інш.), аўтар прыйшоў да высновы, што летапісная нарова жыла на ўсход ад ліваў, і змясціў яе ў вобласць басейна р. Вялікай і Усходняга Прыгуддзя. На складзенай ім карце тэрыторыя Сярэдняга Падзвіння ўключана ў зону доўгіх курганоў неўстаноўленай культурнай прыналежнасці. На думку Д. А. Мачынскага, нарова ўяўляла сабой этнагрупу, якая рана страціла самастойнасць.

У сувязі з адзначаным важна заўважыць, што менавіта ў Падзвінні зафікса-

Крыж на селішчы ля в. Пруднікі

ваны тапонімы *Наровы, Наруці, Нарушова, Нурава* і г. д. Акрамя таго, вядома, што рачныя парогі на Заходняй Дзвіне каля г. Дзісны называліся «Нароўскія парогі».

На тэрыторыі беларуска-літоўска-латышскага памежжа ў XI—XIII стст. існавалі своеасаблівыя ўмацаваныя паселішчы — Браслаў, Маскавічы, Рацюнкі, Дрысвяты і Пруднікі.

Гарадзішча Пруднікі (плошча 1 га) знаходзіцца у васьмістах метрах на захад ад вёскі, на крутым узгорку, размешчаным на левым беразе р. Вяты (прыток Заходняй Дзвіны). Вышыня гарадзішча 18 м. Пляцоўка няправільнай авальнай формы выцягнута па лініі поўнач — поўдзень. З паўднёва-заходняга боку маецца вал вышынёй да 3 м. З 1977 г. раскопкі на помніку вядзе В. І. Шадыра. Таўшчыня выяўленага культурнага слоя ад 0,3 да 3 м. Гарадзішча трохслойнае: ранні жалезны век, эпоха Кіеўскай Русі і часоў Вялікага княства Літоўскага. Да гарадзішча прымыкае селішча II — пачатку XI ст.

На гарадзішчы Пруднікі знойдзена касцяная праколка з зааморфнай галоўкай (X — XI стст.). Падобныя знаходкі вядомы ў Кіеве, Гняздове, Шаставіцах і ў Яраслаўскім Паволжы, менавіта ў тых месцах, якія звязаны з прысутнасцю скандынаваў.

Друкуецца па кн.: Дучыц Л. У. Браслаўскае Паазер'е ў IX — XIV стст. Мн., 1991.

Легендарныя камяні

Багата Падзвінне на валуны. Людзі здаўна пакланяліся іх сіле, складалі легенды. Яшчэ і сёння можна пачуць паданні, што некалі камяні раслі, множыліся і нават хадзілі па зямлі. Аб некаторых валунах гавораць, што гэта акамянелыя людзі, жывёлы ці хаты, або што пад каменем закапаны скарб.

Асабліва багата на такія помнікі Міёршчына. У в. Язна ўсе ведаюць вялізны валун, дзе, па паданнях, палуднаваў Напалеон (ці Кацярына?). А на камені з дзіркай у выглядзе чашы каля былой в. Бертаўшчына паблізу Новага Пагоста, як сведчаць паданні, у 1812 г. елі французы. Непадалёку ад Старога Пагоста быў валун, пра які казалі, што ён калісьці шыў адзенне. Потым нейкая ліхая баба прагневала яго, і камень перастаў шыць.

Паданні ўзніклі пазней, а камяням пакланяліся яшчэ ў язычніцкія часы. Тут нашы продкі збіраліся па святах, маліліся, прасілі сваіх багоў аб ураджаі і прыносілі ахвяры, каб задобрыць сілы прыроды.

Каля вёсак Наўгароды, Волкаўшчына, Снегі, Беларуская, Перабродцзе, Чурылава ёсць так званыя камяні-следавікі. Наогул камяні-следавікі (камяні з адбіткамі следа чалавека ці жывёлы — прыродныя або зробленыя штучна) вядомы ва ўсім свеце. Гэта свайго роду спецыфічная разнавіднасць пятрогліфаў. На Беларусі такіх помнікаў больш за паўсотні. Вучоныя лічаць, што гэтыя камяні з'яўляюцца праяўленнем старажытнага культу сонца, якое ідзе па сусвету, прыносіць святло і даруе ўрадлівасць. З распаўсюджаннем хрысціянства царкоўнікі прыстасавалі старажытныя культы да сваіх мэт і аб такіх камянях з'явіліся паданні як аб слядах розных святых. Старажытныя вераванні прынялі толькі іншыя формы.

Ёсць у Міёрскім раёне цікавыя каменныя крыжы, як, напрыклад, у вёсках Авечкі і Язна. У сярэдневякоўі каменныя крыжы былі вядомы ва ўсёй Еўропе. Звычайна яны ставіліся на перакрыжаваннях дарог, пры пракладцы новых шляхоў, водных пераправах, на месцах бітваў ці на месцах памятных падзей, на межах зямель, а таксама на могілках.

Вядомы на Міёршчыне і камень з выявамі ля в. Камянполле ва ўрочышчы Святая Воля. На камені высечана адлюстраванне пісталета і падковы. А каля Дзісны ў Заходняй Дзвіне былі тры

шырокавядомыя камяні. Ёсць паклонныя валуны і ў рэчышчы Дзісёнкі, прытоку Заходняй Дзвіны. На некаторых з іх высечаны крыжы.

На такія помнікі ўжо даўно звярнулі ўвагу. Яшчэ ў адным з указаў Пятра I было запісана: «... ежели кто найдет в земле или в воде какие старые вещи, а именно каменья необыкновенные, а также какие старые надписи на каменьях... такое бы приносили, за что давана будет довольная дача...»

Але да нашага часу не ўсе такія помнікі нават узяты на ўлік. Частка з іх знішчана. А колькі маглі б расказаць яны аб духоўным жыцці нашых продкаў, аб іх вераваннях, светапоглядзе! Згодна з рэспубліканскім Законам аб ахове помнікаў гісторыі і культуры, камяні з выявамі, камяні, аб якіх бытуюць паданні, і каменныя крыжы падлягаюць ахове і бяруцца на ўлік. Іх комплекснае вывучэнне вучонымі (археолагамі, этнографамі, палеографамі) прымусіць камяні загаварыць.

Л. У. Дучыц

Краўцы-шаўцы

Большасць беларускіх легендаў і паданняў мае падобныя варыянты не толькі ў народаў-суседзяў, але і ва ўсёй Еўропе. Вось адзін з сюжэтаў выключна мясцовага паходжання. Ён вядомы ў дзесятках варыянтаў, прычым запісаны яны ў розных, часам аддаленых адна ад адной мясцінах. Легенды распавядаюць пра майстравыя камяні, якія нібыта могуць шыць адзенне і абутак. У народзе іх называюць камянямі-краўцамі. Звычайна ў гэтых камянёў ёсць і іншая назва — чортавы...

...Каля ракі Дзісна, побач з вёскай Стары Пагост, ляжаў камень-кравец памерам у рост чалавека. У ім было акенца-ніша, у якое людзі, якія прасілі абноўку, клалі тканіну. Адна баба вырашыла паздзекавацца з майстра: накідала яна ў нішу гною ды яшчэ запатрабавала новыя чаравікі. Пасля такога здзеку акенца зачынілася, ліхую бабу скруціла, і больш валун нікому не шыў.

З тым жа дзісенскім краўцом звязана і іншая легенда. У ёй хоць і дзейнічае нячыстая сіла, але камень выступае яе праціўнікам. А было ўсё так. Непадалёку ад ракі будавалі царкву. Людзі звозілі валуны. Раззлаваныя чэрці вырашылі нашкодзіць і ўсе камяні, якія людзі прывезлі за дзень, перакідалі ўначы на другі бераг. Калі чуткі пра гэтыя выхадкі дакаціліся да валуна-краўца, ён ператварыўся ў магутнага асілка і накіраваўся на той бераг. Каб адпомсціць чарцям, кравец за кожны перакінуты камень вяртаў два. Свавольнікі знясілелі і разгубіліся. Чым больш яны працавалі, тым вышэйшая груда валуноў утваралася вакол іх. Хутка чэрці зразумелі, што трэба ўцякаць, бо нічога з іх задумы не атрымаецца. Валуноў, накіданых асілкам, хапіла не толькі на бажніцу, але і на каменную агароджу. А пераможца вярнуўся на ранейшае месца, зноў ператварыўся ў валун і, як раней, абшываў усю ваколіцу да таго выпадку, што ўчыніла ліхая баба.

Друкуецца па кн.: Ляўкоў Э. А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны. Мн., 1992.

Алексеев Л. В. Археологические памятники эпохи железа в среднем течении Западной Двины // ТПОКЭ /Вопр. этнич. истории народов Прибалтики. М., 1959.

Алексеев Л. В. Раскопки древнего Браслава // КСИА. 1960. Вып. 81.

Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыкл. Мн., 1993.

Голубович Е., Голубович В. Славянские поселения правобережной Дисны в Вилейском округе БССР // КСИИМК. 1945. Вып. II.

Гурин М. Ф. Кузнечное ремесло Полоцкой земли IX — XIII вв. Мн., 1987.

Дучыц Л. У. Браслаўскае Паазер'е ў IX — XIV стст.: Гіст.-археал. нарыс. Мн., 1991.

Дучыц Л. У. Край блакітных азёр. Мн., 1988.

Дучыц Л. У. Археалагічныя помнікі ў назвах, вераваннях і паданнях беларусаў. Мн., 1993.

Дучиц Л. В., Зайковский Э. М., Ксензов В. П.

Работы по берегам Западной Двины // АО 1984. Мн., 1986.

Зайкоўскі Э. М. Першабытныя помнікі паўночнай Беларусі. Мн., 1990.

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Віцебская вобл. Мн., 1985.

Ляўкоў Э. А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны. Мн., 1992.

Милютин В. И., Шадыро В. И. Находки монет из поселения Прудники // Гісторыка-археалагічны зборнік. Мн., 1994. № 5.

Очерки по археологии Белоруссии. Мн., 1970. Ч. I.

Покровский Ф. В. Археологическая карта Виленской губернии. Вильно, 1893.

Покровский Ф. В. Курганы на границе Литвы и Белоруссии // Тр. IX археологич. съезда в Вильне в 1893 г. М., 1895. Т. I.

Сапунов А. П. Река Западная Двина. Витебск, 1896.

Сапунов А., Друцкий-Любецкий В. Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Вилейской губернии. Витебск, 1896.

Семянчук Г. М. Новая катэгорыя археалагічных помнікаў на тэрыторыі Полацкай зямлі (грунтовыя могільнікі XI — XIII стст.) // Гісторыка-археалагічны зборнік. Мн., 1993. № 2.

Шадыро В. И., Ласкавы Г. В. Средневековые наконечники стрел лука и арбалета из поселения у дер. Прудники // Гісторыка-археалагічны зборнік. Мн., 1994. № 4.

Шадыро В. И. Памятники среднего Подвинья // АО 1974. М., 1975.

Шадыро В. И. Ранний железный век северной Белоруссии. Мн., 1985.

Шадыро В. И. Раскопки городища Прудники // АО 1983. М., 1985.

Шадыро В. И. Раскопки поселений близ д. Прудники // АО 1986. М., 1988.

Шадыро В. И. Раскопки селища в Витебской области // АО 1985. М., 1987.

Шадыро В. И. Раскопки селища Прудники // АО 1984. М., 1986.

Шадыро В. И. Средневековые материалы из городища Прудники.

Штыхов Г. В. Археологическая карта Белоруссии. Мн., 1971. Вып. 2.

У СКЛАДЗЕ ПОЛАЦКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

На падставе аналізу курганных старажытнасцей на тэрыторыі беларуска-літоўска-латышскага памежжа археолаг Л. У. Дучыц робіць вывад, што рассяленне крывічоў тут пачалося не раней VII — VIII стст. Гэта былі носьбіты культуры доўгіх курганоў. Адзін з найбольш тыповых такіх курганоў выяўлены на курганным могільніку ля в. Вята. Доўгія і авальныя насыпы яшчэ сустракаюцца ля вёсак Кублішчына, Лясная, Бліжняе Чурылава, Чамяры. Але асноўны прыток славянскага насельніцтва прыпадае на XI—XII стст. Курганы тых часоў з пахаваннямі ў яме сустракаюцца ў басейне р. Авуты.

Разам з тым гісторык Мікола Ермаловіч дапускае, што ў нашых мясцінах славянскае насельніцтва не было аднародным. Назва в. Дрыгучы на беразе Зах. Дзвіны можа быць сведчаннем, што тут жылі таксама дрыгавічы.

Л. У. Дучыц мяркуе, што першапачатковае рассяленне славян ішло менавіта па левабярэжжы Зах. Дзвіны, магчыма, з боку Пскоўшчыны, бо ў цэлым пахавальныя помнікі, што захаваліся ў нашых мясцінах, блізкія да курганоў ваколіц Полацка і Себежскага Паазер'я. Крывічы ўзводзілі парубежныя ўмацаваныя паселішчы або ўмацоўвалі тыя, што ўжо існавалі. Яны выконвалі ролю фарпостаў каланізацыі, адміністрацыйных цэнтраў і пунктаў збору даніны. Жыхары займаліся таксама сельскай гаспадаркай, паляваннем, рамёствамі, гандлем, промысламі.

Месцы збору даніны ў той час называліся пагостамі — менавіта там князі «гасцілі». У нашай мясцовасці існуюць, відаць, яшчэ з тых часоў, размешчаныя непадалёку адна ад адной вёскі Стары і Новы Пагост. Менавіта ля Старога Пагоста, па сведчанні А. Сапунова, яшчэ ў мінулым стагоддзі знаходзілі асабліва шмат старажытных рэчаў. Селяніну Шамшуру трапілася, напрыклад, ці то дыядэма з залатымі падвескамі, ці то пазалочаны абруч, да якога былі прымацаваны маленькія бомы. Рэч гэтая была адаслана ў Пецярбург. І знаходкі абручоў былі не адзінкавыя.

«Полацкія крывічы, — пісаў яшчэ ў канцы мінулага стагоддзя прафесар І. Д. Бяляеў, — распаўсюджваючы свае ўладанні па Заходняй Дзвіне і яе пры-

токах, заснавалі Дзісну, Друю, Відзы, Свянчаны, Брачаслоўль, цяпер Браслаўль». І сапраўды, на востраве ў сутоках Зах. Дзвіны і Дзісны пад больш познімі ўмацаваннямі Ніжняга замка выяўлены сляды паселішча XI ст. Кераміку XI — XII стст. знаходзяць археолагі на селішчы, размешчаным на пагорку ў пойме р. Авуты ля в. Завуцце і заселеным у VI — VIII стст. прадстаўнікамі культуры тыпу верхняга пласта Банцараўшчыны. На высокім пагорку ля в. Пруднікі на месцы ўмацаванага паселішча балтаў у XI — XIII стст. існаваў парубежны астрог Полацкага княства.

Першае ўпамінанне Полацка як цэнтра княжання знаходзім у «Аповесці мінулых гадоў» за 862 г. І менавіта ў VIII — IX стст. на археалагічных аб'ектах сучаснага Міёрскага раёна знікаюць апошнія сляды банцараўскай культуры, яскравыя праяўленні жыццядзейнасці балтаў. Летапісных звестак пра падзеі і працэсы, якія адбываліся ў нашых мясцінах у гэты перыяд і нават больш позні час, няма. Застаецца па ўскосных даных меркаваць, што жыццё тут пачало вызначацца палітыкай, якая праводзілася полацкімі князямі і вечам. Паступова з'яўляюцца новыя паселішчы. На карце «Русь у 1054 годзе пры Яраславе Вялікім» у атласе Н. І. Паўлішчава на беразе Зах. Дзвіны паміж Друяй і Полацкам адзначаны Пераслаў. І цяпер на левабярэжжы ва Узмёнскім і Туркоўскім сельсаветах ёсць вёскі з сугучнымі назвамі: Пераслаў, Пераслоўе, Пераслова.

Гісторыя нашых мясцін звязана з імем полацкага князя Усяслава Брачыславіча (1044—1101), вядомага яшчэ як Усяслаў Полацкі, Усяслаў Чарадзей. Гэта пры ім Полацкае княства дасягнула найбольшай магутнасці і практычна стала самастойнай, незалежнай дзяржавай. Не выпадкова гаворыць пра яго «Слова аб палку Ігаравым»: «...Усяслаў князь людзей судзіў, князем гарады радзіў, а сам апоўначы воўкам брадзіў...» Магчыма, што быў ён у ваколіцах Дзісны, бо тут

Усяслаў Чарадзей

у 1914 г. знойдзены пярсцёнак-пячатка з надпісам: «Усяслаў — князь полацкі».

Выказана некалькі здагадак, што магло цікавіць Усяслава Брачыславіча ў нашых мясцінах. Так, настаўнік гісторыі Міёрскай СШ № 3 В. А. Ермалёнак заўважыў, што назва в. Наўгароды ў старадаўніх дакументах пішацца Ноўгарад ці Наўгарод. Што непадалёку знаходзіцца в. Каланіца, якая раней называлася Калодніцы (ад «забіваць у калодкі»). Што лес побач — Стражніца. Што ў курганным могільніку ў ваколіцах Наўгародаў знойдзены ўпрыгожанні, выраблены, па меркаванні археолагаў, наўгародскімі славенамі, а ў самой вёсцы выяўлены фрагменты керамікі XI — XII стст.

Вось так і нарадзілася гіпотэза, што

пасля паспяховага паходу на Пскоў (1065) і Ноўгарад (1066) Усяслаў Брачыславіч пасяліў вялікі захоплены ім палон менавіта ў гэтым глухім кутку ля ўжо абжытых мясцін Старога і Новага Пагоста. У лесе непадалёку размясцілася княжацкая варта. Яна і тутэйшую невялікую рачулку назвала такой прывычнай цяпер назвай — Дзвіна.

Яшчэ адну цікавую версію аб знаходжанні Дудутак, ад якіх «скокнуў воўкам хутка да Нямігі» Усяслаў Брачыславіч, як сказана зноў жа ў «Слове аб палку Ігаравым», выказаў археолаг, вандроўнік і мастак, наш зямляк Язэп Драздовіч. Жыхары вёсак Спігальшчына, Сквірцы, Варонкі так называюць не населены пункт, не сялібу, а ўрочышча ў ваколіцах Залатога Ручая і Чарневіцкага млына ў даліне р. Авуты на мяжы сучасных Міёрскага і Глыбоцкага раёнаў. Яшчэ яно ахоплівае вёскі Тупічына, Зарэчча, Лугаўцы, Крукаўшчына, Сіпаліна. На думку Язэпа Драздовіча, менавіта тут знаходзілася месца зімоўкі конніцы князя Усяслава, бо тутэйшыя мясціны надзвычай багатыя лугамі-сенажацямі.

Барысаў камень

Пярсцёнак князя Усяслава. IX ст.

Размешчанае ў цэнтры Краснаборскае гарадзішча магло быць рэзідэнцыяй князя, тады як у навакольных гарадзішчах і селішчах размяшчалася коннае войска. Пацвярджаюць гэтыя меркаванні знаходкі пахаванняў высакаслых воінаў з узбраеннем на Краснаборскіх і іншых могілках. А помнікам па загінуўшых на Нямізе мог быць размешчаны непадалёку курган-велікан, у насыпе якога археолагі нічога не выявілі. Значыць, насыпаўся ён з рытуальнымі мэтамі.

Яшчэ адзін полацкі князь пакінуў адметны след у нашых мясцінах. Гэта Барыс Усяславіч, які князяваў у пачатку XII ст. Вядома, што ён падараваў аднаму з першых полацкіх епіскапаў (Полацкая епархія заснавана ў 992 г.) дзісенскія землі. Дарэчы будзе сказаць, што блізкае знаходжанне царкоўных

хрысціянскіх улад зусім не перашкаджала мясцовым язычнікам прытрымлівацца свасёй веры і звычаяў аж да XIV ст., калі былі насыпаны пры пахаваннях апошнія курганы.

Імя гэтага князя ўвекавечана на камянях у рэчышчы Зах. Дзвіны, якія яшчэ завуць Барысавымі і «Пісанікамі». Пра іх расказвае А. К. Кіркор у часопісе «Живописная Россия».

Камень, што ляжаў у вадзе на левым беразе Дзвіны ля ўпадзення ў яе Павянужкі, адрозніваўся ад іншых. Надпіс на ім загадкавы — ці то «Сулібор хрэст», ці то «Смелы харобры Барыс святы». Гэты камень з чырвонага граніту выступаў з вады прыкладна на 1,5 м. Па даручэнні графа Уварава валун яшчэ ў 1878 г. з вялікімі цяжкасцямі перавезлі ў Маскву. Быў ён экспанатам Археалагічнага таварыства, Гістарычнага музея. А таму ацалеў і ўрэшце трапіў у музей-запаведнік «Каломенскае».

Дыскусія аб паходжанні «Барысавых камянёў» (мясцовыя назвы — Барыс, Барыс-Хлебнік, Пісар, Пісанік, Барыс-Глеб, Барысаглебскі, Французскі, Напалеонаўскі камень і інш.) працягваецца больш двух стагоддзяў. Выказваліся меркаванні, што яны выконвалі ролю мяжы, але ж граніца Полацкага княства па Дзвіне не праходзіла. Яны маглі быць фарватарам, быць помнікамі ў гонар самога князя ці будаўніцтва храма ў гонар Барыса і Глеба. Магчыма, выскананне крыжоў рабілася з мэтай барацьбы з паганскім культам. Цікава, што в. Накоўнікі і Балоткі, ля якіх у ваколіцах Дзісны знаходзіліся «Барысавы камяні», у сярэдневякоўі належалі Спаскай царкве ў Друі. Яшчэ існавалі меркаванні, што камяні садзейнічалі распаўсюджанню хрысціянства, што яны звязаны з ваеннымі паходамі князя Барыса, які такім чынам прасіў дапамогі ў неба; камяні хрысцілі ў час вялікага голаду, разлічваючы на падтрымку бога, бо раней яны былі прысвечаны паганскаму Дажбогу, хрысціянскія «абавязкі» якога пазней сталі выконваць святыя Барыс і Глеб.

На жаль, яшчэ ў пачатку XIX ст. разгарнулася барацьба з камянямі, а канчаткова яны знішчаны ў сярэдзіне XX ст.

Увогуле полацкі перыяд для нашых мясцін не быў спакойным. Так, вядомы рускі гісторык С. М. Салаўёў сцвярджаў, што Полацкае княства зведала 18 міжусобіц, што толькі ў першыя 28 гадоў XII ст. было 8 літоўскіх нашэсцяў, летам 1092 г. прайшоў мор. Л. У. Дучыц прыводзіць даты чатырох паходаў літоўцаў на полацкія землі ў XII — XIII стст. і сямі ўварванняў крыжакоў. Аднак Полацкае княства не толькі баранілася, яно і наступала, змагалася. Пэўнае ўяўленне аб зброі, якой карысталіся нашы продкі, даюць знаходкі ў гарадзішчы ля в. Прудніки. Іх

Рымская манета.
Знаходка В. А. Ермалёнка

мноства сведчыць аб важнасці населенага пункта, які кантраляваў водны шлях па Дзвіне. Тут не раз перасякаліся інтарэсы балцкіх плямёнаў, палачан-крывічоў, крыжакоў.

Асноўнай зброяй далёкага бою ў жыхароў гарадзішча быў лук. Наканечнікі стрэл па спосабу мацавання да дрэўка падзяляліся на ўтулкавыя і чарашковыя, прычым іх выяўлена 7 тыпаў звычайных, пераважна плоскіх, і 6 тыпаў бранябойных — пірамідальных, квадратных, рамбічных і інш. Нашым продкам у XII — XIII стст. быў вядомы арбалет, стрэлы якога таксама былі некалькіх тыпаў.

Галоўнай зброяй бліжняга бою былі коп'і. Менавіта кап'ёўшчыкі першымі наступалі і распачыналі асноўную бітву.

Дроцік-суліца лічыўся дапаможнай зброяй, з лістападобным чаранковым наканечнікам знойдзены ў кургане ля в. Кублішчына.

Рэдкімі знаходкамі з'яўляюцца мячы, якія былі пераважна заходнееўрапейскага паходжання, булавы.

Мясцовае насельніцтва валодала даволі складанай тэхналогіяй вырабу зброі, гаспадарчых рэчаў з жалеза, якое здабывала з балотнай руды. Яна ўключала свабодную гарачую коўку металу са слабым і нераўнамерным навугляроджваннем; пакетаванне, якое спалучала коўку

Арабскія дырхемы, знойдзеныя на гарадзішчы ля в. Пруднікі

і кавальскую зварку, тэрмаапрацоўку сталі; гарнавую пайку меддзю; цэментацыю і іншыя працэсы.

Ужо ў тыя далёкія часы ў Дзісне вырабляўся гліняны посуд, сыравіну для якога бралі на абрывістых берагах Заходняй Дзвіны.

Мясцовае насельніцтва вырошчвала і апрацоўвала лён, аб чым сведчаць знаходкі льняных нітак у адным з курганоў ля в. Лясная.

Рамёствы задавальнялі ў першую чаргу мясцовыя патрэбы. Але ж каляровыя металы, бурштын, шыферныя прасліцы, нарэшце, сярэбраныя манеты з далёкіх мясцін маглі трапіць на Полаччыну толькі ў выніку гандлю. У былым Дзісенскім павеце ў 1867 г. знойдзена 135 сярэбраных манет IX — першай паловы X ст., у 1896 г. — скарб куфічных дырхемаў IX — X стст. ля в. Краснае ў ваколіцах Старога Пагоста. У наш час выяўлены саманідскі дырхем першай паловы X ст. У канцы мінулага стагоддзя на востраве Старапагосцкага возера адкапаны скарб арабскіх манет. Такія ж сярэбраныя манеты выкарыстоўваліся ў якасці ўпрыгожанняў (курганны могільнік ля Казлоўцаў). Значыць, ужо ў тыя далёкія часы нашы мясціны былі ўключаны ў міжнародны гандаль. Як інакш растлумачыць знаходкі сярэбраных дынарыяў Рымскай імперыі, дырхемаў Арабскага халіфата з Паўночнай Афрыкі і манет з Самарканда ў гарадзішчы ля Пруднікаў? Тут яны не выкарыстоўваліся ў якасці ўпрыгожанняў. Значыць, былі ў абароце менавіта ў IX — XI стст. А побач з манетамі — пацеркі з Візантыі і Сярэдняй Азіі, гіры-разнавагі.

Чужым манетам уключыцца ў мясцовы грошавы абарот было зусім не складана, бо дырхем вагой 2,7—2,9 г быў роўны мясцовай куне, манеты ў 2,3—3,5 г адпавядалі нагаце, а крыху абрэзаныя куфічныя дырхемы ў 1,36 г раўняліся разане. Такім чынам, найстаражытнейшая ўсходнеславянская грашова-вагавая сістэма выглядала наступным чынам: грыўня (68,22 г) раўнялася 20 нагатам або 25 кунам ці 50 разанам.

На Падзвінні яшчэ выкарыстоўвалася «скандынаўская» сістэма: марка (грыўня) у 204 г серабра раўнялася 8 эрэ ці 24 артугам. Тады артуг важыў 8,25 г, а самая дробная манета — 0,822 г.

Архітэктурныя помнікі полацкага перыяду на тэрыторыі раёна не захаваліся. Вельмі сціплыя звесткі пра нашы мясціны ў пісьмовых крыніцах. І гэта пры тым, што археалагічныя раскопкі сведчаць аб высокім для свайго часу ўзроўні матэрыяльнай культуры ў тутэйшых гарадзішчах і селішчах. Відаць, такая акалічнасць дала падставу В. Ю. Ластоўскаму сцвярджаць, што ў час феадальнай раздробленасці Полацкай зямлі ў нашых мясцінах існавала Дзісенскае княства. Але дакументальнага пацвярджэння гэтаму не знойдзена.

Дучыц Л. У. Браслаўскае Паазер'е ў IX — XIV стст.: Гіст.-археал. нарыс. Мн., 1991.

Ермаловіч М. Старажытная Беларусь: Полацкі і Новагародскі перыяды. Мн., 1990.

Живописная Россия / Репринт. воспроизведение изд. 1882 г. Мн., 1993.

Ігнатоўскі У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1992.

История Белорусской ССР. Мн., 1977.

Соловьев С. М. Сочинения. Т. 3—4. Кн. 2: История России с древнейших времен. М., 1988.

Л. А. Матэленак

Аб Барысавых камянях — «Пісаніках»

Исторических памятников более сохранилось в Белорусских поселениях. Мы упомянем здесь о так называемых Двинских камнях или «Писаниках». Собственно, эти камни относятся к Белорусскому Полесью, но особенно замечательные из них находятся в пределах Виленской губернии. В пяти верстах от уездного города Дисны, близ деревни Наковники, в Двине, в самой середине реки, лежит серого цвета гра-

нитный валун, длиною в 5 1/2 аршина, в высоту 2 3/4 аршина и в окружности четырнадцать аршин. На нем высечен крест, поставленный на двух ножках, в виде буквы П, по сторонам которого высеченная надпись «Господи помози рабу твоему Борису». Верхняя часть креста повреждена. В 1818 г. управление Путей Сообщения для очищения фарватера предположило порохом взорвать большие камни. Эта участь постигла и настоящий камень, но, к счастию, только верхняя часть креста раздробилась в куски, остальные части креста и надпись уцелели. Летом 1858 г., при весьма низком уровне воды, М. Ф. Кустинский, известный белорусский археолог, собрал почти все раздробленные куски камня, из коих можно было составить первоначальную форму креста.

Барысаў камень

В двух верстах от этого камня, в 7 от Дисны, почти на середине русла реки, лежит тоже Борисов камень, как народ вообще называет эти камни, размерами превосходящий все другие. Высота его от дна равна 3 1/2 аршина, длина 5 1/4 аршина, окружность около 24 аршин. На плоской поверхности его высечен шестиконечный крест, по обеим сторонам которого надпись: «Господи помози рабу своему Борису».



Барысаў камень

Наконец, третий камень лежит в нескольких шагах от левого берега Западной Двины, при впадении в нее речки Повянушки. Камень этот меньше предыдущих, имеет в поперечнике два аршина, цвета красного. На нем высечен четырехконечный крест, поставленный на круг, с несколько расширенными концами перекладины. Надпись не прочтена.

Камни эти здесь не прекращаются. Они находятся в Двине еще пониже, близ Ашерадена, в Фридрихштадском уезде Лифляндской губернии. Все эти камни, в значительном числе, с крестами, по замечанию д-ра Крузе в его Некроливонике, принадлежат, вероятно, к одному времени, потому что Ашераден принадлежал к Полоцкому княжеству.

Борис, князь Полоцкий, был сын Всеслава, внук Брячислава, князя Полоцкого, умершего в 1129 г.

Гр. Константин Тышкевич думает, что эти камни были пограничными знаками. Едва ли с этим можно согласиться: как

Дисненский уезд, так и окрестности Ашерадена входили в состав Полоцкого княжества. При Борисе эти камни пограничного значения не могли иметь никакого, потому что они лежали внутри страны, а не на рубеже. Такой же точно камень находится и в пяти верстах от Полоцка, а также в Могилевской губернии, и в Виленской, близ м. Долгинова, в деревне Камень. Этот имеет вид самородной глыбы темного гранита, в виде конуса; вышиною в 5 аршин и два в поперечнике основания. На этом камне иссечен шестиконечный крест.

Исследователи Двинских камней не обратили внимания на то, нет ли в окрестностях другого русла Западной Двины; не изменила ли она своего течения, что, как известно, часто случается с большими реками. Может быть, в XII ст. эти камни были положены на суше, а не в русле реки? Известно ведь много камней у славян с надписями и без надписей, имеющих значение памятников в честь знаменитых людей или славных событий. Существует много камней, с которыми связаны народные сказания, и мы еще укажем на некоторые из них.

Кіркор А. К. Першабытныя часы літоўскага Палесся // Живописная Россия. Репринт. воспроизведение изд. 1882 г. Мн., 1993. С. 9—10.

Дзісенскі замак

Існаваў у XIV — XVIII стст. на востраве Замак каля сутокаў рэк Дзісна і Зах. Дзвіна ў Міёрскім р-не. Узнік у XIV ст. на месцы старажытнага паселішча XI ст. Па дакументах XVI ст. вядомы як «Капец-гарадок». У хроніках Лівонскага ордэна зафіксаваны каля 1374 і 1377 гг. пад назвай «Новы замак рускіх», адзначаны замкавы мост, які звязваў замак з берагам. Займаў плошчу каля 5 га. Археалагічнымі раскопкамі пацверджана, што першапачаткова вал замка быў насыпаны з пяску і ўмацаваны з боку Зах. Дзвіны пластом вязкай сіняватай гліны, яго аснова вымашчана дубовымі плахамі. Гліняны пласт засцерагаў вал ад размывання дажджавымі і веснавымі паводкамі. Вышыня вала пасля некалькіх падсыпак дасягнула 5 м. На яго вяршыні спачатку стаяў дубовы частакол, які пазней заменены гароднямі. Дзісенскі замак меў зручныя прыродныя «крэпасці самародныя»: шырыня Зах. Дзвіны, якая абмывала яго з Пн, дасягала 100 м, шырыня Дзісны, што працякала з Пд, — 80—90 м. Плацоўка вострава ўзвышалася над узроўнем вады на 10—12 м, а з улікам вышыні вала і абарончых сцен магутнасць замка значна павялічвалася. У XVI — XVII стст. замкавы вал быў вышынёй 10 м і шырынёй у аснове каля 19 м. На подступах да замка па вадзе шлях перагароджвалі «Нікольскія парогі».

У XIV — пачатку XV ст. Дзісенскі замак выконваў ролю фарпоста Полацка на Зах. Дзвіне, які кантраляваў увесь рух па рацэ і подступы да сталіцы Полацкай зямлі. Пасля Грунвальдскай бітвы 1410 г. і паражэння крыжакоў ён страціў ранейшае стратэгічнае значэнне. У дакументах за 1414, 1461, 1500 і 1552 гг. Дзісна згадваецца як паселішча ці «двор», звесткі пра замак адсутнічаюць. Відаць, ён прыйшоў у заняпад. Пазнейшыя звесткі пра дзісенскія ўмацаванні адносяцца да пачатку Лівонскай вайны 1558—1583 гг. і падзення ў 1564 г. Полацка. У процівагу Полацку, занятаму войскамі Івана IV Грознага, Дзісенскі замак быў адноўлены. Ваенна-фартыфікацыйнымі работамі кіравалі «рыцер и военник добрый», дзяржаўца крычаўскі і дзісенскі Баркулаб Іванавіч Корсак і пан Раман Хадкевіч. Значна павялічылася колькасць насельніцтва Дзісны за кошт бежанцаў і ўцекачоў з Полаччыны, якія «...домы собе побудовавшы, острог немалый около места и вежы при нем коштом и накладом

Востраў у сутоках Дзвіны і Дзісны. Рэшткі гарадзішча XI ст.

своим властным заробили, делы (гарматамі), гаковницами, ручницами, водле можности своее, на тот час бакшты заспособили». Паводле перамір'я 1563 г., калі былі «писаны рубежи городу Полоцку и Полоцкому повету», Дзісна яшчэ ўпамінаецца ў рускіх крыніцах як «Копец-городок». Прылеглыя да замка землі належалі полацкаму ўладыку і называліся «Парогі». Кароль Жыгімонт II Аўгуст высока ацаніў стратэгічнае значэнне адноўленага Дзісенскага замка, адзначаў, што «замок наш Дисненский есть особливою обороною от неприятеля нашего, князя великого Московского, тому панству нашому Великому княжеству Литовскому». У 1566 г. загадаў Б. І. Корсаку «при замку нашом Дисеньском место осаживать» і абвясціць на 8 гадоў розныя льготы і «слободы». Для мяшчан і мясцовых казакоў найважнейшай умовай жыцця ў горадзе быў абавязак «работу остроговую робити и сторожу мевати по тому, яко державца таможний с ними постановить». У 1569 г. пад аховай Дзісенскага замка на левым беразе Дзісны пачалося будаўніцтва новага горада — «места Дисна», якому кароль адвёў 336 га зямлі. У 1579 г. замак стаў цэнтрам збору войск С. Баторыя перад паходам на Полацк. Польскі гісторык А. Гваньіні адзначаў, што тут «вялікі замак, абведзены непрыступным і моцным валам, прыстасаваны да абароны гарматамі і рознай амуніцыяй». Пасля Лівонскай вайны замак паступова прыйшоў у заняпад, што прывяло да здачы яго 25 ліпеня 1654 г. войску рускіх ваявод В. П. Шарамецева і С. Стрэшнева. З удзелам мясцовых жыхароў умацаванні замка былі хутка адноўлены. Паводле дакументаў за 1655 г., ён меў 14 вежаў, у тым ліку 2 Дзвінскія і Дзісенскую брамы, 2 «форткі» да р. Дзісна. Попіс замка называе наступныя вежы: «новая ля крыжа над Дзвіною, новая ля старога Мніскага касцёла, старая Пытачная, вежа Пясочная, Новая Свенская, Старая Крывая, новая Вуглавая, новая ля Тапучага ручая, Плоская, Мосарская». Яны былі прамавугольныя ў плане, амаль усе памерам 8,5×8,5 м, 2-ярусныя, вышынёй каля 9 м, накрытыя дранкай. З боку поля вежы секліся ў 2 бервяны, на іншых участках — у адно. Абарончыя сцены былі 2 тыпаў — стаячы астрог і рубленыя тэрасы, засыпаныя ўнутры зямлёй, з верхнім «боем» і бярвёнамі-«каткамі», якія скідвалі са сцен на праціўніка. На сценах стаяла 40 гармат розных калібраў. У сувязі з вайной Расіі з Рэччу

Валы Ніжняга замка. Сучасны выгляд

Паспалітай 1654—1667 гг. і разбурэннямі горада жыхары зноў перасяліліся на востраў, дзе абнеслі сваё паселішча драўлянымі ўмацаваннямі. Так утварыўся Ніжні замак, вядомы па шэрагу тагачасных крыніц. Умацаванні больш ранняга перыяду сталі называцца Верхнім замкам. 10 красавіка 1660 г. шляхта, казакі, дзісенскія мяшчане і павятовыя мужыкі, якія сядзелі ў аблозе ў Дзісенскім замку, зрабілі пераварот, звязалі рускі гарнізон і адчынілі браму перад войскам С. Юдыцкага. Бурмістра, які ў 1654 г. здаў горад рускім войскам, змоўшчыкі павесілі ў замкавай браме. Да канца вайны ў Дзісенскім замку размяшчаўся значны гарнізон, было 27 бронзавых і жалезных гармат, 41 гакаўніца, 4 драбавікі-«шротаўніцы», ядры, гранаты, карцечныя зарады, сера, порах, свінец і інш. Знішчэнне Дзісенскага замка прыпадае на Паўночную вайну 1700—1721 гг. Дзісна поўнасцю згарэла 15 ліпеня 1700, у 1720 г. пажар паўтарыўся. Зброя з замкавага цэйхгауза паступова была вывезена гетманам М. К. Пацам і панамі з навакольных маёнткаў. 2 гарматы забралі ксяндзы Даўгінаўскага касцёла. У 1700-я гг. маёр кароннага войска Ф. Навіцкі зрабіў тапаграфічны здымак Дзісенскага замка і запісаў, што «цяпер вада і лёд зусім знеслі многія валы, вышэй якіх у горадзе не было ніводнага месца, рэшткі валоў і замчышча зараслі лазою і ў паводку заліваюцца вадой». Апрача гэтага, схілы валоў разворваліся, ад чаго насып аплываў.

М. Ткачоў

Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1993. С. 219.

У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Раздробленая на невялікія княствы Полацкая зямля з сярэдзіны XIII ст. усё больш уцягваецца ў сферу палітычнага ўплыву Літвы. У Полацку ў 1262—1263 гг. па запрашэнні веча княжыў пляменнік вялікага князя Міндоўга Таўцівіл. А ў 1307 г. палачане звярнуліся да вялікага князя Віценя, каб ён дапамог выгнаць з іх зямлі немцаў, і прызналі яго ўладу. Полацкая зямля добраахвотна ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага на ўмовах, што вялікі князь літоўскі прымае спачатку тытул вялікага князя полацкага, а ўжо потым — новагародскага. Полаччына на значны час захавала ўнутраную аўтаномію, нават веча, свае законы, звычаі, войска, тэрытарыяльнае дзяленне, пэўныя асаблівасці грашова-вагавай сістэмы.

Такі паўзалежны стан мясцовых земляў адпавядаў палітыцы літоўскіх князёў: гаспадар старыны не парушае, навіны не ўводзіць.

Аднак уваход Полаччыны ў новую, больш магутную дзяржаву не абараніў яе землі ад крыжацкай навалы. Крыжакі даволі рэгулярна рабілі сюды рэйды, зарэгістраваныя пісьмовымі крыніцамі ў 1324, 1333, 1343, 1374, 1375, 1377 гг. Былі яны накіраваны і непасрэдна на дзісенскія ўладанні і Дзісну. У гэтай сувязі ў Хроніцы Германа Вартберга ўпамінаецца Новы замак рускіх. «... У 1373 г. князь Андрэй Полацкі быў з дружынай перад Дзінабургам, дзе захапіў людзей з конямі і павёў іх з сабой. У адказ на гэта ў 1374 г. дзінабургскі камандор быў са сваімі людзьмі ў Расіі, перад Новым замкам, дзе на замкавым мосце забілі трох рускіх...» У 1377 г. магістр павёў вялікае войска ўверх па Дзвіне, ля Новага замка паставілі чатыры асадныя машыны, а таксама гукі, але ўмацаванні ўзяць не змаглі.

Дакладнае месцазнаходжанне замка не ўстаноўлена, хоць гэта магла быць і Дзісна.

Спыненне крыжацкай экспансіі, расшырэнне міжнароднага гандлю, у першую чаргу па Дзвіне, садзейнічала развіццю сельскай гаспадаркі, рамёстваў і промыслаў у нашых мясцінах, павелічэнню колькасці і расшырэнню населеных пунктаў. Першае пісьмовае ўпамінанне пра Дзісну адносіцца да 1461 г. «Літоўская метрыка» пісала: «... А судзіў сам кароль у Дзіснах». А. П. Сапуноў паведамляе, што князь Скіргайла аддае прыпісаную да Полацкага ваяводства Дзісну нейкаму пану Стэфану Дзяку, якога адначасова вызваляе ад кунічнай, бабровай, хмялёвай і іншых павіннасцей. Гэтую прывілею пацвердзіў кароль Аляксандр Казіміравіч на той падставе, што ўладальнікі маетнасці «па старажытнаму звычаю продкаў сваіх выконваюць конную ваенную службу ў поўным узбраенні».

У пачатку XVI ст. уладальнікамі вотчыны з'яўляюцца полацкія баяры Матфей і Мікіта Шпырковічы, Сцяпан і Сапрон Дарошкавічы, Філімон і Алесян Фефяловічы. Таму не выпадкова да нашых часоў захавалася назва прыгарада Дзісны, а раней маёнтка — Дарожкавічы.

У 1500 г. Дзісна стала цэнтрам павета ў складзе Полацкага ваяводства Вялікага княства Літоўскага.

Першая дакументальная звестка аб Навалацы, сядзібе князёў Нагішкаў, адносіцца да 1468 г. У 1514 г. тут пабудавана праваслаўная царква. З 1693 да 1939 г. сядзіба належала Клодтам (Клотам), якія ўдзельнічалі ў паўстаннях 1831 і 1863 гг. Прадстаўнікі гэтай сям'і загінулі на катарзе ў Сібіры, змагаліся разам з камунарамі на барыкадах Парыжа.

У 1498 г. «Івашку Сапежычу нададзена маетнасць Пагост у павеце Браслаўскім».

Яшчэ Леў Сапега — канцлер Вялікага княства Літоўскага, Станіслаў Буцін-

Леў Сапега

скі — каштaлян смаленскі, Францішак Юндзіл — гродзенскі падкаморый валодалі Новым Пагостам. Менавіта на сродкі Льва Сапегі тут пабудаваны ў 1593 г. касцёл Святой Тройцы. У 1775 г. парафіяне сваімі сіламі ўзводзяць у вёсцы царкву Святога Мікалая. Існаваў тут нават малітоўны дом кальвіністаў, які, аднак, не пакінуў пасля сябе ні слядоў, ні прыхільнікаў.

З XVI ст. па пісьмовых крыніцах становяцца вядомымі вёскі Чэрасы, Язна, Наўгароды, Курылавічы, Юндзялова, Іст, Дзедзіна і інш.

Сярод дакументаў фонду Радзівілаў, што захоўваюцца цяпер у Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве, знаходзіцца копія пацвярджэння Жыгімонта Старога ад 13 студзеня 1517 г., выдадзенага ў Вільні, абмену зямельных маёнткаў паміж Гетаўтам Каленіковічам і падляскім ваяводам Іванам Сямёнавічам Сапегам. У выніку яе Сапега атрымаў двары Орца і Міёры, якія былі выслужаны Гетаўтам у каралевы Алены. Гэта першае пісьмовае ўпамінанне нашага раённага цэнтра як населенага пункта.

«Пожаловать именейцо» было звычайнай справай у Вялікім княстве Літоўскім, зямля ў якім належала ў прыватным парадку шляхце. Буйных спадчынных уладальнікаў маёнткаў з XV ст. сталі называць панамі. Велікакняжацкія землі перадаваліся шляхце ў часовае карыстанне за службу — «жалаваліся». У некаторых выпадках пажалаваныя маёнткі пераходзілі ў спадчынныя. Чацвёртая частка даходу з іх належала дзяржаўнай казне.

Шляхта дабілася з часам прывілею на бязмытны вываз за мяжу драўніны і вырабаў з яе, зерня, жывёлы, што садзейнічала развіццю фальваркаў.

Асновай сельскагаспадарчай вытворчасці і падаткаабкладання з'яўляліся «дымы» — 1—2 дамы адной сям'і, якая сумесна карысталася прыладамі працы, жывёлай і перададзенай па спадчыне зямлёй. Сялянства падзялялася на вольных «пахожых» і «непахожых» людзей, якія не мелі права пераходу да іншага пана, і зусім беззямельную чэлядзь, што абслугоўвала панскія двары. Па характары павіннасцей сяляне падзяляліся на цяглых, асадных, агародных і парабкаў. Узаемаадносіны сялян і феадалаў, шляхты грунтаваліся не толькі на заканадаўчых актах, але і звычаёвых нормах.

«Рэвізія Полацкага ваяводства» за 1552 г. сцвярджае, што пану Дзмітрыю Корсаку належаў маёнтак айчызны двор Язна. «Того двора бояре, напервей Фёдор Пинчук маеть людей своих дымов 6, а огородников 2; Богдан Иванович маеть дымов своих 4, а огородников 2;

Олексей Васильевич мает дымов 2 людей своих, а огородников 2; с тых им со всякого збожа четвертая доля приходить, а на работу им на год по 12 толок ходять, то есть с клячами 8, а пеше 4, а с огородников серебщины, по чему на них положать. Бояре же того двора Язненского, которые людей своих не мають, тых бояр дымов 6, службы и плату за них нет, кроме, где треба, з листы едити».

На граніцах Вялікага княства Літоўскага рэдка было спакойна. Попісы літоўскага войска сведчаць, што ў шматлікіх паходах у чужыя землі, у абароне рубяжоў дзяржавы, у амаль няспынных войнах удзельнічалі дзісенскія ратнікі. Аднак пасля набегаў крыжакоў тут амаль паўтара стагоддзя было адносна спакойна. Сапраўднай трагедыяй стала Лівонская вайна (1558—1583), калі «вялікі князь маскоўскі заваяваў горад і замак Полацкі», а рускія войскі занялі Дзісенскую, Празароцкую, Глыбоцкую і іншыя воласці. На 50 вёрст вакол Полацка ўтварылася пустыня.

Полацкія «пісцовыя кнігі» неаднаразова ўпаміналі «Капец-гарадок пры ўпадзенні р. Дзісны», «вёску Капцоны на левым беразе Дзвіны», «сяло Дзесна (7 двароў) на левым беразе р. Дзісны, насупраць сяла стаіць гарадок Капец».

На новым месцы горад рос хутка. Праз тры гады пасля адраджэння ён атрымаў права бяспошліннага гандлю, а яшчэ праз год кароль Сігізмунд Аўгуст даў яму некаторыя льготы і герб — «тры вежы з муру». Па просьбе гараджан Дзісна неўзабаве атрымала магдэбургскае права і новы герб — лодку, сімвал гандлёвых сувязяў.

Кароль Сігізмунд Аўгуст дараваў за асаблівыя заслугі 25 лютага 1571 г. магдэбургскае права в. Перабродцзе, якая горадам так і не стала.

Для арганізацыі самакіравання агульны сход мяшчан горада выбіраў разам з войтам па чатыры кандыдаты на пасады лентвойта (намесніка войта), бурмістраў і радцаў. А ўжо з гэтых кандыдатаў войт зацвярджаў на адпаведныя пасады патрэбных яму людзей. З запісаў у магістрацкіх кнігах бачна, што «бацькамі горада», як правіла, станавіліся купцы і цэхмістры. Іх называлі ў дакументах «панамі», «учцівымі» ці «славетнымі».

Войты не абцяжарвалі сябе выкананнем штодзённых абавязкаў, даручаючы іх намесніку — лентвойту. Гарадская рада ўсе пытанні самакіравання вырашала на сумесным пасяджэнні, аб чым сведчаць першыя словы запісаў гарадской магістрацкай кнігі: «Перад намі, бурмістрамі, радцамі і лаўнікамі места Дзісенскага».

Гарадскія вярхі, захапіўшы пасады ў радзе, перш за ўсё клапаціліся аб сваіх інтарэсах. Адвольныя паборы, утойванне падаткаў і крадзяжы з гарадской касы прыводзілі гараджан у адчай. У 1644 г. яны звярнуліся са скаргай да караля «з плачам вялікім... ад самага старэйшага да малодшага ў невыносных і цяжкіх крыўдах на паноў бурмістраў, радцаў, лаўнікаў. Яны ні ў ва што перавярнулі ўсе прывілеі, дадзеныя гораду, згубілі пячатку, накладваюць незаконныя паборы, прысвоілі гарадскія пляцы, сваім гвалтам яны адпіхваюць прыезджых ад пасялення ў горадзе, ворыўныя землі прысвоілі сабе ваўчыным правам, не выконваюць сваіх абавязкаў, незаконна спагналі з рамеснікаў данатыву, якую павінны плаціць толькі багатыя купцы, не робяць справаздачу ў зробленых расходах, самавольна без згоды пасольства зацвярджаюць паборы».

Але рашэнні каралеўскага суда ў такіх выпадках нічога не мянялі. А горад дзесяцігоддзямі быў даўжніком багатых крэдытораў, асабліва духавенства.

А. П. Сапуноў прыводзіць апісанне Дзісны, зробленае ў канцы XVI ст.: «Дзісна — вялікі замак, акружаны моцным і несакрушальным валам, вельмі ўмацаваны ваеннымі снарадамі, прытым вельмі дарэчы абмываецца Дзісною і Дзвіною. Горад, які знаходзіцца паміж

тымі ж рэкамі, умацаваны валам, вастраколам і бальверкамі».

З Дзісной, як сцвярджае Л. У. Дучыц, у літаратуры звязаны тры ўпамінанні Старога замка. У інвентары горада 1667 г. называецца месца Капавішча, дзе быў замак паміж рэкамі Дзвіной і Дзісной. Другі замак пад назвай Стары ўпамінаецца на левым, а трэці — на правым беразе Заходняй Дзвіны. Месцы двух апошніх замкаў не выяўлены.

У Верхнім замку (відаць, яно і называлася Капцом ці Капавішчам) было дзевяць «брам». У сярэдзіне XVII ст. у яго на ўзбраенні было 14 медных і 13 жалезных гармат, 30 гакаўніц. У ім былі «дзве вулачкі і рыначак». Адна з іх ішла ад рынку да «пушкарні», а другая вяла прама да сярэдняй вежы. Паміж валамі на пляцоўцы знаходзілася «сажалка».

Сам горад таксама меў умацаванні: вал і драўляную сцяну — «паркан» — з такімі ж вежамі. Але і яны абаранялі толькі частку вуліц, прыкладна да сучасных пажарнай і маста. Астатняе было «за парканам».

Землі ў горадзе належалі не толькі феадалам, але і гараджанам. Невялікія ўчасткі — юрыдзікі — засяляліся рамеснікамі і гандлёвым людам. Імкнучыся прыцягнуць новых жыхароў, горад іншы раз прымаў нават уцекачоў — прыгонных, з-за чаго ў пачатку XVII ст. прыцягваўся да суда вялікім князем.

Уласнасць гараджан на зямельныя пляцы была абмежаванай. Прадаваць, перадаваць ці дарыць іх можна было толькі з ведама войта. Войт мог нават адабраць пляц, калі яго ўладальнік не выконваў правілы забудовы і розныя гарадскія абавязкі. Участкі, якімі валодалі рэлігійныя ўстановы, вызваляліся ад падаткаў.

У Дзісне атрымаў інвестытуру на княжанне герцаг курляндскі Готард Кетлер. Вось як аб гэтым пісаў А. П. Сапуноў: «На поле в лагере раскинули королевские палатки, в одной из

Стэфан Баторы

них поместили не очень красивый трон, так как дело было в дороге, к трону приделали три ступеньки, покрытые красным сукном, потом ввели герцога в лагерь. Он имел с собой около 50 чел. конницы. Прежде всего поехали с ним в приготовленную для него палатку, затем повели его в королевский шатер, где уже заседал король с радою. Явившись туда, герцог стал на колени и произнес присягу. Король, ответив, вручил ему знамя, затем герцог сел возле короля. В этом же лагере король принимал его, а после обеда поехал в замок».

Вялікую цікавасць да Дзісны праяўляў польскі кароль Стэфан Баторы. У час полацкага паходу ў 1579 г. ён прыпыніўся тут лагерам і зрабіў агляд войскам, якія потым рушылі ў паход праз Дзвіну па мосце на лодках.

19 верасня, вяртаючыся з-пад Полацка, Баторы пакінуў у Дзісне гарматы. Наш горад кароль наведаў таксама ў ліпені 1581 г.

Стэфан Баторы імкнуўся ператварыць Дзісну не толькі ў крэпасць, але і аплот каталіцызму. З гэтай мэтай ён заснаваў у горадзе касцёл, хоць каталікаў сярод яго жыхароў амаль не было. І калі ў 1632 г. статут цэха краўцоў проста адпускаў частку брацкіх узносаў на свечкі, то праз 60 гадоў прыпіска на палях ужо рэгламентуе: $^{2}/_{3}$ — для царквы і астатняе — для касцёла.

Умацаванне каталіцызму і уніяцтва суправаджалася грубым насіллем. Напрыклад, калі ў 1728 г. згарэла Узнясенская праваслаўная царква, то «намеснік» — камандзір размешчанай у горадзе «харугві» (вайсковага падраздзялення, з некалькіх харугваў складаўся полк) загадаў страляць у жыхароў, якія збіраліся аднаўляць храм. А ў 1751 г. падкаморска-камісарскі суд вынес дэкрэт аб выбарах у магістрат палавіны ратманаў з католікаў, хоць большасць гараджан былі праваслаўныя. Праўда, у 1767 г. адбылося ўраўненне ў правах некатолікаў і католікаў. Аднак гэта датычыла толькі шляхты, якая складала ўсяго каля 8 працэнтаў насельніцтва, але тым не менш вызначала знешнюю і ўнутраную палітыку Вялікага княства Літоўскага.

Аналагічныя падзеі адбываліся і ў Міёрах. Так, 25 мая 1644 г. Севасціян Святаполк-Мірскі заснаваў тут праваслаўны манастыр і царкву, падараваўшы ім значныя зямельныя ўгоддзі. Аднак 20 снежня 1690 г. яны былі абраваны, а царква ператворана ў касцёл. У мемарыяле Пятра I польскаму каралю Аўгусту II у 1720 г. аб гэтым сказана: «Пред 25 годами прописной к оршанскому Кутеинскому монастырю Миорский монастырь насильно в унию от тамошней околичной шляхты и ксендзов отняты и на плебанию им отдан, а монахи греческого исповедания из онаго тогда ж выбиты вон».

Вось як гэта адбывалася. А. П. Сапуноў паведамляе аб тым, што «ў 1640 годзе Крыштоф і Алена Рылы прадалі Міёры вядомаму ў свой час паборніку праваслаўя Севасціяну Святаполк-Мірскаму, суддзі земскаму браслаўскаму, які, між іншым, прымаў удзел у аднаўленні манастыроў віцебскага Маркаўскага і полацкага Богаяўленскага». Новы ўладальнік заснаваў у сваім маёнтку праваслаўны манастыр, ахвяраваўшы для яго маёнтак Ляшчылавічы з пажаданнем стварыць школу для дзяцей.

Фундушны запіс Севасціяна Мірскага ад 25 мая 1644 г. быў парушаны ўжо яго сынам. Скарга ігумена айца Іова Малочкі ад 2 студзеня 1691 г. сведчыла: «Протестовали и занесли слезную жалобу препод. о. Иов Молочко, игумен Кутеинского и Миорского монастырей, и все иноки древней веры на его милость пана Михаила Мирского, мечного браславского, и на высокопреподобие его милость ксендза Стефана Домбковского, каноника инфляндского, плебана друйского, бывших в одном заговоре и соумышлении, о том, что оба они ... с немалою толпою людей, вооруженных разным боевым оружием, в том числе заряженными ружьями и пистолетами, 20 декабря 1690 года внезапно напали сперва на монастырь в м. Миоры Браславского повета, в котором совершили разные насилия и бесчинства, а именно: всех монахов и прислугу перевязали, били и ругали, а затем почти нагих прогнали из монастыря; разломав двери в церкви и ворвавшись туда, совершенно ее разграбили, захватили в свои руки золото, серебро и все пожертвования и дары благочестивых людей, в том числе и пожертвования Севастиана Мирского, церковную утварь, даже колокола с колокольни поснимали... Тела усопших православных, покоившихся в склепе, повыкидывали на поругание, а церковь обратили в римский костел».

Такая рэлігійная пераарыентацыя нават у адной сям'і — даволі частая з'ява. Дзеля шляхецкіх прывілеяў моладзь ахвяравала запаветамі і верай бацькоў. Між тым, па сведчанні езуіта Растоўскага, «... ва ўсёй Полацкай воласці ў канцы XVI ст. лічылася не больш дзесяці шляхціцаў, выбраўшых каталіцызм».

У абарону малавядомага манастыра ў Міёрах выступае Пётр I. Ці можна гэта лічыць выпадковасцю? Несумненна, былі тут палітычныя матывы, бо рускія цары заўсёды выстаўлялі сябе абаронцамі праваслаўя за межамі сваёй дзяржавы. Але Пётр Аляксеевіч мог

чуць пра Міёры ад Самуіла Емяльянавіча Пятроўскага-Сітніяновіча, больш вядомага як Сімяон Полацкі, выдатнага рускага грамадскага і царкоўнага дзеяча, пісьменніка і перакладчыка, які нарадзіўся на Полаччыне. Прыехаўшы ў Маскву ў 1664 г., ён стаў настаўнікам дзяцей цара Аляксея Міхайлавіча. Жыццё адмерала яму на выкананне гэтага абавязку, на рэлігійную дзейнасць (ён быў уніятам) і літаратурную творчасць шаснаццаць гадоў. Царэвіч Пётр асвойваў грамату па падручніку, спецыяльна напісанаму для яго Сімяонам Полацкім.

С. Е. Пятроўскі-Сітніяновіч аб роднай зямлі ніколі не забываў. У сваім духоўным тэстаменце ён ахвяраваў значныя сумы некалькім беларускім манастырам, у тым ліку Міёрскаму і Дзісенскаму.

Трэба сказаць, што Сімяон Полацкі лічыўся даволі багатым чалавекам, валодаў маёмасцю ў шэсцьсот рублёў золатам і семсот — срэбрам. Яна і стала апошняй данінай далёкай радзіме і пасільнай дапамогай аднадумцам.

А ўвогуле розныя веравызнанні ў нашых мясцінах суседнічалі на працягу стагоддзяў, на словах прапаведуючы высокую мараль, а на справе апраўдваючы кроў і гвалт. Рэальнасцю жыцця былі гвалтоўнае акаталічванне і каталіцкая агрэсія, нацыянальна-рэлігійны ўціск. Каталіцкая царква, напрыклад, умацоўваючы сваё эканамічнае становішча, выступала нават у ролі ранцье. Так, ротмістр Полацкага ваяводства Аляксандр Буйніцкі, маючы вострую патрэбу ў грошах, пазычыў у 1761 г. у дзісенскага ксяндза Анзельма Пагабуда 2000 тынфаў (тынф — 1 злот 8 грошаў) пад залог маёнтка Нача. Да вяртання сумы францысканцы атрымалі права эксплуатаваць маёнтак і прыгонных па свайму разуменню.

У пастаянных даўжніках у духоўных феадалаў знаходзілася Дзісна. У 1681 г. на патрэбы горада ў кіраўніка францысканскага манастыра Кірылы Кажухоўскага было пазычана 500 злотых і некалькі гадоў выплачваліся працэнты. У 1709 г. дзісенскі бурмістр Ян Какановіч пазычыў 500 злотых у францысканцаў, столькі ж у чарнцоў і 220 злотых у Крыжаноснага брацтва. Неўзабаве Какановіч памёр, не разлічыўшыся з даўгамі, і крэдыторы прадалі яго дом.

Польскі даследчык О. Гедэман адзначаў, што ў Дзісне пры ўсіх культавых установах існавалі брацтвы, звязаныя з культам дзевы Марыі. Яны з выключнай настойлівасцю распаўсюджвалі яго сярод жанчын. Для стварэння абстаноўкі фанатызму выкарыстоўваліся таксама «ведаўскія» працэсы — суды над «вядзьмаркамі», якія суправаджаліся катаваннямі. Найбольш вядомымі з'яўляюцца абвінавачванні мяшчанак Кунцэвіч «у чарадзействе» (у 1678 г. настаяцель францысканскага манастыра ў Дзісне «па некаторых доказах і чутках падазрае яе ў чарадзействе») і Метлінай «у злым спосабе чарадзейства», двойчы падвергнутай у 1763 г. выпрабаванням вадой.

Для акаталічвання насельніцтва выкарыстоўвалася школа. Праўда, у Дзісне ў 1775 г. з-за беднасці яе наведвалі не больш чым 10 вучняў.

У скарзе насельніцтва Беларусі і Украіны сейму Рэчы Паспалітай у 1623 г. паведамлялася: «... Мы вельмі зняважаны і прыгнечаны, і з кожным днём тым больш, чым мацней зацягваюць пятлю рабства на нашай шыі нашы адступнікі, якім мы нібыта наўмысна аддадзены на свавольства і здзекі...

На Белай Русі — гэта Полацк, Віцебск, Мсціслаўль, Орша, Магілёў, Дзісна і г. д. У большасці з гэтых гарадоў людзі старога грэчаскага веравызнання... адлучаны ад гарадскіх ратушных пасад, выключаны з рамесных цэхаў, пазбаўлены цэркваў... Прытым яны церпяць невыносныя пакуты, іх садзяць у турмы, падвяргаюць выгнанню, накладваюць арышт на іх маёмасць

і прыдумваюць усялякія, які толькі могуць быць, непрыемнасці, здзекі, знявагі, паклёп...»

Хрэстаматыйным стаў прыклад аб прыбыцці ў Маскву ў 1651 г. ігумена дзісенскага Уваскрэсенскага манастыра Афінагена Крыжаноўскага, які аб'явіў сябе паслом насельніцтва Полацкай зямлі. Яго «послали ко государю ис Полоцка все белорусцы... и велели ему бити челом государю, чтобы он их белорусцев принял в свою государеву оборону».

Шукалі паратунку і не так далёка. 20 студзеня 1632 г. у кнізе Браслаўскага земскага суда з'явіўся запіс аб вяртанні трокскім ваяводам Я. Тышкевічам князю М. Гедройцу сялян, якія ўцяклі з маёнтка Галамыскае. Уцяклі яны недалёка, жылі «в Селищах, называемом и Переброде». Тры сям'і «в року 1623 месяца октебра, з дня осмнадцатого на день деветнадцатым, в ночи, з села Язницы, до тое маетности Голомыское прыслухаючого, проч пошли и потекали».

Толькі гэты дакумент называе дзевяць уцекачоў з сем'ямі. Дзмітр Іванавіч Аўсюковіч з жонкай, сынамі Арцёмам і Янам з в. Дзедзіна яшчэ забралі з сабой па двое коней, кароў і цялушак, шэсць авечак, пяць свіней, тры бочкі жыта і столькі ж аўса, па паўтары — ячменю і гароху, дзве — грэчкі.

Сялянства цярпела не толькі ад прыгону. Здараліся таксама незаконныя паборы, што рабілі вайскоўцы. У кнізе Браслаўскага земскага суда, напрыклад, захаваўся запіс ад 2 кастрычніка 1610 г. аб гвалтоўным зборы «стацыі» салдатамі роты пана Я. Фэрэндзберка без універсала гетмана Вялікага княства Літоўскага Яна Караля Хадкевіча. Пад камандаю «немца» Яна Шадоўскага «немцы рознай нацыі» — «інфлянчыкі, курлянчыкі, шведы, лотва» стацыі (паборaў) выбралі «ліктумінамі (натурай), яко і гатовымі грошмі за перац, за шафран, за гаршкі, за свечкі, за оцат, за соль, за хмель... звёзшы на адно месца пяцьсот коп грошай літоўскіх, не рахуючы падаркаў і выжывеня...»

Пасля гэтага ў трэці раз Ян Шадоўскі разаслаў па вёсках сваіх «пахолікаў». А тыя з трэцяга войтаўства ўзялі гатовымі грашыма «напярод»... «в селе Борках з волок двух — золотых двенадцать... в селе Игнатовичах с трох чвертей волоки — золотых чотыры и грошеи дванадцать, в селе Нивю з волок чотырох — золотых двадцать чотыры, в селе Переброде с волок полпети — золотых двадцать сем... в селе Говцах з волок полчварты — золотых двадцат один, в селе Забору з волоки одное — золотых шесть... в селе Мелеиках с трох вертеи — золотых пять, в селе Хоробровом с полволоки — золотых три, в селе Красном з волок двух — золотых двенадцать...

А особливе розными ликгуминами пабрали: в селе Переброде гусь одну, масла гривенку, куров десет».

Такі гвалт адбываўся насуперак патрабаванням вядомага зборніка законаўчых актаў Статута Вялікага княства Літоўскага, прынятага ў 1588 г.

У сваю чаргу Дзісна прымала чужых уцекачоў. Менавіта тут у «смутны час» кароль Жыгімонт III прымаў у сваё падданства 230 маскоўскіх баяр (1611). Сюды дакацілася хваля масавых уцёкаў стараверaў у XVIII ст., калі адзін народ шукаў і знаходзіў прытулак у другога.

Відаць, не выпадкова ў час руска-польскай вайны 1654—1667 гг. дзісенцы добраахвотна здалі свой горад, калі ў 1654 г. Мацвей Шарамецеў і Сямён Страшнёў «с государевыми ратными людьми пришли под острожек Десну июля в 25 день и того острожку мещане и всякие житейские люди государю добили челом и веру дали». Гэта стала праяўленнем антыфеадальнай барацьбы. Летам 1654 г. урад Рэчы Паспалітай вельмі баяўся народнага паўстання. Польска-літоўскія кіруючыя колы адзначалі, што «на мужиков худая надежда, их пуще надобно опасаться», «мужики вельми недоброхоты», «бунту-

ются, панов своих не слушают и вывозячимся из домов своих подвод не дают», всюду сдаются русским, «больше злого, нежели самая Москва чинят».

Праўда, С. М. Салаўёў паведамляе, што «далі ведаць» цару аб здачы Дзісны і Друі 24 ліпеня. Пры гэтым ён спасылаецца на данясенні каралю яго ваявод, што поспеху царскіх войск садзейнічала тое, што Масква цяпер ваявала «па новаму ўзору»: займала землі літасцю і ўсім, хто прысягаў цару на вернасць, плаціла «жалованье». Нават тых, хто не хацеў здавацца, адпускалі.

За трынаццаць гадоў 2-й паловы XVII ст. наш край неаднаразова станавіўся арэнай проціборства рускіх і польска-літоўскіх войск. І заўсёды ад ваенных дзеянняў цярпелі ў першую чаргу безабаронныя вёскі. Войскі абодвух дзяржаў папаўнялі харчовыя запасы за кошт мясцовага насельніцтва, ды яшчэ імкнуліся панішчыць тое, што заставалася ў людзей, каб ім не мог пажывіцца праціўнік. Пацвярджэннем таму служыць данясенне ў Маскву царскіх ваявод з Полацка ў лютым 1655 г.: «А к Дисне, Государь, и в Полоцкий уезд литовские люди приходят беспрестанно, и Полоцкий и Дисненский уезды воюют и всякие хлебные запасы и сена возят, и крестьян мучают, и жгут, и в полон емлют и деревни разоряют».

У іншых маскоўскіх крыніцах адзначалася, што ў 1655 г. паны неаднаразова спрабавалі напасці на рускі гарнізон у Дзісне, хоць гэта ім вынікаў не прынесла. А ў тым жа годзе з'явіліся ў Друі і яе наваколлі новыя заваёўнікі — шведы.

Яшчэ праз год, летам 1656 г., у час паходу «цішэйшага цара» Аляксея Міхайлавіча «пад Рыгу», «...пришел государь к городу Дисна и стали по сю сторону Двины в шатрах; 17 июля пошел государь из Дисны к Друе». Маскоўскае войска пачало рабаваць мясцовае насельніцтва і паліць вёскі нікольк не горш за шведаў, ведаючы, што гэтае «самавольства» начальства вайсковае ні з Полацка, ні з Масквы не спыніць.

Вось таму «веры» той, што далі цару дзісенцы, ім хапіла толькі на пяць гадоў, пасля чаго рускі гарнізон быў выразаны.

У адным польскім дакуменце гаворыцца, што «мяшчане склалі змову, выразалі непрыяцельскі (рускі) гарнізон, а бурмістра свайго павесілі на замкавай браме». І тое ў нейкай меры пацвярджаецца амністыяй, дадзенай каралём Янам Казімірам жыхарам Дзісны ў 1661 г. «Так як горад Дзісна, — гаворыцца ў «Волюміне легум», — явіла доказ вернасці сваёй, калі, выкінуўшы ад сябе маскоўскі гарнізон, вярнулася да нас і Рэчы Паспалітай уся, разам з крапаснымі людзьмі, то пагэтаму, па міласці нашай і са згоды ўсіх саслоўяў, даруем тутэйшым мяшчанам амністыю». Больш таго, прымаючы пад увагу спусташэнне і галечу гэтага горада, сейм вызваліў яго ад падаткаў тэрмінам на чатыры гады і пацвердзіў усе ранейшыя прывілеі, у тым ліку магдэбургскае права.

Нейкі час Дзісна заставалася сведкай жорсткай барацьбы палякаў і рускіх. У дзённіку сучасніка Адляніцкага Пачэбута адзначана, што 5 жніўня 1661 г. польскае войска рушыла ад Друі да Дзісны, бо гэта зрабіў таксама Хаванскі, што разбіў пана Адахоўскага. А 10 жніўня іх радасна сустрэла ўрачыстай пальбой гармат пад Дзісной дывізія пана Сапегі пад начальствам пана Юдзіцкага, атрымаўшая вялікае падмацаванне.

З маскоўскіх крыніц вядома, што ў лютым 1661 г. пад Друяй на Заходняй Дзвіне ваявода Хаванскі разграміў атрад палкоўніка Лісоўскага, аднак скарыстаць поспех не змог. Палякі, як сведчыць А. Пачэбут, хоць марудна, але значнымі сіламі рухаліся да Полацка.

Разбіты недзе ў нашых мясцінах палкоўнік Лісоўскі палічыў за лепшае перайсці на службу да маскоўскага цара з рэшткамі свайго войска і заняўся рабаўніцтвам мясцовага насельніцтва. Ды

яшчэ больш шчыра за маскавітаў. Калі ж С. Чарнецкі і П. Сапега атрымалі перамогу над рускімі войскамі, палкоўнік Лісоўскі зноў перакінуўся да паляка ў, а на папрокі адказваў коратка: «На тое была вайна».

Пасля бітвы пад Кушлікамі, дзе рускія войскі Хаванскага і Нашчокіна былі разбіты, кароль Ян Казімір «...паехаў на начлег у Дзісну; там з цяжкасцю знайшлі толькі тры пастаялыя двары, свабодныя для размяшчэння яснавяльможнага караля, па той прычыне, што ўсе пастаялыя двары былі перапоўнены параненымі і пакалечанымі ваеннымі рознага чыну людзьмі. Убачыўшы іх кароль гучна заплакаў...» Так, перамогі аплачваліся вялікай крывёй. І не толькі крывёй. Дашчэнту руйнаваліся крэпасці і даволі буйныя населеныя пункты, напрыклад Вята.

У 1516 г. Іван Сапега атрымаў прывілей ад караля Жыгімонта на пабудову ў Вяце фартэцыі, закладку тут горада, крамаў і торга. У сярэдзіне стагоддзя Вятай валодалі беглыя рускія князі Пронскія, затым Сіняўскія. Умацаваны замак пастаянна адзначаўся на картах XVI—XVII стст. Памежнае становішча замка і мястэчка не садзейнічала іх мірнаму існаванню. У сярэдзіне XVII ст. яны былі разбураны ў ходзе вайны Расіі з Рэччу Паспалітай.

З адступленнем маскавітаў пацягнуліся на ўсход абозы «палону» для папаўнення родавых маёнткаў рускіх феадалаў. Выхадцы з Беларусі вызваляліся на пэўны тэрмін ад усіх павіннасцей і атрымлівалі грашовую дапамогу. Але так шанцавала не ўсім. Хто адмаўляўся ад царскай службы — сядзеў у кайданах у турме і нават мог застацца без галавы. Відаць, не выпадкова гісторык С. М. Салаўёў спасылаецца на літоўца Міхалона, які вярнуўся з Крыма. Той сведчыў: «...Один еврей, меняла, видя беспрестанно бесчисленное множество привозимых в Тавриду пленников наших, спрашивал у нас, остаются ли еще люди в наших странах или



Царква ў Дзісне. XVI ст. (з кнігі А. Сапунова)

нет и откуда такое их множество?»

Вайна пакінула страшэнныя сляды разбурэння ў Друі і ў Дзісне, спаленыя вёскі, пустэчу. Сярод асабліва пацярпеўшых беларускіх паветаў называюцца Полацкі і Браслаўскі, у склад якіх уваходзілі землі цяперашняй Міёршчыны. На Браслаўшчыне было знішчана 53,4 % жылля, на Полаччыне — 70,1 %, насельніцтва вынішчана адпаведна 56,3 і 72 %.

Дзісна пасля гэтага была вызвалена ад падаткаў на чатыры гады.

Не аднойчы праходзілі па нашым краі рускія, польскія і шведскія войскі, казацкія атрады пад час Паўночнай вайны (1700—1721). Ваенныя дзеянні пакінулі ў Дзісне вялікія разбурэнні, папялішчы, незасеяныя палі, развал эканомікі і гандлю, масавыя эпідэміі. Ад

чумы ў 1710 г. «немало умерло населения», а таму горад аказаўся «в людях и всяком состоянии разрушен и торговли в нем не стало». Усё гэта дасягнула такіх маштабаў, што нават у 1736 г. у інструкцыі, дадзенай сеймікам Полацкага ваяводства дэпутатам на сейм, указвалася, што «дисненский город его королевской милости со староством издавна разоренный... только само имя в нем осталось, люди все разошлись». Адзін з сучаснікаў ва ўспамінах, што адносяцца да другой чвэрці XVIII ст., пацвердзіўшы скарачэнне насельніцтва Дзісны, удакладніў, што яе жыхароў часцей можна было сустрэць у Курляндыі, Рызе, гарадах Расійскай імперыі.

Толькі ў 2-й палове XVIII ст. пачынаецца эканамічнае ажыўленне на Дзісеншчыне. Далейшае развіццё атрымала фальваркавая сістэма гаспадарання, расшыраюцца пасяўныя плошчы, ураджайнасць збожжавых дасягае сам-4 і больш. Буйныя фальваркавыя гаспадаркі вырабляюць прадукцыю пераважна на продаж, у тым ліку на экспарт. Захаваліся звесткі пра маёнтак Станіслава Радзівіла ў Чэрасах за 1778 г., які складаўся з двух фальваркаў. Яго грашовыя паступленні дасягнулі 46 046 злотых, у тым ліку ад рэалізацыі прадукцыі на знешнім рынку 25 642 злотыя — 56 %, на унутраным — 5400 злотых, ці толькі 12 %, астатняе (15 004 злотыя — 32 %) — гэта водкупы, чынш і інш.

На продаж паступала драўніна і прадукты яе перапрацоўкі (11 976 злотых — 44,5 %), жыта (8333 злотыя — 31 %), ільнасемя (5040 злотых — 18,7 %), пакля (1560 злотых — 5,8 %).

Асноўныя даходы ад сельскай гаспадаркі забяспечвала прадукцыя палявых культур (5253 злотыя — 74,3 %), сенакосы (1669 злотых — 23,6 %), агарод і сад (150 злотых — 2,1 %).

У гэты час у Чэрасах дзейнічала невялікая буда на 4 катлы па перапрацоўцы попелу ў паташ, дзе працавалі 5 чалавек (4,5 тыс. злотых гадавога даходу ад экспарту паташу ў Кралявец), чатыры вінакурні і два млыны. У маёнтку былі 303 двары, аднак у гас-



Сядзіба Лапацінскіх у в. Лявонпаль (з кнігі А. Сапунова)

Ян Нікодэм Лапацінскі, асветнік

Мікалай Лапацінскі, ваявода брэсцкі

падарцы занята 278 «дымоў». Пан трымаў толькі чатырох пастаянных наёмных работнікаў, якія працавалі 300 дзён у год. 236 «цяглых дымоў» адпрацавалі за год 28 184 дні, паншчына складала 119 рабочых дзён у год на гаспадарку («дым»).

Вядома, што ў 1564 г. нейкі Нарбут атрымаў ад уладальніцы Чурылава Масальскай права на «гоны бабровыя на рацэ Друі і ў Чурылавічах на рацэ Волце, або там, дзе яна ўкажа...»

Пісару Вялікага княства Літоўскага Мікалаю Лапацінскаму ў 1750 г. мясцовыя майстры пабудавалі ў вёсцы Лявонпаль прыгожы белы палац. У 1772 г. тут узведзена драўляная уніяцкая царква са званіцай пры ёй. Лапацінскія наладзілі вытворчасць каберцаў, сурвэтаў, абрусаў з так званага друйскага лёну, які высока цаніўся на рынку. Працавалі капялюшная і суконная вытворчасці. Інвентар палаца за 1803 г. паказвае, што мазольная праца падняволеных дазваляла Лапацінскім жыць надзвычай шыкоўна. Яны мелі ў маёнтку чатыры арыгіналы Рубенса, фламандскія нацюрморты, англійскія марыны, узоры антычнага мастацтва, вялізную бібліятэку, друкарню, доследна-навуковыя кабінеты.

Палітыка апалячвання і акаталічвання працягваецца і ў XVIII ст. Да 1797 г. толькі ў павятовым цэнтры з 2100 чалавек насельніцтва большасць гараджан — 1580 — прыняла каталіцтва.

Што ж датычыць прывілеяў шляхты, яны таксама заставаліся недатыкальнымі, хоць супраць іх пастаянна выступала сялянства і гарадскія нізы. Адно з такіх выступленняў адбылося летам 1793 г. на Дзісеншчыне.

На ўскрайку Лявонпаля стаіць помнік — высокая калона на чатырохвугольным пастаменце. Ён установлены мясцовай шляхтай у 1792 г. на вачах у магутнага праціўніка (адсюль быў добра бачны супрацьлеглы бераг Заходняй Дзвіны, які пасля першага падзелу Польшчы адышоў да Расіі) у гонар Канстытуцыі Рэчы Паспалітай 1791 г., асуджанай у 1793 г. за якабінства Расіяй, Аўстрыяй і Прусіяй пры чарговым, другім падзеле гэтай краіны. А якабінства выяўлялася толькі ў абвяшчэнні канстытуцыйнай манархіі: перадачы заканадаўчых функцый у рукі народных прадстаўнікоў, свабодзе друку, свабодзе сумлення, галоснасці судаводства, адмене прыгону і інш.

У выніку гэтага «найвялікшага злачынства» тэрыторыя сучаснага Міёрскага раёна гвалтам была далучана да Расійскай імперыі. У адказ у красавіку 1794 г. выбухнула паўстанне ў Польшчы і Вялікім княстве Літоўскім пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. У Літве і Беларусі яго справу падхапіў Якуб Ясінскі, інжынерны палкоўнік. Па яго слову апоўначы 22 красавіка цемру Вільні ўзрушылі касцельныя і царкоўныя званы. Праз чатыры дні яны званілі ў многіх беларускіх гарадах, у тым ліку ў Браславе, у нашых мясцінах.

Толькі што мог бараніць са зброяй у руках беларускі селянін? Панскія прывілеі і сваё прыгоннае рабства? Таму мясцовае сялянства ў масавым парадку паўстанне не падтрымала. А шляхта больш клапацілася не пра тое, будзе сталіца ў Варшаве ці Пецярбургу, а каб «хлопы» не атрымалі сапраўдную



Мемарыяльная калона
ў в. Лявонпаль

волю. Вось таму высакародны покліч свабоды, незалежнасці, што ўзняў народ да зброі, так хутка страціў прыцягальнасць для мас.

А супраць паўстаўшых ужо рухаліся палкі Ферзена і Суворава... Сялян разам з зямлёй пачалі раздаваць новым панам.

Белоруссия в эпоху феодализма: У 3 т. Мн., 1961. Т. 3.

Воссоединение Украины с Россией. Мн., 1953. Т. 3.

Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI—XVIII вв. (Социально-экономические исследования городов). Мн., 1975.

Дучыц Л. У. Браслаўскае Паазер'е ў IX—XIV стст. Мн., 1991.

Ермаловіч Мікола. Старажытная Беларусь: Полацкі і Новагародскі перыяды. Мн., 1990.

Записки А. П. Ермолова. 1798—1826. М., 1991.

Игнатенко А. П. Борьба белорусского народа за воссоединение с Россией. Мн., 1974. С. 159.

Историко-статистические очерки Виленской губернии. Вильно, 1852.

История БССР. Мн., 1969.

Каргалов В. В. «Полководцы» XVII в. М., 1990.

Козловский П. Г. Магнатское хозяйство Белоруссии во второй половине XVIII в. Мн., 1974.

Копысский В. Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. Мн., 1975.

Мараш Я. Н. Очерки истории экспансии католической церкви в Белоруссии XVIII века. Мн., 1974.

Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии / Издание А. Сапунова и кн. Друцкого-Любецкого. Витебск, 1896.

Можа Юзаф. Дэмаграфічны склад на Беларусі і Літве ў сярэдзіне XVII стагоддзя // Спадчына. 1991. № 5.

Очерки истории СССР. Период феодализма: XVII в. М., 1955.

Соловьев С. М. Сочинения. Книга II: История России с древнейших времен. Т. 3, 4. М., 1988.

Соловьев С. М. Сочинения. Книга IV: История России с древнейших времен. Т. 7, 8. М., 1989.

Тарасаў Кастусь. Памяць пра легенды. Постаці беларускай мінуўшчыны. Мн., 1990.

Л. А. Матэленак

Дзісна: канфесійнае і грамадска-палітычнае жыццё

Крыж Дзісенскага праваслаўнага брацтва. 1673

В 1563 г. началось заселение левого берега Дисны. В 1568 г. в Дисне было уже «немало церквей», в числе их и Воскресенская церковь. Все дисненские церкви находились в ведении полоцких православных епископов.

С начала XVII в. начинается здесь, как и во всем Западном крае, борьба православных с унией. Дисненцы стойко отстаивали веру отцов, и значительная часть их навсегда осталась православною.

Король Владислав IV в начале своего царствования, в 1632 г., вынужден был возвратить православным некоторые из насильно занятых униатами церквей, для православных дисненцев «назначена одна церковь». 17 марта 1633 г. король послал в Дисну дворянина Росицкого для отобрания от униатов Воскресенской церкви. Униатский митрополит Антоний Селява, преемник Кунцевича, употреблял все усилия для того, чтобы отнять у православных эту церковь. Дисненцы жаловались королю, который писал 11 сентября 1642 г. Селяве, чтобы он не притеснял православных и не запрещал им молиться в Воскресенской церкви. В следующем, 1643 г., 27 апреля, король снова приказывает униатскому митрополиту, чтобы он не притеснял православных дисненцев, то же подтвердил и преемник Владислава, Ян Казимир, 12 января 1650 г.

Вскоре, однако, наступило время, когда многие униатские церкви в Дисне были «здезолеване (опустошены) и зруиноване (разорены), а мещане все склонились к Дизунии», т. е. православию: Дисна, в числе других городов Западного края, была занята войсками царя Алексея Михайловича.

Хотя в 1661 г. Дисна очутилась снова в руках поляков, тем не менее король Ян Казимир 15 июля 1661 г. нашел необходимым подтвердить права православных на Воскресенскую церковь, мало того, он признал за православными и вновь выстроенную ими Спасскую церковь, а также и те церкви, которые они могут себе построить впоследствии. Эту грамоту подтвердили и все преемники Яна Казимира: Ян III 30 января 1679 г., Август II 16 августа 1690 г., Август III 20 июля 1736 г., наконец, Станислав Август в 1766 г.

При церкви Воскресения Христова с 1633 г. был монастырь. Монахи издавна ездили в Ригу «для отправования набожества и для упрошения ялмужны

от их милости панов купцов, з розных земель и мест там комерции свои отправляючих». Но уже в 1686 г. Сильвестр Волчанский, наместник и администратор епископии Белорусской, признал это право только за витебским Марковым и полоцким Богоявленским монастырями, а дисненским монахам запретил бывать «в преславном месте Ризском».

Во время страшного пожара 15 июля 1700 г., когда «Дисна до основания, до одного дома, выгорела», сгорела и Воскресенская церковь, но монастырь, кажется, уцелел, уцелела и трапезная Введенская церковь. В 1718 г. монахи дисненского монастыря в числе других подали императору Петру I жалобу на насилие со стороны католиков и униатов. Благодаря заступничеству императора король Август II 28 ноября 1720 г. издал диплом в защиту православных монастырей Западного края, в том числе и дисненского. Но королевские указы мало значили, и своевольная шляхта делала, что хотела. В 1726 г. архиепископ православный Сильвестр Четвертинский дал грамоту на построение вновь Воскресенской церкви. Но когда в 1728 г. дисненские мещане «своим коштом церковь Воскресения Христова хотели в монастыре построить и лесу уже много на сие приготовили дело, тогда намесник с хоронгвою, там стоящею, пришедши с своими людьми воинскими, стреляя на благочестивых собранных людей и старцев, всех разогнал и церкови строить не допустил». Вскоре, однако, Воскресенская церковь была выстроена. Строителями были дисненские мещане Тимофей и Анна Бородульские. Новый храм находился на том же месте, где стоял и древний. В 1810 г. монастырь был упразднен, и церковь Воскресения передана белому духовенству. Этот замечательный храм был истреблен пожаром в 1882 г. При Воскресенском монастыре существовало с 1679 г. братство.

Кроме храма Воскресения Христова в Дисне были еще следующие церкви: Спасская, построенная ранее 1661 г., так как в привилегии кор. Яна Казимира, 1661 г., о ней говорится как о существующей уже, она находилась между нынешними улицами Александровскою и Пробойною.

В память избавления Государя Императора Александра II от опасности, 4 апреля 1866 г., в Дисне воздвигнута часовня. Часовня эта находится как раз против дисненского костела, на берегу реки Двины, и имеет небольшие размеры (две сажени в длину и ширину). На правой стене от входа, снаружи, следующая надпись: «Господи, спаси царя и услыши ны». На левой стене: «В память события 4 апреля 1866 года. Не прикасайтеся помазаннику моему. Владеть вышний царством человеческим. Он поставляет цари и преставляет». В часовне икона св. благов. князя Александра Невского, перед ней аналой и лампада. Крестный ход к часовне совершается ежегодно 4 апреля.

В привилегии Сигизмунда Августа, 12 января 1569 г., права католиков уравнены с правами православных жителей Дисны: «в городе Дисне из особ магистрата, т. е. из бурмистров, радцев, лавников, половина должна быть закона римского и половина греческого». Но это вовсе не указывает на численность католиков в Дисне: известно, что в это время во всем полоцком крае число католиков было весьма незначительно, между тем в грамоте на магдебургское право в Полоцке, данной кор. Александром 4 октября 1498 г., говорится то же самое. Очевидно, короли старались поддержать возникавший католицизм и вследствие этого давали католикам равные права с православными, несмотря на то, что численность первых была весьма незначительна. Первый костел появился в 1583 г. Он зависел от полоцких иезуитов. Костел был деревянный и помещался как раз при ограде бывшего православного монастыря, с южной его стороны. В 1630 г. земенин воев.

полоцкого Крыштоф Малькевич-Хелковский ввел в Дисну францискан, которые в 1773 г. соорудили каменный костел в честь Непорочного Зачатия, существующий и поныне на самом берегу р. Двины. В 1831 г., во время польского восстания, оба костела были закрыты, в 1842 г. деревянный костел был передан на православную Николаевскую церковь, сгоревшую в 1882 г.: каменный же, бывший францисканский, отдан католикам.

Город, как сказано, управлялся магдебургским правом. Все мещане, без различия вероисповедания, перед судом были совершенно равны. Все жители, поселившиеся как в городе, «в паркане и за парканом», так и на предместьях и «около замку», а именно: подданные князей, панов шляхты и духовенства, все ремесленники, наравне с мещанами, ежегодно вносили на общественные надобности известные денежные сборы, а также «парканы робили, башни будовали» и исполняли всякие городские повинности. Точно так же всякие «податки» и государственные налоги равномерно уплачивали все жители разного звания и состояния, духовные и светские. Все жители ежегодно уплачивали определенную сумму на содержание войска. Дисненские мещане владели своими



План Дзісны. Сярэдзіна XVIII ст.

плацами на правах собственников. Земельную собственность свою они имели право, но только с ведома старосты, дарить и передать другим лицам. Жители возводили постройки на своих плацах, соблюдая надлежащий, установленный порядок; кто же этого не исполнял, от того староста мог отнимать плац и передавать его другому лицу. Все плацы, отведенные под церкви, церковные погосты, монастыри и богадельни, были освобождены от всяких податей. Мещане дисненские владели крепостными людьми.

Дисна некогда была довольно большим и торговым городом. Дисненцы издавна вели торговлю с Ригой, Витебском, Полоцком, Смоленском и другими городами; торговали пенькой, льном, салом, разными шкурами и пр.; у них были свои струги. В Дисне были также склады товаров иногородних купцов. Здесь же была и таможенная застава. Вся торговля до конца XVIII в. была в руках христиан, так как евреи, в силу привилегий, не могли иметь в Дисне никакой оседлости и не могли пользоваться никакими общественными выгодами. «Евреи, проживающие в г. Дисне, — говорится в привилегии Сигизмунда Августа, 11 января 1569 г., — не могут иметь ни своего кагала, ни еврейской школы и не смеют таковую строить; не могут также иметь никакой оседлости, покупать плацы, пользоваться какими-либо общественными выгодами, в ущерб дисненским мещанам, согласно прав, привилегий и давнего обычая, под штрафом тысячи коп (грошей) литовских». То же подтвердили кор. Ян Казимир, Ян III, Август II и Август III.

Разного рода неурядицы в конце концов совершенно разорили город. Еще в 1644 г. «перед подстаростим и лентвойтом места Дисненского оповедали и с плачливым великим жалем жаловали мещане всего поспольства места Дисненского, почавши от старшего, аж до наимолодшего, в несносных и великих кривдах своих на их милостей панов бурмистров, радцев и лавников», которые все привилегии, дарованные городу, «внивечь обернули». О буйстве местного гарнизона при построении храма Воскресения Христова сказано выше; очевидно, такое своеволие гарнизона проявилось здесь не впервые. Немало причиняли вреда дисненцам и владельцы смежных с Дисною имений. Вот один из многих примеров. В половине XVII в. владельцем больших поместий Голомысль и Горки, находящихся недалеко от Дисны, был Михаил Вазгерд. В жалобе дисненского старосты, от 15 марта 1751 г., в задворный суд говорится: Вазгерд незаконно приобрел в г. Дисне много плацев земли, построил на них дома и корчмы; между тем «податков» и разных повинностей не желает уплачивать (за много лет не уплатил более 30 т. золотых польских); уничтожал пограничные знаки между своими владениями и дисненскими; присвоил себе самовольно много городских земель, сенокосов, лесов и пущ; с своими вооруженными людьми он нападает на дисненских мещан, разгоняет их, иных связывает и заключает в тюрьму, иных тиранит и даже убивает; такими действиями своими он «город Дисну довел до совершенной нищеты»...

Кроме этих неурядиц Дисну посещали и частые физические невзгоды: страшный пожар 1700 г. истребил весь город, а вслед за тем, в 1712 г., «от поветрия все мещане вымерли».

Все эти бедствия довели дисненских мещан до того, что они, в конце XVIII в., вышли «из города Дисны, наполнили Курляндию, Ригу, Друю и другие города; город Дисна превратился в большую руину».

В течение XIX в. «город почти каждое десятилетие очищается огнем и водою»; большие пожары 1865 г., 1872 г., 1882 г. всякий раз истребляли почти весь город; во время последнего пожара уцелели одни только «Пески», заселенные отставными солдатами, да несколько прибрежных домов. Каменный храм



Карта Дзісеншчыны 1579 г.

Воскресения Христова спасся каким-то чудом. В последнее же время было два наводнения: в 1870 и 1878 гг. все окраины города были залиты водой; остров во время разливов также покрывается водой.

Замок дисненский, как было уже упомянуто, заложен в 1565 году Борколабом Ивановичем Корсаком, на полуострове между р.р. Дисною и Двиною. Один современник пишет: «король Сигизмунд Август, после потери Полоцка, хорошо укрепил шанцами (Дисну) в том месте, которое называется Копец, где река Дисна впадает в Двину». Под именем Копца дисненский замок известен во всех русских актах того времени. Местность, на которой стоял замок, с древнейших времен принадлежала полоцким епископам, как это видно, между прочим, из грамоты кор. Стефана Батория от 21 мая 1586 г.: «Замок наш дисненский есть особливою обороною от неприятеля нашего, князя вел. Московского, тому панству нашему вел. кн. Литовскому, который теж на кгрунтех владычних, прозываемых Порогах, збудован... Дворец Левковский владычный (иначе Лонка), поблизу Дисны лежащий, ку замку нашему дисненскому привернули есьмо».

Во время полоцкого похода Стефан

Баторий, посетив несколько раз Дисну, нашел укрепления замка недостаточными и приказал отрезать замок от суши, соединив каналом Дисну, недалеко от ее устья, с Двиною; таким образом образовался остров; канал этот носил название «Баториев перекоп»...

В настоящее время остров-замок принадлежит причту Воскресенской церкви; он был выменен в 1797 г., с согласия монастыря, на монастырскую землю, которая находилась в конце города и в которой город нуждался для расширения своих пределов.

Кроме замка на острове, или верхнего, и самый город был укреплен также валом и деревянною стеною, или «парканом», с деревянными башнями; это — нижний замок. В стенах были устроены ворота, или «брамы». Одна из брам находилась при конце «Великой улицы», нынешней Бойной, ведущей в Голомысль. Стена окружала не весь тогдашний город, а только часть его, именно пространство по нынешний костел, Парканную и Пробойную улицы. Вся остальная часть, где ныне еврейская синагога, называлась предместьем.

От нижнего замка ничего не сохранилось; от верхнего осталось название — замок, под которым известен остров. Сохранились еще некоторые валы; высота их около 2 саж., длина 1-го — 35 саженей, 2-го — 31 сажень, третьего — 48 саженей, четвертого — 56 саженей, пятого — 50 саженей. По измерению, произведенному в середине XVIII в., остров имел в длину 1517 локтей, в ширину 357 локтей. В настоящее время остров занимает 6 десятин 900 саженей.

Материалы по истории и географии Дисненского уезда Виленской губернии / Изд. А. Сапунова и кн. В. Друцкого-Любецкого. Витебск, 1896.

ІНВЕНТАР ГОРАДА ДЗІСНЫ

22 жніўня 1667 г.

Инвентарь передачи староства Дисненского и державы Куриловской, лежачих в Полоцком воеводстве, за командированием по особому листу его сиятельства, Иеронима Крыстена Киршенштейна, великого подскарбия и земского писаря Великого княжества Литовского, мною, скарбовым дворянином Иваном Казимиром Киркором, Витебской воеводше, польной гетманше вел. кн. Литовского, Дисненской и проч. старостше Анне урожд. Козел-Поклевской, жене Владислава Волковича, списанный в текущем 1667 г. месяца августа 22 дня.

Во-первых, его корол. мил. город Дисна, подсудный Магдебургскому праву: плац пустой над рекою Двиною, на котором был построен старостинский двор (в военное время снесен)... вооружение, принадлежность Дисненскому старостинству: пушек желтой меди, больших и меньших десять, железных пушек три, гаковниц железных в ложах тридцать девять, также гаковница железная долгая без ложа одна, дробовниц железных четыре, гаковница железная на худом лафете одна, каганцев двенадцать, пороху бочек шесть, свинцу штук больших пять, меньших две, также пороху центнеров пять с половиною, вместе с городским порохом, гранат ручных готовых 70, железных 9, пуль 24-фунтовых пятьдесят, пуля железная крестовая одна, пуль 4-фунт.— 260, пуль 2-фунт. 500, пуль $^1/_2$-ф. двести, голотов железных полбочки малой, картечи железной 90, зарядных капсуль к пушкам 40, серы весом два камня, еще свинцу штук 10.

Вооружение это, а именно пушки — в воротах, на рынке и в шанце; амуниция же сложена в цейхгаузе, в каналерыи. Каповище, где находится старый замок между р. Двиною и Дисною; вал около этого каповища и шанец, вновь насыпанный. Поселенные в замке несут повинность: Илья Шаповал — один плац оседлый, 2 пришлых, платит один золотой 36 гр.; Игнат Шаповал — 1 плац оседлый, 2 пришлых, платит 1 золотой 36 гр.; Гришка Стодольник — 1 плац оседлый, $^1/_{13}$ пришлого, платит 1 золотой 45 гр.; Иван Симонович — 1 плац оседлый, 2 пришлых, платит 1 зол. 36 гр.; Иван Логун — 1 плац оседлый, 2 пришлых, платит 1 зол. 36 гр.; Афанас Коженко — 1 зол. 36 гр.; Якуга Клява — 1 зол. 36 гр.;

Прокоп Атрошкевич — 1 зл.; Данило Атрошкевич — 1 зл., Иван Драган — 1 зл., Яcько Щебетковский — 1 зл. 36 гр., Прокоп Стодольник — 1 зл. 36 гр., Иван Отрошкевич — 1 зл. 54 гр.

Повинность замковых людей, когда потребуется, ходить на дворовую стражу, по давнему обычаю отправлять посылки.

Фольв. Лонка, иначе Левковский, Никольские потоки (пороги) над рекою Лонкою: недавно построенный дисненским подстаростою Шульцем двор с амбарами, гумном и скотным двором. Крестьяне этого фольв. Васька Маняк — 1 служба, Николай Эпуравский — $^1/_3$ службы. Повинность этих крестьян: каждую неделю по два дня ходить на работу, с чем будет приказано, от урожая всякого хлеба, т. е. ржи, ярины, овса, ячменя и гречихи, давать четвертую долю на г-жу старостишу.

Давнее мыто от водного сплава на р. Двине должно быть платимо г-же воеводише, по принятому издавна обычаю платежа онаго приемникам ся.

Капщина (т. е. питейный сбор) с города и сбор с перевозов на реках Двине и Дисне взимаются, по принятому издавна обычаю, из них ежегодно должно приходиться Дисненскому ксендзу плебану сто злотых...

Выпіска з інвентарнай кнігі Літоўскай скарбавай камісіі (захоўваецца ў Віленскім цэнтральным архіве. № 3711. Л. 1177—1189).

З гістарычных крыніц

СА СКАРГІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА НА ДЗЕЯННІ ОРДЭНА КРЫЖАНОСЦАЎ

1413 г.

...Перш за ўсё згодна са зместам XVI раздзела прапаноўваюць і пераконваюць прызнаць, што крыжаносцы, у час міру паміж упамянутымі спадарамі, царом і правадыром, пры дапамозе названых крыжаносцаў, і саслоўем майстроў, хітра і вераломна праніклі ў землі і правінцыі вядомага спадара правадыра Вітольда, уварваліся ў акругі, менавіта Меделі, Свірэ, Брацлаў і Плочско, разарылі і спустошылі іх, будынкі ж і будовы спалілі і ператварылі ў попел, людзей абодвух палоў і дзяцей збілі, забілі і вынішчылі, а некаторых, з раней названых акругоў, адвялі як нявольнікаў звязанымі. Дзяўчынак, дзяўчын і служанак згвалтавалі і зганьбілі, замужніх і іншых цнатлівых жанчын схапілі, коней, уючных і хатніх жывёлаў, маёмасць, пажыткі, пасудзіны золата і срэбра і прадметы хатняга ўжытку прысвоілі і па свайму жаданню адвезлі з названых акругоў. Самому ж спадару правадыру і ягонаму роду прычынілі страты ў першых пладах новага ўраджаю да 1 млн. 200 тыс. фіг дзевятага пакалення, акрамя выяўлення такой колькасці крыві забітых людзей, лік якіх даходзіць амаль да тысячы, а таксама згвалтаванняў, зганьбаванняў, упамянутых вышэй, з якіх патрабуюць гэтых крыжаносцаў, гнюсных разбуральнікаў першапачатковых устояў, а таксама імператарскіх і кананічных распараджэнняў за такія абнародаваныя злачынствы караць, поўнасцю выкрыць і папярэдзіць падобнае.

Таксама помнім людзей з Браслава, якіх крыжаносцы як нявольнікаў не вярнулі... Таксама з Дзісны дачка Салькона Оффімія, сын Аўскон, Хетен дачка Смолькона, Охапка дачка Трорескхкона. Таксама Мамельхава, таксама чалавек Марціна Прівішхко па імя, дачка Ігольчона. Таксама дзве дачкі Ходрхона, Котуша і Зофія, жонка Хаўрілона. Усяго іх 49.

Друкуецца па кн.: Litef ak rec gistae inter polonos ordiemqe zruzifeerorum. Poznań, 1892. S. 162. (Пераклад з лацінскай мовы М. У. Валашчук.)

ПРЫВІЛЕЙ КАРАЛЯ ЖЫГІМОНТА І РЭЧЫЦКІМ МЕЧНІКОВІЧАМ ПЕТУХАМ

7 ліпеня 1507 г.

Зыгмунт Первши, король Польски, велики князь Литовски и пр.

Бил нам чолом боярин наш уезду Полоцкого, иж што они купили вечным правом именице, названое Плису, з трома фольварками, селом Блошниками, из тых сел прина-

лежностями, полями, огородами, будованем дворным и гуменным, урожоны Миколай Александр Петух у князя нашого Константина Островского... и тые все справы на тоя именице вечне потверждаемы...

Сигизмундус рекс

Выпіска з актавай кнігі Мінскага гродскага суда за 1755 г. // Віленскі цэнтральны архіў старадаўніх актаў і кніг. № 11800. Л. 726—727.

ЛІСТ, ПІСАНЫ ДА ВАЯВОДЫ ПОЛАЦКАГА, СТАРОСТЫ ДАРАГІЦКАГА, ПАНА ПЯТРА СТАНІСЛАВАВІЧА, АБЫ БАЯРАМ СМАЛЕНСКІМ КУЗЬМЕ, А ТАРАСУ МІКІЦІНІЧАМ НА ЗЯМЛЮ ПУСТОЎСКУЮ НА ІМЯ ПАГОСТ У ПОЛАЦКІМ ПАВЕЦЕ

31 октября 1523 г.

Жикгимонт. Воеводе Полоцкому, старосте Дорогицкому, пану Петру Станиславовичу. Били нам челом бояре Смоленские Кузьма, а Тарас, а Пахом Микитиничи и поведали перед нами, што... намесник деи, с росказанья твоей милости, обравши им землю пустовскую у Полоцком повете, на имя Погост, что держал немец Кглёт, и им в то увязанье дал и лист им на то свой дал; ...Ино деи тот лист — данина в них згинул, а они тое земли вдержани были аж до сих часов, и били нам чолом, абыхмо им на то дали наш лист... мы на их чоломбитье то вчинили, на то дали есьмо им сесь наш лист нехай они тую землю держать со всим, подлуг первое данины нашое...

Писан у Петрикове...

Літоўская метрыка. Кніга запісаў № 12. Л. 122—123.

ПОПІС ЛІТОЎСКАГА ВОЙСКА Ў 1567 г.

Павет Браслаўя Літоўскага:

Грыгоры Мірскі харунжы браслаўскі, маёнтак Меры, Укля. Іванова Басіна, суддзёўна браслаўская, маёнтак Чэрасы. Князь Фёдар Акгінскі з маці сваёй, маёнтак Дзедзіна. Іван Рыжы, маёнтак Мілашова. Паня Станіслававa Скопава, маёнтак Шчолна, Дзедзіна. Ждан Маткевіч, маёнтак Дзедзіна, Васько Мікітавіч, маёнтак Пагост. Андрей Шаўлоўскі, Ян Лукіянавіч Віцкі, маёнтак Меры. Шчэпан Кгірайтовіч, Вогуш Пятровіч, Даніла Ілініч, Багдан Клопат (Копаць?), Меры...

Увогуле на попіс 1567 года павет ставіў 118 коней і 18 драбін...

Гедэман О. Гісторыя павета Браслаўскага. Вільна, 1930. С. 440—442.

ГРАМАТА КАРАЛЯ ЖЫГІМОНТА II АЎГУСТА АБ ВЫЗВАЛЕННІ АД ПАБОРАЎ І ПАВІННАСЦЕЙ НА ВОСЕМ ГАДОЎ НОВЫМ ЖЫХАРАМ ДЗІСНЫ

28 снежня 1566 г.

Жикгимонт Август.

Ознаймуем сим нашим листом, иж росказали семо державцы кричовскому и дисеньскому пану Баркулабу Ивановичу Корсаку, при замку нашом Дисеньском место осаживать, про то мы для розмноженья и запоможенья оного места з ласки нашое г(оспо)д(а)рское тым всим подданым нашим, которые при том замку нашом Дисеньском тепер ест и потом садитися будуть, дали воли отдаванья капщизны и иных платов, на нас, г(оспо)д(а)ра, и на врад тамошний приходячих, и теж дозволяючи им по паньству нашому Вел. кн. Лит. всякими товары, а особливе воском и солью сухим путем и воденым торговати, не даючи от того мыта звыклого и побору нововставленного и тем мостового, подужного, важчого и от описования товаров ничого не платечи до певного часу, то ест от даты сего листу нашого на 8 год; и вжо в том часе вси подданые н(а)ши, мещане дисенские, не мають и не будуть

повинни ни которых капщизн и платов, на нас, г(оспо)д(а)ра, и на врад тамошний приходячих, давати, а от товаров, которыми кольве товарами своими торговати будуть, мыта звыклого и побору нововставленного и торгового, подужного, важчого и от пописыванья товаров, аменовите высковничего и соленичего, платити до того часу, поки тая вольность от даты сего листу нашого 8 год сполна выйдеть.

Вед же по выштью тое волности, от нас даное, мають они всякие платы и повиньности на нас, г(оспо)д(а)ра, полнити по тому, яко будет постановлено. Нижли тепер мають тые мещане дисеньские за тую вольность, им от нас данную, работу остроговую робити и сторожу мевати по тому, яко державца тамошний с ними постановить.

А што ся дотычеть козаков, при тамошнем замку оселых, естли бы таковую повинность полнили, яко и мещане, тогды тое ж вольности поспол з мещаны вживати мають, а пакли бы повиньности поспол з мещаны польнити не хотели, тогды оное вольности, мещаном даное, вживати не мають, але платы и вси доходы платити повиньни будуть.

И на то дали есмо мещаном дисеньским сес наш лист с нашою печатью.

Писан у Вилни лета божьего нароженья 1566 м(еся)ца генваря 28-го дня.

Подпис руки г(оспо)д(а)рское.

Остафей Волович

Белоруссия в эпоху феодализма: У 3 т. Мн., 1959. Т. 1. С. 274—275.

З ПОПІСУ ВОЙСКА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1567 г.

Повет Браславля Литовского **Месяца сентебра 22 дня**

Хоружий Браславский Григорей Мерский з ыменей своих — в Браславском повете з Мерского и Уколского кони 2... Ивановая Басиная, судиная Браславская, з ыменья с Тересы кони 3... Она ж ставила драби 2 з ручниц. Князь Фёдор Окгинский з маткою своею з ыменей в повете Браславском з Дедина, всих коней 4 збройно, пнцр., пр., тр., др... Он же ставил драби 2 з ручни. Кнегиня Ивановая Масалская из Залеся в повете Браславском конь 1, пнцр., пр., тар., др... Иван Рыжий з Милошева конь, пр., пнцр., тр., др., меч.

Михайло Нагишко з братом Дмитром кони 2, пнцр. 1, пр., рогати., согай... Федор Скорка сам хор, оказывался перед его милостью паном гетманом, ставил слуг, кони 2 збройно, пнцр., пр., тр., рогати. Пани Станиславовая Скоповая з ыменей з Щолненского з Дединского клячи 2, каф., пр., рогати. Она ж поставила драба з ручницою. Ждан Миткевич з Дедина конь, пнцр., согай., рогати. Васько Микитинич с Погоста конь, пнцр., пр., рогати., арка., кор...

Месяца октебра 1 дня

Станислав Езопович служить пану воеводе Полоцкому, з ыменей своих с Моляв в повете Браславском, а з Тысин в Ошменском повете ставил слуг кони 2 збройно, пнцр., пр., тар., др.

Месяца декабра 1 дня

Ян Лукъянович Вицкий з дворца закупного от Павла Богдановича Нарбута з Мери ставил конь збройно, бляха, пр., рогати., и оповедял то, иж пан Нарбут описался сам с того дворца службу земскую военную служити, а иж дей он подлуг опису своего с того дворца коня не ставил, чинечи уфале соймовой, тогды с того дворца конь ставил.

Сума того повету вышей описанного коней 51, а драбов 14.

Русская историческая библиотека. М., 1915. Т. XXXIII. Отд. 1. Ч. 3. С. 634—638.

З «ХРОНІКІ ЛІТОЎСКАЙ І ЖМОЙЦКАЙ»

1580 г.

...А кроль, пославши свежую помочь ездных и пеших канцлерови коронному под Заволоче, сам рушился до Полоцка, потом до Десны, так же кролеви принесено новину вдячную, же Заволое замок на пагорку высоком, водами отвсюль оточеный, людом и стрелбою умоцненый и до добытя трудный, взял канцлер коронный порядною и поважною справою през подане примушоное, зо всею стрелбою, делами, котрых было 200, и з живностю отобрал. Там же Василий Саборов, который орды казанские и астраханские под Московское панство подбил, Иван Жалобин, Василий Назимер, воеводове, суть поиманыи, а иншие, ведлуг вери данные, водных пущено. Где и наших под тым замком немало полегло.

Полное собрание русских летописей. М., 1975. Т. 32. С. 121.

З «БАРКУЛАБАЎСКАГА ЛЕТАПІСУ»

1576 г.

Пан Баркулаб Иванович Корсак, староста дисенский и ротмистр кролевский, войт дисенский, рыцер и военник добрый, славный, замок Дисну, замок Вороничи, замок Леплю, замок Чашники — тые вси замки по взятию Полоцком веспол с паном Романом Ходкевичом сами и з своим людом позакладали и места поосажали людми добрыми. А потом року 1576, месяца августа 20 дня в понеделок у вечере, дву годин в ночи, пан Баркулаб преставился на старостве дисенском в замку Дисенке, а погребено честно тело его у месте Виленском у церкви Святыя Пречистыя Богородицы.

Полное собрание русских летописей. Т. 32. С. 175.

З ФУНДАЦЫЙНАЙ ГРАМАТЫ КАНЦЛЕРА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ЛЬВА САПЕГІ НА КАСЦЁЛЫ Ў ІКАЗНІ І ПАГОСЦЕ

16 ліпеня 1593 г.

У імя Айца і Сына і Святога Духа, Усемагутнага Бога ў Троіцы Адзінага Амінь. Паколькі чалавек, які адзін толькі з усіх стварэнняў гэтага свету створаны паводле падабенства свайго Стваральніка, ён павінен з усіх заняткаў свайго жыцця лічыць галоўным і найбольш належным вераваць у Госпада свайго Стваральніка, а ў сваім тленным жыцці вызнаваць і ўслаўляць бязмежную дабрыню і міласэрнасць.

Таму я, Леў Сапега, Канцлер Вялікага княства Літоўскага, Слонімскі, Ясвоінскі і Рэтаўскі староста, усім увогуле і кожнаму паасобку цяперашнім і потым будучым, каму аб гэтым ведаць належыць, абвяшчаю, што дзеля распаўсюджвання шанавання і хвалы Божай Госпада Стваральніка майго, свой маёнтак Іказненскі, які раней з уладанняў дому майго сапежынскага выйшаў і па жаночай спадчыне перайшоў у чужы дом і пасля спынення патомства той лініі, а потым я купіў і набыў яго ад маіх дзядзькоў — паноў Сапег, якія валодалі ім па блізкасці паводле права ўласнасці, а потым я выкупіў гэты маёнтак яшчэ ў яго міласці князя Аляксандра Пронскага Кашталяна Троцкага, таксама меўшага на гэты замак права. Дзе як сам касцёл разбураны, так і наданне нашых набожных продкаў разабрана і знішчана, два касцёлы зноў фундаваць і надаць надумаў. І гэтай маёй граматай фундую і надаю — адзін касцёл у горадзе Іказні ў памяць Цела і Крыві Госпада Нашага Езуса Хрыста, другі ў горадзе Пагосце, прысвечаны Прасвятой Троіцы, абодва пад адным плябанам, у яго ўладзе і кіраванні. На гэтыя касцёлы надаю для ўтрымання плябана і на іншых касцёльных служыцеляў са сваіх уладанняў на вечныя часы наступнае. Перад усім сам касцёл у горадзе Іказні, той будынак, у якім раней была праваслаўная царква Святога Духа, якую ператварылі ў кальвінісцкі храм, а цяпер ізноў ператвораны ў касцёл. Жадаю, каб яму перададзена была плошча на рынку мястэчка Іказненскага

з могілкамі такой шыркі, як цяпер агароджана парканам. А для жылля плябана і іншых служыцеляў касцёла, таксама на школы і шпіталь і сялян усю зямлю каля гэтага ж касцёла паміж друйскай дарогай уздоўж паркана і дарогай упоперак, якая ідзе да моргаў гарадскіх з мястэчка, а таксама па вулачцы ад рынка да гарадской брамы, з усімі падданымі мяшчанамі, з іх павіннасцямі, данінамі, агародамі, службамі, чыншамі і капшчызнай піўной і іншымі даходамі, якія кольвек у тым апісаным пляцы ёсць і ў будучым могуць з'явіцца. Таму ж плябану на ворыва фальварак той пры горадзе Іказненскім, які Буліч Баярын трымаў, з усімі забудовамі, агародамі, прудамі і палямі, як было здаўна з сенажацямі, зараснікамі, гаямі. Усяго ў ім 5 валок і 7 моргаў. А таксама размешчаную паблізу в. Білевічы — 5 валок і другую вёску Рэвутовічы — 4 валокі, з усімі падданымі, грунтамі і наваколлем, як здаўна адмежавана і абмерана было, на вечныя часы адпісваем, а для лоўлі рыбы ў Іказненскай воласці азярцо маё ўласнае Ісмінска, якое ляжыць паміж грунтамі шляхецкімі, таму плябану Іказненскаму назначаем, якому будзе воля ўсялякім спосабам лавіць ва ўзгаданым азярцы і ўжываць яе цалкам для сябе без дазволаў маіх і маіх нашчадкаў.

У Пагосцкай жа воласці на касцёл Троіцы Святой, які там ужо збудаваны, ахвярую пляц увесь ужо абнесены, да таго на плябанію двор мой пагосцкі з усімі пабудовамі, якія там здаўна знаходзяцца, а на ворыва грунт увесь і палеткі дворныя, пачынаючы ад двара і касцёла паміж канцом сажалкі і мяжой каралеўскай да мяжы сяла Даншовіц з аднаго боку, а паміж моргамі мяшчан пагосцкіх за касцёлам і мяжой таксама каралеўскай да самай мяжы сяла Даншовіц на другім баку сяла Даншовіц 10 валок, а ў мястэчку мяшчан трох, каля саду плябанскага жывучых з дамамі і агародамі. Такім чынам, усе грунты падуладныя як у воласці Іказненскай, так і Пагосцкай, апісаныя вышэй, па ўсёй працягласці, з забудовамі, агародамі, садамі, сажалкамі, ставамі, раллём, лугамі, чыншамі, дзяклавымі павіннасцямі, гвалтамі, на плябана і касцёл іказненскі і пагосцкі на часы вечныя дарую, надаю і адпісваю, нічога сабе і сваім нашчадкам і нікому са сваіх блізкіх і далёкіх сваякоў з даходаў уласнасці, улады і вяршынства ніякага ў пералічаных межах і падданых, на іх пражываючых, і якія там жыць будуць, не пакідаю, а ўсё гэта плябану цяперашняму і потым будучым аддаю, а цяпер усе грунты надаю пад уладу і ў карыстанне ксяндзу плябану іказненскаму Станіславу Аляксеевічу. А калі б плябан іказненскі якую-небудзь у тых межах ад каго з суседзяў крыўду меў, тады я і нашчадак мой ад усялякіх крыўд і спрэчак памежных вызваляць яго на вечныя часы будзем павінны. Калі ж я ці мой нашчадак у гэтых апісаных межах плябану крыўду ўчынім, тады вольны будзе ксёндз плябан цяперашні і потым будучы выклікаць мяне і нашчадкаў маіх па справах належачых да гродскага суда ў гродскі суд, па справах належачых да земскага суда ў земскі суд. Я ж і нашчадкі мае, валодаючыя замкам і іказненскім уладаннем, па першай жа позве павінны будзем з'явіцца ў суд і адказваць там, і будзем абавязаны вяртаць усялякія шкоды і судовыя расходы не адыходзячы ад суда, калі справу праіграем. А плябан іказненскі цяперашні і той, хто будзе ім потым, абавязаны будзе за душы маіх памерлых продкаў, і каб Гасподзь Бог быў міласцівы да мяне, прыносіць у абодвух касцёлах ахвяры і выконваць іншыя абрады Хрысціянскай Царквы. У адным касцёле сам, а ў іншым праз свайго вікарыя, каб нідзе не перапынялася служэнне Богу. Усім сваім нашчадкам нагадваю, абавязваю іх, заклікаю да іх сумлення і прашу дзеля бязвінных пакут Сына Божага, каб майго ахвяравання не адмянялі, нічым не крыўдзілі, наадварот, ва ўсім апякалі касцёлы, памятаючы аб вечным гневе Усемагутнага Бога, аб тым, што кожны той, хто маё наданне ліквідаваў, адмяніў ці якім чынам абмежаваў, павінен будзе судзіцца са мной перад Госпадам Богам у дзень апошняга Страшнага Суда Госпада Хрыста, калі прыдзе Ён судзіць жывых і мёртвых. А паколькі ў цяперашні час мы можам убачыць, як нашчадкі, пераходзячы ў іншую веру, захопліваюць наданні сваіх продкаў, адбіраюць у касцёлаў, дамы божыя спусташаюць і прафаніруюць, ці па нядбайнасці плябанаў годных не прызначаюць. Таму я, засцерагаючыся ад такіх цяжкасцей, пазбаўляю сябе і сваіх нашчадкаў усялякага права ўласнасці, прызначэння плябанаў, адмаўляючыся ад усіх уладанняў прыхода і ўсё гэта перадаю капітулу касцёла св. Станіслава ў Вільні і Айцоў Езуітаў віленскай калегіі...

Друкуецца па кн.: Да 400-годдзя касцёла ў Новым Пагосце. Беласток, 1993.

З ЗАПІСУ Ў КНІЗЕ БРАСЛАЎСКАГА ЗЕМСКАГА СУДА АБ НАСІЛЬНЫМ ЗБОРЫ СТАЦЫІ З СЯЛЯН БРАСЛАЎСКАГА ПАВЕТА САЛДАТАМІ РОТЫ ПАНА Я. ФЕРЭНДЗБЕРКА

2 кастрычніка 1610 г.

...Постановывшысе очевисто у суду, пан Ян Охозскии, писар кгродскии браславскии, именем его ми(ло)сти пана своег(о) вельможног(о) его ми(ло)сти пана Януша Скумина Тышкевича, писара его кор(олевское) ми(ло)сти Великог(о) князства Литовског(о), старосты браславског(о), державцы цырынског(о), на неяког(о) Яна Шадовског(о), немца, которыи се менил быт товарышом з роты его ми(ло)сти пана Яна Ферендзберка, жаловал и оповедал в том, иж деи року теперешнег(о), 1610, м(е)с(я)ца сентября 22 дня, он, пан Ян Шадовскии, з немцами розное нацыи, людми так, инфлянчыками, курлянчыками, шведами, лотвою, маючы при собе тых немцов оршак людеи немалыи, чоловека семдесят, а прыехавшы до места Браславско(го), до державы его ми(ло)сти пана его своволне, не будучы уже на послузе его королевское ми(ло)сти пана нашог(о) милостивог(о), яко и Речы Посполитое, а до того и не маючы жадных универсалов, так от его королевское ми(ло)сти пана нашог(о) м(и)л(о)стивого, яко и от вельможног(о) его ми(ло)сти пана Яна Кароля Ходкевича, гетмана Великог(о) князства Литовског(о), але чынечы воли своеи якуюсь стацыю незвыклую у тых нендзных подданых, спустошалых, первеи сего в сем року по двакроть в шести неделях выбирал стацыю.

Которое стацыи выбрал на подданых так ликгуминами, яко и готовыми грошми за перец, за шафран, за горшки, за свечы, за оцет, за соль, за хмель: з волок нендзных ста и девети пораховавшы и знезшы на одно местце пятсот коп грошеи литовских, не рахуючы подарков и выжыженя, што пахолики по селех будучые, у подданых побрали.

А тепер знову трети раз, яко се вышеи поменило, в року теперешнем, 1610, м(еся)ца сентебра 22 дня, прыехавши и росписавшы цедулы пахоликом своим, по селах волости Браславскои, которых он сам лепеи знаеть, имена и прозвища их ведаеть, так з них которог(о) зовуть, для выбираня стацыи грошовои подал и порозсылал...

А с третег(о) воитовства взяли готовыми грошми наперод в селе Черневом з волок пети — золотых тридцат, в селе Барановичах з волок двух — золотых дванадцать, в селе Коновалах з трох чвертеи волоки — золотых чотыры и грошеи дванадцать, в селе Янковичах з волок полтору золотых девет, в селе Борках з волок двух — золотых дванадцать, в селе Родевичах з волоки одное — золотых шест, в селе Игнатовичах с трох чвертеи волоки — золотых чотыры в грошеи дванадцать, в селе Нивю з волок чотырох — золотых двадцать чотыры, в селе Переброде с волок полпети — золотых двадцать сем, з Слободы взяли з волок двух — золотых дванадцать, в селе Глебунах з волоки одное — золотых шесть, в селе Говцах з волок полчварты — золотых двадцат один, в селе Забору з волоки одное — золотых шесть, в селе Лютевичах з волоки одное — золотых шесть, в селе Мелеиках с трох чвертеи — золотых пять, в селе Хоробровом с полволоки — золотых тры, в селе Красном з волок двух — золотых дванадцать, в застенку Масловском — с чверти грошеи тридцат шесть, в селе Детковичах з волок трох — золотых осмьнадцат. А записного с кождое волоки по потроиному.

А особливе розными ликгуминами побрали: в селе Переброде гусь одну, масла грывенку, куров десет.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1747. Воп. 1. Спр. 2. Л. 10—13.

З ЗАПІСУ Ў КНІЗЕ БРАСЛАЎСКАГА ЗЕМСКАГА СУДА АБ ЗАТРЫМАННІ І ЗВАРОЦЕ ТРОКСКІМ ВАЯВОДАЙ Я. ТЫШКЕВІЧАМ БЕГЛЫХ СЯЛЯН З МАЁНТКА ГАЛАМЫСКАЕ ПОЛАЦКАГА ВАЯВОДСТВА КНЯЗЮ М. ГЕДРОЙЦУ

20 студзеня 1632 г.

...Розных годов, м(еся)цеи днеи и ночеи поданые его м(и)л(о)сти пана подстолего и панеи малжонки его м(и)л(о)сти именя Голомыского, у воеводстве Полоцком лежачого, власные отчычы и давност земскую заседелые з розных сел до того именя Голомыского прислухаючые, проч пошли и поутекали з жонами, з детми и зо всякими маетностями, о которых деи его м(и)лость пан подстолеи полоцкии его м(и)л(о)сть п(а)на воеводу

троцкого непооднокротне розных годов и не на одные роки пред суд наш позывал, нижли деи за частым недоистем роков и за звлеченем чыненя справедливости од его м(и)л(о)сти доскуточно росправы прыити не могучы, позвал был о збеги, подданые на роки прошлые, тры кролские суду н(а)шому судити, належачые в року 1631, которые тые роки, с певных прычын не дошли и не хотечы деи до далшых утрат правных прыводити, ино подстаростии провентовии и економ державы его м(и)л(о)сти Браславское, пан Кгарбыел Откинскии посподу с паном Яном Шостаковским, яко слугою его м(и)л(о)сти, успокоиваючы тую справу за росказанем и за моцю, собе даною, в особе его м(и)л(о)сти, не допущаючы тое справы ку далшим поступком правным его м(и)л(о)сти князя Марцыяна Кгодроитя таким способом с постановеня и померкованя прыятелского и за прызнанем самого пана Кгабрыеля Откинского, яко подстаростего и економа провенторового державцы Браславское, же и тепер сут(ь) в Селищах, называемом и Переброде, и в ыншых розных селах домами мешкают.

Померковавшы, погодили, иж деи они тые збеги и подданые, о которые его м(и)л(о)сть пан подстолии его м(и)л(о)сти пана воеводу позывал и о которых мел ещо позывати, имен(а)ми нижеиописаных, мели вернути, которых подданых водлуг того постановеня приятельского и прырeченя своего его м(и)л(о)сти усих, в позве помененых, вернути и отдати деи не хотели, меновите першого подданого Андрея Мосеевича Беля з жоною его Марушою Каспоровною и з дочкою одною Аксинею, з маетностю, которыи мел деи конеи трое, коров две, овец пятеро, свинеи четверо и збожа всякого; другого подданого Андрея Балтромеевича Беля з жоною, у которого деи было маетности: кон один, корова одна, овец четверо, свинеи трое и гр(о)шеи готовых немало; третего подданого Кгрыкгутя Беля з жоною и маетностю, которые деи тые Белове в року 1623 м(еся)ца октебра, з дня осмнадцатого на день деветнадцатыи, вночы, з села Язницы, до тое маетности Голомыское прыслухаючого, проч пошли и поутекали.

Четвертого подданого з села Дедина на имя Дмитра Ивановича Овсюковича з жоною его, з сынами, Артемом и Яном, маетност, которую мел: конеи двое, коров две, подтелков двое, овец шестеро, свинеи петеро, збожем молоченым, жыта бочок тры, ечменю бочок полторы, овса бочок тры, гречыхи бочок две, гроху полбочки, которыи деи тот Дмитрок Овсюкович з села Дедина до маетности Голомыское прыслухаючыи, в року 1623 м(еся)ца октебра, з дня осмнадцатого на ден деветнадцатыи, вночы, проч пошол и утек.

Пятого Радюка Холуевича с жоною его и з маетностю, шостого подданого Гаврыла Коселевича з жоною его и з маетностю, семого подданого Ярмоша Лапуненка з жоною его и з маетностю, осмого подданого Артема Овсюковича з жоною и з маетностю, девятого поданого Сергея Холуевича з жоною и з маетностю, тых ден всих подданых з жонами, з детми и со всею маетностю, которые на тот час домами, оселостями по розных месцах на маетности Селищах, Переброде и иншых селах, яко деи о том шыреи в першых позвах, где которыи мешкает описано и доложоно ест, в повете Браславском лежачых и до староства Браславского принадлежачых, выдат его м(и)л(о)сти мели.

Которых деи не выдали, чынечы то все ку великому жалю, крывде его м(и)л(о)сти пана подстолег(о) и узявшы деи певную ведомост его м(и)л(о)ст пан подстолии, же и тепер в тых селах и урочищах: Андреи Балтромеевич Бел(ь) над рекою Мерыцою, недалека села Селища, а другии Андреи Мосеевич Бел(ь) под Свободою, Перебродом пры воите переброцком, до Браславля прыслухаючым, третии Кгрыкгут Бел(ь) там же пры брате мешкает(ь), четвертыи подданыи Дмитрок Иванович Овсюкович в Красном селе и иншые, в тых позвех именми помененые, там же в Селищах и в Переброде на розных местцах, до Браславля прислухаючых, мешкают.

...Андрея Моисеевича Беля, Андрея Балтромеевича Беля, Гаврыла Кошеленка, Филипа Холуевича, Микиту Хорелковича с жоною, з детми и з маетностю, Остапка Овсюковича с жоною, з детми и з маетностю, иж их самых з жонами, з детми и з маетностю их першых позов в волости, староства Браславского не застал и по заложеню першого позву во всеи волости староства Браславское, так же Сеилискои и Черескои волости, аж до сего часу не были и тепер их нет и о них не ведают воитове волости Браславское, меновите: Матеи Юнцевич, воит волости, воитовства Друиского, Василеи Дворецкии, воит волости Череское, Роман Сушкович, на том перед нами, судом, прысегу выконати мают, которои прысезе ден третии назначаем и складаем.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1747. Воп. 1. Спр. 6. Л. 369—373 адв.

ЧАЛАБІТНАЯ ДЗІСЕНСКІХ МЯШЧАН ЦАРУ АЛЯКСЕЮ МІХАЙЛАВІЧУ АБ ВЫДАЧЫ ІМ ЖАЛАВАННЯ ЗА АБАРОНУ КРЭПАСЦІ АД ПОЛЬСКІХ ВОЙСК

Да 30 верасня 1655 г.

Царю государю и великому князю Алексею Михайловичу, всея Великия и Малыя и Белыя Руссии самодержцу, бьют челом сироты твои государевы, Дисенского острогу бурмистры и райцы и вси мещане.

В прошлом, государь, во 162 году целовали крест мы, сироты твои, тебе, великому государю царю и великому князю Алексею Михайловичю, всея Великия и малыя и Белыя Руссии самодержцу. И будучи в Дисенском остроге, мы, сироты твои государевы, от литовских людей в осаде сидели больше году, и многую нужду и голод терпели, и с литовскими людьми на боех и на выласках билися, и в приход литовских людей на боех и на выласках многие пробиты и в полон поиманы, и на короулех, государь, в Десне по острогу стояли мы, сироты твои, бесперемення 300 человек зимою и летом, а по литовским вестям стояли на короулех мы, сироты твои, и з женишками своими и з детишками без адходу день и ночь. И которые, государь, животишко у нас, сирот твоих, были, и те свои животишка мы, сироты твои, сидя в Десне, в осаде проели. А для промыслу хлебных запасов и торговли из Десенского острогу выехать нам, сиротам твоим, ни в которые твои государевы городы не уметь было за осадом литовских людей. И котория, государь, животишка у нас, сирот твоих, была, и тое, государь, нашу животинишку литовские люди отняли. И ныне мы, сироты твои, будучи в Дисенском остроге, помираем голодною смертью.

Милосердный государь царь и великий князь Александр Михайлович, всея Великия и Малыя и Белыя России самодержец, пожалуй, государь, нас, сирот своих, за наше службишка и раденье и за осадное многое сиденья, чим тебя великого государя об нас, сиротах твоих, бог известит, и вели, государь, об нашей службишке з Десны отписать своему государеву воеводе Максиму Игнатьевичю Челищеву, и сею нашу челобитную под опискою послать к себе государю.

Царь государь, смилуйся, пожалуй.

Русско-белорусские связи: Сб. док. (1570—1667). Мн., 1963. С. 353—354.

ЧАЛАБІТНАЯ ДЗІСЕНСКІХ МЯШЧАН ЦАРУ АЛЯКСЕЮ МІХАЙЛАВІЧУ АБ ВЫДАЧЫ ІМ ЖАЛАВАННЯ ЗА АБАРОНУ КРЭПАСЦІ АД ПОЛЬСКІХ ВОЙСК

Да 30 верасня 1655 г.

В прошлом целовали крест мы, сироты твои, тебе, Великому государю... И будучи в Дисненском остроге, мы от литовских людей в осаде сидели больше году и многую нужду и голод терпели, и с литовскими людьми на боех и на выласках билися... многие побиты и в полон пойманы, и на короулех в Десне по острогу стояли мы... бесперемення 300 человек зимою и летом, а по литовским вестям стояли на короулех и с женишками своими и з детишками без отходу день и ночь. И которые животишко у нас были... в осадке проели. А для промыслу хлебных запасов и торговли не уметь было за осадом литовских людей. И ныне мы, сироты твои, будучи в Дисненском остроге, помираем голодной смертью.

...И вели отписать своему государеву воеводе Максиму Игнатьевичу Челищеву.

Русско-белорусские связи: Сб. док. (1570—1667). Мн., 1963. С. 354.

ЧАЛАБІТНАЯ ДЗІСЕНСКІХ МЯШЧАН У РАЗРАДНЫ ПРЫКАЗ АБ УМАЦАВАННІ І ЗАСЯЛЕННІ АСТРОГА ВЕРХНЯГА ЗЕМЛЯНОГА ГОРАДА ДЛЯ АДБІЦЦЯ НАПАДУ ПОЛЬСКІХ ВОЙСК

21 снежня 1655 г.

Царю государю и великому князю Алексею Михайловичу, всеа Великия и Малыя и Белыя России самодержцу, бьют челом сироты твои Дисненского острогу бурместры и райцы и лавники и все мещане и холопы твои Дисненского строгу казаченка и пушкари и всяких чинов городовые людишка.

В прошлых годех, как острог Дисна был за польским королем и устроен был в Дисне земляной Верхней город. А преж всего, в Верхнем городище устроен был королевский двор для крепости. И тот город запустел и башни погнили. А около того Верхнего городища обошли реки Двена и Десна река со всех четырех сторон. А ныне на том городище живут немногие люди. А старый дисненский острог стоит ниже Верхнего городища... сидеть от нарядные и от мушкетные стрельбы немощно. А как государь по твоему указу... будет и острог поставлен и город устроен будет, и Дисненскому острогу заступа и крепость будет большая. ... сидеть было безстрашно.

Русско-белорусские связи: Сб. док. (1570—1667). Мн., 1963. С. 361.

ЧАЛАБІТНАЯ МЯШЧАН ДЗІСЕНСКАГА АСТРОГА

26 лютага 1659 г.

...под Дисенским острогом через Дисну мост делали... и в Дисенском остроге 11 башен новых поставили и рвы копали... В прошлом году... под твое государевы пушечные запасы 19 подвод з Дисны да Вильни давали, и тех лошадей двое пропало. А в нынешнем году полоцкой посылце 60 подвод давали, и тех лошадей шеснадцатеро пропало ... вели 2 перевозы на реке Двине и на реке Дисне нам отдать.

Русско-белорусские связи: Сб. док. (1570—1667). Мн., 1963. С. 410.

ПРАДПІСАННЕ ПСКОЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА КРАЧЭТНІКАВА АБ ПРЫНЯЦЦІ ПРЫСЯГІ ЖЫХАРАМІ м. ДЗІСНЫ

31 жніўня 1772 г.

Ордер г-ну капитану Абатурову.

От имени моего объявления и провождаемой плакат открою вам высочайшую е. и. в. волю в присоединении польских провинций к Российской империи, а потому, ваше благородие, быв в м. Дисне, исполнить следующее.

1. Числа сентября в главной сего местечка церкви прикажите собраться духовенству, а вы, войдя, объявите начальнику духовенства высочайшее е. и. в. соизволение и прикажите ему публично в церкви прочитать мое объявление, а потом от имени его сиятельства г-на ген.-аншефа Белоруссии ген.-губернатора государственной военной коллегии вице-президента и разных орденов кавалера графа Захара Григорьевича Чернышева плакат.

2. По прочтении объявления и плаката духовенство должно первое яко пастыри душевные показать пример начатием в подданнической верности е. и. в. присяги.

3. В той же самый час на публичной площади сего местечка чрез начальника в том местечке прикажите тем же самым порядком прочитать объявление и плакат и прибить оной на таком месте, где его все читать могли и где наш главный караул учрежден.

4. Чрез комиссара воеводства Полоцкого разошлются мои повеления, чтоб все шляхетство и протчие всякого звания люди, кому только следует присягать, сбирались в назначенные им места, полагая последний срок 18—29 сентября, чтоб к тому времю непременно присяга была окончена.

5. В силе моего назначения к съезду, когда будут приезжать шляхетства и протчие разные люди той парафии, в которой вы находитесь, всех оных приводить к присяге, и, не удерживая, отпущать их в дома.

6. К учинению присяги следует духовенство, шляхетство, городское мещанство, служащие у шляхетства разного звания люди, словом, кроме одного крестьянства, и ежели бы и другие были иноверцы, то потому же должны каждый по своему обряду присягать...

7. При особливом реестре следует тут подписанные его сиятельством плакаты и от меня объявления присяги на 3 языках, молитвенные листы, все плакаты и объявления разошлите по всем местечкам той парафии, молитвенные листы по всем церквам, а в недостатке последних прикажите списать с них копии, присяжные листы употребляйте при себе.

8. На другой день обнародования прикажите всему духовенству, собравшись в главной того местечка церкви, отправиться за высочайшее е. и. в. и дражайшего ея наследника здравия всевышнему молебствия, а по отправлении того начать присягу всем находящимся в том местечке, кои будут присягать.

9. Следуемой у сего плакат покажет вам, что от е. и. в. дозволяется выезд шляхетству тому, кои присягать не пожелают, вы имеете по точности сего исполнить, но наблюдайте притом, что всех таковых тотчас ко мне рапортовать, им же никакого озлобления не показывать.

10. При учинении присяги, когда в назначенное время шляхетство в Дисну к вам будет съезжаться, прикажите вести особливый всем им реестр, записывая его чин, имя и название всех его в той парафии деревень.

11. Экономы или управители деревень тех владельцев, коих в своих домах нет, прикажите им дать подписки, где их владельцы, означа на основании 12 пункта о всех их деревнях, о таковых тотчас мне рапортовать.

12. По окончании во всей парафии присяги собрать все подписанные листы и при рапорте вашем ко мне представить, так чтоб я, конечно, не позже 25 сентября их получил.

13. От подполковника Аршеневского посланы будут столбы с российским гербом, вы из оных поставьте один при м. Дисны.

14. Того же самого числа отправить ко мне с рапортом курьера, с первым приступлением вами к сему делу, а на другой день то же самое сделать з донесением, что у вас происходить будет.

15. На остаток надеюсь я, что вы не упустите ничего из предписанного мной, так как и не оставите со вниманием смотреть на все то, чего при таких деликатных делах соблюдать должно, к достаточному всего того сохранению расположенные при вас войски способом послужат.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3267. Воп. 1. Адз. зах. 52. Л. 24 адв.—25 адв.

Пра талерантнасць у пытаннях рэлігіі ў XVII—XVIII стагоддзях

Розныя ў той час былі ўзаемаадносіны каталіцызму і уніі да дэзуніі (праваслаўя) — бачна вялікая градацыя ад яскравай непрыязі, нейтральнасці да сапраўднай талерантнасці. Калі заяўляюць нашы тэстары ў некалькіх выпадках ва ўступе пра сваю непрымірымасць, рэлігійнасць, што «паміраюць у веры св. каталіцкай», з другога боку ўчыняюць тое і дзісенскія дэзуніяты, акцэнтуючы, што належаць да веры праваслаўнай грэчаскай, «не ў уніі знаходзячайся», але знаходзім таксама прыклады далейшай несумненнай талерантнасці, значнай гатоўнасці памірыцца ў адзінай усеагульнай Хрыстовай Царкве. Нічым іншым нельга растлумачыць учынак фундатара дэзуніяцкай дзісенскай царквы Барадульскага, гарачага схізматыка, бурмістра і багацея, які ў час распачатай ім у самой Дзісне зацятай барацьбы паміж уніяй і дэзуніяй выдзеліў у тэстаменце значныя сумы на царкоўныя брацтвы, паніхіды і саракауст, не забыўся таксама пра яго вялікасць дзісенскага плябана, якому «за маю душу і званы дарую адзін талер, няхай шануе памяць аб душы маёй у сваіх светлых малітвах, таксама выдзяляю 50 талераў (400 злотых) на касцёл, аб чым сведчу, Бог бачыць...

таксама іх вялікасцям ксяндзам дзісенскім францысканцам на святую імшу і званы дарую адзін талер».

Гедэман О. Завяшчанні браслаўска-дзісенскія XVII—XVIII стагоддзяў як гістарычныя крыніцы. Вільна, 1935. С. 13—14. (Пераклад з польскай мовы Л. А. Матэленка.)

Панскі двор і вёска ў Друйскім графстве. Канец XVIII ст.

У канцы XVIII ст. Друйскае графства належала беларускаму магнацкаму роду Сапегаў. Гэта буйное зямельнае ўладанне фарміравалася паступова, галоўным чынам шляхам скупкі асобных маёнткаў, пачатай у 1600 г. вядомым дзяржаўным дзеячам Беларусі і Літвы Львом Сапегам. У дзевяностых гадах XVIII ст. Друйскім графствам валодаў князь Францішак Сапега, генерал артылерыі Вялікага княства Літоўскага. Акт рэвізіі («люстрацыя») 1793 г. сведчыць, што ў яго ўваходзілі акрамя гарадскіх зямель Друі і Прыдруйска яшчэ дзевяць маёнткаў («фальваркаў»), у тым ліку Александрова, Ідолта і Стайкі, што размешчаны на тэрыторыі сучаснага Міёрскага раёна. За кожным фальваркам было замацавана каля дзесяці вёсак. Агульная колькасць сялянскіх гаспадарак («дымоў») складала 1225, што дае падставу лічыць Друйскае графства латыфундыяй. Галоўным акаломам яго ў 1793 г. быў адміністратар усяго графства Вайноўскі. Ён падбіраў служачых, заключаў арэндныя пагадненні, рэгуляваў узаемаадносіны з сялянамі і суседнімі землеўладальнікамі. Яму былі падпарадкаваны адміністратары маёнткаў, якіх называлі акаломамі. Кожны акаром вёў гаспадарку ў даручаным яму фальварку, кіраваў паляводствам на землях, адведзеных пад панскае ворыва, займаўся панскім статкам. Пры гэтым ён абавязаны быў зыходзіць з пісьмовых інструкцый самога вотчынніка і ўказанняў адміністратара графства. Акаром забяспечваў выкананне сялянамі паншчыны і паступленне ад іх грашовага і натуральнага чыншу. Свае функцыі ён выконваў з дапамогай нізавога апарату ў вёсках: войтаў і дзесятнікаў, прызначаных з ліку сялян.

Асобныя галіны панскай гаспадаркі ў Друйскім графстве ўзначальвалі рознаныя функцыянеры. Так, вінакурэннем займаўся «пісар прафінацыі», яшчэ былі сплаў тавараў па Дзвіне, будаўніцтва, склады, дробная вытворчасць — «фабрыкі». Колькасць такіх служачых павялічылася, значыць, панская гаспадарка рабілася ўсё больш шматгалінавай. Узнікла неабходнасць каардынацыі кіравання, для чаго склікаліся эканамічныя сесіі. На гэтых нарадах, што праводзіліся ў Друі па нядзелях, адміністратары фальваркаў і загадчыкі службаў рабілі справаздачы перад адміністратарам графства за мінулы тыдзень і атрымлівалі ад яго заданні. На сесіях узгаднялiся структура пасеваў з улікам якасці глебы і наяўнасці рабочай сілы, узаемныя пастаўкі зерня, сезоннае перамяшчэнне статка.

У цэлым такое кіраванне тыповае для магнацкіх вотчын і адпавядае іх эканамічнаму развіццю. Але ў 1793 г. рэвізоры Юзаф Мілаш і Ян Зажыцкі папракалі адміністрацыю графства ў занядбанні паляводства і жывёлагадоўлі, бо на добрай зямлі вельмі нізкая ўраджайнасць, непраўдападобна высокі паморак жывёлы.

Цяжкасці ў кіраванні панскай гаспадаркай з дапамогай грувасткага наёмнага апарату стымулявалі распаўсюджванне арэнды маёнткаў. У Друйскім графстве з дзевяці фальваркаў шэсць былі здадзены ў арэнду ці знаходзіліся ў залогавым утрыманні. Арэндная сістэма пазбаўляла ад клопатаў, але некаторыя маёнткі даводзіла да галечы.

У 1794 г. чынш — грашовы пабор, які выплачваўся сялянамі, — складаў палову ўсяго прыбытку графства. Гэта ўла-

сціва для маёнтка, які грунтуецца галоўным чынам на феадальных прывілеях, а не на ўласнай вытворчасці. Аднак іншыя паказчыкі сведчаць аб таварных рысах панскай гаспадаркі. Так, больш паловы ўраджаю жыта, сабранага на фальваркавых палетках, ішло на продаж зернем ці перараблялася на гарэлку ў трох панскіх броварах, у тым ліку ў Александрове і Стайках. На продаж накіроўвалася больш палавіны льнянога семя, значная частка ўраджаю іншых культур. Рэалізацыя прадуктаў паляводства праводзілася з цэнтральнага склада, а гарэлкі — праз карчмароў па доўгатэрміновых кантрактах і ў панскай кавярні.

Гарэлачная манаполія станавілася адной з самых значных крыніц грашовых паступленняў. Трывалыя прыбыткі прыносіла рэалізацыя масла і сыру па арэндных кантрактах на гадавы тэрмін (так званы «пахт»). Панскі двор купляў у насельніцтва льнасемя па нізкіх цэнах для перапродажу ў Рызе па больш высокіх.

Яшчэ ў графстве працавалі панскія млыны, дробныя прадпрыемствы па вытворчасці цэглы, выпальванню вапны і дрэваапрацоўцы. На іх выкарыстоўвалася праца парабкаў пэўнай кваліфікацыі з дагаворнай аплатай. У інструкцыях аканомам рэкамендавалася весці закуп у сялян маладняку буйной рагатай жывёлы і свіней для адкорму на добраахвотных пачатках і па дагаворных цэнах.

Ва ўсіх галінах панскай гаспадаркі вёўся бухгалтарскі ўлік. Пры заключэнні пагадненняў рабілася дэталёвая калькуляцыя. Так, пры заключэнні пагадненння на рэалізацыю гарэлкі ўлічваўся рыначны кошт зерня з панскага двара, заробак работнікаў броварaў, выдаткі на дровы і чысты прыбытак. З гэтых кампанентаў фарміравалася цана аптовага продажу.

Такім чынам, у канцы XVIII ст. у буйных маёнтках істотна павысілася таварнасць, з'явіліся капіталістычныя метады кіравання, узрасло прадпрымальніцтва, стала часткова ўжываща наёмная праца, сталі больш выразнымі рысы шматукладнасці.

Пры ўсёй разнастайнасці галін галоўным заставалася земляробства. У панскіх фальварках з'явіліся механічныя арфы і конныя малатарні, аднак ручная праца на вёсцы пераважала. Больш за ўсё сеялі жыта і аўса, а яшчэ азімую пшаніцу, ячмень, грэчку, гарох, боб, лён і каноплі. На сялянскіх палетках больш, чым на панскіх, вырошчвалася льну і канапель, якія карысталіся вялікім попытам на мясцовым і замежным рынках. У той час гэтая мясцовасць ужо вылучалася як ільнаводчы рэгіён. Прымаючы ў 1775 г. закон аб падымным падатку, сейм Рэчы Паспалітай устанавіў для Браслаўскага павета (палавіна цяперашняга раёна ўваходзіла ў Браслаўскі павет) самую высокую на Беларусі тарыфную стаўку ў памеры васьмі злотых з дыма. Гэта матывавалася найвялікшымі пасевамі льну і высокай таварнасцю земляробства.

У XVIII ст. ураджайнасць вызначалася па колькасных суадносінах сабранага і пасеянага збожжа, гэта значыць у «самах». У Друйскім графстве сярэдні ўраджай азімага жыта на панскім палетку за дзесяць гадоў (1783—1793) склаў сам-3,6, аўса — сам-2,7, калі ў сярэднім у маёнтках ураджай жыта лічыўся добрым у межах ад сам-3 да сам-3,5. Трэба меркаваць, што сяляне збіралі на сваіх надзелах лепшыя ўраджаі, чым на панскай ніве. Аднак і там рабіліся захады па павышэнні ўрадлівасці палёў. Адміністратару графства прапаноўвалася вызначаць у кожным маёнтку ўгноеныя і няўгноеныя палеткі, куды трэба вывезці гной, дзе выкапаць на схілах новыя і паглыбіць старыя сцёкавыя канавы, каб не змывалася ўрадлівая глеба. Для гэтай мэты дазвалялася нават наймаць па кантрактах за грошы землякопаў. А сяляне на сваіх палетках такія работы выконвалі па ўласнай ініцыятыве.

У панскім двары вырошчвалі буйную

рагатую жывёлу, авечак, коз і свіней, птушак — гусей і курэй. З 1785 г. у дакументах значацца панскія коні. Усё гэта мелі таксама сялянскія гаспадаркі. На адзін сялянскі дым прыпадала ў сярэднім па 3,5 каня. Гэта было абумоўлена вялікімі памерамі зямельных надзелаў, коннай паншчынай у паляводстве і гужавымі павіннасцямі на карысць панскага двара. Ды і сяляне вывозілі на продаж свае прадукты, купляючы жалезныя лемяшы, косы, сякеры і іншыя рамесныя вырабы. Іх гаспадарка ў другой палове XVIII ст. ужо не была цалкам натуральнай. Панская і сялянская гаспадаркі мелі цесныя сувязі, узаемна залежалі адна ад другой.

У 1793 г. у 1225 сялянскіх гаспадарках Друйскага графства жыло 10 110 чалавек, на 1 дым — 8,3 жыхара. Гэта тлумачыцца традыцыяй сяліцца на адным падворку вялікімі сем'ямі. Шчыльнасць насельніцтва ў дыме адпавядала памеру зямельнага надзелу — у сярэднім 1,1 валокі (валока адпавядала 30 моргам ці 20 дзесяцінам).

Памеры зямельнага надзелу былі звязаны не толькі з колькасцю насельніцтва дыма, але і з формай рэнты. Селянін, заняты на паншчыне, меў менш часу для працы на сваім надзеле, чым чыншавы («кунічны»), які ўвесь свой працоўны час аддаваў уласнай гаспадарцы, але вымушаны быў плаціць з яго землеўладальніку грашовы і натуральны чынш. Таму надзелы ў чыншавых сялян былі звычайна большымі, чым у паншчынных. «Цяглыя» двары, у якіх асноўнай павіннасцю была паншчына, у Друйскім графстве складалі трохі больш палавіны дымоў.

Каб уявіць поўны малюнак становішча сялян, трэба мець на ўвазе, што ўладальнікам усёй зямлі, уключаючы сялянскія надзелы, быў вотчыннік. Сяляне лічыліся толькі карыстальнікамі адведзеных ім надзелаў. Зямельная ўласнасць складала юрыдычную аснову таго, каб патрабаваць ад сялян выканання павіннасцяў на карысць пана. Улада яго распаўсюджвалася і на асобу селяніна, які быў прымацаваны да зямлі і не мог самастойна пайсці са сваёй вёскі. Землеўладальнік мог прадаць вёску ці яе частку разам з сялянамі, але продаж селяніна без зямлі ці продаж члена яго сям'і на Беларусі не практыкаваўся. Сваіх сялян вотчыннік не зганяў з зямлі, бо гэта не прынесла б яму карысці. Сялянскія надзелы па традыцыі пераходзілі ў спадчыну. Хату, пабудовы, жывёлу, прадукты вотчыннік не мог адабраць у свайго селяніна, але мог набыць у яго па пагадненню. Землеўладальнік валодаў правам вотчыннага суда над селянінам. Інвентары буйных маёнткаў фіксавалі зямельнае становішча сялян, пералічвалі іх павіннасці, іх абавязаны былі прытрымлівацца адміністратары і арандатары. У выпадку неўраджаю вотчыннік павінен быў дапамагчы галадаючаму селяніну, у іншым выпадку той мог з сям'ёй пайсці «пабірацца».

Павіннасці вылічваліся з плошчы сялянскага надзелу. Аднак вяскоўцы акрамя асноўнай («аседлай») часткі ўгоддзяў мелі яшчэ «прыёмную» зямлю — асвоеную на пустэчах — і «моргі» — невялікія ворныя і сенажатныя ўгоддзі, арандаваныя ў пана за плату.

Усё вышэйсказанае датычыцца і зямель Міёршчыны, але былі тут некаторыя асаблівасці. Двары сялян, якія мелі зямлю, дзяліліся на чатыры катэгорыі: цяглыя, служнакунічныя, глухакунічныя і агульныя. Цяглы селянін павінен быў адпрацаваць з валокі сваёй зямлі штотыднёва два дні паншчыны (прыгону) у панскай гаспадарцы, пераважна на панскім полі. На паншчыну выходзіў уладальнік двара, яго сын ці работнік, калі ён быў. Акрамя таго, у час жніва і на ворыва выходзілі восем дзён у годзе ўсе працаздольныя члены сялянскай сям'і адпрацоўваць «згоны», ці «гвалты». Зімой паншчына выкарыстоўвалася для перавозкі грузаў на санях. Цяглы селянін плаціў яшчэ чынш грашыма і натурай: 26 злотых 22 грошы з аседлай валокі штогод, а з прыёмнай — яшчэ

столькі ж. Калі зямлі было менш, то павіннасці налічваліся адпаведна часткі валокі. Да сумы грашовага чыншу дабаўлялася па 8 злотых «ільнянога» пабору і па злотаму і 8 грошаў «мядовага». Натурай цяглы селянін плаціў «дзякло», ці «ссыпку» збожжам: жыта — 6 гарнцаў, пшаніцы — 2, ячменю і аўсу — па 8, грэчкі — 1. Данінай называліся іншыя віды натуральнага чыншу — 5 яек, 30 фунтаў сена, пур вапны, пур попелу (пур — мера аб'ёму, рыжскі пур жыта важыць 46,6 кг).

Служнакунічныя, іх яшчэ называлі зямянамі, адбывалі павіннасці ў выглядзе паездак з возам ці верхам на кані па заданнях панскага двара. Яны выходзілі на «гвалты», але штотыднёвую паншчыну не адбывалі. У іх быў больш высокі грашовы чынш: 40 злотых 22 грошы з аседлай і 30 злотых 22 грошы з прыёмнай валокі. Натуральны чынш — такі ж, як і ў цяглых. З ліку служнакунічных прызначаліся «стралкі», якія ахоўвалі лясы і забяспечвалі панскі двор дзічынай, нават выконвалі паліцэйскія функцыі.

Глухакунічныя сяляне не адбывалі ні прыгону, ні згонаў, яны толькі адзін раз у два гады забяспечвалі фурманку для перавозкі ў Рыгу панскіх тавараў. І грашовы чынш іх складаў 80 злотых 22 грошы з аседлай і 70 злотых з прыёмнай валокі. Натуральны чынш яны выплачвалі, як і іншыя.

Нешматлікая група «агульных», ці «чыншавых», сялян ніякіх павіннасцяў не выконвала, яны плацілі па 94 злотыя 22 грошы з аседлай і па 80 злотых 22 грошы з прыёмнай валокі, а таксама ўвесь натуральны чынш.

Каб больш дакладна ўявіць памеры выплат, трэба мець на ўвазе, што злоты адпавядае 30 грошам, а вялікі гарнец жыта важыў 3,9 кг.

Яшчэ на тэрыторыі Друйскага графства жылі ў невялікай колькасці сяляне-дольшчыкі, якія, не маючы сваіх надзелаў, апрацоўвалі панскую зямлю за долю ўраджаю. Былі тут «бабылі», якія не мелі ні сваёй зямлі, ні хаты. Яны займалі куток у сялян і ніякіх павіннасцяў двару не выконвалі.

Некаторыя павіннасці ўскладваліся на воласць у цэлым. Напрыклад, прасці ніткі з панскага лёну. Усе сяляне абавязаны былі выходзіць на будаўніцтва дарог і мастоў, на ўзвядзенне і рамонт млынных плацін. З усіх сялян, маючых хату і гаспадарку, браўся дзяржаўны падатак — «падымнае».

У другой палове XVIII ст. на Беларусі праводзіліся рэформы рэнты. Да нашых мясцін яны не дакаціліся, хаця і тут не абыходзілася без змен. У 1793 г. вотчыннік даў заданне адміністрацыі графства падрыхтаваць ліквідацыю фальварка Ідолта і перавесці там сялян на чынш. На былой фальварачнай зямлі павінны былі наразацца надзелы для сялян з тым разлікам, каб чынш ад іх кампенсаваў страту былых прыбыткаў.

Павіннасці і паборы былі вялізным цяжарам для сялян. І яны абаранялiся як маглі: неахвотна працавалі на паншчыне, уцякалі ў пошуках «лепшага пана», хаця ўцекачоў чакала цяжкае і зневажальнае пакаранне — лупцоўка на вачах аднавяскоўцаў. Адначасова праяўляўся пэўны клопат. Двойчы ў год рэвізор правяраў наяўнасць у сялян збожжа для новага ўраджаю, пры неабходнасці аказвалася дапамога — зерневая пазыка з «сялянскага магазіна» (склада). Заснаваная дваром «сялянская каса» выдавала грашовыя пазыкі ў межах магчымасцяў іх пагашэння атрымальнікам. Навасёлам аказвалася дапамога ў будаўніцтве хаты матэрыяламі. Адміністратар схіляў сялян садзіць ля хат фруктовыя дрэвы, якія панскі садоўнік потым прышчэплiваў.

Пакаранні не прыпынялі ўцёкаў. Ф. Сапега піша: «Жах наводзіць памнажэнне пустэчаў па ўсім графстве, нягледзячы на тое што паншчына і чынш у ім значна ніжэй, чым у суседніх маёнтках». Ён робіць выснову, што «не адны толькія цяжкія павіннасці нязносныя для сялян», і загадвае адміністрацыі

абыходзіцца з сялянамі мякка, не патрабаваць ад іх нічога звыш павіннасцяў, запісаных у інвентары, караць не больш як пяццю ўдарамі, найбольш вінаватых дастаўляць у замак на суд да адміністратара графства. «Трэба захоўваць мяккасць і міласэрнасць, бо падданы занадта нешчаслівы, каб над ім здзекаваліся, і занадта карысны для свайго пана, каб дапускаць да яго несправядлівасць». Гэты дакумент падпісаны 18 кастрычніка 1793 г. у Друі.

П. Р. Казлоўскі

Пералік прыватных маёнткаў і некаторых іх уладальнікаў

Чэрас (Чэрасы): Сапега ленным правам (1505—1529), Басіная, жонка смаленскага баярына Івана Баса (1530), Завіша (1690—1753), Радзівіл (1753—1866), Тышкевічава (1866—1880), Ялавіцкі (1880—1900), княгіні Любамірскія — Сялянскі банк (1908 — цяпер), Харчанка (1912 — цяпер).

Дзедзіна: кн. Масальскі (1567), Нешыйка і Бокій (1578), кн. Агінскі (1629), Рыла (1629), Сульмін (1629).

Дзедзінка: Скоп (1567), Маткевіч (1528—1567), Каханоўскі (1667), Мірскі (1667), друйскія дамініканцы (1702), Рудаміна (1775), Рудніцкі (1780—1908).

Грудзінава (Грудзінаў): баярын Грудына (нёс службу ў полацкім замку каля 1506 г.), кн. Масальскі (1506—1518), Дзевачка (1598—1611), Сапега (1611—1745), Лапацінскі (1745 — цяпер).

Ідолта (Дапбровіца): Шток (1667), Сапега (1725—1824), Мілаш (1824—1909).

Камянполь (ч. Мёр): Мірскі (1621 — цяпер).

Кацілава: Мірскі (1764—1789).

Казакова: кн. Масальскі (1567), Рудаміна (1699), Бчуноў (1699—1720), Невянглоўскі (1720—1735), Мірскі (1735).

Крыцавічы: Зяновіч (да 1552), кн. Масальскі (1552—1586), Рудаміна (1586-1720), Невянглоўскі (1721—1814).

Купцялеўшчызна: Раецкі (1667), Сапега, Бужынскі, Юндзіл, Шауман, Шумскі (цяпер).

Лявонпаль (Чурылавічы, в. Лількі): Рудаміна і Масальскі (XVI ст.), Валасецкая, Дзевачка (1611), Сапега (з 1611 г.), Мірскі (1680—1696), кс. Згер-

Надмагілле Невянглоўскіх на могілках ля в. Крычава (сучасны выгляд)

скі, смаленскі біскуп (1696), Выгоўскі (1697—1700), Агінскі (1711—1742), Клячкоўскі (1742—1745), Лапацінскі (1742 — цяпер).

Лесна: Клот (1789).

Любінова: Клот (1789).

Мёры (Меры, Міры, Меры, Мір): Копаць (Копець) (1567), Віцкі (1567), Мірскі (1580 — цяпер); Пуцята (1600—1789), Рыла (1640, частк.), Клот (1620 — цяпер, частк.), Валасоўскі (1667, частк.), Вендзягольскі (1667, частк.), Дабашынскі, Беліковіч (1797, частк.).

Мілашова: Рыжы (1567).

Наўлак (Наўлака): Нагішка (1514—1693), Любацінскі, Длускі і Гілеўскі (1618—1630—1726), Клот (палова з 1693 г. і цяпер), Клот (другая палова з 1726 г. — цяпер).

Пагост: Сапега (1499—1777, частк.), Клот (1499), Шкоп (1567, частк.), кн. Пронскі (1556—1593, частк.), Мікітавіч (1567, частк.), Галянішча (частк. з 1600 г.), Бужынскі (1777—1797), Юндзіл (1797—1814), Канаплянскі (1839, частк.).

Сцефанова: Беліковіч (1775—1789), Шаўман.

Шчолна: Зяновіч (перад 1522 г.), кн. Масальскі (1522—1586), Рудаміна (1586—1727), Невянглоўскі (1727—1823), Дарангоўскі (1823 — цяпер).

Узмёны: кн. Агінскі, потым кн. Смірскі (1786), Мірскі (1846), Агінскі (1846 — цяпер).

Вята: кн. Масальскі (перад 1542 г.), Сапега (1542), Сіняўскі (1566—1593), кн. Пронскі (1593), потым Сапега.

Забалоцце: Гіржда, Дмахоўскі (1743 — цяпер).

Загор'е (Антанела): Сапега (1725), Мірскі (1775—1789, частк.), Клот (1775—1869).

Гедэман О. Гісторыя павета Браслаўскага. Вільна, 1930. С. 435—440.

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

У 1793 г. у выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай Дзісеншчына ў складзе іншых беларускіх зямель была далучана да Расіі. 4 красавіка ў журнале мінскага, ізяслаўскага і браслаўскага губернатара запісана, што «объявление манифеста произведено с желаемым успехом и спокойствием между обывателями, которые о присоединении их под Российскую державу изъявляют особенную радость и удовольствие»[1]. Аднак гэты запіс нельга прызнаць поўнасцю шчырым: народ атрымаў не волю, а новых паноў і рэкрутчыну, шляхту чакала перасяленне ў Расію. Акаталічванне і апалячванне мясцовага насельніцтва з дапамогай езуітаў актыўна працягвалася яшчэ ледзь не паўстагоддзя, праўда, адначасова з усё ўзрастаючай русіфікацыяй. Нацыянальны ўціск беларусаў паступова мяняў накіраванасць, аднак не слабеў. Гэтая перамена прынесла нашаму народу новыя бедствы. Ганенні на уніятаў прывялі да знішчэння цэлага слою беларускай культуры. У 30-я гады XIX ст. успыхнулі вогнішчы з уніяцкіх кніг, пачалося знішчэнне шматлікіх скульптур ва уніяцкіх храмах.

З палітычнага і эканамічнага боку гэтае далучэнне таксама прынесла народу новыя цяжкасці. Беларусы-ліцвіны са шляхецкай рэспублікі Рэчы Паспалітай сталі цяпер падаткаплацельшчыкамі манархісцкай Расійскай імперыі. І плацілі яны падаткі золатам і срэбрам, а не асігнацыямі, як паўсюдна па Расіі. Такім чынам, толькі з-за розніцы курсаў каштоўнага металу і папяровых грошай падаткі тут былі ў 4—5 разоў большыя.

І ўсё ж былі станоўчыя эканамічныя пераўтварэнні: на два гады скасоўваліся падаткі, ліквідоўваліся шматлікія ўнутраныя і знешнія мытныя пошліны для гандлю, забаронена драпежная высечка лясоў, уведзены дзяржаўны гандаль соллю, арганізаваны пастаянныя пашто-

выя зносіны, палепшаны водныя і сухапутныя шляхі.

У 1795 г. Дзісна становіцца павятовым цэнтрам Мінскай губерні, а з 1842 г. — Віленскай, у 1796 г. атрымлівае ад Кацярыны II новы герб: «на зялёным полі залаты сноп ільну». З уваходам павета ў Віленскую губерню герб удакладняецца: у верхняй частцы змяшчаецца «Пагоня» — герб губерні, у ніжняй захоўваецца сноп ільну, але ўжо на блакітным полі ў знак таго, «што жыхары Дзісны па багатаму пасеву і ўраджаю льну ў павеце адпраўляюць гэтай вытворчасцю прыбытковы гандаль у Рыгу»[2].

Мяняецца адміністрацыйнае дзяленне, у выніку якога Дзісенскі павет значна узбуйняецца, у тым ліку і за кошт Міёрскай воласці. Па 5-й рэвізіі (перапісу) у ім было 40 065 жыхароў[3]. «Мястэчку казённаму» Дзісне для самакіравання пакінуты магістрат, у які гараджане выбіралі 2 бурмістраў і 4 ратманаў. У пачатку XIX ст. у павеце развіваецца толькі мясцовая апрацоўваючая прамысловасць. Тут дзейнічаюць 39 вадзяных і сем ветраных млыноў, тры лесапільні. У Лявонпалі ўжо набыла вядомасць суконная вытворчасць у маёнтку Івана Лапацінскага, якая вырабляла простыя сукны розных гатункаў не толькі для мясцовых патрэб, але і на продаж[4]. Да 1840 г. яго тканіны, абрусы і сурвэткі карысталіся ў Рызе попытам дзякуючы высокай якасці «друйскага» льну.

Жыхары Міёраў у гэты час, як і праз паўстагоддзе, займаліся продажам рыбы, вырабам смалы і ляснымі распрацоўкамі. Пры гэтым смалу яны «гналі» ў простых ямах і з кубічнага сажня добрых смалістых карчоў атрымлівалі па 10 і больш вёдраў прадукцыі.

Аднак мірная праца ў чарговы раз была спынена новай вайной, новымі разбурэннямі. Шмат бедаў давялося перанесці мясцоваму насельніцтву ў Айчынную вайну 1812 г.



Герб Дзісенскага павета

Пасля 24 чэрвеня, калі Напалеон з войскамі пачаў пераправу праз Нёман, 1-я Заходняя армія з 120 210 чалавек пры 580 гарматах пад камандаваннем ваеннага міністра генерала ад інфантэрыі Міхаіла Багданавіча Барклая дэ Толі, згодна са стратэгічным планам вайны з французамі, пачала адступленне ад граніцы да Дрысенскага ўмацаванага лагера. Галоўныя сілы, пры якіх знаходзіўся цар Аляксандр I са світай, рухаліся на Лявонпаль. Другая калона ў Друі пераправілася за Дзвіну, трэцяя кіравалася ад Казьян на Старыя Крукі. Па беразе Дзвіны ішоў корпус Вітгенштэйна.

Дрысенскі ўмацаваны лагер знаходзіўся на левым беразе Заходняй Дзвіны паміж вёскамі Брэдзева, Барсукі,

Валы Дрысенскага ўмацаванага лагера

Слабада (Путры), Шчэберы, Дварчаны, г. зн. на тэрыторыі сучаснага Міёрскага раёна. У 1810 г. афіцэры Генеральнага штаба правялі вялікія тапаграфічныя работы ў шэрагу месц Заходняй Беларусі, пакуль не спыніліся на выгібе ракі ля Дрысы. У наступным годзе пачаліся будаўнічыя работы. Кожны дзень працавала ад 2 да 10 тыс. чалавек мясцовага насельніцтва з Дзісенскага, Дрысенскага і Браслаўскага паветаў, што, вядома, выклікала незадаволенасць земляробаў, адарваных ад звычайных спраў. Усе работы вяліся ўручную з выкарыстаннем прывычных прылад — рыдлёўкі, сякеры і пілы. Тысячы тон зямлі перамяшчаліся на фурманках і тачках.

Памеры ўмацаванняў складалі 4,3 на 3,2 км і былі разлічаны на 120 тыс. чалавек. Уся тэрыторыя ад в. Слабада да в. Брэдзева была ўмацавана рэдутамі (палявымі земляным ўмацаваннямі ў асноўным прамавугольнай формы), якія давалі магчымасць весці кругавую абарону. У другой лініі налічвалася 6 рэдутаў, у трэцяй — 1. Кожны рэдут пярэдняй лініі прыкрываўся лажаментам — акопам для ўкрыцця пяхоты і гармат. Даўжыня такіх акопаў складала 80—100 сажняў.

Лес, які на левым флангу ўшчыльную падыходзіў да ўмацаванняў, быў высечаны, каб вораг не меў магчымасці для раптоўнага нападу. З бярвенняў зрабілі засеку ў тры рады даўжынёй 2,5 вярсты.

Сёмы і восьмы рэдуты злучаліся люнетамі — умацаваннямі, падобнымі на рэдуты, але адкрытымі з тылу. Даўжыня люнетаў — 160 сажняў. Рэдуты другой лініі размяшчаліся на адлегласці 200—300 сажняў. Вышыня іх дасягала 4—5 м. Усе рэдуты першай лініі былі абнесены тынам з бярвенняў, а ў другой мелі акрамя тына яшчэ «воўчыя ямы».

Зносіны з правым берагам Дзвіны павінны былі забяспечвацца 4 мастамі, для якіх таксама прадугледжваліся абарончыя збудаванні. Толькі поўнасцю іх закончыць не паспелі.

1-я руская армія размясцілася ў Дрысенскім лагеры ў наступным баявым парадку: на правым флангу II корпус генерала Багавута, у цэнтры — III корпус М. Тучкова, на левым флангу — IV корпус Астэрмана-Талстога. У аван-

гардзе ля вёсак Пруднікі, Лявонпаль знаходзіўся корпус графа Вітгенштэйна, паміж Дрысай і Дзісной — корпус Дахтурава. Іх раз'ездам была пастаўлена задача затрымаць праціўніка.

Напалеон, даведаўшыся, што 1-я армія знаходзіцца ў Дрысенскім лагеры, даў загад Мюрату перайсці на правы бераг Дзвіны і акружыць Дрысу. Французскі імператар спадзяваўся, што Барклай дэ Толі дасць бой і загіне разам з арміяй у пастцы Дрысенскага лагера. Але рускі галоўнакамандуючы даў загад Вітгенштэйну закрыць шлях на Пецярбург, а ўсёй арміі — адступаць у напрамку Полацка. Таму 14 ліпеня войскі рушылі на ўсход. 15 ліпеня атрад генерала Кульнева даў бой пад Друяй французскай дывізіі генерала Себасцьяні. Былі разбіты два кавалерыйскія палкі праціўніка, узяты ў палон брыгадны генерал Сен-Жэўе. Гэты бой напалохаў Мюрата, і ён затрымаў рух сваіх войск. Таму 1-я руская армія змагла спакойна адступіць да Полацка.

І ўсё ж тры дні «стаяння» ў Дрысенскім лагеры сталі прыкметнай падзеяй у гісторыі Айчыннай вайны. Можа, тут, на невялічкім кавалачку беларускай зямлі, агароджанай рэдутамі, рыхтавалася бітва, што неўзабаве загрымела на Барадзінскім полі.

У Дрысенскім лагеры генерал Барклай дэ Толі дапамог цару прадухіліць смяротную небяспеку плана вайны з французамі, падрыхтаванага галоўным ваенным дарадцам Аляксандра I Фулем. Ён разгадаў манеўр Напалеона зайсці з боку Полацка і нанесці ўдар па неўмацаваных тылах. Французскі імператар не чакаў, што руская армія не застанецца больш трох дзён у лагеры, будаўніцтва якога каштавала некалькі месяцаў працы і вялікіх выдаткаў.

Толькі на чацвёрты дзень, як рускія войскі пакінулі Дрысенскі лагер, французы падступілі да ўмацаванняў. Вось што аб гэтым пісаў у сваіх успамінах «З Напалеонам у Расію» французскі доктар Г. Рос: «Пры няспынным руху да галоўных акопаў, незвычайна высокіх і з вялікай колькасцю байніц, у многіх з нас сэрца забілася падвоеным і па-

троеным тэмпам. Чым бліжэй мы падыходзілі, тым цішэй рабілася, — не чуваць было ні бразгату зброі, ні пакашлівання, ні адзін конь не заіржаў. У кожнае імгненне мы чакалі грамавых залпаў з жэрлаў гармат з гэтых акопаў. Раптам туман, які засцілаў нам вочы, рассеяўся. Цішыня змянілася спачатку шэптам, а потым рогатам: за вялікімі акопамі не было ніводнай гарматы, ніводнага салдата. Наверсе хадзіў толькі нейкі мужычок, якога раней прынялі за салдата...»

Дрысенскі ўмацаваны лагер канчаткова зруйнаваны пад час правядзення меліярацыі. Захавалася толькі некалькі равоў перадмоставага ўмацавання паблізу Дзвіны, што вострымі зубамі ўразаюцца ў калгаснае поле. Даўжыня такога «зуба» не перавышае 200 м. Роў глыбокі, месцамі амаль непераадольны.

Схема Дрысенскага ўмацаванага лагера

На працягу некалькіх месяцаў Міёршчына з'яўлялася арэнай сутычак асобных атрадаў рускіх войск з корпуса Вітгенштэйна і французскіх — маршала Удзіно.

Сутычкі адбываліся не толькі з рускімі войскамі, але і з варожа настроеным мясцовым насельніцтвам, якое захопнікі няшчадна рабавалі. Жыхары краю не менш пацярпелі і ад дзейнасці Камісіі часовага кіравання Вялікага княства Літоўскага, створанай Напалеонам. Яна гвалтоўна адбірала прыпасы (зерне, салому, сена і авёс) для варожай арміі ў сялян і паноў Беларусі і Літвы. За паўгода Камісія прывяла гэтыя землі да поўнага заняпаду[6].

Трагедыя беларускага народа была і ў тым, што вайна зноў падзяліла яго. Адны баранілі сваю маёмасць, аб'ядноўваючыся ў партызанскія атрады. Другія змагаліся супраць любых вайскоўцаў. Так, ля Дрысы быў разбіты рускі атрад, паранена і забіта 40 чалавек. А шляхта, паверыўшы абяцанню Напалеона аднавіць Вялікае княства Літоўскае, нават пайшла з французамі на Маскву. Яна змагалася і супраць беларусаў, што абаранялі Маскву ў складзе рускай арміі.

Рускія войскі таксама карміліся ад мясцовага насельніцтва і нават накладвалі на яго кантрыбуцыю. Напрыклад, у 1817 г. уладальнік маёнтка Лявонпаль Лапацінскі пісаў аб стратах на 140 тыс. рублёў, якія яму нанеслі рускія войскі.

Просты люд прэтэнзіі не выказваў. Але менавіта яго страты былі асабліва адчувальнымі. Напрыклад, страты Браслаўскага павета, куды часткова ўваходзіў і наш сучасны раён, склалі 61 % коней, 58 — кароў, 54 — свіней, 79 — авечак і 15 % хат. Усё гэта каштавала больш мільёна рублёў срэбрам.

Паменшылася колькасць насельніцтва і на Дзісеншчыне. Тут скарацілася пагалоўе жывёлы, не было сіл узорваць

угоддзі ў ранейшых аб'ёмах. У 1813 г. у павеце пасеяна 53 100 чвэрцяў яравых, сабралі 106 000 чвэрцяў, ураджай склаў менш сам-2.

Аднаўленне гаспадаркі пасля вайны ішло цяжка і марудна. Але станоўчыя змены адбываліся. І зноў дзісенскія купцы грузілі стругі — вялікія судны з камандай у 20—40 чалавек — ільном, скурамі, зернем, пянькой, воскам. Калі ў 1820 г. з Дзісны адплылі 33 такія судны, то праз год ужо 139. Вядома, што ў 1848 г. у Рыгу па Дзвіне прыйшлі 1332 купецкія караблі і 800 плытоў з лесам і лесаматэрыяламі. Яны даставілі для продажу тавары на 6 670 929 руб. 15 кап. срэбрам[7].

Не выпадкова ў гэты час Дзісна была вядома як буйны гандлёвы цэнтр на Заходняй Дзвіне. І не толькі таму, што тут дзейнічалі і развіваліся існаваўшыя яшчэ з 1632 г. цэхі краўцоў, абутнікаў, муляраў, кавалёў і інш. Горад залежаў ад ракі. Пакуль асноўным гандлёвым шляхам заставалася Дзвіна, Дзісна, хоць кожнае дзесяцігоддзе гарэла ў агні пажараў, затаплялася паводкай, але, як птушка Фенікс, адраджалася, расшыралася, станавілася больш мнагалюднай. У 1811 г. у ёй было 1405 жыхароў, а ў 1825 г. — 2801. Калі ж пачала працаваць чыгунка, якая не дайшла да горада, яго будучы заняпад, марудны, але няўхільны, стаў непазбежным. Вось і наступнае дзесяцігоддзе адзначана надыходам застою. Да 1839 г. насельніцтва Дзісны практычна не павялічылася. Па сацыяльнаму складу гэта былі ў асноўным мяшчане і пасадскія — 2193 чалавекі абодвух полаў, купцоў 3-й гільдыі 19 (абодвух полаў 56), святароў — 9 (23), ніжніх вайсковых чыноў — 195 (259)[8]. Горад меў 24 вуліцы, але брукаваныя толькі дзве, дзве плошчы, 6 могілкаў і столькі ж культавых устаноў, 338 дамоў мяшчан, 38 будынкаў належала салдатам, 21 — шляхце і чыноўнікам, 12 — купцам, 3 — царкве, 1 — святарам, 1 — дзяржаве[9].

Даходы бюджэту (1829) складаліся з паступленняў ад гарадскіх маёмасцяў і ўстаноў — 4293 руб., ад «піцейных збораў» — 3315, падаткаў — 1200, усяго — 8808 руб. Расходаваліся гэтыя сродкі на ўтрыманне «прысутных месц»: апарату кіравання — 1655 руб., на паліцыю — 156, на добраўпарадкаванне[10] — 159 руб.

Трэба адзначыць, што ў першай палове XIX ст. знешнегандлёвыя сувязі Дзісны і павета ўсё больш перамяшчаюцца з Захаду на Усход. Калі прадукцыя ўласнай вытворчасці яшчэ ў значнай ступені працягвае паступаць на рынкі Захаду, то сам павет усё больш становіцца месцам збыту прамысловых тавараў з Расіі. Гэта найбольш яскрава бачна на прыкладзе буйнейшага мясцовага кірмашу ў Друі, які праводзіўся тройчы ў год (у Дзісне такія кірмашы не праводзіліся). У 1828 г. на студзеньскі трохдзённы распродаж было завезена тавараў на 10 тыс. руб. асігнацыямі, а праз дзесяцігоддзе — на 176 тыс. У гэты час кірмаш збіраў да 13 тыс. чалавек. З Расіі прывозіліся баваўняныя, ільняныя, пяньковыя, шоўкавыя і паўшоўкавыя вырабы, фарфор, фаянс, крышталь і шкло, скуры, рыба, цукар, мыла, тытунь, папера, чай, кітайка[11].

Дзісенскі павет быў пераважна сельскагаспадарчы, спецыялізаваўся на вырошчванні лёну. У сярэдзіне мінулага стагоддзя ён пастаўляў на рынак штогод да 74 тыс. пудоў валакна (каля 1,2 тыс. т)[12]. Калі ў пачатку стагоддзя пачалі распаўсюджвацца пасевы бульбы, клубні пачынаюць шырока выкарыстоўваць не толькі на харчаванне і корм жывёле, але і як сыравіну для вытворчасці гарэлкі. Гэта дазваляла эканоміць зерне, ураджаі якога заставаліся нізкімі. Па справаздачах губернатараў, у 1804—1810 гг. азімыя, напрыклад, давалі сам-4,1, а яравыя нават сам-4.

Развівалася мясцовая прамысловасць. У вёсках Міжрэчча і Аблятова дзейнічалі прадпрыемствы па вытворчасці масы з асіны. У маёнтку Мікалаёва працаваў

буйны млын, які перапрацоўваў да 450 пудоў зерня ў дзень (больш 7 т). У фальварку Аброўшчына дробная прыгонная вытворчасць выпускала да 10 тыс. цаглін (1851), а мукамольная мануфактура мела гадавы капітал у 10 тыс. руб.

У 1846 г. даход ад лоўлі рыбы ў павеце складаў 3 тыс. руб. Годам раней тут на 59 вінакурных заводах выраблялася 80 813 вёдраў гарэлкі[13].

Памешчыкі атрымлівалі значныя даходы ад продажу лесу[14], а ў некаторых маёнтках сяляне «па выпадку блізкага адстаяння ад р. Заходняй Дзвіны... з выгадаю збываюць гаспадарчыя вырабы»[15].

Аднак развіццё гаспадаркі, характэрнае для першых дзесяцігоддзяў XIX ст., з 40-х гадоў змянілася застоем. Адбылося гэта па некалькіх прычынах. Па-першае, развіццё прадукцыйных сіл стрымлівала прыгонніцтва. Дастаткова сказаць, што ў 1858 г. прыгонныя складалі 68,3 % насельніцтва, а да часу правядзення рэформы з 53 582 жыхароў павета памешчыкам належалі 36 510, дзяржаве — 5787, вольных было ўсяго 188.

Па-другое, з кожным годам губляе значэнне транспартнай артэрыі Заходняя Дзвіна. З-за дзісенскіх перакатаў вялікія судны маглі трапіць у Рыгу толькі ў час паводкі. Таму купленыя з восені і прывезеныя зімой тавары доўга ляжалі на прыстанях. З другога боку, сельская гаспадарка, прамысловасць і рамяство арыентаваліся пераважна на забеспячэнне ўнутранага рынку. Да таго ж тавары прыгонніцкай гаспадаркі і саматужнай вытворчасці губляюць канкурэнтаздольнасць. Ураджай ільну, напрыклад, за паўстагоддзе практычна не павялічыўся, тады як беркавец (10 пудоў) валакна ў Рызе, які каштаваў у 1815 г. 64—70 руб., да сярэдзіны стагоддзя прадаваўся ўжо за 25—35 руб.

Уплывала на працэс застою і палітычная сітуацыя. Пасля паўстання 1830—1831 гг. адмяняецца дзеянне асноўнага заканадаўчага акта — Статута Вялікага княства Літоўскага, уводзіцца расійскае заканадаўства. Эканоміка і грамадскае развіццё губляюць гістарычную самабытнасць. Маёнткі ўдзельнікаў паўстання канфіскуюцца, ідзе высылка шляхты ў глыбіню расійскіх губерняў. Гвалтам адмяняецца уніяцтва, якое стала да таго часу самай масавай рэлігійнай плынню. Трэба сказаць, што менавіта да паўстання ў нашых мясцінах езуіты праводзяць актыўнае апалячванне і акаталічванне насельніцтва, займаючыся школьным выхаваннем.

Спад вытворчасці пачаўся з неўраджаю 1844 г. Дрэннае насенне не ўрадзіла і наступным летам. Пачалося рэзкае і паўсюднае скарачэнне пасеваў азімых. 9 студзеня 1846 г. віленскі губернатар пісаў генерал-губернатару, што неўраджай ахапіў усю губерню і ў паветах Дзісенскім, Віленскім, Свянцянскім і Ашмянскім «обыватели не имеют уже собственных способов к пропитанию. Встречается весьма много нищих с изнуренными и опухшими лицами и заметна более противу обыкновенного смертность».

Міёры ў гэты час з'яўляліся цэнтрам чатырох (калі не болей) аднайменных уладанняў. У адно з іх уваходзілі в. Пячонкі, хутары Даўгаполь і Баркі, маёнтак — усяго сем гаспадарак і 96 душ абодвух полаў. Сяляне адбывалі па чатыры мужчынскія і столькі ж жаночых дзён паншчыны на тыдні. Яны вырошчвалі азімае жыта, ячмень, авёс, лён, у невялікіх колькасцях — пшаніцу і гарох. У трохпольным севазвароце чаргаваліся азімыя і яравыя зерневыя з папарам. Галоўныя землеапрацоўчыя прылады — саха і барана.

На агародах вырошчваліся бульба, капуста, морква, цыбуля, рэдзька, агуркі, лён і каноплі. Лішкі іх прадаваліся на кірмашы ў Друі. Сяляне яшчэ займаліся пчалярствам, рамесніцтвам, адыходніцтвам і перавозкай тавараў. Яны працягвалі выконваць розныя фальваркавыя павіннасці, у прыватнасці аддава-

лі памешчыку «даніну» — курэй, яйкі, мёд, грыбы, ягады.

Аналагічныя павіннасці выконвалі сяляне другога ўладання, якое ўключала вёскі Мацюкі, Русачкі, Жукі і засценак Акулаўшчына — усяго дзевяць цяглавых двароў. Тут памешчыку належала 160 дзесяцін зямлі, а 76 сялянам і 7 дваровым — 179 дзесяцін. Але і яна толькі выдзялялася ім у якасці натуральнай аплаты за выкананне павіннасцяў. Да чатырох дзён паншчыны на тыдні (мужчынскіх і жаночых) тут яшчэ дабаўлялася 12 дзён у год работ на ўборцы і касьбе — «згон». Акрамя таго, дзяржаўныя падаткі дасягалі 131 руб. срэбрам. Сяляне вымушаны былі ісці на будоўлі, займацца перавозкай купецкіх тавараў, вырабам сох, барон, павозак, бочак.

Уладальнікі маёнткаў жылі ў вялікіх гарадах ці Міёрах, дзе было адпаведнае жыллё, гаспадарчыя пабудовы. Сярод такіх пабудоў асабліва трэба адзначыць запасны магазін, куды сяляне ссыпалі зерне на выпадак неўраджаю. І неабходнасць у тым была, бо наогул зямля радзіла дрэнна, а ва неўраджайныя 1843—1846 гг. сяляне галадалі і здарыўся масавы паморак свойскай жывёлы ў трэцім уладанні Міёры (вёскі Плейкі, Міснікі, Пад'ельцы, Паршалі, Рыжаўшчына — усяго 30 двароў).

Нарэшце, чацвёртае ўладанне Міёраў складалася з маёнткаў Залессе (вёскі Пячонкі, Барташы, Румішча і засценак Чарнаручча — 22 двары) і Мікалаёва (в. Грыгараўшчына і засценак Краснаручай — 10 двароў).

Магнату Ігнату Лапацінскаму з Лявонпаля належала 5 маёнткаў і 31 вёска, якія налічвалі 179 двароў і 2112 жыхароў. Кожны двор працаваў на памешчыка па два дні на кані і столькі ж пешшу на тыдні. Пры гэтым рабочы дзень быў ад цямна і да цямна, а працаздольнымі лічыліся ўсе сяляне ад 15 да 60 гадоў. Для дзяржаўных сялян заканадаўства вызначала працаздольны ўзрост для мужчын з 17 да 55 гадоў і для жанчын — з 17 да 50 гадоў.

Аднак агульнай рэгламентацыі сялянскіх павіннасцей не існавала. Паншчына ўстанаўлівалася, «соображаясь с мерою надобности». А тая мера складала на працягу года да 568, а ў некаторых выпадках і да 1128 дзён з кожнага сялянскага двара. Пры гэтым аплата працы ў Дзісенскім павеце да рэформы 1861 г. за дзень ворыва вагалася ад 15 да 50 кап., на жніве і малацьбе — 10—15, на касьбе — 15—20 кап. Арэнда валокі зямлі (21,36 га) каштавала 45—60 руб. у год, дзесяціны — 1,5—5 руб. Падушны падатак, уведзены яшчэ ў 1796 г., «с поселян казенного ведомства и крестьян помещичьих» з душы складаў 85 кап., чацвярык мукі і круп па гарнцу з казённых і па 2 — з памешчыцкіх»[16].

Калі скласці даходы і расходы на падаткі, то атрымлівалася, што сяляне маглі жыць толькі ў цесных курных хатах, дзе зімой побач з людзьмі часта ўтрымліваліся свойскія жывёлы і птушка.

Зразумела, фармальна сяляне маглі выказаць незадаволенасць памерамі паншчыны, аброку, іншых павіннасцей. Маглі нават адмовіцца іх выконваць. Толькі і расправа з імі была суровай. Інвентар уладання Горкі пад Дзісной, напрыклад, паведамляе, што за непадпарадкаванне і іншыя парушэнні сяляне атрымлівалі ад пяці да 30 удараў прутом.

У 1846—1848 гг. на 7740 сялянскіх двароў памешчыцкіх сялян у павеце прыходзілася 137 706 дзесяцін зямлі, у тым ліку 101 263 — ворыва і 33 443 — сенакосаў, або па 13,1 дзесяціны ворыва і 4,3 — сенакосаў на гаспадарку. На рэвізскую душу надзел складаў 3,3 дзесяціны.

Крыху адрозніваласа становішча дзяржаўных сялян. Надзельнае землекарыстанне ў іх складала каля 20 дзесяцін. За яго назначаўся грашовы чынш у 12 руб. 50 кап. з цяглавых і 7 руб.

9 кап. з паўцяглавых гаспадарак. Агароднікі плацілі за агарод (сядзібу) і асабісты чынш па 1,5 руб. з кожнага рабочага мужчыны. Пры тым цяглавым лічыўся двор, які меў двух коней, паўцяглавым — з адным канём, а агародны жыў за кошт агарода.

Буйнейшымі дзяржаўнымі ўладаннямі з'яўляліся Перабродцзе і Курылавічы. Напрыклад, інвентар 1852 г. паведамляе, што ў маёнтку Перабродцзе было 105 цяглавых, 34 паўцяглавыя і 7 агародных гаспадарак, жылі 822 чалавекі. Яму належалі таксама возера і пiцейная ўстанова. Больш высокія ўраджаі тут забяспечвалі жыта, гарох і авёс. Лён і каноплі — «мануфактурныя» культуры — вывозілі ў Друю і Дзінабург (Даўгаўпілс).

Трэба адзначыць, што ў 50-я гады мінулага стагоддзя значна ўзмацнілася маёмаснае расслаенне сялян. Той жа інвентар перабродскага ўладання сведчыць, што 18 гаспадарак мелі тут не па аднаму, а па два ўчасткі — каля 40 дзесяцін зямлі, тры гаспадаркі — нават па тры ўчасткі (каля 60 дзесяцін). Не аднолькавай была таксама забяспечанасць рабочым і прадукцыйным статкам. Напрыклад, у в. Забор'е некаторыя гаспадаркі мелі па 5 коней і столькі ж свіней, па 8 кароў і столькі ж авечак. У Мілейках — па 6 коней і свіней, па 10 кароў і авечак. А ў Масеўцах у аднаго селяніна было нават 12 кароў.

Аднак большасць сялян была беднай. Так, са 146 гаспадарак перабродскага ўладання толькі дзесяць мелі па 4 і больш коней. Але і гэтая меншасць ужо завязвала сувязі з рынкам для рэалізацыі атрыманай прадукцыі.

Аналагічнае становішча было ў маёнтках Курылавічы, Новы Пагост і інш. Развіццю капіталізму ў вёсцы садзейнічалі перавод у 40-х гадах XIX ст. дзяржаўных уладанняў з «гаспадарчага» (натуральнага) на грашовы чынш, ліквідацыя фальваркаў.

Развіццё капіталістычных адносін выклікала сацыяльную напружанасць у горадзе. Сведчыць аб гэтым, напрыклад, прашэнне мяшчан Дзісны мінскаму грамадзянскаму губернатару за 1841 г., якія скардзіліся, што з-за беднасці земляробства яны вымушаны займацца заробкамі на суднаходнай Заходняй Дзвіне. Некаторых грамадзян, якія не ведаюць сакрэтаў «ремесла и рукоделия», толькі гэта і корміць. Аднак вось ужо пяць гадоў, як «летнім часам штогод наязджаюць у г. Дзісну Курляндскай і Ліфляндскай губерняў з розных месц, называючыся латышамі, на лодках, прастойваюць да закрыцця ракі, робяць вялікі падрыў у заробках, а менавіта: нагружаюць і выгружаюць з суднаў (барак) тавары, дастаўляюць іх у Якубштат і Рыгу, ды звыш таго займаюцца нават і зняццем з месц спыніўшыхся па мелкаводдзю суднаў, робяць іншыя малыя падвозы ў г. Полацк і Віцебск і адтуль», «пребывают в празднестве», «мы ж, з просячых, г. зн. мяшчан г. Дзісны, некаторыя мелі свае лодкі колькасцю 10, змяшчаючы грузу да 1600 пудоў, каштуе кожная самай нізкай цаной па 75 руб. срэбрам, да з'яўлення ў г. Дзісну латышоў лодкі выкарыстоўваліся заўсёды на вышэйназваныя патрэбы, але цяпер лодкі без выкарыстання на беразе ракі Дзісны стаяць і прыходзяць ад вільгаці ў непрыгоднасць». У выніку, як пісалі мяшчане, яны могуць пазбавіцца лодак і мець значныя страты, «ды прытым па цяперашняму неўраджаю хлеба і дарагоўлі даведзены да самабяднейшага становішча, так што не толькі не ў стане заплаціць дзяржаўныя падаткі, але нават пазбаўляемся з сямействамі дзённага харчавання».

Мяшчане прасілі, каб у час прыбыцця ў Дзісну латышоў, а іх прыязджала да 3 тыс., ім было забаронена наймаць транспарт у горадзе, рабіць пагрузку і разгрузку тавараў і іх дастаўку ў розныя месцы, акрамя прывозу, «а менавіта з мяжуючай Беларускай (г. зн. Віцебскай) губерні».

Што да спажывання спіртнога, губернатар становішча ведаў, бо ў тым годзе ў Дзісну завезена 1790 вёдраў віна, хлебнай гарэлкі і спірту, якімі гандлявалі 8 лавак «чырвонага тавару» з 68 і 9 піцейных дамоў[17]. Але яму не было ніякай справы да развіцця эканомікі ці павышэння занятасці насельніцтва. А ў той час на 3345 гараджан былі 2393 рамеснікі, сярод якіх па аднаму медніку і маляру, 2 бляхары, па 3 кавалі, слесары і рымары, 5 сталяроў, 6 пільшчыкаў, 13 цесляроў, 26 краўцоў, 32 абутнікі і 56 ганчароў. Але галоўны занятак, як паведамляла гадавая статыстычная справаздача, — «рукоделие»[18].

У 1841 г. даходы гарадскога бюджэту склаліся з адкупных сум з прыезджых купцоў (1654 руб. срэбрам), збору за афармленне дакументаў (186 руб.), аплаты за перавоз праз Дзвіну і Дзісну (614 руб.), земляробства давала 87 руб., млыны — 1 руб. 42 кап., узважванне і вымярэнне рэчаў — 13 руб., утрыманне гасцініцы — 14 руб., пастаялых двароў і лазні — 20 руб., карчмы — 1 руб. 50 кап. Гэтыя сродкі расходаваліся на ўтрыманне прысутных месц (946 руб.), чыноўнікаў, служкаў і канцылярскія матэрыялы (638 руб.), начальніка прыходскага вучылішча (240 руб.), рамонт двух драўляных мастоў (23 руб.), вартаўнікоў (60 руб.) і інш.

У параўнанні з бюджэтам 1829 г. даходы і расходы горада становяцца меншымі. А ў гэты час Дзісна мела прыходскае вучылішча, у якім працавалі два настаўнікі і займалася 35 хлопчыкаў. У гарадской турме ўтрымліваліся 162 асуджаныя.

Дзісна ўсё яшчэ з'яўляецца значным гандлёвым цэнтрам, але на знешні рынак у 1841 г. яна пастаўляе мала мясцовых тавараў: 200 беркаўцаў лёну (32 т), 600 чвэрцяў ільнасемя, 7000 чвэрцяў жыта (504 т).

Перамогай развіцця капіталістычных адносін стала рэформа 1861 г. На Дзісеншчыне, як і ва ўсёй Віленскай губерні, яна праходзіла па асобаму палажэнню, якое замацоўвала за сялянамі дарэформенны надзел, хоць памешчык мог у некаторых выпадках паменшыць яго на шостую частку. Да заключэння выкупу павіннасць сялян скарачалася на 10 %. Дваровыя людзі два гады пасля рэформы былі залежнымі ад памешчыка, а затым вызваляліся без зямлі.

Такім чынам, аграрнае пытанне вырашалася не на карысць большасці насельніцтва, што выклікала новы ўздым нацыянальна-вызваленчага руху ў Беларусі. Пачаўшыся ў Польшчы, паўстанне 1863 г. перакінулася на беларускія землі. Варта адзначыць, што і ў 1930—1931 гг. спалучэнне польскага нацыянальна-вызваленчага руху і барацьбы беларускага народа супраць сацыяльнага прыгнёту прывяло да паўстання і на Дзісеншчыне. Яно было задушана царскім урадам, а яго ўдзельнікі жорстка пакараны.

Пасля паўстання царскі ўрад правёў шмат пераўтварэнняў, накіраваных на ўмацаванне самадзяржаўя. Быў адменены Статут Вялікага княства Літоўскага і ўведзена расійскае заканадаўства, гвалтам аб'яднана уніяцкая царква з праваслаўнай, спачатку духавенства, а затым цэрквы і касцёлы пазбаўлены зямельных уладанняў, ліквідаваны ленныя ўладанні, якія да падзелу Рэчы Паспалітай з'яўляліся ўласнасцю шляхты (як Чэрасы — уладанне Радзівілаў). Аднак усё гэта не выкараняла прычыны сацыяльных канфліктаў. Таму аграрная рэформа, звязаная з адменай прыгону, выклікала новую хвалю нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі. Да паўстання заклікала сялян таксама газета «Мужыцкая праўда», якую з сярэдзіны 1862 г. выдавалі К. Каліноўскі, В. Урублеўскі, Ф. Ражанскі. Распаўсюджвалася яна і ў Дзісенскім павеце. Пры гэтым паліцэйскі паведамляў, што распаўсюджвальнікаў-агітатараў «никаким образом открыть не мог, а только почерпнул точные сведения, что значительное количество таких листовок раз-

бросано по деревням и корчмам», ды яму яшчэ стала вядома, што распаўсюджвалі іх два чалавекі, якія ездзілі ноччу на павозцы.

У студзені 1863 г. паліцыя паведамляла, што ў Дзісенскім павеце зноў «появились печатные экземпляры возмутительного обращения, которые возбуждали крестьян против православной веры и против правительства... Ночью неизвестно кем прибиты были маленькими гвоздями к домам и другим строениям сельских обывателей... печатные листы содержания предосудительного в 2 частях за №№ 5, 6 под заглавием «Мужыцкая праўда» (найдено всего 9 листов). Крестьяне, заметив прибитые к их домам, на воротах и столбах какие-то листки, оторвали их из интереса, некоторые из них, хотя малограмотные, читали, когда узнали, что в этих обращениях помещено, на словах объясняли другим крестьянам»[19].

Непаслядоўнасць у аграрнай палітыцы, лозунг аб аднаўленні Польшчы ў межах 1772 г. адштурхнулі ад паўстанцаў беларускае сялянства, у тым ліку і на Дзісеншчыне. Вынікам яго з'явілася толькі зніжэнне на 20 % выкупных плацяжоў. А царскі ўрад, жадаючы зусім вытравіць з памяці народа яго самастойную дзяржаўную гісторыю ў складзе Вялікага княства Літоўскага, забараніў беларускую мову.

Пасля рэформы 1861 г. расслаенне сялянства ўзмацнілася, абеззямельванне выклікала адыходніцтва, «запашніцтва» — напалову прыгонніцкую форму найму. Да 1893 г. у павеце 12 % сялянскіх двароў ужо не валодалі зямлёй, калі ў сярэднім па Віленшчыне становішча не было такім трагічным — толькі 9 % беззямельных двароў. Да 1900 г. 17,4 % гаспадарак не мелі коней.

Шматлікім вяскоўцам дало заробак будаўніцтва чыгункі Пецярбург — Варшава ў 1860 г. А да 1907 г. адыходніцтвам было ахоплена 12,8 % усяго сельскага насельніцтва. Многія эмігравалі ў больш развітыя краіны. Дзісенцы часта выязджалі ў Прыбалтыку, у сталіцу і яе наваколле, знаходзілі прытулак і кавалак хлеба ў розных іншых, часта аддаленых кутках Расіі.



Будынак бальніцы ў Дзісне

Руіны бальніцы

Аб гэтым сведчыць, напрыклад, той факт, што адзін з завулкаў Пецярбурга называўся Дзісенскім.

У штогадовым выданні «Уся Расія» на пачатку XX ст. ёсць паведамленне, што маёнтак Ялавіцкага Франопаль называецца адным з лепшых у краіне па развіцці жывёлагадоўлі. А «Памятная кніжка Віленскай губерні» за 1895 г. апавядае, што ў Лявонпальскай воласці была распаўсюджана арэнда кароў, пры гэтым у год плаціць трэба было за жывёліну 15 руб. (Для параўнання: пуд масла ацэньваўся ў 9 руб., літр малака — 2—3 кап. Пры гэтым сярэдні надой складаў каля 300 вёдраў.)

І ўсё ж з развіццём капіталізму асаблівага эканамічнага ажыўлення ў нашым краі не адбылося. На мяжы XX ст. у Дзісне дзейнічалі толькі два цагельныя заводы, некалькі ганчарных майстэрняў і 259 краўцоў[20]. Колькасць насельніцтва павялічвалася марудна. У 1886 г. у Дзісне жыло 6496 чалавек, у 1897 г. — 6756. Кожнае дзесяцігоддзе горад «ачышчаўся агнём і вадой». Вялікія пажары былі ў 1865, 1872, 1882 гг., значныя страты нанеслі паводкі 1870 і 1878 гг. Тройчы за стагоддзе тут прайшоўся голад з-за неўраджаяў. 1848 г. адзначаны эпідэміяй халеры. І зноў Дзісна і павет пацярпелі больш, чым бліжэйшыя суседзі. Ды і звычайная смяротнасць насельніцтва была высокай. З ёй не маглі справіцца адзін лекар ды некалькі яго вучняў.

Калі меркаваць па колькасці жыхароў, Дзісна на рубяжы цяперашняга стагоддзя была даволі значным населеным пунктам. Затое Міёры нічым асаблівым не вызначаліся. У 1905 г. у будучым райцэнтры было толькі 135 жыхароў, 60 мужчын і 75 жанчын. У суседніх Масеўцах жыло 110 сялян, у Канахах — 142, Свярдлах — 150, Грэцкіх — 158 сялян.

Па перапісу 1897 г., у павеце жылі 204 923 чалавекі, з іх пісьменных — 22,5 %. Назвалі роднай мовай рускую 12 129 чалавек, украінскую — 23, беларускую — 166 141, польскую — 4928, літоўскую — 703, латышскую — 120, нямецкую — 106, французскую — 1, цыганскую — 3 чалавекі. Па веравызнанні насельніцтва размяркоўвалася так: праваслаўных —

107 953 чалавекі, стараверaў — 9484, каталікоў — 66 294, іудзееў — 20 730 чалавек.

Аб стварэнні сістэмы народнай асветы ў нашых мясцінах можна гаварыць толькі ў адносінах да другой паловы XIX ст., пасля адмены прыгонніцтва. Так, да 1877 г. на тэрыторыі сучаснага раёна ўжо дзейнічала 11 народных вучылішчаў. Дзісенскае двухкласнае вучылішча да гэтага часу дапаўняецца жаночай зменай. У 1877/78 навучальным годзе ў ім займалася 50 хлопчыкаў і 26 дзяўчынак. Народныя вучылішчы вучылі дзяцей у Міёрах (1866 г., 32 вучні), Чэрасах (1863), Лявонпалі (1862 г., 29 хлопчыкаў і адна дзяўчынка), Сцефанполлі (1869 г., 25 хлопчыкаў і адна дзяўчынка), Галомыслі (1864 г., 47 хлопчыкаў), Язне (пераведзена з Грыгаравіч, дзе існавала з 1864 г., займаліся 63 хлопчыкі і адна дзяўчынка), Новым Пагосце (1864 г., 42 хлопчыкі), Перабродцзі (1858 г., 37 хлопчыкаў). Паводле іншых крыніц, з 1 лістапада 1887 г. у Язне працавала царкоўна-прыходская школа, у Дзісне — яшчэ адно двухкласнае вучылішча, заснаванае ў 1865 г.

Толькі ў 1899 г. гэтая сістэма папоўнілася народным вучылішчам у Мілашове, на чатырох аддзяленнях якога займалася 180 вучняў ва ўзросце ад 10 да 20 гадоў. Навучанне вялі два настаўнікі. У 1911 г. гэтая школа становіцца царкоўна-прыходскай і застаецца такой да 1920 г.

Яшчэ 40 вучняў села за парты ў 1912 г. у в. Чурылава. У 1915 г. атрымалі магчымасць вучыцца ў школе 49 дзяцей з в. Чурылава Бліжэйшае.

Зразумела, найбольш актыўна школьнае будаўніцтва ішло ў павятовым цэнтры. Тут у 1904 г. на 9113 жыхароў былі ўжо чатыры пачатковыя школы, у іх займалася 700 дзяцей. Аб эфектыўнасці сістэмы народнай асветы асабліва гаварыць не даводзіцца, бо і па перапісу 1912 г. колькасць пісьменных заставалася на ранейшым узроўні — 22,5 %.

Сведчанні аб «шпітальнай» справе не такія багатыя. Вядома, што ў 20-я гады мінулага стагоддзя пачынаюць работу бальніцы ў павятовых гарадах для ваенаслужачых. А з 1835 г. памешчыкам таксама ўказвалася ствараць такія ж лячэбныя ўстановы для сялян. Таму з'явіліся бальніцы «в селениях Селиском и Чересском» Дзісенскага павета (вёскі Селішча і Чэрасы)[21]. Бальніцы тут былі абсталяваны дрэнна, але самую неабходную дапамогу насельніцтву аказвалі. Да 1904 г. у Дзісне ўжо былі бальніца, аптэка, працавалі 3 ўрачы, 2 акушэркі і 7 фельчараў[22].

Павятовы цэнтр меў дзве царквы, касцёл і чатыры сінагогі, 14 піцейных устаноў. У пачатку стагоддзя тут была адбудавана турма, у якой утрымлівалася да 200 зняволеных. Яе абслугоўвала спецыяльная канвойная каманда. Горад меў 17 гарадавых і 40 стражнікаў.

[1] Расійскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў. Ф. ВУА, 1793 г. Спр. 16 537. Л. 35.
[2] Историко-статистические очерки Виленской губернии. Вильно, 1852. С. 136.
[3] Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 1374. Воп. 1. Спр. 395. Л. 4—6.
[4] Белоруссия в эпоху феодализма: В 3 т. Мн., 1961. Т. 3. С. 112.
[5] Улащик Н. Н. Предпосылки крестьянской реформы в Литве и Западной Белоруссии. М., 1965. С. 376.
[6] Тарле Е. В. 1812 год. М., 1959. С. 487.
[7] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 3..С. 495.
[8] Там жа. Т. 3. С. 513—515.
[9] Там жа. С. 516.
[10] Там жа. С. 511.
[11] Там жа. С. 429, 452.
[12] Улащик Н. Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. С. 176.
[13] Там жа. С. 182, 267.
[14] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 3. С. 441.
[15] Улащик Н. Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. С. 376.
[16] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 3. С. 82.
[17] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 833. Л. 16.
[18] Там жа. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 763. Л. 17.
[19] Смірноў А. П. Кастусь Каліноўскі ў паўстанні 1863 г. Мн., 1959. С. 84.
[20] Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917 гг.). Мн., 1953. Т. 3. С. 121.

[21] Грицкевич В. П. С факелом Гиппократа: Из истории белорусской медицины. Мн., 1987. С. 60.
[22] Документы и материалы по истории Белоруссии. С. 247.

Л. А. Матэленак

Паўстанне 1831 г. у Дзісенскім павеце

29 лістапада 1830 г. у Варшаве ўспыхнула паўстанне супраць рускага царызму. Падтрыманыя масамі гарадскога насельніцтва, паўстанцы захапілі горад. За кіраўніцтва паўстаннем змагаліся розныя плыні польскага нацыянальнага руху: шляхецкія рэвалюцыянеры, якія адстойвалі лозунгі буржуазна-дэмакратычных пераўтварэнняў, і кансерватыўна-арыстакратычныя колы, якія ставілі сваёй мэтай толькі аднаўленне Польшчы ў граніцах 1772 г. Рэвалюцыйныя сілы Польшчы не змаглі ўзначаліць паўстанне. Падзеі развіваліся пад уплывам сярэдняй шляхты і арыстакратаў. Падрыхтоўку паўстання ў Беларусі вялі мясцовыя польскія і апалячаныя шляхціцы, польская інтэлігенцыя, афіцэры і чыноўнікі-палякі, каталіцкае і уніяцкае духавенства, спецыяльныя эмісары Каралеўства Польскага. На пачатку 1931 г. для падрыхтоўкі паўстання ў Беларусі і Літве быў створаны Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт. У ім у большасці былі прадстаўнікі кансерватыўнага лагера. У сакавіку 1831 г. паўстанне распаўсюдзілася на Літву і заходнюю частку Беларусі: Ашмянскі, Браслаўскі, Вілейскі і Дзісенскі паветы. У ім прынялі ўдзел каля 10 000 чалавек. Асноўнае ядро паўстанцаў складалі польская шляхта, навучэнская моладзь, афіцэры-палякі.

У Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы захоўваюцца багатыя матэрыялы камісіі, створанай для вызначэння ступені віны ўдзельнікаў паўстання 1831 г. На аснове гэтых матэрыялаў можна яскрава ўявіць, як праходзіла паўстанне на тэрыторыі Дзісенскага павета. Цэнтрам паўстання аказалася мястэчка Лужкі.

Падрыхтоўка да паўстання ў Дзісенскім павеце пачалася ў сакавіку 1831 г. Галоўным сакрэтным начальнікам па падрыхтоўцы паўстання быў памешчык з Ёдаў Аляксандр Лапацінскі. Змова памешчыкаў выявілася ў мястэчку Шаркоўшчына, куды Лапацінскі на 10 красавіка склікаў землеўладальнікаў павета з дапамогай пісьмаў і сваіх агентаў — Багуцкага, Хомскага і інш. У гэты дзень у Шаркоўшчыну прыехалі некаторыя памешчыкі і два ксяндзы, а 11 красавіка ўсе яны наведаліся ў Лужкі, куды 12 красавіка з'явіліся збегшыя з Дзвінска юнкеры і ўслед за імі яшчэ некалькі памешчыкаў. У Лужках яны склалі першапачатковы акт польскай Канфедэрацыі і пачалі запрашаць да сябе памешчыкаў і іншых асоб. 13 красавіка ў Лужках сабралася больш 50 памешчыкаў. Яны склалі канчатковы акт, які быў напісаны ксяндзом піяраў Адамам Татурам, далі клятву на агульнае паўстанне супраць Расіі для ўтварэння Польскай дзяржавы ў граніцах 1772 г. (да першага падзелу Рэчы Паспалітай) і ўтварылі Урадавы камітэт, выбраўшы старшынёй камітэта памешчыка з Плісы Рамуальда Падбіпенту. Перад гэтым да Падбіпенты ў яго маёнтак Сельцы з'явіліся са зброяй 4 юнкеры — Пэнгоўскі, Пржэсецкі, два Плятары — Лук'ян і Фердынанд. Яны запрасілі да састаўлення Урадавага камітэта і паўстання Міхаіла і Адама Куроўскіх, якія былі ў Сельцах, у Падбіпенты, а таксама графа Бржастоўскага, Яна і Нестара Буйніцкіх, а потым адправіліся за Паўлам Міхалоўскім і інш. У выніку абмеркавання ў склад Урадавага камітэта ўвайшлі граф Аўгуст Бржастоўскі, граф Антон Шырын, памешчыкі Павел Міхалоўскі, Антон Корсак, Бенядзікт Кліёт, Фелікс Багуцкі. Кандыдатамі ў члены Урадавага камітэта былі выбраны Фларыян Карказевіч, Ян і Нестар Буйніцкія, Адам Куроўскі, Ян

Удзельнікі паўстання 1861 г. на Дзісеншчыне. Злева направа: А. Рыпінскі, Л. Плятар, Я. Кліёт, А. Пэнтоўскі

Карпіцкі, Томаш Мірскі, Канстанцін Валасоўскі, Адам Кастравіцкі.

Праз некалькі дзён быў складзены Экзаменацыйны камітэт, ці Следчы, старшынёй якога быў назначаны граф Міхаіл Храпавіцкі, але калі ён захацеў быць у войску, то на яго месца быў выбраны Пётр Вінча. Членамі Экзаменацыйнага камітэта былі выбраны Аўгуст Хомскі і Іосіф Корсак.

Для грамадзянскага кіравання паветам былі назначаны каменданты і камісары.

Па ваеннай частцы быў назначаны галоўным начальнікам войска падпалкоўнік у адстаўцы з польскіх войск Валенцій Брахоцкі, якога на гэту пасаду ездзілі запрашаць у Глыбокае Казімір Заліўскі і Аляксандр Лапацінскі. Памочнікам Валенція Брахоцкага быў назначаны памешчык з Лепельскага павета Алёйзій Буйніцкі, начальнікам кавалерыі — граф Міхаіл Храпавіцкі, а пасля яго — Мікалай Кліёт.

Са зместу прадпісанняў, пасланых памешчыкам Дзісенскага павета 14 і 16 красавіка, і Звароту да яўрэяў м. Глыбокае ад 23 красавіка бачна, што мэта паўстання заключалася ў аддзяленні ўсіх польскіх правінцый ад Расіі і ў злучэнні з Каронай Польскай. Сялянам і іншым саслоўям аб'явілі, што «в настоящее жалкое положение они приведены управлением России через чиновников, их притесняющих, 25-летнею военной службой и лихоимством во всех отраслях управления».

Для дасягнення мэты паўстання кожны павінен быў даць клятву «посвятить жизнь и имение, исполнять беспрекословно постановления Конфедерации и ее повеления и для общего блага устраняя собственную любовь, отрекаясь от всех личных обид, с тем, что не будет желать никаких почестей и отличий, кроме только тех, которым общее согласие или повеление установленного правительства призывать будет, а иначе

поступая, признает себя заслуживающим наказания справедливого суда Божия и вольного народа, подвергая себя всеобщему пренебрежению».

Сродкі для дасягнення мэты паўстання вызначаліся прадпісаннем Урадавага камітэта ад 14 красавіка, каб кожны памешчык на другі дзень сам з'явіўся на кані ў Лужкі са зброяй, даставіў разам з сабой з 7 рэвізскіх душ аднаго чалавека ад 18 да 40 гадоў, адзетага, з 2-тыднёвым правіянтам, шляхта вакалічная з двух дамоў — аднаго ўзброенага кавалерыста з правіянтам.

У Звароце да яўрэяў м. Глыбокае камітэт заклікаў іх «к совместному соединению всеми силами и способами к умножению вооруженной силы для упомянутого дела с тем, что и израильский народ, будучи преисполнен теми же чувствами, с нетерпением ожидает минуты воззвания себя к общей помощи и принесению пожертвований, какие в настоящих обстоятельствах суть необходимы». Далей у Звароце гаварылася, што калі яўрэі не могуць паставіць са свайго асяроддзя воінаў-добраахвотнікаў, то няхай прынясуць добраахвотныя ахвяраванні ў грашах і рэчах — сукно, палатно, коней, запасы, порах, свінец. «Кто больше принесет, тем сильнее удостоверит комитет о действительном и искреннем чувстве израильского народа в восстановлении общего блага и предоставит ему неоспоримое право участвовать в той свободе, какую счастье определит быть жребием».

Яўрэйскаму кагалу м. Глыбокае прапаноўвалася на першы выпадак ахвяраваць на ўтрыманне польскіх войск грашамі па 30 капеек серабром з кожнай душы і даставіць у Лужкі, колькі можна, пораху, сукна на абмундзіраванне 18 юнкераў, якія паступілі з расійскага войска ў польскае.

Названыя прадпісанні Урадавага камітэта, акт Канфедэрацыі, клятва і Зварот да яўрэяў былі разасланы паўсюдна па Дзісенскаму павету да камендантаў і ключавых камісараў, і ім было загадана: «1) развезти или разослать по всем помещикам предписания комитета и опубликовать акт Конфедерации и обращение к евреям; 2) пригласив священников, привести всех жителей к присяге, а евреев отослать для этого в м. Глубокое; 3) троекратно объявить в церквах и костелах акт Конфедерации, внушать крестьянам и другого сословия людям, что помещики сделали восстание не для иной цели, как только для отыскания отечества и святости религии, равно законов, приличных вольному народу, и поправления состояния крестьян, которые приведены в жалкое состояние через рекрутство и вообще притеснительное управление чиновников; 4) высылать вооруженных людей, конных и пеших по одному с 7 душ всех вообще имений, доставить магазины для содержания войска; учинить воззвание к помещикам и всем жителям о принесении добровольных пожертвований, поставить караулы от всякого ключа до главной квартиры, нарядить внутреннюю стражу в отношении повиновения крестьян помещикам; наблюдать, дабы не были передерживаемы бежавшие из службы воинские чины, под ответственностью военного суда».

За невыкананне гэтых прадпісанняў камітэт пагражаў камісарам строгімі пакараннямі, аж да смяротнай кары. Дадзена была таксама інструкцыя войску: «Сохранять подчиненность, спокойствие и вообще порядок для сохранения безопасности как личной, так и в отношении имения». Інакш пагражала смяротная кара. Начальнік войска Брахоцкі загадам ад 21 красавіка заклікаў усіх памешчыкаў, каб яны, згодна з пастановай Урадавага камітэта, выконвалі ўсякія рэквізіцыі і патрабаванні. Па яго загаду былі пастаўлены ў Лужках шыбеніцы. Памешчыкам, якія знаходзіліся на ваеннай службе, Брахоцкі гаварыў, што ён іх не надзяляе чынамі, каб яны былі да часу роўныя.

Вялікую дапамогу ў арганізацыі войска аказаў Лужацкаму камітэту Глы-

боцкі кармеліцкі манастыр. Ён паставіў са свайго маёнтка 300 чалавек сялян, выдзеліў 6 сваіх ксяндзоў у распараджэнне Урадавага камітэта.

23—24 красавіка 1931 г. паўстанцы ў колькасці да 3000 чалавек выйшлі з Лужкоў для ўзяцця Дзісны. Горад Дзісна быў разрабаваны. У руках паўстанцаў ён знаходзіўся на працягу трох сутак. Рускія войскі пад камандаваннем палкоўніка Макарава ачысцілі Дзісну ад канфедэратаў. Брахоцкі паслаў даведацца аб сіле рускіх войск, размешчаных на тэрыторыі Віцебскай губерні. Асаблівую надзею ён меў на Лепельскі павет, асабліва на памешчыкаў — братоў Антона і Іосіфа Рэутаў, Валадковіча, Шчыта, Забелу і Антонія Сяляву.

27 красавіка Брахоцкі паслаў пад кіраўніцтвам Іосіфа Сямашкі 25 чалавек конных у м. Ушачы. Сюды яны прыбылі 29 красавіка, правялі разведку аб месцазнаходжанні рускіх войскаў. На шляху ва Ушачы атрад быў прыняты з асаблівай радасцю памешчыкамі Забелай, Чаховічам і Любінскім. Нарэшце, сабраўшы неабходныя звесткі, атрад вярнуўся ў Лужкі.

Выцесненыя з Дзісны Макаравым польскія войскі і 3 мая генералам Саф'янавым віленскія і ашмянскія паўстанцы з м. Глыбокае злучыліся зноў у Лужках. Надзеі ўтрымацца ў Дзісенскім павеце ўжо не было.

4 мая яны раздзяліліся на дзве часткі. План Брахоцкага заключаўся ў тым, каб сабраць больш войска і ісці ў Вілкамір (цяпер г. Укмерге ў Літве) для злучэння з вілкамірскімі паўстанцамі і разам рухацца да Вільні. Урадавы камітэт у Лужках хацеў трымаць войска на месцы для аб'яднання з паўстанцамі ў Лепельскім і Барысаўскім паветах. Але Брахоцкі ўзяў войска і пайшоў праз Мосар у Браслаўскі павет, а адтуль далей, да Вілкаміра, абяцаючы хутка вярнуцца, гаворачы, што робіць гэта для дабра іх саміх, а членам Урадавага камітэта загадаў разыходзіцца.

Рускія войскі пад камандаваннем М. Н. Мураўёва (магілёўскі губернатар) у хуткім часе разгромілі паўстанцкія атрады. Прыбыўшы ў м. Глыбокае 18 мая, Мураўёў запрасіў туды памешчыкаў Дзісенскага павета, нікому не паказваючы сваіх сапраўдных намераў, з тым, каб даць час з'ехацца больш вінаватым. У Глыбокім было толькі два эскадроны гусар. Мураўёў, які праводзіў следства, пісаў, што мала заставалася людзей, не замешаных у паўстанні, што, апрача названых ім «самых злобных мятежников, и прочие помещики действовали с усердием, и хотя чувствовали нелепость своего предприятия, но не смели уже отстать, опасаясь мщения прочих».

Мураўёў адправіў у Дзінабургскую крэпасць 15 чалавек, якія займалі галоўныя месцы ў Канфедэрацыі і складалі Урадавы камітэт: старшыню Рамуальда Падбіпенту, членаў камітэта — графа Аўгуста Бржастоўскага, графа Антонія Шырына, Паўла Міхалоўскага, Антонія Корсака, Фелікса Багуцкага і Бенядзікта Кліёта. «Дух в помещиках, — пісаў Мураўёў, — значительно улучшился (после отправления некоторых в крепость); они увидели, что с ними не шутят, и вдруг сделались усерднее... Дворянство даже собственным своим побуждением просило меня об единой милости: дозволить им изложить в особом акте изображение чистосердечного своего раскаяния».

У канцы жніўня 1831 г. паўстанне было задушана ва ўсіх паветах Беларусі і Літвы, а затым і ў Польшчы. Асноўнай прычынай няўдачы паўстання было тое, што яно не апіралася на шырокія масы сялян, якія засталіся ўбаку ад падзей. Большасць сялян і мяшчан была мабілізавана ў паўстанцкія атрады сілай. Упэўніўшыся, што паўстанне ім нічога не дае, сяляне пакідалі атрады. Шляхецкае кіраўніцтва не ставіла задачы ліквідацыі прыгоннага права і таму не атрымала падтрымкі з боку сялян.

Пасля падаўлення паўстання многія яго ўдзельнікі былі аддадзены пад суд.

У шляхты канфіскавалі маёнткі, асоб недваранскага паходжання аддавалі ў салдаты, высылалі ў Сібір на пасяленне. У заходніх губернях царскі ўрад правёў некаторыя адміністрацыйныя і палітычныя мерапрыемствы, накіраваныя на ўмацаванне яго ўлады. Рускім дваранам і чыноўнікам раздаваліся канфіскаваныя і казённыя маёнткі ў гэтых губернях. З Расіі перасяляліся казённыя сяляне. Але гэта мерапрыемства не дало чаканых вынікаў. Новыя ўладальнікі маёнткаў звычайна хутка іх прадавалі, сяляне перасяляліся неахвотна. Другім мерапрыемствам, якое атрымала назву «разбору шляхты», было пазбаўленне дваранскага звання шляхціцаў, якія не маглі пацвердзіць дакументальна сваю прыналежнасць да гэтага саслоўя. Большасць дробнай шляхты не магла даказаць сваё дваранскае паходжанне і была пераведзена ў саслоўе аднадворцаў, усяго звыш 10 000 шляхецкіх сем'яў. Яны абкладваліся падаткамі і павіннасцямі як дзяржаўныя сяляне. Значная колькасць сем'яў аднадворцаў, у тым ліку з Дзісенскага павета, была пераселена ў паўднёвыя губерні Расіі.

Былі прыняты меры па русіфікацыі органаў кіравання, суда, асветы. У адміністрацыйныя ўстановы назначаліся галоўным чынам рускія чыноўнікі. У 1840 г. адменена дзеянне Літоўскага статута. На Беларусі распаўсюджвалася рускае заканадаўства. Усе судовыя, адміністрацыйныя і грамадскія акты павінны былі складацца толькі на рускай мове. Забаронена было выкладаць польскую мову як асобны прадмет. У 1832 г. быў закрыты Віленскі універсітэт. У Лужках у тым жа годзе была зачынена знакамітая школа пры піярскім манастыры, заснаваная ў 1741 г. полацкім каштэлянам Валяр'янам Жабай, у якой займаліся вучні з розных паветаў Беларусі, Літвы, Латвіі, Украіны. Царскім указам было забаронена ўжываць тэрміны «беларускія» і «літоўскія» губерні і ўведзена назва «Северо-Западный край» (1840). Полацкім царкоўным саборам у 1839 г. уніяцкая царква была аб'яднана з праваслаўнай, скарочана колькасць каталіцкіх манастыроў. У той жа час урад, занепакоены ростам сялянскага руху і польскім паўстаннем 1830—1831 гг., прыняў шэраг мер, якія былі накіраваны на некаторае паляпшэнне становішча сялян Беларусі і абмежаванне правоў польскіх памешчыкаў, што былі ў апазіцыі да царызму.

Усе прынятыя царскім урадам меры не змаглі прадухіліць уздым барацьбы сялянства, стрымаць развіццё грамадска-палітычнага руху ў Беларусі.

К. А. Кожан

Паўстанец і скульптар з Забалацця

Імя Генрыха Дмахоўскага — самаадданага рэвалюцыянера, палітычнага дзеяча і таленавітага скульптара XIX ст. вядома ўсяму свету. Пра яго жыццё напісаны дзесяткі кніг і сотні артыкулаў на рускай, польскай, англійскай, французскай і іншых мовах, аб ім пісаў міжнародны часопіс «Кур'ер ЮНЕСКА».

Архіўныя даведкі сведчаць, што нарадзіўся Генрых 14 кастрычніка 1810 г. у сям'і ўладальніка маёнтка Забалацце (цяпер цэнтр калгаса «Ленінскі шлях» Міёрскага раёна) Міхаіла Дмахоўскага. Бацька яго працаваў у гэты час у Вільні і таму некаторыя даследчыкі лічаць месцам нараджэння Г. Дмахоўскага таксама гэты горад. Дзяцінства ён правёў у нашых цудоўных мясцінах. Прыгажосць краю, азёр, рэк і лясоў абудзіла ў яго душы любоў да мастацтва, прагу да свабоды. Сям'я, у якой нарадзіўся будучы рэвалюцыянер-дэмакрат, славілася дэмакратычнымі і асветніцкімі традыцыямі. Бацька з'яўляўся сакратаром (пісарам) Адукацыйнай камісіі Віленскай навучальнай акругі, быў членам асветніцкіх таварыстваў. Дзядзька Юс-

тын загінуў у паўстанні 1831 г. Праўда, быў яшчэ дзядзька Казімір, які звязаў свой лёс з рэлігіяй і рабіў духоўную кар'еру сродкамі Іуды.

Бацька імкнуўся даць сыну добрую адукацыю і належнае выхаванне. Генрых вывучае права ў Віленскім універсітэце. Яго выкладчыкі Аляксандр Міцкевіч і Валерыян Пяткевіч вызначаліся рэвалюцыйнымі поглядамі. У будучым яны стануць вядомымі дзеячамі польскага нацыянальна-вызваленчага руху. Несумненна, што такія настаўнікі аказалі ўплыў і на Генрыха. Юнак удзельнічаў у арганізацыі рэвалюцыйных гурткоў у Вільні. Тут жа ўпершыню зрабіў крок па шляху авалодвання майстэрствам скульптара. Па некаторых звестках, ён браў урокі ў скульптара Казіміра Ельскага. Неўзабаве Г. Дмахоўскі становіцца доктарам права.

Але выбухнула паўстанне 1831 г., і Генрых Дмахоўскі цалкам аддае сябе барацьбе супраць царызму. Разам з іншай віленскай моладдзю ён змагаўся ў атрадзе Юзафа Заліўскага. Пасля разгрому Генрыху цудам удалося ўцячы, і ваенны трыбунал Мураўёва-вешальніка асудзіў яго завочна. Каб пазбегнуць кары, 21-гадоваму юнаку прыйшлося эмігрыраваць.

Але Дмахоўскі быў не з тых, хто складае зброю. І хоць разец скульптара ўсё больш вабіць яго, ён не можа пакінуць рэвалюцыйную барацьбу: у Францыі прымае актыўны ўдзел у дзейнасці Таварыства польскіх і рускіх зямель ад 1831 г., Саюзе польскіх карбанарыяў, Таварыстве невядомых. Энтузіязм маладых рэвалюцыянераў настолькі вялікі, што яны спрабуюць зрабіць «экспарт» рэвалюцыі, і ў 1833 г. узброены атрад паўстанцаў пад кіраўніцтвам Ю. Заліўскага пераходзіць граніцу Аўстрыі. Г. Дмахоўскі з'яўляецца кіраўніком аднаго з падраздзяленняў гэтай экспедыцыі. І зноў паражэнне. Становішча ў Аўстрыі ў той час не спрыяла рэвалюцыйнаму ўзброенаму паўстанню ўсяго народа.

Генрых Дмахоўскі

Тады рэвалюцыянеры мяняюць формы барацьбы. Генрых Дмахоўскі назначаецца кіраўніком паўстанцкіх сіл Віцебскай губерні і пераходзіць граніцу пад прозвішчам Эмерыка Сандэрса. Магчыма, ён узяў сабе за псеўданім прозвішча англійскага прафесара гравіравання ў Віленскім універсітэце Ю. Сандэрса.

Але прабрацца ў Віцебскую губерню не ўдалося. Па ўсёй заходняй частцы Расіі яшчэ дзейнічала ваеннае становішча. Паблукаўшы па Валыні і Палессі, ён вымушаны быў зноў вярнуцца ў Галіцыю, на тэрыторыю Аўстрыі, каб там разгарнуць агітацыйную работу па падрыхтоўцы ўзброенага паўстання. Але і ў далёкай ад Галіцыі Вільні царскія ўлады не забываліся на яго. Прозвішча Дмахоўскага не раз упаміналася ў розных канцылярыях. Гэтаму спрыялі і наступныя акалічнасці. Па-першае, у жніўні 1832 г. нечакана знік з горада з усімі сямейнымі каштоўнасцямі Міхаіл Дмахоўскі, бацька Генрыха. Пошукі яго вядуцца па ўсіх дарогах, бо царскія ўлады лічаць, што ён уцёк за мяжу, да мяцежніка-сына. Але неўзабаве ўдалося высветліць, што стары чалавек нікуды не ўцякаў са свайго дома. Ён быў жорстка закатаваны сваім лёкаем і яго хаўруснікамі.

У гэты ж час першы данос паступіў і на мяцежніка-сына. У чэрвені 1833 г. віленскі генерал-губернатар князь Даў-

гарукаў атрымаў данясенне: «Прэлат Віленскай кафедры Казімір Дмахоўскі прадставіў мне арыгіналам атрыманае ім з-за мяжы пісьмо ад свайго пляменніка Генрыха, сына прапаўшага без весткі Міхаіла Дмахоўскага, напісанае ў Лембергу (Львове). У пісьме гаворыцца, што ён, Г. Дмахоўскі, памяняў прозвішча сваё на Эмерыка Сандэрса і знаходзіцца ў вёсцы непадалёку ад горада Лемберга... Ён вельмі непакоіцца пра лёс бацькі свайго... Прычым просіць аб прысылцы яму грошай пад адрасам Эмерыку Сандэрсу ў Лембергу... А як паказаў злоўлены ў Беластоцкай волаcці зламыснік Пішчатоўскі, малады Дмахоўскі прызначаны эмісарам у Віленскую губерню, то пра ўсе гэтыя акалічнасці і пра змену прозвішча яго, Дмахоўскага, я абавязкам лічу пачціва данесці Вашаму сіяцельству з тым, што ці не пажадаеце Вы зрабіць начальніцкія па гэтаму прадмету з урадам Галіцыі зносіны».

Адразу заводзіцца сакрэтная справа «пра Генрыха Дмахоўскага, што знаходзіцца за мяжою». Між іншымі папераміі там знаходзіцца выпіска з паказанняў Адама Пішчатоўскага: «Заўжды быў пры Заліўскім і цяпер павінен ужо знаходзіцца за Дзвіною, прыйшоўшы праз Жэмайцію».

24 красавіка 1834 г. да генерал-губернатара Даўгарукава звярнуўся варшаўскі генерал-губернатар: «Па атрыманых аўстрыйскім урадам звестках, што нейкі Генрых Дмахоўскі, які служыў у мяцежніцкай арміі, таварыш злаўмысніка Заліўскага, хаваецца цяпер у аколіцах Леапаля (Львова), галіцкае начальства просіць даставіць прыкметы яго для зручнейшага адшукання гэтага зламысніка».

Па загаду губернатара чыноўнік пабываў у Казіміра Дмахоўскага і той даў прыкметы пляменніка, што «росту ён высокага, валасы светла-русыя, бровы такія самыя, вочы мае блакітныя, нос трохі задзёрты, твар круглы, бакенбардаў і вусоў да 1831 г. не насіў і асаблівых прыкмет не мае». Выкладчыкі медыка-хірургічнай акадэміі, якія працавалі раней у Віленскім універсітэце, закрытым пасля паўстання 1831 г., і ведалі Г. Дмахоўскага, пацвердзілі дакладнасць гэтага апісання. У сваёй здрадніцкай справе дзядзька-прэлат пастараўся добра. Яго данос і прыкметы пляменніка добра дапамаглі аўстрыйскім уладам у пошуках рэвалюцыянера. Старанне ж Казіміра Дмахоўскага было заўважана, і ён хутка пачынае рабіць кар'еру, а з цягам часу становіцца епіскапам, потым і мітрапалітам, галоўным кіраўніком усіх каталіцкіх цэркваў у Расіі.

А Генрых Дмахоўскі яшчэ не ведаў, што вакол яго ўжо звужаецца кола. У хуткім часе яго арыштавалі.

Пацягнуліся доўгія месяцы і гады следства. Толькі праз тры гады суд прыгаварыў яго да 5 гадоў турэмнага зняволення ў крэпасці Куфштэйн. Змрочныя казематы, краты на вузкіх вокнах-байніцах не змаглі загубіць у Генрыху чалавека, душу мастака. З хлебнага мякішу ён ляпіў фігуркі, а за пяць гадоў навучыўся рабіць гэта віртуозна. Ён лепіць «барэльефы» вязняў, такіх жа палітычных зняволеных, як і сам, і нават скульптурныя групы-сцэнкі з турэмнага жыцця. Некалькі такіх работ Генрыха паказваў у Лондане ў 1840 г. яго сябра па зняволенню Ф. Віленьскі.

Пасля вызвалення Генрых едзе ў Парыж, бо шлях на радзіму для яго закрыты. Тут 30-гадовы мастак наведвае школу прыгожых мастацтваў, працуе ў майстэрні вядомага ў той час французскага скульптара Рудэа. Дмахоўскі дапамагае яму ў стварэнні найбольш значнай працы — саркафага Напалеона I. У сваёй майстэрні ён стварае барэльефы Т. Касцюшкі — героя нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў ЗША (1775—1783) і кіраўніка паўстання 1794 г. у Польшчы, К. Пуласкага — героя нацыянальна-вызваленчай вайны ў ЗША, Я. Ясінскага — кіраўніка паў-

стання 1794 г. у Вільні, Саванаролы — барацьбіта за рэспубліку ў Венецыі ў XV ст. У гэты перыяд ён зрабіў барэльефы сваіх сяброў, а таксама помнік В. Пяткевічу, які ўстаноўлены ў горадзе Туры (Францыя). Але найбольшую папулярнасць і вядомасць ва ўсёй Еўропе набыў яго медальён у выглядзе плявацельніцы з адлюстраваннем Метэрніха — аўстрыйскага канцлера, які праславіўся крывавымі расправамі над народам.

Але і захапіўшыся мастацкай творчасцю, Дмахоўскі не перапыняе рэвалюцыйную дзейнасць. У 1846 г. ён уступае ў рады польскага дэмакратычнага таварыства, якое стаіць на рэвалюцыйных і дэмакратычных пазіцыях.

Рэвалюцыі 1848—1849 гг. абудзілі народы Еўропы. Г. Дмахоўскі зноў у першых радах змагароў за свабоду і незалежнасць, цяжка паранены пры абароне Львова.

Але сілы рэакцыі перамагаюць. Таму зноў парыжскія майстэрні, паездкі ў Тур, Матруа, Познань, Міласлаў. У гэты час ён стварае барэльеф сябра-паплечніка Юзафа Заліўскага, высока ацэнены паэтам Ц. Норвідам, праект помніка паўстанцам у Познані, партрэт бацькі. Яго творы адзначаны на Сусветнай выстаўцы ў Парыжы.

Але палітычная дзейнасць запатрабавала тэрміновай паездкі ў Лондан, дзе Г. Дмахоўскі ўдзельнічае ў перагаворах са скандынаўскім камітэтам аб незалежнасці Фінляндыі. У верасні 1852 г. ён развітваецца з Еўропай і накіроўваецца ў ЗША, у Філадэльфію. У Амерыцы Генрых Дмахоўскі пазнае кароткае сямейнае шчасце. Яго жонкай становіцца Алена Шаф — вядомая піяністка.

1853—1857 гг. — перыяд самай плённай дзейнасці скульптара, які вядомы ў ЗША пад імем Генры Д. Сандэрса. Як і ў ранейшых сваіх творах, ён распрацоўвае гераічную, рэвалюцыйную тэматыку. У 1856 г. Г. Дмахоўскі арганізоўвае сваю школу скульптараў і майстэрню. У ёй нараджаюцца велічныя скульптуры герояў нацыянальна-вызваленчай вайны ў Амерыцы 1775—1783 гг. генералаў Х. Гатэса і Х. Глэя, Д. Вэбета, В. Пэна, А. Яксона. Яны экспануюцца ў Капітоліі і акадэміі ў Філадэльфіі.

Але нават у час вышэйшага трыумфу Дмахоўскага-скульптара няшчасці не пакідаюць яго. Нечакана паміраюць жонка і двое маленькіх дзяцей. Увесь свой душэўны боль і смутак уклаў Генрых у стварэнне надмагільнага помніка.

Туга па радзіме, якую Г. Дмахоўскі ніколі не забываў, узмацняецца. І калі пасля смерці Мікалая I Аляксандр II аб'явіў амністыю палітычным злачынцам — удзельнікам вызваленчага руху і рэвалюцыянерам-дзекабрыстам, ён падае прашэнне на дазвол вярнуцца на бацькаўшчыну. 18 верасня 1958 г. у канцылярыі віленскага генерал-губернатара заводзіцца сакрэтная справа «аб сабранні і дастаўцы звестак пра польскага выхадца Генрыха Дмахоўскага».

«Даючы пра гэта ведаць вашаму высокаблагароддзю і перасылаючы згаданую просьбу, я, згодна з прапановай віленскага ваеннага губернатара ад 15 наступнага за нумарам 598, прадпісываю вам сабраць бліжэйшыя звесткі як аб паходжанні выхадца Дмахоўскага і яго сваякоў, так і пра ўдзел яго ў мецяжы і пра вынікі мне падрабязна паведаміць з далучэннем і іншых звестак аб Дмахоўскім, якія пра яго сабраць будзе магчыма...» Але бюракратызм і невуцтва не дазволілі паліцэйскім прасачыць увесь шлях і дзейнасць Дмахоўскага, асабліва за мяжой. Таму ўсе звесткі змясціліся ў кароткім рапарце другой часці паліцэйскага ўпраўлення горада Вільні ад 8 лістапада: «...Па сабраных мною сакрэтных звестках маю гонар данесці, што бацька польскага выхадца Генрыха Дмахоўскага Міхаіл Дмахоўскі цяпер нябожчык, да 1831 года знаходзіўся на службе пры былым тады Віленскім універсітэце, меў чын польскага пісара, а сказаны сын Генрых выхоў-

ваўся ў тым жа універсітэце і падаўся за мяжу ў часе быўшага тады польскага мецяжу, але які ён прымаў у ім удзел, пра гэта мне дазнацца няма магчымасці. Згаданы выхадзец Дмахоўскі мае стрыечную сястру Казіміру, ураджоную Дмахоўскую, якая замужам за памешчыкам Войцехам Ёчам, жыве ў другім кварталe даверанай мне часці, у доме ля Свянціцкіх. Болей жа звестак пра сказанага Дмахоўскага не адкрылася».

Толькі 19 лістапада 1859 г. міністр замежных спраў паведаміў генерал-губернатару ў Вільні, што цар дазволіў Дмахоўскаму вярнуцца. 15 мая 1861 г. Генрых Дмахоўскі нарэшце пасля 30-гадовай разлукі з радзімай ступае на віленскі брук.

З першых дзён за ім устанаўліваецца паліцэйскі нагляд. Ведаючы, што за ім няспынна сочыць Трэцяе аддзяленне, ён вырашае ехаць у роднае Забалацце.

Толькі прыехаў Г. Дмахоўскі ў родны маёнтак не гаспадаром, а госцем. І гэтае вяртанне яго не радуе. Куды ні глянь — голад, галеча. Народ забіты цяжкім прыгнётам. У вёсцы няма ўмоў для творчай дзейнасці. Таму Г. Дмахоўскі пачынае займацца публіцыстыкай. Ён перапісваецца з вядомым беларускім археолагам, этнографам, пісьменнікам і кнігавыдаўцом Адамам Кіркорам. У гэты ж час пачынаецца грамадзянская вайна ў ЗША, і Дмахоўскі прапануе рэдактару «Кур'ера Віленскага» матэрыялы, атрыманыя непасрэдна ад сяброў у Амерыцы. У Забалацці ён працуе над перакладам навейшых замежных кніг па сельскай гаспадарцы і прамысловасці, пра вырошчванне і апрацоўку лёну, цукровага трыснягу і нават пра культуру журавін. «Дзвіна наша, цудоўная Дзвіна, якія залатыя берагі мела б дзе-небудзь у іншым месцы, завалена каменнямі і ў час самай вялікай вады ледзь можа быць суднаходнай! Параўнаць бы яе з Дэлеверам, Місісіпі і Агайо!» — пісаў ён А. Кіркору.

Пачынаецца ўздым новага рэвалюцыйнага руху. Асноўны цэнтр паўстання ствараецца ў Вільні. Там разгортваецца барацьба паміж самімі яго ўдзельнікамі па пытаннях будучых пераўтварэнняў. Дмахоўскі знаходзіцца ў гушчыні гэтых спраў. А для маскіроўкі рэвалюцыйнай дзейнасці ў 1862 г. ён адкрывае скульптурнае атэлье насупраць кафедральнага сабора.

У студзені 1863 г. выбухнула нацыянальна-вызваленчае паўстанне, полымя якога ахапіла тэрыторыю Беларусі, Літвы і Польшчы. На Беларусі яго ўзнімалі Кастусь Каліноўскі, Зыгмунд Сераковскі, Рамуальд Траўгут, Яраслаў Дамброўскі, Валерый Урублеўскі. Сярод іх пачэснае месца належыць і Генрыху Дмахоўскаму. Ён быў абраны рэвалюцыйным камісарам Дзісенскага павета. У родныя мясціны Г. Дмахоўскі вярнуўся пад выглядам агента фірмы сельскагаспадарчых машын, і хутка Дзісенская рэвалюцыйная арганізацыя стварае свой партызанскі атрад. Генрых Дмахоўскі вырашыў весці яго ў Мінскую губерню на злучэнне з іншымі паўстанцкімі сіламі. Калі 14 мая 1863 г. стомленыя партызаны спыніліся на абед у маёнтку Юзафова каля вёскі Парэчча, на іх нечакана напалі царскія войскі. У час кароткага і жорсткага бою дрэнна ўзброеныя паўстанцы былі разгромлены. Частка з іх загінула, частка трапіла ў палон. Толькі невялікая група здолела прабіцца з акружэння. Генрых Дмахоўскі быў у першых радах партызан і загінуў таксама адным з першых.

Пазней адзін з паўстанцаў Я. Гейштар напісаў у пісьме: «Дмахоўскі васьмю стрэламі прашыты — палёг стары на руках падрастаючай моладзі...»

Варшаўская паўстанцкая газета «Весткі з поля бітвы» так адгукнулася на смерць Г. Дмахоўскага: «...Атрымалі сумную вестку, што на чале нешматлікага атрада ў Дзісенскім павеце загінуў Г. Дмахоўскі, скульптар, які пад імем Сандэрса быў вядомы ў Філадэльфіі. Трэба ж так здарыцца, што першы салдацкі стрэл паразіў яго насмерць,

а пасля гібелі камандзіра атрад распаўся. Аднак, як сёння вядома, атрад сабраўся зноў, нават вырасшы ў колькасці».

В. А. Ермалёнак

Іх імёны звязаны з Дзісеншчынай

Старажытная Дзісна віхурай рэвалюцыйных падзей упісала не адну рамантычную і загадкавую старонку ў памяць людскую. Побач з горадам, ля «напалеонаўскага тракта», які жаўцеў пяскамі пад аховай бяроз, знаходзіўся зямельны маёнтак Дарожкавічы з запушчаным старым паркам на беразе Дзвіны. У сярэдзіне мінулага стагоддзя ён належаў Кастравіцкім, прыняўшым актыўны ўдзел у паўстанні 1863 г. З гэтай нагоды Адам Кастравіцкі, сын маршалка Віленскай губерні, быў высланы ў Арэнбург. Яго маці добра ведала паэта Адама Міцкевіча, а верш «Майтэк» рукой аўтара быў запісаны ў яе альбом. Вось таму і хадзілі чуткі, што сам бунтарны паэт нейкі час нібыта хаваўся ад улад менавіта ў капліцы таго маёнтка.

Прыгожая легенда, хоць і неверагодная...

А вось другая гісторыя, падказаная польскім пісьменнікам Янам Гушчам, пра Кастравіцкіх з Дарожкавічаў можа быць і не зусім легендай. Тым больш што сам Я. Гушча нарадзіўся ў фальварку Задвор'е за тры кіламетры ад Цвеціна і ў свой час закончыў гімназію ў Дзісне. Нават Беларуская Савецкая Энцыклапедыя (том I, стар. 379) пацвярджае, што пасля разгрому паўстання 1863 г. адзін з Кастравіцкіх з маёнтка Дарожкавічы вымушаны быў эмігрыраваць у Італію. Там у яго дачкі нарадзіўся пазашлюбны сын Гіём Альберт Апалінарый Кастравіцкі, сусветна вядомы як французскі паэт Гіём Апалінэр.

Застаецца толькі ўдакладніць, дзе знаходзяцца тыя Дарожкавічы: пад Дзісной ці пад Навагрудкам, куды нас адсылае энцыклапедыя.

А вось яшчэ адна легенда. Спаслацца на яе дае падставу кніга Сямёна Букчына «...Народ, издревле нам родной» (Мінск, «Народная асвета», 1984). У ёй вядзецца гаворка пра тое, што ў апавяданнях пра Пушкіна, напісаных яго першым біёграфам П. І. Барценевым, ёсць такое месца: «Раман «Дуброўскі» быў навеяны Нашчокіным». П. В. Нашчокін — сябра Аляксандра Сяргеевіча. Ён расказаў паэту пра небагатага шляхціца па прозвішчу Астроўскі (спачатку аўтар так і называў раман).

У архівах знойдзены ананімныя ўспаміны сучасніка Пушкіна: «Островский проказничал долго, лет пять-шесть... Он грабил с разбором: у кого лишнее — отнимал, встретясь на дороге с нищим — делился с ним, что сам имел... Несмотря на это — его поймали...»

Адкуль гэты нашумеўшы герой? Архіўныя пошукі літаратуразнаўцы І. Г. Сцяпуніна даюць адказ: радавы маёнтак Астроўскіх Аржаневічы (або Астроўшчына) знаходзіўся ў Дзісенскім павеце за 8 кіламетраў ад павятовага цэнтра па дарозе на Полацк. У ім было да 20 душ сялян. У час французскага нашэсця некаторыя дакументы згарэлі. А яны вельмі спатрэбіліся пасля паўстання 1830—1831 гг., калі па царскаму ўказу пачаўся так званы «разбор шляхты». Усе, хто не мог пацвердзіць дакументамі сваё шляхецкае паходжанне, пераводзіліся ў аднадворцы, ураўноўваліся з дзяржаўнымі сялянамі, высылаліся ў Херсонскую і Таўрычаскую губерні, на Каўказ.

Вось і Астроўскія вядуць барацьбу за маёмасць праз суд, але даказаць свае правы не могуць. Паўлу Астроўскаму было ў 1832 г. 22 гады. За яго плячыма ўжо ўдзел у паўстанні, знаходжанне пад наглядам паліцыі, за якім адбыўся арышт. Ёсць меркаванне, што яго высачыў і выдаў памешчык Памарніцкі на

Ігуменшчыне пад Мінскам. Арыштанта адправілі ў Віцебск, затым у Пскоў, адкуль 12 сакавіка 1831 г. разбойнік уцёк — «невядома куды адлучыўся», па словах рапарта.

У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі захаваўся наступны дакумент:

«Управление минского военного губернатора. Содержавшийся в Пскове в числе польских мятежников Минской губернии Игуменского уезда шляхтич Павел Островский, имеющий от рода 22 года, 12 марта бежал... Учинить розыски по нем по Минской губернии. Он высокого роста, бел лицом, волосы светло-русые и до взятия в плен был учителем у помещика Памарницкого. Ушел из Пскова в синем сюртуке...

Минск, временный воинский губернатор, генерал-майор...
№ 2213, 1832 г., от 6 апреля».

Застаецца дадаць, што ў судовых справах Паўла Астроўскага няма абвінавачванняў у забойствах, гэта ледзь не тыповы літаратурны «высакародны» разбойнік, мясцовы Робін-Гуд. Напэўна таму сюжэт і захапіў А. С. Пушкіна. Толькі Аляксандр Сяргеевіч перанёс дзеянне ў цэнтр Рассіі, на бераг Волгі, далей ад паўстання, якое вельмі напужала царскі ўрад і напамінанне аб якім было небяспечным для самога паэта.

Л. А. Матэленак

Удзельнікі паўстання 1831 года з Дзісенскага павета

Даведка. Тэрыторыя Дзісеншчыны ў розныя часы мела рознае адміністрацыйнае дзяленне. У XVI ст. у ВКЛ г. Дзісна адносіўся да Полацкага ваяводства, Шаркоўшчына — да Браслаўскага, а Глыбокае — да Мядзельскага. Граніца паміж ваяводствамі ішла ў асноўным па рацэ Дзісна, за 5 км ад Шаркоўшчыны яна пераходзіла на прыток Дзісны Бярозаўку, па ёй — да ўскраін Глыбокага (з карты ў архіве).

У часы Расійскай імперыі Дзісенскі павет ахоплівaў цяперашнюю тэрыторыю Міёрскага, Браслаўскага, Шаркоўшчынскага, Глыбоцкага і Пастаўскага раёнаў. Вось да гэтых пяці раёнаў і адносіўся спіс удзельнікаў паўстання. У дакументах 1831 г., як і ў дакументах паўстання 1863 г., фіксаваліся прозвішчы камандзіраў атрадаў і службовых асоб. Не фіксаваліся прозвішчы сялян. У 1831 г. сяляне — гэта маёмасць шляхты. А ў 1864 г. іх каралі бізунамі, групамі адпраўлялі на катаргу, у некаторых месцах цэлымі вёскамі высялялі ў Сібір.

На Дзісеншчыне называліся атрады ў 2, 3 і 5 тыс. чалавек, а ў спісах адзначана толькі 114 прадстаўнікоў шляхты і магнатаў.

АБРАМОЎСКІ Мікалай — грамадзянскі камендант Пастаўскага ключа (ключ — адміністрацыйная адзінка. — *Склад.*).

БРЖАСТОЎСКІ — граф, узначальваў камітэт паўстаўшых.

БУЙНІЦКІ — былы прадвадзіцель (маршалак) дваранства.

БУЙНІЦКІ Ян.

БУЙНІЦКІ — пяхота паўстанцаў.

БУЙНІЦКІ Нестар — грамадзянскі камісар Пліскага ключа.

БРАХОЦКІ — з Глыбокага, генерал паўстанцаў.

БАЯРСКІ — з ніжняга земскага суда.

БАГУЦКІ Адольф — з Чырвонага Двара (ля Шаркоўшчыны), з'явіўся ў Дзісну да Мураўёва з павіннай, даравана воля.

БАРТАШЭВІЧ,

БАРТАШЭВІЧ — засядацелі, палкоўнікі на конях.

ВАЗГІРА Пётра — былы галоўнага суда 2-га дэпартамента засядацель, названы палкоўнікам, удзельнік захопу Лужкоў, м. Красная Горка (да кладнеі — **Вазгірд**).

ВАЗГІР Зігмунд — удзельнік захопу Лужкоў 11.4.1831 г.

ВІНЧА — з Літоўшчызны.

ВІНЧА — пяхота.

ВІНЧА — пяхота.

ВАЙНІЛОВІЧ — з Урэза, пяхота.

ВАЛЫНСКІ Мірка — ксёндз-кармеліта з Глыбокага.

ГУРСКІ — клерк глыбоцкага кармеліцкага манастыра.

ДУНІЛОВІЧ — пржэсар дамініканскага манастыра.

ДАВЕЙКА — былы суддзя дэпартамента, палкоўнік на кані.

ДАМЕЙКА — суддзя, пяхота.

ДАМЕЙКА — падкаморы з Ціц, пяхота.

ДОМАНД — засядацель, палкоўнік на кані.

ДУБАШЧЫНСКІ — з Барышкевіч, пяхота.

ДУБАШЧЫНСКІ — з Міёр, пяхота.

ДУБАШЫНСКІ — з Зябак.

ДМАХОЎСКІ Генрык — маёнтак Забалацце ля Перабродзя.

ЕЙСЬМУНД — маршалак (прадвадзіцель) павятовага суда, палкоўнік на кані.

ЕЙСЬМУНД — засядацель, палкоўнік на кані.

ЗЯНОВІЧ Ян.

ЗАМОСКІ — камісар грамадзянскай управы Лужэцкага ключа.

КАНАПЛЯНСКІ Адольф Іванавіч — з Пагоста, у другім месцы — з Нізіны (фальварак за 2 км ад Новага Пагоста, захаваўся сад), падлетак, пад наглядам.

КАНАПЛЯНСКІ Бенядзікт Феліксавіч — падпісаў акт канфедэрацыі, пад нагляд паліцыі без права выезду, не дапускаць да службы, да выбараў.

КАНАПЛЯНСКІ Генрых Якаўлевіч — падлетак (недарасль) з дваран, пад наглядам.

КАНАПЛЯНСКІ Дамінік Іванавіч — падлетак з дваран, зняволены ў Дзінабургскую крэпасць, вызвалены пад нагляд паліцыі.

КАНАПЛЯНСКІ Іван (Ян) Францавіч — камісар Пагосцкага ключа, Дзінабургская крэпасць, вызвалены. (Канаплянскія жылі ў фальварках вакол Новага Пагоста — Забор'е, Сынадворцы, Нізіна і інш.).

КЛІОТ (Клёт) Венядзікт — былы прадвадзіцель дзісенскага межавага суда, член камітэта паўстанцаў.

КЛІОТ — засядацель, пяхота паўстанцаў.

КЛІОТ Фларыян — грамадзянскі камісар Займоўскага ключа.

КЛОТ Леапольд — уцёк у Паўночную Амерыку.

КЛОТ Генрык — удзельнік дзісенскай бітвы, уцёк за граніцу. Прысуд: маёмасць узяць у секвестр.

КЛОТ Ігнацы — усё тое ж.

КЛОТ Мікалай — усё тое ж.

КЛОТ Міхаіл — усё тое ж.

КЛОТ Іван Аўгуставіч — уцёк за граніцу. Клота Аўгуста пазбавілі права дапамагаць сынам.

КЛОТ Рудольф Аўгуставіч — усё тое ж.

КОРСАК Антон — былы падсудак з Чарневіч, член камітэта паўстанцаў, уцёк у Прусію, затым у Амерыку. Забаронена вяртацца ў Расію.

КОРСАК — з Пятроўшчыны.

КОРСАК — з Дальца, палкоўнік на кані.

КОРСАК — з Урэза, пяхота.

КОРСАК.

КОРСАК — камендант у Глыбокім (сын з Пятроўшчыны).

КОРСАК — камендант у Лужках (бацька з Пятроўшчыны).

КУРОЎСКІ Міхаіл — член камітэта паўстанцаў.

КАРКУЗОВІЧ Фларыян — член камітэта паўстанцаў.

КОСАЎ (Коссов) — падкаморы, палкоўнік на кані.

КОСАЎ — харунжы, палкоўнік на кані.

КІРКАГОВІЧ Фларыян (Флиориян) — пяхота.

КАЗАКЕВІЧ — прэсар глыбоцкага манастыра (знойдзена да 200 гарматных ядраў 6-фунтовых і інш.).

ЛАПАЦІНСКІ Людвіг (загінуў) і **Станіслаў** — браты павятовага прадвадзіцеля, арганізавалі змову, сходку ў Шаркоўшчыне, удзельнікі захопу Лужкоў.

ЛАПАЦІНСКІ — граф з Юдзіцыны (6 км ад Ёд), пяхота.

ЛАПАЦІНСКІ — граф з Ёд, пяхота.

ЛАПАЦІНСКІ — граф з Рафалава, пяхота.

ЛАПАЦІНСКІ — граф, прадвадзіцель дваранства Дзісенскага павета, палкоўнік на кані.

ЛАПАЦІНСКІ — граф з Забеліна, палкоўнік на кані.

ЛАПАЦІНСКІ — граф з Варонкі, палкоўнік на кані.

ЛЯСКОЎСКІ — з Гарадка, зяць Баярскага.

ЛЯСКОЎСКІ Іосіф Фларыянавіч — падпісаў акт канфедэрацыі, грамадзянскі камісар Глыбоцкага ключа, змешчаны пад нагляд паліцыі, не дапускаць да службы.

МІГАНОВІЧ Станіслаў — падсудак хомскі, удзельнік захопу Лужкоў.

МІГАНОВІЧ — з Мікалаёва, пяхота.

МАЗУРКЕВІЧ — упраўляючы маёнтка ў Лужках, засядацель Яраслаўскага ніжняга земскага суда.

МІХАЙЛОЎСКІ — з Кораўшчызны.

МІРСКІ — былы прадвадзіцель, пяхота.

МІРСКІ — з Пагоста, пяхота.

МІРСКІ — камендант з Дзісны.

МАСТОЎСКІ — граф з Лучая, пяхота.

ОКУШКА — з Барыл, пяхота.

ПЛЯТАРОВА — памешчыца з Лужкоў.

ПЛЯТАР — з Лужкоў, сакратар камітэта.

ПАДБІПЕНТА Рамуальд — генерал, былы дзісенскі прадвадзіцель дваранства, узначальваў камітэт паўстанцаў.

ПЯТРОЎСКІ сын, з Мінеты, палкоўнік на кані.

ПРЭСМЫЦКІ — з Валкалаты, пяхота.

ПІЛЕЦКІ сын, дазорца, пяхота.

РУТКОЎСКІ — клерк глыбоцкага кармеліцкага манастыра.

САМУЙЛА — з Дальца, палкоўнік на кані.

СТАНІЛЕВІЧ — з Латылі, пяхота.

СТАНІЛЕВІЧ — з Латылі, пяхота.

СКОРЫК — з Заварта, пяхота.

СВЯТАГОР Антон Францавіч — пісьмавадзі-

цель дзісенскага іспраўніка, назваў 104 удзельнікаў паўстання.

ТАТУР — ксёндз лужкоўскага піярскага манастыра, член камітэта паўстанцаў.

ТВАРДОМАНСКІ Ксаверы — удзельнік захопу Лужкоў, грамадзянскі камісар Празароцкага ключа.

ТЫЗЕНГАУЗ — граф з Пастаў, генерал паўстання.

ФЕДАРОВІЧ — з Шаркоўшчыны, пяхота.

ХРАПАВІЦКІ Міхаіл — граф, былы прадвадзіцель губернскага межавага суда, удзельнік захопу Лужкоў.

ХРАПАВІЦКІ — былы маршалак, палкоўнік на кані.

ХАРЭВІЧ — з Карабоў.

ЦЫБУЛЬСКІ Якаў — з Дзісенскага і Полацкага паветаў, удзельнік захопу Лужкоў.

ЧЭРАХОЦКІ — галоўнакамандуючы паўстанцаў, арандатар маёнтка Глыбокага, адстаўны палкоўнік польскай службы.

ЧАРТАШЭВІЧ Едвар — удзельнік захопу Лужкоў.

ЧУМАСКІ — засядацель, з Мінеты, палкоўнік на кані.

ШЫРЫН Антон — былы павятовы харунжы, член камітэта, зняволены ў мінскую турму.

ШЫРЫН (Сирин) — з Парсава.

ШЫРЫН (Сирин) — з Белага Двара, палкоўнік на кані.

ЯЦКОЎСКІ — засядацель дзісенскага ніжняга земскага суда.

ЯБМАНАВА Вераніка — «девица из им. Миколаев», забіла 2 і ўзяла ў палон 3 казакоў.

ЯЦЫНА — з Воранава, палкоўнік на кані.

ЯНУШЭЎСКІ — з Дунілавіч, пяхота.

ЯКАВІЦКІ Гіляры — грамадзянскі камісар Галомскага ключа.

ЯКАВІЦКІ — грамадзянскі камісар Курылоўскага ключа.

Ксёндз лужкоўскага дамініканскага манастыра, сакратар камітэта паўстанцаў.

Глыбоцкі уніяцкі святар малады — шпіён мяцежнікаў.

Глыбоцкі каталіцкі святар — чытаў «возмутительные воззвания» з кафедры.

З 90 юнкераў Дзвінска збегла да паўстанцаў у Лужкі, па аднаму дакументу, 18, па другому — 27 чалавек (абмундзіраваны за кошт глыбоцкага кагалу).

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 215, 295, 299, 561, 694, 1297, 1430.

Спіс паўстанцаў 1831 г.

1. ЛАПАЦІНСКІ Людвік, забіты пры ўзяцці г. Дзісна. II катэг.

2. ЕСЬМАН Гіляры, м. Грыгаравічы Дзісенскага пав., забіты пры ўзяцці Дзісны.

а) эмігранты

7. КЛОТ Мікалай, м. Лесна. Па прадстаўленню Храпавіцкага кіраўнік язды (транспарту). Дрэнная ацэнка Мураўёва. Эмігрыраваў і памёр у Францыі.

8. КЛОТ Генрык, эмігрыраваў і памёр у Францыі. II катэг.

9. КЛОТ Міхал, эмігрыраваў і памёр у Францыі. II катэг.

10. КЛОТ Леапольд, камандзір падраздзялення пяхоты. II катэг.

11. КЛОТ Ігнацій, ад'ютант Брахоцкага. II катэг.

12. ЛАПАЦІНСКІ Казімеж, узбройваў сялян. Памёр у Францыі ў 1859 г. II катэг.

13. ЛАПАЦІНСКІ Юзаф, узбройваў сялян. Памёр у Францыі ў 1853 г. II катэг.

15. ХАМІЦКІ Адольф, г. Дзісна. Член паўстанцкага камітэта. Агент Лапацінскага. II катэг.

16. ХОМСКІ Аўгуст, г. Дзісна. Агент Лапацінскага. II катэг.

27. КОРСАК Вінцэнт, Корсакава, Дзісенскі пав., Залеская гм. «Агент Лапацінскага». II катэг.

33. СЯЛІЦКІ Казімір, селянін з Навалакі. Эмігрыраваў у Амерыку. II катэг.

Юнкеры з Дзінабурга

39. КЛОТ Ян, маёнтак Мёры. II катэг.

в) засталіся ў краіне

62. КЛОТ Бенядзікт, маёнткі Укля і Навалака, член паўстанцкага камітэта. «Ганарлівы паўстанец, агент Лапацінскага. Рассылаў загады». Зняволены ў Дзінабургу. III катэг.

63. КЛОТ Станіслаў. «Даверaны Лапацінскага». Зняволены ў Дзінабургу. II катэг.

64. ЛАПАЦІНСКІ Тамаш, камандзір батальёна пяхоты. Узбройваў сялян, зняволены ў Дзінабургу.

87. КАСТРАВІЦКІ Адам, Дарожкавічы, Мікалаёўскай гміны. Член паўстанцкага камітэта. «Не варты жалю». Аддаў камандзірам сваіх лепшых коней. Зняволены ў Мінску і Дзінабургу.

90. МІГАНОВІЧ Антоній, маёнтак Мікалаёва, 62 гады. Падазравалі ў забойстве казакоў.

97. ЯБМАНАВА Вераніка, абвінавачана ў забойстве казакоў у Мікалаёве.

98. ЯКАВІЦКІ Гіляры, маёнтак Ельня, Дзісенскі пав. Камісар.

99. ЯРКОЎСКІ Фларыян, в. Русакі. «Бунтаўшчык».

102. КАНАПЛЯНСКІ Ян, маёнтак Дворышча, 58 гадоў. Зняволены, асуджаны на смерць, памілаваны.

103. КАНАПЛЯНСКІ Дамінік, сын Яна, Пагост. Непаўналетні.

104. КАНАПЛЯНСКІ Адольф, сын Яна, 19 гадоў. III катэг.

105. КАНАПЛЯНСКІ Генрык, сын Якаба. III катэг.

108. МІРСКІ Геронім, маёнтак Гарані, быў пры ўзяцці Дзісны.

113. РАДЗЕВІЧ Станіслаў, маёнтак Буда.

Сяляне і вязні ў Пскове

129. БАЧАНІН Антоні, падданы Стравінскага, вёска Фралова. Уцёк ад гаспадара, быў у Брахоцкага фурманам, узяты ў палон пад Ратновым. Сібір.

131. ПАРАФ'ЯНАВІЧ Антоні, Дзісенскі пав. Трапіў у палон паранены.

143. САФРАНОВІЧ Базыль, Дзісенскі пав., у паўстанні 1 год.

144. УРУБЛЕЎСКІ Юзаф, в. Гарохава. Паўстанец.

Друкуецца па кн.: Гедэман О. Гісторыя павета Браслаўскага. Вільна, 1930. С. 444—457.

Паўстанне 1863—1864 гг. на Дзісеншчыне

Вытокі паўстання 1863—1864 гг. трэба шукаць у становішчы беларускага народа. Праведзеная зверху адмена прыгоннага права не прынесла доўгачаканага паляпшэння жыцця сялян. Драпежніцкая рэформа не знішчыла поўнасцю прыгонніцкія адносіны. Таму яна дала новы штуршок сялянскім хваляванням. Так, у Віленскай губерні — Ашмянскім, Дзісенскім і Свянцянскім паветах у сакавіку 1861 г. адбылося 17 сялянскіх выступленняў. Найбольш упартай была барацьба сялян Язненскай воласці.

Па вёсках хадзілі чуткі аб фальшывасці маніфеста і «Палажэнняў» ад 19 лютага. Так, у Дзісенскім павеце па-свойму чытаў для сялян гэтыя дакументы рады салдат Каленаў. Вынікам з'явіліся хваляванні сялян у вёсках Людвінова, Канстанцінава, прыгонных памешчыка Акушкі.

Тэрмінова ў Вільню генерал-губернатару В. І. Казімаву жандарскі палкоўнік М. Н. Пахвіснеў дасылае рапарт «О подъеме крестьянских волнений и необходимости усиления находящихся там войск». Цыркуляры віленскага губернатара, якія знаходзіліся ў Цэнтральным гістарычным архіве Літвы, дазваляюць нам высветліць рэакцыю царскіх улад. Вось загад Назімава «Аб прыняцці надзвычайных мер па барацьбе з сялянскімі хваляваннямі і накіраванню ў Дзісенскі павет рэзервных рот Мурамскага пяхотнага палка». Наступныя радкі архіўных лістоў сведчаць, што «300 салдат Мурамскага пяхотнага палка ліквідавалі беспарадкі ў маёнтках Канстанцінава і Людвінова. Арыштавана 35 сялян і галоўны завадатар радавы Каленаў». Іх пратрымалі ў турме некалькі месяцаў, а потым пакаралі розгамі. Каленаў быў асуджаны на доўгае турэмнае зняволенне.

Ваеннымі экзекуцыямі і агульным катаваннем царызму ўдалося адбіць першы націск народных выступленняў, але рэвалюцыйная сітуацыя захоўвалася. Супраць жорсткіх распраў царызму над дэманстрантамі ў Варшаве па ўсёй Расіі пачаліся маніфестацыі пратэсту. Яны прайшлі таксама ў Дзісне, Друі, Глыбокім, Камянполлі і інш.

Шмат клопатаў мясцовым уладам нарабілі гімназісты і студэнты, якія прыехалі на радзіму ў сувязі з уздымам нацыянальна-вызваленчага руху. Так, паліцэйскі прыстаў даносіў аб спяванні забароненых гімнаў. Сярод названых 20 удзельнікаў двое з Міёрскай воласці: студэнты універсітэта Людвіг Мірскі і сын Бенядзікта Кліёта. У данасе з Глыбокага віленскаму генерал-губернатару гаворыцца аб спяванні забароненых гімнаў Гарадзецкімі ў маёнтку Мнюта і Ляоніяй Антаневіч з Акунёва.

Як сведчаць паказанні ў следчай камісіі М. Чарняка, яшчэ ў ліпені ля Глыбокага дзейнічалі паўстанцы з Дзі-

сенскага павета. Царскі ўрад абяцаў вялікія ўзнагароды тым, хто выдасць паўстанцаў або раскажа аб іх месцазнаходжанні. Частка захопленых у палон паўстанцаў была прыгаворана да пакарання смерцю або да пажыццёвай катаргі, ссылкі ў Сібір.

Каб не дапусціць далейшага развіцця паўстання, царскі ўрад пайшоў на адмену некаторых рашэнняў маніфеста ад 19 лютага 1861 г., што некалькі палегчыла становішча сялян. Але ў цэлым паўстанне працягвалася яшчэ і ў 1864 г. Імёны нашых землякоў можна сустрэць у спісах паўстанцкіх атрадаў на Міёршчыне і Гродзеншчыне, у Літве і Польшчы. Каб пазбегнуць пакарання, многія павінны былі пакінуць радзіму.

В. А. Ермалёнак

Удзельнікі паўстання 1863—1864 гг.

БРЖОСТАЎСКІ Абдон — граф, адступны гвардыі штаб-ротмістр, маёнтак Масары (хваляванні сялян).

БУЙНІЦКІ Рафаіл, Аляксандра, Праскоўя — маёнтак Акунёва Глыбоцкай воласці, удзельнікі маніфестацыі ў Глыбокім.

ВІНЧА Артур і **Баляслаў** — сыны памешчыка, удзельнікі маніфестацыі ў Глыбокім.

КАНАПЛЯНСКІ Францішак (Франц Яков), 1814—1864 гг., фальварак Забор'е за 5 км ад Новага Пагоста, адстаўны паручнік, з 1859 г. засядацель ад дваранства ў Віленскай палаце грамадзянскага суда. У 1863 г. — паўстанцкі грамадзянскі начальнік Віленскага ваяводства. Выдадзены мясцовымі сялянамі, памёр па дарозе на катаргу. Маюцца яго паказанні Віленскай следчай камісіі.

КЛЁТ (Кліёт) — сын Кліёта Бенядзікта, памешчыка, удзельнік маніфестацыі ў Друі.

КОРСАК — памешчык з маёнтка Азярцы Глыбоцкай воласці, там адбыліся хваляванні сялян.

КУРОЎСКІ — студэнт, удзельнік маніфестацыі ў Глыбокім.

КАРКУЗЕВІЧУЎНЫ Канстанцыя і **Марцэлія** — удзельнікі маніфестацыі ў Глыбокім.

ЛЯСКОЎСКІЯ — у Ковенскай, Мінскай і Гродзенскай губернях.

МІХАЙЛОЎСКІ — памешчык з Косаржэўшчыны, хваляванні сялян.

МІРСКІ Людвіг і яго дачка — удзельнікі маніфестацыі ў Друі.

ОКУШКА Казімір — маёнтак Канстанцінава Вярхнянскай воласці, калежскі сакратар.

ОКУШКА Уладзіслаў — студэнт, удзельнік маніфестацыі ў Глыбокім.

ПЛЯТАРЫ — з Дзісенскага павета, у Богіна і інш.

ТЫЗЕНГАУЗ Арнольд Канстанцінавіч — граф з Пастаў, хваляванні сялян.

ШЫРЫН — памешчык маёнтка Валынь Вярхнянскай воласці, хваляванні сялян.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 215, 295, 299, 561, 694, 1297, 1430.

Падрыхтаваў У. Лясоўскі

Дакументы сведчаць

СА СПРАВАЗДАЧЫ ІІІ АДДЗЯЛЕННЯ АБ СЯЛЯНСКІМ РУХУ ПАСЛЯ АПУБЛІКАВАННЯ МАНІФЕСТА — ХВАЛЯВАННЯХ СЯЛЯН ВІЛЕНСКАЙ, ГРОДЗЕНСКАЙ І КОВЕНСКАЙ ГУБЕРНЯЎ

1861 г.

...В западных губерниях волнения крестьян начали проявляться также вскоре после обнародования новых положений от недостаточного понимания их, превратного объяснения нанятыми чтецами или применения местных положений великороссийских и малороссийских губерний. Крестьяне приносили жалобы на обременение их инвентарными повинностями, самовольно уменьшали или отказывались от барщины, равно от добавочных поголовных работ, называемых сгонами, и не повиновались, а в некоторых случаях упорно сопротивлялись властям...

...Подобные волнения происходили в разных имениях Виленского, Свенцянского и Дисненского уездов, не прекращены внушениями флигель-адъютанта графа Олсуфьева, штаб-офицера корпуса жандармов и местных властей. При этом наиболее виновные под-

вергнуты исправительному наказанию, а обнаруженные в подстрекательстве крестьян лица, в числе которых обвинен в неправильном толковании положений отставной артиллерии подполковник Антоновский, заключены под стражу и преданы суду...

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772—1903). Мн., 1960. Т. 2. С. 411—413.

ПІСЬМО ГАЛОЎНАЙ ВЫКУПНОЙ УСТАНОВЫ ПРЫ С.-ПЕЦЯРБУРГСКАЙ ЗАХОЎНАЙ КАЗНЕ № 46178 У ДЭПАРТАМЕНТ ДЗЯРЖАЎНАГА КАЗНАЧЭЙСТВА

30 снежня 1865 г.

Галоўная выкупная ўстанова, зацвердзіўшы выкупныя акты па маёнтку «Укля» Віленскай губерні Дзісенскага павета баронаў Альфонса, Арнольда, Алаізія, Альфрэда, Адама і Ганны Клот фон Гейдэнфельд і сястры іх, жонкі надворнага дарадцы Усціны Манюшкавай, дазволіла належачыя сялянам (у колькасці 172 душ) пад выкупляемую зямлю ў колькасці 536 дзес. 2320 саж. выкупныя пазыкі па 1-му акту пад 129 дзес. 1770 саж. — 1065 руб. 67 кап. і па 2-му акту пад 407 дзес. 550 саж. — 4189 руб. 27 кап., усяго пяць тысяч дзвесці пяцьдзесят чатыры руб. дзевяноста чатыры кап., тэрмінам з 1-га лютага 1865 года; аб чым разам з гэтым паведамлена мясцовай губернскай па сялянскіх справах прысутнасці.

Паведамляючы аб гэтым дэпартаменту дзяржаўнага казначэйства, галоўная выкупная ўстанова мае гонар дадаць, што па азначанай пазыцы належыць сялянам плаціць у казну штогод на працягу 49 гадоў па 315 руб. 30 кап.

Член установы
Вытворца спраў
Памочнік вытворцы спраў

Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 565. Воп. 3. Спр. 10303. Л. 15а.

З ЖУРНАЛА ВІЛЕНСКАЙ ГУБЕРНСКАЙ ПА СЯЛЯНСКІХ СПРАВАХ ПРЫСУТНАСЦІ

15 чэрвеня 1866 г.

Нумар артыкула 10.

Слухалі: адносіны 2-й паверачнай камісіі Дзісенскага павета ад 16 лютага 1866 года за № 23, пры якіх прадстаўлена выкупная вытворчасць па маёнтку Міёры калежскага рэгістратара Аўгуста Аўгустова Кліота, складаемаму 1-га міравога ўчастка Міёрскай воласці, Міёрскага сельскага таварыства з паселішча Ракавыя, Томкі і Зарэчныя, засценкаў Востраў і Чаравікі і ўрочышча Клобаўшчына.

З вытворчасці гэтай бачна, што выкупны акт аб'яўлены сялянам і памешчыку 4 лістапада 1865 года.

У маёнтку рэвізскіх мужчынскага полу душ 92, у тым ліку парабкаў 12, сялян гаспадароў 11 і гароднікаў 4, у тым ліку абеззямельных, уноў надзеленых з сялян, 4.

Выкупляецца імі, адпаведна іх жаданню, поўны надзел, а менавіта 170 дзес. 290 саж. абкладзенай плацяжом зямлі; звыш таго неабкладзеных плацяжом зарасляў, прыгодных для пашаў, 19 дзес. 2120 саж. і нязручнай 5 дзес. 400 саж., а ўсяго 195 дзес. 470 саж.

Азначаныя землі агледжаны і змераны паверачнай камісіяй і па выкладзеных у пратаколе падставах аднесены сялянскія ўчасткі ў вёсках Ракавыя і Томкі да 10-га асноўнага разраду без паніжэння, а ў вёсцы Зарэчныя і засценак Востраў да таго ж разраду з паніжэннем на 10 % супраць цаны для гэтага разраду ўстаноўленай, агародныя ж участкі да 8-га асноўнага разраду, па якому выходзіць штогадовага плацяжу за кожную дзесяціну 80 кап., па 72 кап. і па 1 руб. 20 кап., а за ўсе 170 дзес. 290 саж. абкладзенай плацяжом зямлі 134 руб. $36^{1}/_{3}$ кап., складаючымі па капіталізацыі з 6 % капітальную каштоўнасць 2239 руб. 39 кап. Па статутнай грамаце павіннасць з сялян была вызначана ў 660 руб. у год. Чынш гэты па найвышэйшаму ўказу 1-га сакавіка 1863 года і па павагах, выкладзе-

ных у пратаколе камісіі, паменшаны да 128 руб. 21 $^{19}/_{30}$ кап. і затым з выкупным плацяжом з сялян, уноў надзеленых зямлёю, складае 134 руб. 36 $^{1}/_{3}$ кап. у год. З водгуку Дзісенскага павятовага казначэйства ад 22 мая 1866 года за № 920 бачна, названымі сялянамі, што ўвайшлі ў статутную грамату, на працягу часу з 1-га мая 1863 года па 1-е мая 1866 г. унесена ў казначэйства ў карысць памешчыка Аўгуста Аўгустова Кліота чыншу 1144 руб., а трэба ж з іх за гэты час на падставе найвышэйшых указанняў 26 сакавіка і 11 снежня 1864 года 384 руб. 65 кап., значыць сялянамі ўнесена больш, чым трэба было, на 759 руб. 35 кап. Выключыўшы гэты лішак з капітальнай вартасці зямлі, вызначанай паверачнай камісіяй (2239 руб. 39 кап.), складаецца выкупной пазыкі 1480 руб. 4 кап., на пагашэнне якой на працягу 49 гадоў прыходзіцца з усіх сялян вышэй азначанага сельскага таварыства і паселішчаў штогадовых выкупных плацяжоў на 88 руб. 81 кап. у год.

Даведка.

1. Выкупная вытворчасць па маёнтку Міёры была прадстаўлена ў губернскую прысутнасць пры адносінах ад 15 лістапада 1865 года за № 939, але для прапісання ў 2-м пункце выкупнога акта аб уноў надзеленых і ўключэння надзелу іх у план сялянскіх угоддзяў яна па пастанове прысутнасці 15 снежня таго ж года адбыўшайся вярнулася ў 2-ю Дзісенскую паверачную камісію.

2. Скарг ад сялян на дзеянні паверачнай камісіі ў прысутнасць не паступала; памешчык жа Кліот прысланым па пошце 1 снежня 1865 года прашэннем скардзіўся на паверачную камісію за вельмі нізкую ацэнку сялянскіх угоддзяў...

* * *

Адбыўся аднагалосна 28 ліпеня 1866 года.

С л у х а л і: адносіны паверачнай камісіі Дзісенскага павета ад 6 чэрвеня 1866 года за № 187, пры якім прадстаўлена выкупная вытворчасць па маёнтку Станулева памешчыка адстаўнога мічмана Віслава Іванова Святаполк-Мірскага, састаячага 1-га міравога ўчастка Міёрскай воласці Станулеўскага сельскага таварыства з паселішч Дзянісава, Русачкі, Дворышчы, Марцінаўцы, Гізуны і засценкаў Лапігроша, Цнотка, Цяключына і Наталін.

З вытворчасці гэтай бачна, што выкупны акт аб'яўлены памешчыку 5 лістапада 1865 года.

У маёнтку рэвізскіх мужчынскага полу душ 140, у тым ліку парабкаў 23, сялян гаспадароў 44, у тым ліку абеззямеленых, уноў надзеленых з сялян, 22.

Выкупляецца імі адпаведна іх жаданню поўны надзел, а менавіта 430 дзес. 1348 саж. абкладзенай плацяжом зямлі, у тым ліку дроўнага лесу 2 дзес. 470 саж., звыш таго не абкладзеных плацяжом пашаў 62 дзес. 445 саж. і няўдобіц 15 дзес. 1854 саж., а ўсяго 508 дзес. 1241 саж.

Азначаныя землі агледжаны і змераны паверачнай камісіяй і па выкладзеных у пратаколе падставах аднесены вёскі Дзянісава, Русачкі, Марцінаўцы і засценкі Цнотка, Цяключына і Наталін да 9-га, а вёскі Дворышча, Гізуны і засценак Лапігрош да 10-га асноўных разрадаў, па якіх выходзіць штогадовага плацяжу за кожную дзесяціну па 1 руб. і па 80 кап., а за ўсе 430 дзес. 1348 саж. абкладзенай плацяжом зямлі 402 руб. 2 $^{3}/_{4}$ кап., складаючыя па капіталізацыі з 6 % капітальную каштоўнасць 6700 руб. 45 $^{5}/_{6}$ кап. Па статутнай грамаце павіннасць з сялян была вызначана ў 863 руб. 42 кап. у год, чынш гэты па найвышэйшаму ўказу 1 сакавіка 1863 года і па павагах, выкладзеных у пратаколе камісіі, паменшаны да 322 руб. 39 кап. і затым з выкупным плацяжом з сялян, уноў надзеленых зямлёю, складае 402 руб. 2 $^{3}/_{4}$ кап. у год. З водгуку Дзісенскага павятовага казначэйства ад 22 ліпеня 1866 года за № 1272 бачна, што азначанымі сялянамі, увайшоўшымі ў статутную грамату, на працягу часу з 1-га мая 1863 года па 1-е мая 1866 г. унесена ў казначэйства ў карысць памешчыка Віслава Іванова Святаполк-Мірскага чыншу 1496 руб. 80 кап., трэба было з іх за гэты час... 967 руб. 17 кап., такім чынам сялянамі ўнесена больш, чым трэба, на 529 руб. 63 кап. Выключыўшы гэты лішак з капітальнай каштоўнасці зямлі, вызначанай паверачнай камісіяй (6700 руб. 45 $^{5}/_{6}$ кап.), складзецца выкупной пазыкі 6170 руб. 63 кап., на пагашэнне якой на працягу 49 гадоў трэба з усіх сялян вышэйазначанага сельскага таварыства і паселішча выкупных плацяжоў на 370 руб. 25 кап. у год.

Даведка.

1. ... Выявілася, што Бернард Гаравы не мае права на ніякі надзел, бо яго пазбавіўся па ўласнай волі, не па жаданню ўладальніка, са знаходжаннем ва ўцёках, у выніку чаго ўчастак пасля смерці бацькі Бернарда перайшоў да іншага селяніна. Дамінік Федуковіч

і Антон Александровіч за перавод іх большых на меншыя ўчасткі атрымалі ад памешчыка задавальненне і прэтэнзіі не маюць. Карл Пальчэх за хваробай, а Мікалай Шараговіч за старасцю ад надзелу ўчасткамі адмовіліся, жадаючы атрымаць толькі па 3 дзесяціны, якія ім і адведзены замест іншых абеззямеленых з фальваркавай зямлі, бо інвентарнай сялянскай больш не аказалася. Вікенцій Ігнацік пераселены памешчыкам на ўладаемы ім участак у 1865 годзе...

Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў.
Ф. 577. Воп. 3. Спр. 772. Л. 2—3; Спр. 880. Л. 2—4.

КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ Ў «ВИЛЕНСКИЙ ВЕСТНИК» З ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА

29 красавіка 1866 г.

В 1-м мировом участке есть селение Миоры (по географической карте Ново-Меры), в довольно красивой местности, при большом озере того же названия; оно состоит из нескольких дворов, принадлежащих помещикам и занятых вольными съемщиками, окружено со всех сторон деревнями крестьян-собственников; близ него волостное правление, именующееся миорским. В этом селении костел и место жительства ксендза. В 6-верстном расстоянии от Миор находится с. Чересы с православною церквью.

Писали и говорили, что в здешней местности был когда-то православный монастырь, но когда и где, никто положительно не знает. Одни указывали на то место, где ныне стоит костел, другие — в нескольких саженях от него, между тем как помещики утверждали, что настоящий костел существует по актам более 250 лет. Расспрашивая, удалось мне наконец попасть на 80-летнего старичка крестьянина-собственника — православного Василия Рачицкого, из дер. Игнатики, который, вспоминая рассказы своего отца о существовании здесь православия, а с ним и церкви, объяснил, что такая находилась по ту сторону озера, и когда была уничтожена, то взятые с ее два колокола предназначены были на костел, но один утонул в озере во время перевозки, а другой пошел в дело.

Колокольня выстроена, как свидетельствует надпись, в 1828 г. Посреди 3-х колоколов висит один не большой, но и не малый, весь почерневший от времени. Какова же была моя радость, когда начали показываться славянские на нем буквы. По совершенной очистке глазам моим представились следующие славянские надписи: на верху колокола вокруг: «Духа твоего святого не отыми от нас помолимся человеколюбче аллилуя», сбоку колокола: «року АХМД мчіа ноіабріа в дніа, тот звон ест наданы от мене Себестіана Мирского суди земского брацлавского до церкви пресвиатой троичи в маетности моей намиріам стоіачои с костелом римским не вунии будучой».

Ксендз, другой год здесь живущий, и помещики, между коими есть и 60-летние старики, не могли объяснить, откуда достался этот колокол костелу. Что сказать на это? Не само ли Провидение сохранило этот явный признак существования в этой местности православия в укор католицизму, стремящемуся к его уничтожению здесь. Отец крестьянина умер назад тому 40 лет, имея от роду 90 лет, поэтому уничтожение церкви можно отнести к 1740 г., допустив, что это случилось на первых годах его жизни.

Сверх того в архиве Чересской церкви найдена книга, веденная в 1795 и 1796 гг. на польском языке благочинным Брацлавским Иоанном Заборовским, под заглавием: регистр прихожанинам Чересского прихода Замиорской парафии годным к исповеди униатам. Это поименный список лиц обоего пола, между которыми есть много фамилий и ныне принадлежащих крестьянам Миорской волости. Число деревень и застенков Замиорской парафии Чересского прихода по тому списку показано 22, в количестве 75 дворов. Во всех почти тех деревнях и ныне живут крестьяне, но ни одного двора в них нет православного, а все католики. Из числа 260 дворов крестьян Миорской волости — православных не более 50 дворов. Не обидно ли такое угнетение православной веры католиками-панами?

Этот же старик-крестьянин говорит, что он слышал, что и самые владельцы миорские были когда-то православные, перешедшие впоследствии в католицизм. Фамилий Мирский в Дисенском уезде много, и все они ведут свой род от Андрея Святополк-Мирского, князя тверского, но герольдиею в княжеском достоинстве не утверждены, хотя некоторых из них и ныне шляхта в разговоре именует ксіонже (князь).

На крестьян в здешней местности, с которыми я живу уже 3-й год, жаловаться нельзя: они вполне понимают благодеяния и милости Государя, благословляют Его, в исполнении повинностей аккуратны, на всякое доброе дело склонны, жаждут образования, что видно

из того, что на свой счет устраивают училища и доставляют содержание православному наставнику.

Бывшие на народном празднике 17-го числа в г. Дисне крестьяне-католики рассказывали мне, как они были поражены служением нашего духовенства и стройным пением певчих, что это им очень понравилось и что они с нетерпением ждут открытия у них училища, дабы и их дети могли также хвалить Бога; расспрашивали о разных догматах православной веры и с любопытством выслушивали разъяснения, делая довольно длинные вопросы. Я счел необходимым сблизить и с нашим местным духовенством и при содействии его можно надеяться хороших результатов, к каковым уже давно делается мною подготовка.

29 апреля 1866 г. Мир. посредник Васенко

Вестник западной России. 1866. Кн. XII. Т. IV. С. 279—280.

СТАН НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ ДЗІСНЫ Ў 1856—1866 гг.

Дисненское училище терпит недостаток в книгах за медленностью высылки их от Сеньковского из Вильны.

Еврейское училище переполнено. Мальчики первых четырех лавок читали по-русски очень порядочно — некоторые даже без семитического акцента. Остальные считаются вновь вступившими, и едва дошли до складов.

Женская смена в приходском училище радует успехами своих учениц. Девочки, несмотря на то, что некоторые из них принадлежат к семействам полякующих, все чисто и твердо читают славянские молитвы, сознательно говорят, объясняют басни Крылова. Жаль, что рукоделие учениц представляет образцы занятий, необходимых простому быту их семей. Стеклярус, гарусы, цветной шелк, бумажная канва суть предметы более роскоши, чем необходимости. Наставница объясняла, что девочки умеют также и белье шить, но ни на ученицах, ни в классе нам не пришлось в том удостовериться.

Вестник западной России. 1866. Кн. XI. Т. IV. С. 137.

ВЫКУПНЫ АКТ НА ЗЯМЛЮ Ў МАЁНТКУ ДЗЕДЗІНКА ПАМЕШЧЫКА А. А. РУДНІЦКАГА

1867 г.

Па маёнтку Дзедзінка памешчыка губернскага сакратара Аляксандра Аляксандравіча Рудніцкага Віленскай губерні Дзісенскага павета першага міравога ўчастка Друйскай воласці Дзедзінскага сельсавета таварыства 1867 г. Паверачная камісія Дзісенскага павета, зрабіўшы паверку павіннасці сялян у маёнтку Дзедзінка памешчыка Рудніцкага, пастанавіла: выкуп сялянскага надзелу зрабіць з садзеяннем урада на наступных падставах:

1. У маёнтку Дзедзінка дзве вёскі і адзін засценак, належачыя да Дзедзінскага сельскага таварыства. Назвы паселішчаў азначаны ў прыкладаемых да гэтага статутнай грамаце і імянным спісе сялян-гаспадароў.

2. Па статутнай грамаце значыцца ў маёнтку 23 двары, у тым ліку сялян, валодаючых палявымі ўчасткамі, 23. Рэвізскіх мужчынскага полу душ у маёнтку 141, у тым ліку сялян 130, парабкаў 11, дваравых (атрымаўшых зямельны надзел) не лічыцца. На ўноў надзеленых абеззямеленых сялян адзін запісаны па статутнай грамаце ў ліку парабкаў, другі ж зусім нідзе не паказаны.

3. У карыстанне сялян было адведзена па статутнай грамаце: сядзібнай зямлі (з уключэннем выпускаў і пустапарожніх месц у мяжы паселішч) 23 дзес., ворыўнай 276 дзес., сенакоснай 117 д. 1364 с., пашаў звыш сядзібных выганаў або выпускаў, не абкладзеных (на падставе арт. 136 месц. палаж.) асобай павіннасцю — не маецца, усяго адной зручнай 416 д. 1364 с. Акрамя таго, у сялянскі надзел увайшло нязручных месц 851 сажняў. Азначэнне граніц гэтай зямлі і агульнае апісанне яе заключаецца ў прыкладаемай да гэтага статутнай грамаце.

4. Выкупу належыць поўны на справе знаходзячыйся ў карыстанні сялян-домагаспадароў і ўноў надзеленых, а менавіта: сядзібнай зямлі 20 дзес. 663 с., ворыўнай 291 д. 1515 с., сенакоснай 132 д. 116 с., усяго адной зручнай 443 д. 2294 с. Акрамя таго, у рысу выкупаемага надзелу ўвайшло пустапарожніх месц, годных для пашы, 43 дзес. 1941 саж. Неза-

лежна ад гэтага сялянам вёскі Дзедзінка прадастаўлена права пасьбы ў прылягаючых да іх надзела памешчыцкім урочышчы, чысцяк на прасторы 60 дзесяцін.

5. Сяляне пераведзены са здзельнай павіннасці на чынш на падставе вышэйшага ўказу 1-га сакавіка 1863 года.

6. За карыстанне зямлёю было пакладзена з усіх сялян чыншу па статутнай грамаце 1242 руб. у год. За сілаю імяннога вышэйшага ўказу ўрадавага Сенату 1-га сакавіка 1863 года, чынш гэты паніжаны на 20% менавіта да 993 р. 60 кап.

Пры паверцы павіннасці азначаны чынш (993 р. 60 к.) па павагах, выкладзеных у пастанове міравога з'езда, паменшаны на 485 руб. 58 кап. і залічаны, з ізноў надзеленымі складае 508 руб. 2 кап. укладу.

7. Па капіталізацыі канчаткова вызначанай гадавой грашовай павіннасці 508 р. 2 к. з 6 прац., капітальная каштоўнасць выкупляемай зямлі складае 8466 руб. 98 1/3 кап.

8. Колькі менавіта выкупляецца зямлі кожным сялянскім дваром, які вялікі назначаны з кожнага двара чынш і да чаго па капіталізацыі гэтага чыншу з 6 прац. складае капітальная вартасць кожнага ўчастка, азначана ў прыкладаемым да гэтага імянным спісе гаспадароў сялянскіх двароў.

Аб чым прадставіць для далейшага распараджэння Віленскай губернскай па сялянскіх справах прысутнасці.

Сапраўдны за подпісам членаў паверачнай камісіі.

Сакратар

Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 577. Воп. 3. Спр. 856. Л. 22—23.

З ВЫКУПНОГА АКТА 1864 г. ПА МАЁНТКУ ЗАБАЛОЦЦЕ ПАМЕШЧЫКА КАЗЕМІРА УСЦІНАВА ДМАХОЎСКАГА

17 чэрвеня 1864 г.

Па маёнтку Забалоцце памешчыка Каземіра Усцінава Дмахоўскага Віленскай губерні Дзісенскага павета, першага міравога ўчастка Друйскай воласці Забалоццеўскага сельскага таварыства 1864 года чэрвеня месяца семнаццатага дня. Паверачная камісія Дзісенскага павета, зрабіўшы паверку павіннасці сялян у маёнтку Забалоцце памешчыка Дмахоўскага, пастанавіла: выкуп сялянскага надзела правесці з садзеяннем урада на наступных падставах:

1. У маёнтку Забалоцце знаходзяцца два паселішчы, якія належаць да Забалоццеўскага сельскага таварыства. Назвы паселішчаў азначаны ў прыкладаемай да гэтага статутнай грамаце і імянным спісе сялян-гаспадароў.

2. Па статутнай грамаце значыцца ў маёнтку 19 двароў, у тым ліку сялян, валодаючых палявымі ўчасткамі, — 19. Рэвізскіх мужчынскага полу душ у маёнтку 100, у тым ліку сялян 95, парабкаў 5.

3. У карыстанне сялян было адведзена па статутнай грамаце сядзібнай зямлі (з уключэннем выпускаў і пустапарожніх месц у рысе паселішчаў) 19 дзес., ворыўнай 285 дзес., сенакоснай 76 дзес., пашаў звыш сядзібных выганаў і выпускаў, не абкладзеных асабліваю павіннасцю, не паказана, усяго адной зручнай 380 дзес. Акрамя таго, у сялянскі надзел увайшло нязручных месц — не ўвайшло. Азначэнне граніц гэтай зямлі і агульнае апісанне яе заключаецца ў прыкладаемай да гэтага статутнай грамаце.

4. Выкупу належыць поўная ўладаемая ў цяперашні час колькасць зямлі, а менавіта ў паселішчы Вераб'ёва сядзібнай 6 дзес. 24 саж., ворыва 76 дзес. 642 саж., сенакоснай 35 дзес. 630 саж., усяго зручнай 117 дзес. 1296 саж. і пустапарожніх месц 7 дзес. 1968 саж. У паселішчы Лебедзева сядзібнай 10 дзес. 310 саж., ворыва 157 дзес. 70 саж., сенакоснай 75 дзес. 2260 саж. Усяго зручнай 243 дзес. 240 саж. і пустапарожніх месц 17 дзес. 1437 саж. Усяго ўжо ў абодвух паселішчах сядзібнай 16 дзес. 334 саж., ворыва 233 дзес. 712 саж., сенакоснай 111 дзес. 490 саж., усяго зручнай 360 дзес. 1536 саж. і пустапарожніх месц 25 дзес. 1005 саж.

Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 577. Воп. 3. Спр. 718. Л. 12.

ВОЛАСЦІ І ВАЖНЕЙШЫЯ ПАСЯЛЕННІ ЕЎРАПЕЙСКАЙ РАСІІ

Дзісенскі павет

В составе волостей: В районе волостей:

№ п/п	Наименование волостей	Число				Население			Кол. земли в десятинах		Количество земли (в десятинах)					
		сельских обществ	общин	селений	дворов	по ревизии (муж. пола)	по семейным спискам		во влад. крестьянских общ.		во владении частных лиц		казенной		остальной	
							муж. пола	женск. пола	всей	пахотной	всей	пахотной	всей	пахотной	всей	пахотной
1.	Леонпольская	7	7	62	348	1956	2507	2251	7644	3908	8915	2058	137	—	41	33
2.	Миорская	13	13	55	277	1114	1667	1549	3333	2390	7397	3125	—	—	—	—
3.	Николаевская	20	20	108	468	2122	2651	2669	6373	3424	16770	5302	—	—	115	49
4.	Новопогостская	5	5	62	484	1772	2469	2531	7374	4381	13448	4988	579	—	—	—
5.	Перебродская	5	5	86	384	1176	2205	2084	9636	5005	44	29	2313	—	1559	455
6.	Стефанпольская	14	14	45	232	1232	1800	1765	3616	3161	12778	2134	—	—	4	—
7.	Чересская	1	1	61	345	1430	2051	2199	7134	3739	7700	2078	—	—	—	—
8.	Язненская	7	7	137	453	1760	2446	2430	9124	4282	6706	2252	1547	131	261	163

СПС ВАЖНЕЙШЫХ ПАСЯЛЕННЯЎ НА 1886 г.

55. Вол. Леонпольская.

Леонполь, ус. вл.; ц. пр., ч. син., кирпич. з., крчм. В 2 в.—в. првл. Леонпольской волости. В 14 в.—пог. Узьмин, 2 ц. пр.

58. Вол. Миорская.

Миоры, мест. б. вл., при оз. Щелно-Миорки, дв. 2, жит. 17 (110 ч. лиц); в правл. (у г. 39 в.), кст., ч., нар. учил., 3 крчм., ярм. 15 авг. и 8—10 сент. В 6 в.— заст. Вильново кжвн. з.

59. Вол. Николаевская.

Слобода (Николаева), флв. (жит. 87): в првл.; ц. пр., шк., крчм. В 1 в.— ус. Голомысл,. ц. пр., кст. В 5 в.— им. Драшковичи, винок. з., солодовн., волов, млын. В 8 в.— заст. Флегерово, ц. пр. В 16 в.— ус. Понизовы, ц. пр.

60. Вол. Новопогостская.

Новый Погост, мест. б. вл., дв. 40, жит. 399; в. првл. (у. г. 63 в.), шк., п. д. В 6 в.— Бильдюги, евр. посел., евр. млтв. д.

61. Вол. Перебродская.

Линковщина, д. б. г., при оз. Апанасенки, дв. 8, жит. 94; в. првл. (у. г. 49 в.). В 6 в.— Перебродье, мест. (жит. 446) ц. пр., шк., п. д., трж. 14 сент.

Кублищина, д. б. г. дв. 6, жит. 43: старообр. млтв. д.

65. Вол. Стефанпольская.

Амельково, крчм. в. првл. Стефанпольской волости в 50 саж. В 3 в.— ус. Бальново, каплица. В 15 в.— кирп. з. при ус. Липовках.

66. Вол. Чересская.

Чересс, с. б. вл., при оз. Чересс, дв. 1, жит. 15; в правл. (у. г. 32 в.) ц. пр., шк., п. д. В 1/2 в.— винок. з., вод. млн.

Ильшовики, д. б. вл., при р. Волте, дв. 5, жит. 60, сукнов вод. млн., п. д.

68. Вол. Язненская.

Язно, с. б. вл., при р. Язне, дв. 10, жит. 137; в првл. (у. г. 15 в.), ц. пр., шк., крчм. В 1 в.— пивов. з. В 6 в.— каплица в ус. Заута. В 7 в.— пчт. ст. Раздерки.

Блошники, с. б. вл., при оз. Метло, дв. 6, жит. 64; ц. пр.

ПЕРАЛІК ВАЛАСЦЕЙ ПА СТАНАХ

Уезд Дисненский

В 1-м стане: Плисская. — Прозорокская. — Черневичская.
В 1-м и во 2-м станах: Глубокская. — Лужецкая.
В 1-м, 2-м и в 3-м станах: Залесская.
Во 2-м стане: Богинская. — Верхнянская. — Иодская. — Луцкая. — Поставская.
Во 2-м и в 3-м станах: Игуменовская. — Новопогостская.
В 3-м стане: Воропанщинская. — Друйская. — Леонпольская. — Миорская. — Переброд-ская. — Чересская.
В 4-м стане: Николаевская. — Стефанпольская. — Язненская.

Волости и важнейшие селения европейской России / Изд. Центрального статистического комитета. Вып. V. Губернии Литовской и Белорусской областей. СПб., 1886. С. 2—3, 17—19, 26.

Развіццё прамысловасці ў Дзісне. Занятак насельніцтва

Да сярэдзіны XIX ст. прамысловых прадпрыемстваў, нават маленькіх, у Дзісне не было. Як і некалькі стагоддзяў да таго, вытворчасцю неабходных тавараў займаліся рамеснікі. Калі ў XVII ст. яны аб'ядноўваліся ў 9 цэхаў, то ў 1860 г. — у 20. З 93 рамеснікаў 50 былі майстрамі, астатнія — памочнікамі і вучнямі.

У гэты час у горадзе паяўляюцца невялікія заводы. Сярод іх піваварны, два цагельныя з 26 рабочымі. У 1895 г. цэглы выпушчана на 996 руб. Хутчэй рамеснымі майстэрнямі былі ганчарныя заводзікі, дзе працавала 15 чалавек, якія выпусцілі за год прадукцыі на 950 руб. Да прамысловага прадпрыемства можна аднесці і млын.

У павеце было развіта вінакурэнне. У 1845 г. працавала 69 заводаў, якія выпусцілі прадукцыі на 80 813 руб., у 1859 г. 23 заводы — на 138 677 руб. У гэты час развіццё прамысловасці тармазіла адносная дарагоўля рабочай сілы. У 1958 г. рабочаму з канём за дзень плацілі 50 кап. на лесараспрацоўках, пры перавозках тавараў, на заводах плаціць менш было нельга.

Гараджане яшчэ займаліся сельскай гаспадаркай, трымалі 300 галоў буйной рагатай жывёлы, 117 коней, 189 свіней, 99 коз і 5 авечак. Прадукцыя падсобных гаспадарак ішла на сямейныя патрэбы, зрэдку прадавалася на рынку.

Па колькасці рамеснікаў Дзісна адставала ад іншых гарадоў. Прамысловасць была дробная. Той жа піваварны заводзік выпусціў у 1860 г. 5000 вёдраў піва, свечнае прадпрыемства — да 170 пудоў сальных свечак. Аднак умовы працы рамеснікаў былі цяжкімі, якасць вырабаў не дазваляла іх экспартаваць, а мясцовы абмежаваны рынак — расшырыць аб'ёмы вытворчасці, таму заробак быў нізкі. Напрыклад, 200 руб. у сярэднім па губерні за год зарабляліі шаўцы, як і краўцы, хаця іх заробак быў крышку большы. Тыднёвы заробак у 4—5 руб. лічыўся вялікім поспехам.

У 60-я гады ў Дзісне было 9 хлебнікаў і булачнікаў, столькі ж мясніковў, па 4— печнікі, кавалі, гадзіншчыкі, 3 сталяры, па 2— кандытары, меднікі, яшчэ канавал і некаторыя іншыя. Вялікая колькасць гараджан шукала заробак у іншых месцах, 27 мяшчанскіх сем'яў апрацоўвала зямлю. У рамеснікаў быў неабмежаваны рабочы дзень. Ён пачынаўся ў 7—8 гадзін раніцы і працягваўся не менш 13 гадзін, а ў яўрэйскіх

рамеснікаў з 9 гадзін раніцы — пасля ранішняй малітвы, але і заканчваўся пазней. Перапынак у рабоце быў адзін, калі рабочыя палуднавалі, не адыходзячы ад рабочага месца. На некаторых карпатлівых аперацыях выкарыстоўвалася праца жанчын і дзяцей, якім плацілі яшчэ менш.

У 1889 г. на 4 прадпрыемствах горада працавала 9 чалавек, якія выпусцілі прадукцыі на 1270 руб., у 1890 г.— 3 прадпрыемствы, 9 рабочых і прадукцыі на 1330 руб. У пачатку 90-х гадоў пачаўся пэўны рост вытворчасці ў асноўным за кошт цагельных заводаў. У 1892 г. дзейнічала 5 прадпрыемстваў на 12 рабочых месц з аб'ёмам вытворчасці ў 1630 руб. У 1895 г. вытворчасць выросла ў 10 разоў. На двух цагельна-чарапічных заводах працавала 12 чалавек, прадукцыі выпушчана на 15 000 руб., на двух вапнавых — 5 рабочых, выраблена прадукцыі на 270 руб., адзін работнік на свечка-сальнай вытворчасці — на 150, два мылаварныя прадпрыемствы з 3 рабочымі — на 250, ветраны млын з 2 работнікамі меў абарот у 500 руб. Усяго 9 прадпрыемстваў з 27 рабочымі выпусцілі прадукцыі на 16 400 руб. У пералік яшчэ не ўключана адно прадпрыемства з 4 рабочымі і гадавым выпускам прадукцыі на 240 руб. Для параўнання: у Вілейцы працавала прадпрыемства з 2 рабочымі і гадавым аб'ёмам прадукцыі ў 800 руб.

У 1897 г. адбыўся спад вытворчасці, гандлю і масавы адыход насельніцтва. На прадпрыемствах з 22 рабочымі выпушчана прадукцыі на 3810 руб. Па дадзеных «Обзора Виленской губернии» ў 1900 г. у горадзе ўсяго 6 заводаў, 25 рабочых, якія выпусцілі прадукцыі на 3755 руб. Яшчэ 20 рабочых працавала на шчаціннай мануфактуры, было 467 рамеснікаў 45 спецыяльнасцей, нават ювеліры, мадысткі і музыканты. Вялікая колькасць рамеснікаў залежала ад купцоў-скупшчыкаў, да 1908 г. захоўваліся цэхі, што тармазіла развіццё прамысловасці. Адмена цэхаў пачалася ў 1902 г. і працягвалася да 1914 г.

У 1901 г. у Дзісне было 7 прадпрыемстваў з 38 рабочымі, прадукцыі выпускалася на 4045 руб. Адпаведныя паказчыкі 1903 г.— 7, 13 і 9000. Буйнейшае прадпрыемства — вапнава-цагельны завод з 10 рабочымі і аб'ёмам у 5560 руб. На скураным прадпрыемстве заняты адзін чалавек пры аб'ёме ў 400 руб., млын зарабіў 3000 руб. Іншыя прадпрыемствы з-за нязначных аб'ёмаў у статыстыку не трапляюць. Пасля крызісу 1904—1908 гг. 4 прадпрыемствы горада выпускалі прадукцыі на 6000 руб., працавала на іх 18 чалавек. Адпаведныя паказчыкі 1912 г.— 5 прадпрыемстваў, 19 рабочых, абарот 30 405 руб. Рост відавочны, тым не менш гэта адзін з самых нізкіх паказчыкаў у губерні.

У 1900 г. у Дзісенскім эканамічным раёне размяшчалася 31 прадпрыемства з абаротам у 137 000 руб. Асноўная галіна — харчовая — 18 прадпрыемстваў і 112 000 руб. абароту. На другім месцы — дрэваапрацоўчая галіна — 3 прадпрыемствы і 21 000 руб. аб'ёму вытворчасці. Потым — мінеральна-здабываючая (9 прадпрыемстваў і 4000 руб. абароту), хімічная (1 прадпрыемства) прамысловасць.

З 1905 г. ля Дзісны працавала шмат малаказаводаў — 2 у павеце, 24 грамадскія сялянскія маслабойні і 38 прадпрыемстваў у маёнтках. Вялікі грамадскі завод «Перфект» за год выпрабляў больш 3000 пудоў масла. У 1907 г. у Англію было адпраўлена прадукцыі на 175 000 руб.

З цягам часу рабочая сіла ў Дзісне стала больш таннай, мужчына-рознарабочы зарабляў за дзень да рубля, жанчына — да 60 кап. Гэта сярэднія лічбы па губерні за 1910 г. Прыслуга ў гарадах мела 8—10 руб. у месяц без утрымання, з утрыманнем — 2—4 руб.

С. Ф. Шымуковіч

Гандаль у Дзісне ў XIX ст.

Яшчэ ў сярэднявеччы Дзісна была вядомая як цэнтр транзітнага гандлю на Заходняй Дзвіне. Гэтая рака да другой паловы XIX ст. была асноўным транспартным шляхам з паўночных беларускіх зямель — у Рыгу, да Балтыйскага мора, хаця шматлікія парогі, камяні, астраўкі перашкаджалі суднаходству. Летам навігацыя зусім спынялася з-за абмялення. Існавала некалькі праектаў паляпшэння суднаходства, але ўсе яны вызначаліся дарагоўляй і слабай эфектыўнасцю. У пачатку стагоддзя рэчышча на ўчастку Дзісна—Дзінабург ачышчалася ад камянёў, кіраваў работамі паручнік Дзебаналь.

Дзісна жыла на даходы ад гандлю, таму не мела патрэбы ў развіцці прамысловасці. Ужо ў 1813 г. тут пагружана 91 судна, у 1814 г.— 90. У 1820 г. на 33 судны пагружана тавараў на 228 466 руб., у 1821—37 суднаў на 750 170 руб., у 1826—9 суднаў і складзены 1764 плыты агульным коштам 367 680 руб., у 1833 г. пагружана 139 суднаў на 423 836 руб., а выгружана на 11 936 руб. З Дзісны адпраўлялі зерне, драўніну, лён і іншыя мясцовыя тавары. Сюды з Рыгі везлі соль, селядцы, паўфабрыкаты.

Буйныя здзелкі заключалі на штотыднёвых рынках, хаця гараджане і вяскоўцы на іх займаліся таксама дробным рознічным гандлем. Рэалізоўвалі прадукты харчавання, статак, уласныя вырабы, рыбу, злоўленую ў Дзісёнцы і Дзвіне. Штодзённа рознічны гандаль вёўся ў лаўках. У 1840 г. іх было 75, 3 карчмы і 9 шынкоў. У 1858 г. 13 лавак было з цэглы і 60 драўляных, дзве аптэкі.

У 1858 г. на 7 паветаў Віленскай губерні выдадзена 227 гандлёвых пасведчанняў, у тым ліку павятовым гарадам 32, з іх 12 у Дзісну. Купцам 3-й гільдыі і прыказчыкам выдадзена ў гэтым годзе па павятовых гарадах 9 пасведчанняў, з іх 8 у Дзісну. У 1860 г. гораду выдадзена 17 гандлёвых пасведчанняў, у тым ліку 13 купецкіх. У гэтым жа годзе тут пагружана 247 суднаў, 125 579 пудоў тавараў на 62 264 руб. Вялікую ролю іралі іншагароднія купцы-аптавікі, якія куплялі на мясцовым рынку вялікія партыі збожжа і лёну. Цэны на зерне нават у рознічным гандлі вельмі залежалі ў Дзісне ад попыту ў Рызе. У 1855 г. у час блакады рыжскага порта ў сувязі з Крымскай вайной хлеб у горадзе быў больш танны, чым па губерні, як толькі парты адкрыліся — цэны зноў выраслі вышэй сярэднегубернскіх.

У сярэдзіне стагоддзя Дзісеншчына займала 2-е месца ў губерні па колькасці лясоў. Драўніну вельмі актыўна сплаўлялі ў Рыгу, і да канца стагоддзя лясы высеклі.

Але гандлёвыя шляхі ішлі не толькі па рэках. З Мінска ў Дзісну праз Лагойск, Докшыцы і Вілейку ішла дарога 2-га разраду. Па правым беразе Дзвіны яна працягвалася ад Полацка і называлася «купецкім трактам». Да Мінска на 120 вёрст шляху было 7 мастоў і 39 гацяў. Былі яшчэ дарогі мясцовага значэння, зімой ездзілі па замёрзшай Дзвіне, плавалі па ёй 230 дзён.

У канцы стагоддзя баркі, лодкі, плыты дапоўнілі параходы. На ўчастку Віцебск — Дзвінск хадзіла 7 параходаў З. Гіндзіна і Л. Рахмілевіча, якія ажыццяўлялі грузавыя і пасажырскія перавозкі. Білет 1-га класа з Віцебска ў Дзісну каштаваў 1 руб. 30 кап., 2-га — 85 кап. Сувязь з заходнім берагам ажыццяўлялася паромам.

І ў канцы стагоддзя пералік тавараў істотна не памяняўся: лён, ільнасемя, пянька, збожжа, спірт, алей, масла, сала, дзёгаць, вар, шкіпінар, драўніна і вырабы з яе, мыла, воўна, металічныя вырабы. У 70-я гады штогод грузілася прыкладна на 70 000 руб., хаця, па іншых звестках, у канцы 60-х гадоў штогод на двух прыстанях Дзісенскага павета грузілі 200 суднаў, складалі

500 плытоў з грузам на 400 000 руб. У 1895 г. пагружана 27 параходаў, 614 суднаў, 7083 плыты, перагружана 86 параходаў і 10 суднаў. Плаваць было даволі небяспечна. У тым жа годзе параход «Друя», вяртаючыся з Дзвінска, ля Дзісны наскочыў на камень, праўда, абышлося без пацярпеўшых.

У 1897 г. на двух прыстанях пагружана 451 судна, 923 плыты, 14 параходаў. Бачна істотнае скарачэнне гандлю па рацэ. У гэты час паменшылася на трэць колькасць жыхароў у горадзе. У 1903 г. пагружана 493 судны і параходы, складзена 715 плытоў на 222 507 руб. Значна павялічыліся аб'ёмы тавараабароту ў 1912 г., калі складзена 1104 плыты, пагружана 665 суднаў і параходаў на 1 280 755 руб. Яшчэ перагружана 115 суднаў і параходаў на 663 619 руб. З двух прыстаняў на дзісенскую прыходзілася да двух трэціх усяго абароту. Толькі аб'ёмы перавозак па чыгунцы былі непараўнальна большыя, і гарады на ёй раслі больш імкліва.

У маштабах імперыі Дзісна была дробным рынкам земляробчай, расліннай і лясной прадукцыі. Гадавы абарот рынку драўніны — 29 000, земляробчай і расліннай прадукцыі — 109 000 руб. Колькасць гандлёвых прадпрыемстваў адпаведна 4 і 20. Гандлёвыя абароты эканамічнага раёна наступныя:

Рынак прадукцыі	Абарот	Колькасць прадпрыемстваў
Земляробчай і расліннай	216 000	50
Жывёлагадоўчай і паляўнічай	45 000	25
Лясной і драўніннай	176 000	12
Мінеральнай і металічнай	51 000	22
Мануфактурнай і галантарэйнай	218 000	84
Піцейна-карчомных устаноў	442 000	85
Змешана-гаспадарчай	451 000	251
Усяго	1 599 000	

Адзін з галоўных раслінных прадуктаў — лён. У 1910 г. асноўнымі яго вытворцамі былі сяляне. Яны прадавалі штогод з 200 пудоў валакна больш 100 гатункаў коштам ад 1 да 10 руб. (1893) у залежнасці ад гатунку. Толькі ў 1891 г. з Дзісны было адпраўлена 10 000 беркаўцаў ільну (беркавец — 164 кг), пераважна за мяжу.

У 1912 г. пералік экспартуемых тавараў папоўніўся воўнай. Цана пуда ад 20 да 28 руб. Усяго было пастаўлена 33 пуды з Дзісеншчыны, бо нідзе больш у губерні авечак не гадавалі.

Пасля 1905 г. павет становіцца цэнтрам маслабойнай прамысловасці губерні. Праз год у ваколіцах горада дзейнічала 11 зборных і 5 арцельных малаказаводаў, якія прадалі за мяжу 5000 пудоў масла. Малако куплялі ў сялян па 10 кап. за гарнец летам і па 60 кап. вясной. Пуд масла прадавалі па 17—18 руб., у 1907 г. у Англію прадалі яго на 175 тыс. руб.

Наяўнасць дробнай прамысловасці патрабавала купца-аптавіка, які збіраў прадукцыю некалькіх прадпрыемстваў. Былі яны ў Дзісне, займаліся гэтым і іншагароднія. Ужо ў 60-х гадах XIX ст. у горадзе маёмасцю валодалі 60 іншагародніх купцоў. Ды і мяшчане ўцягваліся ў гандаль, штогод беручы гандлёвыя пасведчанні. Палавіна такіх дакументаў, выдадзеных у губерні, заставалася ў Вільні, другая палавіна размяркоўвалася паміж 6 павятовымі гарадамі, мястэчкамі і маёнткамі:

Год	Губерня	Вільня	Дзісна
1885	9555	5213	683
1889	10 482	5318	707
1890	12 043	6221	1191
1892	12 200	6257	1239
1893	12 755	6444	1153
1895	—	—	801
1897	—	—	914
1901	—	—	1122
1903	—	—	1113
1911	—	—	1164
1912	—	—	1366

Да сярэдзіны 90-х гадоў XIX ст. Дзісна была лідэрам у губерні ў атрыманні

гандлёвых пасведчанняў, а ў пачатку XX ст. наперад выходзяць Ашмяны і Ліда. Акрамя штотыднёвых рынкаў у горадзе праводзіліся два штогадовыя кірмашы, хаця і невялікія. У 1901 г. на іх прывезлі тавараў на 13 750 руб., прадавалі на 9630. У 1903 г. гэтыя лічбы склалі адпаведна 15 000 і 10 000 руб. Яшчэ меншыя павятовыя кірмашы былі ў Троках і Вілейцы. Значэнне кірмашоў памяншалася. У 1912 г. на іх у Дзісну прывезлі тавараў на 8955 руб., прадалі на 5800, у 1912 г. адпаведна 8570 і 6290. Гандаль перамяшчаўся ў лаўкі і магазіны. Ужо ў 1860 г. іх было каля 78, акрамя таго, у горадзе было яшчэ 5 магазінаў для складзіравання тавараў, кандытарская, рэстаран, карчма, 17 сталовых пры заезных дамах. Да сярэдзіны 90-х гадоў колькасць лавак і магазінаў дасягнула 163, з іх 130 цагляных. У 1904 г. было ўжо 29 корчмаў. У 1910 г. прадпрыемствы грамадскага харчавання падзяляліся наступным чынам: рэстаран, 11 сталовых, харчэўняў і чаёўных, 22 карчмы, 5 піўных, лавак і вінніц, 10 гасцініц. Існавала спажывецкае таварыства. Цэны на прадукты былі памяркоўныя, зачастую мяса было нават у простага гараджаніна. Фунт жытнёвага хлеба каштаваў 3,2 кап., пшанічнага — 4, мяса першага гатунку — 14, другога гатунку — 11, солі — 1,5, цукру — 15 кап. Гэта «веснавыя», найбольш высокія цэны. Заробак чорнарабочага ў горадзе за дзень — 1 руб., кваліфікаваная праца каштавала даражэй.

Магазіны ў асноўным належалі яўрэям, а ў пачатку XX ст. з'яўляюцца «хаўрусныя», сумесныя крамы, асабліва ў гандлі прадукцыяй жывёлагадоўлі. Належалі яны часта арцельным малаказаводам.

Дзісна была гандлёвым горадам. У пачатку XX ст. з упадкам гандлю па Дзвіне намеціўся ўпадак Дзісны.

С. Ф. Шымуковіч

Кірмашы ў Міёрах

Если где не очень далеко ярмарка, селянин постарается непременно на ней побывать. У него наступают разного рода домашние праздники; нужно, следовательно, сделать маленькие запасы. С другой стороны, в хозяйстве кое-что оказывается лишним: можно продать или обменять на более необходимое в данную пору. Ярмарка в этом отношении представляет очень много для него удобства.

До последнего времени православие в крае было подавлено разного рода влияниями вредными, и поэтому ярмарки главным образом устраивались в тех местах, где бывали костелы. Все они носят одинаковый характер: мы опишем одну из них в местечке Миорах Виленской губернии Дисненского уезда со слов селянина. Из далеких местностей селяне приезжают в Миоры в канун дня ярмарки (8 сентября), более близкие в самую ярмарку. На лугу, перед селом, ставят повозки и лошадей. Ржание и топот лошадей, пение нищих, говор, шум — все сливается в один базарный гул. В селе на улице становятся по одной стороне приезжие старообрядцы с яблоками, пряниками, булками; продаются здесь также крестики, иконы, в прежнее время (недавнее время) виднелись разнообразные польские книжки, «шкоплеры» и т. п. По другой стороне села сидят нищие, поют большей частью религиозные песни, «литании». На паперти костела толпятся богомольцы: одни из них, особенно женщины-шляхтянки, ползут на коленях вокруг костела, другие спешат в костел послушать «органа»; здесь они покупают разные члены человеческого тела, сделанные в миниатюре из воска: кто страдает головной болью, покупает голову, в надежде избавиться от болезни; больной глазами покупает глаз; девушки покупают восковые пластинки с изображением человека, чтобы быть

стройными и красивыми. Все подобные вещицы лежат первоначально перед иконой Божьей Матери, откуда они поступают в продажу.

Из костела отправляются к своим повозкам обедать. Потом закупают все необходимое и возвращаются домой; детям привозят яблок и бубликов. Относительно материала, продаваемого на ярмарке, он изменяется, с одной стороны, по временам года, с другой — вследствие местного богатства или производства того или иного произведения.

(Чересы Виленской губернии
Дисненского уезда)

Чтения в императорском Обществе истории и древности российских при Московском университете /Повремен. издание под заведыванием О. М. Водянского. 1871. Январь — март. Книга первая. Москва, 1871. С. 155. (З архіва Сяргея Панізніка.)

Будаўніцтва і гарадская гаспадарка

Старая частка Дзісны забудоўвалася да вуліцы Парканнай, за якой ішлі ўмацаванні Ніжняга замка. Паступова за імі выросла Прадмесце, заселенае беднатой, бліжэй да Дарожкавічаў размясціўся «мікрараён» галечы — Пяскі. З уваходжаннем горада ў склад Расійскай імперыі быў распрацаваны і зацверджаны 1 студзеня 1798 г. план развіцця Дзісны, паколькі яна ўяўляла сабой да гэтага часу «руіну».

Паступова горад рос. З 307 дамоў у 1790 г. іх стала 414 у 1837 г. Знешні выгляд будынкаў вызначаўся маёмасным станам уладальнікаў. Культавых збудаванняў было 6, казённых дамоў — 1, царкоўных — 3, шляхецкіх і чыноўніцкіх — 21, купецкіх — 12, мяшчанскіх — 338, салдацкіх — 38, належачых духоўным — 1. Яшчэ горад меў 2 драўляныя масты, 2 брукаваныя вуліцы, 22 небрукаваныя і 2 плошчы, 64 агароды, 32 месцы пад забудову і 6 могілак.

Да 1840 г. колькасць храмаў скарацілася да 4, драўляных дамоў стала 399, цагляныя толькі два, адна нецаркоўная школа на 34 вучні, 75 лавак, 3 карчмы, 9 шынкоў і турма. Гораду належаў востраў, на якім ад умацаванняў Верхняга замка засталіся валы і драўляныя збудаванні, якія разбурыліся і вялікай каштоўнасці ўжо не ўяўлялі.

У горадзе знаходзілася шмат пляцоў, якія належалі царкве. У 1797 г. іх абмянялі на востраў.

Архітэктурны выгляд Дзісны ў многім вызначалі культавыя будынкі. Найбольш вылучаўся Уваскрэсенскі манастыр, які існаваў нібыта нават з XV ст. і быў утвораны пры аднайменнай царкве, якая была пабудавана недзе ў XIII ст. Аднак першае пісьмовае ўпамінанне і пра царкву, і пра манастыр адносіцца да 1633 г. З-за стратнасці і старасці збудаванняў манастыр закрылі ў 1810 г.

Уваскрэсенская і Затрапезна-Уведзенская цэрквы былі пабудаваны з дрэва ў 1728 г. на грошы і пры непасрэдным удзеле адной з найбольш вядомых сем'яў Дзісны Барадульскіх. Да гэтага яны неаднаразова перабудоўваліся пасля частых пажараў. На могілках стаяла Успенская царква, якая згарэла ў 1812 г. пад час нашэсця французаў. На яе месца ў 1826 г. была перанесена адрамантаваная Затрапезна-Уведзенская царква. Яшчэ на адных могілках знаходзілася пабудаваная ў 1726 г. царква ў імя Георгія Пабеданосца.

У 1840 г. у рэчышчы дзяржаўнай палітыкі на ўмацаванне праваслаўя ў Беларусі з драўлянага касцёла, што стаяў побач з праваслаўным манастыром, узвялі царкву ў імя Мікалая Чудатворца. У 1844 г. на сродкі мясцовага памешчыка-католіка Дарашковіча зрабілі рамонт новаяўленай царквы. Праваслаўныя Дзісны хацелі, вядома, атрымаць цагляны будынак вялікага касцёла, але неабходных сродкаў на яго аднаўленне не было. Цагляны касцёл пабудовы

1773 г. католікі адрамантавалі ў 1858 г. Галоўны яго прастол у імя Бязгрэшнага зачацця Багародзіцы, бакавыя — у імя св. Антонія Паца, св. Іосіфа Абручніка, св. Фамы і св. Роха.

У 1870 г. была пабудавана новая цагляная праваслаўная Уваскрэсенская царква. На яе ўзвядзенне затрачана з дзяржаўных сродкаў 25 653 руб. У 1879 г. у горадзе пабудавалі праваслаўную капліцу «У імя збавення Аляксандра II ад смерці замахам».

У 1861 г. у горадзе налічвалася больш 500 жылых дамоў, сярод іх ужо 8 было цагляных. А яшчэ 73 лаўкі, 2 аптэкі, гарадская бальніца, турма, 2 вучылішчы, 4 сінагогі. Пабудовы займалі 40 гектараў з 599 належачых гораду. Дзісну фарміравалі дзве асноўныя магістралі — Замкавая і Уваскрэсенская вуліцы. Пры іх перасячэнні знаходзілася гандлёвая плошча з магазінамі і ратушай, а таксама праваслаўным манастыром і цэрквамі.

Адна з асноўных вуліц ішла ўздоўж берага Дзвіны, на ёй размяшчаўся цагляны касцёл, далей гэтая вуліца злівалася з дарогай на Друю.

Амаль усе пабудовы горада былі драўлянымі. Назвы вуліц не мяняліся з часоў заснавання Дзісны, многія атрымалі імёны ад крапасных вежаў — Прабойная, Свіная, Каляпаркана, Чыжоўская, Нарбутаўская, Дарошкаўская, Мытная, Запарканам, Уезная, Замкавая, Зямянская, Канчэўская, завулак Конскі. 16 чэрвеня 1882 г. усе драўляныя пабудовы згарэлі. Не пацярпелі толькі Мікалаеўская і новая Уваскрэсенская цэрквы, турма, асобныя драўляныя і цагляныя пабудовы. Згарэў манастыр, у якім захоўваліся стары гарадскі і царкоўны архівы, моцна пацярпеў касцёл. У 1883 г. яго капітальна адрэстаўрыравалі і зноў асвяцілі.

Горад адразу пачаў адбудоўвацца. Перавага аддавалася капітальным будынкам з цэглы. У старым горадзе захаваўся ранейшы план, а на новых землях пабудовы ўтваралі планавыя роўныя прамавугольнікі. Яшчэ да пажару 1882 г. вядомы рускі падарожнік П. П. Сямёнаў Цянь-Шанскі назваў Дзісну лепшым горадам Віленскай губерні.

Будынак турмы хоць і захаваўся, але зусім развальваўся. Штогод казна выдзяляла на яе па 300—500 руб., амаль уся сума ішла на рамонт. 1 чэрвеня 1891 г. урад прыняў рашэнне будаваць арыштанцкія дамы ў павятовых гарадах



Сучасны выгляд францысканскага касцёла ў Дзісне

Віленскай губерні. Самы буйны меркаваўся ў Дзісне — на 50 месц. На ўвесь праект планавалася выдзеліць 103 835 руб. Вырашана было будаваць арышт-танцкія дамы самай простай канструкцыі — грошай у дзяржавы не было. У 1896 г. планавалася пачаць узвядзенне цаглянага будынка турмы, для чаго патрабавалася 37 165 руб. Але далей праектаў справа не пайшла. Старая турма проста развалілася, вязняў перавялі ў памяшканне віннага склада акцызнага ведамства. Вінны склад — вялікі двухпавярховы цагляны будынак, побач аднапавярховы адміністрацыйны. Узведзены яны ў 1898 г. Перабудова памяшкання пад турму абышлася казне ў 12 000 руб.

Пасля пажару 1882 г. у Дзісне арганізавана Вольнае пажарнае таварыства, дзейнасць якога была паспяховай. Гарадскія ўлады набылі для пажарных 4 коней. Яшчэ ў горадзе знаходзіўся прадстаўнік Расійскага страхавога ад агню таварыства, заснаванага ў 1827 г.,— Фрыдрых Дзмітрыевіч Дар'евіч.

У 1897 г. з'явіўся праект пабудовы ў Дзісне новай лячэбніцы, на якую планавалася выдаткаваць 13 281 руб. Узводзіць будынак пачалі праз шэсць гадоў па новаму праекту (1903), затрацілі на будоўлю гарадской бальніцы 41 523 руб. У 1901 г. вырашана было будаваць Дом народнай цвярозасці, на які меркавалася выдзеліць 9786 руб. У тым жа годзе быў складзены каштарыс будаўніцтва памяшкання казначэйства, расходы вызначаліся ў 24 140 руб. Яно было ўзведзена, але ў 1912 г. капітальна рамантавалася, на што пайшло яшчэ 3300 руб.

Да пачатку XX ст. з-за старасці закрыта Мікалаеўская царква. У 1908 г. распачата ўзвядзенне новай, на што асігнавана з казны 6374 руб. 46 кап. Яна пабудавана на могілках з чырвонай цэглы. Будынак прамавугольнай формы з пяціграннай апсідай, бляшанай двухсхільнай страхой, на якой цыбуліна на васьмігранным барабане. Фасады плоскія, аконныя праёмы праразныя. Галоўны ўваход выдзяляўся паветачкай. Побач з царквою стаіць двух'ярусная званіца (чацвярык на чацверыку), таксама з чырвонай цэглы. Усё ў псеўдарускім стылі. Царква была названа ў гонар іконы св. Адзігітрыі.

У горадзе былі будынкі сінагогі, малельня стараверaў, але гэтыя памяшканні не вызначаліся ў архітэктурным пла-

Аляксандраўскі бульвар у Дзісне. Паштоўка

Хрэсны ход у Дзісне. Дарэвалюцыйны здымак

не. У прыватных дамах размяшчаліся самыя розныя ўстановы — ад публічнага дома да навучальных устаноў. У 1914 г. Дзісенскае вышэйшае 4-класнае вучылішча знаходзілася ў доме Ландау на вуглу вуліц Касатоўскай і Уваскрэсенскай. Гэта двухпавярховы будынак, за арэнду якога вучылішча плаціла 900 руб. у год.

У 1908 г. працягвалася будаўніцтва маста праз раку Дзісна даўжынёй 70,12 сажня.

Актыўна будаваліся купцы. На былых Аляксандраўскай, Парканнай вуліцах да гэтага часу захаваліся купецкія будынкі ў два паверхі з вялікімі падваламі. На Аляксандраўскай, Замкавай вуліцах і плошчы і цяпер можна бачыць памяшканні лавак і майстэрняў — гэта аднапавярховыя цагляныя пабудовы. Будаўніцтва забяспечвала попыт на будматэрыялы і будаўнікоў, заробак якіх істотна розніўся. За дзень печнікі атрымлівалі 1,78 руб., сталяры і тынкоўшчыкі — па 1,73, муляры — 1,67, маляры — 1,66, цесляры — 1,64, кавалі — 1,49, землякопы — 0,99, рознарабочыя — 0,90 руб.

У 1893 г. у горадзе было 582 драўляныя і 86 цагляных дамоў, не лічачы адміністрацыйных будынкаў. Яшчэ налічваліся 163 лаўкі, з іх 130 цагляных. У 1904 г. жылых дамоў ужо 841, крытых бляхай 7, чарапіцай — 36, дрэвам — 775, толем — 36 і ніводнага — саломай.

У 1904 г. на адну пабудову прыходзілася 10,8 жыхара. Гэта трэці паказчык па губерні пасля Ліды (15) і Ашмян (11,5). У горадзе было 56 вуліц і завулкаў агульнай даўжынёй 22,4 вярсты, з іх забрукавана 2,9, ці 12,9%. Гэта, як правіла, цэнтральныя вуліцы. Яшчэ былі дзве плошчы ў 1600 кв. сажняў, што складала 0,5% усяго гарадскога абшару. Вуліцы асвятлялі 110 газавых ліхтароў, 1 ліхтар на 101,8 сажня. Не было водаправода і каналізацыі, не сустракаліся яны і ў іншых павятовых гарадах. Затое працавалі 2 царквы, касцёл, 7 іудзейскіх малітоўных устаноў, 4 могілкі, 5 школ, 2 бібліятэкі, пазыкова-ашчад-

ная каса, натарыяльная кантора, два начлежныя дамы. Ды яшчэ самыя танныя кватэры і прыслуга на ўвесь Паўночна-Заходні край. Так, кватэра ў 6 пакояў і больш каштавала 100—200 руб. у год (у Лідзе 600), 4—6 пакояў — 50—100 (у Лідзе 200—500), малая кватэра да 4 пакояў — 25—50 (у Лідзе 150—200) руб. У 1897 г. у Дзісне была 1171 кватэра, у 1910 г.— 1235 (нязначны рост у параўнанні з іншымі гарадамі). Адставала будаўніцтва цагляных дамоў. У 1910 г. іх было 75 на 825 драўляных. Колькасць скарацілася з-за таго, што на цагляныя дамы рабіліся драўляныя надбудовы, будынкі атрымліваліся іншага разраду — змешанага. Бляхай крыта 30 будынкаў, чарапіцай — 17, дрэвам — 839, толем — 14. На жылы будынак прыходзілася 8,1 жыхара. Гораду належала 180 800 кв. сажняў зямлі (24,8 сажня на аднаго гараджаніна). Налічвалася 55 вуліц і завулкаў даўжынёй 22,8 вярсты, брукавана 4,6 вярсты — 20,2%, дзве плошчы, 2 бульвары ў 0,7 вярсты, захавалася 110 газавых ліхтароў. У тым жа 1910 г. дзейнічала 12 культавых устаноў — 2 царквы, касцёл, сінагога, 6 малітоўных іудзейскіх дамоў, праваслаўная капліца, малітоўны дом стараверaў.

С. Ф. Шымуковіч

З гістарычных крыніц

ЗАЛАЖЭННЕ НОВАЙ КАМЕННАЙ ЦАРКВЫ Ў в. УЗМЁНЫ

Вот что сообщает об этом священник чересской церкви о. Иоанн Василевский. Наконец и Дисненский уезд выступает с церковно-строительной деятельностью. 26-го числа месяца мая сего 1866 года мы торжествовали первую закладку церкви в честь святителя Николая Чудотворца в селении Узменах Дисненского уезда. О времени закладки дисненский уездный комитет известил священника узменской церкви Виктора Юревича, который в свою очередь уведомил и просил окрестное духовенство прибыть для соборного служения и освящения закладки. Закладку узменскай церкви освящал священник Иоанн Василевский с священником леонпольской церкви Александром Бартошевичем, григоровицкой — Константином Усаковским и дьяконом леонпольской церкви Стефаном Косецким. Во время молитвословий над закладкою в выдолбленный камень положено было присутствующими много серебряных монет, которые были прикрыты латунною плиткой с должною надписью, а поверх — другим камнем и залиты известью. По освящении закладки к народу сказано было священником Василевским поучение, после чего провозглашены обычные многолетствия. Торжество поусердствовали посетить представитель комитета г. военный начальник, подполковник Данилов, г. г. мировой посредник Васенко; капитан жандармов Дункель, дисненский исправник Лукин и судья Дисненского уездного суда Боровский. Старая церковь узменская во время литургии переполнена была богомольцами, в числе коих много было крестьян соседних приходов чересского, леонпольского и григоровицкого, стекшихся возслать общие молитвы о ниспослании благословения на место, избранное для нового храма Божия. Ближайший надзор за постройкою новозаложенной церкви дисненским комитетом поручен капитану жандармов Дункелю, и по началу, вполне удовлетворительному во всех отношениях, по ревностной заботливости г. Дункеля, можно надеяться на успешность, прочность и добросовестность начатого дела.

Вестник западной России. 1866. Кн. XII. Т. IV. С. 273—274.

З АРТЫКУЛА А. К. КІРКОРА «НАРОДНАЯ ПРАЦА»

Еще в 1861 г. А. К. Корева в своей статистике Виленской губерніи весьма основательно заметил, что ежели-бы придавать веру официальным известіям о количестве посевов и сборах по соображеніи данных за десять лет, то оказалось бы, что на самое продовольствіе жителей в этой губерніи недоставало бы 681,040 четвертей ржи и 893,060 четвертей картофеля. А между тем достоверно известно, что жители Виленской губерніи излишек ржи сбывают в Ковно для вывоза за границу и в Дисну для сплава по Западной Двине в Ригу. Мало того, часть хлеба и картофеля идет на винокуреніе. Из собранных же самим А. К. Корева сведений на месте оказывается, что напр. рожь средним числом возвращается 5,5 зерном, а в некоторых местах, как напр. в частях Трокскаго, Виленскаго, Свенцянскаго и по р. Западной Двине Дисненскаго уездов, есть пространства, где рожь возвращается 7, 8, 9 и даже 10 зерном; в частях Дисненскаго, Ошмянскаго и Лидскаго уездов 6 и 7 зерном. То же самое можно сказать о двух остальных губерніях.

Лен составляет весьма прибыльную статью дохода в сельском хозяйстве. В Виленской губерніи разведеніем льна занимаются преимущественно в Виленском, Свенцянском, Лидском и Дисненском уездах. В Гродненской губерніи разведеніе льна сильно распространено во всех почти уездах.

Живописная Россия / Репринт. воспроизведение изд. 1882 г. Мн., 1993. С. 208, 211.

У 1870-х гадах згарэў у Дзісне Васкрэсенскі манастыр і царква, а ў ёй — багатыя і дужа старадаўныя архівы дакументаў, перавезеных у XVI ст. з Полацка, а также — архівы і бібліятэка Дзісненскага Младзенчэскага Брацтва і дакуманты школы гэтага брацтва.

Шлюбскі А. Матэр'ялы да крыўскае гістарапісі. Доля кнігасховаў і архіваў // Спадчына. 1992. № 4.

ПАРОХОДСТВО В СЕВЕРО-ЗАПАДНОМ КРАЕ

По реке Западной Двине: I Витебск — Велиж... II Витебск — Двинск, 320 верст. Ежегодно, кроме суббот. Из Витебска в 2 часа дня, в Двинск прибывает на следующий день в 8 часов вечера. Из Двинска в 3 часа утра, в Витебск прибывает на 3-й день в полдень. Цена: I класс 2 рубля 30 копеек, II класс 1 р. 55 к. Пристани: Витебск, Старое-Село, Будылово, Бешенковичи, Улла, Усвица, Оболь, Полоцк, Устье, Дисна, Понизово, Дрисса, Леонполь, Друя, Креславка, Копылово, Двинск.

Виленский календарь на 1911 г.

Дисна — 1) уездный город Виленской губернии, на Западной Двине; пристань; 9 тысяч жителей; 1 лечебное, 2 библиотечные, 5 низших учебных заведений, 1 кредитное учреждение; 31 тысяча рублей бюджет; Дисненский уезд — 5350 квадратных верст; 229 тысяч жителей; 2) приток Западной Двины; берет начало из озера Дисна в Ковенской губернии; длина 180 верст.

Энциклопедический словарь Ф. Павленкова. С.-Петербург, 1913. С. 672.

Насельніцтва Дзісны ў XIX ст. Змяненні сацыяльнага і этнічнага складу жыхароў

У канцы XVIII — пачатку XIX ст. у горадзе, па падліках О. Гедэмана, жыло каля 2100 чалавек. Гэтая лічба атрымана з разліку, што ў кожным з 307 дамоў у 1790 г. было ў сярэднім па 7 жыхароў. Першая дакладная колькасць гараджан прыводзіцца пад 1828 г. у справаздачы мінскага губернатара — 2802 у 330 дамах. Праз дзесяць гадоў іх ужо 2807. Як бачна, рост за сорак гадоў нязначны, а за апошняе дзесяцігоддзе яго наогул няма. У 1838 г. ужо ўлічваецца сацыяльны склад насельніцтва:

	Мужчын	Жанчын
Мяшчан і пасадскіх	1011	1182
Служачых ваеннага ведамства	2	3
Служачых грамадзянскага ведамства	40	26
Адстаўных	20	12
Купцоў III гільдыі	19	39
Духавенства	9	14
Ніжніх воінскіх чыноў	195	64
Дваравых пры панскіх дварах	5	5
Іншых, акрамя замежных грамадзян, вучняў, цэхавых	85	64

Усё мужчынскае насельніцтва горада 1393, жаночае — 1414 чалавек. Колькасць жыхароў крыху павялічылася да 1840 г. і склала тады 2975 чалавек абодвух полаў (мужчын — 1566, жанчын — 1409). Пасадскіх і мяшчан паменшылася да 2068, купцоў абодвух полаў — да 26, духавенства і чыноўнікаў — не змянілася, павялічылася колькасць салдат. У наступныя 20 гадоў колькасць насельніцтва выросла амаль на 75%, і ў 1858 г. у горадзе жылі ўжо 5183 чалавекі.

Дзісна становіцца адным з буйнейшых гарадоў Віленскай губерні. У суседняй Вілейцы жыў толькі 3121 жыхар.

Па веравызнанні 1675 дзісенцаў былі праваслаўнымі, 904 — католікамі, 1949 — іудзеямі. Ужо з пачатку XIX ст. яўрэйскі элемент у горадзе пераважаў, бо Дзісна — гандлёвы цэнтр.

Некалькі паменшылася колькасць жыхароў к 1860 г. — да 4753. Потым становіцца больш мяшчан — 3728, хаця сітуацыя ў веравызнанні не памянялася. У наступным, 1861 г. насельніцтва павялічылася да 4802 чалавек, а абываценяў, прыпісаных да горада, налічвалася 4958. Розніца паміж лічбамі 156 чалавек, гэта мяшчане. Відаць, яны ўзялі пашпарты і пайшлі ў прамысловыя цэнтры Расіі на заробкі.

Сацыяльны склад гараджан у 1862 г. выглядаў наступным чынам:

	Мужчын	Жанчын
Патомнай шляхты	61	47
Шляхты асабістай	72	30
Духавенства	17	26
Купцоў	48	45
Мяшчан	1875	2065
Цэхавых	4	8
Часоваабавязаных сялян	3	5
Воінскіх чыноў на службе	160	—
—»— бестэрмінова адпускных	12	—
—»— у кароткатэрміновых водпусках	22	—
Адстаўных ніжніх чыноў	141	—
Салдацкіх дзяцей	6	—
Салдацкіх жонак і дзяцей	—	146
Замежных грамадзян	4	1
Асоб, вышэй не названых	18	8
Сярод 4958 прыпісаных было		
Мяшчан	1813	1796
Рабочых	664	685

З усяго насельніцтва маёмасцю ў Дзісне валодала ўсяго 478 чалавек: 10 купцоў, 280 мяшчан (прычым 200 з іх яўрэі), 79 рамеснікаў (з іх 75 яўрэі), 23 шляхціцы, 26 ніжніх воінскіх чыноў, яшчэ 60 іншагародніх купцоў-яўрэяў. У горадзе быў адзін купецкі капітал I гільдыі і 17 капіталаў III гільдыі.

У 60-я гады XIX ст., як і раней, шмат жыхароў з-за адсутнасці заробку ішлі ў гарады Прыбалтыкі або сплаўлялі тавары і драўніну ў Рыгу. Для гэтага бралі пашпарты (толькі ў 1861 г. 642).

У 1866 г. насельніцтва горада складала 6066 чалавек пры перавазе хрысціян над іудзеямі, а праваслаўных — над каталікамі.

	Мужчын	Жанчын
Праваслаўных	1066	1124
Аднаверцаў і раскольнікаў	28	6
Каталікаў	667	517
Пратэстантаў	10	5
Іудзеяў	1290	1345
Магаметан	3	4

Шляхты было 232 чалавекі, духавенства — 27, купцоў — 43, мяшчан — 5089, сялян — 36, ваенных, у тым ліку жонак і дзяцей салдат, жандараў, пажарных, — 562, плюс 5 замежных грамадзян і 3 «нідзе не азначаныя».

Асаблівасць Дзісны ў тым, што тут жыло шмат шляхты і яўрэяў, хаця быў толькі 1 равін, калі ў той жа Вілейцы пры нязначнай колькасці іудзеяў іх было 13.

У параўнанні з 1861 г. колькасць купцоў паменшылася амаль у тры разы — з 93 да 33. Дробныя купецкія капіталы выцясняліся буйнымі іншагароднімі. А прырост насельніцтва забяспечвалі мяшчане. Сялян тут заўсёды было мала. Усё гэта сведчыць аб добрай эканамічнай кан'юнктуры і развіцці гандлю па Дзвіне.

У гэты час Дзісна ўваходзіла ў лік 10 гарадоў з сярэдняй колькасцю жыхароў 6000. Яшчэ 20 гарадоў былі буйныя і столькі ж — малыя, з насельніцтвам менш 6000. І да канца стагоддзя Дзісна стабільна ўваходзіць у сярэднюю групу, хаця ў сярэдзіне 70-х гадоў колькасць жыхароў памяншаецца да 6150. Ужо ў 1877 г. у горадзе 6649 чалавек, з іх 196 шляхты, 22 — духавенства, 232 — ганаровых грамадзян і купцоў, 5318 — мяшчан і цэхавых, 30 — вяскоўцаў, 620 — ваенных, 16 — замежных грамадзян, 212 — разначынцаў. Зноў жа асаблівасць Дзісны — тут больш ганаровых грамадзян, ваенных, замежных грамадзян, разначынцаў, менш сялян.

Значныя змяненні адбываюцца ў веравызнанні гараджан: праваслаўных толькі 883, каталікаў — 2773, яўрэяў не памяншалася — 2962. Яшчэ было 6 раскольнікаў, столькі ж магаметан, 16 пратэстантаў.

Пачынаючы з 80-х гадоў колькасць насельніцтва горада на працягу 15 гадоў стабільная, штогадовы прырост ад нараджальнасці да 130 чалавек плюс міграцыя з вёскі. Вось лічбы:

	Шлюбы	Нарадзілася	Памерла	Прырост
1883 г.	44	188	128	60
1885 г.	?	195	82	113
1889 г.	?	204	148	56
1890 г.	63	264	148	116
1892 г.	48	241	187	54
1893 г.	43	294	181	113
1895 г.	47	286	155	131
1897 г.	53	256	134	122
1900 г.	49	270	136	134
1903 г.	?	188	200	−12
1908 г.	?	198	142	56

Як бачым, найвялікшы натуральны прырост быў у апошнім дзесяцігоддзі XIX ст., потым — рэзкі спад. Гэта адбілася і на колькасці гараджан:

1884 г. — 7000
1887 г. — 8026
1888 г. — 8026
1890 г. — 8026
1891 г. — 8162
1893 г. — 8988
1895 г. — 8216
1896 г. — 9113
1897 г. — 6756
1900 г. — па розных звестках 6891 ці 9489 чалавек

Тэмпы росту насельніцтва ў Дзісне сярод гарадоў губерні былі самымі вялі-

Дарэвалюцыйная паштоўка з выглядам Дзісны

кімі да 1900 г. У 1895 г. Дзісна — буйнейшы павятовы горад губерні. Але ў канцы 90-х гадоў трэць насельніцтва пайшла ў Прыбалтыку і Пецярбург на заробкі. Гэтая з'ява называлася адыходніцтвам. Толькі з Дзісенскага павета ў 1893—1896 гг. пайшло 15 836 чалавек, а за адзін 1896 г.— 7908. Гэта плата за адсутнасць прамысловасці ў павятовым цэнтры і лішак свабодных рабочых рук.

У 1893 г. з 8988 жыхароў было 1426 праваслаўных (15,9%), 3238 каталікаў (36%), 4307 яўрэяў (48%), яшчэ 7 пратэстантаў і 4 раскольнікі. Пасля масавага адыходу ў 1897 г. у горадзе засталося 6756 чалавек, прытым значна паменшылася толькі мяшчан, стала больш сялян — 786. Затое ў рэлігійным складзе адрозненні больш істотныя: праваслаўных 1205 — 17,8%, каталікаў 882—13%, яўрэяў 4617—68,5%, астатніх толькі 0,7%. Яўрэяў стрымлівала ад перасялення рыса аседласці. Адыходніцтва стала прывілеяй хрысціян, асабліва каталікаў. У горадзе амаль усе каталікі і праваслаўныя гаварылі на беларускай мове — 1567, на велікарускай — 396, маларускай — 2, польскай — 187, на іўрыце — 4590 (хаця яўрэяў было 4617), на нямецкай — 10, літоўскай — 3 і адзін на «іншай». Адсюль вынікае, што каталік — гэта не паляк.

У выніку крызісу 1904—1908 гг. яшчэ раз рэзка паменшылася колькасць жыхароў Дзісны (з 9113 у 1904 г. да 7307 у 1909 г., з 7303 жыхароў у 1910 г.— праваслаўных 29,4 %, каталікаў — 15,9, яўрэяў — 54,4 %). З наступным эканамічным уздымам насельніцтва горада склала 8,5 тыс. у 1913 г. і працягвала павялічвацца, але меншымі тэмпамі, чым у сярэднім па гарадах Беларусі. Гэта тлумачыцца тым, што Дзісна так і не стала прамысловым цэнтрам, хаця мела лішак свабодных рук. Міма яе прайшла чыгунка. У заняпадзе горада вялікая віна купцоў: яны не ўкладвалі сродкі ў вытворчасць, якая патрабавала вялікіх капіталаўкладанняў з аддачай не адразу, як у гандлі, а праз пэўны час.

С. Ф. Шымуковіч

МАТЭРЫЯЛЫ ПЕРШАГА ЎСЕАГУЛЬНАГА ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ НА ПАДСТАВЕ НАЙВЫШЭЙ ЗАЦВЕРДЖАНАГА ПАЛАЖЭННЯ АД 5.6.1895 ГОДА

Ведомость для подсчета населения по счетному сельскому участку. Губерния Виленская. Уезд Дисненский. Переписной участок № 6. Счетный участок № 15. Стан 3. Волость Миорская

Подпись составлявшего ведомость счетчик Кирилл Покладок

№ п/п	Название села, деревни и т. п.	Всего наличного населения		Постоянно живущего здесь населения		В числе наличного населения было лиц некрестьянских сословий		Приписанного здесь крестьянского населения	
		м.	ж.	м.	ж.	м.	ж.	м.	ж.
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
1.	Деревня Игнатики	47	52	47	52	1	1	53	59
2.	Деревня Подлипки	21	28	22	30	—	—	28	31
3.	Деревня Нивки	13	17	13	17	—	—	13	17
4.	Деревня Апонасенки	15	20	17	20	—	1	19	22
5.	Деревня Яново	62	63	57	62	8	1	66	64
6.	Деревня Говцы	12	12	12	13	1	5	10	6
7.	Деревня Гентово	34	30	26	30	2	1	37	34
8.	Деревня Секерка	18	19	17	19	—	—	17	18
9.	Деревня Граница	8	12	8	13	—	—	12	16
10.	Деревня Томки	34	50	37	50	1	1	68	58
11.	Деревня Раковые	24	15	24	15	—	—	23	16
12.	Деревня Заречные	13	18	13	18	—	—	21	30
13.	Застенок Остров	5	3	5	3	—	—	6	2
	Итого	306	339	298	342	13	10	373	373
	Из обложки формы II	110	86	104	88	22	14	—	—
	Всего	416	425	402	430	35	24	373	373

Губерния Виленская. Уезд Дисненский. Переписной участок № 6. Счетный участок № 15. Стан 3. Волость Миорская

Число жилых строений	Число хозяйств			Наличного населения					Сверх того постоянно живущего в данной местности населения, не оказавшегося налицо в день переписи			В числе наличного населения было:		
				всего			в том числе							
							постоянно живущего	временно пребывающего				крестьян		иностранных подданных
	крестьянских (фор. А)	частных (фор. Б или фор. В)	учреждений	м.	ж.	об. п.	м. ж.	м. ж.	м.	ж.	об.п.	об. п.	м. п.	об. п.
Деревня Игнатики														
17	0+17	—	—	46	51	97	46	51	—	—	—	—	—	97	46
1	—	0+1	—	1	1	2	1	1	—	—	—	—	—	—	—
18	0+17	0+1	—	47	52	99	47	52	—	—	—	—	—	97	46
Деревня Подлипки														
12	0+11	—	—	21	28	49	21	28	—	—	1	2	3	49	21

Деревня Нивки

7	0+5	–	–	13	17	30	13	17	–	–	–	–	–	30	13

Деревня Апонасенки

6	0+1	–	–	15	19	34	15	19	–	–	–	–	–	34	15
1	–	0+1	–	–	1	1	–	1			2	–	2	–	–
7	0+6	0+1	–	15	20	35	15	20	–	–	2	–	2	34	15

Деревня Яново

18	0+18	–	–	54	62	116	54	62	–	–	3	–	3	115	53
1	–	0+1	–	8	1	9	–	–	8	1	–	–	–	1	1
19	0+18	0+1	–	62	63	125	54	62	8	1	3	–	3	116	54

Деревня Говцы

5	0+3	–	–	10	6	16	10	6	–	–	–	–	–	16	10
2	–	0+2	–	2	6	8	2	6	–	–	–	1	1	2	1
7	0+3	0+2	–	12	12	24	12	12	–	–	–	1	1	18	11

Деревня Гентово

9	0+9	–	–	34	30	64	26	30	8	–	–	–	–	61	32
1	–	0+1	–	2	1	3	2	1	–	–	–	–	–	–	–
10	0+9	0+1	–	34	30	64	26	30	8	–	–	–	–	61	32

Деревня Секерка

7	0+9	–	–	18	19	37	17	19	1	–	–	–	–	37	18

Деревня Граница

4	0+4	–	–	8	12	20	8	12	–	–	–	1	1	20	8

Деревня Томки

16	0+14	–	–	34	44	78	34	44	–	–	3	–	3	76	33
1	–	0+1	–	1	6	7	1	6	–	–	–	–	–	7	1
17	0+14	0+1	–	35	50	85	35	50	–	–	3	–	3	83	34

Деревня Раковые

6	0+5	–	–	24	15	39	24	15	–	–	–	–	–	39	24

Деревня Заречные

7	0+6	–	–	13	18	31	13	18	–	–	–	–	–	31	13

Застенок Остров

1	0+1	–	–	5	3	8	5	3	–	–	–	–	–	8	5
122	0+108	0+7	307	339	646	290	290	338	17	1	9	4	13	623	294

Число жилых строений	Число хозяйств			Наличного населения					Сверх того постоянно живущего в данной местности населения, не оказавшегося налицо в день переписи			В числе наличного населения было:		
				всего			в том числе							
							постоянно живущего	временно пребывающего				крестьян		иностранных подданных
	крестьянских (фор. А)	частных (фор. Б или фор. В)	учреждений	м.	ж.	об. п.	м. ж.	м. ж.	м.	ж.	об.п.	об. п.	м. п.	об. п.
24	—	0+24		110	86	196	102	85	8	1	2	3	5	160	88	
146	0+108	0+31		417	425	842	392	423	25	2	11	7	18	783	382	
				11	7	18										
				428	432	860										

Обложка формы II

Губерния Виленская. Уезд Дисненский. Переписной участок № 6. Счетный участок № 14. Стан 3. Волость Миорская

Деревня Русачки I

12	0+12	—	—	33	33	66	33	33	—	—	1	1	2	63	12	
2	—	0+2	—	5	6	11	5	6	—	—	—	—	—	6	2	
14	0+12	0+2	—	38	39	77	38	39	—	—	1	1	2	69	14	

Деревня Русачки 2

5	0+5	—	—	17	14	31	17	14	—	—	—	—	—	31	17	
1	—	0+1	—	1	2	3	1	2	—	—	—	—	—	3	1	
6	0+5	0+1	—	18	16	34	18	16	—	—	—	—	—	34	18	

Деревня Денисово

10	0+11	—	—	35	34	69	35	34	—	—	—	—	—	69	35	

Деревня Блажки

15	0+15	—	—	33	49	82	33	49	—	—	3	—	3	82	33	
4	—	0+4	—	14	18	32	14	18	—	—	3	—	3	23	12	
19	0+15	0+4	—	47	67	114	47	67	—	—	6	—	6	105	45	

Деревня Наталино

14	0+13	—	—	27	31	58	27	31	—	—	1	—	1	58	27	
2	—	0+2	—	5	5	10	5	5	—	—	1	—	1	5	2	
16	0+13	0+2	—	32	36	68	32	36	—	—	2	—	2	63	29	

Деревня Печенки

22	0+22	—	—	57	69	126	57	69	—	—	1	1	2	126	57	
1	—	0+1	—	3	1	4	3	1	—	—	—	—	—	—	—	
23	0+22	0+1	—	60	70	130	60	70	—	—	1	1	2	126	57	

Деревня Гизуны

6	0+6	–	–	13	23	36	13	23	–	–	–	–	–	36	13

Застенок Зеленка

2	0+2	–	–	6	5	11	6	5	–	–	–	–	–	10	5

Деревня Жуки

10	0+10	–	–	29	24	53	29	24	–	–	–	–	–	53	29

Деревня Мартиновцы

10	0+10	–	–	37	35	72	37	35	–	–	–	–	–	72	37

Застенок Теключино

2	0+2	–	–	–	7	13	6	7	–	–	–	–	–	13	6

Подсчет населения на владельческих, казенных, церковных и иных землях по всему счетному участку

Подпись составляющего обложку — Иван Ольшевский

№ переписных листов	Название усадьбы, хутора, поселка и т. д., имя, отчество и фамилия владельца	Всего наличного населения		Постоянно живущего здесь населения		В числе наличного населения было лиц некрестьянских сословий	
		м.	ж.	м.	ж.	м.	ж.
1.	Усадьба Дехтярово	8	6	7	6	—	—
2.	Имение Новый Двор	4	4	4	4	4	4
3.	—»— Новый Двор	4	7	4	7	—	—
4.	Усадьба Чурилово	2	1	2	2	—	—
5.	—»— Стретово	5	2	5	2	—	—
6.	Застенок Стретово	4	5	5	5	—	—
7.	Фольварок Стретово	8	8	8	8	3	4
8.	Околица Пацово	4	5	5	5	—	—
9.	—»— Пацово	4	6	4	6	—	—
10.	—»— Пацово	6	4	6	4	—	—
11.	—»— Пацово	4	6	4	6	—	—
12.	—»— Зуброво	3	5	4	5	—	—
13.	—»— Зуброво	2	5	2	5	2	4
14.	—»— Зуброво	4	1	4	1	—	—
15.	—»— Зуброво	2	3	2	3	—	—
16.	Имение Плянтопов	15	20	15	21	8	10
17.	Имение Соловьи	13	7	14	8	—	—
18.	Фольварок Соловьи	3	4	3	4	2	—
19.	Застенок Лепещино	8	7	8	7	—	—
20.	Фольварок Каменка	6	9	6	9	2	—
21.	Имение Щелно	14	12	14	12	5	—
22.	Усадьба Щелно	5	2	5	2	—	—
23.	Винокуренный завод Щелно	10	9	11	9	6	7
24.	Корчма Щелно	5	2	4	2	—	—
25.	Усадьба Русское Село	4	1	5	1	—	—
26.	Околица Русское Село	3	5	4	5	4	5
27.	Околица Русское Село	4	4	4	4	—	—
28.	Фольварок Вжесянка	8	7	8	7	—	—

№ перепісных лістоў	Назва сядзібы, хутара, пасёлка і т. д., імя, імя па бацьку і прозвішча ўладальніка	Усяго наяўнага насельніцтва		Пастаянна жывучага тут насельніцтва		У ліку наяўнага насельніцтва было асоб некрэсцьянскіх саслоўяў	
		м.	ж.	м.	ж.	м.	ж.
29.	Застенок Шнурки	4	3	4	3	—	—
30.	Застенок Горные	5	9	5	9	3	3
31.	Фольварок Робово	6	5	6	5	—	—
32.	Застенок Фольварок	13	3	13	3	6	—
33.	Фольварок Логовые	10	9	10	9	—	—
34.	Фольварок Цупово	3	2	4	3	—	—
35.	Застенок Болда	3	2	3	2	—	—
36.	Фольварок Микели	5	3	5	3	—	—
37.	Застенок Копцы	3	4	3	4	—	—
38.	—»— Райполь	3	2	3	2	3	—
39.	—»— Корчи	5	2	5	2	—	—
40.	Фольварок Борсучино	5	3	5	3	—	—
41.	Застенок Буевка	1	1	1	1	1	—
42.	Усадьба Латышонки	5	1	5	1	3	—
43.	Имение Загорье	15	20	15	20	5	—
44.	Усадьба Загорье	6	6	6	6	—	—
45.	—»— Загорье	4	2	6	3	4	—
46.	—»— Загорье	2	4	3	5	2	—
47.	—»— Загорье	8	5	8	5	—	—
48.	Усадьба Загорье	3	1	3	1	3	1
49.	—»— Загорье	1	1	1	1	—	—
50.	—»— Загорье	2	2	2	2	2	2
51.	—»— Загорье	4	4	4	4	4	4
52.	—»— Загорье	6	6	6	6	—	—
	Итого	284	257	293	263	72	76

Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 1290. Воп. 11. Спр. 174. Л. 21, 22, 37, 38, 39.

Першыя рэвалюцыйныя выступленні на Дзісеншчыне

Узмацненне сацыяльнай няроўнасці прымушала сялян шукаць лепшага лёсу. Жыхар в. Латышы Іосіф Шук уцёк ад голаду ў Сібір, Ігнат Рынкевіч з Міёраў — у Пецярбург на Пуцілаўскі завод, А. Баговіч быў плытагонам на Заходняй Дзвіне, І. Томка — бурлаком на Волзе. Некаторыя шукалі шчасце нават у далёкай Амерыцы. Пажаўцелыя ад часу дакументы сведчаць аб шматлікіх спробах сялян «адсудзіць» у памешчыкаў землі, якія належаць ім па праву. На працягу ледзь не 50 гадоў безвынікова дабіваліся гэтага, напрыклад, жыхары в. Жукі С. Лаўрыновіч і М. Жук.

Губляючы надзею на лепшае жыццё і сацыяльную справядлівасць, сялянскія і іншыя слаі насельніцтва ўзнімаліся на барацьбу з царызмам. Вялікі ўплыў на яе пачынаюць аказваць першыя рабочыя гурткі сацыял-дэмакратычнага напрамку, якія ўзніклі ў Дзісне ў 1900—1901 гг. Дзякуючы іх дзейнасці гэтая барацьба паступова набывае палітычную афарбоўку і антыцарскую накіраванасць.

І сюды даляцела рэха «крывавай нядзелі», аб якой расказваў відавочца падзей У. Арол з Дворнага Сяла, рэвалюцыйных падзей у розных гарадах імперыі. У Дзісне адбыліся першыя рэвалюцыйныя выступленні. Першага мая 1905 г. тут пад антыўрадавымі лозунга-

мі прайшла дэманстрацыя. Яе арганізатары Пугаўка, Грэйнеман, Харэвіч, Кандакевіч і іншыя былі арыштаваны і жорстка збіты.

Шырока распаўсюджваліся сацыял-дэмакратычныя адозвы і лістоўкі. Яны траплялі нават у такія глухія населеныя пункты, як Снегі і Вісяты. Прыстаў з Дзісны, даведаўшыся аб гэтым, абяцаў «прыняць меры для затрымання вінаватых». Рэвалюцыйная агітацыя мела поспех. Сяляне Перабродскай воласці пачалі высякаць лясы памешчыка Клодта. Жыхары в. Даўгінава захапілі сенакосы пана Выганоўскага.

На валасным сходзе ў Міёрах сяляне адмовіліся плаціць падаткі на ўтрыманне валаснога суда і абвінавачвалі валасное праўленне ў прысваенні сабраных імі сродкаў. Узбуджаны натоўп хацеў утапіць у возеры валаснога старшыню Пашкевіча. Але на дапамогу яму прыйшоў ксёндз Бародзіч, пазней узнагароджаны за гэта і іншыя заслугі ордэнам Святога Станіслава.

Яркім прыкладам росту палітычнай свядомасці сялян стала выступленне ў в. Завуцце. Арганізатарам яго сталі Уладзімір (Іосіф) Альхімовіч з Наравых і Аляксандр Ціманоўскі з Марозаў, якія вярнуліся з Пецярбурга. Сяляне, што сабраліся 9 студзеня 1905 г. у валасным праўленні, прымусілі пісара Бельскага запісаць грамадскае рашэнне спусціць ваду ля млына памешчыка Каржанеўскага, вадасховішча ля якога затапіла сялянскія сенакосы, а сам млын спаліць. І гэта было зроблена.

Намер натоўпу разграміць вінную лаўку быў спынены паліцыяй пры падтрымцы лясной аховы.

«Зачыншчыкаў бунту» асудзілі да катаржных работ. Але калі праз тры гады памешчык аднавіў млын, ён зноў быў спалены. Аднак на гэты раз вінаватых не знайшлі.

У канцы 1905 — пачатку 1906 г. Дзісенскі павет займаў адно з першых месц у Беларусі па колькасці рэвалюцыйных выступленняў. Таму 30 снежня 1905 г. віленскі генерал-губернатар паведамляў, што «першую роту Гразавецкага палка выводзіць з Дзісны нельга па прычыне працягваючыхся спроб да беспарадку».

Ва ўмовах актывізацыі грамадскага жыцця праваслаўная і каталіцкая цэрквы імкнуцца не толькі захаваць свае пазіцыі, але і ўмацаваць іх. Як і пасля рэвалюцыйных падзей 60-х гадоў XIX ст., пачынаецца актыўнае будаўніцтва культурных устаноў. Яны ўзводзяцца ў Міёрах, Перабродзі і іншых населеных пунктах.

Нават у гады рэакцыі царызм не змог выкараніць адмоўныя адносіны да свайго рэжыму. У 1908 г. унтэр-афіцэр Гугновіч дакладвае начальству, што ў Віленскім, Дзісенскім і Свянцянскім паветах «адносна Дзяржаўнай думы сяляне... гавораць, што, як відаць, Дума сялянам нічога добрага не выдумае». У гэты ж час актывізуе сваю дзейнасць Віленская група РСДРП, уплыў якой распаўсюджваецца і на Дзісенскі павет. Яна нават зрабіла спробу выдаць цэнтральны орган партыі — газету «Сацыял-дэмакрат».

Невялікая сацыял-дэмакратычная арганізацыя з 5—7 чалавек існавала таксама ў Дзісне. Яе члены збіраліся на сходы, праводзілі агітацыю сярод рабочых і рамеснікаў. Вядома, што ў пачатку лістапада 1909 г. сацыял-дэмакраты і бундаўцы абмяркоўвалі пытанне аб аб'яднанні. Аднак кампраміснае рашэнне не было знойдзена. Сацыял-дэмакраты патрабавалі, каб іх прадстаўнік абавязкова ўваходзіў у кіруючае ядро, а астатнія члены групы мелі б права ўдзельнічаць у сходах рабочых усіх нацыянальнасцей. Бундаўцы, наадварот, прапаноўвалі паасобнае правядзенне сходаў. У кіруючае ядро, па іх меркаванню, маглі ўваходзіць толькі асобы, якія асабліва вызначыліся.

У 1912 г. у Дзісне зноў з'яўляецца партыйная арганізацыя, якая дзейнічае яшчэ больш актыўна і мэтанакіравана.

Узмацненню ўплыву сацыял-дэмакра-

таў садзейнічаў рост эксплуатацыі працоўных. Так, на двух прадпрыемствах Дзісны ў пачатку стагоддзя восем рабочых выпускалі прадукцыі на 2000 руб. А ўжо да 1908 г. вытворчасць павялічваецца да 27 187 руб. Колькасць рабочых падвойваецца, а выпуск прадукцыі ўзрастае ў 14 разоў. Невыпадкова, відаць, улады Дзісны скардзіліся, што «з забойствам Сталыпіна ўзнімаецца дух у асоб супрацьурадавага настрою» і нарастае рух «да ўзнаўлення дзеянняў накшталт 1905 г.»

Сапраўды, сталыпінскія рэформы ў вёсцы расчысцілі шлях капіталізму. Асноўным элементам іх з'яўляецца хутарызацыя. На Дзісеншчыне сяляне рэзка павялічваюць пасевы лубіну на зялёнае ўгнаенне і канюшыны на корм жывёле за кошт скарачэння плошчаў пад ячменем і іншымі зерневымі. З гэтага хутаране пачалі барацьбу за павышэнне ўрадлівасці глебы і інтэнсіфікацыю жывёлагадоўлі.

Што датычыцца Дзісны, то яна заставалася значным гандлёвым цэнтрам са штотыднёвым рынкам. Да 1904 г. у ёй ужо 841 будынак і 9113 жыхароў, ёсць бальніца, аптэка, працуюць 3 урачы (адзін на 3038 чалавек), 2 акушэркі, 7 фельчараў. У чатырох пачатковых школах займаецца 700 дзяцей. Дзейнічае бібліятэка.

Значна пагаршаецца становішча народа пасля пачатку вайны. Рэзка павялічыліся падаткі і цэны, узмацняецца міграцыя насельніцтва, выкліканая набліжэннем фронту. І Дзісна неўзабаве становіцца прыфрантавым горадам, у ёй стаяць часці 3-й арміі, пасля акупацыі немцамі Вільні сюды эвакуіруюцца губернскія ўстановы. 29 жніўня 1914 г. забаронены продаж гарэлкі, што падрывала памешчыцкую жывёлагадоўлю, заснаваную на адыходах ад вінакурэння. Народу ўсё менш даступнымі становяцца асвета і медыцынскае абслугоўванне.

Усялякі рэвалюцыйны рух у гэты час караецца па строгіх законах ваеннага часу, але выкараніць яго ўжо немагчыма. У 1914 г. сяляне пачалі паліць і рабаваць панскія маёнткі. Гэта было рэакцыя народа на шматлікія працоўныя павіннасці, неаднаразовыя рэквізіцыі коней і іншай жывёлы, голад, недахоп рабочых рук, падмацаваная рэвалюцыйнай прапагандай мясцовых рэвалюцыянераў і прыезджых агітатараў.

Л. А. Матэленак

Тэатральная трупа Ігната Буйніцкага

Рэвалюцыя 1905 г. абудзіла цікавасць беларусаў да нацыянальнай культуры і мастацтва. Паўсюдна пачалі праводзіцца вечары, якія атрымалі назву «вечарынкі», адным з арганізатараў якіх стаў Ігнат Цярэнцьевіч Буйніцкі, уладальнік фальварка Палевачы на Дзісеншчыне.

І. Ц. Буйніцкі ў 1907 г. арганізаваў аматарскую тэатральную трупу, якая ў 1910 г. стала першым беларускім прафесійным калектывам. Першую працяглую гастрольную вандроўку па Беларусі трупа пачала з Дзісны. Напярэдадні газета «Наша ніва» паведаміла, што прадстаўленне «адбудзецца пад загадам і стараннем вядомага арганізатара беларускага тэатра дзядзькі Ігната Буйніцкага». У праграму выступлення ўваходзілі камедыя «Модны шляхцюк», вершы А. Паўловіча і Я. Купалы, народныя песні. На заканчэнне — беларускія танцы пад дуду і цымбалы.

Гэтае выступленне потым «Наша ніва» назаве «вялікім нацыянальным святам»: «Дзісна не помніць такога збору народу. Інтэлігенцыя і просты народ — усе шчыра віталі беларусаў, магутная ідэя нацыянальнага адраджэння гарачымі праменнямі сваімі ўсіх абагрэла, усіх з'яднала, разварушыла застыўшыя сэрцы, заіскрыла выцвілыя ад спёкі вочы, і першае роднае слова са сцэны вітана было не адной слязой з перапоўненых грудзей і нязмоўчным гукам галасоў. Гэта народ пяяў хвалебную пес-

ню барацьбітам за родную Матку-Беларусь. Калі пачаліся беларускія танцы на сцэне, уся зала стагнала глуха ад пахвальных крыкаў, а на галовы танцораў сыпаліся кветкі і ўсцілалі ім дарогу».

Цёплыя адносіны да выступленняў беларускіх артыстаў былі паўсюдна: у Свянцянах і Паставах, Полацку і Мінску, Вільні і Пецярбургу, Варшаве і іншых гарадах. Адно з выступленняў так усхвалявала Янку Купалу, што ён вырашыў стварыць арыгінальную п'есу, сугучную сучаснасці. Так у 1912 г. нарадзілася ўсім вядомая і ўсімі любімая «Паўлінка».

У рэпертуар тэатра І. Буйніцкага ўваходзілі пастаноўкі п'ес «Пашыліся ў дурні» і «Па рэвізіі» М. Крапіўніцкага, «У зімовы вечар» паводле Э. Ажэшкі, «Модны шляхцюк» К. Каганца, «Світанне» і «Мядзведзь» А. Чэхава. «Скокі» ўключалі танцы «Лявоніха», «Чабор», «Мяцеліца», «Юрка», «Верабей» і інш. Дэкламаваліся вершы Я. Купалы, М. Багдановіча, Я. Коласа, Цёткі, А. Паўловіча, Я. Лучыны. Амаль увесь песенны рэпертуар складаўся з народных песень.

Рэалістычная накіраванасць тэатра І. Буйніцкага грунтавалася на народных традыцыях. Паказваючы народны быт і характары, ён дасягаў жыццёвай праўды, імкнуўся да выразнасці, прастаты і даходлівасці спектакляў. У простым дэкарацыйным афармленні выкарыстоўваліся элементы беларускай народнай творчасці. Шмат увагі надавалася касцюмам акцёраў, асабліва харыстаў і танцораў.

Уціск царскага ўрада і матэрыяльныя цяжкасці вымусілі І. Буйніцкага ў 1913 г. закрыць тэатр. Праз год ён рабіў намаганні стварыць новы калектыў, але першая сусветная вайна перашкодзіла ажыццяўленню гэтых планаў.

Друкуецца па кн.: Няфёд У. І. Ігнат Буйніцкі — бацька беларускага тэатра. Мн., 1991.

З архіўных і друкаваных крыніц

ДАНЯСЕННЕ ВІЛЕНСКАГА ГУБЕРНАТАРА ГЕНЕРАЛ-ГУБЕРНАТАРУ АБ РАЗГРОМЕ СЯЛЯНАМІ МЛЫНА В. ЗАВУЦЦЕ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА

9 снежня 1905 г.

9 сяго снежня сяляне Пуцяцінскага сельскага таварыства Язненскай воласці, Дзісенскага п., сабраўшыся ў мясцовае валасное праўленне, прымусілі пісара Бельскага запісаць на асобным лісце паперы грамадскі прыгавор, пасля імі самімі знішчаны, у тым сэнсе, што грамадства пастанаўляе спусціць ваду ў млыне «Завуццё» памешчыка Каржанеўскага і спаліць яго з мэтай адпомсціць Каржанеўскаму за тое, што ён, не даўшы адказ на патрабаванне сялян аб водпуску ім дроў для ацяплення, паехаў за мяжу. Вечарам таго ж дня сяляне гэтыя прыбылі натоўпам у в. Завуцце, адчынілі шлюзы, прымусілі млынара вынесці частку мукі і маёмасць і падпалілі абодва знаходзячыяся ў гэтым сяленні вадзяныя млыны. Пажарам, знішчыўшым млыны дашчэнту, нанесены страты ўладальніку на 25 000 рублёў і арандатару на 500 рублёў. За сім той жа натоўп імкнуўся разграміць знаходзячуюся паблізу казённую вінную лаўку, але падаспеўшым чынам паліцыі пры дапамозе лясных вартаўнікоў і іншых асоб, прыбыўшых на пажар, удалося ўгаварыць натоўп разысціся...

З Дзяржаўнага гістарычнага архіва Літвы.

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ — 1917

ПА СТАРОНКАХ ГАЗЕТЫ «НАША НІВА» ЗА 1906—1908 гг.

№ 6 за 1906 г.

З Дзісны. Нядзель таму две, а можэ и тры были у нас прызывы. Народу пасходзілася з усіх старон багата.

Перэд кватэрай воинскаго присуцтва сабраўся народ, и неведама скуль, пашли па руках листки «да прызыўных» с подписом «Беларускае Социалистычнае Грамады». Такіе ж лісты были параскиданы перэд касцёлам, дзе прысягалі некруты.

Больш ничога не чуваць у нашай старане.

Толькі начальства ездзіць па вёсках і радзіць сядзець ціха і — глаўнае — не чытаць газэт: тады, кажуць яны, усё будзе добра.

Ці толькі праўду яны гавораць — ня ведаю.

Тройца

№ 5 за 1907 г.

У Дзісенскім пав. Выбралі тутака 5 выбаршчыкаў. Усе будуць моцна стаяць за мужыкоў, а правіцельства дык надта ня любяць. С памешчыкамі злучацца ня будуць.

ВЫБАРЫ АД ТАК ЗВАНАГО «РУССКАГО НАСЕЛЕНИЯ» ВИЛЕНСКАЙ ГУБЭРНІ

№ 29 за 1907 г.

20 сенцябра упаўнамочэныe ад валасцей зъедуцца у вуезды, каб там, сабраўшыся разам з дробнымі і вялікімі землевладзельцами у адну камисию,— выбраць кольки чалавек у губэрнию. Гэтые ж людзи, зъехаўшыся ў Вильню, выберуць 2 дэпутаты ў Думу. Гэтые дэпутаты маюць дабивацца у Трэцей Думе новых парадкоў.

Новы закон аб выбарах так пастаўляе, што у вуездзе мужыки и руские памешчыки разам выбираюць з памеж сябе выбаршчыкоў у губэрню. Выгада для мужыкоў тая, што их у вуездах збярэцца больш, як паноў. Напрыклад, у Вилейцэ збярэцца 55 мужыкоў и 14 памешчыкаў, яны ўсе разам павинны выбраць 9 выбаршчыкоў. Мужыкоў больш, значыцца, кали мужыки згаворацца добра, зъехаўшыся за 2 дни у вуезд, назначаць сабе 9 кандыдатоў мужыкоў и дружна пададуць за их галасы, то гэтые пададуць у губэрнию. У Дзисне мужыкоў будзе 45, а памешчыкаў 18. У Ашмяне мужыкоў — 33, а памешчыкоў — 20. У Лідзе мужыкоў — 31, а землеўладзельцоў — 26.

Мы бачым, што выбары ад «рускага населения» у руках мужыкоў, кали мужыки будуць трымацца разам и будуць выбираць толькі сваих. Цьвёрда павинны трымацца мужыки, каб не прапусьціць у губэрню яких дабрадзеёў, што цяпер думаюць па мужыцким плечам пралезци ў Думу. Гэтые дабрадзеи маюць надзею, што беларус цёмен, што яго можна лёгка угаварыць, бо ён несвядомы, газэт мала чытае и ня ведае, хто найлепшы для яго прыяцель. Ды яшчэ беларус баицца ўсякага блискучаго гузика, ды усякаго пана. Трэба трымацца толькі мужыцкай грамады, тады можа у Трэцюю Думу выбяруцца ад Виленскай губ. праўдзивые дэпутаты, што дабьюцца новых парадкоў, якие патрэбны мужыку.

№ 30 за 1907 г.

г. Дзісна Вил. губ. 20 зъехалися з валасцэй упаўнамочэныя ад «рускаго населения». Выбрали 4 папоў, аднаго стараверскага папа и 3 мужыкоў беларусоў, адзин з их быўшы валасны писар, Крамич, чаловек образованы, быў губэрнским выбаршчыкам у Другую Думу, надта чесны и цягне за народ.

№ 10 за 1908 г.

г. Дзісна Вил. губ. У нашым маленьким вуездным горадзи завяли ткацкую школу-варстат, гдзе дарма вучаць вёсковых дзяўчын ткаць дываны, палатно и другие рэчы на новых кроснах — самолётах. Министэрства сельскай гаспадарки дало адзин станок для дываноў и два для палатна, дзисненская каталицкая дабрачынная суполка — 2 станки,

п. Пацэвич — 1 станок, п. Пашкевич — 1 ст. и пани Снарская — цэлых 5 станкоў, бо министэрства трэбавала, каб было 12 кросен-самолётоў. Министэрства прыслала вучыцельку А. Д. Пахолкову, каторая добра вучыць ткаць на розные дэсэни, а так сама вучыць плясьци карунки; казна ёй пэнсию плациць, а тут толькі даюць ёй кватэру. Трэба цешыцца, што у нас людзи не спяць. Была бы толькі цьвёрдая воля и звычай дабиваццa ня гледзячы ни на што сваей мэты, а заўсягды знойдуцца людзи, што потым прыстануць да суполки и памогуць. Найчасьцей кожны кажэ, што ничога ня ведае и ня хочэ ведаць, — «мая хата з краю!»

Прад адкрыццем школы прыезджаў «инструктор», каторы навучаў дарма ўсих, хто хочэ, як развадзиць и вырабляць добры лён.

У нас каля Дзисны цяпер парабилися малочные суполки, бьюць цэнтрафугами масла и пасылаюць проста ў Лондан (па 17—18 руб. за пуд). Адзин паставиў нават паравую цэнтрафугу и выбивае па некольки пудоў масла ў дзень. Мужыки прадаюць свае малако для гэтых фабрык па 10—12 к. гарнец.

Новы

№ 13 за 1908 г.

М. Новы-Погост Вилен. г. Дзиснен. пав. Прабавили тут некаторыя людзи залажыць библиотэку для мужыкоў, але нихто и слухаць ня хочэ, ня тольки пальцам крануць. Людзи у нас цёмные, мусиць, як нигдзе, и ўсяго баяцца, нават без патрэбы. Пяты ўжо год нима ураджаю, але манаполька поўная заўсягды людзей, таргуець у год на 17 тыс. руб. На што добрае людзей не назавешся, а ў «саюз рускаго народа» записываюцца. Цемната вяликая! Спраўник и праваслаўны поп, сабраўшы людзей ў цэркви, казали, што кали запишуцца ў «саюз», то ўсяго им будзе. Але для тых, што записалися, доси аднэй гарэлки. «Саюз русскаго народу» ня хочэ, каб была Дума, и зямли мужыкам саўсим не збираецца даваць. Але мужыки гэтаго ня знаюць, а слухаюць глупства, каторыми им дураць голову. Разумные и цьвёрдые мужыки не записываюцца нигдзе ў «саюз рускаго народу».

Піотра Просты

№ 20 за 1908 г.

З Віленскай губ. агулам возьмуць 6 тыс. 245 рэкр. А па паветах гэтая личба так дзелицца: з Виленскаго пав. — 1240 чал., з Вилейскаго — 823, Дзисненскаго — 852, Лидзскаго — 836, Ошмянскаго — 893, Свенцянскаго — 736, Троцкаго — 865.

№ 23 за 1908 г.

З Дзісненскага павету Вил. губ. Жменька людзей у нас пачала ўжо рупицца аб палепшеньню жыцця свайго, закладаючы таварыства сельскай гаспадарки, арганизуючы выстаўки и т. д. Апроч таго ў некаторых большых мястэчках (у Дзисне, Глубоким) ёсьць ужо пазакладаные хаўрусные крамы. Больш усяго людзи пачали ў нас рупицца аб малочнай гаспадарцэ, закладаючы як супольные, так и прыватные млечарни. Першую вяликую млечарню аткрыли ў 1905 году («Пэрфэкт»), каторая цяпер у год перарабляе з малака да 3 тысяч пудоў масла. Цяпер, ня личачы малых прыватных млечарень, што перарабляюць тольки свае малако, ёсьць ешчэ 18 вяликих заводаў (у гэтай личбе 5 хаўрусных), каторые пасылаюць свае масло у Англию. Летась паслали на 175 тысяч рублёў. Гэтые млечарни плацяць праз 6 летних месяцаў па 9 к. за гарнец (50 к. за пуд малака), праз 3 зимовые па 12 кап. (70 к. за пуд) и праз 3 васеньние на $10\,^1/_2$ к. (60 к. за пуд) малака. Кепска, што у нас не умеюць даглядаць кароў. Вельми добрай каровай у нас ужо личыцца тая, што дае 500 гарцоў у год, а гэтаких па вёсках можна паличыць на пальцах. У Дании з нашых кароў тольки бы сьмеялись. Тамака кепскай каровай личыцца ўжо тая, што даець 1000 гарцоў у год. Але добра будзе, кали каровы дадуць нам и па 1000 гарцоў, а личучы на 10 к. за гарнец, значыць па 100 рублёў; 50 рубл. трэба адкинуць на корм, то астанацца ешчэ, апроч гною, 50 рубл. Але пэўне мы гэтаго скора не дачэкаемся, бо палепшыць сваю млечную гаспадарку можна тольки тады, як ёсьць грошы або танны крэдыт. А у нас, вядома, з грашыма цяжка и крэдыту нима.

Янка Алексеенок

Падзеі, лічбы, факты

14—15 тыс. гадоў назад на тэрыторыі сучаснага раёна з'явіліся першыя пасяленні людзей.

11—7 тыс. гадоў назад	Эпоха мезаліту — сярэднекаменны век. Прыручаны сабака, вынайдзены лук і стрэлы, пашырана выкарыстанне прылад працы з крэменю і косці.
Канец 5-га — пачатак 2-га тысячагоддзя да н. э.	Новакаменная эпоха — неаліт. Пераход ад рыбалоўства, паляванне і збіральніцтва да земляробства і жывёлагадоўлі. З'яўляецца керамічны посуд. У Пазер'і распаўсюджана нарвенская культура і культура тыповай грабеньчата-ямкавай культуры. Рэшткі іх выяўлены ў паселішчах ля вёсак Пераброддзе, Снегі, Лінкаўшчына, Крукі, Стары Пагост, г. Міёры.
Мяжа 3-га і 2-га тысячагоддзяў — VIII—VI ст. да н. э.	Бронзавы век, пачатак выплаўкі металаў і вырабу з іх прылад працы, зброі і ўпрыгожанняў. Зараджэнне патрыярхальнага роду.
XV—XII стст. да н. э.	На тэрыторыі раёна жылі плямёны прыбалтыйскай культуры.
VIII ст. да н. э.— VIII ст. н. э.	Жалезны век. У нашых мясцінах жылі плямёны днепра-дзвінскай археалагічнай культуры. Існавалі гарадзішчы Паддубнікі, Пруднікі, Язна.
VI—IX стст. н. э.	Рассяленне славян-крывічоў, зараджэнне феадальных адносін, фарміраванне княжанняў. З'яўленне і развіццё банцараўскай культуры. Археалагічныя рэшткі яе знойдзены на гарадзішчы ля в. Пруднікі.
862 г.	Першыя летапісныя ўпамінанні пра Полацкае княства, у якое ўваходзілі нашы мясціны.
XI ст.	Заснавана паселішча Дзісна ля ўпадзення р. Дзісны ў Дзвіну.
XI—XII стст.	З'яўленне круглых курганоў з пахавальным абрадам трупапалажэння, які выцесніў крэмацыю, з жаночымі ўпрыгожаннямі — скроневымі бранзалетападобнымі драцянымі колцамі ля вёсак Кублішчына, Лясная.
1044—1101 гг.	Княжанне ў Полацку Усяслава Брачыславіча, празванага Чарадзеем, пярсцёнак якога знойдзены ля Дзісны.
1101 (?) г., 1127—1128 гг.	Княжанне ў Полацку Барыса Усяславіча (свецкае імя Рагвалод), з якім звязаны надпісы на так званых Барысавых камянях. Два з іх знаходзіліся ўваколіцах Дзісны.
1301 г.	Тэрыторыя сучаснай Дзісеншчыны ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага.
1324 (двойчы), 1325, 1333, 1343, 1373, 1377, 1413 гг.	Паходы крыжакоў на Полаччыну, Дзісеншчыну і Дзісну.
1461 г.	Першае пісьмовае ўпамінанне Дзісны.

1461 г. Першае пісьмовае ўпамінанне в. Новы Пагост.

1475 г. Першае пісьмовае ўпамінанне в. Язна.

1504 г. Дзісеншчына ўвайшла ў склад Полацкага ваяводства.

1506 г. Першае пісьмовае ўпамінанне в. Галомысла.

1507 г. Першае ўпамінанне ў пісьмовых крыніцах в. Блошнікі (Калінавае).

1513 г. Першае ўпамінанне ў пісьмовых крыніцах вёсак Басяныя і Орцы.

1514 г. Першае пісьмовае ўпамінанне места Міёры.

1515 г. Першае пісьмовае ўпамінанне в. Вята.

1517 г. Першае пісьмовае ўпамінанне в. Дзедзіна.

1522 г. Першае пісьмовае ўпамінанне в. Вугальнікі.

1529 г. Першае пісьмовае ўпамінанне в. Чэрасы.

1533 г. Першае пісьмовае ўпамінанне вёсак Катавічы, Курылавічы, Цвеціна.

1552 г. Першае пісьмовае ўпамінанне в. Завуцце (Вялікае Завуцце).

1557—1633 гг. Жыццё і дзейнасць Льва Іванавіча Сапегі — палітычнага, грамадскага і ваеннага дзеяча ВКЛ. Меў уладанні на тэрыторыі сучаснага Міёрскага раёна, заснаваў касцёл у Новым Пагосце.

1559 г. Першае ўпамінанне ў пісьмовых крыніцах в. Крычава.

1563 г. У час Лівонскай вайны ротмістр яго каралеўскай вялікасці, староста дзісенскі Баркулаб Іванавіч Корсак пабудаваў замак на востраве (Верхні замак, Капец), Дзісна перанесена на левы бераг ракі (Ніжні замак).

1564 г. Першае пісьмовае ўпамінанне вёсак Чурылава, Чурылавіч — Лявонпаля.

1566 г. Дзісна атрымала права бяспошліннага гандлю.

1566 г. Першае пісьмовае ўпамінанне в. Наўгароды.

1567 г. Першае ўпамінанне ў пісьмовых крыніцах в. Мілашова.

1567 г. Кароль Жыгімонт Аўгуст даў Дзісне новыя льготы і герб «тры вежы з муру».

1569 г. Дзісна атрымала магдэбургскае права і новы герб «ладдзя».

1571 г. Кароль Жыгімонт Аўгуст даў магдэбургскае права «вольнаму гораду» Перабродцзе.

1579, 1581 гг.	Кароль Стэфан Баторы наведваў Дзісну.
1611 г.	Кароль Жыгімонт III прыняў у Дзісне ў сваё падданства 230 маскоўскіх баяр.
1629—1680	Жыццё і дзейнасць Сімяона Полацкага (Самуіла Гаўрылавіча Пятроўскага-Сітніяновіча) — беларускага і рускага грамадскага і царкоўнага дзеяча, пісьменніка, публіцыста і педагога. Завяшчаў значныя сумы праваслаўным манастырам Міёраў і Дзісны.
1633 г.	Першае пісьмовае ўпамінанне пра царкву і манастыр у Дзісне, якія «по преданию» існавалі адпаведна з XIII і XV стст.
1644 г., 25 мая	Суддзя земскі браслаўскі Севасціян Святаполк-Мірскі заснаваў праваслаўны манастыр у Міёрах.
1654 г., 25 ліпеня	Дзісенцы здалі горад рускім войскам В. П. Шарамецева.
1654 г., верасень — 1655 г., сакавік	Аблога Дзісны войскамі Вялікага княства Літоўскага.
1656 г.	Цар Аляксей Міхайлавіч (Цішэйшы) міма Дзісны ішоў «пад Рыгу» з войскамі і вяртаўся з няўдалага паходу.
1661 г.	Антырасійскае паўстанне ў Дзісне.
1662 г.	Упамінанне ў пісьмовых крыніцах «маёмасці» Лонка.
1663 г.	Першае пісьмовае ўпамінанне Узмён.
1690 г., 20 снежня	Праваслаўны манастыр і царква ў Міёрах разрабаваны і ператвораны ў каталіцкі касцёл.
1700 г.	Вялікі пажар у Дзісне, які вынішчыў увесь горад.
1700—1721 гг.	Паўночная вайна Расіі і Рэчы Паспалітай супраць Швецыі, у выніку яе Дзісна разбурана і вынішчана.
1712 г.	Эпідэмія чумы ў Дзісне.
1715—1778 гг.	Жыццё і дзейнасць Мікалая Тадэвуша Лапацінскага, брэсцкага ваяводы, уладальніка Лявонпаля.
1728 г.	У Дзісне пабудаваны драўляныя Уваскрэсенская і Затрапезна-Уведзенская цэрквы на грошы і пры непасрэдным удзеле сям'і Барадульскіх.
1750 г.	Пабудаваны Белы палац у Лявонпалі.
1773 г.	У Дзісне пабудаваны цагляны касцёл.
1775 г.	Першае ўпамінанне пра школу ў Дзісне, у ёй вучылася 10 дзяцей.
1775 г.	Пабудавана драўляная Троіцкая царква ў Лявонпалі.
1793 г.	У выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай Дзісеншчына ўвайшла ў склад Расійскай імперыі.

1796 г. Кацярына II надала Дзісне новы герб — «на зялёным полі залаты сноп ільну».

1797 г. У Дзісне 2100 чалавек насельніцтва, з іх 1580 каталікаў.

1798 г., 1 студзеня Зацверджаны план развіцця Дзісны.

1810—1863 гг. Жыццё і дзейнасць рэвалюцыянера і скульптара Генрыха Дмахоўскага з в. Забалацце.

?—1835 г. Жыццё і дзейнасць Тэклі Урублеўскай, паэтэсы з Дзісны, аўтара трагедый «Пантэя», «Нарымуна — Вялікі князь Літоўскі».

1812 г., 10—16 ліпеня Стотысячная 1-я руская армія пад камандаваннем Барклая дэ Толі знаходзілася з царом Аляксандрам I у Дрысенскім умацаваным лагеры, далей адступала на Полацк.

1812 г., 25 ліпеня Лятучыя кавалерыйскія атрады асобнага корпуса П. Вітгенштэйна пад Лявонпалем і Браславам захапілі ў палон 240 французскіх салдат і афіцэраў.

1827 г. У Дзісне заснавана прадстаўніцтва «Расійскага страхавога ад агню таварыства».

1828 г. У справаздачы мінскага губернатара прыводзіцца першая дакладная колькасць жыхароў Дзісны — 2802; у горадзе 330 жылых дамоў.

1831 г., 23 красавіка Пачатак актыўных ваенных дзеянняў у Дзісенскім павеце пад час нацыянальна-вызваленчага паўстання ў Польшчы і Беларусі.

1831 г., 24—26 красавіка Паўстанцамі захоплена Дзісна.

1831 г., 4 мая Паўстанцы пакінулі Дзісенскі павет.

1850—1893 (?) гг. Жыццё і дзейнасць Вайніслава Савіч-Заблоцкага — літаратара і фальклярыста.

1861 г., 28 жніўня Нарадзіўся Ігнат Буйніцкі — беларускі акцёр, рэжысёр, тэатральны дзеяч. Створаны ім калектыў з вялікім поспехам выступаў у Дзісне.

1863—1864 гг. Паўстанне ў Польшчы, на Беларусі і ў Літве, у якім удзельнічалі жыхары Дзісеншчыны.

1865, 1872, 1882 гг. Вялікія пажары ў Дзісне.

1870 г. У Дзісне ўзведзена цагляная праваслаўная Уваскрасенская царква.

1870, 1878 гг. Вялікія паводкі ў Дзісне.

1882 г. Пасля пажару ў Дзісне арганізавана Вольнае пажарнае таварыства.

1897 г. Усерасійскі перапіс насельніцтва. У Дзісне 6755 жыхароў, у Міёрах — 145.

1898 г. Нарадзіўся І. Бейрах — прафесар медыцынскіх навук з Дзісны.

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ — 1917

1901 г.	Хваляванне сялян у Дзісенскім павеце ў сувязі з межаваннем зямлі.
1901 г.	У Дзісне пабудавана казначэйства, кошт работ 24 140 рублёў.
1903 г.	У Дзісне пабудавана гарадская бальніца, на якую выдзелены 41 523 рублі.
1904 г.	У Дзісне 841 будынак і 9113 жыхароў.
1904—1905 гг.	Дзейнасць арганізацыі РСДРП у Дзісне.
1905 г.	Пачатак правядзення вечарын беларускай нацыянальнай культуры ў Дзісне.
1905 г., 1 мая	Першамайская дэманстрацыя ў Дзісне пад сацыял-дэмакратычнымі лозунгамі.
1905—1907 гг.	Будаўніцтва касцёла ў Міёрах.
1906 г.	Утварэнне вытворчых кааператываў на Дзісеншчыне. Адзін з іх экспартаваў у Англію 5 тыс. пудоў масла.
1906 г.	Нарадзіўся Я. Малецкі — дзеяч нацыянальнага руху, аўтар кнігі «Пад знакам Пагоні».
1907—1909 гг.	Будаўніцтва ў Дзісне маста праз р. Дзісна даўжынёй 70,12 саж.
1908 г.	У Дзісне на могілках пачата будаўніцтва з чырвонай цэглы Мікалаеўскай царквы. З казны выдзелена 6374 руб. 46 кап. У ёй ікона св. Адзігітрыі.

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

Устанаўленне савецкай улады

Вестка аб лютаўскай рэвалюцыі на Дзісеншчыне была сустрэта з уздымам. Як успамінаў відавочца тых падзей былы тэлеграфіст І. Пугачэўскі, у ноч з 28 лютага Полацк прапанаваў дзяжурнаму тэлеграфісту Лазарэнку прыняць тэлеграму з незвычайным адрасам: «Усім, усім, усім!» Яна выклікала перапалох царскіх чыноўнікаў. І. Пугачэўскі і Лазарэнка хутка размножылі і расклеілі яе па гораду, паслалі ў турму, вайсковыя часці.

У горадзе пачаліся мітынгі, дэманстрацыі. Губернатар граф Талстой на сходзе чыноўнікаў у прысутнасці мітрапаліта Нікана зачытаў маніфест аб адрачэнні цара.

У першыя ж дні пасля рэвалюцыі пачалі стварацца Саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Кіравалі ў іх эсэры. Толькі сялянскі Савет узначальваў бальшавік Гайлеш. І ў правядзенні рэвалюцыйных пераўтварэнняў сяляне дзейнічалі найбольш арганізавана і дружна, не чакаючы заканадаўчага рашэння зямельнага пытання. Яны не толькі адбіралі зямлю ў памешчыкаў, але і грамілі маёнткі. Таму ўжо 30 красавіка ў зводцы Часовага ўпраўлення па справах міліцыі паведамлялася: «У Дзісенскім павеце сяляне праводзяць самавольныя вобыскі, арышты, здымаюць у эканоміях рабочых, пагражаюць за супрацьдзеянне насіллямі...»[1]

Асабліва актыўна выступаюць сяляне Язненскай воласці пад кіраўніцтвам былога паліткатаржаніна Альхімовіча. Яны не прызнавалі Часовы ўрад і адмаўляліся выконваць распараджэнні губернскага камісара Балая. Калі ж для арышту Альхімовіча было накіравана падраздзяленне салдат, то праз два дні яго камандзір Цыганкоў паведаміў, што застаецца абараняць Язненскую рэспубліку.

У павеце ішла замена лясной варты выбарнымі людзьмі, не выконваліся рашэнні мясцовых органаў Часовага ўрада. Гэтаму садзейнічала работа сярод насельніцтва ў Дзісне бальшавікоў Лясковўскага, Волкінда і іншых, што вярнуліся з Петраграда. Агітатараў прысылаў сюды Кранштадскі камітэт РСДРП(б). Яны працавалі таксама ў вёсцы[2].

Аднак вялікіх перамен у сацыяльным жыцці не адбылося. Губернскім камісарам Часовага ўрада быў выбраны царскі афіцэр, а павятовым — мясцовы памешчык, былы земскі начальнік і ўладальнік маёнтка Дарожкавічы Капылоў. У міліцыю перайшлі былыя стражнікі

М. М. Багдановіч, поўны георгіеўскі кавалер

і гарадавыя. Палітычныя партыі займалі нярэдка супрацьлеглыя пазіцыі. Эсэры, якія кіравалі ў Саветах, заклікалі чакаць Устаноўчы сход. Рэвалюцыйна настроеныя масы чакаць не жадалі. Сведчанне таго — тэлеграма памешчыцы Каржанеўскай ад 9 ліпеня 1917 г. старшыні Савета міністраў Часовага ўрада: «Грамадзяне суседніх вёсак падзялілі мае палі ў маёнтку Дрыгучы Дзісенскага павета Мікалаёўскай воласці, члены валасныя кіруюць. Прашу прыняць меры. Улады мясцовыя бяздзейнічаюць»[3].

Гэтая тэлеграма сведчыць аб паглыбленні рэвалюцыйных працэсаў у вёсцы, дзе яшчэ ў сярэдзіне мая, паводле данясення губернскага камісара Кліёта Часоваму ўраду, аграрны рух выявіўся толькі ў перадачы прыватнаўласніцкіх і часткі казённых лясоў у падпарадкаванне валасных камітэтаў. Камітэты паўсюдна дазволілі пасьбу сялянскай жывёлы ў лясах і на пашах і аб'явілі азёры агульным здабыткам[4].

З 4 па 6 чэрвеня 1917 г. у г. Дзісна праходзіў першы сялянскі з'езд Віленскай губерні, скліканы па ініцыятыве бальшавікоў. На з'ездзе прысутнічала каля 400 дэлегатаў.

У сваіх дакладах бальшавікі выклалі сялянам аграрную праграму РСДРП(б). Выкрываючы эсэраўскую палітыку не чапаць прыватнаўласніцкія землі да Устаноўчага сходу, бальшавікі заклікалі сялян да неадкладнага захопу памешчыцкіх, удзельных, царкоўных зямель і ўгоддзяў.

Дэлегаты з'езда пайшлі за бальшавікамі. Яны прынялі бальшавіцкую рэзалюцыю, якая патрабавала, каб уся зямля, лясы, сенакосы, пашы, млыны, рыбная лоўля, статак і земляробчыя прылады неадкладна перайшлі ў распараджэнне і пад кантроль валасных і сельскіх камітэтаў.

Да сярэдзіны лета 1917 г. большасць сялян павета пачынае падтрымліваць погляды бальшавікоў па пытаннях аб вайне, міры і зямлі. Гэтаму садзейнічала таксама работа рэвалюцыйных агітатараў 15-га, 2-га і 35-га корпусаў 3-й арміі. Уплыў эсэраў памяншаецца, калі Дзісеншчына з 2 ліпеня ўключаецца ў франтавую зону, дзе ўводзіцца пакаранне смерцю. У жніўні колькасць стыхійных сялянскіх выступленняў аднолькавая з «законнымі», арганізаванымі эсэрамі для бачнасці рэвалюцыйных перамен, потым яны перабольшваюць, набываючы ўсё больш захопна-пагромныя формы[5].

Эсэры, жадаючы ўмацаваць свой уплыў у вёсцы, 27 жніўня зноў склікалі ў Дзісне тэрміновы з'езд сялян Віленскай і Ковенскай губерняў. Аднак асноўнае пытанне — аб зямлі — нават не ўключылі ў парадак абмеркавання. У рэзалюцыі з'езда адзначалася, што агульнае рашэнне зямельнага пытання магчыма толькі на Устаноўчым сходзе, а зямельныя камітэты закліканы змагацца з усякімі спробамі самавольных захопаў угоддзяў, бо аграрныя беспарадкі могуць быць карысныя не сялянам, а «контррэвалюцыі». Толькі ў канцы рэзалюцыі адзначалася, што з'езд «лічыць сваім абавязкам далучыць свой голас да агульнага патрабавання сялян Расіі аб неабходнасці неадкладнага пера-

ходу ў распараджэнне зямельных камітэтаў усіх зямель і прадастаўлення гэтым камітэтам права шырокага распараджэння землямі, апрацаваць якія ўладальнікі адмаўляюцца ці не могуць».

Бальшавікі спяшаліся самі даць зямлю сялянам і зрабілі гэта ў выніку Кастрычніцкай рэвалюцыі. У ёй прымалі непасрэдны ўдзел нашы землякі Лясовіч, Сініца, Рубін, Поляк і многія іншыя, якія працавалі ў той час на сталічных заводах ці служылі ў арміі.

Вестка аб звяржэнні Часовага ўрада разагнала ў Дзісне чыноўнікаў губернскага ўпраўлення, уцёк камендант гарнізона Амарантаў. Раніцай салдаты арыштавалі губернскага камісара. Ствараецца павятовы ваенна-рэвалюцыйны камітэт. Пры падтрымцы рабоча-сялянскай улады праз некалькі дзён адбылася нарада дэпутатаў-сялян Мінскай і Віленскай губерняў (па 4 дэпутаты ад воласці), якая прыняла рашэнне аб скліканні трэцяга губернскага сялянскага з'езда. Ён прайшоў 17—20 лістапада ў Мінску і адобрыў рашэнні II Усерасійскага з'езда Саветаў.

Ваенна-рэвалюцыйны камітэт, умацоўваючы свой апарат, адначасова вёў падрыхтоўку да выбараў пастаянных органаў улады на месцах — Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.

У Міёрах валасны ваенна-рэвалюцыйны камітэт быў створаны ў лістападзе 1917 г. з мясцовых батрацка-бядняцкіх актывістаў. Праз некалькі дзён ён абраў агульны валасны сход, на якім абмяркоўвалася пытанне аб выбарах валаснога Савета.

У склад валаснога Савета былі выбраны бядняк з в. Рыжаўшчына Браніслаў Багуцкі, малазямельны селянін з Сякерак Станіслаў Валеўка, парабак з Ракавых Іосіф Волкаў. Старшынёй яго стаў былы рабочы Ижорскага завода Мікалай Дземідзёнак. Незадоўга перад тым ён вярнуўся ў родную в. Лявонаўцы. Сакратаром выбралі Івана Давыдавіча Лясовіча, былога піцерскага рабочага, пасланага для арганізацыі савецкай улады



І. М. Пірог

С. Ф. Сініцын

ў родных мясцінах.

У воласці была створана народная міліцыя. Першымі міліцыянерамі сталі Аляксандр Ходас, які раней парабкаваў у кулакоў, актывіст Сінкевіч і інш. Савет прызначыў начальнікам міліцыі Барыса Мінчына.

Рэвалюцыя і ў глухой правінцыі павяла адлік сваіх герояў і ахвяр. Ад рук нямецкіх акупантаў у 1918 г. загінуў Аляксандр Ходас. У Лукішкскай турме ў Вільні падарвалі здароўе Сінкевіч, І. Волкаў, Б. Багуцкі. Рана абарвалася жыццё С. Валеўкі і М. Дземідзёнка.

Пасля смерці М. Дземідзёнка старшынёй валаснога Савета быў выбраны Іван Давыдавіч Лясовіч, адзін з нямногіх, каму лёсам было наканавана доўгае жыццё, хоць не простае і не лёгкае. Сакратаром нейкі час працаваў Фёдар Іванавіч Рачыцкі з Нівак (ля Камянполля).

Новая ўлада атрымала ў спадчыну разбураную эканоміку, галечу і голад. І з першых дзён яна вымушана была прымаць неадкладныя меры, каб дапамагчы людзям у самым неабходным. На пасяджэннях Савета абмяркоўваліся просьбы беднякоў аб аказанні ім матэрыяльнай дапамогі. Тым, хто меў асаблівую патрэбу, хлеб выдзяляўся бясплатна. Сяляне атрымлівалі зямлю, сельгасінвентар. Але ўсё гэта можна было ўзяць толькі ў тых, хто меў, — у багатых землеўладальнікаў. Вось таму

камісіі з беднякоў пад кіраўніцтвам прадстаўнікоў Савета вялі ўлік маёмасці памешчыцкіх маёнткаў. Толькі ў пана Мірскага ў Камянполлі было рэквізавана больш 30 кароў, шмат коней, зерня і зямлі.

Савецкая ўлада арганізоўвалася і ў іншых валасцях. У Мікалаёве старшынёй Савета сялянскіх дэпутатаў быў выбраны Налівайка, у Сачыўках — М. М. Варона. У вёсках ствараліся камітэты беднаты. Актыўны ўдзел у іх рабоце прымалі А. С. Томка з в. Клімяты, М. Н. Мятла з Гіргеляў, М. А. Сачыўка і С. С. Мятла з Кухцінцаў і многія іншыя. Марк Апанасавіч Сачыўка, напрыклад, парабкаваў у графа Аранскага, працаваў на заводах Петраграда, зведаў галечу, голад і холад. У 1918 г. сяляне даручаюць яму кіраўніцтва валасным зямельным аддзелам, а ў 1919 г. выбіраюць старшынёй Язненскага валаснога камітэта беднаты.

10 снежня 1917 г., пасля арганізацыі валасных Саветаў, Дзісенскі павятовы рэўком склікаў з'езд прадстаўнікоў валасцей, на якім быў выбраны выканаўчы камітэт Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, утвораны галіновыя аддзелы выканкама, у тым ліку савет народнай гаспадаркі павета[6].

Далейшае замацаванне рэвалюцыйныя пераўтварэнні знайшлі ў рашэннях Першага абласнога з'езда зямельных камітэтаў Заходняй вобласці, які прайшоў 7—11 студзеня 1918 г. у Мінску. Адным з намеснікаў старшыні прэзідыума з'езда быў выбраны тав. Гайлеш, прадстаўнік Дзісеншчыны. Тут была прынята бальшавіцкая рэзалюцыя па зямельнаму, харчоваму, лясному, прамысловаму, рабоча-батрацкаму пытаннях[7]. Яна падводзіла вынік работы, ужо праведзенай на Дзісеншчыне. Вось што паведамляў у гэтай сувязі 18 студзеня 1918 г. «Інфармацыйны лісток» аддзела мясцовага ўпраўлення НКУС Віленскай губерні: «Звязваючым арганізацыйным цэнтрам на акупіраваных частках Віленскай і Ковенскай губ. з'яўляецца ў дадзены час губ(ернскі) Савет рабочых, салдацкіх, сялянскіх і парабкоўскіх дэпутатаў гор. Дзісны. Улада перайшла ў рукі Савета і Саветам вядзецца вялікая арганізацыйная работа ў сэнсе ўмацавання Савецкай улады. Ліквідаваны думы, старыя зямельныя камітэты, земства, казначэйства ў руках Савета. Пры Савеце ўтвораны аддзелы па кіраванню рускай тэрыторыяй на чале з камісарамі. Так, маюцца аддзелы: па ўнутраных справах, ваенны, зямельны, харчовы, юстыцыі, прамысловасці і гандлю, працы, грамадскай дапамогі і культурна-асветніцкі. Маецца пастаянная сувязь з Петраградам, старшыня Савета тав. Кашура (бальшавік) у той жа час з'яўляецца і членам ЦВК...»[8]

Дзісенскі павятовы Савет знаходзіцца ў спісе 31 Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці, складзеным у канцы студзеня 1918 г.[9] А ў наступным месяцы, якраз у дзень пачатку нямецкага наступлення, — 18 лютага — газета «Савецкая праўда» паспявае паведаміць: «Выканаўчы камітэт Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Віленскай і Ковенскай губ., гор. Дзісна. Дзейнасць павятовых, гарадскіх і валасных Саветаў працякае нармальна. Дэкрэты народных камісараў і цэнтральных камітэтаў праводзяцца ў жыццё праз азначаныя Саветы, і супраціўлення ці асаблівай незадаволенасці ў масах не заўважаецца»[10].

У сувязі з дэмабілізацыяй і развалам царскай арміі і пагрозай нямецкага наступлення на Дзісеншчыне яшчэ ў студзені 1918 г. пачынае праводзіцца работа па стварэнні Чырвонай гвардыі, а затым і Чырвонай Арміі. 17 лютага сход грамадзян Язненскай воласці, прысвечаны Дню Чырвонай Арміі, вырашыў: «Для абароны заваёў рэвалюцыі і для барацьбы з праціўнікамі рэвалюцыі — контррэвалюцыянерамі неадкладна праводзіць запіс жадаючых уступіць у рады Чырвонай Арміі, для чаго прыцягваць самых лепшых барацьбітоў.

Для падтрымання парадку на месцы арганізаваць Чырвоную гвардыю і неадкладна праводзіць запіс асоб, жадаючых паступіць у гвардыю.

Старшыня сходу Р. Шчарбіцкі. Сакратар І. Дварэцкі»[11].

Дзісна і павет былі акупіраваны немцамі неўзабаве пасля пачатку наступлення. Захопнікі аднавілі старыя парадкі, жорстка распраўляліся з бальшавікамі і актывістамі. Зямля, статак, інвентар і маёмасць вярталіся памешчыкам.

З прыходам немцаў валасны Савет у Міёрах пайшоў у падполле. Яго пасяджэнні збіраліся нелегальна, пераважна ў вёсках Гентава і Сякеркі. Савет заклікаў супрацьдзейнічаць рабаўніцтву акупантаў, хаваць зерне і статак, папярэджваць актывістаў аб кожным кроку ворага, аказваць дапамогу бальшавікам, якім пагражала небяспека. І гэта ва ўмовах, калі дзісенскі камендант Біртэль пагражаў, што за садзейнічанне бальшавікам «сяленні і гаспадаркі будуць змятацца з твару зямлі і месцы казні будуць перапоўнены... трупамі»[12]. Немцы ў кожнай вёсцы забіралі кароў, коней, фураж, а насельніцтва трымалі ў страху і падпарадкаванні расстрэламі і агнём.

[1] Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя ў Беларусі. Мн., 1957. Т. 1. С. 262.
[2] Игнатенко И. М. Беднейшее крестьянство — союзник крестьянства в борьбе за победу Октябрьской революции в Белоруссии. Мн., 1962. С. 150, 170.
[3] Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Т. 1. С. 463.
[4] Там жа. С. 303.
[5] Игнатенко И. М. Беднейшее крестьянство — союзник пролетариата в борьбе за победу Октябрьской революции в Белоруссии. С. 244—245, 261.
[6] Моргунский С. П. Создание и упрочение белорусской государственности. Мн., 1958. С. 132—133.
[7] Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя ў Беларусі. Т. 2. С. 744—751.
[8] Там жа. С. 798.
[9] Там жа. С. 810—811.
[10] Там жа. С. 884.
[11] Там жа. С. 882.

Л. А. Матэленак

Дакументы сведчаць

**НАКАЗ СЯЛЯНСКАГА З'ЕЗДА ВІЛЕНСКАЙ І КОВЕНСКАЙ губ.
У гор. ДЗІСНЕ ЗЯМЕЛЬНЫМ І ХАРЧОВЫМ КАМІТЭТАМ
АБ КАРЫСТАННІ ЗЯМЕЛЬНЫМІ ЎГОДДЗЯМІ
І ЎЛІКУ ПРАДУКТАЎ ХАРЧАВАННЯ І ІНВЕНТАРУ**

4 чэрвеня 1917 г.

1. Съезд предлагает губернскому, уездным, городским и волостным продовольственным комитетам немедленно произвести точный учет хлеба, фуража, сельскохозяйственных орудий и скота. Всех граждан губерний съезд просит оказать всевозможное содействие.

2. Вся земля, оставшаяся по каким-либо причинам не обсемененной, должна быть приготовлена к посеву озими. Об этом обязаны позаботиться волостные продовольственные комитеты с помощью деревенских и о результатах немедленно донести губернскому земельному комитету.

3. Частные владельцы обязаны к 10 июня 1917 г. заявить волостным комитетам, какую площадь земли они могут обработать под озимь своими средствами.

4. Все казенные луга поступают в распоряжение волостных комитетов, которые обязаны принять меры к охране этих лугов и распределить между нуждающимся населением.

Что же касается частновладельческих лугов, то волостные комитеты извещают владельцев, что они обязаны дать сведения комитетам, с какой площади лугов они (владельцы) могут убрать сено до 10 июля. Все луга после этого срока поступают в распоряжение волостных комитетов, которые распределяют луга нуждающимся за установленную плату.

5. Леса, как частные, так и казенные, находятся в ведении волостных комитетов, которые принимают меры к охране их от порубок и пожаров и отпускают материалы крайне нуждающимся гражданам по строгой регистрации. Валежник и мелкий сухостой отпускаются на дрова бесплатно.

6. Предлагается войсковым частям и всем военным комитетам при заключении сделок по аренде земель, лугов, пастбищ и сенокосов входить по этим делам в соглашение с местными волостными комитетами или губернским земельным комитетом.

7. Воспрещается всякий вывоз крупного рогатого и мелкого рогатого скота и всех продовольственных продуктов и продуктов первой необходимости из пределов волости без разрешения волостных исполнительных комитетов.

8. Прогоны на пастбище и водопои по всем землям отводятся волостными комитетами по своему усмотрению, не причиняя никому вреда.

9. Рыбная ловля в озерах и реках предоставляется в распоряжение волостных комитетов.

10. При обработке земли под озимь и уборке сена волостные комитеты, в случае надобности, реквизируют свободные сельскохозяйственные орудия на срок, необходимый для работ, принимая починку их на себя.

11. В случае реквизиции военными властями рогатого крупного скота и мелкого крестьянский съезд считает необходимым воздержаться от таковой в пределах Виленской и Ковенской губ., т. к. в этих губерниях неоднократно производились реквизиции и они очень пострадали от военных действий, а случайно оставшийся в малом количестве скот должен обслуживать местное население.

Съезд поручает Виленско-Ковенскому губернскому земельному комитету... немедленно распубликовать этот наказ среди населения и принять все меры к строгому и неуклонному его исполнению, а всех граждан Виленской и Ковенской губ. приглашает строго придерживаться этого наказа и при всяких недоразумениях, сопряженных с его выполнением, обращаться за разъяснениями в Виленско-Ковенский губернский земельный комитет, находящийся в гор. Дисне, при губернском продовольственном комитете.

Милиция, на основании указанного выше закона от 21 апреля, обязана оказывать волостным комитетам полное содействие.

Крестьянская газета. 1917. № 7.

З УКАЗУ АБ УКЛЮЧЭННІ ЧАСТКІ ТЭРЫТОРЫІ МІНСКАГА І ДЗВІНСКАГА ВАЕННЫХ АКРУГ У РАЁН ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ

2 ліпеня 1917 г.

В отмену всех отданных ранее разновременно распоряжений и приказов в отношении территории фронта и деления ее на войсковые и тыловые районы и военные округа, приказываю принять к руководству нижеследующее:

1. В район фронта включены территории Минского и Двинского военных округов.

2. ...Из территории Двинского военного округа в район фронта входят: Витебский, Велижский, Лепельский, Полоцкий, Городокский и Невельский уу. Витебской губ.; Свенцянский и Дисненский у. Виленской губ. и Холмский, Торопецкий и Великолукский у. Псковской губ.

3. Перечисленные в 2 пн. местности состоят на военном положении...

4. Разграничительную линию между районами общего тыла и войсковыми устанавливаю:

По Витебской губ. от северной границы фронта по восточной границе Дисненского у. до Минской губ. ...

Главнокомандующий армиями
ген.-лейтенант Деникин

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Інв. № 2102. Л. 701.

ТЭЛЕГРАМА ГАЛОЎНАГА НАЧАЛЬНІКА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ АРМІЙ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ НАЧАЛЬНІКАМ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ МІНСКАГА І ДЗВІНСКАГА ВАЕННЫХ АКРУГ АБ ПРЫНЯЦЦІ МЕР СУПРАЦЬ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ СЯЛЯН

22 ліпеня 1917 г.

По приказанию главного начальника снабжений армий Западного фронта передаю для сведения и доклада главному начальнику округа копию: «Сообщаю для сведения копию моей телеграммы губернским (и) уездным продовольственным комитетам, комиссарам, Советам рабочих, солдатских и крестьянских депутатов. Сообщаю для сведения и немедленного проведения в жизнь основные положения моего приказа 18 сего июля № 18 губернским, уездным и волостным продовольственным комитетам:

1) Принять немедленно самые энергичные, решительные меры (к) недопущению и прекращению всяких самовольных незаконных действий со стороны населения, препятствующих землевладельцам уборке полей и посеву;

2) никоим образом не выносить постановлений и резолюций, дающих повод населению (к) проявлению насильственных и преступных действий против землевладельцев. За неисполнение требований, изложенных выше, виновные в том председатели и члены продовольственных управ помимо устранения (от) должности будут привлекаться законом (к) уголовной ответственности за бездействие или превышение власти;

3) объявить землевладельцам-арендаторам, что они обязаны приложить все силы к тому, чтобы поля, покосы были убраны, озимые пашни засеяны. Если они не смогут справиться (с) этим собственными силами и средствами, должны заявить (об) этом продовольственным управам (в) установленные ими сроки, после чего управы обязаны принять соответствующие меры (к) уборке полей, покосов и посеву озимых. За неисполнение настоящего требования виновные землевладельцы и арендаторы подлежат ответственности (по) ст. 29 Уст(ава о) наказаниях, налагаемых мировыми судьями, (в) редакции постановления Временного правительства (от) 17 марта с. г.;

4) объявить населению, что за самовольные незаконные действия, препятствующие землевладельцам правильно вести хозяйство, виновные, помимо возмещения причиненных убытков, подлежат строгой законной ответственности, причем о виновных (в) таких действиях лицах надлежит немедленно представлять судебной власти для возбуждения уголовного преследования. Все меры (по) разрешению вопроса (о) засеве (и) уборке полей должны приниматься исключительно продовольственными комитетами и управами за их ответственностью при непременном условии, что весь хлеб, подлежащий отчуждению по закону 25 марта с. г., поступал (в) распоряжение государства. Министр продовольствия Пешехонов, 21750».

Полковник Арцишевский

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Інв. № 2102. Л. 752, 753.

ПАСТАНОВА АБ ЗАБАРОНЕ ВЫВАЗУ І ПЕРАВОЗАК ПРАДУКТАЎ ХАРЧАВАННЯ І ФУРАЖУ З ГУБЕРНЯЎ РАЁНА ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ

27 верасня 1917 г.

Обязательное постановление, изданное по соглашению с министром продовольствия на основании постановления Временного правительства от 21 августа 1917 г. для населения губерний: Минской, Могилевской, Смоленской и Калужской и уездов: Вилейского, Ошмянского, Свенцянского и Дисненского Виленской губ.

1. Воспрещается вывоз из перечисленных выше губерний и уездов, входящих в район Западного фронта, за пределы района фронта по железным, водным и гужевым путям:

а) хлебов: ржи, пшеницы, полбы, проса, гречихи, чечевицы, фасоли, гороха, кукурузы, муки, круп всякого рода, отрубей и отходов;

б) продуктов продовольствия: скота, мяса, мясных продуктов, сала, масла коровьего, масла постного, рыбы, соли, сахара, картофеля, капусты и других огородных овощей;

в) фуража: ячменя, овса, жмыхов, сена и соломы;

г) предметов первой необходимости: мануфактуры всякой, кож и изделий из них, железа всякого рода, табаку, изделий табачных и спичек.

2. Воспрещается перевозка всех поименованных предметов из одной губернии в другую.

Перевозка внутри района фронта допускается только с особого каждый раз разрешения, подлежащего губернского продовольственного комитета и притом не иначе как в адреса губернских, уездных, городских, волостных и районных продовольственных комитетов.

Запрещение перевозки не распространяется на заготовки, пересылаемые в интендантские магазины и склады, а ровно и на предметы, перевозимые пассажирами в виде ручного багажа или клади.

3. Настоящее обязательное постановление заменяет собой все прежде разновременно изданные в пределах района фронта военными и гражданскими властями обязательные постановления, касающиеся запретов вывоза и перевозок предметов продовольствия и фуража всех видов.

Виновные в нарушении сего постановления, вступающего в силу со дня распубликования, подлежат привлечению к судебной ответственности по ст. 29 Уст(ава) о наказ(аниях), налаг(аемых) мир(овыми) суд(ьями), в редакции постановления Временного правительства от 17 мая с. г.

Главнокомандующий армиями Западного фронта
ген. от инфантерии Балуев
Главный начальник снабжения армий
Западного фронта ген.-лейтенант Минут

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 616. Воп. 1. Спр. 1. Л. 282.

Бальшавік з Янова

Косцю Янушкевічу з вёскі Янова, што на Міёршчыне, было сем гадоў, калі зусім маладым памёр бацька — сялянскі шавец. З маці засталося трое дзяцей. У дванаццаць гадоў хлопчык наняўся пастухом, пасвіў кароў. Зімой Косця вучыўся ў сельскай школе, якую з-за беднасці не закончыў. Настаўнік толькі прабудзіў у ім цікавасць да ведаў, якія ён затым усё жыццё здабываў самастойна.

У студзені 1900 г. Косцю споўнілася 15 з паловай гадоў, трэба было штосьці мяняць. Не хацелася пакідаць родныя ваколіцы, ціхае возера, лес за дарогай, куды хадзіў нярэдка за грыбамі. Але аднавясковец, які прыехаў з Пецярбурга на пабыўку, настойваў:

— Паедзем на заробкі. Давязу да самага горада.

Так Янушкевіч пайшоў «у людзі». Спачатку паўгода працаваў памочнікам у падрадчыка-домабудаўніка, а на зіму быў зволены. Аднак шчасце не абышло яго. У снежні Косцю прынялі «хлопчыкам» на гандлёвае прадпрыемства.

Першая рэвалюцыя, якая ўспыхнула ў Пецярбургу, аказала на Янушкевіча моцнае ўздзеянне. У той час ён працаваў сталяром у домаўладальніка Элмаша. Варта было яму аднойчы далучыцца да забастоўшчыкаў, як адразу ж застаўся без працы. Давялося пачынаць усё спачатку. У ліпені 1906 г. Канстанцін паступіў вучнем сталярна-мэблевай фабрыкі, якая знаходзілася на Малой Балотнай вуліцы. Жывучы на свае сціплыя заробкі, ён добра ўсвядоміў, што без рабочай прафесіі, без цвёрдасці духу яму проста не выжыць. Таму да вывучэння сталярнай справы адносіўся вельмі старанна.

1910 год стаў паваротным у жыцці Канстанціна Янушкевіча. Вясной ён перайшоў на сталярную фабрыку Бяляева і пачаў актыўна ўдзельнічаць у рабоце падпольнай арганізацыі. Без яго не прайшло ніводнай забастоўкі. У тыя дні ён моцна пасябраваў з рабочым-сталяром Васілём Курачкіным, членам партыі з 1904 г., адным са стваральнікаў прафсаюза дрэваапрацоўшчыкаў. Больш вопытны падпольшчык перадаваў яму сакрэты канспірацыі, паводзін у месцах масавага збору людзей, сваё

уменне весці прапаганду. Па яго прапанове Янушкевіч уступае ў прафсаюз дрэваапрацоўшчыкаў, затым хутка быў абраны членам праўлення, старшынёй рэўкамісіі. Разам з В. М. Курачкіным яму давялося нямала папрацаваць, каб арганізаваць выпуск часопіса дрэваапрацоўшчыкаў. На агульным сходзе ў доме графіні Панінай, адстойваючы марксісцкі напрамак часопіса, яны далі бой меншавікам і эсэрам, якія хацелі, каб выданне было чыста прафесійным. Хаця і дабіліся выпуску часопіса, аднак з-за недахопу грошай ён выходзіў нерэгулярна, нярэдка канфіскоўваўся цэнзурай. Янушкевіч успамінаў: «На сталярнай фабрыцы Бяляева мне даводзілася збіраць грошы на свае выданні: газету «Праўда», часопіс дрэваапрацоўшчыкаў».

Калі дайшлі звесткі аб расстрэле рабочых на Ленскіх прыісках, Канстанцін адразу ж арганізаваў забастоўку пратэсту. Затым правёў майскую і ліпеньскую эканамічныя забастоўкі. Апошняя закончылася няўдачна, паліцыя яе разграміла. Янушкевічу загадалі пакінуць фабрыку як «палітычна ненадзейнаму». 1 жніўня 1912 г. ён паступіў на Руска-Балтыйскі завод, дзе працаваў яго сябра В. М. Курачкін. Разам з Курачкіным ён правёў тры забастоўкі запар. У лістападзе ў час сходу, які праходзіў за Новавясковымі могілкамі, на падпольшчыкаў наляцела паліцыя. Было арыштавана на месцы звыш ста чалавек, у тым ліку — Канстанцін Янушкевіч. Аднак хутка з-за адсутнасці ўлік ён быў вызвалены.

Арышт і турма не спужалі Янушкевіча, не зламалі яго волі. Ён і яго аднадумцы змагаліся супраць паліцэйскіх рэпрэсій, і ім удалося адстаяць ад ссылкі арыштаваных рабочых. Гэта была немалая перамога. Яны арганізоўвалі масавыя забастоўкі ў сувязі з гадавінай Крывавай нядзелі, 1-е Мая, 300-годдзем дома Раманавых, правялі збор сродкаў у фонд бастуючых рабочых фабрыкі. Грошы перадалі думскай фракцыі большавікоў. І Канстанцін тут жа папляціўся. Пад выглядам скарачэння рабочых ён быў звольнены. Для яго пачаліся нялёгкія дні. Аднак выручылі сябры.

Самая яркая старонка біяграфіі Янушкевіча звязана з Металічным заводам, куды ён паступіў у чэрвені 1913 г. Ён уліўся ў групу мадэльшчыкаў, якіх гаспадары называлі «выбуханебяспечнымі», арганізатарамі многіх стачак. Тут былі яшчэ жывыя рэвалюцыйныя традыцыі Выбаргскай стараны. Тут Янушкевіч зблізіўся з бальшавікамі В. П. Вінаградавым, Е. С. Белавусавым, І. П. Румянцавым і іншымі. Дружба з рэвалюцыйна настроенымі рабочымі аказала істотны ўплыў на канчатковы выбар яго жыццёвага шляху: Янушкевіч уступіў у партыю бальшавікоў.

Канстанцін прагна вывучаў вопыт лепшых барацьбітоў. Сапраўдным узорам для яго быў мадэльшчык Васіль Вінаградаў, чалавек волатаўскай сілы, таксама з вясковай беднаты, толькі з Цвярской губерні. З Вінаградавым Янушкевіч быў побач у рэвалюцыйнай дзейнасці. Зімой яны сумесна праводзілі сходкі, нелегальныя сходы на канспіратыўных кватэрах, летам — за гарадам, на палянцы за Любашынскім праспектам. Падполле навучыла іх вынаходлівасці, узважваць кожнае слова, кожны свой учынак. Як ні небяспечна было, яны ўмешваліся ў канфліктныя сітуацыі, у грамадскі працэс, вучыліся быць палітыкамі. В. П. Вінаградаў, стаўшы ў савецкі час двойчы Героем Сацыялістычнай Працы, успамінаў: «На кожным заводзе была вядучай майстэрня ці цэх. На нашым такую ролю іграла мадэльная майстэрня, якая была апорай бальшавізму: з пяцідзесяці рабочых у ёй было 7 членаў партыі (Яфім Белавусаў, Павел Макараў, Пётр Шчаглоў, Ілья Ананьеў, Іван Румянцаў, Канстанцін Янушкевіч і я), былі і аднадумцы. Усе надзённыя пытанні перш за ўсё вырашаліся тут, а затым аб прынятых рашэннях паведамлялася ў іншыя майстэрні».

Паліцэйскі нагляд прымушаў дзейнічаць і паасобку. Канстанцін тайна распаўсюджваў лістоўкі, бальшавіцкую літаратуру, праводзіў гутаркі з маладымі рабочымі. Высокую ацэнку атрымала яго барацьба за прыняцце закона аб страхаванні рабочых. Пераканаўча прагучала яго выступленне ў час забастоўкі кавалёў:

— Мы патрабуем работы ў тры змены па 8 гадзін без зніжэння зарплаты. Касцьмі ляжам, але не адступім!

Забастоўка перамагла. Яна яшчэ вышэй узняла аўтарытэт Янушкевіча. А ў паліцыі ён быў на прыкмеце як небяспечны вораг самадзяржаўя. Такіх улады гатовы былі выпальваць гарачым жалезам.

Калі пачалася першая сусветная вайна, К. І. Янушкевіч актыўна выступаў на мітынгах супраць вайны. За удзел у буйной майскай забастоўцы 1916 г. ён быў зноў арыштаваны, заключаны ў турму, а затым адміністрацыйна сасланы ў Саратаў, далей ад сталіцы. Тут ён сустрэўся з бальшавіком-ленінцам Ігнатам Фокіным, з якім быў знаёмы ў Пецярбургу. Той дапамог Канстанціну звязацца са страхавым таварыствам «Маяк», дзе вялася палітычная работа. Аднак у Сарататве ён доўга не затрымаўся. Янушкевіч быў мабілізаваны ў армію і з маршавай ротай накіраваны на Паўднёва-Заходні фронт.

Канстанцін служыў сапёрам 329-га Бузулуцкага палка 85-й дывізіі. Яму даводзілася наводзіць пераправу праз Піну, Прыпяць.

Пасля лютаўскай рэвалюцыі Янушкевіча выбралі ў палкавы, а затым у дывізіённы і корпусны камітэты. Натхнёны давер'ем, ён з новай сілай уключыўся ў палітычную агітацыю. Па яго ініцыятыве быў звольнены камандзір палка Троіцкі. Адданыя цару афіцэры патрабавалі судзіць рэвалюцыянера. На абарону Канстанціна выступіў дывізіённы камітэт і апраўдаў яго. Як палымяны агітатар, ён вельмі быў патрэбны салдатам. І раптам казённае пісьмо: адміністрацыя Металічнага завода патрабавала яго вяртання як кваліфікаванага мадэльшчыка і рэпрэсіраванага рабочага.

Пралетарскі Піцер, наэлектрызаваны рэвалюцыйнымі падзеямі, рыхтаваўся да рашаючых падзей. Неабходна было, як казаў К. Маркс, «штурмаваць неба», праявіць вялікую храбрасць. Свежым ранкам 25 кастрычніка 1917 г. Янушкевіч, статны і шыракаплечы, увайшоў у графскі дом, дзе знаходзіўся чырвонагвардзейскі атрад. Усе прыціхлі, чакаючы асабліва важнага паведамлення. Начальнік штаба загаварыў спакойна і ўпэўнена:

— Таварышы! Штаб чырвонай гвардыі Выбаргскага раёна загадаў выступаць са зброяй. Палову чырвонагвардзейцаў адпраўляем у яго распараджэнне, яны пойдуць штурмаваць Зімні, захопліваць юнкерскае вучылішча. Чвэрць атрада будзем трымаць у баявым рэзерве, астатнія — на ахову завода.

На штурм пайшлі Яфім Белавусаў, Мікалай Рабаў, Ігнат Нікіцін (родам з Гродзенскай губерні), паэт Ілья Садоф'еў, пайшлі ўсе, хто быў поўны жадання пабудаваць новы свет вольнай працы і сацыяльнай справядлівасці. І ўсе яны ўнеслі часцінку сваёй мудрасці, каб Кастрычніцкая рэвалюцыя перамагла. Многія з іх, каго Янушкевіч ідэйна рыхтаваў, узбройваў, вучыў страляць, былі шчыра ўдзячны яму. Былы токар М. Ф. Рабаў, стаўшы генерал-лейтэнантам, успамінаў пра Канстанціна Янушкевіча як пра удумлівага і сур'ёзнага арганізатара, які выхаваў у ім пачуццё рэвалюцыйнага абавязку і дапамог стаць удзельнікам барацьбы за свабоду народа.

І пасля перамогі рэвалюцыі спраў для Янушкевіча не паменшылася. Ён працягваў кіраваць атрадам чырвонай гвардыі, удзельнічаў у вулічных баях, абараняў подступы да Петраграда. Выбраўшы дэпутатам Петраградскага Савета, яго накіроўваюць у секцыю дрэваапра-

цоўшчыкаў Савета народнай гаспадаркі Паўночнай вобласці, дзе ён працаваў побач з П. С. Залуцкім, В. М. Молатавым, А. В. Луначарскім. У жніўні 1918 г. ЦК партыі накіроўвае яго на Усходні фронт, пад Казань. Там ён быў абраны членам Шыхранскага Ваенна-рэваюцыйнага камітэта, загадваў харчовым забеспячэннем 5-й арміі. На сваім вопыце ён пераканаўся, што абараняць рэвалюцыю было не менш цяжка, чым яе рабіць. Закончыў службу ў Чырвонай Арміі камандзірам дывізіі.

Э. В. Карніловіч

Сцяг працы. 1988. 20 верас.

Нязломны змагар

Васіль Антонавіч Валеўка нарадзіўся ў чэрвені 1885 г. Як і ўсе дзеці сялянскай беднаты, рос ён без належнага догляду, бо бацька і маці заўсёды былі заняты працай. Калі споўнілася 9 гадоў, яго аддалі ў «навуку» — у падпаскі. Але бацька, сам непісьменны, усё ж хацеў даць сыну адукацыю. Ён уладкаваў яго ў пачатковую школу.

З лета 1898 г., закончыўшы пачатковую школу, Васіль Валеўка стаў канагонам у рудніку «Жоўтая Рака» ў Крыварожжы. Працаваў нароўні з дарослымі, а атрымліваў за работу капейкі.

Юны Валеўка працаваў санітарам у бальніцы рудніка, потым — вучнем слесара, паштальёнам. Юнак прыахвочваецца да чытання кніг і газет, знаёміцца з членамі сацыял-дэмакратычнай арганізацыі. Ад іх атрымлівае нелегальныя брашуры і чытае іх з захапленнем.

1904 год у жыцці В. Валеўкі азнаменаваўся трыма важнейшымі падзеямі: уступленне ў партыю РСДРП, жаніцьба і ўдзел у стачцы. У час стачкі Васіль быў сувязным паміж рудзінкамі, склікаў на мітынгі гарнякоў, смела ўступаў у дыскусіі з анархічна настроенымі людзьмі. Аднак стачка закончылася паражэннем. Пасля гэтых падзей Васіль яшчэ больш цікавіцца пралетарскім рухам, знаёміцца з папулярнымі брашурамі «Хто з чаго жыве?», «Павукі і мухі», «Пра агітацыю» і іншыя. Значна пашыраецца яго палітычны кругагляд.

1905 год выклікаў на Крыварожжы, як і па ўсёй Расіі, новую хвалю пратэсту супраць крывавых злачынстваў царызму.

Студзеньская палітычная стачка на Крыварожжы закончылася арыштамі, праследаваннямі бальшавікоў. У гэты перыяд В. Валеўка займаецца арганізацыяй баявых дружын і іх узбраеннем. У чэрвені 1906 г. планавалася на адным са складоў захапіць каля 200 кілаграмаў дынаміту. Але аперацыя не ўдалася: групу выдаў правакатар. Васіль Валеўка быў арыштаваны. Пачаліся цяжкія дні зняволення. За два месяцы допыту жандары не атрымалі ніякіх звестак. І ўсё ж у асобе В. Валеўкі дэпартамент паліцыі бачыў «небяспечную асобу». І ён ссылаецца пад нагляд паліцыі ў Архангельскую губернію на 3 гады.

Як доўга ні цягнуліся гады ссылкі, але ім, нарэшце, прыйшоў канец. У Крыварожжы В. А. Валеўка, хоць і знаходзіўся пад тайным наглядам паліцыі, не сядзеў склаўшы рукі. Аднаўляе партыйныя групы, вядзе прапагандысцкую работу. У 1916 г. другі арышт і высылка ў Іркуцкую губерню. Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Васіль Валеўка накіроўваецца на Крыварожжа, каб дапамагчы бальшавікам гарняцкага краю аднавіць партыйныя арганізацыі. Пачалася барацьба за ўладу Саветаў, у якой самы дзейсны ўдзел прымаў і Васіль Валеўка.

Работа па здзяйсненню сацыялістычных пераўтварэнняў была перапынена наступленнем нямецкіх войск. Гэтая акалічнасць прымушае бальшавікоў паскорыць фарміраванне Чырвонай гвардыі. Ствараецца крыварожскі рэвалюцыйны полк. Васіль Антонавіч непасрэдна займаецца гэтай справай і прызначаецца начальнікам штаба. Пачалося паходнае жыццё. Цяжкія паходы, зімсільваючыя баі адмоўна адбіліся на зда-

роўі В. Валеўкі — ён захварэў і быў адпраўлены ў тылавы шпіталь у Саратаў, лячыўся доўга і зноў стаў на ногі. Але для нясення вайсковай службы быў непрыгодны. Праз нейкі час В. Валеўку накіроўваюць следчым губЧК. Праз год Валеўка быў рэкамендаваны на работу ў Екацярынаслаўскую губЧК.

В. А. Валеўка заўсёды імкнуўся туды, дзе было цяжэй. Ён просіць накіраваць яго ў Нікалаеўскую губерню. А там выбірае самы аддалены Александрыйскі павет, дзе яго абралі старшынёй. Барацьба з бандытызмам, кулакамі, разрухай — вось няпоўны пералік тых спраў, якія выпалі на долю старшыні.

У 1922 г. старая хвароба напомніла пра сябе: ногі распухлі, хадзіць стала цяжка. Ён быў пад наглядам лепшых урачоў Адэсы, Харкава, Масквы. Калі гэта не дапамагло, ЦК КП(б)У прымае рашэнне адправіць яго на лячэнне за граніцу.

Пасля таго, як стан здароўя Валеўкі стаў лепшым, ён займаецца гаспадарчай дзейнасцю.

У 1926 г. хвароба зноў абвастрылася. Кансіліум вядомых нямецкіх спецыялістаў прыйшоў да вываду, што звычайныя метады лячэння не дапамогуць, патрэбна хірургічнае ўмяшанне.

— Адзіны выхад — ампутацыя. Патрэбна ваша згода,— катэгарычна заявіў прафесар.

— Калі ёсць надзея на выздараўленне і вяртанне на работу — ампутуйце,— адказаў на гэта Васіль Антонавіч, чым вельмі здзівіў прафесара. Той ніяк не мог зразумець, як гэты чалавек можа думаць перш за ўсё пра работу, а не пра сябе і сваё жыццё.

Пасля працяглага лячэння партыя накіроўвае яго на новую пасаду — у Народны камісарыят рабоча-сялянскай інспекцыі. Але хвароба нядоўга дазволіла займацца стваральнай працай. У 1928 г. В. А. Валеўку ампутавалі абедзве нагі. Урачы раяць яму пайсці на пенсію, пасяліцца ў адным з курортных месц Каўказа або Крыма. Але такая перспектыва яго не цешыла. Ён належаў да той катэгорыі людзей, для якіх праца ў імя народа складала сэнс жыцця.

— Працаваць да апошняга ўздыху — такое маё крэда, і я ад яго не адступлюся,— гаварыў Васіль Антонавіч. 24 чэрвеня 1930 г. В. А. Валеўка памёр. Ён пахаваны ў Маскве на Новадзявочых могілках.

Л. К. Касаты

Сцяг працы. 1982. 19 кастр.

Сведка падзей незабыўных

Адам Рыгоравіч Шабуцкі нарадзіўся ў в. Мацюкі ў 1893 г. Як і большасць дзяцей у той час, спазнаў галечу і голад. Сям'я рана страціла бацьку-кармільца. Хлопчыку не было калі вучыцца і адпачываць. Першая сусветная вайна яшчэ больш пагоршыла становішча народа ўсёй Расіі. Каб пазбегнуць мабілізацыі ў царскую армію, не праліваць кроў за цара-бацюшку, Адам Шабуцкі па парадзе сябра Міхаіла Каскевіча едзе ў Петраград і з яго дапамогай уладкоўваецца першым вучнем, а потым рабочым на Ліцейным заводзе. Гэта прадпрыемства выконвала заказы для фронту, і таму на яго рабочых існавала «бронь».

Уліўшыся ў згуртаваны рабочы калектыў, Шабуцкі разам з іншымі прымаў удзел ва ўсіх выступленнях лета і восені 1917 г. Памяць захавала найбольш яскравыя падзеі таго часу.

Праз 70 гадоў не мог без хвалявання Адам Рыгоравіч успамінаць 4 ліпеня 1917 г. У гэты дзень Часовы ўрад распачаў дэманстрацыю працоўных, якія запоўнілі вуліцы Петраграда. Разам з ўсімі на Неўскім праспекце А. Р. Шабуцкі заклікаў да сканчэння імперыялістычнай вайны, да перадачы ўсёй улады Саветам. Натоўп быў сустрэты кулямётным агнём з браневіка. Адам Рыгоравіч паспеў схавацца за нейкі выступ у сцяне, а яго сябра Фёдар Пальчэўскі з Міёршчыны быў забіты.

З кожным днём у Петраградзе мянялася абстаноўка. Адаму Рыгоравічу дапамагаў арыентавацца ва ўсіх палітычных пытаннях сябра з Міёраў — Краўчанка. Ён быў мараком, служыў у Кранштаце, прымаў удзел у арышце Мікалая II. Ён і паведаміў аб падрыхтоўцы ўзброенага паўстання 24 кастрычніка.

Напярэдадні рабочыя Ліцейнага завода арганізавалі забастоўку. Разам з іншымі ігнараваў загады фабрыкантаў і Шабуцкі. Яму не ўдалося прыняць удзел непасрэдна ў штурме Зімняга палаца, але многія нашы землякі там былі. А Міхаіл Сцяпанавіч Грэцкі з вёскі Пціцкія нават з'яўляўся камандзірам атрада нарвскіх рабочых.

Адам Рыгоравіч успомніў і свайго сябра Уладзіміра Паршуту з вёскі Застарынцы, які ўдзельнічаў у вобыску на кватэры Керанскага.

Пасля рэвалюцыі ў Петраградзе ўспыхнулі рабаўніцтва, марадзёрства. Савецкая ўлада звярнулася да свядомых рабочых з просьбай дапамагчы ўтаймаваць злачынцаў. У ліку 150 рабочых Ліцейнага завода адгукнуўся на гэта і Шабуцкі. Ён прымаў удзел у патруляванні, аднойчы з таварышамі нават быў абстраляны на вуліцы Садовай.

Давялося Адаму Рыгоравічу ўдзельнічаць у нацыяналізацыі прадпрыемства, арганізацыі запасу харчовых прадуктаў на Аляксандраўскіх складах. Вясной 1918 г. А. Р. Шабуцкі ў сувязі з хваробай маці вяртаецца дадому. Але дабрацца на Міёршчыну было не так проста. Немцы акупіравалі амаль усю Беларусь. Цягнік з Петраграда ў Полацку быў затрыманы, усіх адправілі ў лагер-турму. Толькі праз чатыры месяцы знявалення іх адпусцілі.

У 1920 г. Адам Рыгоравіч пайшоў у Чырвоную Армію, служыў у 8-м запасным палку пад Масквой да канца грамадзянскай вайны.

В. А. Ермалёнак

Сцяг працы. 1988. 21 ліп.

У баях заваяваная, у працы загартаваная

З успамінаў Я. Г. Рубіна

...Люты 1917 г. 171-ы пяхотны полк, дзе я служыў тады салдатам, стаяў у прыгарадзе Петраграда. Забастоўкі, дэманстрацыі, мітынгі рабочых прывялі ў рух армію і вёску. Салдаты адмаўляліся выконваць загады царскіх генералаў.

26 лютага на бок рэвалюцыі перайшлі многія часці Петраградскага гарнізона. Зняўся з казармаў і выступіў на падтрымку рэвалюцыі і наш полк.

Ледзь заняўся золак 27 лютага, наш полк прыбыў у Петраград на дапамогу бальшавікам.

Рабочыя сустрэлі нас з радасцю. Многія тут жа ўліліся ў нашу часць. Сумесна мы адолелі супраціўленне жандармерыі і занялі шэраг важнейшых аб'ектаў сталіцы.

Царызм быў зломлены. Але ўладу захапіла буржуазія. Урад змяніўся, а парадкі засталіся старыя. «Вайна да пераможнага канца», — крычалі прыхвасні Керанскага. Амаль кожны дзень яны прыязджалі да салдат і агітавалі выехаць на абарону, як яны гаварылі, Айчыны.

Задума Керанскага была зразумелай. Ён хацеў пазбавіцца рэвалюцыйна настроеных салдат і ў крыві задушыць рэвалюцыю. Гэта яму не ўдалося. Салдаты пайшлі за бальшавікамі. Яны не пакінулі Петраграда.

У Кастрычніцкай рэвалюцыі мне не прыйшлося ўдзельнічаць. Наш полк стаяў у прыгарадзе Петраграда і ў пачатку 1918 г. наогул быў расфарміраваны.

З Петраграда з групай салдат я накіраваўся на радзіму. У Віцебску добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію. У Бешанковічах у гэты час адбылося выступленне рускіх салдат супраць немцаў. У баі загінулі нямецкі генерал і некалькі салдат. Гэта пагражала зры-

вам перамір'я. Перад намі стаяла задача раззброіць салдат, што паддаліся правакацыі. І мы выканалі яе.

У 1920 г. нашу часць перакінулі на паўднёвы фронт супраць Урангеля, потым на разгром банды Махно.

У 1921 г. перад Савецкай краінай паўстала новая праблема — не хапала хлеба. Камандаванне Чырвонай Арміі па ўзгадненню з партыйнымі органамі (у гэты час я быў ужо камуністам) накіроўвае мяне ў вёску. Там кулакі аб'явілі сабатаж Савецкай уладзе. Памятаю, прыбыў я ў Кавалеўскую воласць Мікалаёўскага павета. На чале валвыканкома стаяў п'яніца і падкулачнік. Хлеб кулакі закапалі ў ямы, арганізавалі банды, забівалі актывістаў, палілі грамадскае дабро. Павятовы камітэт назначыў мяне старшынёй валаснога Савета. Для барацьбы з кулакамі я стварыў атрад самаабароны.

Аднойчы, даведаўшыся, дзе я начую, кулакі акружылі дом. Сакратару валаснога Савета загадалі выклікаць мяне на вуліцу. Я адмовіўся выйсці. Бандыты адкрылі агонь. Але хутка падаспелі сяляне-беднякі з атрада самаабароны, і мы разагналі бандытаў.

Хлеб усё ж здалі кулакі. Не ўдалося сарваць ім і веснавую сяўбу. Валасны Савет дапамог беднякам насеннем, і заданне савецкага ўрада было выканана.

У 1923 г. партыя аб'явіла вайну супраць спекулянтаў. Мяне прызначаюць старшынёй гандлёвага таварыства. Гэта быў цяжкі перыяд мірнай барацьбы з ворагамі савецкай улады. Спекулянты скуплівалі тавары, прадавалі іх утрая даражэй і гэтым настройвалі насельніцтва супраць савецкай улады.

Створаныя кааператыўныя таварыствы павялі рашучую барацьбу са спекуляцыяй і ў хуткім часе трывала зацвердзілі сацыялістычныя формы гандлю.

Сцяг працы. 1963. 7 лістап.

Дарагія ўспаміны

1917 год Іосіф Іванавіч Пугачэўскі сустрэў у Дзісне на пасадзе паштова-тэлеграфнага служачага. 28 лютага пасля дзяжурства ён адпачываў дома, калі прыбег рассыльны.

— Іосіф Іванавіч, — паведаміў ён. — Прыйшла нейкая папера. Начальнік пошты прачытаў яе і ўцёк. Дзяжурны Лазарэнка прасіў вас тэрмінова прыйсці на тэлеграф!

Тэлеграма сапраўды была незвычайная. Пачыналася яна словамі: «Усім!..» А далей паведамлялася, што царскае самадзяржаўе пала. Тэлеграма была тэрмінова размножана і расклеена па Дзісне, адаслана ў турму, у вайсковыя часці. З радасцю сустрэла насельніцтва вестку аб лютаўскай рэвалюцыі. Паўсюдна праходзілі мітынгі, дэманстрацыі, сходы.

У першыя дні пасля рэвалюцыі былі створаны Саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Але, нягледзячы на рэвалюцыю, парадкі ў павеце не вельмі змяніліся. І не дзіва. Губернскім камісарам быў царскі афіцэр, а павятовым — мясцовы памешчык, міліцыя складалася з былых стражнікаў і гарадавых.

Толькі з прыходам весткі аб Кастрычніцкай рэвалюцыі бальшавікі ўзялі ўладу ў павеце ў свае рукі. Адразу былі ліквідаваны старыя органы кіравання, выбраны павятовы камітэт.

Іосіф Пугачэўскі актыўна ўдзельнічаў у грамадскіх пераўтварэннях. Захавалася тэлеграма начальніку Віленскай акругі ад 19.01.1918 г. Яна паведамляе: «Раённым дэлегацкім з'ездам прыфрантавых устаноў Віленскай акругі, які адбыўся 6 студзеня ў Маладзечна, я выбраны камісарам Віленскай паштова-тэлеграфнай акругі... Пугачэўскі». А неўзабаве Іосіф Іванавіч быў камандзіраваны на з'езд паштова-тэлеграфных служачых у Разань, які павінен быў адбыцца 1 лютага 1918 года.

— У Разань я ехаў не адзін. На з'езд ад Віленскай акругі былі камандзіраваны дэлегаты Мятла, Крывенькі, Бязручка. Былі гэта людзі без пэўных палітычных перакананняў. Дзякуючы праведзенай з імі растлумачальнай рабоце па прыездзе на з'езд яны ўжо цвёрда падтрымлівалі праграму бальшавікоў. Гэта аказалася вельмі дарэчы, бо многія паштовыя служачыя былі недаверліва і нават варожа настроены ў адносінах да савецкай улады.

Неўзабаве пасля з'езда Іосіф Іванавіч Пугачэўскі па распараджэнню Народнага камісара пошты і тэлеграфа Падбельскага быў накіраваны ў падначаленне Народнага камісара сувязі Заходняй камуны Карла Фёдаравіча Разенталя. А там зноў Дзісна. Пасля вызвалення горада ад нямецкіх захопнікаў Іосіфу Іванавічу давялося аднаўляць сувязь, работу пошты і тэлеграфа.

Запомніўся Іосіфу Іванавічу 1919 г. У той час ён быў на пасадзе намесніка камісара пошты і тэлеграфа Літоўскай Савецкай Рэспублікі, адказваў за аднаўленне сувязі. Спраў было шмат. Немцы пры адступленні разбуралі ўсё, што можна было разбурыць. Вось чаму асабліва адказным было для сувязістаў забеспячэнне прамой сувязі аб'яднанага пасяджэння Цэнтральных Выканаўчых Камітэтаў Беларускай і Літоўскай Савецкіх Рэспублік, які праходзіў у Вільні. Яны вырашалі пытанне аб аб'яднанні дзвюх рэспублік у адну. На пасяджэнне прыехаў намеснік народнага камісара па замежных справах таварыш А. А. Іофэ.

У час перагавораў па аб'яднанні і адбылася размова з Леніным, якую ў якасці тэлеграфіста забяспечваў Іосіф Іванавіч Пугачэўскі.

— У час абмеркавання пытання аб аб'яднанні дзвюх рэспублік паміж дэлегатамі ўзніклі рознагалоссі. Таварыш Іофэ быў вымушаны звярнуцца за парадай да Уладзіміра Ільіча.

Размова вялася па тэлеграфу. Я перадаваў пытанні Іофэ па прамому праваду ў Маскву Леніну і атрымліваў на іх адказы. Памятаю, што размова ішла аб назве новай рэспублікі. На даклад Іофэ Уладзімір Ільіч адказаў:

«Нічога, няхай паспрачаюцца. У прынцыпе ж ніхто супраць аб'яднання не пярэчыць. Быў бы вытрыманы агульны сэнс нашай праграмы».

Аб'яднанне адбылося. Рэспубліка атрымала назву Літоўска-Беларускай.

Л. А. Матэленак

Сцяг працы. 1970. 28 сак.

Спіс забітых, параненых і без вестак прапаўшых у гады першай сусветнай вайны воінаў-ураджэнцаў Дзісеншчыны

АВЛАСОВ Иосиф Юльянович, д. Григоровичи, без вести пропал.

АДАМЕНОК Юльян, Новопогостская вол., без вести пропал.

АЛЕКСЕЕВ А. Г., Новопогостская вол., ранен.

АЛЕСЬКО Роман Викентьевич, Леонпольская вол., ранен.

АНИСЬКО Гиляр, Язненская вол., без вести пропал.

АНОШКО Станислав, д. Блажки, без вести пропал.

БЕЛЕВИЧ В. К., Язненская вол., ранен.

БЕЛЕВИЧ Лука Карпович, д. Перебродье, убит.

БЕЛЕВИЧ Киприан, д. Перебродье, без вести пропал.

БЕЛЯЕВ Иван Васильевич, д. Денисово, без вести пропал.

БИЗЕЛЕВИЧ Герасим, м. Леонполь, без вести пропал.

БОГОВИЧ Осип, мл. унтер-офицер, Миорская вол., ранен.

БОРИСЕНОК Иван, Чересская вол., без вести пропал.

БОРОК Иван, Чересская вол., д. Грецкие, без вести пропал 4.08.1914.

БРИКМАН Иван, Леонпольская вол., ранен.

ВАЛЬЧЕВСКИЙ Осип, Миорская вол., ранен.

ВАСИЛЕВИЧ Роман, г. Дисна, без вести пропал.

ВЕЛИЧКО Осип, Леонпольская вол., без вести пропал.

ГАЙЛЕВИЧ Адольф, д. Лебедево, без вести пропал.

ГИРЖД Эдуард, д. Лебедево, без вести пропал.

ГРОМ Николай Петрович, Перебродская вол., умер от ран.

ДАРГЕЛЬ Степан, Перебродская вол., без вести пропал.

ЕЗУПКОВИЧ Иван, д. Березово, без вести пропал.

ЖАБЕНОК Семен, д. Яново, без вести пропал.

ЖУК Павел Адамович, д. Слобода, без вести пропал.

ЗАКРЕВСКИЙ Карп Петрович, д. Новгороды, без вести пропал.

ИВАНОВ Устин Иванович, Миорская вол., убит.

КАРЖАК Осип, Перебродская вол., ранен.

КАСКЕВИЧ Петр Петрович, Миорская вол., убит.

КИСЕЛЕВ Константин, д. Виногроды, без вести пропал.

КОВАЛЕВСКИЙ Владимир, Миорская вол., без вести пропал.

КОЗЛОВ Филипп Илларионович, Залесская вол., убит.

КОРЕШКОВИЧ Александр, Леонпольская вол., д. Ясево, без вести пропал.

КРАСОВСКИЙ Павел Харламович, Перебродская вол., убит.

КРЮК Николай Андреевич, д. Яново, без вести пропал.

КУКЕЛЬ Устин Иванович, г. Дисна, убит.

ЛИННИК Александр, Леонпольская вол., без вести пропал.

МАЛЕЦКИЙ Вацлав, Миорская вол., д. Хранополь, без вести пропал.

МАЛЕЦКИЙ Никодим, г. Дисна, ранен.

МАЛЯВКО Павел, д. Карандаши, без вести пропал.

МАРКОВИЧ Василий, Леонпольская вол., без вести пропал.

МАРТИНКЕВИЧ Василий Дмитриевич, Миорская вол., без вести пропал 4.08.1914.

ПАВЛОВСКИЙ Бронислав, г. Дисна, убит 14.11.1914.

ПОЗНЯК Иосиф Августинович, Миорская вол., убит 14.11.1914.

ПРОТОС Степан Николаевич, г. Дисна, без вести пропал.

РИНКЕВИЧ Адольф, Миорская вол., ранен.

САКОВИЧ Петр, ефрейтор, Язненской вол., ранен.

СЧАСТНЫЙ Юрий Осипович, д. Черессы, без вести пропал.

ТУРЗЕНОК Устин, д. Лебедево, убит.

ШАРКОВИЧ Петр, д. Жугеровщина, убит.

ШУК Матвей, Леонпольская вол., без вести пропал.

ЮГАН Осип, Чересская вол., убит.

Друкуецца па кн.: Именной список убитых, раненых и без вести пропавших. Пг., 1915. Ч. 1, 2, 3.

ГАСПАДАРЧАЕ БУДАЎНІЦТВА І ЧАСОВАЯ АКУПАЦЫЯ

Дзісеншчына была вызвалена ў лістападзе 1918 г., а ўжо 10 снежня прадстаўнікі ўсіх валасцей на пашыраным пасяджэнні Дзісенскага павятовага выканкама дакладвалі, што савецкая ўлада адноўлена на ўсёй тэрыторыі павета, зямля і маёмасць маёнткаў і хутароў узята на ўлік, з бандытызмам і спекуляцыяй вядзецца актыўная барацьба. Хлеб узяты на ўлік не толькі ў кулакоў, але і ў сялян з тым, каб лішкі яго потым можна было падзяліць сярод асабліва бедных ці пацярпеўшых. У Дзісне ўстанаўліваюцца цвёрдыя цэны на харчаванне і прадметы першай неабходнасці, узяты на ўлік магазіны з мануфактурай і скуранымі таварамі, на кантроль — маёнткі[1].

У горадзе ўстаноўлены кантроль за дзейнасцю кінематографа, за работай лазні і млына. Кантрыбуцыя на багатых дала сродкі для адкрыцця і ўтрымання бальніцы і медыцынскіх пунктаў па павеце. Медыцынскае абслугоўванне беднаты стала бясплатным.

Вызначэнне і спагнанне падаткаў праводзілася па класаваму прынцыпу. Зямельны аддзел улічваў землі, каб пачаць іх пераразмеркаванне. Гарадскі аддзел выдзеліў 163 кватэры для беднякоў. Пачынаюцца работы па добраўпарадкаванні павятовага цэнтра.

22 снежня 1918 г. гарадскі Савет у Дзісне ліквідаваны, яго функцыі пачынае выконваць павятовы Савет.

Для аховы парадку ў Дзісне і павеце ствараецца народная міліцыя з рабочых і былых франтавікоў, а для барацьбы з контррэвалюцыяй — надзвычайная камісія. Яе старшынёй назначаны Уладзімір Ануфрыевіч Маняк, які да гэтага кіраваў толькі што распушчаным Дзісенскім гарсаветам.

Дзісеншчына працяглы час знаходзілася ў прыфрантавой зоне, двойчы па ёй пракаціліся баявыя дзеянні. Яна пе-

ражыла мабілізацыю, бежанцаў, рабаўніцтва захопнікаў. Сялянская гаспадарка была аслаблена, паменшыліся пасяўныя плошчы і пагалоўе жывёлы. Таму з уваходжаннем у Літбел павет атрымаў вялікую дапамогу на дзіцячыя дамы, ахову мацярынства і дзяцінства, утрыманне інвалідных дамоў, параненых[2]. Аднаўлялася медыцынскае абслугоўванне, пачалі работу школы. Аб праблемах народнай асветы ішла размова на з'ездзе настаўнікаў павета, які падпольна праходзіў у Глыбокім (тады Глыбокае ўваходзіла ў склад Дзісенскага павета) яшчэ ў час нямецкай акупацыі. Ён накіраваў у Маскву Сабалеўскага і Шыціка, якія сустрэліся з Луначарскім, дамовіліся з загадчыкам аддзела Наркамасветы Мазурам, каб ён быў прадстаўніком настаўнікаў Дзісеншчыны ў Саўнаркаме.

У межах тагачаснага павета на Дзісеншчыне налічвалася 44 тыс. дзяцей школьнага ўзросту, але ў 226 школах займаліся толькі 16 284 вучні[3]. Ужо адно гэта сведчыць аб цяжкасцях, якія перажывала народная асвета.

9—10 студзеня 1919 г. у Глыбокім адбыўся другі з'езд настаўнікаў. Яго ўдзельнікі паслалі Леніну і Луначарскаму тэлеграму: «З'езд настаўнікаў Дзісеншчыны пастанавіў горача вітаць Савецкую ўладу, якая прынесла працоўнаму народу вызваленне ад улады гвалтаўнікоў, і заяўляе, што ўсе свае сілы (настаўніцтва) аддасць на служэнне і ўмацаванне Савецкай улады». А стварэнне адзінай працоўнай савецкай школы было адобрана на з'ездзе настаўнікаў у Маладзечне 15—16 сакавіка, у якім прыняло ўдзел 200 педагогаў з Ашмянскага, Вілейскага і Дзісенскага паветаў.

Між тым у грамадстве працягвалася палярызацыя сіл, узмацнялася класавая барацьба. Па рашэнні Саўнаркама Літбела намечаны перавыбары валасных Саветаў, каб вывесці з іх кулакоў і кулацкіх прыхільнікаў. Найбольш небяспечным ворагам рабоча-сялянскай улады заставаўся голад. Для барацьбы з ім выкарыстоўваўся не толькі тавараабмен з сялянствам, але і харчразвёрстка. У вёскі накіроўваліся харчатрады, што таксама выклікала напружанасць, хоць такія атрады арыентаваліся на падтрымку беднай большасці ў барацьбе з кулацтвам, на падаўленне мяцяжоў. З асаблівa небяспечным выступленнем контрэвалюцыйных сіл савецкая ўлада сутыкнулася ў ваколіцах павятовых цэнтраў Дзісны і Браслава.

Арганізавацца і аб'яднаць свае сілы мясцовай контррэвалюцыі дазволіла польская акупацыя. Духавенства, незадаволенае савецкай уладай, выкарыстала адмоўную рэакцыю сялянства на рашэнне ўрада Літбела не выдзяляць сялянам частку канфіскаванай панскай зямлі. Урад Літбела і кампартыя ўзялі арыенцір на прапаганду і арганізацыю савецкіх гаспадарак на базе былых панскіх маёнткаў.

Духавенства ў саюзе з панамі і кулакамі натхняла мяцеж «зялёных» непасрэдна ля польска-савецкай граніцы. Пачаўся ён у сярэдзіне чэрвеня 1919 г. і быў узгоднены з камандаваннем польскай арміі, якая планавала нанесці ўдар па знясіленых баямі часцях Чырвонай Арміі. Мяцежнікі распаўсюджвалі правакацыйныя чуткі, што валасныя выканкамы далі ўказанне касіць пасевы на выпадак адступлення Чырвонай Арміі, што камуністы будуць разбураць касцёлы і праследаваць католікаў, што Саветы адбяруць у сялян увесь статак і коней. На фоне няўпэўненасці ў заўтрашнім дні гэта знаходзіла пажыўную глебу сярод большасці насельніцтва.

Выступленне кулакоў і дэзерціраў успыхнула ў Германавічах, перакінулася на Глыбокае, Шаркоўшчыну, Міёры, Друю, Новы Пагост, Іёды і іншыя населеныя пункты. Цэнтрам мяцяжу стала мястэчка Іказнь, дзе размясціўся яго штаб і галоўныя сілы. Агульныя інтарэсы аб'ядналі арганізатараў выступлення: ксяндза Буклярэвіча, былога паліцэйскага палкоўніка Жабо, былога штабс-капітана царскай арміі Наруша,

братоў-памешчыкаў Шумскіх, ксяндза Грынеўскага, памешчыка Раевіча, былога прыстава Парфяновіча, злодзея-рэцыдывіста Агея Зуева і інш. Яны стваралі ўзброеныя атрады, якія пачалі разганяць мясцовыя Саветы, жорстка распраўляліся з камуністамі і савецкімі работнікамі, рабавалі сялян.

На Міёршчыне паўстанне «зялёных» адбывалася пад кіраўніцтвам памешчыка Ваганоўскага з Александрова і ксяндза міёрскага касцёла. У Міёрах банда захапіла памяшканне валаснога Савета, арыштавала яго членаў Волкава, Багуцкага, начальніка міліцыі Мінчына. Непадалёку ад Старога Пагоста п'яныя «зялёныя» забілі павятовага ваеннага камісара Маляўку, які на аўтамабілі ехаў з Дзісны.

На падаўленне паўстання быў накіраваны атрад Віленскага каравульнага батальёна пад камандаваннем камісара Міцкевіча. Але гэтых сіл аказалася мала. Аператыўнае кіраўніцтва барацьбой з контррэвалюцыяй узначаліў віленскі губернскі камісар Кашчук, рэзідэнцыя якога пасля захопу Вільні пілсудчыкамі ў красавіку 1919 г. знаходзілася ў Дзвінску (Даўгаўпілсе). Па яго трывожнаму паведамленню павятовыя камітэты партыі Полацка, Мінска, Дзвінска, Віцебска правялі мабілізацыю камуністаў, савецкіх работнікаў, людзей, адданых савецкай уладзе.

Барацьбу з мяцежнікамі вялі атрады Цішко, Скрабо, браслаўскага ваенкома Брылевіча. Рота чырвонаармейцаў пад камандаваннем камуніста Глотава вызваліла мястэчка Міёры, дзе чакалі расстрэлу члены валвыканкама.

Паўстаўшыя сілай прымушалі ўступаць у свае атрады сялян, мабілізаваных у Чырвоную Армію і захопленых на зборных пунктах. Хутка ў іх радах было больш двух тысяч чалавек. Таму баі з імі вяліся ўпартыя. У іх загінулі браслаўскі ваенком Брылевіч, член Дзісенскага рэўкома Альхімовіч, стары камуніст Бехер, петраградскі бальшавік Трачэўскі і інш. Трагічным для многіх стаў дзень 21 чэрвеня, калі былі акружаны і разбіты атрад з Браслава і Дзвінская рота.

І ўсё ж асноўная частка сялян контррэвалюцыянераў не падтрымала. Так, у Мілашове мяцежнікі разагналі валасны Савет і запатрабавалі выдачы камуністаў, але атрымалі рашучы адпор і вымушаны былі пакінуць вёску. Аднак асноўныя пункты паўстання былі падаўлены толькі часцямі рэгулярнай Чырвонай Арміі 28 чэрвеня 1919 г., незадоўга да польскага наступлення на Савецкую Расію.

У пачатку выступлення кіраўнікі контррэвалюцыйнага мяцяжу пазбягалі антысавецкіх лозунгаў. Яны заклікалі: «Не трэба мабілізацыі!», што адпавядала інтарэсам беднаты. Але як толькі паўстанне набыло размах і кіраваць ім сталі польскія афіцэры, што прыбылі з-за лініі фронту, галоўнымі лозунгамі сталі «Далоў Саветы! Смерць камуністам!» Больш канкрэтнай праграмы ў «зялёных» не было. Яны лічылі, што ўсе сацыяльна-эканамічныя праблемы будуць вырашаны з уваходжаннем Беларусі ў склад Рэчы Паспалітай. Таму рады паўстанцаў хутка сталі радзець. Іх пачалі пакідаць нават дэзерціры. І толькі арганізатары мяцяжу з рэшткамі разбітых атрадаў паспрабавалі прарвацца праз лінію фронту.

Польская армія з наступленнем спазнілася, каб выкарыстаць у сваіх мэтах паўстанне.

І ўсё ж белапольская інтэрвенцыя пачалася. У павеце адразу было аб'яўлена ваеннае становішча. Валасныя выканкамы пачалі праводзіць запіс добраахвотнікаў — па 10—12 чалавек ад воласці. Была праведзена мабілізацыя чатырох узростаў сялян. У маі — чэрвені Дзісенская павятовая партарганізацыя накіравала на фронт 170 камуністаў. Паспяхова таксама праводзілася мабілізацыя камсамольцаў[4]. 17 мая была сфарміравана Дзісенская камуністычная баявая дружына з 93 чалавек пад камандаваннем салдата Паніжніка.

28 ліпеня яна прыняла першы бой пад в. Косевічы, у якім загінуў жыхар Дзісны Паўлоўскі. Увесь горад урачыста хаваў героя.

Але неўзабаве Дзісенскі павет, а ў яго складзе і Міёрская воласць былі акупіраваны белапалякамі. Для барацьбы з новымі захопнікамі ствараюць партызанскія атрады вядомыя чэкісты Ваупшасаў і Рабаў. Пры іх непасрэдным удзеле ў Вялікім Сяле (цяпер Шаркоўшчынскі р-н) быў створаны Дзісенскі атрад прыкладна з 30 байцоў пад камандаваннем Іларыёна Спірыдонавіча Малчанава. Ён загінуў восенню 1921 г. ад рукі правакатара дэфензівы Талочкі ля в. Лазоўнікі Міёрскай воласці. У радах партызан змагаліся жыхары Дзісны Валянцін Сяргееў, Васіль Дуброўскі, Пётр Ступель. Атрад здзейсніў некалькі паспяховых аперацый[5].

У чэрвені 1920 г. пачалося вызваленне Міёршчыны. 4 ліпеня артылерыя корпуса Г. Д. Гая вяла абстрэл маёнтка Дрыгучы, дзе былі ўмацаванні белапалякаў. Неўзабаве тут разгарэўся жорсткі бой. У час варожай контратакі пагеройску змагаліся артылерысты пад камандаваннем Станавога.

Спачатку белапалякі стрымлівалі парыў чырвонаармейцаў, але да 17 гадзін увесь 3-і корпус перайшоў у наступленне. Да 22 гадзін ён дасягнуў рубяжа Заходняя Дзвіна — в. Павяцце, прайшоўшы з баямі 25—28 кіламетраў.

Раніцай наступнага дня баі ўзнавіліся ля в. Сташулі, жорсткімі яны былі на берагах Вяты, аднак да змяркання чырвоныя коннікі Г. Д. Гая ўвайшлі ў Друю і Браслаў[6].

Насельніцтва Міёршчыны радасна сустракала вызваліцеляў. У вызваленых валасцях аднаўлялася савецкая ўлада. Дзісенскі павятовы рэўком яшчэ 7 ліпеня аб'явіў сябе вышэйшай уладай[7]. У звароце да насельніцтва ён заклікаў: «Таварышы! Вы цяпер пачынаеце ўмацоўваць рабоча-сялянскую ўладу ў Дзісенскім павеце. У вашы рукі пераходзяць усе багацці нашага павета. Бераж

Г. Д. Гай

І. Д. Лясовіч

жыце і ахоўвайце іх! Не давайце нікому раскрадаць і знішчаць тое, што створана стагоддзямі працай вашай і вашых продкаў».

У павеце прымаліся меры па ўмацаванні парадку, ішоў збор зброі ў насельніцтва, вялася барацьба са спекуляцыяй, самагонаварэннем, дэзерцірствам. Разгортваліся аднаўленчыя работы, адкрываліся школы. Зноў вёўся ўлік маёмасці маёнткаў і зямлі. Пад кіраўніцтвам Леаніда Іосіфавіча Ракоўскага, як расказвала газета «Чырвоны сцяг» за 7 чэрвеня 1957 г., пачаўся ўлік бібліятэк памешчыкаў, збор карцін, фамільных архіваў шляхты, былі сабраны тысячы рэдкіх выданняў.

«Известия» за 17 ліпеня 1920 г. паведамлялі: «Насельніцтва Дзісны ахвотна адгукнулася на заклік рэўкома і ахвяруе грошы і рэчы на карысць параненых чырвонаармейцаў. Розных рэчаў сабрана пакуль 800 штук; ахвяраванні працягваюць паступаць».

Павятовы рэўком намячае развіццё вытворчасці, якое было рэальна ў тых складаных умовах. Напрыклад, на пасяджэнні 31 жніўня вырашана пабудаваць у Дзісне плаціну і млын[8].

У Міёрах зноў быў створаны ваенна-рэвалюцыйны камітэт, старшынёй якога з'яўляўся Іван Давыдавіч Лясовіч, намеснікам — Іван Андрэевіч Нікалаёнак.

Аднак зрабіць паспелі няшмат. Па Рыжскаму дагавору 1921 г., папярэднія ўмовы якога былі падпісаны 12 кастрычніка 1920 г., Міёршчына ўвайшла ў склад Рэчы Паспалітай Польскай.

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 765. Воп. 1. Спр. 5. Л. 11, 12, 18.
[2] Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией (1919—1920 гг.). Мн., 1962. С. 60—61.
[3] Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі / Пад рэд. С. А. Умрэйкі. Мн., 1968. С. 279.
[4] Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией (1919—1920 гг.) С. 109.
[5] Ваупшасов С. А. На тревожных перекрестках. М., 1971. С. 48, 94.
[6] Сцяг працы. 1988. 26 лістап.
[7] Моргунский С. П. Создание и упрочение белорусской государственности. Мн., 1968. С. 181.
[8] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 8. Спр. 30. Л. 33.

Л. А. Матэленак

Дакументы сведчаць

З ДЫРЭКТЫВЫ КАМАНДАВАННЯ ЗАХОДНЯГА РАЁНА АБАРОНЫ АБ ЗАДАЧАХ У СУВЯЗІ З АДЫХОДАМ ГЕРМАНСКІХ ЧАСЦЕЙ

15 лістапада 1918 г.

№ 02, Смоленск — 22 час. 25 мин.

...Для предстоящего исполнения указанных задач приказывается:

А) Начдиву Псковской (2-й и 3-й районы пограничной охраны, 6 полков, 2 эскадрона бывшей Витебской дивизии и 8 орудий) — во вновь образуемой Двинской пограничной области, в состав которой включается часть Островского у., Псковской губ., к западу от демаркационной линии, Режицкий у., Двинский, часть Полоцкого у. до демаркационной линии Витебской губ., Свенцянский и Дисненский у. Виленской губ., направить:

...2) комбрига 2-й с подчиненными ему частями и четырьмя орудиями из района Великие Луки — Невель на Полоцк — Березино — Свенцяны, где по прибытии сформировать Свенцянский Военный Совет с подчинением ему Виленского, Свенцянского и Дисненского у. Виленской губ., и части Полоцкого у. Витебской губ., до демаркационной линии...

Расійскі дзяржаўны ваенны архіў. Ф. 6. Воп. 4. Спр. 47. Л. 203—208.

З ЗАГАДА ВОЙСКАМ ЗАХОДНЯЙ АРМІІ АБ ПРАЦЯГУ НАСТУПЛЕННЯ Ў БЕЛАРУСІ (З ТЭЛЕГРАФНАЙ СТУЖКІ)

12 снежня 1918 г.

№ 19/0, Смоленск — 13 час. 45 мин.

...Г) Главком Вацетис приказал Особой латышской группе (начгруппы Андреев) в составе готовых полков Интернациональной дивизии с приданными ей частями других родов оружия, 3-го Либавского и Саратовского латышских стрелковых полков, одной мартирной батареи и одним автоотрядом:

а) сосредоточившись в районе Дрисса, Дисна, Полоцк (управление группы временно Полоцк) и приняв броневой поезд № 5 и 2-й район 2-го округа пограничной охраны, сменить части Псковской дивизии в районе Якобштадт — Двинск...

Расійскі дзяржаўны ваенны архіў. Ф. 201. Воп. 3. Спр. 120. Л. 23—26.

РЭЗАЛЮЦЫЯ З'ЕЗДА ПРАДСТАЎНІКОЎ ВЯСКОВЫХ САВЕТАЎ МІЁРСКАЙ ВОЛ. ДЗІСЕНСКАГА ПАВ. АБ ПАДТРЫМЦЫ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ І КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ

25 лютага 1919 г.

Мы, представители деревенских объединенных Советов Миорской вол. на съезде 25 февраля 1919 г., заслушав тт. Горбаченко и Анисковича о деятельности советской власти и Коммунистической партии (большевиков) как исполнительных защитников беднейшего класса, клянемся честью поддерживать их всеми силами и средствами от всех посягательств наших вековечных врагов типа торгашей, кулаков и прочих паразитов-соглашателей, нашу защитницу Красную Армию, борцов за землю и волю трудящихся.

Да здравствует власть Советов всего мира!
Да здравствует Коммунистическая партия и ее вождь!
Да здравствует Красная социалистическая Армия!

Председатель Богович
Товарищ председателя Валявко
Секретарь Лясович

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 765. Воп. 1. Спр. 45. Л. 34.

Вызваленне Міёршчыны

Вызваленне Міёршчыны ад белапалякаў звязана з імем вядомага героя грамадзянскай вайны Г. Д. Гая, камандуючага 2-м конным Каўказскім корпусам. Па загаду Рэўваенсавета рэспублікі штаб корпуса быў накіраваны з Каўказскага фронту ў Смаленск у распараджэнне Камзаха (камандаванне Заходняга фронту). Там Г. Д. Гай атрымаў загад тэрмінова сфарміраваць у раёне Дзісны 3-і конны корпус і быць гатовым у пачатку ліпеня прарваць польскі фронт.

Вось як апісвае Г. Д. Гай у сваіх успамінах далейшыя падзеі:

— Для фарміравання корпуса ў раёне Дзісны, адпаведна загаду Камзаха, сцягваліся часці 10-й і 15-й кавалерыйскіх дывізій, але без тылоў і неабходных органаў. Прызнаюся, загад Камзаха спачатку мяне не вельмі абрадаваў. Справа ў тым, што на Каўказскім фронце ў складзе 2-га коннага корпуса было 4 дывізіі (каля 8 тыс. шабляў), а тут, на польскім фронце, супраць больш моцнага, узброенага і хітрага праціўніка мне далі 2 малалікія кавалерыйскія дывізіі (каля 4 тыс. шабляў) і без тылоў...

...Праз гадзіну эшалоны корпуса накіраваліся ў г. Полацк, куды прыбылі 24 чэрвеня 1920 г.

Не паспеўшы закончыць сваё фарміраванне, 3-і конны корпус да вечара 3 ліпеня размясціўся за правым флангам Заходняга фронту. Па маёй просьбе корпусу часова была прыдадзена 164-я стралковая брыгада. Усяго корпус меў у сваім складзе 4097 шабляў, 46 станковых кулямётаў і 20 гармат...

Для палітычнага забеспячэння нашага контрнаступлення вялікую работу правяла Кампартыя Літвы і Беларусі.

Прыступаючы да вызвалення зняволенай польскімі памешчыкамі Беларусі, РВС Заходняга фронту звярнуўся да працоўных з адозвай. І трэба сказаць, да гонару працоўных сялян Заходняй і Усходняй Беларусі, што яны ўсюды аказвалі нам поўнае садзеянне, нават у перыяд нашых няўдач і адступленняў...

У 7 гадзін раніцы 4 ліпеня малалікія, але імклівыя палкі 3-га коннага корпуса сканцэнтраваліся ля ўсходняй ваколіцы в. Забалацце, у 6 кіламетрах ад перадавой лініі фронту. З панскага двара Грыгаравічы (дзе быў палявы штаб корпуса) на аўтамабілі я паехаў да байцоў,

Схема пачатку паходу на Варшаву (з кнігі Ю. Пілсудскага «1920 год»)

каб выказаць ім пажаданні перад боем. Перасеўшы на каня, маю баявую «Ледзі», я ў суправаджэнні начальніка штаба корпуса т. Вілумсона і ардынарцаў пад'ехаў да палкоў корпуса, гучна вітаючы іх. Ліхія камдзівы Матузенка і Томін пастроілі свае часці для заслухоўвання загаду камандуючага Заходнім фронтам. Стаўшы ў сярэдзіне пастроенага карэ, я зачытаў загад:

«Чырвоныя салдаты, настаў час. Нашы войскі па ўсяму фронту пераходзяць у наступленне...

У наступленні ўдзельнічаюць палкі, якія разбілі Калчака, Дзянікіна, Юдзеніча. На абарону савецкай улады сабраліся байцы з усходу, поўдня, захаду і поўначы...»

Не паспеў я закончыць загад, як магутнае, незмаўкаемае «ўра» страсянула паветра, пераносячы яго раскаты да польскіх акопаў...

— Бух-бух, бух-бух,— адгукнулася артылерыя корпуса. Адпаведна з намечаным планам яна ўжо пачала падрыхтоўку...

Наша контрнаступленне пачалося...

Слова аб чырвоным кулямётчыку

Нарадзіўся Адам Ягоравіч Анашка ў в. Блажкі ў 1895 г. Як і ўсе аднавяскоўцы, яго бацька меў мала зямлі. Хлеба хапала толькі да вясны. Працавалі ад цямна да цямна. Але Адам вучыўся грамаце, скончыў Міёрскае народнае вучылішча. Калі выбухнула першая сусветная вайна, маладога хлопца накіравалі на будаўніцтва ўмацаванняў ля Ковенскай крэпасці.

У 1916 г. у час чарговай мабілізацыі А. Я. Анашка стаў салдатам. Як пісьменнага яго накіравалі вучыцца на кулямётчыка ў вядомую Араніенбаўмскую школу пад Петраградам. Тут малады салдат не толькі авалодваў зброяй, але асвойваў «палітыку». Сярод курсантаў было шмат палітычна падрыхтаваных і свядомых рабочых з Масквы і Петрограда. Яны неслі ў салдацкія масы праўду аб імперыялістычнай вайне. Аднак шпікі данеслі аб сходках, і 60 найбольш актыўных салдат былі раней тэрміну адпраўлены ў акопы. Сярод іх знаходзіўся і А. Я. Анашка. Яму давялося ўдзельнічаць у наступленні пад Цярнопалем, бачыць тысячы загінуўшых і пакалечаных.

Салдаты тады спявалі: «Брала руская брыгада галіцыйскія палі, а дасталіся мне ў награду два кляновыя кастылі». Не выпадкова і праз паўстагоддзе не мог без дрыжыкаў успамінаць ветэран затопленыя ледзяной вадой акопы, з якіх салдаты не выходзілі суткамі. Таму расло іх абурэнне супраць імперыялістычнай вайны. З радасцю сустрэлі на фронце вестку аб тым, што народ скінуў Мікалая Крывавага.

Але ж вайна працягвалася, салдаты гінулі ад куль, голаду і сцюжы. Моцнае здароўе было ў Адама Анашкі, аднак і яго зваліла цынга, адняліся ногі. Толькі па дарозе ўцёк з санітарнага цягніка, бо ведаў, што тыф можа не дазволіць даехаць да шпіталю. З цяжкасцю дабраўся да родных мясцін, дзе і дагнала яго вестка аб перамозе Кастрычніцкай рэвалюцыі.

А. Я. Анашка адным з першых у вёсцы распачаў агітацыю за савецкую ўладу. Дапамагае ён Міёрскаму валасному рэвалюцыйнаму камітэту размяркоўваць зямлю паноў Мірскіх. Але ў лютым 1918 года немцы занялі наш край. Толькі ў снежні прыйшло вызваленне. Тады пачалася мабілізацыя ў Чырвоную Армію. Адам Ягоравіч Анашка свядома запісаўся ў яе рады. Разам з ім пайшоў на фронт Віктар Суравец з Пад'ельцаў.

З Дзісны мабілізаваных накіравалі ў Віцебск, дзе фарміраваўся кавалерыйскі жалезны полк пад камандаваннем рэвалюцыянера-латыша Стаўкуса. Потым шлях скіраваў да Смаленска, дзе А. Я. Анашка зноў трапіў на курсы кулямётчыкаў. Пад кіраўніцтвам вопытных інструктараў авалодваў рознымі сістэмамі зброі. Да апошніх гадоў жыцця ўспамінаў ён англійскі кулямёт Льюіса, французскія Гочкіса і «Шоша». Толькі закончыць вучобу і тут не ўдалося. Школу чырвоных кулямётчыкаў тэрмінова накіравалі пад Магілёў супраць войск контррэвалюцыйнага генерала Доўбер-Мусніцкага.

Цяжкія былі тут баі. Белапольскія войскі мелі вялікую колькасную перавагу. Толькі з разгромам асноўных сіл контррэвалюцыі савецкі ўрад змог перакінуць больш войск на Заходні фронт. Былі сфарміраваны новыя арміі. Полк, у якім ваяваў А. Я. Анашка, увайшоў у 3-і корпус Г. Д. Гая. Давялося вызваляць яму свае родныя мясціны. Наступленне было настолькі імклівым, што толькі адну ноч пераначаваў чырвонаармеец у роднай хаце. Гэта здарылася ў пачатку ліпеня, а ў сярэдзіне жніўня

А. Я. Анашка (справа)

чырвоная конніца набліжалася да Варшавы. Але зноў чырвонаармейцам давялося аказацца пад ударамі пераўзыходзячых сіл праціўніка. Стомлены за час наступлення корпус Гая вымушаны быў адступіць. Для затрымкі белапалякаў стварыўся кулямётны эскадрон, у які ўвайшлі лепшыя кулямётчыкі. Пад каманду Вахрамеева ў эскадрон трапіў і наш зямляк. Яго задача: памерці, але затрымаць ворага. І вось на жменьку чырвоных байцоў імчыць конная лава польскіх уланаў. Адам Анашка на левым фланзе чакае каманду пачынаць стральбу. Нарэшце: «Агонь!» Нібы спатыкнулася конніца. Толькі і кулямёт замоўк, перакасіла ленту з патронамі.

І праз шмат гадоў сніўся А. Я. Анашку той момант, нанова перажываў ён напружанае імгненне. І зноў бачыў над сабой ашчэраную морду каня, пераможны аскал вусатага легіянера з высока занесенай шабляй.

Потым А. Я. Анашка ваюе ў 1-й Коннай арміі Будзённага, удзельнічае ў разгроме банд Махно, Антонава. Яшчэ шмат праехаў на сваёй тачанцы па баявых дарогах, змагаючыся за савецкую ўладу.

У 1921 г. А. Я. Анашка паехаў у адпачынак дадому, толькі тут ужо гаспадарылі ў адпаведнасці з Рыжскім дагаворам польскія паны. Давялося ўтойваць сваё чырвонаармейскае жыццё. Ды паліцыя аб нечым здагадвалася, бо не раз выклікала ў пастарунак і частавала гумавымі палкамі.

А потым Адам Ягоравіч выбіраўся старшынёй калгаса імя Сталіна, працаваў намеснікам старшыні сельгасарцелі, узначальваў будаўнічую брыгаду. Нават атрымліваючы пенсію, працягваў аказваць пасільную дапамогу гаспадарцы.

В. А. Ермалёнак

Сцяг працы. 1987. 12 верас.

Ветэран

Экзамены ў царкоўна-прыходскай школе Валодзя Мятла здаў на адны пяцёркі. Апрача пасведчання прынёс ён дамоў і пахвальны ліст.

Праз нейкі час бацькаву сядзібу наведаў настаўнік, які параіў аддаць хлопца вучыцца далей. Не хацелася Кандрашу Мятле адпускаць у людзі старэйшага сына, які быў яго першым памочнікам. Звязвала рукі і нястача. Сям'я налічвала 7 душ, пасля яна павялічылася яшчэ на двух едакоў. А ворнай зямлі было крыху больш трох дзесяцін. У Кадушках вучылі бясплатна, для далейшай вучобы патрэбны грошы, і немалыя — 20 рублёў у год. А гэта ні многа ні мала — кошт сялянскай каровы.

І ўсё ж бацькі вырашылі вучыць хлопца далей. Аддалі сына ў Язненскае двухкласнае вучылішча, а калі яно было закончана — у Дзісенскае гарадское вучылішча.

Але і тут вучоба закончана. І зноў выдатныя адзнакі, пахвальны ліст...

Уладзімір не стаў шукаць для сябе «інтэлігентнай» работы. Трэба дапамагаць сям'і. Валодзя араў поле, касіў лугі, сек дровы. Ён любіў нялёгкую працу хлебароба. Так прадаўжалася да 1917 г. Яшчэ да рэвалюцыі паступіў на двухгадовыя педагагічныя курсы, якія адкрыліся ў Дзісне, паспеў закончыць іх да нямецкага наступлення ў 1918 годзе. За два гады вучобы адбылося шмат важных падзей, а курсы, як ні дзіўна, дзейнічалі. І вось у кішэні юнака пасведчанне, у якім напісана, што Мятла Уладзімір Кандратавіч мае права працаваць настаўнікам пачатковых класаў. Але замест школы ён добраахвотна ўступіў у рады Чырвонай Арміі. З баямі адступаў, а восенню гнаў немцаў на захад. Пад канец 1919 г. у Дзісну прыйшлі новыя заваёўнікі — польскія легіянеры.

У маі 1920 г. з Чырвонай Арміяй Мятла ўвайшоў у Дзісну. Запомніў ён мітынг на вуліцы, што прылягае да гарадской бальніцы. Яе запоўнілі байцы Чырвонай Арміі, сяляне, гарадская беднята. Усе хацелі ведаць, што будзе далей. З балкона бальніцы выступаў легендарны Гай — камандзір корпуса чырвонай кавалерыі. Ён заклікаў усіх, хто не хоча заставацца пад панскім прыгнётам, уступаць у Чырвоную Армію. Чытаў свае новыя вершы Дзям'ян Бедны. Два радкі з тых вершаў Уладзімір Кандратавіч памятае да гэтага часу:

...Нашы пушачкі як загрохаюць,
А ў вокнах паны аж завохаюць...

Яшчэ гаварыў малады баец гадоў 17. Ён добраахвотна ўступіў у конны корпус Гая і заклікаў усіх, хто здольны насіць зброю, ісці ў Чырвоную Армію. Запомніў Уладзімір і прозвішча таго

юнака — Міхась Машара. Праз шмат гадоў Міхаіл Машара стаў вядомым беларускім пісьменнікам. Пасля заканчэння мітынгу Уладзімір пайшоў у родныя Чарапы, дапамог бацьку ўзараць шнур зямлі на глінішчы. Калі праз 3 дні вярнуўся ў сваю часць, прыняў удзел у баях за Дзісну.

Ваеннае шчасце хісткае. Давялося зноў адступаць пад Полацк. А ў ліпені пайшоў Уладзімір са сваёй часцю на захад. Удалося і да родных заскочыць. У жніўні ў летняй смузе ён убачыў званіцы варшаўскіх касцёлаў. Здавалася, што перамога блізкая. Але давялося зноў адступаць. Калі 20 сакавіка 1921 г. усе газеты надрукавалі тэкст Рыжскага мірнага дагавора, Уладзімір Кандратавіч даведаўся, што граніца дзвюх дзяржаў пралягла ў двухстах метрах на ўсход ад родных Чарапоў.

Рыжскі мірны дагавор даваў права кожнаму вярнуцца ў родныя мясціны. Уладзімір Кандратавіч не выкарыстаў гэтае права. Ён прадаўжаў служыць нейкі час у арміі, а ў 1924 г. паступіў на вышэйшыя курсы беларусазнаўства ў Мінску. Яны давалі права выкладаць беларускую літаратуру і мову ў сямігадовай школе. З гэтага часу Уладзімір Кандратавіч працуе дырэктарам сямігодкі на Полаччыне, дзіцячага дома на Быхаўшчыне, старшынёй акруговага праўлення прафсаюза настаўнікаў, загадчыкам райана і рэдактарам раённай газеты ў Лепелі, Барысаве, загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі райкама партыі. Прадаўжаў вучыцца на курсах марксізму-ленінізму ў Маскве, гістарычным факультэце інстытута ў Мінску. У 1941 г. закончыў завочна геаграфічны факультэт БДУ.

Летам 1940 г., праз 20 гадоў пасля апошняй пабыўкі, наведаў бацькоўскую старонку. Быў ён госцем не толькі родных братоў і сясцёр, але і ўсіх чарапоўцаў. Прыгадалі мінулае. Аднавяскоўцы пахваліліся Уладзіміру Кандратавічу, што яны ўжо члены першага ў Дзісенскім раёне калгаса «17 Верасня», што справы ў іх ідуць добра, што былыя беднякі сталі гаспадарамі свайго лёсу. Праз год, як абяцаў, да землякоў з'ездзіць не давялося, пачалася вайна.

На фронт Уладзіміра Кандратавіча не ўзялі. Эвакуіраваўся ў глыбокі тыл разам з сям'ёй. У Горкаўскай вобласці працаваў інспектарам райана, пасля — загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі райкама партыі.

У сакавіку 1943 г. яго накіравалі ў ЦК КПБ. Да 1950 г. працаваў загадчыкам аддзела культуры пры Савеце Міністраў БССР, а потым — у Міністэрстве асветы БССР начальнікам аддзела школ рабочай і сялянскай моладзі. Адначасова быў сакратаром партбюро міністэрства. На гэтай пасадзе многа зрабіў для паляпшэння навучання дарослай моладзі. З 1959 г. — персанальны пенсіянер рэспубліканскага значэння.

Але не такі чалавек Уладзімір Кандратавіч, каб бавіць час на рыбалцы. Ён брату свайму Ананію, які жыве ў калгасе імя Цітова нашага раёна, пісаў: «Няхай беспартыйныя цешацца адпачынкам. Члены партыі мабілізаваны на ўсё жыццё. Ёсць яшчэ порах у маёй парахаўніцы. Пакуль ёсць сілы, буду працаваць».

Радзіма высока ацаніла заслугі свайго сына. Ён узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга і чатырма медалямі «За доблесную працу».

В. І. Высоцкі

Сцяг працы. 1984. 24 студз.

Тыя далёкія дні

Даведка: па даных Цэнтральнага Дзяржаўнага архіва, С. А. Шаўлюга з'яўляўся ў 1919 годзе чырвонаармейцам 1-й роты 133-га Арлоўскага стралковага палка 15-й Арлоўскай стралковай дывізіі.

Семяон Аляксеевіч Шаўлюга нарадзіўся ў сялянскай сям'і ў вёсцы Калатушкава. Быў ён пятым дзіцём, а ўсяго меў адзінаццаць братоў і сясцёр. Тут,

у сваёй вёсцы, хадзіў у пачатковую школу, у якой былі 4 класы. Потым дапамагаў бацькам на зямлі. 15 мая 1916 г. прызвалі юнака на службу ў царскую армію. Першапачатковую ваенную падрыхтоўку атрымаў у Арле ў 178-й пяхотнай роце, у эстонскім гарадку Выру быў абмундзіраваны і пасля кароткага прыпынку ў Дзвінскай крэпасці трапіў у франтавую траншэйную каманду.

Траншэйная каманда. Яна абслугоўвала бамбамёты, мінамёты, двухдзюймавыя гарматы, з якіх стралялі па бронепаяздах. З маладым папаўненнем у яе ўліўся С. А. Шаўлюга восенню 1916 г. 142-і Звянігарадскі полк стрымліваў немцаў непадалёку ад Даўгаўпілса. Баі былі жорсткія. Каб стрымаць ворага, патрабавалася і мужнасць, і гераізм, і ўменне валодаць зброяй. Нават цяпер Семяон Аляксеевіч успамінае асабліва-

С. А. Шаўлюга (у цэнтры)

сці абслугоўвання тых мінамётаў, што стралялі 75-фунтовымі мінамі, бамбамётаў, якія разбуралі ўмацаванні, паражалі пяхоту, пускалі асвятляльныя ракеты ноччу. Не забыўся ён і пра японскія вінтоўкі, што выдавалі навабранцам, у цара-бацюшкі сваіх не хапала. Памятныя яму Чорныя і Залатыя Горкі — мясцовасць, дзе ваяваў.

Але не гэтымі падрабязнасцямі знамянальны той час і для Семяона Аляксеевіча, і для нашай краіны. На фронт вестка аб лютаўскай рэвалюцыі спазнілася на два тыдні. Радасна сустрэлі яе салдаты. Ды толькі для іх мала што змянілася. А галоўнае — працягвалася непатрэбная народу вайна. І рэвалюцыйныя салдаты прынялі рашэнне: «Фронт трымаць будзем, а наступаць — не!»

Каб узняць «патрыятычны» дух арміі, на фронт прыбыў Керанскі. Праехаў перад палкамі, што былі на адпачынку на другой лініі абароны, кланяўся з аўтамабіля салдатам налева і направа. Аднак гэтага аказалася мала. Тады нагналі казакоў, устаранілі «падрыўныя» элементы. Суседскі Мажайскі полк згадзіўся ісці ў атаку. А больш настойлівых звянігарадцаў выклікалі без зброі ў штаб і «прачасалі» гарматамі. Давялося і ім стаць памяркоўнымі, згаворлівымі.

Толькі не ўдалося тое наступленне, хаця рыхтаваліся да яго нібыта старанна, тэрмін пачатку пераносілі. Аказваецца, немцы аб усім ведалі, таксама рыхтаваліся, і яшчэ лепш.

Не выпадкова франтавікі з радасцю сустрэлі вестку аб Кастрычніцкай рэвалюцыі. Паслалі тэлеграму ў Піцер аб падтрымцы яе, аб гатоўнасці абараняць. Нават пачалі грузіцца ў эшалоны. Аднак іх умяшанне не спатрэбілася.

Такі паварот спраў не задаволіў афіцэраў. Яны пачалі ўцякаць з фронту. А часць, у якой служыў С. А. Шаўлюга, яшчэ стрымлівала немцаў, ахоўвала чыгунку пад Псковам і толькі потым вярнулася ў свае казармы ў Арле. Ішоў 1918 год.

Горад сустрэў настроеных па-рэвалюцыйнаму франтавікоў негасцінна.

— Начальнік гарнізона Суханосаў папракаў нас тым, што пакінулі фронт, — успамінае С. А. Шаўлюга, — тры дні не дазваляў разгрузіцца з эшалонаў і вярнуцца ў свае казармы. Але не за фронт ён турбаваўся. Пад яго кіраўніцтвам быў сфарміраваны атрад, гатовы выступіць супраць савецкай улады. Гэтым планам франтавікі маглі перашкодзіць.

І перашкодзілі. Калі намер выдаць салдатам жалаванне за некалькі месяцаў і распусціць іх па хатах не ўдаўся, казармы пачалі абстрэльваць. На салдат пусцілі бранявікі. Толькі франтавікі ўжо знаходзіліся пад агнём, напалохаць іх было не проста. Контррэвалюцыянеры вымушаны былі са стратамі адступіць, а на наступную раніцу рэвалюцыйныя франтавікі арыштавалі Суханосава. Вось тады ў памяшканні Кадзецкага корпуса Семяон Аляксеевіч пачуў словы, якія ўспамінае да гэтага часу: «Калі вы не падтрымаеце савецкую ўладу, то яна загіне!» Салдаты падтрымалі.

Арлоўскі полк праз Пензу скіраваўся да Волгі. С. А. Шаўлюга ўспамінае баі ля Казані, узяцце Сімбірска. Гэта адбылося 12 верасня войскамі пад камандаваннем М. Н. Тухачэўскага.

— Наступаць мы пачалі вечарам, — расказвае Семяон Аляксеевіч, — а раніцой на паравозе праімчалі праз Волгу, вартавыя позна спахапіліся.

Наступалі і адступалі, траплялі пад абстрэл бронепаяздоў белых. Усё было. Калі падышлі да Сызрані, яна ўжо была вызвалена. Тут пагрузіліся на параходы, узялі кірунак на Самару. Потым быў Бугуруслан, наступленне на Уфу.

На Паўднёвым фронце С. А. Шаўлюга аказаўся ў час самых напружаных баёў з войскамі Дзянікіна ў 1919 г. у час паходу белых армій на Маскву. І цяпер успамінаецца яму вёска Катухоўка пад Варонежам, станцыя Абрамаўка, ля якой занялі пазіцыі. Тут з раніцы павінны былі наступаць. Ударыла артылерыя, разгарнуліся ў ланцуг, і ў ранішнім паўзмроку сустрэліся з наступаючымі белякамі. Станцыю потым бралі трое сутак.

Яшчэ адзін населены пункт на варонежскай зямлі памятны Семяону Аляксеевічу. Гэта мястэчка Біруч. Тут чырвонаармейцаў, якія вырваліся з белагвардзейскага акружэння, ля невялікага мосціка праз рэчку насцігла мамантаўская кавалерыя. Жорсткім быў бой. З раніцы белыя рушылі ў атаку супраць чырвонаармейскага ланцуга, самым крайнім у якім быў С. А. Шаўлюга. Яму адразу не шанцавала. Адшпіліўся падсумак з патронамі, чаго раней ніколі не здаралася. А яшчэ праз некалькі мінут ён быў цяжка паранены.

Яго даставілі ў шпіталь. Аднак параненых было шмат, а медыкаментаў мала. Таму тыя, хто мог рухацца, выратылі вярнуцца да сваіх казарм у горадзе Арле. Толькі ажыццявіць задуму не ўдалося. Арол сустрэў іх калючым дротам, за якім хаваліся белыя. Гэты горад войскі Дзянікіна займалі з 13 па 20 кастрычніка 1919 г.

Па сутнасці на гэтым вайна для С. А. Шаўлюгі закончылася. Ён праз Віцебск падаўся ў родныя мясціны. Толькі Дзвіна ўжо стала граніцай. Яе давялося пераходзіць нелегальна.

Л. А. Матэленак

Сцяг працы. 1988. 7 студз.

Дакументы сведчаць

УКАЗ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЯТОВАГА РЭЎКОМА АБ АДНАЎЛЕННІ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў ПАВЕЦЕ

7 ліпеня 1920 г.

Мощным ударом Красной Армии Дисненский уезд вновь освобождается от ига белопольских банд. Всюду в волостях войтов, слуг польской буржуазии, сменяют красные Революционные комитеты, основной задачей которых является организация власти на местах и помощь Красной Армии. Устанавливается власть рабоче-крестьянская, власть трудового народа. Все законы, изданные белополяками и их чиновниками, отменяются.

Всякие ограничения в правах трудящихся того или иного вероисповедания, национальности и пола отменяются. Все школы открываются для приема в них детей трудящихся. Обучение вводится бесплатное. Государство берет на себя воспитание подрастающего поколения.

Трудящиеся Дисненского уезда!

Красная Армия на своих штыках несет вам полное освобождение из-под ига панов.

Помочь Красной Армии в этом — вот задача, стоящая перед вами!

Все контрреволюционные силы должны быть уничтожены. Арестовывайте помещиков и их слуг-прихлебателей, помогавших им в удушении трудящихся. Никто из них не должен скрыться. Всех препровождайте в Ревком.

Товарищи! Вы сейчас приступаете к укреплению рабоче-крестьянской власти в Дисненском уезде. В ваши руки сейчас переходит все богатство нашего уезда. Берегите и охраняйте его. Не давайте никому расхищать и уничтожать то, что создано веками трудом вашим и ваших предков.

Соблюдайте приказы Революционных комитетов. Всякий, не исполняющий приказов Революционного комитета, является врагом народа.

Трудящиеся Дисненского уезда!

Дисненский уездревком призывает вас всех встать грудью за дело советской власти, власти трудового народа.

Вперед на борьбу с панами!

Смерть панам-дармоедам, врагам советской власти!

Да здравствует советская власть!

Да здравствует Красная Армия, освободительница Дисненского уезда из-под сапога польской панщины!

Примечание. Дисненский уезд был освобожден в мае 1920 г. частями XV армии в период майско-июньского наступления. К началу июля 1920 г. значительная часть уезда была вновь оккупирована белопольскими войсками.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 8. Воп. 1. Адз. зах. 30. Л. 23.

УКАЗ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЯТОВАГА РЭЎКОМА АБ ПАРАДКУ ПРАВЯДЗЕННЯ ВОБЫСКАЎ

9 верасня 1920 г.

По имеющимся в уездревкоме сведениям, некоторые учреждения и лица производят неправильно, зачастую без достаточных оснований, обыски. При обысках конфискуются предметы, не подлежащие ни конфискации, ни реквизиции и даже временному держанию. В целях устранения такого беспорядка уездный Революционный комитет приказывает:

1) Обыски могут быть призведены лишь в тех случаях, когда для этого имеются основания.

2) При обысках строго воспрещается забирать вещи, не подлежащие по закону изъятию.

3) В местечках и деревнях обыски могут производиться лишь в присутствии председателя сельского Совета или его заместителя и члена той семьи, где производится обыск, а за отсутствием такового приглашаются свидетели.

В городе обыск производится по разрешению отдела управления уездревкома.

Дзяржаўны архіў Маладзечанскай вобл. Ф. 442. Воп. 1. Адз. зах. 83. Л. 26.

ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ДАПАМОЗЕ МОЛАДЗІ В. КОСТЫКА ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА ДЗЕЮЧЫМ ЧАСЦЯМ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

21 чэрвеня 1920 г.

При занятии дер. Костыко Дисненского уезда местная молодежь соорганизовалась и попросила оружия, чтобы идти вместе с красноармейцами в разведку. Прекрасно знакомая со всеми окрестностями, красная молодежь оказала большое содействие Красной Армии при преследовании панских войск.

Факел. 1920. № 25 (177).

ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ РАШЭННІ АГУЛЬНАГА СХОДУ СЯЛЯН ЯЗНЕНСКАЙ ВОЛ. ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА АБ АКАЗАННІ ДАПАМОГІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

9 ліпеня 1920 г.

Общий сход крестьян недавно освобожденной от белых Язненской вол. Дисненского уезда приветствует Красную Армию, освободившую Белоруссию от грабежа и насилий польской шляхты. Сход постановил: отдать все силы и все свое достояние Рабоче-Крестьянской Красной Армии. Сознавая тяжелое положение транспорта, крестьяне отдают и будут отдавать свои подводы и рабочую силу красному фронту. Дезертиры фронта и труда объявляются злейшими врагами крестьянства, которым нет места среди честных тружеников свободной России.

Факел. 1920. № 28 (181).

ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ АКАЗАННІ ДАПАМОГІ РАНЕНЫМ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАМ НАСЕЛЬНІЦТВАМ Г. ДЗІСНЫ

14 ліпеня 1920 г.

Население Дисны охотно откликнулось на призыв волостного Ревкома и жертвует деньги и вещи в пользу раненых красноармейцев. Разных вещей собрано пока 800 шт.; пожертвования продолжают поступать.

Известия ВЦИК. 1920. № 156 (1003).

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЯТОВАГА РЭЎКОМА

31 жніўня 1920 г.

...Слушали: Доклад экономотдела от 25 сего августа о постройке плотины и турбинного двигателя для электрической станции, лесопилки и мельницы.

Постановили: Представленный доклад утвердить, поручив экономотделу приступить к осуществлению намеченного плана работы, представив предварительно уревкому подробный план намеченных работ...

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 8. Воп. 1. Адз. зах. 30. Л. 33.

УКАЗ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЯТОВАГА РЭЎКОМА АБ МЕРАХ ПА АХОВЕ ПАГАЛОЎЯ РАГАТАГА СТАТКА

28 жніўня 1920 г.

Доводя до сведения всех граждан города и уезда, что за 6-летнюю войну и неоднократные оккупации уезда немецкими и белопольскими войсками в Дисненском уезде уничтожено более 75 % рогатого скота, в целях ограждения такового от дальнейшего истребления и в интересах поднятия народного хозяйства уездный Революционный комитет приказывает:

1. С сего числа убой рогатого скота кем бы то ни было без разрешения уездпродкома воспрещается.

2. Всякого рода разрешения, кем бы то ни было выданны(е) до сего времени на право убоя скота, считаются недействительными.

3. Покупка и продажа рогатого скота, а также лошадей кем бы то ни было допускается лишь по разрешению: в городах — уездземотдела, а в волостях — волземотдела, которые ведут точный учет всему скоту.

Настоящий приказ входит в силу со дня его опубликования.

За нарушение сего приказа виновные будут предаваться суду.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 8. Воп. 1. Адз. зах. 30. Л. 35.

Удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны

ДВАРНАСЕЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АРОЛ Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1898 г. у в. Дворнае Сяло. Удзельнік Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Загінуў у 1944 г.

ДЗЕМІДЗЁНАК Фама Васільевіч, н. у 1891 г. у в. Дворнае Сяло. Удзельнічаў у штурме Зімняга палаца, удзельнік грамадзянскай вайны. Памёр у 1974 г.

КАНАХ Дзмітрый Сцяпанавіч, н. у 1885г. у в. Дворнае Сяло. Удзельнічаў у штурме Зімняга палаца. Памёр у 1981 г.

КЛІМЕНЦЬЕЎ Апанас Емяльянавіч, н. у 1895 г. у в. Селішча. Удзельнік грамадзянскай вайны, ваяваў у складзе 3930-га Дзвінскага стралковага палка на Украіне ў 1919 г.

МАЦЮК Захар Ігнатавіч, н. у 1891 г. у в. Дворнае Сяло. Удзельнік Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Памёр у 1981 г.

ГОРАД ДЗІСНА

ПАНІЖНІК Даніла Рыгоравіч. Удзельнік грамадзянскай вайны. Загінуў.

ПАРАДНЯ Пётр Герасімавіч, н. у 1898 г. Удзельнічаў у грамадзянскай вайне з 1918 па 1920 г.

ПАЎЛОЎСКІ Уладзімір Паўлавіч, н. у 1888 г. Удзельнік грамадзянскай вайны з 1918 па 1919 г. Загінуў у 1919 г.

ПУГАЧЭЎСКІ Іосіф Іванавіч. Удзельнік грамадзянскай вайны.

ЗАВУЦЦЕЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АКАЧОНАК Іван Васільевіч, н. у 1890 г. у в. Барсукі, беспартыйны. У 1915—1917 гг. удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Маскве. Арганізатар першых калгасаў, былы старшыня Міцкаўскага, Зябкаўскага сельскіх Саветаў.

АЛЯШКЕВІЧ Аркадзь Яўстаф'евіч, н. у в. Кухцінцы. Удзельнік грамадзянскай вайны, камандзір роты пяхотных войск. Памёр у 1982 г.

БАХІР Фядора Андрэеўна, н. у 1896 г. у в. Кісялі. Прымала ўдзел у рэвалюцыйных падзеях у Петраградзе.

ВЫСОЦКІ Мірон Еўдакімавіч, н. у 1885 г. у в. Коўзаны. Служыў у 141-м стралковым Мажайскім палку (1915—1918). Памёр у 1974 г.

КАСАТЫ Аляксей Міронавіч, н. у 1895 г. Удзельнік грамадзянскай вайны.

КАСАТЫ Мікалай Іванавіч, н. у 1894 г. у в. Касатыя. Удзельнік грамадзянскай вайны.

КІСЕЛЬ Сяргей Антонавіч, н. у 1896 г. у в. Кісялі, беспартыйны, радавы. У 1918 г. добраахвотнікам пайшоў на фронт. Запісаўся ў Дзісенскім камісарыяце ў 25-ы полк, які фарміраваўся ў Віцебску. Удзельнічаў у разгроме банды Булак-Балаховіча, змагаўся з белагвардзейцамі да 1919 г.

КІСЕЛЬ Якаў Антонавіч, н. у 1896 г. у в. Вялікае Завуцце. Удзельнік грамадзянскай вайны. Загінуў.

МАКРЫЦКІ Пётр Паўлавіч, н. у 1894 г. у в. Шніткі. У 1917 — 1918 гг. удзельнічаў у грамадзянскай вайне на Украіне, змагаўся з пятлю-

Ф. В. і М. В. Дземідзёнкі

раўцамі. У гады Вялікай Айчыннай вайны дапамагаў партызанам.

МЫСЛІВЕЦ Мацвей Рыгоравіч, н. у 1896 г. у в. Мысліўцы. Жыў у Маскве. Член РКП(б). Загінуў у 1919 г. пад Беластокам.

МЯТЛА Кірыл Данілавіч, н. у 1918 г. у в. Мётлы, беспартыйны, добраахвотнік 60-й асобнай роты сувязі, тэлефаніст, працаваў у Дзісне лінейным майстрам.

МЯТЛА Мікалай Іванавіч, н. у 1894 г. у в. Малінаўка. Удзельнік рэвалюцыйных падзей у Петраградзе ў 1917 г. Член КПСС. Да Вялікай Айчыннай вайны старшыня Прасёлкаўскага сельскага Савета. Расстраляны немцамі ў ліпені 1941 г.

СЯМЧОНАК Сяргей Антонавіч, н. у 1890 г. у в. Дубрава, радавы, беспартыйны. Удзельнік першай сусветнай і грамадзянскай войнаў.

ШАЎЛЮГА Семяон Аляксеевіч, н. у 1897 г. у в. Калатушкава. Удзельнік першай сусветнай вайны, радавы траншэйнай каманды 142-га Звяніградскага палка. У 1918—1919 гг. чырвонаармеец 1-й роты 133-га Арлоўскага стралковага палка 15-й Арлоўскай дывізіі. Удзельнічаў у баях на Усходнім і Паўднёвым франтах. Памёр.

МІКАЛАЁЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АЎСЮК Марк Іванавіч, н. у 1899 г. у в. Сакалова. Удзельнік грамадзянскай вайны. Памёр у 1975 г.

БЕЛАЗОРЧЫК Уладзімір Іванавіч. Удзельнік грамадзянскай вайны. Памёр у 1972 г.

ЗАБЛОЦКІ Сідар Міхайлавіч, н. у 1890 г. у в. Навінцы. Удзельнік грамадзянскай вайны.

КАПЦЮГ Васіль Багданавіч, н. у 1904 г. у в. Усце. Удзельнік грамадзянскай вайны, ваяваў у складзе 71-га пяхотнага палка. Удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне ў складзе 3-га пяхотнага палка Войска Польскага.

КРАСЬКО Антон Канстанцінавіч, н. у 1898 г. у в. Паплавы. Удзельнік грамадзянскай вайны. Памёр у 1975 г.

МІШУТА Антон Давыдавіч, н. у 1903 г. у в. Ліпаціна. Удзельнік грамадзянскай вайны.

СТРУЙ Пётр Іванавіч, н. у 1900 г. у в. Сакалова. Удзельнік грамадзянскай вайны. У Вялікую Айчынную вайну працаваў на адным з уральскіх заводаў. Памёр у 1975 г.

НОВАПАГОСЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

АНДРУКОВІЧ Іван Іванавіч, н. у 1890 г. Удзельнік рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, ваяваў у раёне Петраграда. Памёр у 1966 г.

ГАЛІНСКІ Павел Вікенцьевіч, н. у 1895 г. Удзельнік грамадзянскай вайны, радавы. Памёр.

ДАРГЕЛЬ Казімір Казіміравіч, н. у 1879 г. у в. Дворышча, беспартыйны. Удзельнік рэвалюцыі. Памёр у 1980 г.

ДАРГЕЛЬ Рыгор Феліксавіч, н. у 1894 г. Удзельнік рэвалюцыі. Памёр у 1978 г.

ІВАНОЎ Тарас Дзмітрыевіч, н. у 1891 г. у в. Крукаўшчына. Удзельнік грамадзянскай вайны. Памёр у 1950 г.

КАЗАК Фёдар Карлавіч, н. у 1990 г. у в. Падазер'е, беспартыйны. Удзельнік грамадзянскай вайны, радавы.

КРУМІН Браніслаў Антонавіч, н. у 1899 г. Удзельнік грамадзянскай вайны.

КУКУЦЬ Андрэй Юльянавіч, н. у 1893 г. у в. Белеўцы, беспартыйны. Удзельнік грамадзянскай вайны. Памёр у 1973 г.

КУКУЦЬ Віктар Юльянавіч, н. у 1895 г. у в. Белеўцы, беспартыйны. Удзельнік грамадзянскай вайны. Памёр у 1949 г.

КУКУЦЬ Уладзімір Юльянавіч, н. у 1897 г. у в. Белеўцы. Удзельнік грамадзянскай вайны. Памёр у 1975 г.

Група франтавікоў першай сусветнай вайны. Сярод іх ураджэнец Міёршчыны І. Вялічка

ПУГАЎКА Фёдар Рафаілавіч, н. у 1899 г. у вёсцы Пагнойнікі, член КПСС. Удзельнік грамадзянскай вайны, радавы.

СІВІЦКІ Бернард. Удзельнік рэвалюцыі. Загінуў у 1918 г.

ЦІТОВІЧ Захарый Ігнатавіч, н. у 1902 г. у в. Новы Пагост. У складзе 267-га пяхотнага палка змагаўся супраць Калчака, ваяваў на Паўднёвым фронце супраць Урангеля, 1-я разведвальная каманда 268-га горнастралковага палка. Прызваны ў артылерыю ў 1944 г., з баямі дайшоў да Эльбы. Памёр у 1990 г.

ПАВЯЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

АЎСЮК Браніслаў Іосіфавіч, н. у 1897 г. у в. Зубрава. Удзельнічаў у грамадзянскай вайне, радавы. Памёр у 1972 г.

ГРЖДА Ігнат Аўгусцінавіч, н. у 1893 г. у в. Пацева. Удзельнік грамадзянскай вайны. Памёр.

ЗАХАРЭНЬ Сцяпан Іванавіч. Удзельнік рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. Памёр у 1975 г.

КАСНАРЭВІЧ Фелікс Францавіч, н. у в. Пацева. Удзельнік грамадзянскай вайны, радавы.

З. І. Цітовіч

РУБАНІК Іосіф Аляксандравіч, н. у 1888 г. у в. Дубаўка. Удзельнік грамадзянскай вайны. Памёр у 1978 г.

РУБАНІК Фёдар Іванавіч, н. у 1898 г. у в. Казакова. Удзельнік грамадзянскай вайны.

ФЕДУКОВІЧ Станіслаў Антонавіч, н. у 1898 г. у в. Павяцце. Удзельнік грамадзянскай вайны. Памёр у 1970 г.

ПЕРАБРОДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АЛЬХІМОВІЧ Антон Андрэевіч, н. у 1896 г. у в. Фядосаўшчына, беспартыйны. Удзельнік рэвалюцыі. Працаваў у лясніцтве. Памёр у 1964 г.

БАРАН Іосіф Іосіфавіч, н. у 1891 г. у в. Дзедзіна. Удзельнік грамадзянскай вайны. Памёр у 1974 г.

БАТУРА Сімон Мартынавіч, н. у 1897 г. у в. Вераб'ёва. У 1916—1919 гг. ваяваў на Украіне, сяржант.

БЛАЖЭНКА Сцяпан Альфонсавіч, н. у 1896 г. у в. Лебедзева, беспартыйны. Удзельнік грамадзянскай вайны ў 1918—1921 гг. Заходні фронт пад Рыгай, сяржант.

ГАРАДЗЕЦКІ Антон Антонавіч, н. у 1895 г. у в. Лебедзева. Удзельнік грамадзянскай вайны.

КАРЦЯНОВІЧ Леанід Віктаравіч, н. у 1895 г. у в. Перабродцзе, беспартыйны. У складзе 28-га стралковага палка 4-й дывізіі ўдзельнічаў у грамадзянскай вайне да 1921 г. У 1939 г. выбраны дэпутатам Народнага сходу ў г. Беластоку. Працаваў старшынёй, сакратаром Муражанскага сельскага Савета Браслаўскага раёна. Памёр у 1963 г.

КАРЦЯНОВІЧ Сцяпан Іванавіч, н. у 1894 г. у в. Перабродцзе. Удзельнік рэвалюцыйнага руху. Памёр у 1978 г.

ЛАБУНЬКА Адам Андрэевіч, н. у 1894 г. у в. Вераб'ёва. Удзельнік грамадзянскай вайны.

ЛАБУНЬКА Іван Андрэевіч, н. у 1890 г. у в. Вераб'ёва. Удзельнік грамадзянскай вайны.

ЛЯСОВІЧ Іван Давыдавіч, н. у 1892 г. у в. Гентава. Удзельнік рэвалюцыйных баёў у Петраградзе.

НАВІЧОНАК Іван Пятровіч, н. у 1890 г. у в. Падзявы, беспартыйны. Удзельнік грамадзянскай вайны. Ваяваў на Украіне ў складзе 148-га палка. Памёр у 1969 г.

РАДЗШЭВІЧ Уладзімір Пятровіч, н. у 1895 г. у в. Апанасёнкі. Удзельнік грамадзянскай вайны.

РУБАНІК Ілля Міхайлавіч, н. у 1896 г. у в. Крычава, член КПСС. Удзельнік грамадзянскай вайны.

СІПОВІЧ Рафаіл Саламонавіч, н. у в. Дзедзіна. Удзельнік грамадзянскай вайны.

СТАШУЛЁНАК Марыя Станіславаўна, н. у 1899 г. у в. Фядосаўшчына. Удзельніца рэвалюцыйнага руху, бачыла У. І. Леніна. Беспартыйная.

ТУРЗЁНАК Антон Рыгоравіч, н. у 1895 г. у в. Дзедзіна. Удзельнік грамадзянскай вайны на тэрыторыі Екацярынаслаўскай губерні.

ЯШКАЎ Іван Савельевіч, н. у 1896 г. у в. Петкуны, беспартыйны. Удзельнік рэвалюцыйнага руху 1905—1917 гг., прымаў удзел у штурме Зімняга палаца ў складзе 134-га стралковага палка, бачыў У. І. Леніна. Памёр у 1965 г.

ТУРКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАРКОЎСКІ Уладзімір Дзмітрыевіч, н. у 1898 г. у в. Вулышчына. Удзельнік грамадзянскай вайны.

ГЛЕБКА Пётр Маркавіч, н. у 1886 г. у в. Дворышча. Удзельнічаў у вайне з белапалякамі.

ДЗЯМЕШКА Кліменцій Сямёнавіч, н. у 1897 г. у в. Траскуны, беспартыйны. Удзельнічаў у грамадзянскай вайне з 1919 па 1922 г. у складзе 5-га стралковага пяхотнага палка. Працаваў у ЧК г. Магілёва.

ДАБРАВОЛЬСКІ Ігнат Іосіфавіч, н. у 1891 г. у в. Рыжмонты. Ваяваў у складзе Чырвонай Арміі з ліпеня 1918 г. Удзельнічаў у разгроме банды Булак-Балаховіча пад Нарвай.

ЗАЗНОЎ Віктар Рыгоравіч, н. у 1897 г. у в. Верашчакі. Удзельнічаў у баях з белапалякамі.

КАРАВАЙ Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1899 г. у в. Цімошкава. Ваяваў супраць белапалякаў у складзе 28-га палка 4-й стралковай дывізіі 1-й коннай арміі Будзённага, радавы.

ЛЮДСКІ Антон Антонавіч, н. у 1891 г. у в. Цімошкава, беспартыйны. З 1918 г. знаходзіўся ў Чырвонай Арміі ў складзе 703-га Сібірскага палка, радавы. З 1919 г. служыў на браняпоездзе № 36 імя У. І. Леніна, у 1920 ваяваў на Каўказе.

ПАРШУТА Васіль Аляксандравіч, н. у 1897 г. у в. Цімошкава. У 1920—1921 гг. служыў у 1-й коннай арміі Будзённага, прымаў удзел у разгроме банд Махно і Пятлюры.

ПАТРЫМАЙЛА Аляксандр Кузьміч, н. у 1892 г. у в. Гаравыя. Ваяваў у складзе Чырвонай Арміі супраць Дзянікіна і з белапалякамі.

ПУЧКОЎСКІ Уладзімір Ігнатавіч, н. у 1898 г. у в. Гараўцы. У 1918 г. служыў у Першым Яраслаўскім сацыялістычным добраахвотным палку, удзельнічаў у ліквідацыі банды Пярхурава, у баях з белапалякамі ў складзе 3-га лёгкага артылерыйскага дывізіёна.

ШАМШУР Андрэй Андрэевіч, н. у 1898 г. у в. Юркаўшчына. Удзельнік грамадзянскай вайны. Загінуў у 1943 г.

ШКЯЛЁНАК Аляксандр Іванавіч, н. у 1897 г. у в. Хоцькава. У 1918 г. пайшоў добраахвотнікам у Чырвоную Армію, удзельнічаў у баях супраць белапалякаў у складзе 464-га пяхотнага палка пад г. Слонімам.

ШКЯЛЁНАК Уладзімір Фёдаравіч, н. у 1888 г. у в. Пякоціна. У 1917 г. быў у Чырвонай гвардыі ў Петраградзе. Служыў на браняпоездзе, удзельнічаў ва ўзяцці Чырвонай Горкі, у баях з белапалякамі ў складзе 96-га стралковага палка.

ШУЛЬГА Іосіф Фаміч, н. у 1897 г. у в. Пруды. Ваяваў з белапалякамі ў складзе Чырвонай Арміі.

ШЭНДА Пётр Маркавіч, н. у 1896 г. у вёсцы Рыжмонты. З 1918 г. ваяваў у складзе 28-й дывізіі Чырвонай Арміі, удзельнічаў у барацьбе супраць Калчака і Урангеля, браў Перм і іншыя гарады.

ЯНУШОНАК Якаў Купрыянавіч, н. у 1899 г. у в. Цімошкава. З 1920 г. ваяваў з Урангелем у Крыме, белапалякамі, у 1922 г. удзельнічаў у разгроме банд ва Узбекістане.

ЯЗНЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

КАБЯК Пётр Ігнатавіч, н. у 1898 г. у в. Субачава. Удзельнік грамадзянскай вайны. Памёр у 1979 г.

КАРАСЬ Карп Васільевіч, н. у в. Карасі. Удзельнік грамадзянскай вайны.

МЯТЛА Павел Сцяпанавіч, н. у 1902 г. у в. Амбросенкі. Удзельнік грамадзянскай вайны.

ТАРАРАКА Вікенцій Сцяпанавіч, н. у 1902 г. у в. Чаркасава. Удзельнік грамадзянскай вайны.

З ГІСТОРЫІ ПОЛЬСКАЙ АКУПАЦЫІ

У 1921 г. пасля заключэння Рыжскага дагавора тэрыторыя Міёршчыны і Дзісеншчыны адышла да Польшчы. Мір прыйшоў на разбураную, абяднелую зямлю. Мір няўстойлівы, трывожны. У час рэвалюцыі і грамадзянскай вайны большасць мясцовага насельніцтва падтрымлівала савецкую ўладу. Натуральна, што пасля акупацыі яно не толькі пасіўна супраціўлялася захопнікам. Яшчэ восенню 1920 г. на Дзісеншчыне падпольная паўстанцкая група Іларыёна Малчанава зрабіла некалькі налётаў на польскія войскі. Падпольшчыкі пад кіраўніцтвам С. А. Ваупшасава расшыралі нелегальную сетку. Былі ў іх аднадумцы і ў Міёрах. Да мая 1921 г. моцная, добра заканспірыраваная група сфарміравалася ў Дзісне. Сувязь з ёю падтрымлівалася праз дачку ўладальніка маёнтка Аўласы Аксану. Падпольшчыкі распаўсюджвалі лістоўкі, збіралі зброю.

У нелегальных умовах працягвалі дзейнічаць ячэйкі камуністаў і камсамольцаў. Дзісенскія камсамольцы паслалі сваіх дэлегатаў праз лінію фронту на першы з'езд камсамола Беларусі, што праходзіў у верасні 1920 г.

У першыя гады акупацыі партызаны пад кіраўніцтвам бальшавікоў спалілі на Дзісеншчыне дзесяць панскіх маёнткаў. Нават у маі 1929 г. тут працягваюць узнікаць баявыя падпольныя групы, у склад якіх уваходзілі В. Сяргееў, В. Дубровскі, П. Ступель, І. Арцімёнак і інш. За рэвалюцыйную дзейнасць неаднаразова арыштоўваліся дзісенцы Макоўнік, Лапіцкі, Маняк, Атрахімовіч. У дні рэвалюцыйных свят падпольная група КПЗБ у складзе Грыцкевіча, Шульмана, Тумаркіна і іншых вывешвала ў горадзе чырвоныя сцягі.

Дух супраціўлення трымаўся гадамі. Гэтаму садзейнічала антынародная каланізатарская эканамічная, нацыянальная і сацыяльная палітыка ўлад панскай Польшчы. У параўнанні з даваенным часам на Міёршчыне пагалоўе буйной рагатай жывёлы паменшылася на 24,9 %, коней — на 11,2, свіней — на 12,9, авечак — на 35,7 %. Сярэдні ўраджай азімага жыта нават у 1925/26 сельскагаспадарчым годзе быў толькі 4,6 ц з гектара, да вайны збор зерня з гектара пасеваў складаў 7 ц.

Польскія ж улады ў адпаведнасці з законам ад 17 красавіка 1920 г. «Аб надзяленні зямлёй салдат польскай арміі, якія асабліва вызначыліся ў вайне супраць Савецкай Расіі» толькі на дзісенскім участку граніцы стварылі 197 асадніцкіх хутароў. У далейшым гэты працэс быў замацаваны «Законам аб парцэляцыі і асадніцтве», прынятым у ліпені 1925 г. Акрамя таго, праводзіцца хутарызацыя (камасацыя) і распродаж памешчыцкіх земляў (парцэляцыя). Такім чынам, быў узяты курс на раскол сялянства і ўмацаванне кулака. У выніку з 1923 па 1938 г. на Віленшчыне 43 % сялянскіх гаспадарак выдзелены на хутары. А штотыднёвік «Самапомач» рабіў у пачатку 1937 г. прагноз, што ў бліжэйшыя гады чакаецца пераход на хутары ў Браслаўскім павеце 141 вёскі, якія мелі 27 728 га

зямлі і 3756 гаспадарак, у Дзісенскім — 100 вёсак (23 400 га і 3457 гаспадарак).

Аднаўленне гаспадаркі ішло марудна. У 1929 г. войт Язненскай гміны паведамляў, што каля 70 % насельніцтва ў сувязі з неўраджаем не мае чаго есці. І такое было не вельмі рэдкай з'явай. Напрыклад, 23 лютага 1934 г. газета «Родны край» пісала, што ў сялян Дзісенскага і суседніх паветаў няма ні хлеба, ні бульбы, ні круп. Ад голаду ў людзей з'яўляецца галавакружэнне, усё часцей сустракаюцца выпадкі, калі людзі пухнуць з голаду, распаўсюджваюцца эпідэмічныя хваробы.

Становішча пагаршалася «ножніцамі» цэн на сельскагаспадарчую і прамысловую прадукцыю, шматлікімі падаткамі. Не выпадкова сяляне эмігрыравалі у больш развітыя капіталістычныя краіны.

У цяжкіх матэрыяльных умовах з-за адсутнасці работы знаходзілася насельніцтва Дзісны, дзе колькасць жыхароў скарачалася і ў 1931 г. складала толькі 4806 чалавек. Усё ж гэты прыгранічны горад заставаўся даволі значным цэнтрам закупак і паставак на знешні рынак ільновалакна, яек, як і Міёры.

Наш раённы цэнтр у 20-я гады — гэта мястэчка, якое амаль не развівалася ў эканамічных і культурных адносінах. У 1927 г. тут жылі 422 жыхары. Іх патрэбы задавальнялі пяць прыватных магазінаў-лавак, млын, аптэчны склад. У Міёрскай гміне ў гэты час былі 42 панскія маёнткі, у Лявонпальскай — 33. У будучым райцэнтры ў пачатку 30-х гадоў купец Агенштат пабудаваў «фабрыку» запалкавай саломкі. Аб маштабах прадпрыемства можна меркаваць хаця б па тым, што цяпер гэты будынак — толькі адно з памяшканняў лесамэблевага цэха камбіната бытавога абслугоўвання.

Вядома, будаўніцтва той «фабрыкі» было не адзінай мясцовай ініцыятывай. Дзісенскі магістрат прапанаваў пабудаваць чыгунку Зябкі — Дзісна, што адобрылі ў Варшаве. Праект, які садзейні-

Адкрыццё школы ў Мікалаёве (да 17 верасня 1939 г.)

Хор Дзісенскай сямігадовай школы. 1938

чаў эканамічнаму развіццю Заходняй Беларусі, праз два гады зацвердзілі і... пахавалі.

Раўнадушша польскіх улад да эканамічнага становішча мясцовага насельніцтва дапаўнялася нацыянальным уціскам. Так, пэўная частка жыхароў краю лічыла сябе палякамі. І ўсё ж большасць складалі беларусы. Сярод рамеснікаў і гандляроў пераважалі яўрэі. З часоў ніканаўскага расколу тут знайшлі прытулак нямала стараабрадцаў, якія захавалі не толькі веру, але і мову, уклад жыцця. Толькі адносіны да розных этнічных груп былі аднолькавыя — каланізатарскія. Адзін з лідэраў польскай нацыянальна-дэмакратычнай партыі С. Грабскі ў 1923 г. адкрыта заяўляў: «Адзінае, што цяпер патрэбна,— гэта каб мясцовыя беларускія сяляне зрабіліся польскімі».

Ва ўсіх афіцыйных установах ужывалася толькі польская мова. Неўзабаве ва ўсіх школах было ўведзена выкладанне на польскай мове, выкладчыкамі ў іх з'яўляліся пераважна выхадцы з польскіх тэрыторый. Хоць марудна, але сетка навучальных устаноў расшыралася на аснове мясцовай ініцыятывы і прагі народа да асветы, шэфскай дапамогі (польскія легіянеры пабудавалі школьны будынак у Чурылаве) і фінансавання цэнтральных улад. На тэрыторыі сучаснага Міёрскага раёна ў 30-я гады дзейнічала 39 пачатковых — «паўшэхных» — школ, дзе адзін настаўнік адначасова займаўся з 35—40 дзецьмі рознага ўзросту, 7 шасцігадовых школ, у якіх працавалі па тры настаўнікі. У Дзісенскай гімназіі вучоба каштавала 900 злотых у год, што было мала каму па кішэні. Вядома, у сценах яе беларуская мова не гучала.

Далёка не кожная сям'я магла пасы-

лаць у школу дзяцей. Хлопчыкаў вучылася 70 %, дзяўчынак — усяго 5—6 %.

Медыцынскае абслугоўванне зрабіла крок не наперад, а назад. Яшчэ ў 1923 г. Дзісенская інфекцыйная бальніца на 100 ложкаў была скарочана напалавіну. Але і яна выкарыстоўвалася толькі на чвэрць. Па афіцыйных даных Віленскага ваяводства, на стацыянары плата за дзень лячэння складала 4,5—9,6 злотых, за аперацыю апендыцыту трэба было аддаць 50—70 злотых. Гэта рабіла для многіх проста недаступнай кваліфікаваную медыцынскую дапамогу. Таму значная частка насельніцтва звярталася да знахароў. Высокай заставалася смяротнасць.

Ва ўмовах малапісьменнасці, невуцтва моцнымі былі пазіцыі рэлігіі, якую прапаведавалі 33 касцёлы і 34 царквы. Сумесная дзейнасць польскіх школ і культавых устаноў аказала значны ўплыў на акаталічванне і апалячванне насельніцтва. Аднак беларуская нацыянальная самасвядомасць выкаранена не была. Яркім праяўленнем яе можна назваць лёс і творчасць нашага земляка, народнага артыста СССР Генадзя Іванавіча Цітовіча — музыказнаўцы, этнографа і харавога дырыжора. За доўгае і плённае творчае жыццё Генадзь Іванавіч запісаў у розных раёнах рэспублікі каля 3000 народных мелодый. Ён стаў арганізатарам і мастацкім кіраўніком Дзяржаўнага народнага хору БССР, які цяпер носіць яго імя.

Паштоўка па зборы сродкаў на будаўніцтва касцёла ў Міёрах

Шырокі размах у 1925—1927 гг. атрымала на Дзісеншчыне дзейнасць Беларускай сялянска-рабочай грамады. Пачалося ўсё з першых парламенцкіх выбараў у Рэчы Паспалітай, што праходзілі ў 1922 г. У адпаведнасці з выбарчай сістэмай у сейм і сенат маглі прайсці пераважна прадстаўнікі пануючых класаў. Зусім мала «паслоў» выбіралася ад нацыянальных меншасцяў. Так, беларусаў у сейме было 11, у сенаце — тры. З 444 дэпутатаў адзінаццаць прадстаўнікоў ад Беларусі — вынік выбараў 1928 г. Зразумела, аказаць сур'ёзны ўплыў на палітыку ўрада яны не маглі. І ўсё ж...

Адным з дэпутатаў сейма ў час першых выбараў стаў Пётр Васільевіч Мятла — «кааператар з Маладзечна».

Паводле сведчання вядомага дзеяча КПЗБ М. С. Арэхвы, П. Мятла належаў да левага крыла беларускай нацыянальнай фракцыі сейма. «Юзаф Драздовіч, рольнік з Прапілеўшчыны», таксама быў прадстаўніком «паслоў» па Віленскай акрузе № 64, якую прадстаўлялі шэсць дэпутатаў, у тым ліку П. В. Мятла.

П. В. Мятла з'яўляўся актыўным удзельнікам Таварыства беларускай школы і напісаў кнігу аб яго дзейнасці. На пасяджэннях сейма ён адзначаў, што польскі буржуазны ўрад, не маючы смеласці весці сваю каланізатарскую палітыку адкрыта, зацвердзіў вядомыя ліпеньскія законы і пад іх прыкрыццём ліквідуе апошнія беларускія школы.

Явай беларускай вёскі станавілася таксама самавольства польскай паліцыі.

У такіх умовах рос уплыў КПЗБ, ішоў пошук арганізацыйных форм праяўлення беларускай нацыянальнай самасвядомасці. І напярадзе гэтага руху аказаліся «паслы» сейма Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, П. Валошын і П.

Мятла. З удзелам С. Рака-Міхайлоўскага і П. Мятлы пытанне аб Грамадзе абмяркоўвалася ў Дзісенскім павеце ў снежні 1925 г. У Глыбокім з гэтай мэтай адкрыўся філіял Беларускага каапératыўнага банка і кааператыва «Сноп», якія выкарыстоўваліся для арганізацыі легальнай палітычнай работы.

У красавіку 1926 г.— новая нарада. На ёй намечана разгарнуць агітацыйную работу, стварыць культурна-асветніцкі юнацкі гурток. У ліпені пад кіраўніцтвам камуністаў пачалося стварэнне грамадоўскіх гурткоў. Уздым нацыянальнага руху быў такі вялікі, што членамі новай арганізацыі ў некаторыя месяцы станавіліся па 1—2 тыс. чалавек. А да канца года ў Дзісне з'яўляецца павятовы камітэт. У гэты час у 198 гуртках Грамады аб'ядноўвалася 9980 членаў.

Чым растлумачыць імклівы рост аўтарытэту БСРГ? Адказ на гэтае пытанне дае праграма арганізацыі. У ёй указвалася, што Грамада лічыць неабходным аб'яднанне ўсіх беларускіх зямель у незалежную рэспубліку пад уладай сялян і рабочых. А яшчэ — перадача памешчыцкіх, дзяржаўных і царкоўных зямель сялянам, ліквідацыя асадніцтва, танныя крэдыты, перараэмеркаванне падаткаў на эксплуататарскія класы, дэмакратычныя свабоды, кааператаванне сялянства, скарачэнне арміі і паліцыі, сацыяльныя пераўтварэнні, амністыя для палітзняволеных, выбарнасць народных судоў, раўнапраўе усіх грамадзян...

Яшчэ не ставілася пытанне аб ліквідацыі прыватнай уласнасці, але нават сказанае ў праграме не ўкладвалася ў рамкі «санацыйнага», аздараўленчага рэжыму, які ўстанавіўся ў Польшчы ў маі 1926 г., калі да ўлады прыйшоў прадстаўнік буйной буржуазіі і агрэсіўнай ваеншчыны Ю. Пілсудскі. І адразу Грамада адчула пільную ўвагу паліцыі, якая не чуралася самавольства, правакацый і паклёпу. Напрыклад, калі 29 верасня 1926 г. гурток Грамады быў створаны ў в. Мікалаёва, у гэты ж дзень паліцыя пачала допыты не толькі кіраўнікоў, але і ўсіх членаў арганізацыі.

У кастрычніку гэтага ж года член аднаго гуртка Грамады Юдзенік забіў правакатара Івашкевіча. Буржуазны друк выкарыстаў інцыдэнт для гучнай кампаніі супраць ўсёй арганізацыі, а «Дзеннік Віленскі» адкрыта абвінаваціў у забойстве Дзісенскі павятовы камітэт.

Улады выкарыстоўвалі для запалохвання членаў Грамады штрафы. Дзісенскі войт, напрыклад, у снежні 1926 г. аштрафаваў на 5—15 злотых і прысудзіў да 30—60 дзён зняволення дваццаць удзельнікаў афіцыйна дазволенага сходу членаў Грамады ў в. Брусаванка.

У абстаноўцы самавольства ўлад сходы Грамады нярэдка выліваліся ў сутычкі з паліцыяй. Так, 21 лістапада 1926 г. у в. Касабудскія (Касабукі) паліцэйскія запатрабавалі ад старшыні гуртка не пачынаць сход. Калі той не падпарадкаваўся, пад пагрозай зброі прысутным сказалі разысціся. Але сяляне не спужаліся, і хутка ў памяшканні сабралася больш сотні чалавек. Вартавыя грамадоўскай міліцыі нават не дапускалі паліцэйскіх у памяшканне, дзе праходзіў сход. Ён быў закрыты пасля таго, як на дапамогу паліцэйскім прыбыло яшчэ дванаццаць чалавек. А потым было выклікана падраздзяленне салдат.

Ёсць звесткі, што гурток у в. Язна сабраў 10 злотых у дапамогу палітзняволеным. А калі газеты паведамілі аб пажарах у Дзісенскім павеце, грамадоўцы амаль па ўсёй Заходняй Беларусі правялі збор сродкаў у дапамогу пацярпеўшым.

Але палітыка ўціску і даносаў не дапамагала ўладам спыніць рост уплыву Грамады. Таму ў ноч з 14 на 15 студзеня 1927 г. пачаўся планамерны разгром гурткоў арганізацыі, масавыя арышты актывістаў і камуністаў. Закончыўся ён судовым «працэсам 56-ці» над кіраўнікамі Грамады.

Пасля разгрому Грамады антыкаму-

ністычная і антысавецкая прапаганда ўзмацнілася. Польскія ўлады, марачы аб «вялікай Польшчы», вялі ўздоўж граніцы ўзмоцненае ваеннае будаўніцтва. У прыватнасці, узведзена і ў 1930 г. здадзена ў эксплуатацыю чыгунка Друя — Варапаева, якая прайшла ля Міёраў. Яна мела стратэгічнае значэнне.

І ўсё ж уплыў КПЗБ на Дзісеншчыне не быў выкаранены. Калі ў дні рэвалюцыйных свят на савецкім беразе Дзвіны жыхары Луначарска ўрачыста выходзілі на дэманстрацыі, у Дзісне таксама з'яўляўся на дахах высокіх будынкаў чырвоны сцяг, распаўсюджваліся лістоўкі. Толькі ў 1937 г. паліцыі ўдалося натрапіць на след падпольнай групы КПЗБ. Газета «Зялёны штандар» у 1938 г. пісала: «Насельніцтва Маладзечанскага, Вілейскага, Дзісенскага паветаў знаходзіцца пад уплывам камуністаў. У Маладзечанскім павеце камуністам спачувае 70 % сялян, у Дзісенскім — каля 50 %. Любімымі песнямі насельніцтва ўсходніх пагранічных ваяводстваў з'яўляюцца: «Задрыжаць перад намі буржуі», «Крывавы справім мы ім баль», «Самі наб'ём мы патроны», «Інтэрнацыянал».

Праз Дзісну КПЗБ перапраўляла ў СССР членаў партыі і літаратуру ў абодва бакі. Дзейсны ўдзел у абслугоўванні гэтай дарогі прымаў Рувім Рыгоравіч Леках. І справа была пастаўлена так, што з 1931 па 1938 г. правалаў тут не здаралася.

Як ацэньвалі атмасферу «санацыі» жыхары Міёраў? У часопісе «Шлях моладзі» (№ 7, кастрычнік 1929 г.) паведамлялася:

«Міёры, Дзісненскага пав. Калі была ў нас вясною галадоўка, дык усё жыццё заглохла. Хоць, праўду кажучы, дык і раней нічога асаблівага не было. Галоўнай прычынай гэтага ёсць тое, што не даручаюць нам беларускіх газэт, каторымі наша сялянства цікавіцца. Калі пойдзеш на пошту па газэту, дык пачтар кажа, што адаслаў да гміны, пойдзеш у гміну, дык там адпраўляюць да стоража, каторы кажа: «Я і ў вочы ніякіх газэт не відзеў...»

Дык, браты дарагія, даволі спаць і спадзявацца, што хтось вызваліць нас ад здзекаў, паможа і напраміць нам наша жыццё. Нам трэба самім дамагацца належачых нам правоў. І стойка бараніць іх. Цяпер якраз час, калі складаюць дэкларацыі на родную ўрадавую школу, дык мы ўсе разам павінны выявіць свае пажаданні і злажыць дэкларацыі. Нам трэба памятаваць, што чужая школа — гэта вораг дзіцяці. Дык ня будзьма ж ворагамі сваіх дзяцей, сваёй моладзі!

Стары дзядзька».

Нягледзячы на сацыяльны, палітычны, эканамічны, нацыянальны і рэлігійны ўціск, нашы дзяды і бацькі змаглі захаваць свае нацыянальныя рысы, мову і звычаі. А яшчэ спадзяванні на лепшае будучае.

Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР: Док. и материалы. Т. 2 (1929—1933 гг.). Мн., С. 276—277.

В авангарде революционной борьбы: Матер. науч.-теор. конференции, посвященной 50-летию образования КПЗБ и КСМЗБ, 29 ноября 1973 года. Мн., 1974. С. 51—52.

Ваупшасов С. А. На тревожных перекрестках. Мн., 1974. С. 80, 83, 89.

Кухарев Б. Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии. Мн., 1975. С. 12 — 14, 52.

Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. Мн., 1954. С. 373.

Орехво Н. С. Дела и люди КПЗБ: Воспоминания. Мн., 1983. С. 59.

Палуян У. А. Беларуская сялянска-рабочая грамада. Мн., 1967. С. 47.

У суровыя гады падполля. Мн., 1958. С. 249.

Цэнтральны дзяржаўны архіў Літвы. Ф. 51. Воп. 1. Л. 11.

Л. А. Матэленак

Дэпутат сейма

Пётр Васільевіч Мятла нарадзіўся ў 1890 г. у сям'і заможнага селяніна Васіля Усцінавіча Мятлы.

П. В. Мятла

Хлопчык рос жвавым, цікаўным. Неўзабаве яго асабліва стала вабіць да сябе другая палова вялікай бацькоўскай хаты: там была школа. Імкненне да ведаў вызначыла жыццёвы шлях сялянскага хлопца. Ён закончыў царкоўна-прыходскую школу ў роднай вёсцы, затым гімназію ў Дзісне, педагагічныя курсы ў Коўне. У 22 гады малады настаўнік П. В. Мятла пачаў сваю педагагічную дзейнасць. Выкладчык народнай школы, «вучыцель», як тады яго называлі, з захапленнем аддаўся любімай справе — выхаванню сялянскіх дзяцей.

Але не доўга давялося працаваць настаўнікам Пятру Васільевічу. Грымнула вайна. Вясковы інтэлігент раздзяліў лёс соцень тысяч рабочых і сялян, якіх царскі ўрад кінуў у пекла імперыялістычнай бойні. Толькі ў 1917 г. ён вяртаецца дамоў і зноў настаўнічае. Пачынаецца самы актыўны і бурны перыяд у яго жыцці.

Сялянскае паходжанне, работа настаўнікам у вёсцы, франтавая школа жыцця — усё гэта не магло не прывесці Пятра Васільевіча ў лагер рэвалюцыйнай дэмакратыі. Малады настаўнік усё больш пачынае цікавіцца грамадскім жыццём, пытаннямі арганізацыі беларускіх школ, спажывецкай кааперацыі, развіцця нацыянальнай культуры. Настаўніцкая і грамадская дзейнасць П. В. Мятлы пакінула значны след на Маладзечаншчыне, дзе ён працаваў пасля дэмабілізацыі.

Пасля заключэння Рыжскага дагавора ў 1921 г. вясковае жыццё, дзе асабліва ярка стала праяўляцца рэакцыйная сутнасць польскіх улад, не задавальняе П. В. Мятлу. Ён едзе ў Вільню, працуе там у беларускай вайсковай камісіі. «Апрача гэтага, — адзначае «Беларускі каляндар» за 1923 г., — шмат працаваў дзеля развіцця кааперацыі і беларускай асветы, стараючыся закладаць беларускія школы. Ладзіў беларускія спектаклі, арганізоўваў вясковую моладзь і выявіў сябе як шчыры сын беларускага народа, рупны працаўнік дзеля грамадскае справы».

Калі ў 1922 г. пачынаецца вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты (ці, як тады гаварылі, у «паслы») сейма і сената, менавіта ў Маладзечне П. В. Мятла быў занесены ў выбарчы бюлетэнь па спісу № 16 як кааператар. У 32 гады П. В. Мятла стаў паслом сейма Рэчы Паспалітай. У ліку 11 дэпутатаў-беларусаў ён уваходзіць у Беларускі пасольскі клуб і падтрымлівае найбольш левае крыло, да якога адносіліся Б. А. Тарашкевіч, С. А. Рак-Міхайлоўскі і П. П. Валошын. Усе яны паступова сталі на шлях барацьбы за ўз'яднанне беларускага народа.

Разам з дэпутатамі ад КПЗБ П. В. Мятла выступае ў абарону інтарэсаў працоўных. Гнеўна гучыць яго голас у сейме летам 1925 г. пры абмеркаванні ўрадавага законапраекта аб зямельнай рэформе.

— Зямля і лясы — наша багацце і наша жыццё, — гаварыў Пётр Васільевіч у сваім выступленні, выкрываючы рабаўніцкі характар гэтай рэформы. — За іх будзем весці барацьбу да апошняй кроплі крыві. Мы зусім не маем зямлі для чужынцаў, насланых з Польшчы. Мы маем зямлю толькі для беззямельнага нашага мясцовага насельніцтва без розніцы нацыянальнасці... Калі ж вы прымеце гэты закон, тады толькі ўзмацніцца рух, паўстане барацьба за зямлю...

Але рэакцыйны «Закон аб парцэляцыі і асадніцтве» быў прыняты. Менавіта ў гэты час П. В. Мятла становіцца адным з найбольш актыўных дзеячаў Беларускай сялянска-рабочай грамады (БСРГ), аб стварэнні якой у чэрвені 1925 г. заявіў у сейме Б. А. Тарашкевіч. Ён рыхтуе ад імя дэпутатаў клуба Грамады інтэрпеляцыі (запыты) у сейм аб становішчы ў краі, выступае на мітынгах у абарону інтарэсаў працоўных. Мэтай новай арганізацыі з'яўлялася аб'яднанне ўсіх беларускіх зямель у незалежнай рэспубліцы пад уладай сялян і рабочых.

Дзейнасць П. В. Мятлы ў гэты час надзіва разнастайная. Ён працягвае працаваць у беларускіх легальных кааператыўных арганізацыях. Адна з іх — Беларускі кааператыўны банк у Вільні, які дазваляў Грамадзе весці легальную работу сярод шырокіх слаёў насельніцтва. 25 кастрычніка 1925 г. ён становіцца намеснікам старшыні назіральнага савета банка.

Пётр Васільевіч з'яўляецца актыўным членам Таварыства беларускай школы і 8 чэрвеня 1926 г. выбіраецца ў склад галоўнай управы арганізацыі. Дзейнасці ТБШ ён прысвяціў кнігу «Аб Таварыстве Беларускай школы і яго барацьбе» (1932). Гнеўна асуджае дэпутат-беларус каланізатарскую палітыку польскіх улад, якія закрываюць апошнія беларускія школы. У пісьме члену англійскага парламента Артуру Шэпарду ён піша, што «беларусаў не лічаць раўнапраўнымі грамадзянамі і ім не даюць магчымасці вучыць сваіх дзяцей на роднай мове...»

П. В. Мятла быў палымяным трыбунам, кожнае выступленне ён выкарыстоўваў для ўздыму народных мас на барацьбу за дэмакратычныя свабоды, за лепшае жыццё. На мітынгу ў мястэчку Дунілавічы 3 красавіка 1926 г. Пётр Васільевіч заклікае працоўных больш актыўна змагацца за атрыманне зямлі без выкупу, перанос падаткаў на заможныя слаі, змяншэння войска і паліцыі, ліквідацыю беспрацоўя, амністыю для палітзняволеных, адкрыццё нацыянальных школ. Рэзка крытыкуе ён каланізатарскую палітыку ўрада Пілсудскага ў Заходняй Беларусі на павятовым з'ездзе Грамады ў Вілейцы 29 жніўня гэтага ж года.

П. В. Мятла пакінуў творчы след як журналіст і арганізатар рэвалюцыйнага друку. На працягу некалькіх месяцаў 1926 г. ён з'яўляўся адказным выдаўцом газет «Беларуская справа» і «Наша справа», якія ў гэты час афіцыйна лічыліся органамі Грамады. На іх старонках праўдзіва паказваецца жыццё народа, крытыкуецца ўнутраная і знешняя палітыка буржуазнага ўрада, выкрываецца яго антыдэмакратычная сутнасць.

Актыўная рэвалюцыйная дзейнасць П. В. Мятлы не магла застацца па-за ўвагай улад. 5 снежня 1926 г. П. В. Мятла і П. П. Валошын, нягледзячы на «дэпутацкую недатыкальнасць», былі збіты паліцэйскімі пры разгоне з'езда Грамады Бельскага павета, які праходзіў у вёсцы Стара-Бярозава.

Гэтая падзея ўскалыхнула ўсю Заходнюю Беларусь, паказала неадкладную неабходнасць умацавання рэвалюцыйнага лагера, над якім пастаянна вісела пагроза разгрому. Таму ў канцы 1926 — пачатку 1927 г. працягваецца актыўная работа па стварэнні новых гурткоў Грамады, умацавання Таварыства беларускай школы. Самы непасрэдны ўдзел у ёй прымае дэпутат сейма П. В. Мятла.

У ноч з 14 на 15 студзеня 1927 г. па распараджэнні ўрада пачаўся разгром Грамады, а таксама ТБШ і іншых беларускіх грамадскіх і кааператыўных арганізацый. 16 студзеня быў арыштаваны і П. В. Мятла.

П. В. Мятла прыцягваецца да судовай адказнасці па «працэсу 56-ці» як удзельнік змоўніцкай арганізацыі. Справа цягнулася ў Вільні тры месяцы.

Кіраўнікі Грамады мужна змагаліся да канца. Яны імкнуліся выкарыстаць судовы працэс для выкрыцця сфабрыкаваных абвінавачванняў. Камуністыч-

ная партыя ў час працэсу заяўляла: «На лаву падсудных пасаджаны як дзяржаўныя злачынцы лепшыя прадстаўнікі народных мас Заходняй Беларусі».

22 мая 1928 г. акруговы суд вынес прыгавор. П. В. Мятла і іншыя кіраўнікі Грамады былі асуджаны на 12 гадоў цяжкага турэмнага зняволення, апеляцыйны суд скарациў гэты тэрмін удвая.

У 1931 г. пасля адмены зняволення П. В. Мятла і іншыя кіраўнікі Грамады пераязджаюць у Мінск. Усе свае сілы Пётр Васільевіч аддае літаратурнай і грамадскай дзейнасці. Але зрабіць ён паспеў не многа...

Л. А. Матэленак

Сцяг працы. 1976. 24 жн.

Дакументы сведчаць

З АРХІЎНАГА ФОНДУ

Дзісенскае павятовае староства **1921 г.**

В 1921 году в повете было 34 православные церкви и 33 католических костела.

В Друйской гмине в 1921 году насчитывалось 28 помещиков, имеющих земли больше 45 десятин, в Леонпольской гмине — 33 помещичьих имения, в Миорской гмине — 42 помещичьих имения.

В адресном справочнике б. Польши за 1927 год имеются сведения о городах:

Дисна, 4413 жителей. В городе было: 1 синагога, гимназия, эпидемическая больница, поликлиника, приют для престарелых, электростанция, добровольное пожарное общество.

Орган городского самоуправления — магистрат, возглавлял бургомистр Пацевич Генрих.

Население обслуживали: два врача-терапевта, два зубных врача, два акушерных врача и 1 аптека.

Адресный справочник, л. 1923.

Леонполь — центр Леонпольской гмины, 382 жителя. В местечке был аптечный склад и 2 водяные мельницы.

Адресный справочник, л. 1931.

Перебродье — центр Перебродской гмины, 376 жителей. В местечке было 3 магазина.

Адресный справочник, л. 1941.

Новый Погост — центр Ново-Погостской гмины, 625 жителей. В местечке было 2 врача, 2 медфельдшера, 1 акушерка, 1 аптека, 6 магазинов.

Адресный справочник, л. 1939.

Язно — центр Язненской гмины, 243 жителя, 1 фельдшер, 1 акушерка, 2 мельницы, 4 магазина.

Адресный справочник, л. 1928.

Миоры — центр Миорской гмины, 422 жителя. В местечке был аптечный склад, 2 мельницы, 5 магазинов.

Адресный справочник, л. 1934.

Філіял Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці ў г. Маладзечна. ФР-437. Воп. 1. Спр. 307. Л. 50—58; Спр. 1343. Л. 33—34; Спр. 19. Л. 507—508.

ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ КЛАСАВЫМ РАССЛАЕННІ СЯЛЯН У В. КАРАЛЁВА ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА

Лістапад 1933 г.

Расслоение в дер. Королево. В моей деревне — 18 хат. 1 хозяйство безземельное; 3 — по 3 дес., имеют по 1 корове и 1 лошади; 3 хозяйства — 7 дес., по 1—2 коровы, 1 лошадь; 3 хозяйства — по 12 дес., 2 коровы, 2 лошади; 4 хозяйства — 18 дес. земли, 3 коровы, 2 лошади; 4 хозяйства — 25 дес. земли, 6 коров, 4 лошади.

Земля у нас средняя. Наша деревня считается сравнительно богатой, кругом все деревни бедняцкие. Хлеба в большинстве деревень у бедняков хватает до коляд, в рабочее время — всегда бесхлебица. Растет дробление земли.

Задолженность у нас большая, главным образом в кассе Стэфчика, займы за рубку и окопку хуторов, за семена, не говоря уже о задолженности по налогам. В 1930 г. во время неурожая дали нам семена на посев картошки, ячменя и др. За пуд считали нам по 10 зл. Самый бедный у нас теперь имеет задолженность только за семена на 150 зл., не считая процентов. Я имею задолженность в кассе Стэфчика на 250 зл. (имею 3 дес. земли), кроме налогов. Все долги вместе у меня — 600 зл. Если бы я должен был рассчитаться, мне надо было бы все хозяйство продать. Приблизительно так же должны все бедняки. Середняки менее задолжены, так как они понемногу выплачивают. Касса Стэфчика берет за ссуду 2 проц. месячных. В тех деревнях, где проведена комасация, задолженность превышает 1 тыс. зл. Задолженность с каждым годом растет.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 242. Воп. 1. Спр. 420. Л. 33.

З ПРАМОВЫ ДЭПУТАТА СЕЙМА РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ Б. А. ПІМАНАВА Ў СЕЙМЕ ПРЫ АБМЕРКАВАННІ ІНВЕСТЫЦЫЙНАГА ПЛАНА НА 1937—1938 гг.

9 лютага 1937 г.

...Вялікая памылка лічыць, што Віленшчына павінна быць і ёсць стопрацэнтны земляробчы край. З сельскай гаспадаркі насельніцтва паўночна-ўсходніх «крэсаў» не магло праіснаваць раней, не можа і зараз. У сілу неспрыяльных кліматычных умоў захады на сельскагаспадарчае развіццё не павінны нікога цешыць, нічога не дае і не даведзеная да канца зямельная рэформа... Вось чаму цэлыя вёскі Браслаўскага, Дзісенскага, Свянцянскага і Пастаўскага паветаў, ствараючы арцелі муляраў, цесляроў, ішлі на заработкі ці рабіліся фабрычнымі рабочымі. Дзесяткі тысяч рабочых кожны год ідуць у Латвію, дзе на сезон знаходзяць працу, не знаходзячы, на жаль, у сваёй дзяржаве.

Друкуецца па кн.: О нуждах восточных воеводств (Польши «Б»). Речи депутата Б. А. Пимонова. Вильно, 1938. С. 7.

З ПРАМОВЫ ДЭПУТАТА СЕЙМА РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ Б. А. ПІМАНАВА НА ПЛЕНАРНЫМ ПАСЯДЖЭННІ СЕЙМА ПРЫ АБМЕРКАВАННІ БЮДЖЭТУ МІНІСТЭРСТВА ШЛЯХОЎ ЗНОСІН

16 лютага 1937 г.

...Выкарыстанне чыгункі Варшава — Друя, пабудаванай са значнымі стратамі ў гаспадарчых адносінах, дае праблематычныя вынікі. Значнасць лініі Варшава — Друя для гэтай часткі краю велізарная. Але сістэма карыстання жадае лепшага. На гэтым участку, працягласцю 89 км, курсіруюць толькі два таварна-пасажырскія цягнікі. З Друі ў Вільню трэба ехаць амаль 12 гадзін... Таму мала жадаючых карыстацца такой дарогай...

Яшчэ патрэбна адна заўвага адносна чыгункі Варапаева — Друя. Гэтая дарога яшчэ недабудавана. Яна патрабуе некаторых памяшканняў, якія павялічаць яе гаспадарчую значнасць. Неабходна пабудаваць ветку, таму што ў дадзены момант дарога не даходзіць да Друі. Трэба яе давесці да ракі Дзвіны ці да ракі Друйкі, упадаючай у Дзвіну. Гэта дасць магчымасць шырэй карыстацца чыгункай для перавозкі лясных матэрыялаў, іх не трэба два разы перагружаць і падвозіць на конях, што патрабуе дадатковых расходаў. Таму няма жадаючых карыстацца чыгункай для перавозкі лесу.

Друкуецца па кн.: О нуждах восточных воеводств (Польши «Б»). Речи депутата Б. А. Пимонова. Вильно, 1938. С. 10—11.

З газетных радкоў

З ЗАКЛІКУ ДА БЕЛАРУСКІХ, ЯЎРЭЙСКІХ І ЛІТОЎСКІХ КУЛЬТУРНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ ЎЗМАЦНІЦЬ БАРАЦЬБУ ЗА ШКОЛУ НА РОДНАЙ МОВЕ

У Дзісенскім павеце настаўнікі-паланізатары ўзяліся за справу перавядзення утраквістычных школ на выключна польскія. Ходзіць настаўнік з хаты ў хату і ўгаворамі, пагрозамі змушае сялян да падпісання ліста, дамагаючыся «дабравольнага» пераходу на школу ў польскай мове. Не здолела паланізаваць беларускіх дзяцей утраквістычная школа акупантаў, дык сілай, гвалтам хочуць яны гэта даканаць.

Чырвоны сцяг. 1935. № 10 (114).

Старонкі летапісу

...Дзісна была канчатковым пунктам маіх дэпутацкіх сустрэч. Адсюль я павінен быў павярнуць назад і па правым баку Дзісёнкі прабірацца да Глыбокага праз Язненскую, Лужацкую і Залескія гміны. Аднак нам яшчэ трэба было зрабіць некалькі сустрэч у Германавіцкай, а за ёй — у Сцефанпольскай гмінах. Усё ішло нармальна. Мы перасоўваліся ад аднаго буйнога населенага пункта да другога.

Нарэшце па-сапраўднаму замарозіла. Выпаў снег і па-зімоваму пакрыў зямлю. У Дзісну мы дабраліся ўжо сапраўднай зімой.

Да рэвалюцыі Дзісна была сярэднім павятовым гарадком і даволі ажыўленым гандлёвым пунктам. Да чыгуначнай станцыі ад яе было ўсяго нейкіх дзесяць кіламетраў. Сюды паступала з ўсяго павета — і не толькі з аднаго Дзісенскага — збожжа, лён, жывёла. Адсюль плылі ва ўсе глухія куткі фабрычныя і заводскія вырабы.

Аднак палякі пабаяліся арганізаваць сваё павятовае староства ў Дзісне, бо на другім беразе Дзвіны былі бальшавікі, суседства не вельмі прыемнае. Усякае здараецца ў жыцці. Вось таму павятовае староства заснавалі ў Глыбокім. Усё ж на пяцьдзесят кіламетраў далей ад небяспечнай граніцы. Каб ажывіць гандлёвы рух, правялі праз Глыбокае чыгунку. Буйнейшыя гандляры сцягнуліся ў Глыбокае. Дзісна пачала глохнуць і занепадаць, на яе брукаваных вуліцах пачаў расці падарожнік і трыпутнік. А Глыбокае стала буйным гандлёвым пунктам на Усходніх крэсах. Вывозілі адсюль за бясцэнак хлеб, лён, жывёлу і розную сыравіну ў Польшчу.

У Дзісне мы правялі за два дні дзве сустрэчы. А вечарам на другі дзень я быў змушаны прыняць удзел у першым маім уласным літаратурным вечары. Вечар быў арганізаваны гарадскімі асветнымі арганізацыямі, якія там-сям расклеілі афішы аб вечары, і таму людзей сабралася шмат. Знайшоўся чалавек, які зрабіў грунтоўны даклад аб літаратуры Заходняй Беларусі. Я не прывык да чытання публічна ўласных вершаў, выступаў не зусім удала, аднак прымалі мяне цёпла, з энтузіязмам. Пасля выступілі з чытаннем маіх вершаў вучні старэйшых класаў сярэдняй школы горада. Я быў прыемна здзіўлены, што маю творчасць так ведаюць у гэтым глухім пагранічным кутку. Праўда, у мяне было выпушчана ўжо некалькі зборнікаў, а тры мае п'есы ставіліся там-сям на самадзейных сцэнах. Аднак прычынай поспеху, пэўна, было тое, што на другім беразе Дзвіны знаходзілася Савецкая Беларусь. Яна стымулявала насельніцтва Дзісны, асабліва моладзь, любіць і не забываць родную літаратуру, у тым ліку і літаратуру Заходняй Беларусі.

Пасля заканчэння вечара моладзь Дзісны паказала сваю мастацкую самадзейнасць, якая была на высокім узроўні — як на той час.

На другі дзень мы павярнулі назад і рабілі ўжо сустрэчы ў Язненскай гміне.

Машара М. Старонкі летапісу. Мн., 1975. С. 81—83.

Яго складаны лёс

У 1925—1926 гг. беларускія дэпутаты польскага сейма арганізавалі на тэрыторыі ўсёй Заходняй Беларусі легальную грамадска-палітычную арганізацыю — Беларускую сялянска-рабочую грамаду. Адным з актыўнейшых кіраўнікоў быў Пётр Васільевіч Мятла. Дзякуючы яго намаганням на Дзісеншчыне ўтварылася вялікая колькасць гурткоў Грамады. Адным з найбольш баявітых быў мятлянскі, якім кіраваў селянін-бядняк Ілля Паўлавіч Мятла. Некалькі членаў гуртка звязаліся з савецкай разведкай, рыхтаваліся да ўзброенага паўстання. За мяжу на сувязь з ГПУ некалькі разоў хадзілі Лукаш Андрэевіч Кадуш-

ка з Рандароў і Раман Міхайлавіч Кадушка з в. Кадушкі. У 1926 г. Ілля Мятла прыцягнуў да дзейнасці ў гурткоўцаў каваль з в. Гусакі Антон Саковіч.

Калі пачаўся разгром Грамады, судзілі не толькі кіраўнікоў, але і радавых яе членаў. Зведалі турэмнага хлеба таксама мятлянскія грамадоўцы. Апошнім быў арыштаваны Мікалай Высоцкі. Прывялі яго па этапу ў Беразвечча, што паблізу Глыбокага. Там мясцілася палітычная паліцыя — дэфензіва. Допыт Мікалая працягваўся тры месяцы. Ад яго дамагаліся, каб ён пацвердзіў, што Лукаш Кадушка, Раман Кадушка і Ілля Мятла з'яўляліся агентамі Полацкага аддзялення ГПУ. Мікалай на кожным допыце сцвярджаў адно: «Названыя грамадзяне ў сваёй дзейнасці не выходзілі за рамкі праграмы і статута Грамады. А праграма Грамады не прадугледжвала ўзброенай барацьбы супраць існуючай улады».

На суд Мікалая завезлі ў Вільню. Разбіраў справу Віленскі акруговы суд восенню 1928 г. Прысудзілі яму 5 год турмы ўмоўна. Улічылі, што хлопец малады гадамі, не служыў у польскім войску і не прымаў ваеннай прысягі.

Праз год яго прызвалі ў армію. Служыў у г. Ломжа. Пасля таго як вярнуўся дамоў, знаходзіўся пад наглядам паліцыі.

1 верасня 1939 г. фашысцкая Германія напала на Польшчу. Мікалай Высоцкі па мабілізацыі з'явіўся на зборны пункт у Язна. Праз два дні ён ужо займаў абарону пад горадам Млава. Польская армія, якая не мела на ўзбраенні дастатковай колькасці танкаў і авіяцыі, тым не менш аказала агрэсарам упартае супраціўленне. Па-геройску абаранялі свае пазіцыі і салдаты-беларусы. Немцы абрушылі на абарону палякаў тысячы бомб, пусцілі на прарыў танкі.

У гэтым першым баі Мікалай Высоцкі атрымаў сур'ёзнае раненне ў сцягно. Давялося адступаць. Параненага М. Высоцкага прывезлі ў Вільню, памясцілі ў шпіталь. Тут ён сустрэў прыход часцей Чырвонай Арміі. Яму дазволілі вярнуцца дадому.

А дома пачалося новае жыццё. У вёсцы быў створаны «часовы сялянскі камітэт», які ўзяў на сябе абавязкі сельскага Савета. У камітэт увайшлі сяляне-беднякі і асабліва тыя, хто змагаўся з рэжымам Пілсудскага і пацярпеў ад польскіх улад. У склад камітэта ўвайшоў і Мікалай Высоцкі...

В. І. Высоцкі

З успамінаў Зеліслава Янушкевіча

Зеліслаў Янушкевіч — староста Браслаўскага павета ў 1923—1933 гг. У пасляваенны час напісаў успаміны, якія захоўваюцца ў аддзеле рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі ў Варшаве.

У 1923 г. улады выступілі ініцыятарамі заснавання ў Браславе сельскагаспадарча-гандлёвай кааперацыі. Сябрамі кааперацыі запісалася даволі шмат сялян. Улады дапамаглі аформіць крэдыты і справа пайшла. Старшынёй арганізацыі, якая атрымала назву «Рольнік», стаў супрацоўнік бюро павятовага аддзела Мар'ян Госк. Наколькі патрэбнай была кааперацыя, паказалі тэмпы яе развіцця. Праз 2 гады кааперацыя мела ўжо 4 млн злотых гандлёвага абароту. Яна кантралявала гандаль солі, цукру, жалеза ў павеце. Набывала ўсё льняное семя, якое часткова перапрацоўвалася ў прымітыўнай ручной маслабойцы, часткова пасля ачышчэння перапраўлялася ў льнаробчыя раёны Польшчы як каштоўны насенны матэрыял... Абароты

Паводка 1931 г. у Дзісне

Паводка 1936 г. у Дзісне

арганізацыі тым часам раслі, і «Рольнік» стаў поўным пакупніком і забеспячэнцам сялян. Пашыраючы сваю дзейнасць, кааперацыя пачала закладваць філіі ў Відзах, Опсе, Друі, Міёрах, Ёдах...

...Увесну 1931 г. пачала небяспечна падымацца вада на Дзвіне. У рэшце рэшт яна дасягнула ўзроўню звыш 12 метраў супраць звычайнага, што не адбывалася ўжо шмат гадоў. Паплылі па Дзвіне хаты, хлявы, абадраныя дрэвы, сена і салома. У некаторых выпадках выцягвалі з вады людзей і жывёлу, якіх паводка змыла разам з хатамі і хлявамі. Больш паловы мястэчка Друя апынулася пад вадой. Паводкавыя воды Дзвіны сталі падымацца па прытоках — Друйцы, Вяце, Мёрыцы, Волце і інш. На гэтых прытоках утварыліся лядовыя заторы, якія знеслі некалькі млыноў. На пратоках былі затоплены масты. Над мостам у Пуцінаве, які знаходзіцца сярод сухога сасновага лесу, вада ўзнялася на 2 метры. Амаль усе масты ўцалелі дзякуючы толькі таму, што былі нядаўна пабудаваны і перад паводкай іх нагрузілі вялізнай колькасцю камянёў...

Друкуецца па кн.: Браслаўскія сшыткі. 1996. № 1. С. 75—79.

У СПРАВЕ НЕЎРАДЖАЯЎ

Неўраджаі, якія амаль з году ў год паўтараюцца ў паўночных паветах Віленшчыны — Браслаўскім, Дзісенскім, Пастаўскім, — ад пэўнага часу звярнулі на сябе ўвагу людзей навукі, перш за ўсё людзей, што працуюць у земляробскім даследніцтве. Пытанне гэта тым больш цікавае, што глеба сама па сабе ў гэтых паветах не бедная, а значна багацейшая, чым у суседняй Свянцяншчыне. І аднак неўраджаі тут здараюцца рэгулярна амаль кожны год.

Справай гэтых неўраджаяў зацікавіўся ўжо колькі год назад чалавек, здаецца, найбольш да гэтага пакліканы, — кіраўнік даследчай станцыі ў Беразвечы пад Глыбокім Л. Невяровіч. Сваімі колькігадовымі даследаваннямі Л. Н-віч дзеліцца ў «Туд. Pol.» (№ 1—2—37), дзе прыходзіць да наступных вывадаў.

Мокры год прыносіць тут голад людзям, а сухі — жывёле. Але не ўсюды. Там, дзе грунты асушаныя, напр. ф. Зацішша, Беразвеч і іншыя, у мокрыя і ў сухія гады неўраджаяў не было. Галоўную прычыну спатыканых тут неўраджаяў аўтар бачыць у нізкай культуры глебы. Дзеля гэтага, па думцы аўтара, трэба думаць аб падняцці гэтай культуры такімі спосабамі:

1. Весці далей хутарызацыю.

2. Ускорыць г. зв. асноўную мэліярацыю (урэгуляванне рэчак і ручаёў), якая была б панукай для саміх гаспадароў праводзіць мэліярацыю (асушку) поўную пры помачы адкрытых равоў ці дрэнаў.

3. На ўсіх ужытковых грунтох, а асабліва на вязкіх гляёх араць у вузкія 3—4-метровыя загоны з перагонамі для адвядзення лішняй вады, якую не можна трымаць не толькі на азіміне, але і на ярыне, а нават на сенажацях і пасьбішчах.

4. Прапагандаваць пры помачы танных крэдытаў ужыванне культыватара, валачыла і валка-кальчаткі.

5. Падняць культуру сенажацяў і пасьбішчаў, якія пасярэдна падымуць ураджайнасць ароміны.

6. Заводзіць плыткае ўзорыванне аржышча зараз жа за сярпом і канешна заворываць усе аржышчы на зіму. Зімовая ворка павінна быць глыбокай, але не можна даставаць зашмат зямлі дзікай. На вязкіх грунтох трэба стасаваць зімовую ворку з паглыбляльнікам.

7. Не сцягваць вяснянага абрабляння глебы; не чакаць, пакуль усё поле высахне, а выходзіць з валачылам і бараной, як толькі абсохнуць паасобныя праталіны; на даліне прыйдзе чарга пазней.

8. Вывезены гной не трымаць на кучках, а чым хутчэй яго растрэсці і зараць. Глей і гліна вельмі ўдзячны за гнаенне паверсе кампостам. Пашыраць кампаставанне торфу.

9. Не пазніцца з вяснянай сяўбой. Не пачынаць адсаджэнне бульбы, але ад яравой пшаніцы ці жыта, пасля сеяць авёс, лён, стручковыя, кончыць бульбай. Асабліва рана трэба сеяць аўсы грубазерневыя, познадаспяваючыя аўсы. Рана трэба сеяць і там, дзе ўжываюцца штучныя гнаі.

10. На грунтох, добра ўгноеных, сеяць на зялёную пашу па аржышчы зразу за сярпом, пакуль збожжа яшчэ сохне ў копках: віку, пялюшку, ячмень, гарчыцу, бобік, сонешнік, а ў лён усяваць торхву. На бяднейшых грунтох сеяць лубін, пялюшку, грачыху — на зялёны гной, а часткова і на зялёную пашу.

11. На грунтох гляістых і гліністых агранічыць саджэнне бульбы і садзіць там больш кармавыя буракі і моркву. Акрамя таго, пашыраць засевы люцэрны, бобіку, сонешніку і конскага зуба (кукурузы) як пашу для жывёлы, а бобу і фасолі — як пажыву для чалавека.

12. У севазвароце пільнаваць, каб чаргаваліся між сабой расліны плытка і глыбока карэнячыяся: кожная з такіх раслін ссе спажыву з розных пластоў зямлі і не вынішчае яе.

13. Усюды там, дзе лепшая глеба, пашырыць засеў пшаніцы за кошт жыта: пшаніца лепш вытрымлівае хваробу снежнай плесні (цвіль). Проці плесені азімінаў трэба кожнае сяўбовае насенне байцаваць.

Беларускі папулярна-гаспадарскі часопіс «Самапомач». 1937. № 1.

Міёршчына ў час паміж войнамі

Міраслаў Задора-Цішэўскі — аўтар успамінаў — нарадзіўся ў 1889 г. у Кракаве. У 1912 г. закончыў Кракаўскі універсітэт, дзе атрымаў спецыяльнасць інжынера земляробства. Узяўшы шлюб з Марыяй Аскерка, асеў у маёнтку Узмёны, потым у Біруках каля Новага Пагоста. Быў абраны ў гмінны савет у Новым Пагосце і павятовы сеймік у Браславе. Заснаваў станцыю насення і сельгасмашын. Уваходзіў у павятовы саюз аграрыяў. У 1938 г. узнагароджаны за заслугі ў грамадскай працы залатым Крыжам Заслугі.

Земляробча-гандлёвы кааператыў «Рольнік» у Браславе, буйнейшы гэтага тыпу ў цэлым ваяводстве, аб'ядноўваў жыхароў Браслаўшчыны і быў аб'ектам паказу турыстам. Але напярэдадні 1930 г. пачалі паяўляцца цяжкасці ў гандлі, недахоп наяўных грошай, паменшыўся абарот, што пагражала не толькі дэфіцытным балансам, але і больш істотнымі праблемамі...

Эканамічны стан земляробчых вытворцаў Браслаўшчыны ад заканчэння першай сусветнай вайны да пачатку другой (менш гэта адносіцца да жыхароў вёскі, больш земляробаў, гэта значыць людзей, якія галоўны даход забяспечвалі земляробствам, мелі адпаведныя сельгасмашыны і рыштунак) быў наступны. Адзначу, што мінімум ворыва быў каля 5 га, максімум — каля 30—40 га. Ужо ў першыя пасляваенныя 1921—1922 гг. аказалася, што малая і большая ці вялікая ўласнасць інакш трактаваліся ў эканамічным плане. Так, большая ўласнасць акрамя большага ў арыфметычнай прагрэсіі зямельнага падатку плаціла значна больш з 1 га ворыва. Акрамя таго, плаціла і іншыя падаткі, якіх не плаціла дробная ўласнасць. Па маіх падліках, у 1935 г. з 1 га вялікая ўласнасць плаціла 15 злотых, а меншая — толькі трэцюю частку таго. Усялякія аднаразовыя плацяжы — лясны, падатак на маёмасць — забіралі з большай уласнасці апошнія грошы, калі яны заставаліся пасля першага этапу парцэляцыі...

У час паміж войнамі на ваеннае асадніцтва ў павеце ўзята Дзедзіна, Чэрасы, Лясная, прыватна распарцэляваны Узмёны, Любінова, частка лявонпальскіх фальваркаў, камянполлеўскіх і інш.

Мэтавыя крэдыты для дробнай і буйнейшай уласнасці на пакупку мінеральных угнаенняў, элітнага насення ці некаторых машын і сельгаспрылад пасля пэўных фармальнасцей былі выплачаны каапераваным земляробам праз гмінныя касы ці касы Стэфчыка. Крэдыты тыя былі 6-месячныя аж да двухгадовых і ў дастатковай колькасці, і нават звычайна не былі выкарыстаны. Малазямельныя не выкарыстоўвалі для апрацоўкі зямлі машыны, а калі і выкарыстоўвалі — не ўкамплектаваныя, напрыклад жалезныя плугі, але толькі аднаадвальныя і бясколавыя. У паўсямесным ужытку былі спрунжановыя ба-

роны, якія выкарыстоўваліся не толькі для апрацоўкі, але і для закрыцця насення. З машын даволі шмат куплялася конных прывадаў, што патрабавалі 2—4 коней, для сілкавання прымітыўнага абсталявання ад малатарняў без рухавікоў да веялак для ачысткі абмалочанага зерня. Спалучаліся з прывадам прыстасаванні для малацьбы льнасемя і мяцця трасты, для абмалоту насення чырвонай канюшыны.

Пад канец апісваемага перыяду ў кожнай вёсцы быў прынамсі адзін камплект коннай малатарні, якім карысталіся суседзі. Добра працавалі ў нашай мясцовасці, і не толькі на вялікай уласнасці, жняркі-снопавязалкі, хаця яны і былі не вельмі папулярныя з прычыны вялікай цаны, значнай вагі, а яшчэ дарагога шпагату. Параконныя ўжываліся толькі ў вялікіх гаспадарках, пераважалі аднаконныя, якія запрагаліся ў дугу, прычэпы тыпу «панараду» для дастаўкі грузаў і драбіны...

Найлепшы вынік для малой земляробчай уласнасці дало правядзенне з дапамогай аграномаў конкурсаў агратэхнікі ці вырошчвання, сутнасць якіх у тым, што пэўная колькасць гаспадарак пад кіраўніцтвам агранома прыступала да вырошчвання аднолькавых культур, выкарыстоўваючы аднолькавыя прыёмы ўгнаення гноем ці тукамі, сяўбы, догляду і ўборкі. Кожны канкурсант атрымліваў насенне і мінеральныя ўгнаенні ад сеймікa бясплатна па кніжачцы, у якую абавязаны быў запісваць дату і час выканання работ. Памер плантацыі быў 50—100 квадратных метраў. Конкурс праводзіўся на працягу трох гадоў, у першы звычайна садзілі буракі, потым найчасцей капусту, у канцы нейкія бабовыя ці прапашныя. Жывёлагадоўчыя конкурсы былі найрадзейшымі з-за цяжкасцей у патрэбнай колькасці маладняку. Былі конкурсы з парасятамі на працягу 9 месяцаў і цялятамі — гадавыя. Конкурсы гаспадарання выклікалі вялікую цікавасць, тым больш што кантраляваліся вельмі дакладна, а ўзнагароды калектыўныя і індывідуальныя былі вялікія. Яны вучылі гаспадароў працаваць з новымі прыладамі, а мясцовых кавалёў — добра і танна іх выраб-ляць...

У міжваенны перыяд земляробства, пераважна дробная ўласнасць, атрымала вялікае развіццё. Палавіна яе была хутарызавана, пры пераносе жылля пабудавана шмат новых дамоў, значна большых. Паўсюдна зніклі курныя хаты, маленькія вокны, якія не адчыняліся ні зімой, ні летам. Нават адвечныя саламяныя стрэхі мяняліся на гонтавыя ці нават чарапічныя, будынкі абсаджваліся пладовымі дрэвамі і кветкамі. Вёска пачала выглядаць больш заможна як супольнасць фермераў. Мала было перад вайной вёсак, у якіх не было б хоць аднаго радыё ці звычайнага добрага прыёмніка. Усё больш вясковай моладзі вучылася ў сярэдніх і вышэйшых школах, не было скаргаў на недахоп месцаў для вучобы вяскоўцаў. Моладзь часцей стала насіць гарадское адзенне, на танцах у вёсцы часцей сустракалася чорнае ўбранне.

Перад вайной раённым аграномам у абшары Міёры — Новы Пагост быў Марыян Трашчынскі...

У 1934 г. закончылася будаўніцтва 100 км чыгункі нармальнай каляі Варапаева — Друя. Дарог з цвёрдым пакрыццём наогул не было, іншыя дарогі і масты не памяняліся пасля 1917 г. і на цяжкіх землях вясной і восенню было не праехаць. Не забылася легенда пра коней, якія патанулі на вялікай дарозе ў разводдзе. Так здарылася на тракце Пагост — Шаркоўшчына недзе ў 1923 г. вясной. У 1922—1926 гг. на пераезд з Узмён у Міжрэчча на вялікдзень на добрых конях патрабавалася 12 гадзін...

Міёры ў 1914 г. — вялікая касцельная вёска, толькі што стаўшая ажыўленым мястэчкам. Пакупка і трапанне лёну, іншай земляробчай прадукцыі. Каля 2000 пастаянных жыхароў.

Пагост — касцельная вёска, пастаянных жыхароў каля 1500, свабодна рас-

тучая. Вялікі філіял «Рольніка», млын, прыватны універсальны магазін мясцовага жыхара Насючонка, католіка, быў лепш забяспечаны, чым любы іншы магазін далікатэсаў.

Большасць насельніцтва жыла ў вёсках і засценках, што ў значнай ступені ўскладняла ўзаемаадносіны ўрача з хворымі. Мясцовыя жыхары, пераважна людзі пачцівыя і шчырыя, высока цанілі сваіх эскулапаў, часта нават любілі. Усе дзверы ад палацаў да хат былі пастаянна шырока адчынены для гэтых людзей справы.

Добрай пасляваеннай спадчынай былі шматлікія аптэкі і добрыя фармацэўты, што ў медыцыне мела вялікае значэнне. Дрэнным было тое, што лячэннем займаліся былыя фельчары, санітары, нават былая вайсковая прыслуга, выдаваўшая лекі ў шпіталях, якія называлі сябе «дахтарамі». Былі звычайнымі знахары і шаптуны, якія лячылі ўсялякія хваробы — ад тыфу, адзёру да ўкусу змяі і шалёнага сабакі — толькі ім вядомымі лекамі з замовамі, часта давалі наркотыкі, гарэлку на жывых змеях. Былі таксама такія, якія замаўлялі рожу і хваробу «ад бумажнага ліца» — гэтая хвароба азначала моцную анемію...

Павет быў падзелены на санітарныя раёны. У кожным быў раённы лекар з персаналам памочнікаў, звычайна фельчара, акушэркі і работніка, адначасова прыбіральшчыка і дэзінфектара. Раённая прыёмная размяшчалася ў будынку, што належаў гміне або наймаўся ў прыватніка. У ім былі пакой для чакання, прыёмная і невялікая лабараторыя, у якой сам лекар сваімі апаратамі рабіў аналізы для вызначэння хвароб. Прыём вёўся штодзённа з 8 да 14 гадзін, потым былі выезды ці прыватная практыка (у лекара дома). Аплата за лячэнне ў прыёмным пакоі дарослага каштавала 2 злотыя, бедныя з пасведчаннямі гміны ад аплаты вызвалялі-ся. Так было і з аплатай за лякарствы, у абодвух выпадках расходы пакрывалі-ся з мясцовага бюджэту. Раённы лекар атрымліваў штомесяц каля 300 злотых — 50 % платы наведвальнікаў.

Здароўе мясцовага насельніцтва было дрэнным. Раёны былі вымушаны прыступіць да барацьбы супраць распаўсюджанай трахомы, шмат гадоў не леча-най, затым былі тыф, адзёр і венерычныя захворванні, у прыватнасці сіфіліс.

У Друі працяглы час лекарам быў доктар Заслаўскі, адзін фельчар і адзін ложак, якія абслугоўвалі Друйскую і Лявонпальскую гміны. Раён Міёраў — шмат гадоў працаваў доктар Бачаньскі, фельчар і быў ложак на Міёрскую і Перабродскую гміны. Раён Пагост — працяглы час працаваў доктар Часлаў Валаньскі, фельчарам была інтэлігентная дачка лекара п. Касевічава з ведамі сярэдняга лекара.

Двароў і дваркоў было шмат...

Друкуецца па кн.: Задора-Цішэўскі М. Мае ўспаміны з Браслаўшчыны. 1918—1939 гг. (Пераклад з польскай мовы Л. А. Матэленка.)

«Беларускі цар»

Так называлі ў нашай мясцовасці Кузьму Юльянавіча Крука за яго клопат аб людзях і барацьбу за нацыянальнае вызваленне. Менавіта яму падараваў свой фотаздымак наш вядомы зямляк Пётр Мятла. Вось якія радкі верша Максіма Багдановіча былі змешчаны на адваротным баку здымка:

Хай пяе ён аб роднай зямлі,
Каб у сэрцы нам сорам ўзбудзіць,
Каб змагацца з няпраўдай ішлі,
Ў чыім сэрцы сумленне не спіць.

На ўспамін Кузьме Юльянавічу
аб сумеснай грамадскай працы
на карысць роднаму народу.
П, Мятла, 10 лістапада 1926 года.

Нарадзіўся Кузьма Юльянавіч у 1896 г. у в. Масцішча Мікалаёўскай воласці. Яго бацька Юльян Дамінікавіч меў хутар і зямлі каля 18 гектараў. Мясцовыя

Кузьма Крук (сядзіць)

ўлады яго хутар прызналі ўзорным. Сюды часта прыязджаў павятовы аграном, які вучыў, як трэба весці гаспадарку, як апрацоўваць зямлю. Ён прывёз усе тагачасныя сельскагаспадарчыя машыны: конны прывад, малацілку, арфу, сеялкі, плугі, каткі. Аграном хацеў паставіць бацьку цагляны дом і выкапаць рыбную сажалку, але Юльян Дамінікавіч пабаяўся, каб не трапіць у вялікія даўгі.

Юльян быў пісьменны, а таму цаніў грамату і, маючы шмат дзяцей, пусціў у свой дом школу, каб свае дзеці маглі таксама вучыцца. Старэйшага сына Кузьму, бачачы яго добрыя здольнасці, аддаў вучыцца ў Дзісенскую гімназію. У канцы 1915 г., калі ў час першай сусветнай вайны загінула на фронце шмат афіцэраў з дваран, сталі браць на вучобу ў ваенныя вучылішчы простых людзей, хто меў сярэднюю адукацыю. Кузьму паслалі вучыцца ў Іркуцкую школу прапаршчыкаў. Пасля заканчэння школы трапіў на фронт пад Рыгай. За мужнасць у баях атрымаў шэраг узнагарод.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ўступіў у рады Чырвонай Арміі. Яго дзейнасць высока ацаніў вядомы военачальнік Тухачэўскі. У 1920 г. вярнуўся ў родную вёску. Пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора Кузьма паехаў у Вільню, дзе пачаў вучыцца ў Віленскім універсітэце на юрыдычным факультэце, але закончыць вучобу яму не ўдалося. Ён адразу актыўна ўключыўся ў нацыянальны вызваленчы рух. Быў членам Таварыства беларускай школы, затым уступіў у Беларускую сялянска-рабочую грамаду. Тут ён актыўна супрацоўнічае з вядомымі дзеячамі нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі П. Мятлой, І. Дварчанінам, Б. Тарашкевічам, Б. Валошыным. Таксама прымаў актыўны ўдзел у выпуску часопіса «Маланка», які займаў актыўную антыпольскую пазіцыю.

У 30-я гады пад час выбараў у польскі сейм ён стаў кандыдатам у паслы. Менавіта тады, напэўна, у яго і з'явілася прозвішча «беларускі цар». Адзеўшы світку з пачкамі нумароў (тады бюлетэняў не было), ён на кані развозіў іх па вёсках Дзісеншчыны і Міёршчыны, дзе яго ўсе ведалі. Але ў сейм ён не быў абраны, бо палякі фальсіфікавалі выні кі выбараў. У 1938 г., калі нацыянальна-вызваленчы рух польскімі ўладамі быў фактычна задушаны, ён вымушаны вярнуцца з Вільні ў сваю вёску. Але яна была ў пагранічнай паласе, а таму польскія ўлады забаранілі яму там жыць. Нават калі ён хадзіў у Грыгаравіцкую царкву, то польскія пагранічнікі выводзілі яго за пагранпаласу. Увесь час польскай акупацыі Кузьма Юльянавіч змагаўся за зямельную рэформу, за беларускую школу, за вядзенне справа-

водства ва ўсіх установах на беларускай мове.

Пасля прыходу Чырвонай Арміі 17 верасня 1939 г. ён з цяжкасцю ўладкоўваецца працаваць настаўнікам Алекшыцкай сямігадовай школы. Савецкая ўлада не дала «беларускаму цару» значнай пасады, нягледзячы на тое што ён меў для гэтага дастатковую адукацыю. Наадварот, яму не давяралі, і каб не пачалася вайна, Кузьма Юльянавіч, магчыма, стаў бы ахвярай рэпрэсій, як і П. Мятла, У. Луцкевіч, Б. Тарашкевіч і інш. Пад час гітлераўскай акупацыі ён таксама працягваў працаваць настаўнікам. У маі 1942 г. быў арыштаваны Дзісенскай паліцыяй. Камендантам паліцыі з'яўляўся былы начальнік польскай пагранічнай варты, і зараз ён атрымаў магчымасць расквітацца з «беларускім царом».

27 мая 1942 г. Кузьма Юльянавіч быў расстраляны ў Дзісне.

В. А. Ермалёнак

Гімназія імя ксяндза Рыгора Пірамовіча ў Дзісне

Аўтар артыкула, надрукаванага ў Чэнстахоўскай газеце «Нядзеля», — Вацлава Францаўна Каўчыньска (дзявочае прозвішча Вярховіч) нарадзілася ў 1920 г. у в. Германавічы Дзісенскага павета Віленскага ваяводства. Да вайны закончыла школу ў Германавічах і Дзісенскую гімназію. Працавала настаўніцай у Германавіцкай школе. У пачатку 50-х гадоў разам з маці выехала ў Польшчу. Там яна прадоўжыла вучобу ў Кракаве. Абараніла доктарскую дысертацыю ў Гданьскім універсітэце. Ведае некалькі замежных моў, асабліва добра валодае французскай. Нягледзячы на пенсійны ўзрост, працягвае працаваць. Вацлава Каўчыньска — прафесар Люблінскага універсітэта імя Марыі Складоўскай-Кюры. Падтрымлівае цесную сувязь з Германавіцкім музеем мастацтва і этнаграфіі імя Язэпа Драздовіча.

XX стагоддзе — асабліва трагічнае стагоддзе па прычыне дзвюх сусветных войнаў, фашызму і сталінізму. Добра, калі ў гісторыі гэтага перыяду знойдзем моманты і месцы, якія ахвотна ўспамінаем. Да такіх месцаў для многіх палякаў належаць усходнія ўскраіны II Рэчы Паспалітай. Лёсы тых палякаў, раскіданых зараз па ўсёй краіне і па розных кутках зямнога шара, да апошняга часу заставаліся невядомымі.

Калі год таму назад я была ў Калгары, то заўважыла, з якім энтузіязмам палякі, якія там жывуць, чыталі ў «Нядзелі» артыкул аб Вільні. Малады чалавек сказаў, што, прачытаўшы гэты артыкул, стаў патрыётам Вільні, хоць ніколі там не быў. Спадарыня, супрацоўніца універсітэта, мела моцнае жаданне прачытаць што-небудзь аб ускраінным мястэчку Міёры, дзе жыў ксёндз Бародзіч, будаўнік касцёлаў у часы агрэсіі. Другія з вялікім пачуццём успаміналі Дзісну, дзе наведвалі заняткі ў гімназіі ці вянчаліся ў касцёле Святой Тэклі. Падзяляючы іх пачуцці да горада Дзісны, а асабліва да гімназіі імя Рыгора Пірамовіча, які назаўсёды застаўся ў памяці выхаванцаў, хачу коратка аб гэтым напісаць.

Дзісна часоў II Рэчы Паспалітай — гэта горад, размешчаны на самых далёкіх яе граніцах, у вусці ракі Дзісна, які зачароўвае сваімі зялёнымі насаджэннямі.

На вуліцы 3-га Мая, якая ідзе ўздоўж Дзвіны, стаяў крыж і пагранічны слуп.

Цікавую гісторыю гэтага горада падрабязна апісаў у сваёй кнізе «Дзісна і Друя — магдэбургскія гарады», выдадзенай у 1934 г., Отан Гедэман, датчанін па паходжанні, які, атрымаўшы філалагічную адукацыю ў Кіеве, пасяліўся ў Вільні і напісаў некалькі кніг аб гарадах Віленшчыны.

Тэрыторыя Дзісенскага павета калісьці адносілася да Вялікага княства Літоўскага, аб чым гаворыць запіс перадачы гэтых зямель праз Скіргайлу (1354—1397), брата Ягайлы, нейкаму Стэфану Дзяку. Гістарычнае ўпамінанне аб Дзісне маем таксама ў Метрыцы Літоўскай пад 1461 г. — «А судзіў сам кароль у Дзісне». Ужо тады гэты горад выдзяляўся. Хутка Казімір Ягелончык там спыніўся, каб чыніць суд. Дзісна была тады вотчынай з вялікакняжацкім

Вучні Дзісенскай гімназіі

дваром, адным з адміністрацыйных цэнтраў каралеўскіх уладанняў.

У 1560 г. успыхнула вайна паміж Жыгімонтам Аўгустам і Іванам Грозным, які пасля заваявання Інфлянтаў хацеў дасягнуць Балтыкі. Вайна прынесла неспрыяльны паварот для Польшчы і Літвы — Іван Грозны ўзяў Полацк. Насельніцтва, якое ўцякала ад маскалёў, пачало асядаць у Дзісне як у добрым для абароны месцы. Падняліся першыя ўмацаванні ў горадзе і на востраве, размешчаным на Дзвіне, які пазней быў названы востравам Баторыя.

Першы падзел Польшчы, лінія якога праходзіла ўздоўж Дзвіны, паставіў імперыю Кацярыны II у непасрэднае суседства з Дзісной, знішчаючы дзвінскі гандаль — галоўную крыніцу даходаў жыхароў горада. Пасля другога падзелу Дзісна апынулася за межамі Рэчы Паспалітай. Перыяд падзелаў не прынёс Дзісне росквіту. У прадмесці, з боку Дзвіны, знаходзіўся маёнтак са старым паркам, калісьці перададзены Скіргайлам полацкім баярам Дарашкевічам. Пасля даўніх уладальнікаў засталася толькі назва, таму што маёнтак належаў ужо Кастравіцкім. Аднак калі Адам Кастравіцкі, маршалак Віленскай губерні, быў асланы ў Арэнбург, маёнтак быў канфіскаваны на карысць расіяніна. Маці Адама Кастравіцкага, з роду Пангоўскіх, добра ведала Міцкевіча і клапацілася аб філарэтах.

У часы II Рэчы Паспалітай стары парк з капліцай належаў расійскаму роду Капыловых. Моладзь хадзіла там часта на прагулку, таму што паблізу знаходзілася гімназія, перабудаваная з царскай турмы. Арганізатарам гэтай гімназіі быў доктар Тадэвуш Станеўскі, які нарадзіўся ў 1886 г. у Блудаве на Валыні, а памёр у Вейхерове ў 1978 г. Т. Станеўскі вывучаў у Ягелонскім універсітэце філасофію і гісторыю. Там атрымаў ступень доктара філасофіі, а потым прысвяціў сябе педагагічнай

працы — з перапынкам на час ваеннай службы, калі прымаў удзел у бітвах II брыгады легіянераў.

У верасні 1921 г. доктар Т. Станеўскі прыняў прапанову арганізаваць польскую гімназію ў Дзісне. З першай справаздачы за 1921/22 навучальны год вынікае, што гэтае заданне не было лёгкім. Вялікая колькасць кандыдатаў у ніжэйшыя класы гімназіі патрабавала вырашэння мясцовых і кадравых праблем.

Будынкі царскай турмы ў хуткім часе былі перабудаваны і добра прыстасаваны да навучальных заняткаў. Апрача галоўнага будынка з класамі былі гімнастычная зала, майстэрня ручной працы са станкамі, а таксама кабінет біялогіі, за якім быў размешчаны вялізны батанічны сад. Склаўся добры педагагічны калектыў, хоць было нялёгка прыцягнуць людзей з універсітэцкай адукацыяй на граніцу.

Высока было пастаўлена выкладанне гуманітарных прадметаў. Заходнія мовы па выбары, толькі лацінская мова, якая мае так многа агульнага з польскай, была абавязковай. Выкладаў яе вельмі патрабавальны прафесар І. Валашчук. І нічога дзіўнага, што прыгажосць лацінскай граматыкі і паэзіі моцна зачаравала многіх на ўсё жыццё. Рэлігія з'яўлялася абавязковым прадметам. На ўроках клас дзяліўся на групы па веравызнаннях. Больш за ўсіх было каталікаў, рэлігіі вучыў ксёндз С. Малахоўскі, пазней — ксёндз А. Забельскі.

Моладзь была таксама размеркавана па нацыянальнай і грамадскай прыналежнасці, аднак гэтыя адрозненні не выклікалі ніякіх антаганізмаў. У гімназіі добра працавала вучнёўскае самакіраванне, тэатральны гурток, мы мелі ўласны штомесячны часопіс «Наш голас», які друкаваўся ў павятовай друкарні і на конкурсе ў 1937 г. заняў трэцяе месца ў краі. У месячніку паказаў сябе школьны паэтычны клуб, які знаходзіўся пад уплывам «Маладой Польшчы». У 1935 г. быў выдадзены зборнік паэзіі Д. М. Касатага пад назвай «Купальскія агні. Рэха з-пад Дзвіны». Часта наладжваліся экскурсіі ў Вільню, Варшаву, Гдыню. Вельмі добрыя ўражанні засталіся ад падарожжаў з братамі-марыянамі да Вострай Брамы ў Вільні.

Сёння, пасля доўгіх гадоў педагагічнай працы, лічу, што гімназія ў Дзісне была на высокім узроўні адукацыі і выхавання. Апекаваўся над ёю ксёндз Рыгор Пірамовіч, таму нічога дзіўнага, што сем выпускнікоў гімназіі выбралі духоўны шлях (у тым ліку пяць ксяндзоў, адзін епіскап і начальніца сясцёр-



Будынак Дзісенскай гімназіі

Вучні і выкладчыкі Дзісенскай гімназіі

назарэцянак у Ларэта ў Італіі). Сярод выпускнікоў ёсць урачы і фармацэўты, пісьменнікі і паэты, педагогі і вучоныя. Шкада, што гэтая цудоўная гімназія існавала толькі 18 гадоў.

17 верасня 1939 г. паклала канец яе існаванню. У гэты дзень прафесар гімназіі Зыгмунт Герговіч, паручнік запасу і камендант горада, з 15 салдатамі, 14 вучнямі і 3 паліцэйскімі мужна абараняў Дзісну ад батальёна расійскай пяхоты.

У няроўным баі ён упаў цяжка паранены, быў перавезены за Дзвіну, са Смаленска пісаў жонцы — прафесару той жа гімназіі. Загінуў у Катыні.

У хуткім часе гімназія імя кс. Рыгора Пірамовіча стала школай-дзесяцігодкай. У час вайны будынкі гімназіі захаваліся і цяпер у іх размяшчаецца бальніца.

Вайна, Сібір, работы ў Германіі, эміграцыя і рэпатрыяцыя раскідалі выпускнікоў гімназіі па ўсім свеце, аднак яны заўсёды імкнуцца падтрымліваць паміж сабой кантакты, доказам чаго з'яўляюцца два з'езды, арганізаваныя ў Беластоцкім ваяводстве.

Вацлава Кучыньска
(Пераклад з польскай мовы К. Кожана)

«Наш голас» — часопіс Дзісенскай гімназіі

Вучнёўскае самакіраванне «Супрацоўніцтва» гімназіі імя кс. Гжэгажа Пірамовіча ў Дзісне пачало выдаваць часопіс «Наш голас» у 1930/31 навучальным годзе. Спачатку ён выходзіў раз у месяц, а з 1933 г. — двойчы. У гісторыі каралеўскага горада гэта было першае і адзінае друкаванае польскамоўнае выданне. Яно з'явілася па ініцыятыве дырэктара гімназіі доктара Тадэвуша Станеўскага пры клапатлівай падтрымцы ксяндза Сільвестра Малахоўскага.

Апеку над часопісам было даручана ажыццяўляць прафесарам гімназіі Аляксандру Мацяшку, а потым Аляксандру-Баляславу Цыпсу, Вандзе Хмялеўскай і Станіславу Станкевічу.

Галоўнымі рэдактарамі заўсёды былі вучні ў асноўным выпускных класаў. Першы — Пётр Пупін (у будучым ксёндз), затым Ян Гушча (беларускамоўны пісьменнік), Мілецій Андзіленка, Дзмітр-Мечыслаў Касаты (паэт, дырэктар БВА ў Вроцлаве), Леапольд Драздовіч, Юзаф Буёнак і апошнім у 1939 г. стаў Генрых Пухальскі.

Першы нумар «Нашага голаса» ў 1930 г. быў надрукаваны на шклографе. Як успамінае Пётр Пупін, назва адлюстроўвала «імкненне зрабіць часопіс голасам нашых меркаванняў, які б быў чутны не толькі ў Дзісне, але і ва ўсёй Польшчы». Спачатку выдадзена 70 экземпляраў, затым тыраж павялічыўся да 300. У 1931 г. часопіс друкаваўся ў Вільні (друкарня Казіміра Ліньковіча). З наступнага года выкарыстоўвалі друкарні Глыбокага, спачатку М. Казовіча, а з 1933 г. — З. Шэйнбойма. Апошні нумар перад пачаткам другой сусветнай вайны выйшаў з друкарні паноў Шэйнбойма і Голдберга.

Характэрна, што цана часопіса на працягу ўсіх дзесяці гадоў не мянялася, чаму сёння можа пазайздросціць любое выданне: 50 грошаў за нумар, 5 злотых на год з перасылкай, а для вучняў 30 грошаў за асобнік, 2,5 злотых на год з перасылкай, без перасылкі — 2 злоты. Таму выдаўцы ўвесь час пераадольвалі фінансавыя цяжкасці. Падтрымлівалі часопіс дырэктар Станеўскі і гаспадар млына Майжэш Бімбат.

«Наш голас» спачатку з'яўляўся часопісам навуковай літаратуры, а з 1934 г. — навукова-літаратурным і грамадскім. Друкаваўся кароткімі сказамі, выразнай і зразумелай мовай, амаль без памылак. Праўда, часта рэдактары з-за недасведчанасці не пазбягалі нейкіх недакладнасцей. Так, у інтэрв'ю з новым бурмістрам не было адзначана яго прозвішча. Зараз ужо мала хто памятае, што гэта быў бацька нашай сяброўкі Міры Пуцятаўны.

У чацвёртым нумары часопіса за 1931 г. рэдакцыя прыводзіць словы прафесара Віленскага універсітэта Яна Снядэцкага з XVIII ст.: «Мова — гэта не сукенка жанчыны, якую можна перарабіць, перакруціць, пакамячыць, каб потым яе выкінуць і забыць». З мовай звязана перш за ўсё культурная прыналежнасць. Гэтыя радкі актуальныя і сёння. З публікацыі можна даведацца, што мову беларусаў у Маскве звалі літоўскай і перакладалі з яе.

Кожны нумар часопіса адкрываўся ўступным артыкулам рэдактара, які ўтрымліваў асноўныя палажэнні аб яго мэце — займацца справамі навукі, літаратуры і грамадскага жыцця. Таму выданне стаяла на даволі высокім мастацкім і літаратурным узроўні, трымаючы чацвёртае месца паміж школьных выданняў усёй Польшчы. І да апошняга нумара часопіс быў верны свайму запавету: адлюстроўваць лад жыцця асяроддзя, з якога паходзіць большасць моладзі, — вёскі. Таму друкаваў паданні і легенды, расказваў пра звычаі і традыцыі беларускага народа як хроніку таго, што ўжо знікае.

Шмат месца ў часопісе адведзена гісторыі каралеўскага горада Дзісна. Былі навіны з краіны і ўсяго свету, рэгіянальная тэматыка. Асвятляліся пытанні культуры, змяшчаліся рэцэнзіі на тэатральныя прадстаўленні, канцэрты школьнікаў. Друкаваліся матэрыялы пра мясцовыя грамадскія і гаспадарчыя справы. «Наш голас» актыўна ўдзельнічаў у жыцці горада. Быў, напрыклад, надрукаваны бюджэт Дзісны, праводзілася дыскусія аб неабходнасці будаўніцтва чыгункі з Шаркоўшчыны, уносіліся прапановы добраўпарадкаваць гарадскі парк імя Браніслава Перацкага, палепшыць стан вуліц і дарог.

Шырока асвятлялася жыццё гімназіі і ліцэя, маладзёжных арганізацый. Часопіс паведамляў, што існавала тава-

Выпускнікі Дзісенскай гімназіі

рыства акадэмікаў-дзіснян, старшынёй якога быў Данат Масальскі, пазней доктар-хірург, які памёр у Торуні. Куратарам гэтай арганізацыі з'яўляўся Тадэвуш Чыжоўскі з універсітэта Стэфана Баторыя ў Вільні. Ішла гаворка аб дзейнасці аб'яднання выхаванцаў гарадской гімназіі, аб жыцці харцарскай дружыны імя Рамуальда Траўгута, аб справах вучнёўскага самакіравання і яго секцый, аб саюзе «земян крэсовых», аб існаванні метэаралагічнай станцыі. Адным словам, часопіс быў універсальны і рознабаковы.

З «Нашага голасу» вядома, што да 1900 г. у Дзісне сярэдняй школы не было. Першая ўстанова такога тыпу — прагімназія Барбары Дзімітравай і Веры Лішынай, якая існавала два гады. У 1908—1909 гг. дзейнічала новая гімназія Палагеі Навіцкай, таксама руская, мела чатыры класы. Перастала існаваць з-за недахопу сродкаў. У 1906 г. з'явілася таемная польская школа ў доме пані Снарскай. У 1917 г. па ініцыятыве дзісенца Казіміра Русецкага ўтвараецца камітэт прыватнай гімназіі з рускай і абавязковай польскай мовамі. У 1918 г. пад час нямецкай акупацыі пачынае працаваць польская прагімназія на чале з дырэктарам Бургартам. Нарэшце, у 1921/22 навучальным годзе адкрылася гімназія імя ксяндза Г. Піраміовіча, першым яе дырэктарам стаў доктар Тадэвуш Станеўскі. Яна атрымала нумар 925.

Кожны мог знайсці ў часопісе нешта для сябе: звесткі пра касу Стэфчыка, парады па жывёлагадоўлі, рыбалоўству, апрацоўцы лёну. Дзякуючы такой універсальнасці ён не аднойчы атрымліваў станоўчыя рэцэнзіі ў друку.

З 1935 г. у «Нашым голасе» пераважае рэгіянальная тэматыка: мясцовая вёска з яе традыцыямі і будучыняй, мястэчкі, археалагічныя раскопкі, цікавыя тутэйшыя выпадкі. Ці ж не цікава, што нібыта ў 1824 г. жыў у маёнтку Кастравіцкіх у Дарожкавічах Адам Міцкевіч? І шмат легенд і песень на бела-

рускай мове і аб Беларусі. Вось, напрыклад, урывак з верша Д. Касатага «Беларусь» у нерыфмаваным перакладзе:

Люблю цябе, сумную, забытую зямлю,
Людзей спакойных, абцяжараных спякотнай працай,
Ціха граючыя ў касцёле арганы,
Нядзельныя фэсты, святы і пасты.
Люблю гэта ўсё і адчуваю гэта ў сабе.

Шмат пішацца аб нацыянальных меншасцях — літоўцах і стараверах. Справа для тых часоў нехарактэрная, але часопіс выдзяляўся нацыянальнай і рэлігійнай талерантнасцю.

Знаходзім у часопісе шмат звестак пра выпускнікоў гімназіі. Так, сталі ксяндзамі ці клірыкамі Ян Лінцэвіч, Клеманс Піявару, Пётр Пупін, Герман Мацкевіч, Зянон Лазоўскі, Юзаф Гірэт, Юзаф Буёнак, Яўгеніюш Бэлюй, а Эдвард Кісель нават беластоцкім архіепіскапам і мітрапалітам. З дзісенскай вуліцы Заліўной паходзіць глыбоцкі дэкан ксёндз Антоні Зінкевіч.

Найбольш цікавыя артыкулы выклікалі дыскусіі, уздымалі аўтарытэт іх аўтараў. Да сённяшняга дня цікавыя аб'явы як сведчанні эпохі. Напрыклад, цырульня Х. Формана, што існавала з 1897 г., абяцала жанчынам найноўшыя прычоскі. Крама Г. Гаўтмана прапаноўвала ўсё добрае, свежае, усё высокай якасці і па даступных цэнах.

Дзесяцігадовага юбілею «Наш голас» не дачакаўся. З 1930 да 1939 г. з'явілася некалькі дзесяткаў сшыткаў. Невядома, ці захаваўся першы нумар, ці выйшаў апошні нумар за 1939 г. Па ініцыятыве першага рэдактара Пятра Пупіна было вырашана сабраць першы сяброўскі з'езд выпускнікоў гімназіі ў 1940 г. Аднак да гэтага справа не дайшла.

Застаецца сказаць, што часопіс цалкам рэдагаваўся вучнямі. А больш глыбокі і змястоўны навуковы аналіз яго яшчэ наперадзе.

Міхаіл Вазгірд
(Пераклад з польскай мовы
В. А. Ермалёнка)

Па старонках часопіса «Наш голас»

Здвоены № 3—4 за 1938 г.

НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ДАСЯГНЕННІ НАШАЙ УСТАНОВЫ Ў 1937/38 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ

...Моладзь гімназіі выступіла ініцыятарам у знак прызнання заслуг маршала Сміглага-Рыдза ўнесці прапанову ў гарадскую Раду аб прысваенні яму ганаровага грамадзянства г. Дзісна.

У час дыскусіі па гэтаму пытанню нарадзілася думка афяраваць для арміі ўзбраенне. Гімназія ўжо прыступіла да рэалізацыі той ідэі, даруе за кошт уласных сродкаў адзін кулямёт. Моладзь з энтузіязмам удзельнічае ў гэтай справе.

У першы раз харцарская дружына хлопцаў і часткова дзяўчат паедзе ў час канікулаў у харцарскі лагер на Нарачы. Для гэтай мэты засталося купіць тры палаткі, кожная на 10 асоб.

30 мая паехаў трэці клас з 37 чалавек на 16-дзённую краязнаўчую экскурсію. Яе траса: Вільня, Варшава, Кракаў, Вялічка, Закапане. Экскурсія ў горы, дарога ўздоўж Падкарпацця да Драгабужа і нафтавага Заглемба, Заляшчылкі, пераход праз румынскую граніцу, Львоў і вяртанне праз Варшаву і Вільна. Кошт экскурсіі каля 3500 злот...

НАШ РЭГІЯНАЛЬНЫ МУЗЕЙ

Рэгіянальны музей пры нашай гімназіі пачаў стварацца ў 1936 г. пані праф. Вандай Хмялеўскай. Па яе ініцыятыве моладзь занялася той справай — даць пачатак музею. З таго года музей знаходзіцца пад апекай краязнаўчага гуртка пад кіраўніцтвам п. праф. Ганны Вілавічоўны. Непасрэдным адказным з'яўляецца калега Ільін (4-ы клас). Задачай гэтага музея з'яўляецца збор скарбаў нашай зямлі тут, на ўскрайку. Музей збірае рэчы, выраблены мазольнай працай вяскоўца...

...Маем наступныя рэчы: пастуховыя торбы малую і вялікую, прылады для вырабу тоўстых вяровак (кручкі), лыжку з дзвюма дзіркамі для вырабу асновы, музычны інструмент, т. зв. «жалейка», «разец» для вырабу драўляных лыжак, тры пары лапцей з ліпавага лыка і лазовай кары, паплавок невада, шчотка са скуры яжа для часання лёну, 2 драўляныя лыжкі, апалонік, драўляная «чарка» для піцця гарэлкі, цэп, ігліца для вязання сеткі, ткацкі чаўнок, «бёрды» (для працягвання асновы пры ткацтве), «сумка» для нашэння кніжак, З верацяны, шпулька для калаўрота, трапачка для трапання лёну ад кастры (трапло)...

Прыкладна трэць не мае назвы ні па-польску, ні па-беларуску. Можа хто ведае правільную назву?

Далей маем скураныя капшукі на тытунь і грошы, шыла для «падлатання» лапцей, вуды, сеткі і пробы лёну. Яшчэ фотаздымкі, паказваючыя спосаб прымянення такіх прылад. Кідаецца тут у вочы вясковы лад. Цэласнасць музея дапаўняюць карціны і разьба пана Гушчы (в. Задвор'е Язненскай гміны Дзісенскага павета)...

Ідзём наперад. У мінулым годзе мелі каля 110 экспанатаў, а ў гэтым — 180. Трэба дадаць, што сёлетнія знаходкі па вартасці лепшыя. Належыць тут падкрэсліць вялікую ахвярнасць бацькоў і жаданне вучняў. З тых рэчаў некаторыя рэдка сустракаюцца і ўяўляюць вялікую навуковую каштоўнасць. Кіраўніцтва музея дзякуе моладзі за сумесную работу, а асабліва калегам Феліксу Гушчу (1 «б»), Казіміру Грыгаровічу (1 «б»), Казіміру Бесікірскаму (1 «а») і Мікалаю Муху (1 «б»). Просім вас, калегі, аб далейшай сумеснай працы...

М. Рачыцкі, 2 «б» кл.

ХРОНІКА

У гэтым школьным годзе акрамя канцэрта з удзелам варшаўскіх артыстаў Бендэра і Кавальскага ў нашай гімназіі адбыліся 3 школьныя музычныя канцэрты, арганізаваныя ўласнымі сіламі. Праграма тых канцэртаў наступная:

25.02.38 г. «Саната». Класічныя творы выканаў скрыпічны квартэт музычнага таварыства пад кіраўніцтвам праф. Струмілоўскага.

30.03.38 г. «Манюшка». Арыі, песні і інструментальныя творы ў выкананні вучняў.

28.04.38 г. «Класікі і рамантыкі». Творы ў выкананні квартэта музычнага таварыства і сольныя нумары.

* * *

Школьная бібліятэка папоўніла ў бягучым годзе свае запасы. Прыбыло 267 тамоў, агульная колькасць кніг павялічылася з 4428 да 4695 тамоў. Пабагацелі ўвогуле 2 аддзелы — мастацкай літаратуры на 115 тамоў і сучасных моў на 66 тамоў.

З «КАЛЕНДАРА РЭПАРЦЁРА»

27.3.38 г. Другі клас «б» наладзіў у «Народным доме» прадстаўленне. Сыгралі спектакль Марыі Райтуўны «Чаравічак каралевы Ядвігі».

3.4.38 г. Адбыўся бацькоўскі сход.

10.4.38 г. У «Народным доме» адбыўся публічны сход з рэфератам п. праф. Шрэдэра аб каланіяльных справах з удзелам гімназічнай моладзі.

3.5.38 г. Народнае свята. Пасля абеду адбыўся народны бег, у якім удзельнічала гімназічная моладзь з 16 гадоў.

Інструментальны аркестр Дзісенскай гімназіі

6.5.38 г. Пісьмовыя экзамены.
16—19.5.38 г. Вусныя выпускныя экзамены.
18.6.38 г. Экскурсія ў Мазурына на сухапутную граніцу з СССР.
26.5.38 г. Пасля абеду бацькоўскі камітэт арганізаваў у гарадскім парку народнае свята.
28.6.38 г. Выпускны баль. Іграў ваенны аркестр з Лужкоў.

Пераклад з польскай мовы
Л. А. Матэленка

ДА ЖЫЦЦЯ НОВАГА, САВЕЦКАГА (ПЕРШЫЯ КРОКІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПЕРАБУДОВЫ ЖЫЦЦЯ)

З 17 верасня 1939 г. у гісторыі Міёршчыны наступае новы этап. Тут, у паграніччы, пачынаўся першы з шасці дзён паходу Чырвонай Арміі па Заходняй Беларусі. Мясцовае насельніцтва сустракала яе з надзеяй і ўздымам. Паўсямесна ствараюцца часовыя ўправы з прадстаўнікоў Чырвонай Арміі і працоўных, арганізоўваюцца сялянскія камітэты. Напрыклад, у в. Цвеціна ў такі камітэт былі выбраны Васіль Усціновіч, Васіль Брынкевіч, Іван Фурс, Вікенцій Сачыўка, Уладзімір Капуста, Вікенцій Руткоўскі і інш. Кіраваў яго работай Мікалай Мятла.

Камітэт размяркоўваў панскія землі, браў пад свой кантроль маёмасць маёнткаў, аказваў дапамогу беднякам і парабкам.

У кастрычніку 1939 г. была ўтворана Вілейская вобласць, у якую ў ліку сямі раёнаў уваходзіў Дзісенскі. А 15 студзеня 1940 г. на падставе Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР арганізоўваецца раён з цэнтрам у Міёрах. У яго ўвайшлі гарадскі (1075 жыхароў) і 19 сельскіх Саветаў (36 006 жыхароў). Міёры на той час уяўлялі сабой неўпа-

радкаваную вёску, якая пражыла вялікі пажар, з насельніцтвам крыху больш за тысячу чалавек, пераважна яўрэяў. Прамысловасць абмяжоўвалася лесапільняй і млынам.

22 кастрычніка ў Заходняй Беларусі прайшлі выбары дэпутатаў у Народны сход. Міёршчыну прадстаўлялі настаўнік Ф. Д. Манцэвіч, сяляне А. Л. Сінкевіч, А. М. Арцімёнак, Невядомскі, пісьменнік Міхась Машара і інш. 28—30 кастрычніка ў Беластоку яны галасавалі за дэкларацыю аб устанаўленні ў Заходняй Беларусі савецкай улады, уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР, канфіскацыі памешчыцкіх земляў, нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці.

Дакладчыкам па пытанні «Аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР» быў Флор Данатавіч Манцэвіч. Менавіта ён унёс на абмеркаванне дэлегатаў прапанову аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР і тым самым у склад СССР. Ф. Д. Манцэвіч, А. І. Арцімёнак, А. Л. Сінкевіч і М. А. Машара былі выбраны ў склад паўнамоцнай камісіі для перадачы рашэння Народнага сходу Вярхоўнаму Савету СССР.

Выступаючы ад імя працоўных Дзісеншчыны, селянін Васіль Сямёнавіч Стома з вёскі Касатыя гаварыў на нечарговай сесіі Вярхоўнага Савета БССР: «Жылося нам у Польшчы вельмі дрэнна, паны не давалі развівацца нашай культуры. Але ўсё-такі ім не ўдалося задушыць наш моцны народны дух. 20 гадоў нас душылі, але не выкаранілі нашай мовы, як толькі паноў не стала, мы свабодна назвалі сябе беларусамі».

Новы час прынёс новыя змены. Адна з іх — калектывізацыя ў вёсцы. Неўзабаве пасля ўз'яднання адным з першых па ініцыятыве сялян ствараецца калгас «17-е Верасня» ў в. Касатыя. Захаваліся пратаколы сходаў грамадзян мястэчка Лявонпаль. У адным з іх паведамляецца, што 14 лютага 1940 г. абмяркоўвалася пытанне аб арганізацыі

М. Б. Бакша

калгаса. 74 чалавекі, якія прысутнічалі на сходзе, стварылі сельгасарцель — таксама «17-е Верасня». Быў зацверджаны яе статут, які першым падпісаў Сяргей Панізнік. У склад праўлення былі выбраны Міхаіл Бакша (старшыня), Пётр Афончанка, Марыя Белавус і іншыя сяляне. Яны вырашалі ўсе пытанні жыцця калектыўнай гаспадаркі: стварылі добраахвотную дружыну і будаўнічую брыгаду, гаварылі пра адкрыццё ясляў і заключэнне дагавору з МТС, клапаціліся аб папярэджанні крадзяжоў.

18 сакавіка 1940 г. сяляне в. Свярдлы сталі членамі калгаса «Парыжская камуна», у які ўвайшлі 69 гаспадарак. Першым старшынёй яго быў выбраны Сцяпан Вікенцьевіч Вайсковіч.

30 сакавіка на агульным сходзе жыхароў в. Слабада прынята рашэнне аб арганізацыі калектыўнай гаспадаркі «Чырвоны сцяг», у якую неўзабаве ўступіла 108 сем'яў. Сяляне выбралі старшынёй калгаса Ануфрыя Амбросьевіча Жугера.

Растлумачальную работу па арганізацыі калгаса ў в. Чэрасы праводзіў прадстаўнік райкама Кухаронак. Першымі ў калектыўную гаспадарку ў 1940 г. ўступілі Прохар Мацюк, Рыгор Мацюк, Аляксандр Мацюк, Барыс Мацюк, Сцяпан Мацюк, Іван Костка і інш. Старшынёй выбралі Іосіфа Іванавіча Шчаснага, які загінуў у час вайны. Былі абагулены зямля, коні, інвентар, насенне.

Утварыліся дзве брыгады — у Чэрасах і Слаўшчызне. У панскім доме пасялілі-ся бяздомныя сяляне-калгаснікі, асад-ніцкі дом стаў клубам, дзе моладзь ак-тыўна ўдзельнічала ў мастацкай сама-дзейнасці. Утварылася камсамольская арганізацыя, першымі камсамольцамі сталі Мікалай Крук, Гайлевіч — стар-шыня сельскага Савета, настаўніцы Кі-сялёва, Сарокіна, Запатылак, калгасні-цы Алена Талочка і Кацярына Бяляў-ская.

У верасні 1940 г. у раёне была ўжо 21 калектыўная гаспадарка. Для сумес-най працы аб'ядналіся 780 сялянскіх гаспадарак з 8848. У сельгасарцелях працавалі 3 аграномы і столькі ж заа-тэхнікаў, адзін ветурач. Неабходны быў яшчэ ветурач, два ветфельчары, іншыя спецыялісты. На месцы падрыхтавана 20 рахункаводаў, 21 брыгадзір па сіла-саванню, 40 трактарыстаў. Увогуле на кааператыўную і гаспадарчую работу вылучана больш за 240 чалавек, звольне-ны 63 былыя гандляры, «кіраўнікі і члены контррэвалюцыйных арганіза-цый».

Праводзілася вялікая агітацыйна-пра-пагандысцкая праца па арганізацыі кал-гасаў, дзейнічала 20 агіткалектываў, у складзе якіх было 345 агітатараў. Райкам партыі намеціў стварыць яшчэ 5 агіткалектываў пры пярвічных парт-арганізацыях. Толькі за ліпень — вера-сень яны прачыталі 685 дакладаў па матэрыялах XVIII з'езда партыі, міжна-роднаму становішчу, іншых пытаннях. Вялікая арганізацыйная і прапаган-дысцкая праца давала свой плён.

Калектыўныя гаспадаркі ствараліся ў многіх вёсках. Захаваўся трэці нумар раённай газеты «Бальшавіцкая трыбу-на», які сведчыць: у межах тагачаснага Міёрскага раёна на май 1941 г. дзейні-чалі 34 калгасы. У былым маёнтку Клётаў Двор ствараецца МТС на 10 трактараў. Аднак тут яшчэ не хапала 2 малацілак, 19 трыераў, 20 веялак, 17 пажарных насосаў, 100 вогнетушы-целяў.

Сумеснай пастановай райкама партыі і райвыканкама ад 10 красавіка 1940 г. зацверджаны план яравой сяўбы на 20 920 га, у тым ліку зерневыя і зерне-бабовыя павінны былі заняць 10 720 га (яравая пшаніца — 650, серадэла — 50, лубін — 190), кармавыя — 3200 га (ка-раняплоды — 260, аднагадовыя тра-вы — 465, шматгадовыя травы — 2775), лён — 2950 га, каноплі — 50, бульба — 3920, агародніна — 80 га. Калгасы па-вінны былі пасеяць 1432 га (850 га збожжавых, 197 — лёну, 225 — бульбы, 131 — аднагадовых траў, 20 — караня-плодаў, 5 — агародніны, 4 — канап-ляў).

Што яшчэ прынесла новае жыццё ў вёску? Напрыклад, у в. Чэрасы акра-мя клуба былі адкрыты бібліятэка, мед-пункт, школа-сямігодка.

Па ўсёй Заходняй Беларусі прапа-гандаваліся афармленне і арганізацыя работы хаты-чытальні ў Пераброддзі. Да лета 1940 г. тут была зручная мэбля, музычныя інструменты, зроблены стэн-ды для выставак, спецыяльныя сталы для настольных гульняў, чатыры фота-вітрыны, якія адлюстроўвалі дасягненні сельскай гаспадаркі, калгаснага будаў-ніцтва, прамысловасці і транспарту, аформлены вітрыны на атэістычныя тэ-мы. Вяскоўцы прыходзілі ў хату-чы-тальню паслухаць даклад ці лекцыю, прыняць удзел у гутарцы ці гучных чытках. Драмгурток паставіў некалькі п'ес. Гурткі мастацкай самадзейнасці наведвалі з канцэртамі бліжэйшыя кал-гасы. Штомесячна выходзіла насцен-газета. Дзейнічалі гурткі па ліквідацыі малапісьменнасці, па падрыхтоўцы і здачы норм ГСО, ПВХО і інш.

Да ўсяго гэтага трэба дадаць, што ўжо тады в. Пераброддзе мела тры-валыя песенныя традыцыі. Яшчэ да 1939 г. тут арганізаваўся хор, які ак-тыўна выступаў да 1989 г.

У былым павятовым цэнтры — гора-дзе Дзісна — да 1940 г. былі створаны райкам партыі і райвыканкам, гарсавет. Тут намячалася будаваць вінзавод рэс-

публіканскага значэння. Адбываецца рэарганізацыя дзвюх школ, ствараецца школа для дарослых, адкрываецца амбулаторыя, два Дамы сацыялістычнай культуры, бібліятэка, сталовая, гасцініца. Арганізавана школа савецкай міліцыі на 150 чалавек. У Дзісне бальніца расшыраецца, у Новым Пагосце адкрываецца новая. Уся медыцынская дапамога становіцца бясплатнай. Расходы на ахову здароўя ўзрастаюць з 15 кап. на чалавека ў часы панскай Польшчы да 23 руб. 50 кап. у 1940 г. З вялікім уздымам у 1940 г. праходзяць у Дзісенскім і Міёрскім раёнах выбары ў Вярхоўныя Саветы СССР і БССР — першыя такія выбары пасля ўз'яднання. Дэпутатамі ад Дзісны, у прыватнасці, выбраны К. В. Кісялёў, А. С. Малевіна, Ф. Ф. Струй.

На 1 красавіка 1940 г. у раёне былі 31 член ВКП(б) і 10 кандыдатаў. Яны аб'ядноўваліся ў трох пярвічных партарганізацыях, кандыдацкай і партыйна-камсамольскай групах. Першыя партарганізацыі з'явіліся ў райспажыўсаюзе, міліцыі, райвыканкаме і райкаме партыі.

Першая партыйная канферэнцыя ў Міёрах праходзіла 11—12 красавіка 1940 г. На ёй прысутнічала 35 дэлегатаў з рашаючым і 8 — з дарадчым галасамі. Яны выбралі раённы камітэт з 7 чалавек. У іх ліку былі першы сакратар РК КП(б)Б Фядот Паўлавіч Аксёнаў, другі сакратар Мікалай Фёдаравіч Прохараў, трэці — Іван Аляксеевіч Кобыш, старшыня райвыканкама Васіль Якаўлевіч Шклярык, загадчык арганізацыйна-інструктарскага аддзела Кузьма Маркавіч Кірылаў, начальнік НКДБ Маісей Паўлавіч Шаўчэнка.

Пад кіраўніцтвам райкама партыі праводзіцца калектывізацыя сельскай гаспадаркі, ствараюцца гурткі палітвучобы і агіткалектывы, арганізацыі АСАВІЯХІМа і Чырвонага Крыжа, камітэт фізкультуры і інш. Дакументы РК КП(б)Б, якія захаваліся ў архівах, сведчаць, што арганізаванага супраціўлення замацаванню савецкай улады на Міёршчыне не было. Аднак гэты працэс нельга назваць простым і лёгкім. У раёне не хапала не толькі арганізатараў вытворчасці, мала было проста адукаваных, пісьменных людзей, нестава ла сіл і сродкаў.

У 1940 г. на Міёршчыне зарадзіўся камсамол. Пярвічныя арганізацыі налічвалі ў Перабродцзі 13 юнакоў і дзяўчат, у Новым Пагосце — 8, Чэрасах — 9, Новых Круках — 7, калгасах «Парыжская камуна» — 12, «17-е Верасня» — 8, «Чырвоны сцяг» Александрынскага сельсавета — 6, «Чырвоны сцяг» Валькаўскага сельсавета — 5. Да жніўня ўжо дзейнічала 16 «пярвічак». Першым сакратаром РК ЛКСМБ быў Казлоў.

У пачатку 1941 г. арганізуюцца 30-дзённыя курсы для 30 цялятніц, 42 загадчыкаў ферм і старшых конюхаў, 25 брыгадзіраў паляводчых брыгад. Намячаецца вучоба старшынь калгасаў, зацвярджаецца семінар для павышэння палітычнага і тэарэтычнага ўзроўню кіруючых работнікаў раёна. Яго кіраўнік — новы першы сакратар РК КП(б)Б Сяргей Піліпавіч Саўрэй, зацверджаны на гэтай пасадзе 2 лютага 1941 г.

Утвараюцца сельскія Саветы. Іх першымі старшынямі і сакратарамі выбіраюцца: у Перабродцзі — Платон Савельевіч Яфімаў і Іван Пальчэўскі, у Новых Круках — Максім Макаравіч Матылёнак і Уладзімір Тарасавіч Грэцкі, у Жуках — Вікенцій Антонавіч Цярэшка і І. Г. Федушкевіч, у Павяцці — Міхаіл Казіміравіч Сасновіч і Іосіф Аляксеевіч Шпак, у Новым Пагосце — Назарый Ягоравіч Лутохін і Андрэй Пятровіч Лабаноўскі, у Чэрасах — Павел Міхайлавіч Сушко і Іван Іосіфавіч Анашка, у Міёрах — Станіслаў Ігнатавіч Альхімовіч і Станіслаў Іванавіч Суравец, у Лебедзеве — Іосіф Вікенцьевіч Гернат і І. І. Самулевіч. У Дворным Сяле старшынёй быў Іван Лявонавіч Мароз і сакратаром у Лявонаўцах — Даніла Антонавіч Урбановіч.

Першая сесія Міёрскага раённага Савета дэпутатаў працоўных прайшла 28 снежня 1940 г. Выступаўшыя адзначылі, што ў 21 калгасе больш 4750 га ворыва, а агульная плошча сельгасугоддзяў — 7187 га. Галоўнае для работнікаў сельскай гаспадаркі — укараненне сацыялістычнага спаборніцтва і стахановскага руху, перадавой тэхнікі, падрыхтоўка ўласных кадраў, павышэнне ўраджаю.

У калгасах раёна к канцу 1940 г. налічвалася 471 галава буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 269 кароў, 325 авечак, 130 свіней, 624 кані.

У раёне было 49 школ, у іх працавала 105 настаўнікаў і вучылася 4199 дзяцей. Цяпер адкрыта яшчэ 13 школ, вучыцца ўсяго 6322 школьнікі. У 1940 г. на народную асвету выдзелена 1,5 млн руб.

З 62 школ адна была сярэдняя, 11 — няпоўных сярэдніх і 51 — пачатковая. 56 школ былі беларускамоўныя і 6 — рускамоўныя. У іх працавала 180 настаўнікаў, толькі за жнівень — верасень 1940 г. прыбыло 67 педагогаў. За год выраблена больш 200 парт. Аднак адчуваўся недахоп падручнікаў і дапаможнікаў.

Разгортвалася барацьба з непісьменнасцю і малапісьменнасцю. Але пакуль яна была выбарачнай. У першую чаргу працавалі з дапрызыўнікамі, гэта 724 юнакі.

Была створана разгалінаваная сістэма хат-чытальняў, Дамоў сацыялістычнай культуры, клубаў, кінатэатраў, чырвоных гурткоў. Было адкрыта 12 хат-чытальняў і Дом сацыялістычнай культуры. Яны атрымалі 8 радыёпрыёмнікаў і 3 тэлефоны. Але за ўвесь 1940 г. у раёне прадэманстраваны толькі два кінафільмы.

На развіццё сістэмы аховы здароўя ў 1940 г. выкарыстана 410 тыс. руб. Пачалі дзейнічаць дзве новыя бальніцы на 75 ложкаў, сем урачэбных і фельчарскіх пунктаў, два радзільныя аддзяленні і столькі ж зубных кабінетаў, рэнтгенкабінет, дзіцячыя яслі. На 1941 г. намячалася на ахову здароўя выдзеліць 677 тыс. руб.

У гэты час у раёне дзейнічалі дзве ўчастковыя бальніцы — у Друі (якая тады ўваходзіла ў Міёрскі раён) на 45 ложкаў і ў Новым Пагосце на 15 ложкаў. 45 тыс. руб. было выдаткавана на ўзвядзенне ў Друі бальнічнага гарадка. Працавалі 4 урачы з патрэбных 7, была машына «хуткай дапамогі». За ліпень — жнівень 1940 г. атрад медыцынскіх работнікаў атрымаў папаўненне з 8 акушэрак і 14 медсясцёр. Гэтых работнікаў ужо хапала для ўкамплектавання штатаў.

У раёне налічвалася 14 657 пайшчыкаў, дзейнічала 7 сельпо, 83 гандлёвыя кропкі. Пабудаваны 8 магазінаў, 3 сельмагі, 2 хлебапякарні магутнасцю 6 т хлеба ў суткі, аўтагараж на 4 машыны. Насельніцтву прададзена прамысловых тавараў на 7070 тыс. руб.

Аднак з іншых крыніц вядома, што ў другім і трэцім кварталах 1940 г. тавараў атрымана на 4168 тыс. руб., што на 102 тыс. руб. менш запланаванага. У продажы не хапала солі, газы, шкла, лямпаў. На гандлёвае будаўніцтва было выдзелена 131 тыс. руб., а асвоена толькі 75 тыс. руб. Хаця з запланаваных 6 сельмагаў і раймага ў верасні ўжо будавалася 5 сельмагаў, працавалі 61 магазін і ларок з прадугледжаных да адкрыцця 68. Для работы ў іх падрыхтавана 14 чалавек.

У маі 1941 г. пачала выходзіць тыражом 1500 экземпляраў раённая газета «Бальшавіцкая трыбуна», рэдактарам якой з'яўляўся М. Р. Шляхценка.

Грамадскіх будынкаў новы райцэнтр амаль не меў. Таму ўзводзіліся памяшканні для райвыканкама, суда, ашчадкасы і ясляў — усяго 8 дамоў з 16, адабраных у паноў і асаднікаў і перавезеных у Міёры. З іншых 8 дамоў атрымалася 14 кватэр. Брукаваліся вуліцы ў райцэнтры і Друі, увогуле было пабудавана 108 км дарог, адрамантавана 255 км, узведзена 6 мастоў з 8 запланаваных, яшчэ тры адрамантаваны. На

дарожнае будаўніцтва выкарыстана 572 267 руб. — 125 % запланаваных сродкаў.

Развівалася тэлефонная сувязь, дзейнічала 28 нумароў, хаця патрэба была ў 60—70.

З прамысловых аб'ектаў працавалі 17 млыноў (на трох з іх устаноўлены дынамамашыны), лесазавод (піларама і сталярны цэх), 2 цагельныя заводы мясцовай прамысловасці і тры ў калгасах, у Друі — арцелі з 25 шаўцоў, 45 краўцоў, 13 цырульнікаў. Агульныя аб'ёмы вытворчасці за год невядомыя, аднак цэглы выпушчана не менш 340 тысяч, выпалена 50 т вапны, нарыхтавана 2500 м^3 торфу на паліва.

Алыцкі З. П. Перамога калгаснага ладу ў заходніх абласцях БССР // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1958. № 3.

Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Т. 2 (1929—1939 гг.). Мн., 1972.

Віцебскі абласны дзяржаўны архіў. Ф. 7047. Спр. 6, 7.

Люди нарочанского края. Мн., 1975.

Советская Белоруссия. 1939. 15 лістап.

Сцяг працы. 1968. 28 сак.

Царюк И. О. КПБ — организатор культурного строительства в западных областях Белоруссии (1939—1955 гг.). Мн., 1968.

Л. А. Матэленак

Прыход Саветаў

З дзённіка І. А. Лапіцкага «З успамінаў аб мінулым. 8 гадоў жыцця маёй сям'і (1939—1946)»

Восенню 1938 г. я захварэў і пакінуў работу сакратара гміны. Мне была вызначана пенсія ў 178 злотых, і мы ўсёй сям'ёй перасяліліся з Мікалаёва ў Дзісну на вуліцу Замянскую, дзе зааранда-валі домік над самай Дзвіной. Мелі прасторную залу, спальню і кухню за 15 злотых...

На захадзе разгаралася вайна. Гітлераўскія полчышчы з маланкавай хуткасцю наступалі на Польшчу, якая знаходзілася напярэдадні поўнага разгрому. У Дзісне панавалі паніка і неспакой. Улады выдалі шэраг надзвычайных распараджэнняў аб здачы насельніцтвам усёй без выключэння зброі, аб зацямненні на ноч вокнаў у дамах, размешчаных уздоўж дзяржаўнай граніцы. У народзе гаварылі, што польская разведка нібыта выявіла выпадак светлавой сігналізацыі за Дзвіну з дома на набярэжнай.

Штодзённа адпраўляліся на фронт усё новыя і новыя партыі з салдат запасу. Большая частка пагранічнікаў была адаслана на фронт. Скарачаўся камандны састаў. Многія каменданты «стражніц» заменены афіцэрамі запасу. Камендантам дзісенскай «стражніцы» быў назначаны Герговіч — настаўнік гімназіі.

Аб тым, што прыйдуць бальшавікі, не гаварылі. Погляды ўсіх былі скіраваны на Захад.

19 верасня 1939 г. была нядзеля. У нас госці, гулялі ў прэферанс, леглі спаць позна. Не паспелі заснуць, як у акно пастукалі. Жонка ўстала і прыадкрыла занавеску. У двары, прыгнуўшыся і прыхіліўшыся да сцяны, стаялі салдаты з вінтоўкамі. Жонка адскочыла ад акна і, спужаўшыся, стаілася. «Можа, гэта нямецкі дэсант?» — пытаецца ў мяне. Супакоіўшыся крышку, яна падышла да дзвярэй і спытала: «Хто там?» «Свои, откройте», — пачуўся ледзь чутны адказ. «Не адчыню!» — і жонка хутка скіравалася ў пакой. У цемры наскочыла на крэсла і нарабіла такога грукату, які быў чутны нават на вуліцы. Калі яшчэ раз жонка прыадкрыла занавеску, заўважыла, як салдаты, крадучыся адзін за другім, выходзілі са двара.

Наступіла мёртвая цішыня, хвіліны чакання нечага невядомага і жахлівага. Хвілін праз пяць пачулася кулямётная чарга — адна, потым яшчэ, яшчэ. Мы

паляглі на падлогу. За кулямётнай стральбой пачуліся больш аддаленыя ўзрывы гранат, вінтовачныя стрэлы.

Хутка стральба спынілася. Супраціўленне палякаў было слабое. Большасць пагранічнікаў і паліцыянтаў здалася савецкім войскам, астатнія разбегліся. Больш чэсна абараняўся камендант пагранічнікаў Герговіч. Ён з кулямётам схаваўся ў ксяндзовым садзе паміж мурамі і нейкі час адстрэльваўся, пакуль не быў цяжка паранены. Польскія афіцэры запасу Арцішэўскі і Юшкевіч, якія спяшаліся яму на дапамогу, забіты пры спробе перабегчы вуліцу.

Днём адбылася дэманстрацыя працоўных горада, якія з чырвонымі сцягамі і аркестрам прайшлі і па нашай вуліцы. У той жа дзень да нас заходзілі салдаты, якія ноччу стукалі ў акно. Гаварылі, што хацелі даведацца, дзе знаходзіцца польская паліцыя, але, пачуўшы грукат, паспяшаліся адысці, бо баяліся быць абстралянымі.

У тую вераснёўскую ноч

Верасень 1939 года. Залатая восень. Гэты цёплы дзень у мястэчку Луначарскае быў напоўнены звычайнымі паўсядзённымі клопатамі. Жанчыны шчыравалі ў агародах, збіраючы восеньскія дары прыроды. Каля новага мураванага будынка сельскага магазіна калгаснікі абмяркоўвалі вынікі фінскай вайны, якая толькі нядаўна закончылася.

Цэнтрам усеагульнай увагі мястэчка стаў дэмабілізаваны з фінскага фронту лейтэнант запасу з ордэнам Чырвонага Сцяга на гімнасцёрцы. Вучняў-падлеткаў зачароўваў бляск ордэнскай эмалі. А мужчын захапляў расказ аб зімовым штурме ўмацаванай лініі Манергейма, фінскіх снайперах, незамярзаючых балотах. Кожнаму — сваё. Калгасніцы ў яркіх сарафанах абмяркоўвалі дэфіцыт паркалёвых тканін і планавалі «налёт» на гарадскія магазіны пасля атрымання разліку па працаднях у калгасе.

Стометровая пагранічная паласа жыла сваім размераным жыццём. Па вуліцы праскакаў верхавы пагранічны раз'езд у зялёных фуражках і накіраваўся ў бок лесу на правым беразе Заходняй Дзвіны. Прайшоў у «сакрэты» першы атрад пагранічнікаў. На дазорнай вышцы Луначарскай пагранзаставы хадзіў вартавы-назіральнік, часам прыкладваючы да вачэй бінокль, і тады ярка ўспыхвалі два сонечныя зайчыкі ў акулярах.

Піянеры-школьнікі, папрасіўшы дазволу ў каменданта пагранзаставы, лавілі вудамі рыбу ў адведзенай для гэтага зоне і, памятаючы заклік аб уважлівасці, марачы затрымаць хаця б аднаго «дыверсанта», углядаліся ў супрацьлеглы бераг, дзе ў польскім горадзе Дзісна кіпела сваё, невядомае жыццё.

На лодках каталіся ўздоўж берага прыбраныя «буржуі-гімназісты» з «панскімі дочкамі». У парку на паўвостраве, сярод бяроз, іграў духавы аркестр і круціліся каруселі з моладдзю. Але гэта быў іншы, чужы свет, незнаёмы і загадкавы.

А ў мястэчку шумеў млын, бухаў выхлапамі дызель і шумна, паспешліва грызла сталёвымі зубамі бярвенні піларама.

Нішто не парушала ўстаноўленага парадку. Дзень заканчваўся. Хутка наступіла цёмная вераснёўская ціхая ноч, поўная напружанай пагранічнай цішыні, дзе за кожным вуглом і кустом мроіцца парушальнік граніцы.

Мястэчка заснула.

У час ночы ў доме ўчастковага інспектара, лейтэнанта міліцыі, раздаўся ціхі стук у акно. Гэта ў пагранічнай зоне справа звычайная. То чарговая праверка пашпартнага рэжыму, то парушэнне кантрольнай паласы і праследаванне парушальніка — без гэтага рэдка якая ноч абыходзілася. Апрануўшыся, участковы паспяшаўся да дзвярэй. У двары стаяла група незнаёмых ваенных і начальнік пагранзаставы. Папрасілі дазволу зайсці ў хату і не запаль-

ваць лямпу, пакуль не завесяць вокны. А на вуліцы чуўся глухі шум натоўпу, колаў, і гэты трывожны гул напаўняў спячае мястэчка.

Калі завесілі вокны і запалілі вісячую лямпу-дваццацілінейку, на круглым стале расклалі палявыя ваенныя карты, а ўчастковага папрасілі абысці жыхароў і папярэдзіць, каб да раніцы ніхто не выходзіў з дому і не запальваў святло.

Пачаў дзейнічаць Луначарскі ваенны Савет. А на вуліцы па-ранейшаму чуўся шум праходзячых войск. Ва ўсіх жыхароў сон як рукой зняло. Усе насцярожана прыслухоўваліся і чакалі гукаў стральбы і шуму бою.

Набліжалася раніца. Але на здзіўленне усё аказалася простым і будзённым. Жаўнеры польскай стражніцы ў бой не ўступілі, і ўсё закончылася мірным шляхам. У Луначарскай школе адмянілі заняткі і падрыхтавалі памяшканне пад ваенны палявы шпіталь. Раніцай даведаліся, што знайшоўся ў Дзісне адзін гімназіст-фанатык, які залез на званіцу і пачаў страляць, але яго хутка знялі. А ў школу паступіў адзін ранены польскі памешчык, які на аўтамабілі кінуўся ўцякаць ад бальшавікоў у Вільню, але недалёка ад Дзісны трапіў у аўтааварыю.

Праз дзень была ўстаноўлена паромная пераправа, і ў горад пачалі рухацца абозы з савецкімі і партыйнымі работнікамі, арганізоўваць у Дзісне павятовую савецкую ўладу. А войска пайшло далей на Беласток. З Дзісенскага павета пацягнуліся на станцыю Боркавічы абозы з пастаўкамі хлеба. Па прапусках.

Пачалося фарміраванне мясцовых кадраў і мясцовай савецкай інтэлігенцыі. Але поўнай ідыліі не было. Ішла нябачная барацьба ідэй. І не без ахвяр.

Э. Ц. Мароз

Сцяг працы. 1989. 16 верас.

З успамінаў Генадзя Паўлавіча Дзямешкі

З 70 гадоў майго жыцця мне больш за ўсё помніцца год 1939. Гэта — апошні год жыцця ў капіталістычным свеце. У гэтым годзе, 17 верасня, адкрылася новае жыццё, калі я разам з усімі беларусамі Заходняй Беларусі зрабіў крок у свет сацыялізму. Гэты дзень быў такі радасны і жаданы, што неяк сцішыў боль жудасных дзён у Глыбоцкай дэфензіве, калі мне прыйшлося перанесці катаванні, дзе прайшоў шлях да расстрэлу, чуў душараздзіраючыя крыкі людзей. Але гэта было потым.

А ў канцы снежнай зімы 1931 г. трынаццацігадовым хлопчыкам мяне адвезлі за 30 кіламетраў ад бацькоўскага дома ў в. Коськаўцы, аддалі ў пастушкі да гаспадара Пятра Чургеля. У яго доме ўпершыню ўзяў у рукі кніжкі на беларускай і рускай мовах. У школе нас вучылі толькі па-польску. Самае вялікае ўражанне ў той час у мяне засталося ад чытання сатырычнага беларускага часопіса «Янка-Маланка». Неяк у адным з нумароў я прачытаў радкі: «Пётр I прасек акно ў Еўропу, а Кузьма Крук у навуку». Дзіўна і прыемна было сустрэць прозвішча знаёмага чалавека на старонках часопіса. Кузьма Юльянавіч Крук быў маім земляком. Ведаў я, што вучыўся ён у Віленскім універсітэце, што гады тры ці чатыры перад гэтым у час выбараў у польскі сейм за яго, як за свайго кандыдата, галасавалі ўсе беднякі нашай акругі. Аб гэтым тады многа было гаворкі ў доме майго бацькі. Ды хіба пройдзе кандыдат беднякоў, калі ў выбарчай камісіі сядзелі паны, шляхта?

У 1933—1934 гг. я працаваў ужо ў новага гаспадара Івана Лаўрыновіча ў в. Карандышы, цяпер гэта Узмёнскі сельсавет Міёрскага раёна. Ён таксама быў пісьменным чалавекам, выпісваў беларускую газету «Шлях моладзі». Я з захапленнем чытаў кожны яе нумар. Так нарадзілася ў мяне мара аб

вучобе, прага пазнаць як мага больш праз друкаванае слова. Але гады ішлі, а магчымасці вучыцца па-сапраўднаму не было. Заставалася адно — больш чытаць. У школьнай бібліятэцы ў Галінове былі кнігі Адама Міцкевіча, Генрыха Сянкевіча, іншых польскіх аўтараў. Я іх хутка прачытаў. А што далей? Міжволі задумваўся над сваім лёсам.

У 1937 г. у в. Масцішча вярнуўся Пётр Лаўручонак. Ён вучыўся ў Віленскай беларускай гімназіі, якую нечакана закрылі, і хлопцу давялося думаць аб нейкім заробку, каб не сядзець на шыі ў бацькоў. Пётр уладкаваўся прадаўцом у кааператыўны магазін в. Галінова. Мы пазнаёміліся і пасябравалі. Ад яго я атрымліваў падручнікі, сам пачаў выпісваць газету «Шлях моладзі». Памятаю, там змяшчаліся вершы Міхася Машары і Яўгена Скурко (Максіма Танка). Аднойчы вечарам Пётр даў мне статут УЛКСМ (адкуль ён яго ўзяў, не сказаў), прапанаваў стварыць сваю маладзёжную арганізацыю. Я яго думку падтрымаў. Хутка да нас далучыўся Аркадзь Дзямешка, мой сусед.

Нас было ўжо трое, і настаў час дзейнічаць. Першае, што мы зрабілі — распаўсюдзілі антырэлігійны верш «Хлерка», напісаны мной паводле сапраўднага здарэння ў касцёле. Зайшоўшы туды, праваслаўны Хлерка заснуў і, не заўважаны арганістам, быў зачынены ў касцёле пасля вячэрняй службы. У вершы апісваўся сон Хлеркі, які быццам бы трапіў у рай, дзе святыя і сам гасподзь Бог сустрэлі яго няветліва. Але горш за ўсё, што тут жа быў і ксёндз Бародзіч, які не даваў жыцця праваслаўнаму люду, імкнучыся схіліць усіх да каталіцкай царквы:

А! Ты ў рай ідзеш, саколік!
Ты ж, напэўна, не католік?
Што маўчыш? Няма гаворкі? —
Запытаўся ксёндз у Хлёркі.

— Я лічу, што бог адзіны,
Чым я перад ім павінны?
А ў раю ўсе тут раўны,
Хто як можа, бога славіць:
Так пытанне Хлерка ставіць.

Ксёндз Бародзіч тут як гаркне —
Прэч адсюль ты, недавярак!
Вшысцы свенце, памагайце,
Хама з раю выганяйце!...

Распаўсюдзілі мы верш ананімна, бо ў той час аўтару не паздаровілася б за такое вальнадумства. А тым часам «Хлерку» дэкламавалі на вечарынках, перапісвалі ад рукі, і ён пайшоў гуляць па вёсках.

Аб побыце нашым і бедах вяскоўцаў я напісаў карэспандэнцыю ў газету «Шлях моладзі», падпісаўшыся псеўданімам «Дзя-шка». На маё здзіўленне, вельмі хутка прыйшоў нумар з гэтым допісам. Тады я даслаў пісьмо ў рэдакцыю. Але газета больш не выходзіла, напэўна, была забаронена.

З восені 1937 г. і да канца года я мала сустракаўся з сябрамі, бо пайшоў у наймы да Рыгора Яйсона, скнары і міраеда. Толькі вясной 1938 г. нашы сустрэчы з Пятром і Аркадзем сталі больш частымі. Аркадзь усю зіму хадзіў па вёсках, зарабляючы на жыццё кравецкай справай. Ён прынёс нам некалькі нумароў газеты «Правда». Рашылі мы адзначыць першамайскае свята. Пачалі меркаваць, як зрабіць. Пётр прапанаваў вывесіць чырвоны сцяг на маяку ў в. Гагаліншчына. Мы дамовіліся, што Аркадзь дастане чырвонай матэрыі, Пётр намалюе на сцягу савецкую сімволіку. Мне трэба непрыкметна напярэдадні свята вывесіць яго на самай вяршыні маяка. Як вырашылі, так і зрабілі. Раніцай вестка аб гэтым абляцела ўсю ваколіцу. З Глыбоцкай дэфензівы на матацыкле прыехалі жандары. Забралі на допыт Сяргея Протаса з в. Таранды. А сцяг не маглі зняць, пакуль не знайшоўся добраахвотнік з пагранічнай заставы, якая размяшчалася ў в. Алешчанцы.

Пасля гэтага выпадку Аркадзь адчуў, што за ім сочаць. Аднойчы ён прыйшоў на сустрэчу ўсхваляваны, расказаў, што

выклікалі на допыт у Дзісенскую паліцыю. Пакуль што адпусцілі. На наступны раз ён аб'явіў, што рашыў перабрацца праз мяжу ў СССР. Мы з Пятром яго думку падтрымалі. Гэта было летам 1938 г. Мы прасілі яго расказаць савецкім органам аб нашай падпольнай арганізацыі. Як ён пераходзіў граніцу, як склаўся далейшы лёс нашага таварыша Аркадзя Рыгоравіча Дзямешкі, невядома. Ведаючы цяпер аб масавых рэпрэсіях, можна меркаваць, што трагічна.

Гэты год запомніўся яшчэ адным выпадкам. Восенню мяне выклікалі ў Дзісну на прызыўную камісію. Ля стала, дзе запаўняліся карткі, адзін з членаў камісіі, маёр, спытаў аб маёй нацыянальнасці. Я назваўся беларусам, хоць мае папярэднікі ўсе запісваліся палякамі. Мае словы разгневалі членаў камісіі. Але я стаяў на сваім. Толькі ўвечары аформілі дакументы. Усіх выстраілі на вуліцы і маёр пры ўсіх паабяцаў «загнаць» мяне ў турму як камуніста.

З уходам Аркадзя Дзямешкі мы страцілі многае. Ён трымаў сувязь з падполлем у Дзісне. З кім, мы не ведалі, гэтага патрабавалі правілы канспірацыі. Наогул, імкнучыся пашыраць свой уплыў на вясковую моладзь, кожны з нас дзейнічаў самастойна. Так было больш надзейна. Я прыцягнуў на наш бок Мікалая Дзямешку, Уладзіміра Дыдку, Канстанціна Протаса, Мікалая Місніка. Дзяўчат мы не прымалі ў сваё кола, ведаючы, што ў любы час можам падвергнуцца рэпрэсіям.

Хоць сабрацца нам усім было не проста, усё ж мы сустракаліся, выкарыстоўвалі любую магчымасць паагітаваць. Пётр зрабіў сваімі рукамі дэтэктарны радыёпрыёмнік. Кузьма Крук, які да гэтага часу вярнуўся з Вільні ў родныя мясціны, падтрымліваў добрыя адносіны з намі, даваў тое-сёе з літаратуры.

Відаць, нашы справы не засталіся незаўважанымі паліцыяй. А тут яшчэ вайна пачалася, да такіх, як мы, паставілі больш строга. 8 верасня 1939 г. мяне і Пятра забралі, даставілі ў Мікалаёўскі пастарунак, дзе пратрымалі трое сутак, адкуль перавезлі ў Глыбокае. Там у дэфензіве нас адразу разлучылі. Мяне павялі на допыт. У ярка асветленым пакоі сядзелі двое следчых. Адзін трымаў у руцэ гумавую дубінку. Мне загадалі разуцца. Спачатку пыталі пра сцяг на маяку, пра саўдзельнікаў. Потым сталі біць. Я страціў прытомнасць. Калі прыходзіў у сябе, зноў пачыналіся катаванні. Не ведаю, колькі часу гэта цягнулася, здаецца, бясконца. Потым пачуў каманду: «Вывесці і расстраляць!»

У калідоры мяне паставілі да сцяны, страху не было, бо смерць здавалася выратаваннем ад болю. Але выстралаў я не дачакаўся, відаць, гэта была толькі інсцэніроўка расстрэлу. Мяне штурхнулі ў плечы і павялі да дзвярэй. Апынуўся ў цесным пакойчыку, зваліўся на падлогу. Прыйшло забыццё. Ачуняў ад святла, зразумеў, што пачаўся новы дзень. Да вечара мяне не выклікалі, падумалася, што доказаў паны следчыя не маюць, інакш не пакінулі б мяне ў пакоі. Дакараў сябе, што не збег па дарозе ў Мікалаёва.

Наступіўшая ноч была не меншым выпрабаваннем, чым допыт напярэдадні. Блізка ад майго пакою катавалі жанчыну, яе крыкі былі страшнейшымі за ўласныя мукі. Потым пачуўся мужчынскі голас. Я чакаў, што наступным выведуць мяне. Толькі раніцай зазвінелі ключы ў дзвярах, перавялі ў іншы будынак, у агульную камеру, дзе было з дзесятак хлопцаў. Усе маўчалі, відаць, кожны прайшоў праз допыт. У гэты ж дзень мяне выпусцілі з наказам з'явіцца ў свой пастарунак у в. Мікалаёва. Вызвалілі і Пятра. Мы з ім сустрэліся ўжо на вуліцы Глыбокага.

І вось мы дома, радуюцца гэтаму родныя. Але сапраўдная радасць прыйшла наступнай раніцай 17 верасня, калі мы з бацькам убачылі ля нашай хаты асадніка Валенскага. Ён, зняўшы шапку, ветліва прывітаўся і сказаў нам: «Прыйшлі бальшавікі». Ад такой наві-

ны я не мог усядзець дома. Папрасіў веласіпед у брата і паехаў да Пятра ў Масцішча. А ўжо разам з ім рушылі па дарозе Міёры — Дзісна. І тут убачылі кавалерыстаў з чырвонымі зоркамі на шапках — нашых вызваліцеляў...

Запомніўся яркі сонечны дзень, радасны святочны настрой, узрушанасць і прыўзнятасць, якія панавалі ў Дзісне. Каля пажарнай быў мітынг — з аўтамашыны, як з трыбуны, выступаў афіцэр. Вакол машыны натоўп людзей. Калі прамова была закончана, папрасілі ў афіцэра газеты і пацікавіліся, ці можна нам перабрацца на той бок Дзвіны ў пасёлак Луначарскае, у Савецкую Беларусь, бо вельмі хацелася пагутарыць са сваімі братамі-беларусамі. Ён адказаў, што цяпер ужо можна, бо граніцы няма.

Дамоў мы вярнуліся надвячоркам. У хаце сабралася поўна народу, і яшчэ доўга я ім расказваў пра тое, што ўбачыў, пачуў у Дзісне, Луначарскім, а потым чытаў газеты. Так скончыўся гэты першы дзень жыцця без улады капіталістаў. Першую ноч я спаў спакойна, упэўнены ў тым, што не з'явяцца за мной узброеныя панскія прыслужнікі.

На наступны дзень мы з Пятром збіралі зброю ў былых польскіх прыслужнікаў — асаднікаў, каб здаць яе новай уладзе. Зброя была дастаўлена ў аддзел міліцыі.

На нашай зямлі ўстанаўлівалася новая ўлада, адкрываліся школы, паштовыя аддзяленні. Гучалі беларускія і рускія песні. Потым Пётр стаў настаўнічаць, я быў выбраны сакратаром Ліпацінскага сельскага Савета. Школу, клуб, сельсавет размясцілі ў будынку былога памешчыка Каранеўскага ў в. Дрыгучы.

Хутка я атрымаў камсамольскі білет, з якім і пайшоў служыць у Чырвоную Армію.

Сцяг працы. 1989. 16 верас.

Мой першы настаўнік

З успамінаў народнага артыста СССР Г. І. Цітовіча

Вобраз майго першага настаўніка Флора Данатавіча Манцэвіча застаўся ў мяне на ўсё жыццё.

У «школу Манцэвіча» мяне адправілі галоўным чынам для вывучэння польскай мовы, без ведаў якой ва ўмовах буржуазна-памешчыцкай Польшчы нам, жыхарам Заходняй Беларусі, шлях да адукацыі быў закрыты. Але, як потым высветлілася, тут я прыдбаў значна больш, чым веданне мовы.

Флор Данатавіч навучыў нас любіць родную прыроду, свята берагчы традыцыі і культуру свайго народа.

Флор Данатавіч нарадзіўся ў 1890 г. у мястэчку Іказнь Новааляксандраўскага павета Ковенскай губерні (цяпер Браслаўскі раён Віцебскай вобласці). Ён быў чацвёртым дзіцем і трэцім сынам у сям'і селяніна Даната Паўлавіча Манцэвіча, удзельніка паўстання Кастуся Каліноўскага.

Флор, калі падрос, стаў вучыцца адразу ў двух вучылішчах: зімой хадзіў у народнае, а летам — у сельскагаспадарчае, дзе прайшоў усе класы, пачынаючы з пасьбы гусей і канчаючы доглядам коней. Будучы ў народнай школе, Флор захапляўся граннем на скрыпцы і спевамі, якія выкладаў добры музыкант, мясцовы рэгент В. Насыр. Ён уладкаваў галасістага хлопчыка ў царкоўны хор, дзе ўжо спяваў яго брат Іосіф.

Але нядоўга ўдзельнічалі Манцэвічы ў гэтым хоры. У душах хлопчыкаў успыхнуў пратэст супраць пануючага ў Расіі самавольства: у 1901 г. у час ганебнай цырымоніі «адлучэння» Л. М. Талстога яны дэманстратыўна адмовіліся спяваць «анафему» вялікаму пісьменніку і назаўсёды рассталіся з хорам.

У 1904 г. Флор, выдатна закончыўшы народнае вучылішча, застаўся дома

дапамагаць бацькам. У 14 год ён добра валодаў цапом, баранаваў, касіў, хадзіў з сахой і плугам, а ў вольны час шмат чытаў.

У чэрвені 1906 г. Флор паступіў у Полацкую настаўніцкую семінарыю.

У пачатку 1907 г. у семінарыі ўспыхнула забастоўка. Навучальная ўстанова была закрыта. Шматлікіх семінарыстаў, галоўным чынам з асяроддзя спачуваючых сацыял-дэмакратам, звольнілі з «воўчым білетам». У гэту катэгорыю трапілі Іосіф і Флор.

Пасля разгону 2-й Дзяржаўнай думы і паражэння першай рускай рэвалюцыі восенню 1907 г. быў аб'яўлены новы набор у Полацкую семінарыю. Пры падтрымцы прагрэсіўна настроенага выкладчыка гуманітарных навук І. Спаўнова браты Манцэвічы зноў сталі вучыцца ў семінарыі. Флор стаў душой усіх мастацкіх мерапрыемстваў, якія тут праводзіліся. Ён кіраваў хорам, арганізаваў струнны аркестр, удзельнічаў у драматычным гуртку. У 1910 г. закончыў семінарыю, атрымаўшы званне настаўніка народных школ. За час вучобы Флор прафесійна авалодаў ігрой на скрыпцы. Ён хацеў паступіць у кансерваторыю, але для гэтага не хапала сродкаў.

Восенню 1910 г. Флор атрымаў назначэнне ў Баумгофскае народнае вучылішча (Дзвінскі павет Віцебскай губерні), дзе працаваў да першай сусветнай вайны. Потым Флора разам з Іосіфам мабілізавалі ў армію і накіравалі ў якасці санітараў спачатку ў Дзвінск, затым у адзін з ваенных шпіталяў Беластока.

Будучы ў пачатку 1917 г. на пабыўцы ў Іказні, Флор пазнаёміўся з настаўніцай Аляксандрай Міхайлаўнай Герасімавай, якая стала яго жонкай. Усё сваё жыццё яна была надзейнай падтрымкай у час праследавання мужа ўладамі буржуазнай Польшчы.

Вялікую Кастрычніцкую сацыялістычную рэвалюцыю Манцэвічы сустрэлі ў Іказні. Флор Данатавіч прыняў актыўны ўдзел у стварэнні мясцовых ор-

Ф. Д. Манцэвіч

ганаў савецкай улады і народнай адукацыі. Але ў сакавіку 1921 г. Заходняя Беларусь адышла да Польшчы.

У Манцэвічаў нарадзілася другая дачка. Патрэбна было падумаць аб матэрыяльным забеспячэнні сям'і. У гэты час у Глыбокім быў аб'яўлены набор на курсы па перападрыхтоўцы былых рускіх настаўнікаў для польскай школы. Флор Данатавіч паступіў на гэтыя курсы і паспяхова закончыў іх у 1922 г. Яго назначылі ў Іказненскую школу.

У 1923 г. у гэту школу паступіў і я. Мае аднагодкі, якія вучыліся ў Флора Данатавіча другі год, вельмі паважалі яго. У хуткім часе Ф. Д. Манцэвіч пакарыў і мяне. Асабліва цікавымі былі яго ўрокі прыродазнаўства і спеваў. Апошні нярэдка ператвараўся ў лекцыі па агульнай культуры беларускага народа. Заходзячы ў клас, ён заўсёды вітаў нас мяккім паклонам і лагодным позіркам разумных, выразных вачэй. Затым пачынаўся ўрок. Пачынаўся ён са спеваў гамаў пад скрыпку і паўтарэння народнай песні «Чачотка». Канец урока быў прысвечаны паэзіі. Чыталіся вершы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, А. Міцкевіча. А якімі цікавымі былі экскурсіі па прыродазнаўству! Флор Данатавіч вучыў нас любіць і берагчы прыроду.

Часта пасля заняткаў я заходзіў у кватэру Манцэвічаў (яна знаходзілася ў будынку школы), каб узяць кніжку для чытання або пазабавіцца з пяцігадо-

вай Марусяй. У доме гучала беларуская і руская мовы. Польская была тут толькі афіцыйнай.

Хутка я паехаў на вучобу ў Вільню, і нашы сувязі закончыліся. Але ў час канікулаў я заўсёды лічыў сваім абавязкам адведаць Манцэвічаў. Так было і летам 1928 г. Заходжу ў школу. Вакол незнаёмыя людзі. Пытаюся Флора Данатавіча, а мне гавораць: «Адбыў у невядомым напрамку». Ад знаёмых даведаўся, што Флор Данатавіч пераведзены ў в. Ніўнікі (Міёрскі раён).

За Манцэвічам пастаянна сачылі. Флор Данатавіч не падабаўся ўладам за «пагубны» ўплыў на мясцовае насельніцтва. Высветлілася, што ён зноў арганізаваў збор подпісаў пад хадайніцтвам аб адкрыцці беларускай школы. За гэта і перавялі яго ў рускую стараверскую в. Ніўнікі.

Летам 1935 г., цяпер ужо студэнтам кансерваторыі, я наведаў Манцэвічаў у Ніўніках, перад іх пераездам у Старыя Крукі. Гэта была апошняя мая сустрэча з Флорам Данатавічам. Ранкам мы хадзілі на рыбалку. І тут, схаваўшыся ў чароце ад людскіх вачэй, вялі адкрытую размову. Мой настаўнік умеў знайсці агульную мову з субяседнікамі розных узростаў і інтэлектуальных узроўняў.

У тыя дні Флор Данатавіч пазнаёміў мяне са сваёй калекцыяй фальклорных запісаў. У ёй былі рускія і беларускія народныя песні, прымаўкі і прыказкі, анекдоты, фразеалагізмы, прычым запісы гэтыя адпавядалі ўсім патрабаванням навуковай анатацыі.

Дзе б ні працаваў Ф. Д. Манцэвіч, ён устанаўліваў дзелавыя сувязі з прагрэсіўна настроенымі людзьмі, карыстаўся ўсеагульнай павагай насельніцтва. Пачынаючы з 1935 г. знаходзіўся пад наглядам паліцыі і кожную нядзелю абавязаны быў рэгістравацца ў пастарунку, бо Старыя Крукі знаходзіліся ў дваццаці кіламетрах ад польска-савецкай граніцы.

Да настаўніка прыходзілі за парадай, а часта і за медыцынскай дапамогай. Тут ён меў магчымасць прымяніць на практыцы вопыт, набыты ў час работы ў ваенных шпіталях, і атрыманыя шляхам самаадукацыі медыцынскія навыкі. Асабліва спатрэбіліся яны ў Старых Круках, дзе не было нават фельчара.

Вялікай радасцю для сям'і было набыццё ў 1936 г. трохдыяпазоннага радыёпрыёмніка. Цяпер цікавячыя Флора Данатавіча звесткі паступалі з Масквы і Мінска. Да гэтага часу вакол Флора Данатавіча згуртавалася невялікая, але надзейная група аднадумцаў. Яны збіраліся ў яго доме, каб паслухаць радыё, атрымаць каментарыі на важнейшыя падзеі, а потым расказаць усё гэта ў сваёй і навакольных вёсках.

Ранкам Флор Данатавіч кожны раз слухаў па радыё апошнія паведамленні. Уключыўшы прыёмнік 17 верасня 1939 г., ён пачуў, што прыйшоў час вызвалення. З крыкам «Нашы ідуць!» пабег да суседа, каб паведаміць яму радасную вестку. Пачалі рыхтавацца да сустрэчы вызваліцеляў. З'явіліся чырвоныя сцягі, букеты і гірлянды яркіх восеньскіх кветак: граніца зусім недалёка — вось-вось прыйдуць жаданыя госці!

Пасля прыходу перадавых часцей Чырвонай Арміі ў школе — ужо легальна — сабраліся аднавяскоўцы. Флор Данатавіч запрасіў іх у клас, дзе цяпер радыёпрыёмнік у поўную сілу гаварыў праўду на роднай мове. Але здзіўленне людзей, прыйшоўшых сюды, выклікала другое: на тым месцы, дзе раней вісеў партрэт польскага прэзідэнта, усе ўбачылі партрэт У. І. Леніна.

Яшчэ да арганізацыі раённай школьнай сеткі Флор Данатавіч пачаў заняткі ў Крукаўскай школе — без падручнікаў і па ўласнай праграме. Хутка яго запрасілі ў г. Друя для кіраўніцтва перападрыхтоўкай настаўнікаў для беларускіх школ, якія пачалі адкрывацца. Яго вылучылі кандыдатам у дэпутаты Народнага сходу Заходняй Беларусі, якое раша-

ла пытанне аб дзяржаўнай будове на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

На першым пасяджэнні сходу, 28 кастрычніка, з дакладам «Аб дзяржаўнай уладзе» выступіў С. О. Прытыцкі. Па другім пытанні — «Аб уваходзе Заходняй Беларусі ў састаў Беларускай ССР» даклад зрабіў Ф. Д. Манцэвіч. Ён вельмі хваляваўся, таму што зместам гэтага пытання былі напоўнены дваццаць год яго жыцця, за яго ён цярпеў ганенне, а цяпер ад сябе і ад імя выбраўшых яго ён адкрыта выказваў гэту даўнюю мару з высокай трыбуны Народнага сходу.

29 кастрычніка 1939 г. была ўтворана Паўнамоцная камісія Народнага сходу з 66 дэпутатаў, якая павінна была прадставіць Дэкларацыю аб уваходзе Заходняй Беларусі ў склад БССР (а тым самым і ў састаў СССР) сесіі Вярхоўнага Савета Саюза ССР. У гэту камісію быў выбраны і дэпутат Ф. Д. Манцэвіч...

ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ РАЗДЗЕЛЕ ПАМЕШЧЫЦКАЙ ЗЯМЛІ І ДЗЕЙНАСЦІ СЯЛЯНСКІХ КАМІТЭТАЎ У ДЗІСЕНСКІМ ПАВЕЦЕ

28 верасня 1939 г.

С первого же дня своей работы созданные в деревнях крестьянские комитеты завоевали большую популярность и авторитет. С исключительной заботливостью и уважением крестьяне относятся к народному добру.

Крестьянские комитеты приступили к разделу помещичьей земли. Помещик Бисекирский из имения Речино владел сотнями гектаров лучшей земли, большинство же крестьян не имело даже крохотного надела.

Огромную радость испытал батрак Владимир Породня, бездомный, не имевший никаких средств к существованию, когда узнал о решении крестьянского комитета: его наделили 10 гектарами земли и дали корову, а его семья переселяется в один из помещичьих домов.

В просторные комнаты помещичьего дома вселена и семья бедняка Владимира Вороны, имевшего ранее только полгектара земли. Даже для засева своего жалкого клочка земли бедняку приходилось на кабальных условиях занимать у пана семена. Сейчас Владимир Ворона получил 9,5 га земли, корову.

Крестьянские комитеты заботятся об обеспечении населения дровами, улучшают дороги, приводят в порядок мосты. Успешно развернул работу крестьянский комитет Язно, председателем которого избран крестьянин Павел Щербицкий.

Правда. 1939. № 268.

Першы калгас

14 лютага 1940 г. грамадзяне мястэчка Лявонпаль сабраліся на сход, каб разгледзець пытанне аб арганізацыі калгаса. Прысутнічалі на ім 74 чалавекі. Яны абмяркоўвалі заявы, якія паступілі ад 28 гаспадарак, і вырашылі арганізаваць сельскагаспадарчую арцель «17-е Верасня». Быў зацверджаны статут гаспадаркі. Першым яго падпісаў Сяргей Панізнік.

Сход выбраў праўленне калгаса. У яго ўвайшлі старшыня Міхаіл Бакша, а таксама Пётр Афончанка, Марыя Белавус і іншыя сяляне.

Праз некалькі дзён калгаснікі сабраліся на агульны сход, каб разгледзець арганізацыйныя пытанні. Старшыня прэзідыума Пётр Афончанка двойчы даваў слова старшыні калгаса. Міхаіл Бакша гаварыў аб неабходнасці працаваць усім старанна, берагчы агульнае дабро. Калгас павінен быць прыкладам

для будучых калгасаў, школай, а калгаснікі — інструктарамі.

Потым старшыня ўнёс прапанову замацаваць калгаснікаў на адпаведных работах. Догляд за конямі быў даручаны Васілю Белавусу, каровамі — Елізавеце Ціхановіч, авечкамі — Алене Каськевіч, карміць дойны статак даручылі Сцяпану Салтану, Францу Федуковічу, вартаўніком адзінагалосна выбралі Трафіма Салтана.

Весці гаспадарку па-новаму было не проста. Новая справа патрабавала роздуму, калектыўнага абмеркавання. А таму калгаснікі часта збіраліся на сходы, на якіх абмяркоўвалі нормы выпрацоўкі, стан працоўнай дысцыпліны, ішла размова аб уступленні ў калгас новых членаў, выбарах адказных асоб: кладаўшчыкоў, касіраў. Так, першым кладаўшчыком стаў Ігнат Захарэвіч. Адзін за другім калгаснікамі станавіліся Андрэй Белавус, Пётр Міснік, Аляксандр Белавус, Казімір Пяткевіч, Станіслава Хадзюк, Сцяпан Арлоўскі, Казімір Сацуць, Раіса Гаспаровіч, Макар Бунта, Пётр Смулька, Вера Шук і інш.

Але калгаснікамі станавіліся не ўсе. 2 сакавіка пасля бурнага абмеркавання сяляне-калгаснікі не прынялі ў сваю сям'ю Адольфа Пальчэўскага. Палагея Шук і іншыя калгаснікі адзначылі, што пры Польшчы ён здзекаваўся над беднымі.

Калгаснікі з увагай адносіліся да патрэб бяднейшых членаў калектыву. Напрыклад, аванс выдадзены Аркадзю Тычку і Васілю Шуку, штодзень адпускаліся калгаснае малако для дзяцей Алены Каськевіч, Антаніны Шастакевіч, Ефрасінні Альхімовіч, у якіх не было кароў.

Выбары звеннявых, рамонт памяшканняў, падрыхтоўка страхавых агентаў, дапамога пагранічнікам — многія пытанні разглядаюць калгаснікі. Яны абмяркоўваюць пастанову партыі і ўрада, ствараюць камісію па падрыхтоўцы да святкавання Першамая.

Кніга пратаколаў калгаса сведчыць, што з 14 лютага па 15 верасня 1940 г. у калгасе адбылося 39 агульных сходаў і пасяджэнняў праўлення. І калі спачатку на іх разглядаліся пераважна пытанні аб прыёме ў сельгасарцель, то потым настае час арганізацыйнай перабудовы, вырашэння неадкладных і перспектыўных задач. Так, калгаснікі падтрымалі прапанову аб лепшым кармленні васьмі коней, якія выдзяляліся для работы з машынамі: жняяркамі, касілкамі. У ліпені было прынята рашэнне аб абагуленні пасеваў азімых, а неўзабаве зацвярджаецца план правядзення ўборачнай кампаніі. Калгаснікі ствараюць добраахвотную дружыну, будаўнічую брыгаду. На сходах яны рэзка выступаюць супраць крадзяжоў, асуджаюць тых працаўнікоў, якія не вельмі імкнуцца ўмацоўваць сацыялістычную гаспадарку. Размова аб гэтым ішла на сходзе 14 ліпеня. І праз многія іншыя пратаколы праходзяць складаныя праблемы спалучэння асабістых і агульных інтарэсаў, барацьбы з уласніцкімі праяўленнямі.

24 ліпеня калгаснікі абмяркоўваюць пытанне аб адкрыцці ясляў.

Калгасу аказвала дапамогу дзяржава, асабліва ў правядзенні сельскагаспадарчых работ. На адным са сходаў хлебаробы вырашылі падпісаць дагавор з МТС. Захаваўся сшытак, у якім называюцца прозвішчы трактарыстаў Цвячкоўскага, Сямёна Белавуса, Лашчонка, Вілема, Паўплейкі.

З пратаколаў бачна, як павялічвалася колькасць калгаснікаў. Калі на першы сход прыйшлі 74 чалавекі — прадстаўнікі 28 гаспадарак, то потым іх налічваецца 76, 115, 181.

Сцяг працы. 1983. 8 кастр.

Сведчаць ветэраны калгаса «17-е Верасня»

Валянціна Шук: Першыя пратаколы калгасных сходаў пісала я ўласнай рукой. Здарылася так, што мяне, 16-гадовую дзяўчыну, якая толькі што скончыла сямігодку, прызначылі галоўным рахункаводам калгаса. Вядома, не толькі вёў справы, але і вучыў мяне Гаеўскі, які займаўся бухгалтарскай работай яшчэ пры панах. Удваіх мы працавалі ў невялікім пакойчыку на другім паверсе другога палаца Лапацінскіх. Калі ж пачалася вайна, я сабрала ўсе калгасныя дакументы і схавала іх на гарышчы, закапаўшы ў кастру. Потым хацела іх знайсці, але безвынікова. Так і праляжаў архіў 40 гадоў у старым будынку.

Калгаснае жыццё ў перадваенныя гады запомнілася тым, што ўсё рабілі ўручную. Шмат часу аддавалі ўмацаванню гаспадаркі. Але жылі весела, часта збіраліся па дамах, як тады гаварылі, «у складчыну». Працавалі старанна. Руплівасцю вызначаліся даяркі Таццяна Захарэвіч, Настасся Аніськовіч, паляводы Сцефаніда Спіцэвіч, Марыя Драгун.

У Лявонпалі стваралася камсамольская арганізацыя. У яе радах былі сакратар сельскага Савета Феня Аніськовіч, Ніна Ламанос. Многія пабойваліся ўступаць у камсамол — раптам што-небудзь зменіцца.

Вайна параскідала нашых калгаснікаў. Але адразу пасля вызвалення сельгасарцель была адноўлена. І зноў я ў ёй стала рахункаводам.

Настасся Аніськовіч: Да вайны я хадзіла на палявыя работы. Запомнілася, як круцілі арфы, ачышчаючы абмалочанае зерне. А потым стала даяркай. З жывёлагадоўляй была звязана і пасля вайны.

Памятаецца, што даярак не хапала. Летам хадзілі даіць статак за чатыры кіламетры ў Гарохаўе. У групе маёй было 18 кароў. Вечарам гурт прыганялі з пашы позна, пакуль падоім — цёмна. Вось і начавалі побач з каровамі ў пастаўніку разам з Таццянай Захарэвіч, Марыяй Балбека, Ефрасінняй Афончанка. Летам світае рана, прачнёмся, зноў падоім кароў, а тады ўжо дамоў вяртаемся.

Таццяна Захарэвіч: Я ўсё жыццё працавала даяркай — 30 гадоў аддала ферме. З удзячнасцю ўспамінаю сябровак, з якімі дзялілі цяжкасці і радасці. І трэба сказаць, прэтэнзій да нас не было. Даілі мы кароў у Лявонпалі, хадзілі за 5 кіламетраў у Тамушдвор, у іншыя мясціны.

Да гэтага часу памятаецца, як пасля вайны адзначылі мяне гадзіннікам «Перамога», а потым — юбілейным ленінскім медалём.

Сцефаніда Спіцэвіч: Мы з мужам пачалі працаваць у калгасе паляводамі. Сама я з беднякоў, 9 гадоў працавала ў пана. Вось таму мы не доўга разважалі аб уступленні ў калгас.

На калгасным полі працавалася радасна, народу было многа. Жалі яшчэ сярпамі, а вось малацілі ўжо спецыяльнымі машынамі — малатарнямі. «Сложкамі» іх называлі. Бывала, пры малацьбе стаіш высока, як на небе.

Мой муж выдатны сявец быў. Сеяў хутка, адзін з сявалкай паспяваў усе палі ў брыгадзе абысці. Памятаю такі выпадак. Мой муж сеяў, а ляшыла Ганна Маслоўская. Прыехаў да іх старшыня Міхаіл Бакша. Спадабалася яму работа, захацелася і самому ўласныя сілы паспытаць. Вось і адправіў ён Ганну дадому, а сам сяўцу дапамагаць стаў. Толькі не ўправіўся ляшыць. Стаў гаварыць, што пры такой хуткасці якасці не будзе. Пасварыліся, адным словам. Але пасевы атрымаліся добрыя.

Было ў калгасе шмат іншых выдатных працаўнікоў. Сярод іх запомніліся Марфа і Міхаіл Параднікі, Кацярына Жугер, Варвара Адамовіч, Кацярына Стоўб.

Адным з першых арганізатараў калгаса быў Фёдар Параднік, працавалі ў арцелі Варвара Сіняўская, Юзэфа Пакор-

ская з сынам Вячаславам, Ефрасіння Лакотка, Варвара Барэйка, Віктар Сіняўскі з сям'ёй і многія іншыя. Парознаму склаўся іх лёс. Некаторыя загінулі ў вайну, іншыя раз'ехаліся.

Запісаў Л. А. Матэленак

ПАЛІТЫЧНЫЯ РЭПРЭСІІ

Складаныя абставіны былі на Беларусі ў 30-я гады. З аднаго боку — упартая, самаадданая праца па наладжванні новага жыцця, пераўтварэнні краіны, з другога — трагічны лёс неспрадвядліва абвінавачаных людзей. Вядомы тэзіс Сталіна аб абвастрэнні класавай барацьбы па меры руху да сацыялізму стварыў атмасферу падазронасці, неабгрунтаваных рэпрэсій. 1937 год увайшоў у нашу гісторыю як год «вялікага тэрору». Менавіта ў 1937—1938 гг. была знішчана найбольшая колькасць людзей. У Міёрскім раёне ўсё пачалося пазней, у 1939 г., пасля ўз'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі.

Большасць ахвяр палітычных рэпрэсій былі пакараны паводле рашэнняў пазасудовых органаў («двоек», «троек», асобных нарад калегій АДПУ, НКУС, МУС і інш.).

Палітычныя рэпрэсіі, якія пракаціліся па Міёршчыне і Дзісеншчыне ў 40—50-я гады, на доўгія гады ўсялілі ў свядомасць жыхароў страх і недавер'е. Людзі вырошчвалі хлеб, гадавалі дзяцей, займаліся мірнай стваральнай працай і раптам станавіліся «ворагамі народа», страчвалі свабоду, часта і жыццё. Якія толькі абвінавачванні не прыпісваліся ім: і ўдзельнікі антысавецкіх дыверсійна-тэрарыстычных, контррэвалюцыйных арганізацый, і агенты замежных разведак, яны прыцягваліся да адказнасці за антысавецкую прапаганду, распаўсюджванне контррэвалюцыйных чутак, агітацыю супраць калгасаў, шкодніцтва, як члены сям'і «ворага народа» і інш.

Не проста было тады разабрацца ў тым, што адбывалася. Многія верылі, што быццам сярод нас жывуць «ворагі народа», падтрымлівалі органы НКУС, якія вялі «непрымірымую» барацьбу з імі. І толькі праз гады даведаліся мы праўду аб тых, хто без усякай прычыны загінуў у засценках НКУС, у турмах і лагерах.

Тысячы сялян раёна былі рэпрэсіраваны ў адміністрацыйным парадку (раскулачаны) і высланы на поўнач, на Урал, у Сібір.

Многія з рэпрэсіраваных былі рэабілітаваны яшчэ ў 1950—1960-я гады, іншыя пазней. Людзям вяртаюцца іх чэсныя імёны. У працэсе работы над кнігай «Памяць» сталі вядомы прозвішчы рэабілітаваных, якія прыводзяцца ніжэй.

Яны загінулі ў Катыні

Сярод нашых землякоў, рэпрэсіраваных пад час таталітарнага рэжыму, сваю долю забраў і крывавы «катыньскі канвеер». Пакуль упамінаўся толькі Зыгмунд Герговіч — прафесар Дзісенскай гімназіі і камендант горада. Праводзіліся арышты па сацыяльнай прыкмеце («буржуяў»), паліцэйскіх, афіцэраў, асаднікаў, прадстаўнікоў контррэвалюцыйных партый.

Сярод расстраляных у катыньскім лесе ля Казельска пасля эксгумацыі былі выяўлены астанкі нашых землякоў. Гэта Тадэвуш Цэшэўскі, нарадзіўся ў 1914 г., падпаручнік, сын уладальніка невялікага маёнтка ў Біруках Яраслаў Дабашынскі, таксама падпаручнік, год нараджэння 1899, інжынер сельскай гаспадаркі ў Дзісенскім павеце. Апошні з вядомых — Адам Дамалеўскі, паручнік корпуса аховы пагранічча з Дзісны.

А. В. Казлоўскі

Трагедыя ў Лясной

Маёнтак Лясная ў гістарычных крыніцах вядомы з XVIII ст. Тут у 1798 г. нарадзіўся наш вядомы зямляк, удзельнік паўстання 1831 г. начальнік артылерыі паўстанцкага войска ў Дзісенскім павеце Мікалай Клёт. Але пасля першай сусветнай вайны сляды апошніх яго ўладальнікаў губляюцца і маёнтак перадаецца дзяржаве.

На пачатку 20-х гадоў швагерцы былых арандатараў Э. Набэльскай і сям'і Мікалая Янушкевіча, якія пражывалі ў маёнтку, польскія ўлады выдзелілі ў суседнім засценку Важа па 7 гектараў зямлі. З угоддзяў маёнтка невялікую частку купілі сяляне в. Канцыполле, а асноўныя абшары былі падзелены на дзевяць асад.

Неўзабаве пачалі прыязджаць перасяленцы-асаднікі. Пераважна гэта былі маладыя людзі невялікага дастатку. Той-сёй прыязджаў са сваякамі, многія потым пабралі шлюб з мясцовымі дзяўчатамі. Паступова павялічваліся сем'і, нараджаліся дзеці. У многіх асаднікаў, хоць і не ва ўсіх, гаспадаркі хутка буйнелі. Цурчала тут адвечнае сялянскае жыццё са сваімі турботамі, радасцямі і журбой.

Нямногае вядома пра тыя сем'і. Дбайнай апрацоўкай зямлі вызначалася гаспадарка Яна Гогача. Яго жонка Анэля была з роду Вярцінскіх з в. Фралоўшчына.

Леанард Савіцкі родам з Лінкаўшчыны. Застаўся ўдаўцом з чатырма дзецьмі. Напярэдадні другой сусветнай вайны зноў ажаніўся, узяўшы з-пад Шаркоўшчыны дзяўчыну па прозвішчы Куяловіч.

Станіслаў Іскра прыехаў з Седліц. Меў жонку і чацвёра дзяцей.

Уладзіслаў Агрызка з жонкай нейкі час мелі ў Пераброддзі краму, а ў Лясной арганізавалі кааператыўную малатарню.

Кавалер ордэна «Віртуці мілітары» — адной з найвышэйшых ваенных узнагарод Рэчы Паспалітай — Юльян Кавальскі меў з жонкай дваіх дачок.

Томаш Бадыла ўзяў жонку з Юндзялова, меў двое дзяцей. Жыў з братам Іпалітам і сястрой Франяй.

Невядомыя імёны Козела, які жыў з жонкай і дзецьмі, і Бартмана, што жыў з братам і трымаў жонку з-пад Глыбокага.

З Познаньскага ваяводства прыехаў Мазуркевіч з жонкай. Займаўся выключна жывёлагадоўляй, якую вёў узорна.

Для жыхароў Лясной верасень 1939 г. стаў чорным. Па даносе першым быў арыштаваны Томаш Бадыла. Тады такім чынам часта зводзілі асабістыя рахункі. А яшчэ страх мацаваў новую ўладу.

Лёс Томаша невядомы.

9 студзеня 1940 г. было звычайным днём, нішто не прадказвала бядой. Вяскоўцы займаліся сваімі справамі і, як звычайна, рана леглі спаць. Але ноччу, ужо пад раніцу, у вокны хат загрукалі. Міліцыянеры ў суправаджэнні праваднікоў-«актывістаў» з Пераброцкай воласці пачалі ўдакладняць спісы жыхароў і склад сем'яў, звяраць прозвішчы. Потым загадалі хутка збірацца, браць з сабой толькі самае неабходнае і грузіцца ў падагнаныя сані. Усчалася паніка. Перапужаныя і разгубленыя людзі ў спешцы хапалі то адно, то другое, часам зусім непатрэбнае. Адусюль чуліся плач жанчын і дзяцей, рыканне жывёлы, камандныя крыкі НКУСаўцаў.

Бязладныя зборы пад рулямі вінтовак хуткімі не атрымліваліся. Толькі пад вечар абоз з некалькіх саней, поўных людзей і небагатага сялянскага скарбу, акружаны канваірамі, дабраўся ў Волкаўшчыну. Мясцовыя сяляне імкнуліся нешта перадаць гаротнікам у далёкую дарогу. Але іх адганялі змрочныя фігуры ў доўгіх шынялях з вінтоўкамі наперавес.

Напярадзе абоз чакаў паўстанак Купчалёва, таварныя вагоны і доўгі шлях у Сібір. Там некаторыя жыхары Лясной засталіся назаўсёды. Каму пашчасці-

ла перажыць усё, не варочаліся ў нашы мясціны. Толькі Ян Гогач пасля вайны наведаў родных сваёй жонкі. Астатнія шукалі спакайнейшае і больш заможнае жыццё ў Польшчы.

Колькі ў той дзень было рэпрэсіравана толькі ў гэтай невялікай вёсачцы, дакладна невядома. Крыху больш трыццаці чалавек. Але ў той дзень былі яшчэ тры ахвяры. У леснічоўцы ля Масцішча былі схоплены ляснічы Казімір Залескі, яго жонка-настаўніца Гелена з маленькім дзіцём. Яны пайшлі па шляху пакут разам з жыхарамі Лясной. Праз нейкі час ад Гелены да знаёмых прыйшоў ліст. У ім паведамлялася, што дзіця ў дарозе памерла і яго на хаду поезда проста выкінулі ў снег.

Рэпрэсій пазбегла сям'я Бертмана, якая яшчэ да 1939 г. памяняла месца жыхарства, і жонка Леанарда Сівіцкага — яе не паспелі занесці ў «чорны» спіс.

...Пагорачкі і лагчыны, уздоўж недалёкага лесу няспешна струменіць ручай, дзе-нідзе купкамі ўзвышаюцца пасярод палёў і лугоў хмызнякі, віецца між імі палявая дарога. Дзве хаткі, у якіх пакуль цепліцца жыццё, рэшткі амаль разбуранай аборы, ставок ды адзічэлыя сады нагадваюць аб тым, што тут некалі буяла жыццё.

Сцяг працы. 1993. 10 жн.

«Варфаламееўскія ночы»

З успамінаў І. А. Лапіцкага

...Зіма 1940 г. была перыядам страху і няўпэўненасці ў заўтрашнім дні для многіх. Вывозіліся ў Казахстан і некуды на Поўнач сем'і памешчыкаў, паліцаяў, асаднікаў, служачых і польскіх актывістаў. Вывазы рабіліся ноччу. Вечарам зганялі ў Дзісну падводы, ноччу міліцыя раз'язджалася ў розныя бакі са спісамі сем'яў, якія належаць вывазу. Ніхто не мог ведаць, на каго выпадзе гэтае страшнае жэрабя, пакуль ноччу не пастукаюць яму ў дзверы і не дадуць каманду «Собирайтесь!» На ліквідацыю гаспадаркі і падрыхтоўку да ад'езду даваліся 2—3 гадзіны.

Давялося і нам перажыць шмат страху і быць відавочцамі жахлівых выпадкаў. Я ж таксама працаваў сакратаром гміны. Асабліва мне запомнілася адна «варфаламееўская ноч». Вечарам пайшла па гораду чутка, што сабралася шмат падвод, будзе масавы вываз. Можна ўявіць, з якім настроем, з якой трывогай мы сустракалі гэтую ноч. Святло патушылі, але ніхто не думаў задрамаць Чакалі стуку ў дзверы. І вось застукалі. Усе паўскоквалі з ложкаў. Жонка адчыніла дзверы. У пакой увайшлі два міліцыянеры і адзін у цывільным адзенні. «Зажгите огонь», — сказаў адзін з увайшоўшых. Наступіла жахлівая паўза. «Здесь кто живет?» Жонка адказала. І зноў паўза. «А где живет жена коменданта полиции Бальцера?» Жонка паказала на другую палову дома. Начныя наведвальнікі пайшлі, а мы доўга не маглі апамятацца і прамовіць слова. Я прыглядваюся да аслупянеўшых жонкі і дзяцей і імкнуся ўгадаць іх думкі. На тварах дзяцей прыкметна горкая ўсмешка, схаваная радасць. Радуемся ўсе мы, што яшчэ раз страшнае жэрабя не выбрала нас.

Жонка Бальцара днём раней гэтага «візіту» нарадзіла. Мая жонка прысутнічала пры родах у якасці акушэркі. Хворую з нованароджаным і двума дзецьмі 4 і 6 гадоў пасадзілі ў сані і павезлі ў цёмную марозную ноч.

Так праходзілі ночы пад страхам вывазу на працягу ўсёй зімы, і толькі вясной мы ўздыхнулі лягчэй, бо вывазы спыніліся. Тое, што не вывезлі маю сям'ю, лічылася цудам. Некаторыя гаварылі, што выратавала маё калецтва. Гэта няпраўда. Выратавала тое, што ні я, ні мая жонка не мелі ворагаў сярод мясцовага насельніцтва. Наадварот, мелі шмат добрых сяброў-яўрэяў і беларусаў. Некаторыя з іх з прыходам савецкай улады аказаліся камуністамі

і занялі кіруючыя пасады ў раённых партыйных і савецкіх органах. Калі б не гэтыя сябры (Грыцкевіч, Розет, Шульман), мне б давялося падзяліць лёс старога-калекі Садоўскага з Мікалаёва, які разам з сям'ёй быў вывезены ў Казахстан і, як расказваюць відавочцы, пакончыў самагубствам.

ВЕРНУТЫЯ ІМЁНЫ

Ахвяры беспадстаўных палітычных рэпрэсій

ДАЎГІНАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАРСУКІ

МУРАШКА Мікалай Васільевіч, н. у 1903, аднаасобнік. Арыштаваны 12.5.1933, асуджаны да высылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 13.7.1993.

ВЁСКА БРЭДЗЕВА

КУДЫШ Марыя Фамінічна, н. у 1884, калгасніца. Маці траіх дзяцей, арыштавана 4.2.1933, асуджана да ВМП. Рэабілітавана 31.8.1989.

ВЁСКА БУДАВА

ЖУГЕР Сцяпан Ігнатавіч, н. у 1887, калгаснік. Арыштаваны 4.2.1933, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.9.1989.

РУСЕЦКАЯ Марыя Вікенцьеўна, н. у 1990, хатняя гаспадыня. Арыштавана 15.5.1929, асуджана да высылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана 9.1.1992.

ВЁСКА ГРУДЗІНАВА

БЖЭСКАВЯК Уладзіслаў Стэфанавіч, н. у 1899 у Познаньскім ваяв., селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 27.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, на Поўначы да 1.9.1941. Рэабілітаваны 22.12.1989.

БЕЛАВУС Аляксей Аляксеевіч, н. у 1904, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 13.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, высланы на Поўнач. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ВЁСКА ДУБНІКІ

СМУЛЬКО Юльян Казіміравіч, н. у 1893, начальнік оперпункта НКУС у Бігосава. Арыштаваны 14.8.1937, расстраляны 16.9.1938. Рэабілітаваны 25.1.1958.

ВЁСКА ЛЯВОНПАЛЬ

БАЛЕЎСКІ Баляслаў Карлавіч, н. у 1898 у Польшчы, селянін. Арыштаваны 26.12.1939, асуджаны на 8 гадоў, высланы ў Каргапальлаг. Рэабілітаваны 6.4.1990.

ВАНЕВІЧ Мар'ян Уладзіслававіч, н. у 1906 на Украіне, настаўнік Лявонпальскай школы. Арыштаваны 20.7.1940, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ДУЦМАЛЬ Юзаф Сямёнавіч, н. у 1990, камендант паліцыі ў Лявонпалі. Арыштаваны 18.9.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 6.11.1992.

КУРОВІЧ Аляксандр Паўлавіч, н. у 1890 у г. Лодзь, нам. каменданта паліцыі ў Лявонпалі. Арыштаваны 18.9.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 6.11.1992.

МЯЛЬКО Томаш Мацвеевіч, н. у 1899 у Познаньскім ваяв., былы паліцэйскі. Арыштаваны 26.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.11.1989.

СМУЛЬКО Іван Вікенцьевіч, н. у 1879, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 25.8.1937, расстраляны 8.12.1937. Рэабілітаваны 22.1.1959.

ФЕЛЬДЭНШТЭЙН Берка Абрамавіч, н. у 1909 у Польшчы, кравец-прыватнік у в. Лявонпаль. Арыштаваны 12.11.1940, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ШУК Аляксандр Дзмітрыевіч, н. у 1910, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 4.9.1931, асуджаны на 5 гадоў канцлагера. Рэабілітаваны 12.10.1989.

ВЁСКА СКАКУНЫ

ПАДВІНСКІ Браніслаў Гіляравіч, н. у 1887, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 28.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.11.1989.

РУДЗІЧ Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1900, ляснік. Арыштаваны 13.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ВЁСКА СЛАБАДА

САВІЦКАЯ Ганна Рыгораўна, н. у 1893, калгасніца. Арыштавана 19.9.1937, асуджана на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 7.4.1989.

ВЁСКА ТОМАШ ДВОР

РАГОЎСКІ Іосіф Іосіфавіч, н. у 1896, рахункавод. Арыштаваны 16.6.1933, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.4.1966.

ДВАРНАСЕЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГІР'ЯТЫ

КАШКУР Іосіф Якаўлевіч, н. у 1915, ветурач. Арыштаваны 28.12.1944, асуджаны на 7 гадоў ППЛ, высланы ў Варкуту. Рэабілітаваны 22.9.1955.

ВЁСКА ЗАГОР'Е

ШАЎЛЮГА Павел Фёдаравіч, н. у 1913, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 11.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, у Варкутлагу да 21.9.1941. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ГОРАД ДЗІСНА

АБРАМЗОН Генох Генохавіч, н. у 1897, рабочы. Арыштаваны 5.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.11.1990.

АБРАМЗОН Маісей Янкелевіч, н. у 1918, кравец. Арыштаваны 14.3.1939, асуджаны на 15 гадоў ППЛ, высланы ў Енісейск. Рэабілітаваны 11.6.1955.

АБРАМЗОН Мордух Мендзелевіч, н. у 1909, гандляр ільном. Арыштаваны 6.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.11.1990.

АБРАМЗОН Носен Шмуйлавіч, н. у 1912, арандатар млына. Арыштаваны 8.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.10.1992.

АГУРЧОНАК Васіль Іванавіч, н. у 1907, слесар, арыштаваны 6.12.1928, асуджаны на 5 гадоў канцлагера. Рэабілітаваны 31.7.1992.

АЛЬХІМОВІЧ Аркадзь Іванавіч, н. у 1914, рыбак. Арыштаваны 23.7.1932, асуджаны на 10 гадоў канцлагера. Рэабілітаваны 30.6.1992.

АРЦІМЁНАК Іван Іванавіч, н. у 1902, аднаасобнік. Арыштаваны 5.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.11.1990.

АТРАХІМОВІЧ Уладзімір Аляксандравіч, н. у 1895 у в. Каралёва, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 9.11.1939, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 17.11.1944.

БАЛЬЦАР Францішак Якубавіч, н. у 1897 у Германіі, камендант Дзісенскай паліцыі. Арыштаваны 17.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.10.1990.

БІМБАТ Маісей Янкелевіч, н. у 1880 г. у в. Мікалаёва, уладальнік млына і электрастанцыі. Арыштаваны 17.3.1940, асуджаны да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 1.11.1990.

БОДНЕЎ Гірша Эльяшавіч, н. у 1912 у в. Баброўшчына Пліскай воласці, прыватны кравец. Арыштаваны 15.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Сасланы ў Каргапальлаг да 1.9.1941. Рэабілітаваны 12.12.1989.

БЯЛЯЙ Галіна Мікалаеўна, н. у 1921, тэлефаністка. Арыштавана 5.7.1940, асуджана на 5 гадоў ППЛ. У Карлагу да 22.11.1941. Рэабілітавана 31.10.1989.

ВАРОНА Мікалай Купрыянавіч, н. у 1901 у в. Жады, старшыня арцелі «Новы лад». Арыштаваны 26.12.1944, асуджаны на 6 гадоў ППЛ у Комі АССР. Рэабілітаваны 17.4.1963.

ГАЛАЎЧЫНСКІ Гурый Мікалаевіч, н. у 1904, былы нам. рэферэнта старосты Глыбоцкага павета. Арыштаваны 3.4.1940, асуджаны да 5 гадоў ППЛ, у Вятлагу да 8.1941. Рэабілітаваны 12.12.1989.

ГАЛУБІЦКІ Клеафас Осіпавіч, н. у 1990, цясляр. Арыштаваны 21.10.1939, асуджаны на 9 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ГЕЛЬФАНД Ісак Мордухавіч, н. у 1904 у Латвіі, майстар арцелі «Савецкая Беларусь». Арыштаваны 12.8.1949, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, высланы ў Краснаярскі край. Рэабілітаваны 2.11.1990.

ГІТЛІЦ Танкум Моўшавіч, н. у 1910, беспрацоўны. Арыштаваны 3.10.1939, асуджаны на 5 гадоў ППЛ, высланы ў Казахстан. Рэабілітаваны 16.10.1992.

ГЛЕБКА Антон Сцяфанавіч, н. у 1909 у Расіі, рабочы па найму. Арыштаваны 4.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.11.1990.

ГРЫЦКЕВІЧ Георгій Аляксандравіч, н. у 1911, загадчык Дзісенскага райкамунгаса. Арыштаваны 5.8.1940, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.10.1990.

ГРЫЦКЕВІЧ Пётр Вікенцьевіч, н. у 1898, рабочы-цясляр у гарадскім вучылішчы. Арыштаваны 5.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.11.1990.

ДАРВАЕД Ігнат Іванавіч, н. 13.3.1911, саматужнік. Арыштаваны 12.10.1930, асуджаны на 5 гадоў канцлагера. Рэабілітаваны 19.10.1989.

ДАРВАЕД Мікалай Рыгоравіч, н. у 1907, шавец. Арыштаваны 6.12.1928, асуджаны на 5 гадоў канцлагера. Рэабілітаваны 31.7.1992.

ДЗЯВУЛЬСКІ Альберт Андрэевіч, н. у 1901, загадчык кааператыва пры магазіне «Рольнік». Арыштаваны 8.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ДЗЯНЬКОЎСКІ Канстанцін Антонавіч, н. у 1877, рабочы-чыгуначнік. Арыштаваны 2.7.1931. Пазбаўлены права жыць у пагранічнай паласе на 3 гады. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ДЛУГІН Азрэль Міхайлавіч, н. у 1906, рабочы. Арыштаваны 9.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.11.1990.

ЖАРДЗЕЦКІ Мечыслаў Людвігавіч, н. у 1893 у в. Міронава, прадавец магазіна ў Дзісне. Арыштаваны 15.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, у Каргапальлагу да 16.9.1941. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ЖЫЛІНСКІ Вікенцій Вацлававіч, н. у 1880, селянін. Арыштаваны 26.12.1944, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ІСАКОВІЧ Сяргей Герасімавіч, н. у 1903, селянін. Арыштаваны 13.3.1932, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.10.1989.

ІСРАІЛАВА Алена Аляксандраўна, н. у 1910. Арыштавана 9.12.1948, асуджана на 10 гадоў

ППЛ з абмежаваннем правоў на 5 гадоў. Рэабілітавана 3.5.1996.

ІЦІН Фішар Шмуйлавіч, н. у 1909, селянін. Арыштаваны 5.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.11.1990.

КАРЖАНЕЎСКІ Антон Герасімавіч, н. у 1886 у в. Кухцінцы, цясляр. Арыштаваны 12.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, вывезены ў Сібір. Рэабілітаваны 28.11.1989.

КАРЭПЧЫК Мікалай Міхайлавіч, н. у 1907, пільшчык у лясніцтве. Арыштаваны 5.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.11.1990.

КАТКОЎСКІ Іван Мікалаевіч, н. у 1918 у в. Лебедзева Маладзечанскага р-на, бухгалтар. Арыштаваны 6.2.1941, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Памёр у 1943 у зняволенні. Рэабілітаваны 4.6.1992.

КЕЙЗІК Мікалай Феафанавіч, н. 13.6.1920 у в. Лявонпаль, вучань ліцэя ў Дзісне. Арыштаваны 4.2.1939, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 8.10.1993.

КЛЕТ Афраім Мендзелевіч, н. у 1903, рабочы. Арыштаваны 5.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, высланы на Поўнач да 1.9.1941. Рэабілітаваны 22.12.1989.

КЛЕТ Гірш Абрамавіч, н. у 1912, рабочы. Арыштаваны 6.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.11.1990.

ЛАБАДЗЬ Мілецій Гіляравіч, н. у 1897 на х. Копаравічы, вальшчык Дзісенскага райпрамкамбіната. Арыштаваны 24.12.1944. Рэабілітаваны і вызвалены з турмы 8.4.1947.

ЛЕКАХ Іосіф Савельевіч, н. 15.8.1898, грузчык. Арыштаваны 16.9.1937, расстраляны 25.11.1937. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ЛУШЧЫК Канстанцін Гаўрылавіч, н. у 1912 у Пецярбурзе, шафёр школы міліцыі ў Дзісне. Арыштаваны 5.8.1940, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Ва Ухце да 8.1941. Рэабілітаваны 12.12.1989.

МІНДЛІН Лейб Лейзеравіч, н. 30.10.1909, сталяр. Арыштаваны 5.10.1939. Асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 18.10.1989.

МІХНЕВІЧ Францішак Данатавіч, н. у 1904. Арыштаваны 5.10.1939, асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 24.11.1989.

НАРУШКЕВІЧ Іван Уладзіслававіч, н. у 1904, настаўнік. Арыштаваны 1.5.1940, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Сасланы ва Ухту да 1.9.1941. Рэабілітаваны 12.12.1989.

ПАГАЛІНСКІ Антон Валяр'янавіч, н. у 1903 у Лепельскім пав., рабочы па ўтрыманні пагранічных знакаў. Арыштаваны 29.9.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, на Поўначы да 9.1941. Рэабілітаваны 20.11.1989.

РАШЫЦКІ Платон Васільевіч, н. у 1891 у Ветрынскім р-не, каваль, прыватны прадпрымальнік. Арыштаваны 31.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, высланы ў Пячлаг. Рэабілітаваны 19.2.1990.

РЖАЧЫЦКІ Казімір Антонавіч, н. у 1897, рабочы на высечцы лесу. Арыштаваны 27.2.1924, асуджаны на 3 гады канцлагера. Рэабілітаваны 30.6.1992.

РЖАЧЫЦКІ Станіслаў Антонавіч, н. у 1898, селянін. Арыштаваны 27.2.1924, асуджаны да высылкі на Урал на 3 гады. Рэабілітаваны 30.6.1992.

САМАЗВАНАЎ Анфім Фаміч, н. у 1911, чарнарабочы. Арыштаваны 5.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, ва Ухце да 11.9.1941. Рэабілітаваны 22.12.1989.

САФРО Лейба Юдалевіч, н. у 1918, рабочы. Арыштаваны 18.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.11.1990.

СІНІЦА Васіль Лаўрэнавіч, н. у 1922 у в. Мурашчына, шавец. Арыштаваны 28.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.11.1990.

СЫРЭВІЧ Юстын Антонавіч, н. у 1910, цясляр. Арыштаваны 17.11.1939, асуджаны на 5 гадоў ППЛ, на Поўначы да 23.9.1941. Рэабілітаваны 20.11.1989.

СЯРГЕЕЎ Валянцін Дзмітрыевіч, н. у 1884, садавод калгаса «Пралсоўінтэрн» у в. Луначарскае. Арыштаваны 24.8.1937, расстраляны 5.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 1.4.1958.

ТУМАРКІН Меер Іосіфавіч, н. у 1909, настаўнік. Арыштаваны 14.10.1940, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, вызвалены 4.6.1945. Рэабілітаваны 9.5.1955.

УНУК Уладзіслаў Антонавіч, н. у 1898 у Мехаўскім р-не, ст. паліцэйскі. Арыштаваны 5.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.11.1990.

ФІНКЕЛЬМАН Лейзер Файвушавіч, н. у 1911, гандляр. Арыштаваны 15.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.11.1990.

ХАЛЕМАНЮК Вячаслаў Рыгоравіч, н. у 1896 у Люблінскім пав., нам. каменданта паліцыі. Арыштаваны 17.9.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.12.1990 г.

ХАСІНЕВІЧ Рамуальд Якаўлевіч, н. у 1921, саматужны цясляр-маляр. Арыштаваны 12.2.1941, асуджаны на 8 гадоў у ППЛ. Памёр у зняволенні ў 1943. Рэабілітаваны 4.6.1992.

ШАБАР Сцяфан Сцяфанавіч, н. у 1904, калодзежны майстар. Арыштаваны 11.11.1940, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ШАДЗЕЎСКІ Андрэй Антонавіч, н. у 1902 у Латвіі, селянін. Арыштаваны 28.10.1939, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Сасланы ва Ухту. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ШУЛЬГА Дзмітрый Купрыянавіч, н. у 1990 у в. Рагульцы, чорнарабочы. Арыштаваны 16.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, сасланы ў Вятку. Рэабілітаваны 1.11.1990.

ШЧАРБІЦКІ Канстанцін Аляксандравіч, н. 4.5.1912 у Фінляндыі, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 27.12.1935, асуджаны на 3 гады ППЛ. У Варкуце да 20.1.1939. Рэабілітаваны 18.9.1989.

ШЫМАНОЎСКАЯ Софія Станіславаўна, н. у 1871, хатняя гаспадыня. Арыштавана 2.5.1921, асуджана на 2 гады ў Архангельскі канцлагер. Рэабілітавана 29.5.1992.

ЮДЗІН Ісер Айзікавіч, н. у 1887, рабочы-сплаўшчык. Арыштаваны 25.8.1924, асуджаны на 5 гадоў канцлагера ў Салаўках. Рэабілітаваны 6.6.1991.

ЯКУТОВІЧАВА Эмілія Міхайлаўна, н. у 1894, былая памешчыца, арыштавана 12.8.1940, асуджана на 7 гадоў ППЛ. Саслана на Поўнач. Рэабілітавана 18.10.1989.

ЯЦЫНА Мечыслаў Альбертавіч, н. у 1890, памешчык з засценка Каледзіна. Арыштаваны 18.7.1920, змешчаны ў канцлагер на ўвесь час грамадзянскай вайны. Рэабілітаваны 29.5.1992.

ЗАВУЦЦЕЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АТРОШКАВА

РУТКОЎСКАЯ Ганна Сцяпанаўна, н. у 1880, калгасніца. Арыштавана 24.8.1937, асуджана на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 30.11.1989.

ВЁСКА ГІРГЕЛІ

УРБАН Антон Восіпавіч, н. у 1904 у в. Сойчына, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 9.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, высланы на Поўнач. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ВЁСКА ГУСАКІ

ВАРАТЫНСКІ Целесфор Георгіевіч, н. у 1903, рыбак Браслаўскага рыбтрэста. Арыштаваны 31.12.1944, асуджаны на 4 гады ППЛ. Вызвалены 28.5.1948 і перададзены польскім уладам. Рэабілітаваны 24.12.1992.

ХУТАР ЖАДЫ

ВАШКЕЛЬ Андрэй Мацвеевіч, н. у 1903, селянін. Арыштаваны 1.3.1932, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.4.1993.

ХУТАР ЗАГАСЦІННЕ
(не існуе)

КРАСНІЦКІ Антон Віктаравіч, н. у 1898 у фальв. Сутокі, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 20.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, да 9.9.1941 ва Ухце. Рэабілітаваны 15.11.1989.

ВЁСКА КАДУШКІ

ДМОЎСКІ-КАДУШКА Якаў Сцяпанавіч, н. у 1898, упаўнаважаны штаба войск Заходняга фронту. Арыштаваны 27.9.1924, асуджаны да 1 года канцлагера. Рэабілітаваны 18.1.1993.

КАДУШКА Мікалай Андрэевіч, н. у 1990, селянін. Арыштаваны 19.8.1927, асуджаны на 3 гады канцлагера. Рэабілітаваны 31.7.1992.

ВЁСКА КАЛАТУШКАВА

ЗАЯЦ Аляксандр Васільевіч, н. у 1915 у в. Рэдзькі, сталяр. Арыштаваны 19.12.1939, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 15.11.1989.

САЛАВЕЙ Цімафей Іванавіч, н. у 1895, калгаснік. Арыштаваны ў 1938, расстраляны ў Полацку 13.7.1938. Рэабілітаваны 7.5.1959.

ХУТАР КАМЕНКА

ЦЫБУЛЬСКІ Мечыслаў Вацлававіч, н. у 1904 на х. Каменка Мікалаёўскай вол., памешчык. Арыштаваны 23.9.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, сасланы ў Котлас. Рэабілітаваны 14.1.1993.

ВЁСКА КАНАРШЧЫНА

КУЛЯНОК Іван Антонавіч, н. у 1910, селянін. Арыштаваны 1.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, на Поўначы да 9.1941. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ХУТАР КІСЯЛІ

КІСЯЛЁЎ Васіль Васільевіч, н. у 1898, вартаўнік ларка. Арыштаваны 14.9.1936, асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 20.2.1940.

ВЁСКА КОПАРАВІЧЫ

ПАТКЕВІЧ Ігнат Іванавіч, н. у 1864, арандатар. Арыштаваны 1.2.1930, асуджаны да ВМП, расстраляны. Рэабілітаваны 11.9.1989.

ВЁСКА КОЩЦЕВА

САКОВІЧ Пётр Мікітавіч, н. у 1893, парабак. Арыштаваны 14.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні у Котласе. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ВЁСКА КУХЦІНЦЫ (УВАЙШЛА У СКЛАД ЗАВУЦЦЯ)

АЛЯШКЕВІЧ Яўтен Ціханавіч, н. у 1908 у Ковенскай губ., часова не працаваў. Арыштаваны 24.4.1934, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 19.10.1989.

САЧЫЎКА Алена Адамаўна, н. у 1887 у Свянцянскім пав., сялянка. Арыштавана 22.2.1933, асуджана на 5 гадоў ППЛ, потым тэрмін павялічаны на 3 гады. Рэабілітавана 2.10.1989.

САЧЫЎКА Іван Аляксеевіч, н. у 1887, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 11.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, у Цельлагу да 9.1941. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ВЁСКА ЛОНКА

ГАЛЫМБЕЕЎСКІ Іван Адамавіч, н. у 1886 у Сядлецкай губ., селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 20.9.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.11.1989.

ГРОНСКІ Уладзімір Антонавіч, н. у 1897 у Ашмянскім павеце, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 20.9.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, саслана ны на Поўнач. Рэабілітаваны 20.11.1989.

САЛТУКОВІЧ Іван Станіслававіч, н. у 1897 у Польшчы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 20.9.1939, асуджаны на 5 гадоў ППЛ, на Поўначы да 25.9.1941. Рэабілітаваны 16.10.1992.

СКРЫПКА Пётр Антонавіч, н. у 1903, солтыс Мікалаёўскай вол. Арыштаваны 24.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, высланы на Поўнач. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ВЁСКА МАЛІНАЎКА

КОТ-КАТОВІЧ Баляслаў Апалінаравіч, н. 20.2.1884, камендант інтэрната Белкамунтрэста ў Полацку. Арыштаваны 22.8.1937, расстраляны 12.11.1937. Рэабілітаваны 13.10.1989.

ВЁСКА МАЛІНАЎКА

АСТАПОВІЧ Іван Мікалаевіч, н. у 1895 у в. Малькавічы, селянін. Арыштаваны 3.6.1920, змешчаны ў канцлагер да канца грамадзянскай вайны. Рэабілітаваны 29.5.1992.

МЯДЗЕЛЕЦ Мефодзій Аляксандравіч, н. у 1898 у в. Малькавічы, селянін. З 1919 у Чырвонай Арміі. Арыштаваны 3.6.1920, змешчаны ў канцлагер да канца грамадзянскай вайны. Рэабілітаваны 29.5.1992.

ВЁСКА МЫСЛЎЦЫ

МЫСЛІВЕЦ Аляксей Васільевіч, н. у 1906, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 13.12.1939, асуджаны на ППЛ у Каргапаль да 28.9.1941. Рэабілітаваны 13.12.1989.

ВЁСКА НАРОВЫ

ЮНАШКА Францішак Казіміравіч, н. у 1905 у Ашмянскім пав., селянін-аднаасобнік на х. Наровы. Арыштаваны 15.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 15.11.1989.

ВЁСКА РАНДАРЫ

КАДУШКА Павел Андрэевіч, н. у 1902, селянін. Арыштаваны 16.9.1926, асуджаны да 10 гадоў канцлагера, высланы ў Салаўкі. Рэабілітаваны 16.4.1992.

ХУТАР РЫЖОЎЦЫ

ЛУШЧЫК Алена Гаўрылаўна, н. у 1906 у Пецярбурзе, хатняя гаспадыня. Арыштавана 30.1.1927, асуджана на 3 гады канцлагера. Рэабілітавана 10.4.1992.

ВЁСКА САЛАЎІ

ШУГАЛЬСКІ Віктар (Вікенцій) Іларыёнавіч, н. у 1901. Арыштаваны 27.4.1929, асуджаны на 10 гадоў канцлагера. Рэабілітаваны 12.6.1956.

ВЁСКА САЧЫЎКІ

БАБАКА Міхаіл Казіміравіч, н. у 1893, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 20.12.1949, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 3.9.1965.

БАБАКА Сцяфан Сямёнавіч, н. 16.5.1886, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 29.8.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, сасланы ва Ухту, вызваленыны 21.9.1941. Рэабілітаваны 29.11.1989.

ПЯТКЕВІЧ Феліцыян Антонавіч, н. у 1871, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 15.7.1940, асуджаны да ссылкі на 5 гадоў у Краснаярскі край. Рэабілітаваны 12.12.1989.

ВЁСКА ТРАЯКІ

САКОВІЧ Арсен Васільевіч, н. у 1904, селянін. Арыштаваны 18.12.1926, асуджаны на 3 гады канцлагера, сасланы на Салаўкі. Рэабілітаваны 31.7.1992.

САКОВІЧ Лявон Іванавіч, н. у 1890, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 4.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Вызвалены 9.1941. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ВЁСКА УСЦЕ

ЖАРАНІН Васіль Сямёнавіч, н. 2.2.1895, электраманцёр. У 1919—1920 гг. нам. камісара 706-га шпіталя Чырвонай Арміі. Арыштаваны 26.11.1937, расстраляны 31.1.1938. Рэабілітаваны 10.12.1966.

ЖАРАНІН Мікалай Васільевіч, н. у 1915, рабочы. Арыштаваны 13.12.1935, асуджаны на 6 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.5.1995.

ПАЛІНСКІ Антон Яфімавіч, н. у 1892. Арыштаваны 18.4.1928, асуджаны да высылкі на 3 гады ў Сібір. Рэабілітаваны 29.5.1992.

ВЁСКА ЦВЕЦІНА

АРАНСКІ Лявон Казіміравіч, н. у 1867 у фальв. Цвеціна, былы памешчык, змешчаны ў канцлагер да канца вайны з Польшчай. Рэабілітаваны 25.5.1992.

РАЗУМЧЫК Фёдар Селівейстравіч (Сільве-

стравіч), калгаснік. Арыштаваны 21.11.1937. Расстраляны 17.1.1938. Рэабілітаваны 7.9.1960.

ВЁСКА ЦЕЛЯШЫ

ЧАРНЯЎСКІ Дзмітрый Іванавіч, н. у 1889 у Свянцянскім павеце, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 25.7.1925, асуджаны на 3 гады канцлагера. Рэабілітаваны 20.7.1992.

ХУТАР ЦІМАНОЎШЧЫНА

КУЛІКОЎСКІ Іван Іванавіч, н. у 1902 у фальв. Ціманоўшчына, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 23.10.1939, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 15.11.1989.

ВЁСКА ЦІШЫНО

ФІЛІПОВІЧ Іван Рыгоравіч, н. у 1906, селянін. Арыштаваны 14.11.1939, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.10.1989.

ВЁСКА ЧАЛНІЧЫНА

МУЛЯРОНАК Сяргей Рыгоравіч, н. у 1912 у фальв. Сяргееўка, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 24.11.1939, асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ВЁСКА ЧАРАПЫ

КАДУШКА Яфім Паўлавіч, н. 8.9.1891, аднаасобнік. Арыштаваны 22.9.1939, асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 24.11.1989.

КАДУШКА Яфім Паўлавіч, н. у 1891, селянін. Арыштаваны 18.8.1927, асуджаны на 10 гадоў канцлагера. Рэабілітаваны 31.7.1992.

КАНАШЭВІЧ Алена Фёдараўна, н. у 1889, прыбіральшчыца. Арыштавана 8.10.1937, расстраляна 11.11.1937. Рэабілітавана 13.10.1989.

МЯТЛА Аляксандр Антонавіч, н. .22.6.1901, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 6.12.1939, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.11.1989.

МЯТЛА Аляксей Кандратавіч, н. у 1897, рабочы сельпо ў в. Кушлікі Полацкага раёна. Арыштаваны 26.9.1937, расстраляны 20.12.1937. Рэабілітаваны 9.10.1989.

МЯТЛА Мікіта Раманавіч, н. у 1899, селянін. Арыштаваны 21.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.10.1992.

ВЁСКА ШПАКІ

БЯЛЯЙ Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1892 у в. Шпакі, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 11.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. У ссылцы да 1.9.1941. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ХУТАР ШЫМАНШЧЫНА

РЫКУН Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1892 у в. Шантарава, калгаснік. Арыштаваны 24.8.1937. Расстраляны 18.11.1937. Рэабілітаваны 6.9.1957.

ВЁСКА ШЫШКІ

ЖУК Іван Людвігавіч, н. у 1893, селянін. Арыштаваны 8.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, у Каргапальлагу да 23.8.1941. Рэабілітаваны 30.12.1989.

г. МІЁРЫ

ПАДОЛЬСКІ Уладзімір Фаміч, н. у 1891 у в. Крукаўка, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 20.12.1940, асуджаны на 5 гадоў ППЛ, да 2.9.1941 сасланы на Поўнач. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ЦВЯЧКОЎСКІ Іосіф Антонавіч, н. у 1897 у в. Русачкі, курсант артакадэміі ў Самаркандзе. Арыштаваны 29.7.1942, асуджаны на 5 гадоў ППЛ, сасланы ў Вятлаг. Рэабілітаваны 11.9.1989.

МІКАЛАЁЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АКУНЁВА

РЭДЗЬКА Макар Міхайлавіч, н. у 1901, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 14.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, у Анеглагу да 19.9.1941. Рэабілітаваны 1.11.1989.

ВЁСКА БАНДАРЦЫ

ЗЕЛЯНКЕВІЧ Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1905 у в. Казлоўцы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.10.1939, асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 24.11.1989.

СЯЦКО Лука Сямёнавіч, н. у 1990, чорнарабочы. Арыштаваны 25.6.1938, асуджаны да ВМП. Расстраляны 3.10.1938. Рэабілітаваны 11.9.1989.

ТРАНКЕВІЧ Антон Пятровіч, н. у 1894, аднаасобнік. Арыштаваны 5.3.1932, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.4.1993.

ВЁСКА ДЗЕХЦЯРОВА

ЯНУШОНАК Антон Захаравіч, н. у 1900, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 17.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, сасланы ў Каргапальлаг да 29.8.1941. Рэабілітаваны 29.8.1941.

ВЁСКА ДЗЯНІСАВА

БЯЛЯЙ Мікалай Канстанцінавіч, н. у 1896, настаўнік сярэдняй школы ў в. Станіславова. Арыштаваны 3.7.1940, асуджаны на 8 гадоў ППЛ.

Высланы ў Каргапальлаг да 16.10.1941. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ВЁСКА ЕЛЬНЯ

БАБЯЦІНСКАЯ Ядвіга Адольфаўна, н. у 1877 у маёнтку Ельня, памешчыца. Арыштавана 28.3.1940, асуджана на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 12.12.1989.

ЯКАВІЦКІ Стэфан Адольфавіч, н. у 1881 у маёнтку Ельня, былы памешчык. Арыштаваны 2.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, высланы ў Карлаг. Рэабілітаваны 12.12.1989.

ВЁСКА КАПЫЛЬШЧЫНА

ЖУК Сільвестр Міхайлавіч, н. у 1898, селянін. У 1919—1920 служыў у Чырвонай Арміі. Арыштаваны 29.8.1929, асуджаны да ВМП. Рэабілітаваны 31.7.1992.

ВАСІЛЁНАК Васіль Фёдаравіч, н. у 1903 у в. Ямна, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 23.8.1940, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ХУТАР КУТЫ

СІЦЬКО Раман Васільевіч, н. у 1905 у фальв. Мікольчыкі Мікалаёўскай вол., каваль. Арыштаваны 18.10.1939, асуджаны на 5 гадоў ППЛ, на Поўначы да 24.9.1941. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ВЁСКА ЛУГАЎЦЫ

РАЗУМЧЫК Васіль Васільевіч, н. у 1893, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 15.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.11.1989.

РАЗУМЧЫК Сяргей Іванавіч, н. у 1912, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 11.10.1932. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 12.10.1989.

ЯЛЕНСКІ Пётр Арсенавіч, н. у 1917, селянін. Арыштаваны 17.7.1938, асуджаны на 3 гады ППЛ, высланы на Калыму. Рэабілітаваны 30.7.1992.

ВЁСКА МІКАЛАЁВА

ВАРАНОЎСКІ Станіслаў Казіміравіч, н. у 1904 у в. Фралова, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 21.9.1939, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Сасланы на Поўнач да 9.9.1941. Рэабілітаваны 20.11.1989.

КАТОВІЧ Цімафей Ціханавіч, н. у 1897, лесаруб. Арыштаваны 3.8.1938, расстраляны 13.10.1938. Рэабілітаваны 10.9.1959.

САДОЎСКІ Васіль Антонавіч, н. у 1892, настаўнік. Арыштаваны 21.9.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Памёр 23.12.1942 у зняволенні. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ШАЙКОЎСКІ Антон Паўлавіч, н. 4.5.1886, казначэй фінчасці артылерыйскіх курсаў удасканалення каманднага саставу ў г. Пушкіне. Арыштаваны 28.8.1937. Расстраляны 8.12.1937. Рэабілітаваны 25.1.1960.

ВЁСКА МІРОНЧЫКІ

ВАРАХОБ Антон Аляксандравіч, н. 10.1.1902, селянін-парабак. Арыштаваны 16.9.1937. Расстраляны 11.11.1937. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ЖАРДЗЕЦКІ Мечыслаў Людвігавіч, н. у 1893, прадавец магазіна. Арыштаваны 15.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ВЁСКА ПАГОРЦЫ

КАБЯК-МЯДЗЕЛЕЦ Ігнат Іванавіч, н. у 1896 у в. Бандарцы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 24.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 15.11.1989.

ХУТАР ПАДОРКА

БАРЦІЦКІ Фелікс Аляксандравіч, н. у 1899 у Люблінскай губерні, валасны старшыня. Арыштаваны 8.1.1940, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.11.1989.

ВЁСКА РУДНЯ

МАЦКЕВІЧ Сяргей Рыгоравіч, н. у 1889, селянін. Арыштаваны 13.4.1950, асуджаны на 10 гадоў ППЛ, вызвалены 27.7.1955. Рэабілітаваны 11.1.1967.

ВЁСКА САКАЛОВА

ГЛПНСКІ Фёдар Вікенцьевіч, н. у 1902, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 12.3.1941, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Расстраляны ў ліпені 1941 пры этапіраванні. Рэабілітаваны 4.6.1992.

МАРОЗ Георгій Ігнатавіч, н. у 1911, селянін. Арыштаваны 25.2.1941, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні ў 1943. Рэабілітаваны 4.6.1992.

МІШУТА Ілля, н. у 1903, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.12.1939, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. На Поўначы да 9.1941. Рэабілітаваны 20.11.1989.

МІШУТА Пётр Максімавіч, н. у 1906 у в. Сакалова, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 12.5.1934, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ВЁСКА СЛАБАДА (ЦЯПЕР У МЕЖАХ в. МІКАЛАЁВА)

КАРОТЧЫК Мікалай Адамавіч, н. у 1909, селянін-парабак. Арыштаваны 21.8.1931, асуджаны на 10 гадоў канцлагера. Рэабілітаваны 28.11.1989.

ТАТАРЫН Іван Дзям'янавіч, н. у 1912, селянін-аднаасобнік, Арыштаваны 11.4.1935, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 4.10.1989.

ВЁСКА СЦЕФАНПОЛЛЕ

МІЦКЕВІЧ Баляслаў Пятровіч, н. у 1890, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 23.9.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, у Варкутлагу да 5.9.1941. Рэабілітаваны 22.12.1989.

СКШЫЛІНСКІ Юльян Валянцінавіч, н. у 1899 у Паморскай губ., дарожны рабочы. Арыштаваны 23.9.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, у Вятлагу да 9.1944. Рэабілітаваны 13.12.1989.

ВЁСКА УСЦЕ

ІВАШКЕВІЧ Апанас Карпавіч, н. у 1915, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 5.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.11.1990.

НОВАПАГОСЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВАЛЕНТАРОЎШЧЫНА

ЯНЧЭЎСКІ Цеафіл Ігнатавіч, н. у 1884, служачы канторы грамадзянскіх спраў. Арыштаваны 21.9.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, сасланы ў Марыінск Новасібірскай вобл. да 30.8.1941. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ВЁСКА ВОЙТКАВА

БАГДАНОВІЧ Вацлаў Антонавіч, н. у 1894, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 21.7.1920, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 10.4.1992.

ВЁСКА ВОСТРАВА

БУЙНІЦКІ Мікалай Тарквіньевіч, н. у 1890, былы памешчык. Арыштаваны 18.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.10.1989.

ХУТАР КАЛЕСНІКІ

ЛАСТОЎСКІ Вацлаў Усцінавіч, н. 20.10.1883, акадэмік. Арыштаваны ў Мінску 21.7.1930, асуджаны да высылкі на 5 гадоў у Саратаў, 23.1.1938 да ВМП. Рэабілітаваны 10.6.1988.

ХУТАР КЛІБАЎШЧЫНА

ГІРЫН Норберт Ігнатавіч, н. у 1907, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 16.9.1940, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, высланы на Поўнач. Рэабілітаваны 28.4.1972.

ХУТАР МАЛАСЦЬ

АНКУДА Антон Васільевіч, н. 1.8.1990, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 19.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Высланы на Поўнач да 25.9.1941. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ВЁСКА НОВЫ ПАГОСТ

ВЯРКОВІЧ Міхаіл Фаміч, н. у 1894 у в. Лебедзева, валасны пісар, сакратар воласці Новы Пагост. Арыштаваны 30.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, высланы ў Варкуту. Рэабілітаваны 22.11.1989.

ВЁСКА СТАРЫ ПАГОСТ

РУБНІКОВІЧ Уладзіслаў Раманавіч, н. у 1901, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 13.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. У Казахстане да 25.9.1941. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ПАВЯЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЛЕКСАНДРОВА

ГЕРБКА Іосіф Янавіч, н. у 1867, селянін. Арыштаваны 17.12.1928, асуджаны да высылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 27.8.1992.

ШУБІН Аляксандр Браніслававіч, н. 13.2.1923, вучань. Арыштаваны 20.1.1939, асуджаны на 5 гадоў ППЛ у Краснаярскім краі. Рэабілітаваны 12.6.1958.

ВЁСКА АЛЕКСАНДРЫНА

РЫНДЗЁНАК Міхаіл Станіслававіч, н. у 1902, селянін. Арыштаваны 28.8.1940, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 18.11.1992.

ВЁСКА ВЯТА

АНОШКА Антон Адамавіч, н. у 1924, селянін. Арыштаваны 27.1.1940, асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 18.6.1992.

ВЁСКА ДЗЕХЦЯРОВА

КРАСЬКО Апанас Іларыёнавіч, н. у 1899, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 23.8.1940, асу-

джаны на 8 гадоў ППЛ. Вызвалены 13.9.1941. Рэабілітаваны 10.8.1990.

КРАСЬКО Кузьма Гіляравіч, н. у 1902, селянін. Арыштаваны 5.9.1930, асуджаны да ВМП. Рэабілітаваны 29.9.1989.

ЯНУШОНАК Антон Захаравіч, н. у 1990, селянін. Арыштаваны 17.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, у Каргапальлагу да 8.1941. Рэабілітаваны 12.12.1989.

ЯНУШОНАК Пётр Пятровіч, н. у 1903, селянін. Арыштаваны 21.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, сасланы ў Комі АССР. Рэабілітаваны 24.12.1992.

ВЁСКА НОВАЕ СЯЛО

БЕЙНАРОВІЧ Іосіф Антонавіч, н. у 1891, брыгадзір калгаса «Праўда». Арыштаваны 20.1.1933, асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 26.10.1989.

ВЁСКА РАЧНЁВА

МІХАЛЬСКІ Тадэвуш Казіміравіч, н. у 1912 у Клецкім ваяв., гандляр-прыватнік. Арыштаваны 13.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, у Каргапальлагу да 19.11.1941. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ВЁСКА СТАЙКІ

ЛАКОТКА Фёдар Васільевіч, н. 9.2.1923, вучань. Арыштаваны 1.2.1938, асуджаны на 5 гадоў працоўнай калоніі. Рэабілітаваны 12.4.1990.

ВЁСКА ЧАМЯРЫ

КАРНІЦКІ Станіслаў Іванавіч, н. у 1880, рабочы-чыгуначнік. Арыштаваны 6.7.1938. Асуджаны да ВМП. Расстраляны ў Смаленску 31.10.1938. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ВЁСКА ЧУРЫЛАВА

БЕЛАВУС Нестар Венядзіктавіч, н. у 1904, калгаснік. Арыштаваны 14.2.1941, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.11.1988.

КАСКЕВІЧ Адам Іванавіч, н. у 1896, старшыня сельпо. Арыштаваны 19.9.1937. Расстраляны 8.12.1937. Рэабілітаваны 4.2.1960.

ВЁСКА ЧУРЫЛАВА ДАЛЁКАЕ

ДЗЕДУШКЕВІЧ Апанас Аляксандравіч, н. у 1914, рахункавод калгаса імя Сталіна. Арыштаваны 22.7.1940, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, ва Ухце да 27.8.1941. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ШУК Віктар Гаўрылавіч, н. у 1894, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 19.7.1940, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 23.4.1941. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ПЕРАБРОДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АСАДА-ДЗЕДЗІНА

ШВІДЗЕР Станіслаў Іосіфавіч, н. у 1890 у Кракаўскай губерні, былы паліцэйскі. Арыштаваны 21.9.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, сасланы ва Ухту. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ВЁСКА БУКАВА

ШУК Фёдар Якаўлевіч, н. у 1895, старшыня калгаса «Камінтэрн» Дрысенскага р-на. Арыштаваны 23.8.1937. Расстраляны 8.12.1937. Рэабілітаваны 6.3.1970.

ВЁСКА ЗАБАЛАЦЦЕ

СТАЛЬМАЧОНАК Данат Адамавіч, н. у 1905 у маёнтку Весялова, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 8.4.1940, асуджаны да 8 гадоў ППЛ, высланы ва Ухту. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ВЁСКА ПАДЗЯВЫ

БАЛЕЙКА Міхаіл Іванавіч, н. у 1893, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 13.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, сасланы ў Варкутлаг. Рэабілітаваны 22.11.1989.

ВЁСКА ПЕРАБРОДДЗЕ

ЦЭЦАР Ульян Міхайлавіч, н. у 1880. Арыштаваны 8.3.1938. Асуджаны да ВМП. Расстраляны 26.10.1938. Рэабілітаваны 6.10.1989.

ВЁСКА ПЕТКУНЫ

ТУРОК Эдвард Вікенцьевіч, н. у 1892 у в. Рубеж Браслаўскага р-на, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 7.10.1940, асуджаны на 5 гадоў ППЛ, у лагеры да 7.10.1941. Рэабілітаваны

ВЁСКА ПЯЧОНКІ

РАЧЫЦКІ Аляксандр Каперавіч, н. у 1891, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 22.5.1929. Рэабілітаваны 19.12.1989.

ВЁСКА СЯКЕРКА

ВАЛЕЎКА Станіслаў Дзяменцьевіч, н. у 1891, брыгадзір калгаса «Бальшавік». Арыштаваны 24.8.1937. Расстраляны 18.11.1937. Рэабілітаваны 26.10.1959.

ВЁСКА ЯНОВА

УЛАСЕВІЧ Міхаіл Карлавіч, н. у 1902, селянін. Арыштаваны 24.9.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ХУТАР ЯНОПАЛЬ

БРЫЦ Ігнат Пятровіч, н. у 1875 у Латвіі, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 8.4.1940, асуджаны на 5 гадоў высылкі ў Краснаярск. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ТУРКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЛЕШЧАНЦЫ

СЛІВА Іван Міхайлавіч, н. у 1890 у Варшаўскай губ., селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 22.9.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, высланы на Поўнач. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ВЁСКА БЕДЗЕНКА

ПАНАМАРЭНКА-ПАДМАРСКІ Мікалай Рыгоравіч, н. у 1898, шавец-прыватнік. Арыштаваны 23.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ЛЯШКЕВІЧ Віктар Адамавіч, н. у 1917 у в. Беразова, селянін. Арыштаваны 5.3.1939, асуджаны да ВМП. Рэабілітаваны 22.8.1961.

ВЁСКА БЕРАЗОВА

УРУБЛЕЎСКІ Канстанцін Паўлавіч, н. у 1922, селянін. Арыштаваны 5.3.1939, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.8.1961.

ВЁСКА БЫЧЫНШЧЫНА

СВІДЭРСКІ Антон Ігнатавіч, н. у 1898 у фальв. Бычыншчына, былы памешчык. Арыштаваны 13.4.1940, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, у Вятлагу да 29.8.1941. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ХУТАР ГЕЛЕНПОЛЛЕ

ЖАБКО Міхаіл Феміцыянавіч, н. 17.2.1904 у Мінску, настаўнік. Арыштаваны 2.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.10.1989.

ВЁСКА ГОРКІ

ГУТОЎСКІ Фердзінанд Аляксандравіч, н. у 1913 у в. Рыжмонты, настаўнік. Арыштаваны 23.12.1944, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 9.5.1948. Рэабілітаваны 18.12.1992.

КЛІСТА Браніслаў Казіміравіч, н. у 1908, слесар-саматужнік. Арыштаваны 10.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, у высылцы да 2.9.1941. Рэабілітаваны 9.7.1992.

ВЁСКА ДРЫГУЧЫ

БАРЭЙКА Міхаіл Бернардавіч, н. у 1906 у Браслаўскім павеце, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.11.1939, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Сасланы ва Ухту да 1.9.1941. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ГАГАЛІНСКІ Аляксандр Васільевіч, н. у 1904 у в. Хомічы, паштальён. Арыштаваны 20.6.1940, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.10.1990.

ЦЯСТА Марыя Фамінічна, н. у 1881, сялянка-аднаасобніца. Арыштавана 17.3.1940, асуджана на 8 гадоў ППЛ. У Сібірлагу да 29.8.1941. Рэабілітавана 24.11.1989.

ХУТАР КАЛЕСНІКІ

ЗАРЭМБА Карней Восіпавіч, н. у 1908 у в. Хоцькава, калгаснік. Арыштаваны 15.9.1944, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 13.1.1969.

ВЁСКА КРАЎЧАНКІ

САДОЎСКІ Антон Вікенцьевіч, н. у 1905, машыніст Дрысенскай электрастанцыі. Арыштаваны 3.2.1938. Расстраляны 19.4.1938. Рэабілітаваны.

ВЁСКА ЛІПАНТЫ

ПРОГ Мікалай Паўлавіч, н. у 1990 у в. Хомічы, кравец. Арыштаваны 9.3.1938, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 9.11.1960.

ВЁСКА МАЛЫШАВА

БУЛАЎСКІ Іван Антонавіч, н. у 1905, селянін. Арыштаваны 26.9.1940, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 1.11.1990.

ГАГАЛІНСКІ Парфірый Васільевіч, н. у 1908. Арыштаваны 12.10.1932, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.10.1989.

ГАРАВЕЦ Іван Антонавіч, н. у 1902, сакратар Дварашчанскага сельскага Савета. Арыштаваны 22.1.1951, асуджаны на 10 гадоў ППЛ з абмежаваннем правоў на 5 гадоў. Вызвалены 6.1.1956. Рэабілітаваны 13.6.1963.

ХУТАР МЫСЛІ

ЧАХОЎСКІ Станіслаў Мартынавіч, н. у 1897, рабочы. Арыштаваны 12.6.1929, асуджаны да высылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 30.9.1993.

ВЁСКА ПОЖАНЬКА

ГАГАЛІНСКІ Уладзімір Іванавіч, н. у 1899 у в. Малышава, селянін. Арыштаваны 12.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, да 25.9.1941 на Поўначы. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ЛЕЙЧЫНСКІ Аляксей Міхайлавіч, н. у 1902 у Пецярбурзе, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 15.3.1934, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ВЁСКА СТАЛЬМАКОВА

ЗЯНОЎСКІ Іосіф Антонавіч, н. у 1903 у м. Празарокі, манцёр сувязі. Арыштаваны 23.10.1940, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, сасланы ва Ухталаг. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ВЁСКА ФРАЛОВА

МАРЦІНОЎСКІ Канстанцін Антонавіч, н. у 1911, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 18.12. 1939, асуджаны на 5 гадоў ППЛ, высланы на Поўнач да 9.1941. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ПАТРЫМАЙЛА Мікалай Аляксандравіч, н. у 1907, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 13.6.1932, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 12.4.1990.

ВЁСКА ЦІМОШКАВА

ПАЧОПКА Андрэй Піліпавіч, н. у 1902, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 28.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. У высылцы да 12.9.1941. Рэабілітаваны 16.10.1992.

ВЁСКА ШАРАГІ

ДЗЯМЕШКА Софія Уладзіміраўна, н. у 1924 у в. Забалоцце, сялянка-аднаасобніца. Арыштавана 1.4.1946, выслана на 5 гадоў у Краснаярскі край. Рэабілітавана 8.12.1989.

ХУТАР ЯСІНА

ЯСІНСКІ Вікенцій Вікенцьевіч, н. у 1889 у фальв. Саўчанкі, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 24.11.1939, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Вызвалены 20.9.1941. Рэабілітаваны 22.12.1989.

УЗМЁНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАРСУКІ

БЕХЦЕР Густаў Карлавіч, н. у 1899 у Седліцкай губерні, пісар. Арыштаваны 17.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ВЁСКА УЗМЁНЫ

ВАЛЫНЦОЎ Сяргей Паўлавіч, н. у 1904, вучань. Арыштаваны 4.3.1921, накіраваны ў калонію. Рэабілітаваны 3.7.1993.

ТАМАШЭВІЧ Іван Іванавіч, н. у 1920 у в. Труды, селянін. Арыштаваны 10.7.1938, асуджаны да ВМП. Рэабілітаваны 29.7.1958.

ЧЭРАСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАСЯНЫЯ

РЫМША Маісей Дзмітрыевіч, н. у 1892, рабочы. Арыштаваны 1.10.1940, асуджаны да ВМП. Рэабілітаваны 17.11.1994.

ВЁСКА ЗАСТАРЫНЦЫ

ДАРОЖКА Іван Аляксандравіч, н. у 1883, калгаснік. Арыштаваны 24.8.1937, расстраляны 26.12.1937. Рэабілітаваны 23.10.1989.

ДАРОЖКА Якаў Аляксандравіч, н. у 1923, калгаснік. Арыштаваны 30.6.1938, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 3.4.1989.

ВЁСКА КРУКІ

ДРАЗДОВІЧ Ірына Максімаўна, н. у 1880, Арыштавана 20.11.1937. Расстраляна 5.1.1938. Рэабілітавана 4.8.1989.

ЯЗНЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АБУХАВА

ГЛЕБКА Раман Васільевіч, н. у 1892, селянін. Служыў у Чырвонай Арміі ў 1919—1920. Арыштаваны 27.10.1937, асуджаны 18.1.1938 да ВМП. Рэабілітаваны 15.6.1992.

СВІРКО Дзмітрый Дзмітрыевіч, н. у 1898, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 11.4.1929, асуджаны на 10 гадоў канцлагераў. Рэабілітаваны 15.5.1958.

ВЁСКА АВЕЧКІ

ШАМШУР Ілья Іванавіч, н. у 1893, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 11.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, сасланы на Поўнач да 23.9.1941. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ШАМШУР Аляксандр Паўлавіч, н. у 1902, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 16.12.1939, асуджаны на 5 гадоў ППЛ, высланы ва Ухту, затым ў Бузулук. Рэабілітаваны 14.1.1993.

ВЁСКА АЛЬХОЎКА

САКОВІЧ (ЦІМАНОЎСКАЯ) Настасся Кандратаўна, н. у 1901, сялянка. Арыштавана 1.10.1927, асуджана на 5 гадоў канцлагера. Рэабілітавана 15.6.1992.

ВЁСКА АМБРОСЕНКІ

МЯТЛА Павел Сцяпанавіч, н. у 1897, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 31.1.1949, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.3.1966.

ВЁСКА АНКУДАВА

ЯРЫНОЎСКІ Вільгельм Лаўрэнцьевіч, н. у 1897, памешчык. Арыштаваны 21.10.1940, асуджаны на 5 гадоў высылкі ва Узбекістан. Вызвалены 2.1942. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ВЁСКА АЎЛАСЕНКІ

ПУЧКОЎСКІ Пётр Антонавіч, н. у 1895, калгаснік. Арыштаваны 13.8.1938. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Памёр 24.11.1940. Рэабілітаваны 24.8.1959.

ПУЧКОЎСКІ Уладзімір Пятровіч, н. у 1898, калгаснік. Арыштаваны 24.8.1949, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Вызвалены 21.8.1954. Рэабілітаваны 3.9.1965.

ВЁСКА БАГУЦКІЯ

БЯЛЕВІЧ Леў Мікалаевіч, н. у 1928, студэнт. Арыштаваны 15.2.1947, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.10.1992.

ХУТАР БАРАВОЕ

РАЧЫЦКІ Мечыслаў Адольфавіч, н. у 1905, цясляр. Арыштаваны 20.2.1940, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. У Каргапальлагу да 10.1940. Рэабілітаваны 16.10.1992.

ВЁСКА БАСЯНКІ-3

КАБЯК Фама Іванавіч, н. у 1889, калгаснік. Арыштаваны 14.7.1950, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 10.6.1965.

ВЁСКА БЛОШНІКІ (ЦЯПЕР КАЛІНАВАЕ)

БЯЛЕВІЧ Марыя Станіславаўна, н. у 1894, брыгадзір Полацкага пункта па дастаўцы статка. Арыштавана 19.11.1937, асуджана да ВМП. Расстраляна 5.1.1938. Рэабілітавана 16.10.1989.

ВОРАХАЎ Дзмітрый Міхайлавіч, н. у 1904, калгаснік. Арыштаваны 23.8.1937, асуджаны да ВМП. Расстраляны 20.11.1937 у Полацку. Рэабілітаваны 9.10.1989.

НЕЗБЖЫЦКІ Уладзіслаў Уладзіслававіч, н. 14.1.1908, настаўнік. Арыштаваны 27.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 18.10.1989.

ПІЛЮЧОНАК Пётр Антонавіч, н. у 1887, калгаснік. Арыштаваны 11.8.1938, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.9.1989.

ВЁСКА БОР

ЧАРНЯК Леанід Аляксандравіч, н. у 1915 у Пскоўскай губ., селянін. Арыштаваны 6.2.1941, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні ў 1943. Рэабілітаваны 4.6.1992.

ВЁСКА ВАРОНКІ

КАТУШОНАК Пётр Сцяпанавіч, н. у 1905, селянін. Арыштаваны 4.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, высланы ў Варкуту. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ВЁСКА ДРАНЬКІ

ДАРАШКЕВІЧ Васіль Іванавіч, н. у 1896, селянін. Арыштаваны 6.11.1940, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, у Каргапальлагу да 8.1941. Рэабілітаваны 12.12.1989.

ВЁСКА ЖОЙДЗІКІ

КАЗЕЛЬСКІ Сямён Сямёнавіч, н. у 1908, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 9.10.1939, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 14.6.1983.

ВЁСКА ЗААЗЕРЦЫ

ТАБОЛА Алег Іванавіч, н. у 1929, студэнт. Арыштаваны 6.3.1947, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.11.1991.

ШЧАСНЫ Павел Дзмітрыевіч, н. 25.12.1882, калгаснік. Арыштаваны 25.6.1938, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 3.2.1970.

ВЁСКА ЗАБАЛОЦЦЕ

ВАЛЫНЕЦ Іван Ігнатавіч, н. у 1908, ляснік. Арыштаваны 3.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.5.1964.

КАБЯК Ігнат Лукіч, н. у 1888, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 6.12.1939, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ЮРШЭВІЧ Аляксандр Іванавіч, н. у 1928, студэнт. Арыштаваны 19.3.1947, асуджаны на 25 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.10.1992.

ВЁСКА ЗАБОР'Е

БАЛАЙ Іван Іларыёнавіч, н. у 1896, селянін. Арыштаваны 11.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Высланы ў Дагестан. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ВЁСКА ІЗАІТКІ

МАЦУЛЕВІЧ Баляслаў Казіміравіч, н. у 1908, муляр. Арыштаваны 28.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 1.11.1990.

ВЁСКА ІСТ

ГАЕЎСКІ Канстанцін Сцяпанавіч, н. у 1875, тэхнік упраўлення водных шляхоў. Арыштаваны 20.3.1940, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, у Вятлагу да 13.9.1941. Рэабілітаваны 12.12.1989.

ГАЕЎСКІ Пётр Сцяпанавіч, н. у 1874 (1876?), памешчык, змешчаны 26.6.1920 у канцлагер да канца вайны з Польшчай. Рэабілітаваны 25.5.1992. Арыштаваны 20.3.1940 у Глыбокім, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ГАЕЎСКІ Уладзімір Сцяпанавіч, н. у 1878, памешчык. Змешчаны 22.6.1920 у канцлагер да канца вайны з Польшчай. Рэабілітаваны 25.5.1992.

ПЕТРУКОЎСКАЯ Аліна Казіміраўна, н. у 1887, сялянка-аднаасобніца. Арыштавана 13.11.1940, асуджана на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 22.12.1989.

ВЁСКА КАЗЕЛЬСКІЯ

КАЗЕЛЬСКІ Аляксандр Васільевіч, н. у 1902, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 22.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Высланы ва Ухту Комі АССР. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ВЁСКА КАНЦЭРАВА

ЖОЙДЗІК Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1901, рабочы хлебапякарні. Арыштаваны 21.2.1938. Расстраляны 31.5.1938. Рэабілітаваны 2.10.1989.

ВЁСКА КАРАЛЕЎСКІЯ

КАСАТАЯ Кацярына Рыгораўна, н. у 1888, сялянка. Арыштавана 17.12.1944, асуджана на 3 гады ППЛ. Рэабілітавана 4.6.1992.

ВЁСКА КАРАСІ

КАРАСЬ Аляксандр Уладзіміравіч, н. у 1908, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 19.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. У высылцы да 27.8.1941. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ВЁСКА КАТАВІЧЫ

САВІЦКІ Антон Захаравіч, н. у 1914, селянін. Арыштаваны 7.6.1936, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.6.1992.

ВЁСКА КРАСНЯНЕ

МАЦІЕЎСКАЯ Софія Пятроўна, н. у 1901, сялянка-аднаасобніца. Арыштавана 11.5.1934, асуджана на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 31.10.1989.

ПАНЦАРНЫ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1890 у Ветрынскім р-не, кравец-саматужнік. Арыштаваны 28.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, саслана ў Пячлаг. Рэабілітаваны 19.2.1990.

ВЁСКА ЛІСПОЛЛЕ

ГЛЕБКА Браніслава Станіславаўна, н. у 1892, сялянка. Арыштавана 6.12.1939, асуджана на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 15.11.1989.

ВЁСКА ЛОНШЧЫНА

ВАЙЦЯХОВІЧ Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1918, селянін. Арыштаваны 22.6.1939, асуджаны на 3 гады ППЛ, у Анеглагу да 9.1941. Рэабілітаваны 16.10.1992.

ВЁСКА МАЗНЕВА

ПОПЕЛ Аляксандр Іванавіч, н. у 1898 у в. Блошнікі, селянін. Арыштаваны 9.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, сасланы ва Ухту. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ВЁСКА МІХАЛІ

ЖАЛКОЎСКІ Вільгельм Юльянавіч, н. у 1912 у в. Райполле, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 14.2.1940, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ЛІПІНСКІ Іван Іосіфавіч, н. 27.3.1901 у Радомскай губерні, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 5.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ВЁСКА ПАДАЗЕР'Е

ІНГЛЕТ Іван Міхайлавіч, н. у 1900 у Львоўскай губерні, ляснік. Арыштаваны 24.9.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ ва Ухту. Рэабілітаваны 1.11.1990.

ВЁСКА ПАРАДНІ

КОЗЕЛ Антон Патапавіч, н. у 1896, селянін-

аднаасобнік. Арыштаваны 25.10.1940, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ПАРАДНЯ Мікалай Дзмітрыевіч, н. 23.4. 1902, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 9.10. 1939, асуджаны на 5 гадоў ППЛ, ва Ухце да 9.8.1941. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ВЁСКА ПІСКУНОВА

БЯЛЯЦКІ Павел Антонавіч, н. у 1895 у в. Ізаіткі, селянін. Арыштаваны 11.10.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Да 18.9.1941 у Белбалтлагу. Рэабілітаваны 15.11.1989.

ВЁСКА ПЛІГАЎКІ

САПЕГА Уладзіслава Францаўна, н. у 1907, калгасніца. Арыштавана 24.8.1937. Расстраляна 5.1.1938.

ВЁСКА ПУГАЎКІ

БАХІР Пётр Пятровіч, н. у 1918, кравец. Арыштаваны 3.5.1939, асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 30.6.1992.

ПУГАЎКА Веніамін Андрэевіч, н. у 1920, селянін. Арыштаваны 5.6.1939, асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 5.11.1992.

ВЁСКА САРОКІ

ГЛПНСКІ Меленцій Антонавіч, н. у 1893, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 4.12.1944, высланы ў Комі АССР на 5 гадоў. Рэабілітаваны 18.11.1992.

ВЁСКА САСОНШЧЫНА

ГЛЕБКА Аляксандр Іванавіч, н. у 1893, сталяр. У 1918—1921 у Чырвонай Арміі. Арыштаваны 16.7.1932, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.5.1992.

СВІРКО Іосіф Сцяфанавіч, н. у 1889, селянін. У 1918—1920 у Чырвонай Арміі. Арыштаваны 2.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, сасланы ва Ухту. Рэабілітаваны 14.1.1993.

ВЁСКА СВІРКІ

СВІРКО Іван Васільевіч, н. у 1921, селянін. Арыштаваны 8.12.1937, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.12.1992.

ВЁСКА СПІГАЛЬШЧЫНА

БАЦЯНОЎСКІ Альберт Антонавіч, н. у 1929, студэнт. Арыштаваны 6.3.1947. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.11.1992.

ВЁСКА СЯЛЬЦО

КАТУШОНАК Іван Ігнатавіч, н. у 1884, селянін. У 1919—1921 у Чырвонай Арміі. Арыштаваны 18.8.1929, асуджаны да ВМП. Рэабілітаваны 31.7.1992.

ВЁСКА СЯМЯЖЫНА

РАЖЫНСКІ Георгій Францавіч, н. 1.8.1907 у Люблінскай губ., аграном. Арыштаваны 26.9.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, на Поўначы да 9.1941. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ВЁСКА СЯРГЕЙЧЫКІ

МУРАШКА Іван Васільевіч, н. 31.3.1906 у Латвіі, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 15.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ВЁСКА ХРАЛЫ

ЛЕАНОВІЧ Апанас Кузьміч, н. у 1911, селянін. Арыштаваны 24.10.1932, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 2.11.1989.

ВЁСКА ШАРАГІ

ДАРАШКЕВІЧ Іосіф Іларыёнавіч, н. у 1894, калгаснік. Арыштаваны 31.10.1933, асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 12.10.1989.

ДАРАШКЕВІЧ Рыгор Іларыёнавіч, н. у 1893, калгаснік. Арыштаваны 28.10.1933, асуджаны да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 12.10.1989.

ШЫПКО Зінаіда Іванаўна, н. у 1918, аднаасобніца. Арыштавана 7.4.1948, асуджана на 10 гадоў ППЛ з абмежаваннем у правах на 5 гадоў, вызвалена з Вятлагу 1.7.1955. Рэабілітавана 17.3.1992.

ШЫПКО Півонія Іванаўна, н. у 1924, аднаасобніца. Арыштавана 7.4.1948, асуджана на 25 гадоў ППЛ з абмежаваннем у правах на 5 гадоў. Вызвалена з Пячорлагу 1.7.1955. Рэабілітавана 17.3.1992.

ВЁСКА ШЧАРБІЦКІЯ

ШЧАРБІЦКІ Аркадзь Дзмітрыевіч, н. у 1922, селянін. Арыштаваны 30.3.1939, асуджаны на 3 гады ППЛ, высланы ў Анеглаг. Рэабілітаваны 22.9.1992.

ШЧАРБІЦКІ Уладзімір Дзмітрыевіч, н. у 1914, муляр. Арыштаваны 22.6.1939, асуджаны на 3 гады ППЛ, высланы ў Архангельскую вобл. Рэабілітаваны 16.10.1992.

ВЁСКА ЯЗНА

БЕКАРЭВІЧ Васіль Сафронавіч, н. у 1882 у Гомельскай вобл., святар. Арыштаваны 15.6.1949,

асуджаны на 25 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.9.1993.

ВЯЛЬ Міхаіл Іванавіч, н. у 1918 у в. Пашніно, селянін. Арыштаваны 28.3.1939, асуджаны на 3 гады ППЛ. Высланы на Поўнач да 13.5.1942. Рэабілітаваны 5.11.1992.

МАДЗЕЙ Казімір Францавіч, н. у 1909 у Кракаўскім ваяв., ляснік. Арыштаваны 6.2.1941, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Памёр у няволі ў 1943. Рэабілітаваны 4.6.1992.

ПРЫВАЛКА Уладзімір Ігнатавіч, н. у 1913, селянін. Арыштаваны 27.5.1939, асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 18.11.1992.

РЫМКЕВІЧ Аляксандр Антонавіч, н. у 1897 у в. Чарапы, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 25.11.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ. Высланы ў Варкуту да 8.9.1941. Рэабілітаваны 18.10.1989.

СІНКЕВІЧ Аляксандр Андрэевіч, н. у 1923, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 15.12.1939, асуджаны на 8 гадоў ППЛ, высланы на Поўнач да 11.9.1941. Рэабілітаваны 22.12.1989.

СІНКЕВІЧ Андрэй Аляксандравіч, н. у 1894, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 15.12.1939, асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 8.12.1989.

ФІЛІППОВІЧ Васіль Паўлавіч, н. у 1907 у Маскве, калгаснік. Арыштаваны 13.2.1941, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 14.7.1992.

Заўвага. У спіс ахвяр беспадстаўных палітычных рэпрэсій унесены грамадзяне, якія жылі на той момант на тэрторыі раёна, а таксама ўраджэнцы раёна, рэпрэсіраваныя за яго межамі.

Падзеі, лічбы, факты

1917 г., 4—6 чэрвеня.	Першы сялянскі з'езд Віленскай губерні ў Дзісне.
1917 г., лістапад.	Утвораны валасны ваенна-рэвалюцыйны камітэт у Міёрах.
1918 г., 18 лютага.	Пачатак наступлення нямецкіх войск у Беларусі. Дзісеншчына акупіравана ў першыя дні.
1918 г., лістапад.	Дзісеншчына вызвалена ад нямецкіх акупантаў.
1918 г., 10 снежня.	У Дзісенскім павеце адноўлена савецкая ўлада.
1919 г., чэрвень.	Паўстанне «зялёных» на Міёршчыне.
1919 г., ліпень.	Дзісенскі павет акупіраваны палякамі.
1920 г., 18 чэрвеня.	Пачатак наступлення Чырвонай Арміі ля Дрыгучоў пад камандаваннем Г. Гая.
1920 г., 7 ліпеня.	Дзісенскі павятовы рэўком аб'явіў сябе вышэйшай уладай.
1921 г., 18 сакавіка.	Паводле Рыжскага мірнага дагавора Дзісенскі павет адышоў да Польшчы.
1922 г.	Утворана Віленскае ваяводства. У склад яго ўвайшлі Дзісенскі і Браслаўскі паветы, на частцы тэрыторыі якіх размяшчаўся сучасны Міёрскі раён.
1926 г., студзень.	Да Браслаўскага павета далучана 8 гмін Дзісенскага павета, у тым ліку Чэраская, Лявонпальская, Міёрская, Новапагосцкая, Перабродская.
1926—1927 гг.	Перыяд актыўнай дзейнасці на Дзісеншчыне гурткоў Беларускай сялянска-рабочай грамады.
1930 г.	Заканчэнне будаўніцтва чыгункі Варапаева — Друя, якая прайшла праз Міёры.

1930 г., лета. Дзісенскі і Браслаўскі паветы наведаў прэзідэнт Польшчы Ігнацій Масціцкі, яго маршрут праходзіў праз Новы Пагост і Пераброддзе.

1931 г., вясна. Вялікая паводка ў Дзісне.

1935 г. У в. Лявонаўцы нарадзіўся Я. А. Томка — віцэ-адмірал, Герой Савецкага Саюза.

1939 г., 17 верасня. Пачатак паходу Чырвонай Арміі. Мітынг у Дзісне.

1939 г., 28—30 кастрычніка. Работа Народнага сходу ў Беластоку, у якой удзельнічала дэлегацыя ад Міёршчыны. Ф. Д. Манцэвіч выступіў з дакладам па пытанні аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР.

1939 г., кастрычнік. Утворана Вілейская вобласць, у якую ўвайшоў Дзісенскі раён.

1940 г., 15 студзеня. Утвораны Міёрскі раён у складзе Вілейскай вобласці.

1940 г., вясна. Пачатак калектывізацыі ў раёне. Утвораны калгасы «Парыжская камуна» ў в. Свярдлы, «17-е Верасня» ў в. Лявонпаль, «Праўда» ў в. Камянполле, «Чырвоны сцяг» у в. Слабада.

1940 г., 28 снежня. Устаноўчая сесія Міёрскага раённага Савета першага склікання.

1941 г., май. Выхад першага нумара Міёрскай раённай газеты «Бальшавіцкая трыбуна».

1941

1945

ШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ...

Так пачыналася вайна

Вестка аб пачатку вайны была ўспрынята жыхарамі Міёршчыны насцярожана, са страхам і трывогай. У гэтым прыгранічным раёне яшчэ не забыліся на ваенныя дзеянні, якія вяліся не так даўно, у 1939 г. Партыйнымі і савецкімі органамі Міёрскага раёна ў адпаведнасці з дырэктывай урада была праведзена работа па ўзняцці працоўных на адпор ворагу. Літаральна з першых дзён камітэтам партыі пачалі арганізоўвацца групы і атрады, якія дапамагалі часцям Чырвонай Арміі, што вялі баі на тэрыторыі раёна, а затым сталі асновай створаных партызанскіх атрадаў. Адначасова вяліся аператыўныя работы па захаванні калгаснай маёмасці. Аднак ажыццявіць намечаныя планы не ўдалося. Фронт імкліва набліжаўся. 3-я нямецкая танкавая група да 4 ліпеня 1941 г. захапіла невялікі плацдарм на ўсходнім беразе Заходняй Дзвіны ў раёне Дзісны. Часці 22-й арміі адступалі з цяжкімі баямі.

Вось як аб тых трагічных падзеях расказваюць дакументы 126-й стралковай дывізіі, якой камандаваў генерал-маёр Кузняцоў.

ФРЭЙДКІН Мордух Давідавіч, н. у 1939.
ФРЭЙДКІН Рубін Залманавіч, н. у 1905, рабочы.
ФРЭЙДКІНА Зэлда Рубінаўна, н. у 1935.
ФРЭЙДКІНА Сіфра Залманаўна, н. у 1900, работніца.
ФРЭЙДКІНА Соня Давідаўна, н. у 1932.
ФРЭЙДКІНА Хася Хаймаўна, н. у 1906, работніца.
ФУРМАН Залка Ізраілевіч, н. у 1940.
ФУРМАН Ізраіль Мэндалевіч, н. у 1912, загадчык клуба.
ФУРМАН Мэндаль Абрамавіч, н. у 1880, настаўнік.
ФУРМАН Рафол Ізраілевіч, н. у 1937.
ФУРМАН Роха Аўсееўна, н. у 1881, работніца.
ФУРМАН Шэйна Рафолаўна, н. у 1913, работніца.
ХАНІН Лейба Ліпавіч, н. у 1907, рызнік.
ХАНІНА Ліба Лейбаўна, н. у 1936.
ХАНІНА Фейга Лейбаўна, н. у 1907, работніца.

ХАНІНА Эстар Лейбаўна, н. у 1938.
ХІДЭКЕЛЬ Рахміль Шлёмавіч, н. у 1885, кравец.
ХІДЭКЕЛЬ Сора Бейнусаўна, н. у 1885, краўчыха.
ХІДЭКЕЛЬ Шляма Рахмілевіч, н. у 1920, кравец.
ХОДАС Абрам Рафаілавіч, н. у 1938.
ХОДАС Ліба Рафаілаўна, н. у 1936.
ХОДАС Майка Янкелеўна, н. у 1905, работніца.
ХОДАС Рафаіл Янкелевіч, н. у 1905, гарбар.
ХОДАС Сіфра Рафаілаўна, н. у 1934.
ХОДАС Сорка Рафаілаўна, н. у 1932.
ЦЫПІН Абрам Янкелевіч, н. у 1912, механік.
ЦЫПІН Самуіл Янкелевіч, н. у 1914, механік.
ЦЫПІН Янкель Абрамавіч, н. у 1870, механік.
ЦЫШІНА Гіта Янкелеўна, н. у 1922, работніца.
ЦЫЦІНА Роза Хаймаўна, н. у 1918, работніца.
ЦЫЦІНА Рыва Мордухаўна, н. у 1920, работніца.
ЦЫЦІНА Хася Абрамаўна, н. у 1875, работніца.
ЦЭНЦІТОР Гершэн Хаймавіч, н. у 1880, шаўвар.
ЦЭНЦІТОР Соня Гершэнаўна, н. у 1920, рахункавод.
ЦЭНЦІТОР Сціса Іцыкаўна, н. у 1885, рахункавод.
ШКОЛЬНІК Беньямін Мордухавіч, н. у 1910, рабочы.
ШКОЛЬНІК Трайна Янкелеўна, н. у 1912, работніца.
ШМІРЫН Лейба Мэндалевіч, н. у 1940.
ШМІРЫН Мэндаль Эфраімавіч, н. у 1910, каваль.
ШМІРЫНА Хася Мэндалеўна, н. у 1916, работніца.
ШНЭЙДЗЕР Маша Фалкаўна, н. у 1920, работніца.
ШНЭЙДЗЕР Меня Зуськавіч, н. у 1938.
ШНЭЙДЗЕР Мікель Хаймавіч, н. у 1905, кравец.
ШНЭЙДЗЕР Сіма Зуськавіч, н. у 1936.
ШНЭЙДЗЕР Церна Янкелеўна, н. у 1870.
ШНЭЙДЗЕР Шмуйла Самуілавіч, н. у 1860.
ШНЭЙДЗЕР Янкель Шмуйлавіч, н. у 1914, кравец.
ШУЛЬЦ Лейба Моўшавіч, н. у 1936.
ШУЛЬЦ Малка Моўшаўна, н. у 1938.
ШУЛЬЦ Моўша Хаймавіч, н. у 1910, шавец.
ШУЛЬЦ Рыва Моўшаўна, н. у 1939.
ШУЛЬЦ Хана Лейбаўна, н. у 1910, работніца.
ШЭЙНАР Арон Саулавіч, н. у 1929.
ШЭЙНАР Іосель Саулавіч, н. у 1927.
ШЭЙНАР Моўша Саулавіч, н. у 1925.
ШЭЙНАР Самуіл Саулавіч, н. у 1931.
ШЭЙНАР Саул Моўшавіч, н. у 1900, шавец.
ШЭЙНАР Сора Хаймаўна, н. у 1901, работніца.
ШЭЙНАР Хава Саулаўна, н. у 1939.
ШЭЙНАР Хана Саулаўна, н. у 1936.
ШЭЙНАР Цыва Саулаўна, н. у 1933.
ШЭЙНЕР Абрам Рубінавіч, н. у 1923, бухгалтар.
ШЭЙНЕР Арон Янкелевіч, н. у 1895, кравец.
ШЭЙНЕР Бовель Лейбаўна, н. у 1900, работніца.
ШЭЙНЕР Гінка Мэндалеўна, н. у 1924, работніца.
ШЭЙНЕР Дора Мэндалеўна, н. у 1899, гаспадыня.
ШЭЙНЕР Залман Мэндалевіч, н. у 1930.
ШЭЙНЕР Іеха Аронаўна, н. у 1923, краўчыха.
ШЭЙНЕР Іосель Абрамавіч, н. у 1880, рабочы.
ШЭЙНЕР Іоха Гдалеўна, н. у 1885, работніца.
ШЭЙНЕР Іцык Мэндалевіч, н. у 1925, рабочы.
ШЭЙНЕР Лейба Аронавіч, н. у 1937.
ШЭЙНЕР Лейба Іоселевіч, н. у 1917.
ШЭЙНЕР Меер Іоселевіч, н. у 1907, кравец.
ШЭЙНЕР Міна Рубінаўна, н. у 1927.
ШЭЙНЕР Моўша Аронавіч, н. у 1930.
ШЭЙНЕР Мэндаль Рубінавіч, н. у 1930.
ШЭЙНЕР Песя Рубінаўна, н. у 1925, бухгалтар.
ШЭЙНЕР Роза Шлёмаўна, н. у 1880, работніца.
ШЭЙНЕР Рохка Хаймаўна, н. у 1896, краўчыха.
ШЭЙНЕР Рубін Хонавіч, н. у 1895, бракёр.
ШЭЙНЕР Рыва Шмуйлаўна, н. у 1921, краўчыха.
ШЭЙНЕР Хацкель Абрамавіч, н. у 1870, рабочы.
ШЭЙНЕР Хона Абрамавіч, н. у 1870, рабочы.
ШЭЙНЕР Шмуйла Янкелевіч, н. у 1892, кравец.
ШЭЙНЕР Эта Лішманаўна, н. у 1895, краўчыха.
ШЭЙНЕР Янкель Аронавіч, н. у 1925, кравец.
ШЭЙНЕР Янкель Шмуйлавіч, н. у 1928.
ШЭНІМАН Рыва Міхелеўна, н. у 1938.
ШЭНІМАН Хана Міхелеўна, н. у 1936.
ШЭНКМАН Бася Шлімаўна, н. у 1880, работніца.
ШЭНКМАН Гівін Іцакавіч, н. у 1920, настаўнік.
ШЭНКМАН Іцык Хаймавіч, н. у 1880, разнік.
ШЭНКМАН Хава Ідзелеўна, н. у 1905, работніца.
ЭДАЛЬМАН Абрам Борухавіч, н. у 1912, рабочы.
ЭДАЛЬМАН Дзіна М., н. у 1875, работніца.
ЭДАЛЬМАН Ідзель Борухавіч, н. у 1910, скурабракёр.
ЭДАЛЬМАН Ісак Ідзелевіч, н. у 1935.
ЭДАЛЬМАН Лейба Борухавіч, н. у 1938.
ЭДАЛЬМАН Лея Борухаўна, н. у 1918, работніца.

ЭДАЛЬМАН Люба Ісакаўна, н. у 1910, работніца.
ЭДАЛЬМАН Нехама Борухаўна, н. у 1920, работніца.
ЭДАЛЬМАН Рыва Борухаўна, н. у 1925, работніца.
ЭДАЛЬМАН С. М., н. у 1872, рабочы.
ЭДАЛЬМАН Хая Ідзелеўна, н. у 1938.
ЭЙДАЛЬМАН Бейля Борухаўна, н. у 1905, работніца.
ЭЙДАЛЬМАН Борух Шэйбсавіч, н. у 1940.
ЭЙДАЛЬМАН Груня Рахнілаўна, н. у 1933.
ЭЙДАЛЬМАН Ізраіль Рахнілавіч, н. у 1922, рабочы.
ЭЙДАЛЬМАН Маісей Шэйбсавіч, н. у 1928, рабочы.
ЭЙДАЛЬМАН Моўша Рахнілавіч, н. у 1930.
ЭЙДАЛЬМАН Рахніль Іосавіч, н. у 1880, рабочы.
ЭЙДАЛЬМАН Рыва Шэйбсаўна, н. у 1933.
ЭЙДАЛЬМАН Самуіл Рахнілавіч, н. у 1920, рабочы.
ЭЙДАЛЬМАН Фейга Моўшаўна, н. у 1890, работніца.
ЭЛЬМАН... Гіршавіч, н. у 1927.
ЭЛЬМАН... Гіршавіч, н. у 1930.
ЭЛЬМАН Герт Іошавіч, н. у 1900, рабочы.
ЭЛЬМАН Сара Іошаўна, н. у 1900, работніца.
ЭНГЕЛЬ Айзік Рахмілавіч, н. у 1880, рабочы.
ЭНГЕЛЬ Хая Борухаўна, н. у 1890, работніца.
ЭНГЕЛЬ Хлойна Янкелевіч, н. у 1924, рабочы.
ЭСТАВА Ліба Моўшаўна, н. у 1870.
ЭСТАЎ Лейба Моўшавіч, н. у 1870.
ЭСТРАВА Алта Абрамаўна, н. у 1890, работніца.
ЭСТРАВА Бася Залманаўна, н. у 1932.
ЭСТРАВА Бейля Нахталеўна, н. у 1900, работніца.
ЭСТРАВА Віхна Іосераўна, н. у 1930.
ЭСТРАВА Гліко Кусіелеўна, н. у 1908, настаўніца.
ЭСТРАВА Голда Хацкелеўна, н. у 1885, земляроб.
ЭСТРАВА Ента Лейбаўна, н. у 1885, работніца.
ЭСТРАВА Люба Зуськаўна, н. у 1932.
ЭСТРАВА Мера Давідаўна, н. у 1922, работніца.
ЭСТРАВА Мера Залманаўна, н. у 1915, работніца.
ЭСТРАВА Міна Давідаўна, н. у 1920, работніца.
ЭСТРАВА Міна Моўшаўна, н. у 1880, работніца.
ЭСТРАВА Міна Янкелеўна, н. у 1930.
ЭСТРАВА Нехама Вульфаўна, н. у 1925, работніца.
ЭСТРАВА Нойма Янкелеўна, н. у 1932.
ЭСТРАВА Роха Моўшаўна, н. у 1900, работніца.
ЭСТРАВА Соня Ельеўна, н. у 1895, работніца.
ЭСТРАВА Фрэйда Хлаўнаўна, н. у 1880, работніца.
ЭСТРАВА Хая Борухаўна, н. у 1905, работніца.
ЭСТРАВА Хая Давідаўна, н. у 1924, работніца.
ЭСТРАВА Хая Залманаўна, н. у 1930.
ЭСТРАВА Хая Янкелеўна, н. у 1920, работніца.
ЭСТРАВА Церна Ісераўна, н. у 1922, пашталёна.
ЭСТРАВА Цыва Янкелеўна, н. у 1920, работніца.
ЭСТРАВА Эстра Рахмілеўна, н. у 1900, работніца.
ЭСТРАЎ Абрам Абрамавіч, н. у 1938.
ЭСТРАЎ Арам Янкелевіч, н. у 1922, рабочы.
ЭСТРАЎ Бейнус Беркавіч, н. у 1927, вучань.
ЭСТРАЎ Берка Вульфавіч, н. у 1930.
ЭСТРАЎ Берка Ізраілевіч, н. у 1937.
ЭСТРАЎ Берка Лейбавіч, н. у 1890, рабочы.
ЭСТРАЎ Вульф Зуськавіч, н. у 1870.
ЭСТРАЎ Давід Хацкелевіч, н. у 1880, рабочы.
ЭСТРАЎ Залка Кусіелевіч, н. у 1920, рабочы.
ЭСТРАЎ Залка Халманавіч, н. у 1910, рабочы.
ЭСТРАЎ Залман Залкавіч, н. у 1870.
ЭСТРАЎ Залман Лейбавіч, н. у 1875, рабочы.
ЭСТРАЎ Зусман В., н. у 1900, рабочы.
ЭСТРАЎ Ізраіль Ісеравіч, н. у 1910, бракёр лесу.
ЭСТРАЎ Ізраіль Хацкелевіч, н. у 1890, рабочы.
ЭСТРАЎ Ісер Ізраілевіч, н. у 1926, столяр.
ЭСТРАЎ Ісер Лейбавіч, н. у 1870, земляроб.
ЭСТРАЎ Кусіел Залкавіч, н. у 1880, рабочы.
ЭСТРАЎ Лёва Беркавіч, н. у 1922, бухгалтар.
ЭСТРАЎ Лейвіч Ісеравіч, н. у 1920, рабочы.
ЭСТРАЎ Міхал Вульфавіч, н. у 1920, рабочы.
ЭСТРАЎ Міхель Зуськавіч, н. у 1936.
ЭСТРАЎ Рубін Шалшавіч, н. у 1924, вучань.
ЭСТРАЎ Самуіл Кусіелевіч, н. у 1925, рабочы.
ЭСТРАЎ Хайм Кусіелевіч, н. у 1935.
ЭСТРАЎ Хайм Залманавіч, н. у 1920, рабочы.
ЭСТРАЎ Хацкель Ізраілевіч, н. у 1924, столяр.
ЭСТРАЎ Хона Зуськавіч, н. у 1930.
ЭСТРАЎ Янкель Залкавіч, н. у 1865.
ЭСТРЫН Сара Абрамаўна, н. у 1860.
ЮДЗІНА Сора Моўшаўна, н. у 1922, работніца.
ЮДЗІНА Этка Ізраілеўна, н. у 1890, работніца.
ЮДЗІН Меер Моўшавіч, н. у 1920, рабочы.
ЯЛАВА Гінда Самуілаўна, н. у 1890, пекар.
ЯЛАЎ Фалка Хайсеевіч, н. у 1920, пекар.

ЯЗНЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БЛОШНІКІ (ЦЯПЕР КАЛІНАВАЕ)

БАРАН Асар, н. у 1896, кравец.

БАРАН Ента, н. у 1896, краўчыха.

БАРАН Ефця, н. у 1927, краўчыха.

ДЗІМЯНЦЕЙ Абрам Абрамавіч, н. у 1929, школьнік.

ДЗІМЯНЦЕЙ Абрам Юдавіч, н. у 1887, земляроб.

ДЗІМЯНЦЕЙ Берта І., н. у 1898.

ДЗІМЯНЦЕЙ Гіля Мэндалеўна, н. у 1882.

ДЗІМЯНЦЕЙ Гіта Еселеўна, н. у 1895.

ДЗІМЯНЦЕЙ Жэня Лейбаўна, н. у 1920.

ДЗІМЯНЦЕЙ Лейба Юдавіч, н. у 1880, земляроб.

ДЗІМЯНЦЕЙ Роза М., н. у 1883.

ДЗІМЯНЦЕЙ Саламон Лейбавіч, н. у 1919, земляроб.

ДЗІМЯНЦЕЙ Юда Абрамавіч, н. у 1920, земляроб.

ЛІЎШЫЦ Гіта М., н. у 1882.

ЛІЎШЫЦ Шмуйла Рофавіч, н. у 1915.

СЛАВІН Гаўрыла, н. у 1918, селянін.

СЛАВІН Мэндаль М., н. у 1884, земляроб.

СЛАВІН Моўша Мэндалевіч, н. у 1921, земляроб.

СЛАВІНА Сорка, н. у 1886.

ВЁСКА МУРАШЧЫНА

ФІНКЕЛЬШТЭЙН Вульф, н. у 1905, гандляр.

ВЁСКА ЯЗНА

ГОФМАН Бэля.

ГОФМАН Мэндаль І.

ГОФМАН Руман.

ГОФМАН Фейга.

ГОФМАН Хана.

ГОФМАН Эстар.

ПЭН Борка.

ПЭН Мордух.

ПЭН Эдля.

ФЕЙГЕЛЬ Берка Вульфавіч.

ФЕЙГЕЛЬ Вульф Беркавіч.

ФЕЙГЕЛЬ Міхал.

ФЕЙГЕЛЬ Сорка.

ПАДПОЛЬНЫ І ПАРТЫЗАНСКІ РУХ

Супраціўленне захопнікам пачалося літаральна з першых дзён. Вілейскі абкам партыі да 3—4 ліпеня арганізаваў каля дзесяці партыйна-партызанскіх груп, у тым ліку адну з 18 чалавек на чале з сакратаром Міёрскага райкама партыі Саўрэем.

Першапачатковы этап развіцця ўсенароднай барацьбы з акупантамі ў значнай ступені звязаны з аказаннем дапамогі савецкім воінам, якія трапілі ў акружэнне. А. М. Манцэвіч, жонка Ф. Д. Манцэвіча, успамінала, што аднойчы да іх у дом зайшлі два акружэнцы — камандзіры Чырвонай Арміі Кудаеў і Светлалобаў. Іх пераапранулі ў цывільнае адзенне, накармілі, далі прытулак. Яны арганізоўвалі засады ля фашысцкіх перапраў праз Дзісну, праводзілі гутаркі з насельніцтвам, умацоўвалі ў людзей упэўненасць ў перамозе над ворагам. Неўзабаве камандзіры сабралі групу акружэнцаў і пайшлі на ўсход, разлічваючы прарвацца праз лінію фронту.

Савецкія воіны і камандзіры, якія аказаліся ў акружэнні, садзейнічалі кансалідацыі сіл супраціўлення. У вёсках Моцеўкі, Дзеверкі, Чэрасы, Картавыя, Татары, Пціцкія і інш., у Міёрах стварыліся падпольныя групы. Першапачаткова яны складаліся з 2—3 чалавек, не мелі кіруючага цэнтра. Яшчэ ў ліпені 1941 г. група з 27 падпольшчыкаў сфарміравалася вакол А. М. Манцэвіч. Сярод іх былі Іван Фёдаравіч і Іван Васільевіч Лакоткі, іх бацькі, Дзмітрый Барок і яго бацька, Віктар, Ігнат і Павел Сушко, Іосіф, Павел і Сяргей Шчасныя. Спачатку яны дапамагалі акружэнцам перапраўляцца праз Заходнюю Дзвіну, а потым пачалі парушаць тэлефонную сувязь, разбураць масты, у тым ліку на дамбе ў Чэрасах.

У сваю чаргу Дзмітрый Барок накіроўваў дзейнасць чэраскай падпольнай

камсамольскай групы, у якую першапачаткова ўваходзілі Антаніна Манцэвіч, Віктар Сушко, Іван Лакотка. Да восені да іх далучыліся Юрый Манцэвіч, яшчэ адзін Іван Лакотка, потым Вольга Крыштапёнак, Анастасія Мароз, Марыя і Сяргей Шчасныя, Фёдар Сцепулёнак, Вольга Грэцкая, Аляксей Мілун, Мікалай Пацеенак. Камсамольцы знайшлі некалькі вінтовак, гранат і нават кулямёт, падбіралі надзейных людзей.

Ядро камсамольска-маладзёжнай арганізацыі ў Старых Круках і Вялікай Глінаўцы складалі Уладзімір Канах, Пётр Грэцкі, Іван Ракоца, Віктар і Зінаіда Сушко.

Антыфашысты в. Моцеўкі (кіраўнік Н. А. Лутохін) збіралі звесткі аб гарнізонах у Міёрах і Глыбокім, мініравалі дарогі, пашкоджвалі тэлеграфна-тэлефонную сувязь.

Падпольшчыкі в. Пціцкія вялі разведку ў Міёрах і Дрысе, сістэматычна псавалі сувязь паміж гэтымі населенымі пунктамі. У в. Масеўцы яны спалілі торфазавод і нарыхтаванае паліва для мясцовага гарнізона.

Антыфашысцкая група в. Картавыя (кіраўнік Г. С. Арлоўскі) вяла палітычную работу сярод насельніцтва, збірала зброю і боепрыпасы, спаліла малочныя пункты ў сваёй вёсцы і Дворным Сяле.

Патрыятычныя групы дзейнічалі і непасрэдна ў Міёрах. Вядома, што адной з іх кіравала Ірына Гарбаценка. Антыфашысты забяспечвалі падпольшчыкаў, а затым і партызан дакументамі, выкралі ва ўправе пішучую машынку для падпольнага райкама камсамола, распаўсюджвалі лістоўкі, вялі пошукі зброі, боепрыпасаў і медыкаментаў.

З першых дзён акупацыі пачала аб'ядноўвацца моладзь Мікалаёўскага сельсавета Дзісенскага раёна. У жніўні 1941 г. тут была створана падпольная камсамольская арганізацыя, сакратаром якой пэўны час была Глафіра Васільеўна Рымдзёнак (Качан), а затым Андрэй Яленскі. У яе ўвайшлі Рыта Рымдзёнак з в. Бушава, Косця Яленскі з Лугаўцоў,

С. П. Шчасны

Марыя Лісоўская з Луначарска, Ціхан Федарэц з Федарцоў, Хрыстафор Федарэц, Максім, Віталь, Пётр, Іосіф і Ганна Мядзельцы з Шарагоў, Люба, Іван, Алена і Міленцій Святкія з Дзянісава, Валя і Зоя Чэрап з Бушава і інш.

Камсамольцы пачалі са збору зброі на месцах баёў за Дзвіной. Яны схавалі ў навакольных лясах два станковыя кулямёты, сем ручных, каля дваццаці аўтаматаў, некалькі дзесяткаў вінтовак і шмат патронаў. Устанаўліваліся сувязі з воінамі Чырвонай Арміі, якія апынуліся ў акружэнні і аселі сярод мясцовага насельніцтва. Першым далучыўся да падполля савецкі афіцэр Іван Зубкоў. А да вясны 1942 г. у арганізацыі налічвалася каля ста юнакоў і дзяўчат.

У кіруючае ядро падполля ўваходзілі Г. Рымдзёнак, І. Зубкоў, А. Яленскі. У красавіку 1942 г. яны прынялі рашэнне аб стварэнні партызанскага атрада. Аднак ажыццявіць намечанае камсамольцы не паспелі. Па даносу здрадніка пачаліся масавыя арышты. Асабліва жорстка на вачах родных і аднавяскоўцаў гітлераўцы дапытвалі Андрэя Яленскага і Ціхана Федарца. Яны загінулі, але таварышаў не выдалі. Астатніх падпольшчыкаў некалькі дзён трымалі ў падвалах, дапытвалі і збівалі іх. Аднак прызнання не дабіліся і вымушаны былі адпусціць.

Праз нейкі час паліцыя яшчэ раз схапіла 18 маладых патрыётаў і дапытвала іх некалькі тыдняў. Але і на гэты

раз нічога не дабілася. Усе выйшлі на волю, толькі дзейнасць падполля спынілася. І тым не менш многія камсамольцы ў далейшым актыўна ўключыліся ў партызанскую барацьбу.

Вясной і летам 1942 г. на тэрыторыі Міёрскага і Дзісенскага раёнаў узмацніўся рух партызанскіх груп. Яны ўстанаўлівалі кантакты з мясцовымі патрыётамі, прыцягвалі іх да збору разведвальных даных, зброі, выканання іншых даручэнняў. У прыватнасці, гэтым займаўся Павел Рыгоравіч Казлоўскі, які з мая 1942 па лістапад 1943 г. нелегальна жыў на хутарах Пліскага і Дзісенскага раёнаў. Пазней ён стаў палітруком узвода партызанскай брыгады імя Жукава, пасля вайны — кандыдат гістарычных навук, супрацоўнік Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі.

Летам 1942 г. у Міёрскім, Дзісенскім і Шаркоўшчынскім раёнах дзейнічала група ўпаўнаважанага ЦК і Вілейскага абкама партыі А. І. Шаўчэнкі. Аб'яднаўшыся з групамі П. Ф. Рудава і Н. З. Умінскага, яна наносіла адчувальныя ўдары па ворагу.

Невялікі атрад «Спартак» летам 1942 г. вырас з 60 да 400 чалавек за кошт партызанскіх і падпольных груп Міёрскага, Дунілавіцкага і Шаркоўшчынскага раёнаў. Ператварыўся ў брыгаду спецатрад «Няўлоўныя» (камандзір Міхаіл Сідаравіч Прудніка ў), які прыбыў у Дзісенскі раён з-за лініі фронту. У яе радах змагаліся з ворагам Мікалай Сцяпанавіч Шымуковіч з в. Анкуды, Ігнат Аляксандравіч Шчарбіцкі з Варонак, Генадзь Міхайлавіч Федарэц з Мазурына, Уладзімір Сідаравіч Дарашкевіч і Піліп Паўлавіч Басянок з Плігавак, Дар'я Ульянаўна Кадушка з Чэрасаў.

Група партызан брыгады «Няўлоўныя» пад кіраўніцтвам П. Н. Шырокава ў Міёрскім і Шаркоўшчынскім раёнах выросла ў атрад, які вытрымаў карную блакаду і стаў ядром брыгады «За Радзіму».

Намеснік начальніка асобага аддзела партызанскага атрада, начальнік разведкі брыгады імя Жукава Рыгор Яфімавіч Шчарбакоў успамінаў: «Многія сяляне самі аддавалі нам зброю і боепрыпасы. У Міёрах, напрыклад, адзін стары перадаў абрэз, дзве вінтоўкі і дзве скрынкі патронаў. Незадоўга да гэтага яго збілі фашысты, патрабуючы зброю, але ён не выдаў яе ворагу, а нам даставіў са

Група партызан брыгады «Кастрычнік»

Група партызан брыгады «Кастрычнік»

словамі: «Вазьміце, дзеткі, і біце праклятых ворагаў».

Ужо ў 1942 г. народныя мсціўцы пачалі праводзіць значныя аперацыі. Напрыклад, восенню партызанскі атрад А. Д. Мядзведзева, які пазней уліўся ў брыгаду імя ЦК КП(б)Б, разграміў валасную ўправу ў Язпе і ўзарваў маслазавод. Закладвалася аснова масавага партызанскага руху.

Актывізавалася дзейнасць падпольшчыкаў. У прыватнасці, А. М. Манцэвіч наладжвае сувязь з браслаўскімі антыфашыстамі братамі А. А. і Д. А. Васілеўскімі. Патрыёты здзяйсняюць дыверсіі, распаўсюджваюць лістоўкі. Ведаць праўду аб гераічпай барацьбе савецкага народа з ворагам дапамагае радыёпрыёмнік, зманціраваны ў Міёрах Альбінам Кучынскім. Нарэшце падпольшчыкі ўстанавілі сувязь з партызанамі, у першую чаргу атрада «Спартак». Калі ж гітлераўцы высачылі патрыётаў Аркадзя і Яніну Баркоў, яны загінулі, але нікога не выдалі.

Міёрскія падпольшчыкі пачынаюць укараняцца ў апарат кіравання акупантаў. Так, пісарам агульнага аддзела ўправы стаў Г. Ф. Манцэвіч, які праз А. Д. Лясовіч папярэдзіў антыфашыстаў, што рыхтуецца адпраўка моладзі ў Германію.

У 1943 г. Вілейскі падпольны абкам партыі ўпарадкаваў партызанскія фарміраванні і кіраўніцтва імі. У Пліскі раён (частка яго ўваходзіць у сучасны Міёрскі) перадыслацыравалася брыгада «Кастрычнік», брыгада імя Калініна стала дзейнічаць у Міёрскім, 4-я Беларуская — у Дзісенскім раёнах. 2 верасня зацверджаны Міёрскі падпольны райкам КП(б)Б у наступным складзе: Ф. Н. Гаўрыленка — сакратар, М. А. Клімянок і Н. В. Ладыс — члены.

Барацьбу супраць захопнікаў на Дзісеншчыне ўзначаліў падпольны райкам КП(б)Б у наступным складзе: сакратар Ф. М. Расюк, члены М. І. Ярмак, А. С. Іваноў, М. Д. Свірыдзенка, А. С. Сямёнаў.

Камсамольскай работай у Міёрскім раёне кіраваў упаўнаважаны абкама А. Ю. Міхасёнак. У Дзісенскім раёпе дзейнічаў райкам ЛКСМБ, сакратаром якога з'яўляўся М. Шульга, сакратаром па прапагандзе — М. Крашэўскі, членамі — С. Нікіцін, М. Глазкін, К. Протас.

З сакавіка 1943 г. у Міёрскім раёне пачынае выходзіць орган падпольнага райкама КП(б)Б газета «Кліч партыза-

на», са студзеня 1944 г. пад такой жа назвай выдае газету Дзісенскі РК КП(б)Б.

Для правядзення агітацыйнай работы на Міёршчыне з брыгады Герасімава была накіравана група ў складзе дзевяці чалавек пад камандаваннем Паўла Міхайлавіча Стральцова. Камісарам у ёй быў Мікалай Кручкоў.

9 кастрычніка 1943 г. у Дзісенскі раён прыбыла з расонскіх лясоў 4-я Беларуская брыгада (камандзір В. А. Сазыкін, камісар В. К. Шэндзелеў), якая павінна была весці разведку ў інтарэсах Калінінскага фронту. 395 байцоў і камандзіраў пачалі баявую работу з разгрому абозу гітлераўцаў. Абапіраючыся на дапамогу мясцовых падпольшчыкаў, праз пяць дзён брыгада поўнасцю знішчыла варожы гарнізон у в. Ліхачы, дзе захапіла тры кулямёты, мінамёт, 14 вінтовак, вялікую колькасць боепрыпасаў і амуніцыі. А потым пачаліся дыверсіі на камунікацыях ворага, разгарнулася масава-палітычная работа сярод мясцовага насельніцтва.

На тэрыторыі Міёрскага раёна (у сучасных граніцах) у розны час акрамя названых дзейнічалі іншыя партызанскія брыгады. Яны заўсёды адчувалі падтрымку мясцовага насельніцтва, атрымлівалі практычную дапамогу патрыётаў. Без гэтага не мог існаваць партызанскі рух, не маглі быць паспяховымі іх баявыя аперацыі.

Прыкладаў узаемадзеяння партызан і патрыётаў дастаткова. Напрыклад, вясной 1943 г. Ірына Гарбаценка паведаміла ў брыгаду «Кастрычнік» аб тым, што з Міёраў у Дзісну накіроўваецца абоз паліцыі. Народныя мсціўцы зрабілі засаду у в. Крукі, захапілі трафеі.

11 ваеннапалонных, якія працавалі ў нямецкіх часцях, з дапамогай падпольшчыкаў уцяклі з Міёраў у партызанскую брыгаду імя М. І. Калініна.

Цікавай з'явай у партызанскім руху можна назваць падпольны партызанскі атрад «Масква», створаны падпольшчыкамі в. Чэрасы пад кіраўніцтвам настаў-

А. В. Канах

І. Ф. Лакотка

М. З. Гляк

П. А. Баброўскі

П. І. Гаўрутаў

А. П. Козел

ніцы А. М. Манцэвіч і пры падтрымцы камандавання 4-й Беларускай брыгады. Камандзірам яго быў выбраны мясцовы жыхар А. В. Канах. Асаблівасць гэтага падраздзялення заключалася ў тым, што звычайныя сялянскія хлопцы займаліся сваімі звычайнымі сялянскімі справамі. Калі камандаванне трубіла збор, гэтыя хлопцы станавіліся байцамі-партызанамі. Яны ўдзельнічалі ў баявых аперацыях, разбуралі масты. На іх баявым рахунку спалены склад гаручага ў Глыбокім, збор зброі і боепрыпасаў. Баец атрада Іван Фёдаравіч Лакотка вывез з Глыбокага шрыфты і некаторае друкарскае абсталяванне, якое потым выкарыстоўвалася ў 4-й Беларускай брыгадзе для выпуску лістовак і раённай газеты.

Многія байцы атрада «Масква» потым сталі партызанамі. Некаторыя аддалі жыццё ў барацьбе з ворагам у падполлі, у партызанскіх атрадах і на фронце: Аляксей Мілун, Павел Шчасны, Сцяпан Мацюк, Юзя Шубіна, Дзмітрый Барок. Ордэнам Леніна пасмяротна ўзнагароджаны франтавік Ніканор Пахірка. Не дажылі да перамогі Іосіф Шчасны, Мікалай Сушко, Пётр Адамовіч, Пётр Муха, Іван Скавародка, Піліп Лапцёнак.

Народныя мсціўцы праводзілі на Міёршчыне буйныя баявыя аперацыі. Так, атрады 4-й Беларускай брыгады трымалі пад ударам чыгуначную магістраль Полацк — Рыга. Яны блакіравалі нямецкі гарнізон у Дзісне, а 11 лютага 1944 г. раптоўна напалі на гарнізон, спалілі там млын, электрастанцыю, склады. У маёнтку Дарожкавічы былі захоплены дзесяткі галоў жывёлы, 14 лютага знішчаны гарнізон у в. Узмёны, яшчэ перад гэтым быў разгромлены гарнізон у Лявонпалі. Толькі са студзеня па красавік 1944 г. брыгада правяла каля 90 баёў, арганізавала 12 дыверсій на камунікацыях ворага.

Вялікі рэзананс мела аперацыя па разгрому варожага гарнізона ў Міёрах. Яе правяла 30 чэрвеня 1943 г. бры-

У. К. Казачонак

М. А. Скрыпкін

Т. І. Сініца

У. І. Радзішэўскі



А. Д. Міхайлаў

А. А. Скрабатун

гада імя Ракасоўскага ў час рэйду да воз. Нарач. Камандаваў гэтым злучэннем А. В. Раманаў, камісарам з'яўляўся П. М. Машэраў, начальнікам штаба — В. Н. Дармянёў.

Брыгада фарсіравала Заходнюю Дзвіну і спынілася ў в. Кавалеўшчына. Гэта навіна пасеяла паніку ў навакольных варожых гарнізонах, што і прапанаваў выкарыстаць для нападзення на Міёры камандзір атрада № 3 брыгады «Кастрычнік» А. І. Канапелька. Аперацыя пачалася на світанні штурмам варожых умацаванняў. Партызаны знішчылі ўправу, пошту, гараж. Страты ворага склалі 85 чалавек, у народных мсціўцаў забіта было 10 чалавек і 14 паранена.

Партызаны хутка пакінулі Міёры, куды неўзабаве прыбыло падмацаванне.

Шмат было аперацый і баёў «мясцовага» значэння. Напрыклад, з гранатамі прабіліся з акружэння ля в. Ахрэмаўцы партызаны брыгады імя Жукава жыхары в. Ніўнікі Рыгор Парменавіч, Пафнуцій Яфімавіч і Феафан Парменавіч Яфімавы, Іосіф Ігнатавіч Завадскі. У гэтай брыгадзе змагаліся М. З. Гляк і І. Дз. Кудраўцаў.

Партызанскія агітатары прынялі бой 27 снежня 1944 г. ля в. Козічы Дзісенскага раёна, куды на машыне раптоўна з'явіліся карнікі.

Вяртаючыся з баявога задання, група байцоў брыгады «Кастрычнік» пад камандаваннем камуніста Ф. П. Зыранава даведалася, што войт в. Костачына збірае падаткі. Партызаны загадалі войту выдаць жыхарам квітанцыі аб нібыта здадзеных падатках, а яму ўручылі даведку, што яны ў яго нібыта забралі 11 800 руб.

Брыгада імя Жукава разграміла гарнізон у маёнтку Курылавічы, дзе захапіла зброю, боепрыпасы, коней і кароў.

А яшчэ засады, узрывы на дарогах, зрыў нарыхтовак і іншых мерапрыемстваў акупацыйных улад...

Вядома, захопнікі не маглі з гэтым мірыцца. Неаднаразова яны імкнуліся разграміць партызанскія фарміраванні. Вялікая карная экспедыцыя супраць брыгады імя Калініна, «Спартак» і імя Жукава была арганізавана ў канцы верасня 1943 г. У ёй удзельнічала да 20 тысяч салдат пры падтрымцы 12 артбатарэй, 20 танкаў і 40 самалётаў. У брыгадзе імя Калініна у той час было 314 байцоў, узброеных 13 кулямётамі, двума супрацьтанкавымі ружжамі, 42 аўтаматамі і 150 вінтоўкамі. Прыкладна такія ж сілы мелі брыгады «Спартак» і імя Жукава.

Нягледзячы на шматразовую перавагу ў жывой сіле і ўзбраенні, немцам не

У. Р. Гаўрыловіч з вучнямі СШ № 2 г. Міёры

ўдалося знішчыць фарміраванні народных мсціўцаў. Яны прарвалі блакаду. А гітлераўцы жорстка адпомсцілі мясцоваму насельніцтву за падтрымку партызанскага руху.

У партызанскіх брыгадах і атрадах актыўна змагаліся П. А. Баброўскі, П. І. Гаўрутаў, У. Р. Гаўрыловіч, А. Дз. Міхайлаў, У. К. Казачонак, А. П. Козел, П. А. Марцінята, У. І. Радзішэвіч, Т. І. Сініца, А. А. Скрабатун, М. А. Скрышкін і многія іншыя.

Напярэдадні Беларускай наступальнай аперацыі вораг стаў умацоўваць гарнізоны, узмацніўся яго націск на партызан. У цяжкіх баях у маі 1944 г. брыгады 4-я Беларуская, «За Радзіму», «Спартак», імя У. І. Леніна, імя М. І. Калініна, імя Г. К. Жукава не толькі адстаялі свае пазіцыі, але і расшырылі зоны дзеяння. У маі толькі 4-я Беларуская брыгада правяла каля ста аперацый, знішчыла больш за 300 варожых салдат і афіцэраў.

Гітлераўцы паспрабавалі блакіраваць у канцы мая — сярэдзіне чэрвеня 1944 г. брыгады імя У. І. Леніна, імя П. К. Панамарэнкі, 16-ю Смаленскую, імя С. М. Кароткіна, 4-ю Беларускую і «Кастрычнік» у раёне балота Багна-Мох. Аднак асноўныя сілы партызан і на гэты раз прабіліся з акружэння, хоць кожная карная экспедыцыя выклікала шматлікія ахвяры не толькі сярод народных мсціўцаў, але і мірнага насельніцтва, прыносіла беды і пакуты. І ў гэты раз у наваколлі Балота-Мох былі спалены ўсе вёскі. Асабліва пацярпела Залессе — самыя глухія населеныя пункты на ўскрайку балотнага масіву, што служылі базай для партызан.

Калі гітлераўскае камандаванне накіравала на фронт рэгулярныя часці, якія ўдзельнічалі ў карнай экспедыцыі, народныя мсціўцы зноў вярнуліся ў свае раёны дыслакацыі. Разам з мясцовым насельніцтвам яны аказвалі ўсямерную дапамогу Чырвонай Арміі: парушалі варожыя камунікацыі, нападалі на адступаўшыя калоны немцаў, мініравалі дарогі. Але тактыка ў гэты перыяд партызанскай вайны была іншай: напярэдадні вызвалення дапускаць менш разбурэнняў, больш засеяць палёў, каб сабраць ураджай ужо на вольнай зямлі.

Л. А. Матэленак

Першыя партызаны

З дзённіка І. А. Лапіцкага

У пачатку 1942 г. мясцовыя органы кіравання перададзены беларусам. Замест польскіх паветаў, магістратаў і гмін утвораны раёны, гарадскія і валасныя ўправы. Старшынёй Дзісенскай раённай управы назначаны быў Забайяла, сакратаром — Сонцаў, старшынёй гарадской управы — Рыгор Ліпскі, старшынёй Мікалаёўскай валасной управы — Трушынскі, сакратаром — Рабіза. Палякі, выпусціўшы з рук кіраўніцтва мясцовымі органамі, пастараліся паставіць свайго чалавека на чале паліцыі. Назначаны замест Свінарскага камендантам паліцыі Шампур хоць і лічыўся беларусам, але з'яўляўся адданым абаронцам палякаў і сапраўдным катам мясцовых жыхароў.

Вясной пайшлі чуткі пра партызан. Занепакоеныя немцы распарадзіліся аб вяртанні ваеннапалонных у лагер, якіх перад тым аддалі ў сялянскія сем'і. Але многія ўжо паспелі пайсці ў лес.

У гэты час з'явіўся ў нас першы партызан, жыхар вёскі Лугаўцы Яленскі. Да яго далучыўся Федарэц з вёскі Федарцы. Яны ўстанаўлівалі сувязь з партызанамі, збіралі зброю па дарогах, дзе адступалі савецкія войскі, хавалі яе ў лясах, заклікалі мясцовых жыхароў уступаць у рады народных мсціўцаў. Толькі з-за нявопытнасці трапілі яны ў рукі немцаў. Два тыдні мучылі іх, здзекаваліся з іх, вазілі па дарогах і лясах, шукалі схаваную зброю. Не выдалі.

Яленскага расстралялі ў Дзісне ля

касцёла ў завулку пры доме аптэкара Разета і закапалі тут жа ў дварэ. Казалі, што ён нібыта спрабаваў ратавацца ўцёкамі. Ціхана Федарца фашысты расстралялі ў яго роднай вёсцы на вачах у маці, суседзяў і яго таварыша Яленскага.

У маі арыштавалі ўсіх камсамольцаў, але праз тыдзень выпусцілі. Немцы рыхтавалі новую справу — вываз моладзі ў Германію на работы. Наша дачка Ія таксама была прызначана да вывазу, але пазбегла яго, бо ёй удалося ўладкавацца на працу рэгістратарам Дзісенскай бальніцы.

* * *

1943 год быў перыядам асабліва імклівага росту партызанскага руху ў Мікалаёўскай воласці, вельмі зручнай для гэтых мэт. Адначасова немцы ўзмацнілі тэрор. Для застрашвання яны жывымі спалілі сям'ю Грыдзюшкаў у Сцефанполлі, там жа расстралялі сям'ю Ігната Ганчаронка, учынілі шмат зверстваў у іншых вёсках. Да восені партызаны занялі ўсе населеныя пункты ўздоўж Вянужскіх лясоў ад Крукоў да Кутоў, адрэзалі немцам доступ да лесу — галоўнага пункта забеспячэння Дзісны палівам і ўстанавілі кантроль над дарогай Дзісна — Міёры на ўчастку Туркова — Крукі.

Немцы павялічвалі састаў паліцыі, утварылі і ўзброілі атрады так званай самааховы, устанавілі для іх умацаваныя пункты, у вёсках павесілі званы для сігналізацыі на выпадак з'яўлення партызан. Мала было жадаючых уступіць у самаахову, яшчэ менш — супрацоўляцца партызанам. Часцей за ўсё яны ў выпадку небяспекі разбягаліся або пераходзілі на бок партызан.

Немцам для камандавання мясцовымі фарміраваннямі патрэбны былі афіцэры. Таму яны ўсімі сіламі імкнуліся завербаваць для гэтага жыхара вёскі Хомічы Пятра Сямёнавіча Гагалінскага. Гэты выдатны чалавек — мой найлепшы сябра, лейб-гвардыі прапаршчык рускай арміі, георгіеўскі кавалер усіх чатырох ступеняў, чатырнаццаць разоў паранены ў першую сусветную вайну. Гэты рослы чалавек атлетычнага целаскладу, прыгажун карыстаўся асаблівай павагай і любоўю сярод мясцовага насельніцтва. Сябры называлі яго Пятром Вялікім.

Немцы бачылі ў ім вялікі аўтарытэт, які мог пацягнуць за сабой шмат жадаючых у самаахову. Яны і выклікалі яго па гэтай справе ў Глыбокае. Па дарозе Пётр Сямёнавіч заехаў да нас у Мікалаёва, каб параіцца, як пазбегнуць уступлення ў самаахову. Мы вырашылі тады, што ён будзе сімуляваць калецтва, з'явіцца да немцаў з мыліцай. Сімуляцыя ўдалася.

У кастрычніку 1943 г. да вёсак Сарочына і Труды з Расоншчыны перапраўіўся партызанскі атрад пад камандаваннем Сазонава (камісар Андрэеў). Утварылася 4-я Беларуская брыгада. Мы пазней пазнаёміліся з партызанамі ў Слабадзе, куды прыехалі камандзір разведкі Свірыдзенка, камісар Сямёнаў і разведчыца Фруза. З гэтага часу і пачалася наша работа разведчыкаў-сувязных. Яна заключалася ў перадачы партызанам інфармацыі аб дыслакацыі і перамяшчэнні нямецкіх войск, размяшчэнні складоў, падрыхтоўцы карных аперацый, у перадачы партызанам медыкаментаў і зброі. З кастрычніка наша група разведчыкаў-сувязных была зарэгістравана ў штабе брыгады. Кожны атрымаў псеўданім: Надзя — «Феня», Ія — «Зорка», яшчэ былі Зіна Дзехцярэўская, Валодзя Заяц. Валодзя Баброўскі — «Заглоба», святар Валынец — «Уладзімір».

Ія стала перакладчыцай па парадзе кіраўніцтва разведкі.

У ноч з 1 на 2 лістапада да нас на кватэру прыбылі Свірыдзенка і Сямёнаў. З'явілася з Дзісны Ія. Тады ёй было даручана дастаць некалькі бланкаў пашпартоў і скласці план Дзісны з умацаваннямі і пераправамі на подступах да гарнізона.

У ноч з 15 на 16 лістапада Ія ў нас на кватэры перадала Свірыдзенку 10 пашпартных бланкаў, адзін з якіх быў афармлены па іх просьбе на імя Івана Галавача з Навінцаў. Пры гэтым прысутнічалі камандзір Сямёнаў, разведчыца Фруза і незнаёмы нам камандзір са штаба брыгады.

Восенню Надзя некалькі разоў ездзіла да Пятра Сямёнавіча Гагалінскага. Неяк ноччу павінен быў быць у яго камандзір атрада, у якім знаходзіўся сын Пятра Сямёнавіча. Не запальваючы лямпу, Надзя і сям'я Гагалінскіх прасядзелі да раніцы ў чаканні камандзіра і сына. Не дачакаліся. Між тым Пётр Сямёнавіч расказваў шмат цікавага, маляваў планы на будучае. І хто тады мог ведаць, што яго і сям'ю чакае трагічная смерць.

20 лістапада ўзмоцнены атрад паліцыі пад камандаваннем вядомага ката Шамшура акружыў сядзібу Гагалінскіх. Цяжка хворы гаспадар ляжаў на ложку. Яго Шамшур застрэліў на вачах у сям'і. Потым усіх зачынілі ў свірне і жывымі спалілі жонку і дваіх малалетак. Сярэдні сын у гэты час пасвіў статак і таму застаўся ў жывых.

Паліцай, які ўдзельнічаў у аперацыі, расказваў: падзея так уразіла яго , што ён без дазволу ўцёк да ручая і схаваўся, бо не мог перанесці крыкі, плач і просьбы аб літасці няшчасных маці і дзяцей.

Старэйшаму сыну партызаны паведамілі аб трагедыі са спазненнем. Ён з таварышамі прыбыў у вёску тады, калі паліцыя была далёка.

Пасля трагедыі ў Хомічах партызаны арганізавалі напад на гарнізон у Дзісне, план якога ў іх ужо быў. У ноч на 11 лютага 1944 г. атрады 2, 3 і 5 занялі вуліцы Глыбокую, Полацкую і Заліўную, а яшчэ Дарожкавічы. Партызаны захапілі шмат мукі на паравым млыне Бімбата, статак у Дарожкавічах, спалілі млын, электрастанцыю, два склады.

Добрая інфармацыя падпольшчыкаў тлумачыцца тым, што некаторыя з іх працавалі ў адміністрацыйных органах. Ія была перакладчыцай у раённай управе. Шмат важнай інфармацыі і зброі атрымана ад Косці Шымуковіча, які служыў у паліцыі.

За нападам на Дзісну неўзабаве паследаваў разгром гарнізона ў Мётлах, у час якога подзвіг Аляксандра Матросава паўтарыў Пётр Яленскі, брат загінуўшага партызана.

З успамінаў былога партызана 4-й Беларускай партызанскай брыгады М. І. Ганебнага

Восенню 1942 г. у вёсках абапал балота Багна-Мох з'явіліся першыя партызаны. Неўзабаве сюды перамясцілася 4-я Беларуская партызанская брыгада. Многія хлопцы сталі прасіцца ў рады народных мсціўцаў. Узялі толькі тых, у каго была зброя.

Нарэшце на возеры Ельня пачалі прызямляцца нашы самалёты. З-за лініі фронту рэгулярна прыбывалі зброя і боепрыпасы. І вось у сакавіку 1944 г. многія мае аднагодкі, як і я, атрымалі вінтоўкі.

4-ы атрад пад камандаваннем Гарбаценкі стаяў у вёсках Ліпна, Боркаўшчына і Фядосава. Я быў залічаны ў першы ўзвод (камандзір Кібуноў, палітрук Іваноў), які размяшчаўся ў дамах Івана Шымуковіча, Аўдоцці Шымуковіч і іншых сялян.

Сваё першае баявое хрышчэнне атрымаў праз некалькі дзён. З-за лініі фронту мы атрымалі ротныя мінамёты. Трэба было зрабіць іх выпрабаванне. А каб міны дарэмна не псаваць, вырашылі напасці на гарнізон у Дзісне. Пагрузілі на сані мінамёт, запас мін і неўзабаве прабраліся да в. Беразова. Размясціліся зручна ля ручайка, і першая пасланая намі міна ўзарвалася на двары гарнізона. Другая трапіла ў нейкі драўляны будынак, таму што запалаў пажар. Ужо пасля першага выбуху гарнізон быў падобны на растрывожаны мурашнік.

Нас, відаць, выявілі, бо па ручаю ўдарылі з буйнакалібернага кулямёта.

У красавіку 1944 г. тры атрады нашай брыгады прымалі ўдзел у дыверсійнай аперацыі на чыгунцы Полацк — Ветрына — Глыбокае. Асноўныя сілы фарсіравалі р. Дзісну ў в. Навінцы і далей рухаліся ў напрамку Ветрына. Наш атрад пераправіўся ля в. Мурашчына і рушыў на Лужкі. Нам трэба было прыкрыць правы фланг асноўных сіл па лініі ад в. Крыўкі да в. Чырвоная Гара і не даць магчымасці фарміраванню нямецкіх памагатых пад камандаваннем Вітвіцкага, якое знаходзілася ў Лужках і Гарадцы, нанесці ўдар па астатніх атрадах з флангу і тылу.

Кіраваў аперацыяй начальнік штаба 4-га атрада Лагуноў. Хоць яна прайшла паспяхова, вярталіся без асаблівага настрою. Мы зайздросцілі партызанам іншых атрадаў, якія прымалі актыўны ўдзел у аперацыі на чыгунцы. Там была канкрэтная работа. А мы ляжалі ў засадзе, чакалі праціўніка, які так і не адважыўся на сустрэчу з намі.

Неяк па каналах агентурнай разведкі штаба атрада стала вядома, што немцы плануюць вылазку ў бок Дзісны з мястэчка Германавічы для нарыхтоўкі харчоў. Гэта азначала, што многія сяляне застануцца без зерня, кароў і іншай жывёлы. Камандаванне атрада выслала дазор з мясцовых партызан Антона Івашкевіча, Паўла Шымуковіча і інш. Трапіў туды і я. Камандаваў намі камандзір аддзялення Іван Давыдаў. Мясцовасць мы ведалі добра, выбралі зручны ўскраек лесу і арганізавалі назіранне за дарогай Германавічы — Дзісна. Праз нейкі час паявілася калона немцаў і паліцаяў. У ёй было не менш 150 чалавек. Трое засталіся весці назіранне, а мы ўдваіх кінуліся ў атрад. Але конная разведка нас апярэдзіла, і атрад у баявым парадку рушыў насустрач праціўніку.

Аднак немцы паспелі абрабаваць мясцовых жыхароў, а ў адной вёсцы вырашылі пабражнічаць. Яны не чакалі там партызан, і нам удалося акружыць карнікаў. Завязалася перастрэлка. Пад ружэйна-кулямётным агнём немцы і паліцаі не прынялі сур'ёзнага бою і хутка сталі адыходзіць, падбіраючы параненых. Нарабаванае дабро вярнулі законным гаспадарам.

У канцы мая 1944 г. немцы вырашылі знішчыць нашу брыгаду і блакіраваць зону, прымусіўшы партызан скіравацца на балота Багна-Мох. Наш узвод прыкрываў адыход у напрамку Сцефанпольскія хутары — Ямна. Партызаны з мясцовых жыхароў былі выдзелены ў якасці праваднікоў. Давялося выконваць такую місію і мне. Пасля перастрэлкі з немцамі праз р. Дзісну ля Людвінова наша група пачала адыходзіць да возера Ельня. Калі мы з'явіліся на месцы збору, там было ўжо шмат партызан, падцягваліся іншыя. Рыхтаваліся да прарыву блакады. Аднак аказалася, што асноўныя сілы брыгады ўжо прарваліся. Сіл на паўторны рывок яўна не хапала, можна было загінуць усім. Тады было вырашана выходзіць невялічкімі групкамі і адзіночна. Мне ўдалося прайсці міма нямецкіх пастоў і за кароткую ноч дайсці дадому. Але там заставацца было небяспечна. Таму дняваў у суседнім хляве, глыбока закапаўшыся ў мінулагоднюю салому. Хлеў стаяў на ўскрайку, непадалёку ад лесу. Я праз шчыліну ў сцяне добра бачыў, як немцы рыхтаваліся ланцугом прачэсваць лес і балота. Праваднікамі ў іх былі мясцовыя паліцаі.

Позна вечарам голад прымусіў мяне пайсці дадому. Ноч правёў у яме на полі, а на світанні рушыў на балота. І гэта ледзь не каштавала мне жыцця, таму што немцы арганізавалі паўторнае прачэсванне лесу. Здалёк пачуліся адзіночныя стрэлы з вінтовак і аўтаматныя чэргі, брэх сабак. Да мяне прыбегла наша партызанка-разведчыца і паведаміла аб небяспецы. Здавалася, выйсця няма. Сам добраахвотна залез у лавушку. Але тут успомніў, што побач знаходзіцца багна, па якой можна прайсці

толькі ў некаторых месцах. Мы хутка па аднаму мне вядомай сцяжынцы забраліся на сярэдзіну дрыгвы. На больш высокім месцы рукамі выкапалі ў моху яму глыбінёй больш метра, якая тут жа напоўнілася рудой халоднай вадой. Мы ўдваіх залезлі ў гэтую брудную ваду па шыю, паверх галоў накрылі сябе мохам і паставілі маленькія сасоначкі. У апошні момант я заўважыў, як з лесу на чысцяк выйшлі немцы з сабакамі. На першым часе мы не адчувалі ледзянога подыху вады. Я чуў нямецкую гаворку, брэх сабак, а калі гучалі стрэлы, то чакаў, калі трапіць у мяне ці маю спадарожніцу. Але нямецкі ланцуг пастаяў крыху перад дрыгвой і стаў абыходзіць яе з абодвух бакоў, а потым скіраваўся далей.

Адчуваю, што праціўнік пайшоў, што небяспека мінула, а вылезці з ямы не магу. Сутарга звяла ногі. З цяжкасцю выцягнуў сваё цела з мокрай магілы, дапамог вызваліцца з халоднай гразі спадарожніцы. Доўга расціраліся, пакуль аднавілі нармальны кровазварот.

З вялікай перасцярогай пачалі прабірацца дамоў. Трэба было запасціся харчамі, высушыць адзенне. А праз некалькі дзён адбылася радасная сустрэча з падраздзяленнямі Чырвонай Арміі.

З успамінаў камандзіра партызанскай брыгады «Кастрычнік» Ф. К. Юрчанкі

Наш партызанскі атрад «Кастрычнік» з 25 чалавек восенню 1942 г. ішоў з-за лініі фронту. У пачатку лістапада наблізіліся да балота Багна-Мох, спыніліся ў в. Мнюхі.

Жыхары Мнюхаў сустрэлі партызан нядрэнна. За суткі мы памыліся ў гарача нацепленых лазнях, прывялі ў парадак адзенне і абутак. Трэба сказаць, што гэтая вёсачка і яе разважлівы старэйшына дзед Ягор былі самай надзейнай апорай нашага атрада.

Пасярэдзіне балота ёсць некалькі астравоў — узвышшаў, парослых лесам. Адзін з іх даволі вялікі. Трэба было паглядзець гэтыя мясціны і, магчыма, зрабіць там сваю базу. Але трапіць туды цяжка. Быць правадніком ахвотна згадзіўся Арсенцій — мужчына сярэдніх гадоў з хутара Кручкі. На вялікім востраве былі два жыхары. На ўскрайку з поўначы жыў Фёдар Буда з жонкай і іх чатыры сыны. Убачыўшы Буду ўпершыню, агледзеўшы яго вельмі беднае жытло, наш партызан Ануфрый Лапін жартам усклікнуў: «Ды гэта ж яшчэ адзін Рабінзон!» Гэтая празвіўка за Фёдарам і засталася. Шмат гора перанёс Рабінзон. Блакаднай восенню 1943 г. за сувязь з партызанамі фашысты жорстка збілі яго, спалілі хату, старую і меншых дзяцей прагналі з балота. Два старэйшыя сыны пайшлі ў партызаны. Сам Фёдар быў вывезены на катаржныя работы ў Германію, дзе зусім аслеп.

На паўднёвым ускрайку возера жыў таксама небагаты састарэлы мужчына з такой жа старой сястрой Іосіф Альшэўскі, якога звалі Амерыканцам. Непадалёку знаходзілася амаль новая лазня. На ўзвышшы ўздымаўся драўляны маяк, пабудаваны перад самай вайной нашымі тапографамі. З яго ў бінокль можна было выразна бачыць бліжэйшыя хутары, в. Буды, усё наваколле. А да бліжэйшага сухога берага не менш сямі кіламетраў.

Для разведкі наваколля вырашылі на некалькі дзён спыніцца тут. Хоць у хаце было вельмі цесна і не зусім сытна, Альшэўскія дзяліліся з намі апошнім кавалкам хлеба. Аднойчы я спытаў у гаспадара, чаму яго празвалі Амерыканцам. Той крыху памаўчаў, дымячы самакруткай з моцным самасадам, потым няспешна стаў расказваць.

— У маладосці сваёй зямлі я не меў. Давялося за кавалак хлеба гнуць спіну ў паноў. Пасля ў пошуках лепшага жыцця доўгі час бадзяўся па беламу свету. Пабываў у Галандыі, Францыі,

Ф. К. Юрчанка (у цэнтры)

Англіі і нават у Амерыцы. Але добрага жыцця нідзе не знайшоў. Хвораму і знясіленаму ад цяжкай працы, без грошай давялося вярнуцца ў родныя мясціны, пасяліцца на гэтым востраве.

Дом і лазня Амерыканца доўгі час давалі надзейны прытулак партызанскім разведчыкам. Але восенню 1943 г. фашысты пад выглядам партызан заслалі на востраў сваіх «малайцоў», якія спілавалі маяк, спалілі хату і лазню Альшэўскага, а саміх гаспадароў па-зверску забілі і кінулі ў полымя.

Сцяг працы. 1995. 11 мая.

З успамінаў былога камісара партызанскага атрада імя Суворава брыгады імя Леніна П. Д. Сталярова

Вайна застала мяне ў Мядзелі, дзе я працаваў першым сакратаром райкама камсамола. Воінскую часць, у якую быў накіраваны ваенкаматам, не знайшоў, бо пад націскам фашыстаў нашы войскі адыходзілі на ўсход. І ўжо ў Полацкім раёне мы аказаліся ў тыле ворага. Глухімі сцяжынкамі дабраўся да Шумілінскага (былога Сіроцінскага) раёна. Тут сустрэўся са знаёмымі людзьмі, якія мелі сувязі з падпольным райкамам партыі, што ўзначальваў сакратар Фралоў. Мяне зацвердзілі інструктарам райкама.

Я праводзіў гутаркі сярод насельніцтва аб стварэнні падпольных груп і партызанскіх атрадаў, аб зборы зброі, знішчэнні тэлефоннай сувязі, мастоў на дарогах і г. д. Неўзабаве было створана пяць партызанскіх атрадаў. Яны разграмілі ўсе невялікія нямецкія гарнізоны.

У ліпені 1942 г. райкам партыі прызначыў мяне палітруком першай роты першага атрада, камандзірам якога быў старшы лейтэнант Мікалай Аляксандравіч Сакмаркін, камісарам — Андрэй Сямёнаў. Мяпе выбралі сакратаром партарганізацыі гэтага атрада. У яе ўваходзілі і члены бюро райкама партыі, і камуністы штаба брыгады Кароткіна.

Першай буйной аперацыяй брыгады Кароткіна з'явіўся разгром нямецкага гарнізона на чыгуначнай станцыі Язвіна. У выніку яе забіта каля 70 нямецкіх салдат і афіцэраў, 12 паліцэйскіх, за-

П. Д. Сталяроў

хоплены 2 ручныя кулямёты, 62 вінтоўкі і вялікая колькасць боезапасаў, батальённы мінамёт. З нашага боку толькі шэсць чалавек атрымалі раненні.

Потым настала чарга гарнізона ў мястэчку Сіроціна. У ім налічвалася каля 300 немцаў і паліцаяў. У час штурму вораг хутка быў выгнаны з населенага пункта, пакінуўшы на полі бою каля 70 забітых.

Неяк нам стала вядома, што на фронт па чыгунцы Полацк — Віцебск павінен прайсці нямецкі пасажырскі цягнік з жывой сілай. Штаб брыгады загадаў першаму партызанскаму атраду нанесці ўдар. Было забіта 67 і паранена 190 фашыстаў.

На чыгунцы Віцебск — Полацк часцей пачалі ляцець пад адхон варожыя эшалоны з жывой сілай і тэхнікай. Выконвалі гэту работу падрыўныя групы камсамольцаў.

На ўчастку дарогі, кантралюемым партызанамі, нямецкія цягнікі пачалі хадзіць толькі днём і з хуткасцю 10—20 км ў гадзіну. Пры гэтым яны штурхалі перад сабой некалькі пляцовак з гравіем. Але партызаны пачалі падрываць і іх, карыстаючыся мінамі-«вудачкамі».

У канцы 1942 г. немцы арганізавалі супраць партызан карную экспедыцыю. Брыгадзе імя Кароткіна давялося адысці ў Расонскі раён, але яна хутка зноў вярнулася. Для больш аператыўнай дзейнасці брыгаду раздзялілі на дзве часткі. Адна захавала ранейшую назву, другая стала брыгадай імя Леніна. Яе ўзначаліў М. А. Сакмаркін.

Летам 1943 г. брыгада імя Леніна перайшла ва Ушацкі раён. У гэтай зоне дзейнічала 16 партызанскіх злучэнняў, дзякуючы чаму вялікая тэрыторыя знаходзілася пад іх кантролем.

Фашысты вырашылі раз і назаўсёды пакончыць з народнымі мсціўцамі. З фронту яны гналі 60 тысяч салдат, узброеных артылерыяй, мінамётамі. Былі выкарыстаны таксама танкі, самалёты. Партызан было больш 17 тыс. 11 красавіка 1944 г. завязаліся цяжкія баі. 25 дзён партызаны стрымлівалі націск ворага, які акружыў нас з усіх бакоў. Па загаду штаба мы пачалі рыхтавацца да прарыву. З брыгады імя Леніна і 16-й брыгады імя Шлапакова стварылі групу прарыву з дзвюх тысяч чалавек. Ім супрацьстаяла 6 тыс. фашыстаў.

Перад штурмам у кожным узводзе, у ротах прайшлі сходы, на якіх былі дадзены канкрэтныя заданні кожнаму партызану.

І вось ноччу нечакана для фашыстаў пачаўся штурм. У адно імгненне была прарвана іх абарона, і партызаны выйшлі з акружэння.

Адпачывалі мы непадалёку ад Дзісны, затым праз балоты рушылі ў Шаркоўшчынскі раён, раніцай прайшлі праз вёскі Зялёнка, Руда, Краснае, знішчыўшы там нямецкія гарнізоны. І толькі ў Пагосце вораг аказаў нам супраціўленне. Акружыўшы вёску з усіх бакоў, мы хутка знішчылі 90 фашыстаў. Былі захоплены штабныя дакументы, многа бельгійскіх коней, зброі.

16 чэрвеня 1944 г. нашу брыгаду ў складзе 600 чалавек паслалі на чыгунку Вільнюс — Дзвінск для вядзення рэйкавай вайны ў Латвіі. Там мы знішчылі 4 км рэек, усю сувязь, надоўга спыніўшы на гэтым адрэзку рух цягнікоў.

У пачатку ліпеня мы сустрэліся з савецкімі войскамі.

Сцяг працы. 1984. 26 чэрв.

КАРНАЯ АПЕРАЦЫЯ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ «ФРЫЦ» СУПРАЦЬ ПАРТЫЗАН У МІЁРСКІМ І СУСЕДНІХ РАЁНАХ

Верасень — кастрычнік 1943 г.

«Фрыц» — кодавая назва карнай аперацыі нямецка-фашысцкіх захопнікаў супраць партызанскіх брыгад «Спартак», «За Радзіму», Ф. С. Шляхтунова (пазней імя Даватара), імя Варашылава, імя Гастэлы, імя Жукава, імя Ракасоўскага, асобных атрадаў партызанскіх брыгад «Жалязняк», «Народныя мсціўцы», імя С. М. Кароткіна, спецыяльнага партызанскага атрада «Сокал» і мясцовага насельніцтва ў Браслаўскім, Відзаўскім, Глыбоцкім, Міёрскім, Пастаўскім, Шаркоўшчынскім, Дунілавіцкім раёнах у верасні — кастрычніку 1943 г.

Праводзілася сіламі ўсходняй баявой групы брыгадэнфюрэра СС Гарма, паўднёвай групы обер-групэнфюрэра СС Мюлера, заходняй групы начальніка пагранічнай аховы г. зв. генеральнай акругі «Літва» Гахтэля, паўночнай групы брыгадэнфюрэра СС Шэдэра. Баявыя групы былі сфарміраваны з нямецкіх паліцэйскіх палкоў і батальёнаў, спецыяльных баявых артылерыйскіх, авіяцыйных падраздзяленняў, часцей пагранічнай аховы г. зв. генеральных акруг «Беларусь», «Літва», «Латвія». Усходняя група складалася з 2 паліцэйскіх палкоў, 254-га матарызаванага батальёна, 2 артылерыйскіх дывізіёнаў, 11-й роты сувязі, нямецкай жандармерыі і паліцыі. Паўночнай групе, акрамя 16-га паліцэйскага палка, былі прыдадзены 2-я авіягрупа і танкавая егерская рота. 24 верасня карнікі пачалі акружаць вялікую тэрыторыю па лініі: воз. Дрысвяты — усходні бераг воз. Аболе — заходні бераг воз. Богінскае — в. Казяны — усходні бераг воз. Вял. Швакшта — в. Занарач — Чарэмшыцы — Крывічы — Параф'янава — г. Глыбокае — в. Ручай — Наугароды — Міёры — г. п. Друя — воз. Дрысвяты. Намнога большыя сілы праціўніка вымусілі партызан адысці з блакіраваных масіваў. Пры адступленні партызаны мініравалі дарогі, вялі засадныя баі, у некалькіх месцах прарвалі акружэнне і выйшлі ў суседнія раёны Віцебскай вобл. за чыгунку Полацк — Маладзечна. У канцы кастрычніка — пачатку лістапада партызаны вярнуліся на ранейшыя месцы дыслакацыі.

За час аперацыі, паводле няпоўных звестак, карнікі загубілі 509 мясцовых жыхароў, вывезлі на катаргу ў Германію 12 тыс. чалавек, у тым ліку 1708 дзяцей, спалілі 87 вёсак, у тым ліку Бабылі (загубілі 25 чал.), Браслаўскую Луку (17 чал.), Быкоўшчыну (29 чал.), Гайлешы (24 чал.), Грабішкі (11 чал.), Дзегцяры (12 чал.), Забор'е (12 чал.), Рудава (12 чал.), Стайкі (59 чал.) Браслаўскага р-на, Кеўлічы (28 чал.), Стахоўскія (49 чал.) Пастаўскага р-на, Сухавержа (60 чал.) Міёрскага р-на, Ёды (510 чал.) Шаркоўшчынскага р-на і інш. Гітлераўцы захапілі 36 тыс. галоў жывёлы, 1608 ц збожжа, 4104 ц бульбы, 1111 ц сена, саломы і гародніны. Гітлераўскае камандаванне карную аперацыю «Фрыц» прыраўноўвала да вялікай баявой аперацыі на фронце. Усім яе ўдзельнікам былі выплачаны «франтавыя» і ўзнагарода «за ўдзел ў баях».

Друкуецца па кн.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг. Энцыклапедыя. Мн., 1990. С. 608—609.

Аб іх не гаварылі галосна

Польскі арганізаваны рух супраціўлення акупантам узнік у 1940 г. Кіруючым цэнтрам яго быў Саюз узброенай барацьбы. На першым этапе польскае палітычнае кіраўніцтва і ваеннае камандаванне называлі агрэсарамі як нямецкі бок, так і савецкі. З гэтага пункту гледжання распрацоўваліся ўсе стратэгічныя і тактычныя планы, вялася аператыўная работа. Трэба сказаць, што, нягледзячы на тэрор савецкіх улад супраць асоб польскай нацыянальнасці ў перыяд 1939—1941 гг., польскаму камандаванню супраціўлення на тэрыторыі былых усходніх ваяводстваў — Віленскага, Навагрудскага і Палескага ўдалося захаваць ядро арганізацыі. Наша мясцовасць згодна тэрытарыяльнага падзелу польскага руху супраціўлення ўваходзіла ў падпарадкаванне галоўна-

му камандаванню Саюза ўзброенай барацьбы Віленска-Ковенскай акругі. Тэрыторыя Міёрскага раёна ўваходзіла ў Браслаўска-Пастаўскі раённы інспектарыят пад кодавай назвай «Рыба», які складаўся з трох мясцовасцей: «Бяроза-2» — Браслаў і заходняя частка цяперашняга Міёрскага раёна; «Дуб» — мясцовасць Дзісны і прылягаючых вёсак; «Пальма» — мясцовасць Пастаў.

У данясенні галоўнага каменданта Саюза ўзброенай барацьбы за перыяд з верасня 1941 г. да сакавіка 1942 г. сцвярджаецца, што Віленска-Ковенская акруга «захавала значную частку сваёй арганізацыйнай сеткі, падзелена на чатыры раённыя інспектарыяты і мясцовасці, ідзе камплектаванне камандавання мясцовасці і арганізацыя баявых падраздзяленняў».

Згодна са стратэгічнай распрацоўкай польскага камандавання, якая ўвабрала вопыт першай сусветнай вайны і адраджэння польскай дзяржавы ў 1918 г., актыўныя баявыя дзеянні Арміі Краёвай павінны былі распачацца, калі знясіленая і дэмаралізаваная няўдачамі на Усходзе нямецкая армія будзе не ў стане аказаць супраціўленне, дастатковае для падаўлення агульнанацыянальнага польскага паўстання. Таму на першым этапе галоўнымі напрамкамі ў дзейнасці польскіх партызан былі падрыхтоўка кадраў і матэрыяльная падрыхтоўка паўстання.

ЦАНАЕВ (ЦАПАЕВ) Василий Георгиевич, р. в 1910 на ст. Петровский Завод Читинской обл., ряд., бронебойщик 18-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 4.7.1944.

ЧИЧКОВ Николай Васильевич, р. в 1922 в д. Аложайка Камышинского р-на, ряд., стрелок 18-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 4.7.1944.

ЯЗНЕНСКИЙ СЕЛЬСОВЕТ

ДЕРЕВНЯ ЯЗНО

СТАКАНОВ Виктор Александрович, р. в 1913, гв. старш., шофер отд. «Смерш», умер от ран 6.7.1944 в 503-м шпг.

Партызаны і падпольшчыкі — ураджэнцы іншых раёнаў і абласцей, якія загінулі і пахаваны на тэрыторыі раёна

ГОРАД ДЗІСНА, БРАЦКАЯ МАГІЛА

ГАНЕБНЫ А.
ГАНСКІ Уладзімір Уладзіміравіч, забіты ў 1944.
ГЛАДКОЙ Канстанцін Іванавіч.
КАЗЛОЎСКІ Уладзімір Іосіфавіч, загінуў 27.12.1943.
КАРАЛЁЎ Міхаіл Мікітавіч.
КУЗЬМІН Я.
ЛАТЫШКЕВІЧ Н.
МАРКОВІЧ Аляксей Іванавіч, н. у 1924, загінуў 7.1944.
МАЛАТОК Іван Несцеравіч, н. у 1916, загінуў 3.5.1944.
МУГНАЙТАСАЎ А.
НАБЕЕЎ Аляксандр Васільевіч.
РУДАКОЎ Д.
САНЬКО І.
ФІНАБЕЕЎ Леанід.
ЦІТОВА Марыя Іванаўна.
ШАРДЗЕЎ Сяргей Яфімавіч.
ШУРЭМАЎ В. Ф.

ЗАВУЦЦЕЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГАЛЁНЧЫНА

РАДЫСТКА Ліза, загінула ў 1944.

ВЁСКА КОПЦЕВА

БЕЛАВУСАЎ Віктар Мікітавіч, н. у 1925, загінуў у 1943.
ВАРАБЕЕЎ Іван Лявонавіч, н. у 1925, загінуў у 1943.
МАРОЗ Сцяпан Фёдаравіч, н. у 1918, загінуў 17.9.1943.

ГОРАД МІЁРЫ, БРАЦКАЯ МАГІЛА

АДАМЯН М. С.
ВЫСОЦКІ А. А.
ГРОБАЎ П.
ГРЫЖМЯКОЎСКІ І.
КАЦ С.
КРУЧКОЎ Васіль Ягоравіч.
МЯТЛЮК Пётр Яфімавіч.
РАССАМАХІН.
САЛАЎЁЎ Д.
ТАЛСТОЙ Пётр Васільевіч, н. у 1915, загінуў 13.10.1943.



Помнік на магіле радзісткі Лізы ў в. Галёнчына

ТАРАСЕНКАЎ А. Т.
ШАБАЎ А. Г.
ШАМЁНАК Віктар Сямёнавіч, н. у 1922, загінуў 24.5.1944.
ЯРМАК М. І., кам. 4-й Бел. партыз. брыгады.

ЧЭРАСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА МАСЕЎЦЫ, БРАЦКАЯ МАГІЛА

КЛЯШТОРНЫ Максім Максімавіч, н. у 1921, загінуў 7.5.1944.
КУХТА Ігнат Іванавіч, н. у 1920, загінуў 28.3.1944.
ЧАРНОЎ Мікалай Аляксандравіч, загінуў 6.6.1944.

ВЁСКА ПАЦЕЕНКІ

МІЛУН Аляксей Антонавіч, н. у 1921, загінуў у 1943.

ЯЗНЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАСЯНКІ

МАРКАВЕЦ Аляксандр Лук'янавіч, н. у 1919, рад. партыз. брыг. Мядзведзева, загінуў 10.12.1942.

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

ПАСЛЯ ВЫЗВАЛЕННЯ АЙЧЫНЫ

Міёрскі раён быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх акупантаў 4 ліпеня 1944 г. 10 ліпеня адбылося першае пасяджэнне Міёрскага райкама партыі, на якім абмяркоўвалася пытанне «Аб задачах на рабоце складу Міёрскага райсавета дэпутатаў працоўных» і першачарговыя задачы па аднаўленні разбуранай вайной гаспадаркі і наладжванні мірнага жыцця. Як было адзначана на агульнай нарадзе камуністаў і камсамольцаў партызанскай брыгады імя Капана Фёдаравіча Сімакоў. Пад абстрэлы траплялі і іншыя партыйныя, савецкія і камсамольскія работнікі.

За перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі фашысцкія варвары нанеслі раёну вялікія страты. У межах тагачаснага Міёрскага раёна забіта тры тысячы чалавек, вывезена ў фашысцкую Германію 995 чалавек, спалена дашчэнту жылых дамоў аднаасобнікаў 1407, халодных пабудоў — 3327, разбурана грамадскіх пабудоў калгаснікаў — 14, жылых дамоў калгаснікаў — 33, халодных пабудоў калгаснікаў — 109. Поўнасцю разбурана і знішчана МТС, спалена і разбурана 29 школ і раённы ДСК.

За перыяд нямецкай акупацыі нямецкімі захопнікамі знішчаны 3331 конь, 5516 галоў буйной рагатай жывёлы, 6314 свіней, 1017 авечак і коз.

Акрамя таго, былі знішчаны і разбураны 34 калгасы, поўнасцю паралізавана тэлеграфна-тэлефонная сувязь, а таксама выведзена са строю чыгуначная магістраль на працягу 49 км.

З 34 даваенных калгасаў былі адноўлены восем, а дзейнічалі нармальна толькі тры: «Праўда», «17-е Верасня» і «Чырвоны сцяг». Удзельная вага аднаасобніцкіх гаспадарак складала 90 %. Менавіта на гэтае асяроддзе была накіравана варожая антысавецкая агітацыя супраць калектывізацыі.

У парадку экстраннай дапамогі за год трэба было пабудаваць 800 дамоў па-

Міёрскі раён быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх акупантаў 4 ліпеня 1944 г. 10 ліпеня адбылося першае пасяджэнне Міёрскага райкама партыі, на якім абмяркоўвалася пытанне «Аб задачах на рабоце складу Міёрскага райсавета дэпутатаў працоўных» і першачарговыя задачы па аднаўленні разбуранай вайной гаспадаркі і наладжванні мірнага жыцця. Як было адзначана на агульнай нарадзе камуністаў і камсамольцаў партызанскай брыгады імя Капана Фёдаравіча Сімакоў, «партыйна-камсамольскі актыў павінен стаць прыкладам для ўсіх у справе актыўнага ўдзелу ў аднаўленні савецкай улады ў раёне. Задача старшыні — дапамагаць Чырвонай Арміі па выяўленні і знішчэнні асобных груп разбітага праціўніка, якія хаваюцца па лясах».

Райкам партыі намячае меры па правядзенні мабілізацыі ваеннаабавязаных і ўліку пасяўных плошчаў, укамплектаванні нарыхтоўчых арганізацый, падрыхтоўцы іх базы, а затым па арганізацыі сельгаснарыхтовак, разгортванні лесанарыхтовак для аднаўленчых работ у краіне, мабілізацыі на будаўніцтва Паўднёва-Уральскай чыгункі. Усё гэта ажыццяўлялася ў складаных умовах, калі яшчэ стралялі з-за вуглоў фашысцкія памагатыя. Ад іх кулі 10 верасня 1944 г. пры выкананні службовых абавязкаў загінуў у Александрынскім сельсавеце інструктар райкама партыі Сця-

цярпеўшым ад фашысцкіх блакад. Льготы на пастаўку дзяржаве сельгаспрадуктаў атрымалі 1632 сям'і, якія знаходзіліся ў найбольш цяжкім стане, былі вызвалены ад паставак 116 сем'яў франтавікоў і партызан. 430 сем'яў франтавікоў атрымалі 158 619 руб. дапамогі, а 103 сем'ям загінуўшых воінаў было выплачана 26 250 руб.

У пачатку жніўня райкам партыі абавязвае кіраўніцтва МТС неадкладна закончыць рамонт жняярак і перадаць іх для ўборкі дзяржфондаўскіх пасеваў і сялянскіх надзелаў за «аплату натурай».

Пачынаецца аднаўленне мясцовай прамысловасці. 9 верасня 1944 г. пры абмеркаванні гэтага пытання на пасяджэнні райкама партыі адзначалася, што «за час акупацыі раёна нямецкія фашысты разбурылі 5 млыноў, воўначасальную фабрыку, фабрыку кардону, 3 цагельныя і 3 вапнавыя заводы...

Адноўлены і працуюць 3 цагельныя заводы, лесапільны завод, воўначасальная фабрыка, 3 вапнавыя заводы, 11 млыноў, электрастанцыя. Праводзіцца рамонт на 2 млынах, канчатковае аднаўленне электрастанцыі, вапнавых і цагельных заводаў».

Адначасова з гаспадарчай вядзецца вялікая агітацыйная культурна-масавая работа. Адкрыта 10 хат-чытальняў, створаны агіткалектывы і замацаваны за сельсаветамі.

Да першага пасля вызвалення навучальнага года прынята рашэнне аб пераносе ў Міёры сярэдняй школы з Друі.

За паўгода мірнага жыцця, на перыяд да 30 снежня 1944 г., былі адноўлены органы савецкай улады: райсавет з яго аддзеламі і 20 сельскіх Саветаў, а таксама 57 школ з ахопам 4931 вучня, 3 бальніцы на 55 ложкаў, 4 ФАПы, райветлячэбніца і 3 ветпункты, МТС, тры калгасы, адкрыта 16 хат-чытальняў, Дом культуры, раённая бібліятэка, адноўлена тэлефонна-тэлеграфная сувязь, сістэма спажыўкааперацыі і іншыя нарыхтоўчыя арганізацыі, пачаў працаваць лесазавод.

Раённая газета «Бальшавіцкая трыбуна» 27 снежня 1944 г. пісала: «Калгас «17-е Верасня» Лявонпальскага сельсавета да вайны быў перадавым калгасам у раёне. Калгаснікі збіралі высокія ўраджаі, высокапрадукцыйныя жывёлагадоўчыя фермы былі гордасцю калгаса і калгаснікаў.

Нямецкія захопнікі разбурылі калгасную гаспадарку. Яны разрабавалі калгаснае дабро, інвентар, знішчылі жывёлагадоўчыя фермы.

Пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі калгаснікі актыўна ўзяліся за аднаўленчую працу. Цяпер калгас мае ферму буйной рагатай жывёлы, авечкагадоўлю, свінагадоўлю, пчалапасеку. Праўленне калгаса (старшыня тав. Панізнік) старанна клапоціцца аб хутчэйшым аднаўленні калгаснай гаспадаркі.

За кароткі час калгас мае да 15 тысяч даходу».

На той час калгас «17-е Верасня» меў 345 га зямлі, у ім аб'ядноўвалася 56 двароў. На калгасных фермах утрымлівалася 54 свінні, 60 авечак, з якіх настрыглі 833 кг воўны, ад 18 кароў было надоена 14 256 л малака. Дзяржаве сельгасарцель прадала 4325 л малака і 844 кг мяса.

Прыкладна так працавалі і астатнія гаспадаркі. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, разбурэнні, раён ужо з ураджаю 1944 г. паставіў дзяржаве 108 407 пудоў хлеба, 159 898 — бульбы, 2790 — мяса, 16 531 пуд сена. Праўда, асноўны ўклад у гэтыя пастаўкі зрабілі аднаасобніцкія гаспадаркі.

Але ўсё ж такі станаўленне гаспадаркі адбывалася марудна. Райкам партыі неаднаразова вяртаўся да абмеркавання пытанняў аб ходзе сельгаснарыхтовак, лесанарыхтовак, выканання іншых работ. Так, 7 верасня 1944 г. адзначалася, што план сельгаснарыхтовак сарваны. Адстаюць Павяцкі, Новапагосцкі, Друйскі, Аляксандрынскі і іншыя сельсаветы.

9 кастрычніка канстатуецца, што ўзарана толькі 1552 га зяблівa пры плане 14 тыс. га. Адстаюць Навакрукаўскі,

Міёрскі, Лявонпальскі і іншыя сельсаветы. План паставак бульбы выкананы на 31,5 %, здадзена ўсяго 90,1 т клубняў.

Ствараецца падсобная гаспадарка пры райспажыўсаюзе, на якую выдзяляецца 30 га пасяўных плошчаў і столькі ж сенакосу.

МТС мела пяць трактароў і ў першую веснавую кампанію ўзарала 329 га угоддзяў.

У 1945 г. праводзілася напружаная работа па будаўніцтве жылля. Да 18 кастрычніка 1945 г. у раёне пабудавана 650 дамоў.

Для сірот быў арганізаваны дзіцячы дом у Александрове, які налічваў 65 выхаванцаў. Яны забяспечваліся не толькі ў цэнтралізаваным парадку, але мелі падсобную гаспадарку, у якой было 20 га зямлі, 4 каровы і два кані. Дзеці, а палавіна з іх займалася ў 1—4-х класах, удзельнічалі ў харавым, танцавальным і фізкультурным гуртках, палітгуртку.

Насельніцтва ўсё шырэй уцягвалася ў будаўніцтва новага жыцця. Аб гэтым красамоўна сведчаць публікацыі раённай газеты «Бальшавіцкая трыбуна». Сяляне в. Гір'яты Чэраскага сельсавета, напрыклад, арганізавалі збор навагодніх падарункаў воінам-франтавікам. Маладыя агітатары камсамольцы Перабродскага сельсавета пад кіраўніцтвам камсорга Ю. Цыра праводзілі сходы і гутаркі сярод насельніцтва, звяртаючы асаблівую ўвагу на асвятленне падзей на франтах і выкананне гаспадарчых планаў. У час лесанарыхтовак і лесавывазак яны выпусцілі спецыяльны нумар насценгазеты аб лепшых людзях. Асаблівай павагай сярод сялян карысталася камсамолка-агітатар Людміла Юневіч.

Сяляне Перабродскага сельсавета звярнуліся да насельніцтва раёна з заклікам дапамагчы суседзям-асвейцам, якія асабліва пацярпелі ад фашысцкіх захопнікаў, у аднаўленні гаспадаркі.

На лесамэблевым заводзе за кароткі час былі адноўлены лесапільны, сталярны, колавы і іншыя цэхі. Сталярны цэх (начальнік т. Кучынскі) выконваў норму на 110—120 %, цэх шырпатрэбу (начальнік т. Карэй) — на 100—120 %. Добра працаваў качагар Федуковіч. Паміж цэхамі заключаны дагаворы на лепшае правядзенне работ, паспяховае выкананне норм.

«Мы, сяляне Навакрукаўскага сельсавета, як найбольш пацярпеўшыя ад вайны, бярэм на сябе абавязацельства і заклікаем усіх працоўных Міёрскага раёна агульнымі нашымі народнымі сіламі пабудаваць заводы: адзін у Лявонпалі, другі ў Міёрах, якія дадуць нам сотні тысяч цэглы ў год...» — пісалася ў газеце. Ініцыятарамі гэтага патрыятычнага руху сталі А. Мацюк, Я. Канах, І. Капусцін, В. Грэцкі, З. Сушко, В. Канах, Е. Грэцкі, М. Хартовіч, Г. Канах, В. Матэленак, М. Крук, Ж. Крук, І. Лакотка, С. Мацук, Т. Варонька і іншыя сяляне. Цагельныя заводы і ў Лявонпалі, і ў Міёрах (у раёне сучасных вуліц Азёрнай і Набярэжнай) былі пабудаваны. Яны забяспечвалі цэглай першыя будоўлі аднаўленчага перыяду.

Дапамога дзяржавы вызваленаму раёну ў першую чаргу заключалася ў паставуцы тэхнікі. Так, у зводцы МТС за 18 сакавіка 1945 г. адзначалася, што да веснавых палявых работ былі адраманатаваны 4 трактары з 5 і прычапны інвентар да іх. Акрамя таго, МТС рамантавала інвентар калгасам. У рабоце вызначалася трактарная брыгада камсамольца Максімовіча. Старанна працавалі слесар Шчабол, кавалі Жук і Бялевіч. Пры МТС дзейнічалі курсы трактарыстаў. На іх вучыліся не толькі юнакі, але і дзяўчаты — Адэля Федуковіч і Вера Матэленак.

Ужо на першых пасляваенных веснавых палявых работах разгарнулася спаборніцтва трактарыстаў. Так, брыгада Філіповіча абавязалася ўзараць 580 га, а калектыў Цвячкоўскага — 800 га. Сакратар камсамольскай арганізацыі МТС І. Максімовіч у калгасе «Чырвоны сцяг» узараў у першыя два дні работ 10 га.

1945 — ДА НАШЫХ ДЗЁН

А. Р. Хаткевіч

Паступова ў спаборніцтва ўключаліся паляводчыя брыгады, звенні. Не адразу яны дабіваліся высокіх вынікаў, набывалі арганізаванасць і зладжанасць, прафесійнае майстэрства. Вядома, у прыватнасці, што пры высокіх абавязацельствах тыя ж эмтээсаўскія механізатары вясной 1945 г. узаралі толькі 329 га.

Курс на калектывізацыю набываў усё больш прыхільнікаў. У 1948 г. у раёне ўтварылася яшчэ 8 гаспадарак. Асабліва шырокі размах набыла калектывізацыя ў 1949 г., а да канца 1950 г. яна была практычна закончана.

Так, перад веснавой сяўбой 1949 г. аб'ядналіся ў калгас «Баявы партызан» сяляне в. Чэрасы. У в. Барсукі Валькаўскага сельсавета ствараецца калгас імя Калініна. У Александрынскім арганізуюцца сельгасарцелі «Чырвоны сцяг», імя Сталіна, «1-е Мая» і інш.

18 мая 1949 г. раённы партыйны сход пры абмеркаванні пытання «Аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў» адзначыў, што ў выніку растлумачальнай работы, пераканання на вопыце і прыкладзе існуючых гаспадарак сяляне цэлымі вёскамі пайшлі ў сельгасарцелі. Толькі са студзеня па май 1949 г. у раёне арганізавана 28 новых калгасаў. У маі — чэрвені — яшчэ 26. Сярод іх «Новы шлях» у Чэраскім сельсавеце, «Ленінскі шлях» — у Новапагосцкім, імя Васілеўскага — у Наўгародскім, імя Пушкіна — у Валькаўскім, імя Будзённага — у Барсукоўскім, «Прагрэс» — у Павяцкім і многія іншыя.

Да канца 1950 г. у раёне ўжо дзейнічала 145 калектыўных гаспадарак. Для абслугоўвання іх створана другая МТС у Клётавым Двары. Дырэктарам яе стаў былы франтавік А. Р. Хаткевіч. Трактарны парк перавысіў 40 машын. Павялічваліся пастаўкі мінеральных угнаенняў. Усё гэта садзейнічала паступоваму ўмацаванню эканомікі калгасаў. Раённая газета 25 жніўня 1949 г. паведамляла, што ў калгасе «Новы шлях» выдаецца толькі авансам па 1,5 кг зерня на працадзень, у «Чырвоным сцягу» і «1-е Мая» — па 2,5 кг. За ўдарную працу хлебаробы атрымліваюць першыя дзяржаўныя ўзнагароды. Напрыклад, ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга ўручаны звеннявым Ніне Адамовіч, Іосіфу Лукоўскаму, Юліі Мароз. Многія адзначаны медалямі, а звеннявы калгаса «17-е Верасня» Мікалай Сіняўскі — ордэнам Леніна.

Адбываліся змены ў індустрыяльным развіцці раёна. Пачалі дзейнічаць Міжрэчанская і Міёрская гідраэлектрастанцыі, якія ў 1948 г. выпрацавалі 45 300 квт/гадзін электраэнергіі, уведзены 4 млыны, арганізавана некалькі кааператыўных арцеляў. За 1949 г. прамысловасць выпусціла валавой прадукцыі на 692 025 руб.

Да 1947 г. сувязісты павялічылі тэлефонную сетку да 100 нумароў, устанавілі больш магутную апаратуру на радыёвузел, што дазволіла радыёфікаваць 160 двароў.

1950 г. стаў своеасаблівай вяхой у развіцці сістэмы народнай асветы. Не толькі таму, што ў ёй ужо дзейнічалі 2 сярэднія, 13 сямігадовых і 54 пачатковыя школы, у якіх вучылася 6380 вучняў, працавала 269 настаўнікаў, 56 з іх мелі вышэйшую адукацыю. Галоўнае, што да гэтага часу ў раёне ў асноўным была ліквідавана непісьменнасць сярод дарослых.

Разгортваецца выхаваўчая і культурна-асветніцкая работа ўстаноў культуры. У 1947 г. пачынаюць дзейнічаць

раённая, гарадская і 18 сельскіх бібліятэк з фондам 8822 кнігі. Працуюць 18 хат-чытальняў і Дом культуры. У 1951 г. гэтая сістэма дапаўняецца раённай дзіцячай бібліятэкай, якой дзесяткі гадоў загадвала В. П. Лахманава. Літаральна за некалькі гадоў бібліятэчны фонд кніг падвойваецца.

Сістэма медыцынскага абслугоўвання да 1953 г. уключала раённую, гарадскую і дзве сельскія бальніцы, тры ўрачэбныя ўчасткі, сем ФАПаў, тубсанаторый «Друя». Насельніцтва абслугоўвалі 17 урачоў і 70 работнікаў сярэдняга медыцынскага персаналу.

Адразу пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў быў адноўлены Дзісенскі раён, які праз пятнаццаць гадоў увайшоў у склад Міёрскага. Працоўныя Дзісеншчыны дасягнулі значных поспехаў у аднаўленні народнай гаспадаркі. У хуткім часе тут пачынаюць працаваць бальніцы, школы, адноўлены і павялічваюць вытворчасць масласырзавод, цагельны завод, цэхі прамарцелі «Савецкая Беларусь», электрастанцыя. Пабудавана абласная туббальніца. Аднаўляецца рух па ўзарванаму гітлераўцамі мосту праз р. Дзісну. У горадзе, разбураным у час баёў, разгортваецца жыллёвае і камунальнае будаўніцтва. Больш таго, насельніцтва Дзісеншчыны аказвае вялікую дапамогу працоўным суседняй Ушаччыны ў нарыхтоўцы і вывазцы лесаматэрыялаў для аднаўлення населеных пунктаў, спаленых карнікамі.

Да 1950 г. вытворчасць прамысловай прадукцыі ў параўнанні з даваенным узроўнем падвоілася. Пачаўся наступны этап у развіцці сельскай гаспадаркі — узбуйненне калгасаў.

У гісторыі раёна першых пасляваенных гадоў адзначаюцца не толькі пазітыўныя працэсы. Адразу ж пасля вызвалення частымі былі бандыцкія вы-

Настаўнікі з Міёраў у першыя пасляваенныя гады

лазкі. Ім супрацьстаялі вопытныя міліцыянеры, многія з якіх прайшлі полымя партызанскай вайны і фронту. У Дзісне гэта начальнік аддзела Андрэй Максімавіч Фамін, выпускнік Саратаўскай школы міліцыі, участковыя інспектары Сарычаў, Рахчэўскі, Васін, оперупаўнаважаны Сідараў. У Міёрах — начальнік Муля Гіршавіч Столпер, участковыя інспектары Ажынскі, Эдэльман і інш.

Але дзяржаўны рэпрэсіўны апарат дзейнічаў не толькі супраць былых фашысцкіх прыслугачоў-паліцэйскіх, дэзерціраў, «зялёных». Яшчэ да вайны пачаліся першыя высяленні, якія ў першую чаргу закранулі буйных землеўладальнікаў і прадстаўнікоў польскай адміністрацыі. Пазней пералік рэпрэсіраваных пашыраўся: «нядобранадзейныя», «андэрсаўцы», «раскулачаныя». Але, на шчасце, вялікага размаху высяленні не набылі. Многія незадаволеныя сталінскімі парадкамі мелі магчымасць афіцыйна выехаць у суседнюю Польшчу ў якасці рэпатрыянтаў. І часта «палякамі» станавіліся мясцовыя жыхары незалежна ад нацыянальнасці, якія баяліся рэпрэсій за палітычныя погляды, чакалі раскулачвання або мабілізацыі на працу ў шахты, нават на вучобу ў ФЗА, уцякалі ад калгасаў, спадзяваліся атрымаць зямлю з пабудовамі на былых нямецкіх уладаннях.

Школы, камсамольскія і партыйныя арганізацыі пад сцягам атэістычнай работы разгарнулі сапраўдную вайну з рэлігіяй. Адна за другой закрываюцца культавыя ўстановы: касцёлы ў Новым Пагосце і Лявонпалі, цэрквы ва Узмёнах, Перабродцзі. У руінах засталіся культавыя будынкі ў Дзісне, без увагі людзей разбурыліся і разбураюцца яны ў Мікалаёве, Ідолце, Стэфанове. Для многіх з іх другое жыццё прыйдзе толькі ў 80-я, «перабудовачныя», гады.

Л. А. Матэленак

Дзіцячыя дамы ў пасляваенны час

Вялікая Айчынная вайна прынесла шмат пакут людзям. Краіна ляжала ў руінах, не было нават неабходнага. Вельмі востра стаяла пытанне аб дзецях, якія страцілі родных і блізкіх людзей. А такіх было дзесяткі і сотні — сірот, пакалечаных як фізічна, так і духоўна. У многіх месцах адкрываліся дзіцячыя дамы, куды звозілі адзінокіх дзяцей. Такое адбывалася і ў нашым раёне. Былі адкрыты дзіцячыя дамы ў вёсках Гарані, Дзедзіна, Александрова, Вянужа, Грыгаравічы.

З успамінаў ветэрана Вялікай Айчыннай вайны і працы Уладзіміра Канстанцінавіча Казачонка, які адкрываў дзіцячыя дамы ў вёсках Гарані і Дзедзіна:

— Пасля дэмабілізацыі я быў накіраваны на педагагічную працу. Памятаю, што дзяцей-сірот у дзіцячыя дамы накіроўвалі праз Полацкі прыёмнік-размеркавальнік. Іх было настолькі многа, што існуючыя дзіцячыя дамы ўсіх не маглі размясціць. У 1946 г. я адкрываў Гаранскі дзіцячы дом, а праз год — Дзедзінскі.

Дзіцячы дом у в. Гарані (цяпер тэрыторыя Новапагосцкага сельсавета) размяшчаўся ў былым панскім маёнтку. З дапамогай вясковага насельніцтва падрыхтавалі і адрамантавалі жылыя будынкі, узвялі лазню. Шмат было сталярных работ. Значную дапамогу аказалі печнікі — інвалід Вялікай Айчыннай вайны Дзеканіцкі і сям'я Стальмачонкаў. З гэтай сям'і працавалі бацька і яго два сыны. Чым мог дапамагаў старшыня мясцовага Савета Буравы.

У жніўні 1947 г. у дзіцячы дом было прынята больш чым 100 дзяцей. Я быў пераведзены разам з некалькімі выхаванцамі з Гаранскага ў Дзедзінскі дзіцячы дом. У Дзедзіне таксама быў выкананы вялікі аб'ём падрыхтоўчых і рамонтных работ. Фінансаванне і забеспячэнне дзяцей вопраткай, абуткам рабілі ся праз абласны аддзел адукацыі. Тава-

ры дастаўляліся з Полацкай базы па чыгунцы да Бігосава або да Бароўкі. Там разгружаліся, і гужавым транспартам іх везлі ў дзіцячыя дамы. У той час у раёне былі толькі дзве аўтамашыны — у райспажыўсаюзе і прамкамбінаце. Кіраўнікі гэтых арганізацый і выдзялялі транспарт. Дахавае пакрыццё прывозілі з Міёрскага льнозавода. Бэлькі пілавалі на лесазаводзе, а потым на конях везлі да в. Тычкі. А ўжо з гэтай вёскі мясцовыя жыхары таксама на конях прывозілі будаўнічы матэрыял у Дзедзіна.

Харчаванне для дзяцей выдзялялася праз раённую нарыхтоўчую кантору, штосьці куплялі на рынку. У першыя гады дзейнасці дзіцячага дома ў Дзедзіне бульбу мясцовыя сяляне здавалі ў кошт аплаты падаткаў. Што да хлеба, то ў Міёрах працавала невялікая пякарня, адкуль ён і прывозіўся.

Кантынгент дзяцей ў дзіцячым доме быў разнародны. Многія дзеці паступалі з моцнымі псіхічнымі парушэннямі, бо яны перажылі вялікае гора. Былі дзеці, на вачах якіх фашысты расстралялі бацькоў, а самі яны толькі па выпадковасці засталіся жывымі.

У дзіцячых дамах аказваліся дзеці, бацькі якіх былі рэпрэсіраваны.

Склад выхавацеляў таксама розніўся. У асноўным гэта былі людзі з сярэдняй і незакончанай сярэдняй адукацыяй. І тым не менш усе яны праяўлялі вялікі клопат аб сваіх падапечных. Прыкладалі шмат старання для забеспячэння нармальнага вучэбна-выхаваўчага працэсу. Працавалі дружна і суладна. Гэта давала пэўны плён. Дзеці адтайвалі душой, добра працавалі, займаліся фізкультурай і спортам. У Дзедзіне на 40 га зямлі вырошчвалі бульбу, агародніну. Гадава-

Выхаванцы Павянужскага дзіцячага дома

лі таксама кароў, коней, свіней. Свая падсобная гаспадарка дазваляла наладзіць нядрэннае харчаванне выхаванцаў.

Хлопчыкі і дзяўчынкі прагавіта цягнуліся да вучобы, амаль усе ўдзельнічалі ў мастацкай самадзейнасці. Часта ставілі канцэрты ў вёсках, ездзілі ў Друю і Міёры. У дзіцячым доме наладжваліся сустрэчы з ветэранамі вайны і працы.

Дзеці ў дзіцячых дамах выхоўваліся да 14 гадоў, а потым іх накіроўвалі ў рамесныя вучылішчы, пераважна Ленінграда.

Старэйшыя выхаванцы, якім было 16 гадоў, працаўладкоўваліся.

Дзіцячым дамам удзялялася вялікая ўвага мясцовымі органамі ўлады. Нядрэнна было наладжана медыцынскае абслугоўванне выхаванцаў. У Дзедзінскім дзіцячым доме працавала медсястра і на паўстаўкі ўрач. І гэта ў той час, калі ўрачоў у раёне было толькі 5. Кожны месяц праводзіўся медагляд дзяцей і абслугоўваючага персаналу.

З успамінаў былой выхаванкі Дзедзінскага дзіцячага дома Мальвіны Пятроўны Закрэўскай:

— У Дзедзінскім дзіцячым доме я жыла ў 1948—1949 гг. Трапіла, калі мне ішоў 15-ы год. Расказваць, канешне, няпроста. Адназначна, што час, праведзены ў дзіцячым доме, застаўся ў нашых сэрцах. Людзі, якія працавалі ў гэтых установах, аддавалі часцінку сваіх душ, каб узняць нас на ногі. Памятаю, што было нялёгка з харчаваннем. Тым не менш нам давалі стравы і на першае, і на другое, і на трэцяе. Даволі часта прывозілі яблыкі, цукеркі. Мы імкнуліся добра вучыцца і былі ахвочыя да працы.

Праз год я развіталася з дзіцячым домам, мне дапамаглі ўладкавацца на маслазавод, дзе працавала лабаранткай.

Павянужка (Вянужа) — невялічкая вёсачка, якая размясцілася непадалёку ад шашы Міёры — Полацк бліжэй да Дзісны. Раней тут таксама быў дзіцячы дом.

З успамінаў Зоі Фёдараўны Кодзіс:

— Павянужскі дзіцячы дом стаў дзейнічаць адразу пасля таго, як прагналі немцаў. Чаму выбралі вёску Павянужка? Адказ просты. Тут захавалася мноства панскіх будынкаў, якія не так



Першыя спартыўныя перамогі

Выпуск выхаванцаў Панявужскага дзіцячага дома

складана было прыстасаваць для жытла. Хапала месца для гаспадарчай дзейнасці. У той час гэты населены пункт адносіўся да Дзісенскага раёна. Для дзяцей Павянужка стала добрым месцам, дзе яны маглі акрыяць пасля розных перажыванняў.

Дзеці траплялі ў гэтую ўстанову рознымі шляхамі. Памятаю, аднойчы раніцай ля аднаго з будынкаў знайшлі маленькага хлопчыка. Жаночая псіхалогія такая, што мы нераўнадушна ўспрымаем пакуты дзяцей. А гэта якраз быў той выпадак, калі дарослыя падкінулі дзіця дзяржаўнай установе. Мы былі ўзрушаны. Памылі хлопчыка, пакармілі яго. Здавалася, што ён адразу павесялеў. А потым часта кожная з жанчын хадзіла паглядзець на нашага падкідыша. Хлопчык развіваўся нармальна. Ён адчуў, што ў яго стала шмат сяброў.

У Павянужскім дзіцячым доме выхоўвалася прыкладна 200 дзяцей. Я працавала памочніцай повара. Таму добра ведаю, як кармілі выхаванцаў. Рыхтавалі розныя стравы: варылі баршчы, пяклі катлеты, рабілі пельмені, галубцы, розныя запяканкі. Вельмі дарэчы была падсобная гаспадарка. Гадавалі з дзесятак коней, свіней, столькі ж кароў. Акрамя бульбы, агародніны сеялі авёс для коней, з яго рабілі талакно.

Першым дырэктарам дзіцячага дома быў Мікалай Мікалаевіч Шкялёнак, а завучам з пачатку і да закрыцця — Цімафей Спірыдонавіч Кармалыс.

У в. Пякоціна жыве Раіса Пятроўна Садоўская, якая таксама працавала ў Павянужскім дзіцячым доме. Яна ўспамінае, што дзяцей песцілі, хацелі, каб яны найхутчэй забыліся пра вайну. Няпроста гэта было. Дарослыя ўсімі сіламі імкнуліся замяніць ім бацькоў. Гэта

ў большасці ўдавалася. Дзеці знаходзілі ў дзіцячым доме цеплыню і любоў, шчырыя адносіны.

Жылі дружна. Не было ў нас вялікіх непаразуменняў. Ды і дзеці былі не падобныя на цяперашніх. Ваенная калатнеча зрабіла іх не па гадах дарослымі. І уладкаванае жыццё яны цанілі.

З самага пачатку адкрыцця Павянуж-скага дзіцячага дома і да яго расфарміравання, а гэта было ў 1968 г., бухгалтарам працавала Аляксандра Пятроўна Шкялёнак. Яна ўспамінае:

— Дзеці паступалі ў дзетдом з Дрысенскага, Полацкага і Віцебскага раёнаў. Вучоба і праца ў іх цесна спалучаліся. У дзетдоме дзеці атрымлівалі адукацыю 7 класаў. Хлопчыкі вучыліся сталярнай справе ў майстэрні. Мой муж Уладзімір Лук'янавіч быў інструктарам, дапамагаў асвоіць інструменты, прывіваў навыкі працоўнай дзейнасці. Дзеці самі майстравалі лаўкі, табурэткі, шафы. Рабілі ўсё тое, што было патрэбна па гаспадарчай частцы. Дзяўчынак вучылі шыць. Для гэтага была майстэрня. Самі рамантавалі адзенне, бо былі праблемы з пакупкай новага.

Вельмі ўрачыста адзначалі святы, дні нараджэнняў.

Заўсёды з хваляваннем адпраўлялі сваіх выхаванцаў «у людзі». З нашага дзіцячага дома хлопчыкі паступалі ў вучылішчы Віцебска. Шмат дзяўчынак ехала ў Рыгу на фабрыку «Бальшавічка». Заўсёды перад развітаннем з дзіцячым домам увесь калектыў быў заняты адным клопатам — дастойна адправіць сваіх выхаванцаў у свет. Для сваіх выпускнікоў куплялі новую вопратку, збіралі нейкі харч на дарогу.

Грыгаравіцкі дзіцячы дом размяшчаўся непадалёку ад в. Рыжмонты. Цяпер гэта тэрыторыя Туркоўскага сельсавета.

З успамінаў Ніны Пракопаўны Мялешка, выхавацельніцы Грыгаравіцкага дзіцячага дома:

— У свой час я вучылася ў Магілёве ў педвучылішчы. Закончыўшы яго ў 1950 г., была накіравана ў дзіцячы дом школьнага тыпу, які размяшчаўся ў Грыгаравічах. Пасля вучобы ў мяне было ў нейкай ступені рамантычнае светаадчуванне: хацелася перавярнуць горы, але рэальнасць была суровай. Людзі толькі што выйшлі з вельмі жорсткай вайны. Многага не хапала. Калектыў дарослых не вызначаўся веданнем педагагічнай справы. Гэта былі простыя людзі, якія даступнымі ім сродкамі ратавалі дзяцей ад холаду і голаду, імкнуліся даць пуцёўку ў жыццё.

Мне была даручана старэйшая група. Гэта было пэўным выпрабаваннем, бо ў групе знаходзіліся дзеці, толькі на 2—3 гады маладзейшыя за мяне.

Многія дзеці былі псіхічна надломлены. У сваім кароткім жыцці яны пабачылі шмат гора.

Групы складаліся прыкладна з 40 чалавек, а ўсяго было 120 выхаванцаў. Пабудовы драўляныя, ацяпленне пячное. Газай запраўлялі лямпы, якія выкарыстоўвалі для асвятлення. Сапраўдным святам былі дні, калі прывозілі кіно. А гэта здаралася два разы ў месяц.

Дзіцячы дом трымаўся ў асноўным на падсобнай гаспадарцы. За ім было замацавана 40 га зямлі. Гадавалі кароў, свіней, коней.

Дакладна не ведаю дату адкрыцця дома. Дырэктарам працаваў Піліп Іванавіч Лузгін. Побач з ім была жонка Ніна Фёдараўна. Яны самі з Баравухі. Ануфрый Якаўлевіч Чарноў працаваў бухгалтарам. Цяпер ён жыве ў Луначарску, у Наваполацку — былая медсястра Тамара Андрэеўна Зайцава.

Л. К. Касаты

З успамінаў былой выхаванкі Александроўскага дзіцячага дома Таісіі Ігнатаўны Шкварцавай

Больш за ўсё мне хочацца сказаць пра непагаснае пачуццё ўдзячнасці за падараванае жыццё, за тое, што ў самы цяжкі час 1944 г. знайшоўся добры

астравок выратавання на Міёрскай зямлі — Александроўскі дзіцячы дом. Галоўнае, што было тады ў дарослых, — сардэчнасць, вялізнае жаданне адагрэць і прылашчыць сірот. Арганізатарам дзіцячага дома дапамагалі жыхары раёна. Яны везлі хлеб і муку, бульбу, пасцельную бялізну, адзенне. Цяпер нават уявіць немагчыма, як маглі гэтыя людзі ў цяжкі ваенны час стварыць нават такія мінімальныя ўмовы для сірот.

Вайна рана пазбавіла нас дзяцінства. Мы, хворыя і галодныя, абадраныя, былі шчаслівыя, калі аказаліся пад дахам сярод клапатлівых людзей. Перад гэтым на працягу больш трох гадоў акрамя пажарышчаў і разбурэнняў, багністых балот і непраходных лясоў нічога не бачылі. Запомніўся толькі пастаянны жах, бамбёжкі і абстрэлы, слёзы і кроў, брэх нямецкіх аўчарак і пагражальныя крыкі карнікаў. Нарэшце партызаны паведамілі нам, што фашысты адступаюць на захад і ўжо ніколі не вернуцца, што можна выходзіць з лесу. Нам не верылася ў тое, мы развучыліся радавацца, страх яшчэ быў моцны. І ўсё ж якое гэта было радаснае пачуццё! Словамі перадаць немагчыма. Мы доўга плакалі ад радасці, а потым разышліся па родных мясцінах. Вярнуліся дадому, а хаты няма, усё спалена і разбурана. Людзі радуюцца і плачуць, плануюць новае жыццё, узводзяць зямлянкі на пажарышчах. А што было рабіць нам, сіротам?

Доўга бадзяжнічалі мы з сястрой па спаленай Асвеі, плакалі. Нас прынялі ў сваю зямлянку добрыя людзі. Так перажылі зіму. А вясной 1945 г. вялікая група асвейскіх дзяцей была накіравана ў Александрова. Нас абмылі, пераапранулі ў чыстае, залячылі балячкі. Тады яшчэ не было ўтульнасці і сытасці, але мы былі вельмі рады і гэтаму. Дарослыя праяўлялі ўвагу да ўсіх. Многія нашы

Сустрэча былых выхаванцаў Александроўскага дзіцячага дома

дзеці доўга плакалі і не маглі заснуць. Паступова знікалі страх і слёзы, прыйшлі мірныя сны, стаў заціхаць боль страт.

Дзіцячы дом усіх зблізіў. Старэйшыя шэфствавалі над малодшымі. Мы дапамагалі дарослым ва ўсім. Восенню пайшлі ў школу, вучыліся разам з мясцовымі дзецьмі, сябравалі.

Наш дзіцячы дом падтрымліваў сувязь з вайсковай часцю. Шэфы-воіны былі заўсёды дарагімі гасцямі, мы радаваліся іх прыезду, чакалі. Аднойчы шэфы прывезлі ў падарунак дзецям маленькі акардэон. Сярод дзетдомаўцаў быў Ваня Чаркевіч, які ўмеў крыху іграць на баяне, ён паспяхова асвоіў і акардэон. А калі ад'язджаў на вучобу ў Ленінград, яму ўручылі на памяць гэты падарунак.

Для большасці з нас кароткае знаходжанне ў дзіцячым доме аднавіла сілы і здароўе, было рэабілітацыяй саміх сябе пасля страчаных надзей на жыццё.

Наступіў час развітвацца. Па мабілізацыі «працоўных рэзерваў» першая група старэйшых рабят накіроўвалася на вучобу і працу ў розныя гарады былога Саюза. І зноў слёзы і смутак. Як цяжка было ехаць ад сяброў па школе, па дзіцячаму дому! Шкада было развітвацца з клапатлівымі і добрымі работнікамі дзіцячага дома.

Усіх нас прыстойна апранулі і выпусцілі ў свет, як з роднай хаты. Правадзілі ўсе — дзеці і дарослыя. Гэта было 27 ліпеня 1946 г.

З таго часу прайшло шмат гадоў. Дзіцячага дома даўно няма. Але ў 1971 г. мы зноў сустрэліся на сваёй першай жыццёвай прыстані. Гэта была першая сустрэча праз шмат гадоў з выхавацелямі, настаўнікамі, са знаёмымі жыхарамі вёсак Александрова, Орцы, Павяцце і г. Міёры. Потым з'явілася добрая традыцыя, якую мы ўжо не парушалі: сустракацца кожныя пяць гадоў у першую нядзелю ліпеня — дзень вызвалення рэспублікі ад фашызму. Апошняя, пятая сустрэча адбылася ў 1991 г. Вялізную маральную і практычную дапамогу нам аказвалі раённыя ўлады, грамадскасць, работнікі народнай адукацыі з Міёраў, Павяцця, Александрова, кіраўніцтва сельскага Савета і калгаса «Гігант».

Мы падтрымліваем сувязь адзін з адным, з сябрамі і знаёмымі на Міёршчыне. Сябруюць нашы дзеці.

Нізкі паклон усім жыхарам Міёрскага раёна ад усіх нас — александроўцаў — за разуменне і падтрымку, чуласць і гасціннасць. Хочацца дапоўніць гэтае апавяданне адным эпізодам пра людскую дабрыню.

У в. Міёркі-2 жыве Апалонія Антонаўна Зямец. Гэтая простая і сціплая жанчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны ля школы ў Міёрах падабрала змучаную дзяўчынку і замяніла ёй маці. Фашысты везлі на захад людзей вялікімі эшалонамі, адных у канцлагеры, іншых для медыцынскіх доследаў. Гэтыя эшалоны рухаліся з-пад Ленінграда пад бамбёжкамі. Пасажыраў аднаго такога эшалона выкінулі, не паспеўшы ўсіх знішчыць. Сярод іх былі Лёня і Ліда Лесніковы, потым нашы дзетдомаўцы. Яшчэ напярэдадні гэтай жудаснай дарогі яны перажылі вялікую трагедыю — ад хвароб і голаду памерла маці, а крыху пазней — двое меншых — Люда і Коля. Бацька быў на фронце.

На людскім рынку ля школы ў Міёрах дзяцей разбіралі неахвотна. Лёню ўзяў адзін багаты гаспадар, які неўзабаве паехаў у Польшчу, і хлопчык зноў застаўся без нагляду. Ён доўга бадзяжнічаў, шукаючы ў людзей прытулку, трапляў у рукі фашыстаў, цярпеў здзекі. Ліду ўзяла Апалонія Антонаўна Зямец. У сям'і гэтай беднай жанчыны было шмат праблем і клопатаў. Але яна змагла знайсці патрэбныя словы, праявіла пяшчоту і мацярынскую ласку да адзічэлай і забітай горам дзяўчынкі. Гора і боль паступова сталі заціхаць. Яна прывыкла да новай сям'і, але нечакамі плакала аб сваім браціку. Апалонія Антонаўна ведала пра тое, перажывала

гэтае гора, як сваё, яна гатова была знайсці хлопчыка, каб толькі Ліда не плакала. Але пра Лёню ніхто нічога не ведаў.

Ішоў час, адсвяткавалі Перамогу. Лідзе трэба было вучыцца. А неўзабаве стала вядома, што ў Александрове адкрылі дзіцячы дом. Стала Ліда прасіць сваю другую маці, каб адпусціла яе ў гэты дзіцячы дом, бо была ў яе надзея сустрэцца з братам. Апалонія Антонаўна ўсё зразумела. Пакідала Ліда дом са слязамі і смуткам аб гэтай добрай сям'і. Больш за ўсіх плакала Апалонія Антонаўна.

У дзіцячы дом Ліду прынялі, крыху пазней прывезлі з дзіцячага прыёмніка і Лёню. Так сустрэліся брат і сястра пасля вайны ў Александроўскім дзіцячым доме.

У 1947 г. Ліда разам з іншымі дзяўчынкамі паехала вучыцца і працаваць у Ленінград, пазней паехаў і Лёня. Бацька да гэтага часу быў ужо дома. Ён вярнуўся пасля працяглага лячэння ў шпіталі, бо быў цяжка паранены. Доўга гараваў — няма ні жонкі, ні дзяцей, ні хаты. Калі сустрэў Ліду і Лёню, крыху лягчэй стала франтавіку. На жаль, бацькі даўно няма ў жывых. Ад цяжкай хваробы пяць гадоў назад памёр і Лёня (Аляксей Аляксандравіч Леснікоў).

А дружба Ліды (Лідзіі Аляксандраўны Смірновай) з дарагой Апалоніяй Антонаўнай і яе роднымі працягваецца. Яны часта сустракаюцца. У Лідзіі Аляксандраўны добрая і дружная сям'я. Дзве дачкі Лідзіі Аляксандраўны маюць свае сем'і. Усе яны ведаюць пра нялёгкі лёс сваёй маці, пра яе другую маму, лічаць Апалонію Антонаўну сваёй бабуляй.

Магчыма, ёсць не адна такая добрая сям'я на Міёрскай зямлі, дзе знайшлі прытулак дзеці-сіроты з-пад Ленінграда. Эшалон, які прывезлі фашысты ў Міёры ў 1943 г., быў поўны. Дзяцей разабралі. Як склаліся іх далейшыя лёсы? Сярод гэтых дзяцей была яшчэ адна выхаванка дзіцячага дома. Гэта Валя Сцяпанава (прозвішча да замужжа). Зараз яна жыве ў Расонах. У яе муж і дзве дарослыя дачкі. Прыязджаюць на нашы сустрэчы ўсе. Кожны раз наведваюць сям'ю, якая дала прытулак Валі да дзіцячага дома. На жаль, я пра яе нічога не ведаю...

У МІРНАЙ ПРАЦЫ

50-я гады для Міёршчыны былі пераломнымі ў многіх адносінах. У сельскай гаспадарцы праводзіцца ўзбуйненне калгасаў. Толькі на тэрыторыі былога (даваеннага) Міёрскага раёна са 145 калектыўных гаспадарак да 1951 г. застаюцца 62, у 1956 — 31, а цяпер ва ўзбуйненым за кошт Дзісеншчыны раёне ўсяго 23 калгасы і 3 саўгасы. Сярод лепшых па ўраджайнасці лёну ў 1953 г. у рэспубліцы названы калгас «Перамога» Прасёлкаўскага сельсавета. Ён меў 1514 га ўгоддзяў, у тым ліку 819 га ворыва. Яравыя і азімыя зерневыя займалі 223 га, тэхнічныя — 72, бульба — 41, кармавыя — 27 га. У сельгасарцелі аб'ядналася 300 двароў, 460 працаздольных. Яны даглядалі 254 галавы буйной рагатай жывёлы (90,7 % да запланаванага), 192 коней (80,7 %), 341 авечку (124 %), 191 свінню (108,5 %), 170 птушак (26 %). Дойны статак налічваў 49 кароў (59 %).

Старшынёй калгаса «Перамога» яшчэ пры арганізацыі гаспадаркі быў абраны ў сакавіку 1949 г. Антон Сцяпанавіч Мятла — сын селяніна-серадняка з в. Мётлы.

У выніку чарговага ўзбуйнення калгас «Перамога» атрымаў новую назву — імя Цітова.

Аднак у цэлым па раёне працэс развіцця гаспадаркі адбываўся неадназначна. З аднаго боку — самаадданая праца, з другога — павялічвалася незадаволенасць калгаснікаў мізэрнай аплатай працаднёў, незаконнай абрэзкай прысядзібных участкаў, неабгрунтаваным абкла-

даннем сельгаспадаткамі, абмежаваннямі ў гадоўлі асабістай жывёлы і г. д. Пачынаецца адток рабочай сілы з вёскі. У першую чаргу імкнецца замацавацца ў гарадах моладзь шляхам паступлення ў сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы, уладкавання на неквалiфікаваную працу. Многія вярбуюцца на лесараспрацоўкі Поўначы, Урала, Сібіры.

І ўсё ж, нягледзячы на шматлікія цяжкасці, калгасная вытворчасць паступова набірала тэмпы. На пачатак 1955 г. у 31 гаспадарцы раёна налічвалася 4605 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 1897 кароў, свіней — 4870, авечак — 4686, коней — 5197. За гэты год вытворчасць малака склала 1 329 361 кг, воўны — 5752,2 кг. Пры агульнай пасяўной плошчы 36,9 тыс. га ўраджай жыта складаў 2,8 ц з га, пшаніцы — 5,4, ільнасемя — 1,5, ільнавалакна — 1,4, бульбы — 36,5. Валавы збор зерня дасягнуў 16,3 тыс. ц, бульбы — 45,4 тыс. ц.

8 студзеня 1954 г. пры рэарганізацыі адміністрацыйнага дзялення Дзісенскі і Міёрскі раёны ўвайшлі ў склад Маладзечанскай вобласці.

А ў ранейшых межах у Міёрскім раёне налічвалася 26 калгасаў і 1 саўгас. Яны паставілі дзяржаве 6731,98 ц ялавічыны, 1846,51 ц свініны, 23 557 кг мяса птушкі. У грамадскай жывёлагадоўлі на 1 студзеня 1960 г. налічвалася 13 699 галоў буйной рагатай жывёлы, 11 818 свіней, 881 конь, 3743 авечкі, 9859 птушак. За год ад 5256 кароў атрымана 3 317 806 кг малака, сярэдні надой на адну фуражную карову быў 1670 кг.

Паляводства гаспадарак забяспечыла ў 1960 г. вытворчасць 3523 ц ільнавалакна, 3861 ц ільнасемя, 21 390 ц бульбы.

Улічваючы, што ў раёне было развіта льнаводства, у Міёрах пабудаваны льнозавод, які прыступіў да перапрацоўкі трасты 1 студзеня 1956 г. Расшыраецца і выносіцца за межы райцэнтра маслазавод. Райпрамкамбінат выпусціў за гэты ж год прадукцыі на 2938,6 тыс. руб., райхарчкамбінат — на 1547 тыс. Расшыралі вытворчасць арцелі «Праца» і «Нарыхтоўшчык». У Дзісне дзейнічалі прамкамбінат, маслазавод, лясгас. Увогуле за 1960 г. прамысловасць выпусціла прадукцыі на 28 432,5 тыс. руб.

Развівалася тэлефонная сувязь. У 1957 г. былі ўстаноўлены рэпрадуктары ў 1200 дамах.

У 1955 г. у раёне дзейнічалі раённая, гарадская, дзве сельскія бальніцы, 6 фельчарска-акушэрскіх пунктаў. У іх працавала 14 урачоў, 86 работнікаў сярэдняга медыцынскага персаналу. За пяцігодку колькасць урачоў узрасла да 22, сярэдняга медыцынскага персаналу — да 198. ФАПаў было ўжо 17, 4 участковыя, гарадская і раённая бальніцы з агульнай колькасцю ложкаў на 250 чалавек.

У гэты перыяд не толькі ўмацоўваецца матэрыяльная база і расшыраецца сетка агульнаадукацыйных школ. Вырашаюцца пытанні паляпшэння ведаў вучняў, навучання рабочай і сельскай моладзі. У 1955 г. у раёне адкрыта шэсць сямігадовых школ сельскай моладзі і адна — рабочай. Наведвала іх 111 чалавек. А ўсяго дзейнічала 71 школа: 6 сярэдніх, 21 сямігадовая, 44 пачатковыя. Яны забяспечвалі навучанне 5943 дзяцей. За пяцігодку колькасць школ павялічваецца да 90, дзе працавалі 684 настаўнікі (226 мелі вышэйшую адукацыю) і вучыліся 6794 вучні.

20 студзеня 1960 г. ліквідавана Маладзечанская вобласць, Міёрскі раён увайшоў у склад Віцебскай вобласці. Можна сказаць, што пачаўся сучасны этап яго развіцця. Сельская гаспадарка ўжо была прадстаўлена буйнымі гаспадаркамі. Так, у 1968 г. у раёне былі 33 калгасы і 2 саўгасы, у сярэднім на гаспадарку прыходзіўся 2441 га сельгасугоддзяў, у тым ліку 1678 га ворыва. Значна перавышалі гэтыя памеры саўгас «Міёрскі», калгасы імя Чапаева, «Баявы партызан», «Гігант». Побач існавалі больш дробныя калгасы — «За

ўладу Саветаў», «Цвеціна», імя Цітова, «Шлях да камунізму». У будучым усе яны ўзбуйняцца або ўвойдуць у склад іншых гаспадарак, усе павялічаць аб'ёмы вытворчасці. З 1958 да 1968 г. калгас імя Цітова пад кіраўніцтвам А. С. Мятлы забяспечыў рост па ўсіх паказчыках у 1,5—3 разы. За гэты ж час вытворчасць малака ўзрасла ў 5,4 раза, а мяса — у 6 разоў у калгасе «Маладая гвардыя». Яго старшыня Пётр Пятровіч Кандрашоў стаў першым Героем Сацыялістычнай Працы ў раёне, а гаспадарка ў 1971 г. адзначана ордэнам «Знак Пашаны». У 8,8 раза за дзесяцігоддзе павялічыў грашовы даход калгас імя Чапаева, якім працяглы час кіраваў былы абаронца Брэсцкай крэпасці Акім Аляксеевіч Чувікаў. Званнем Героя Сацыялістычнай Працы адзначана дзейнасць на пасту кіраўніка калгаса «Цвеціна», а затым аб'яднанага імя Цітова Івана Ерамеевіча Анісімава.

Поспех даваўся не проста. Вось лістоўка, падрыхтаваная аддзелам прапаганды і агітацыі райкама КПБ у сакавіку 1967 г. пра брыгадзіра калгаса «Гігант» Лідзію Андрэеўну Грэцкую:

«1962 год. У 8-й брыгадзе калгаса «Гігант» у гэты год змаглі атрымаць з кожнага гектара зерневых 4,6 ц, бульбы — 73 ц, ільнасемя і льновалакна па 1,4 ц. Брыгада знаходзілася ў запушчаным стане. Нізкай была працоўная дысцыпліна. Зразумела, што ў такіх умовах брыгада не магла рухацца наперад. Лідзія Андрэеўна Грэцкая працавала ў той час звеннявой па льну ў гэтай брыгадзе. Сэрца і розум сумленнай працаўніцы не маглі мірыцца з такім становішчам. Жанчына папрасіла праўленне калгаса даверыць ёй брыгаду. З першых дзён Лідзія Андрэеўна добрасумленна ўзялася за працу на пасадзе брыгадзіра.

Лідзія Андрэеўна ўгаварыла застацца ў сваёй вёсцы Мечыслава Бабковіча, які пасля васьмігодкі рашыў падацца ў Верхнядзвінск. Ведаючы яго любоў да коней, замацавала за ім самага лепшага каня. Пасля размовы з брыгадзірам пайшлі працаваць на ферму даяркамі выпускніцы Рэгіна Рублеўская і Сцефаніда Матэленак.

Умее брыгадзір працаваць з людзьмі. Аднаго пераканае, другога прысароміць, трэцяму загадае. Да кожнага знойдзе ключык. І брыгада пачала паспяхова спраўляцца з любой работай, выходзіць у перадавыя. Своечасова пачалі сеяць, больш уносіць угнаенняў, своечасова і без страт убіраць ураджай. І ўраджай павысіўся. У мінулым годзе кожны гектар, адведзены пад жыта, даў па 16,6 ц зерня, бульбы — па 250 ц, ільнасемя і льновалакна — па 6,1 ц з 1 га. За поспехі, дасягнутыя ў павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак жыта, пшаніцы і іншых зерневых і кармавых культур, Лідзія Андрэеўна Грэцкая ў 1966 г. узнагароджана ордэнам Леніна.

Горкай была маладосць Лідзіі Андрэеўны. Яе бацька быў беззямельным селянінам. Сям'я пераязджала з месца на месца ў пошуках работы, прытулку і кавалка хлеба.

Новае жыццё прынесла савецкая ўлада. Маладая сялянка едзе ў Мінск на юбілейную сесію Вярхоўнага Савета БССР, прысвечаную святу аб'яднання Усходняй і Заходняй Беларусі. Упершыню едзе па чыгунцы ў беларускую сталіцу. Яшчэ большае ўражанне аказвае Масква, куды Лідзія Андрэеўна прыязджае потым як дэпутат Вярхоўнага Савета СССР. Лідзія Андрэеўна ўзначальвае калгас, працуе старшынёй сельскага Савета. І паўсюдна карыстаецца любоўю і павагай. За актыўны ўдзел у гаспадарчым і культурным будаўніцтве ў 1961 г. яна была ўзнагароджана Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

У брыгадзе, якой кіруе Лідзія Андрэеўна, 330 га ворыўнай зямлі. Сваю галоўную задачу яна бачыць у атрыманні максімальных даходаў ад кожнага кавалачка ўзаранай зямлі. Вырашчаны ўраджай не задавальняе Лідзію Андрэеўну. Абавязацельства брыгады на юбілейны год — атрымаць больш 18 ц зерневых

з кожнага гектара, звыш 260 ц бульбы, па 6,5 ц ільнасемя і льновалакна. Сярод калгаснікаў разгарнулася спаборніцтва за ўзорную падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Для сяўбы створаны паўнацэнныя насенныя фонды, якія даведзены да кандыцый. Па стану на 1 сакавіка вывезена на кожны гектар яравой сяўбы па 10 т арганічных угнаенняў. Сабрана больш 15 т попелу, нарыхтавана 120 т аргана-мінеральных сумесяў.

Няма сумнення, што да 50-годдзя савецкай улады Лідзія Андрэеўна Грэцкая прыйдзе з новымі, больш высокімі паказчыкамі. Такі яе партыйны абавязак перад людзьмі, перад дзяржавай».

Так, гэта тыповая агітка з тых, на якіх выхоўвалася цэлае пакаленне. Але ж яшчэ лёс чалавека, канкрэтная вытворчая сітуацыя, вырашэнне гаспадарчых задач. Тым больш што ў тым жа «Гіганце» брыгадзір брыгады № 9 Рыгор Пятровіч Муха таксама ў гэты час забяспечваў ўраджай зерневых у 21,3 ц з 74 га.

У жывёлагадоўлі даяркі раёна раўняліся на В. П. Шарковіч з «Маладой гвардыі», якая ў 1964 г. надаіла ад кожнай каровы сваёй групы па 4703 кг малака. Птушніца з «Парыжскай камуны» В. А. Вайсковіч атрымлівала ад кожнай з 500 курэй па 133 яйкі.

На дапамогу працаўнікам вёскі прыходзіць тэхніка, паляпшаюцца ўмовы працы, разгортваецца вытворчае, жыллёвае і дарожнае будаўніцтва. Напрыклад, у 1978 г. на палях раёна працавала 1000 трактароў, 315 камбайнаў, 443 аўтамабілі, шмат розных сельгасмашын. 10 гаспадарак з 29 атрымалі ўраджай па 20 і больш цэнтнераў зерня з гектара, а ў «Парыжскай камуне» забяспечаны рэкордны намалот у 32,8 ц з кожнага гектара. На жніве вызначаліся на працягу некалькіх гадоў Станіслаў Антонавіч Рынкевіч з «Парыжскай камуны», Павел Якаўлевіч Ісаковіч з калгаса імя Гастэлы, Андрэй Іванавіч Кашкур з «Гіганта». Пераможцамі раённага спаборніцтва выходзілі даяркі Часлава Казіміраўна Мікель з «Маладой гвардыі» і Вольга Андрэеўна Мірончык з калгаса імя Цітова, кілаграмовых штодзённых прываг дабівалася цялятніца

Дарожныя работы ў в. Паташня

Ала Фадзееўна Чэрап са «Сцяга перамогі», лепшай свінаркай стала Валянціна Іосіфаўна Мацук з «Запаветаў Леніна», лепшымі вадзіцелямі — Іосіф Генрыхавіч Сцефановіч з «Гіганта» і Кірыл Васільевіч Быкоўскі з «Перамогі».

З 1965 да 1978 г. у развіццё сельскай гаспадаркі раёна ўкладзена 67,4 млн руб. Гэтыя сродкі выкарыстаны на ўзвядзенне памяшканняў на 1400 галоў буйной рагатай жывёлы, 14 600 свіней, а яшчэ 52 зернетакоў, 25 майстэрняў, 21 ворахатака і іншых аб'ектаў. Трактароў стала больш у 2,3 раза, зерневых камбайнаў — у 2,4, ільнаўборачных — у 16 разоў. Пабудавана і адрамантавана 230 км дарог, у тым ліку 60 км заасфальтавана, знесена з хутароў 1056 дамоў, у вёсках пабудавана 15 000 квадратных метраў жылля, школ на 2868 месц, клубаў на 2160 месц, бальніц на 180 ложкаў і інш. Закончана электрыфікацыя населеных пунктаў раёна. У 1973 г. асфальт звязаў раён са сталіцай, у 1978 г. — з абласным цэнтрам.

За гэты ж час падвоіліся аб'ёмы прамысловай вытворчасці. Ствараецца раённы камбінат бытавога абслугоўвання, сетка атэлье якога ахапіла цэнтральныя сядзібы ўсіх гаспадарак. У 1965 г. уводзіцца ў эксплуатацыю мясакамбінат у Міёрах. У кансервавы завод пераўтвараецца прамкамбінат, а на яго базе ў канцы 1971 г. пабудаваны хлебазавод. Адначасова ўводзіцца ў эксплуатацыю камбікормавы завод. У Дзісне з прамкамбіната вылучаецца плодаагародніны завод, які пазней становіцца кансервавым. Вялікую практычную дапамогу працаўнікам вёскі аказваюць спецыялізаваныя падраздзяленні раённых аддзяленняў «Сельгастэхніка» і «Сельгасхімія», Райсельэнерга, новая база якога паўстала на ўскрайку Міёраў у 1978 г.

Адначасова з вытворчым будаўніцтвам у Міёрах значная ўвага надаецца ўзвядзенню жылля. 15 студзеня 1972 г. райцэнтру прысвойваецца статус горада. У гэтых адносінах менш пашанцавала больш старажытнай, але менш прамыслова развітай Дзісне. Пэўнае ажыўленне тут адбылося з будаўніцтвам на тэрыторыі раёна і ўвядзеннем у эксплуатацыю нафтапрадуктаправода Наваполацк — Вентспілс, а затым і ЛПДС «Дзісна». І ўсё ж Дзісна яшчэ дзесяцігоддзі не магла аднавіць разбуранае вайной. Яна стала своеасаблівай Меккай для кінематаграфістаў, якія здымалі тут кінастужкі «Чорная бяроза», «Дзяржаўная граніца» і іншыя фільмы.

Грамадскае жыццё раёна апошнія дзесяцігоддзі было даволі аднастайным, але не менш напружаным. Да кожнай пяцігодкі, юбілею, з'езда, пленума і г. д. распрацоўваліся абавязацельствы, праводзіліся спаборніцтвы, падводзіліся вынікі. Вакол гэтага праводзілася амаль уся партыйная, камсамольская і прафсаюзная работа. Дзейнічалі агіткалектывы з агітатарамі і палітінфарматарамі, сістэма палітасветы з мноствам палітшкол, курсаў і семінараў. Усё было фармалізавана, абрасло справаздачамі, паперамі, сходамі, актывамі. Але несла і пэўны арганізацыйны, выхаваўчы зарад, вызначала пэўную перспектыву, хоць павольны, але няўхільны рост аб'ёмаў, дабрабыту. Адным словам, забяспечвала стабільнасць, якая ўзарвалася ў 1991 г. Дарэчы, гэты год па аб'ёмных паказчыках стаў для раёна вяршыняй, арыенцірам на працяглы перыяд. У поспех укладзена агульная праца работнікаў усіх галін народнай гаспадаркі.

У спажывецкай кааперацыі ў 1963—1970 гг. уводзяцца квасільна-засолачны пункт на 100 т і халадзільнік на 120 т у нарыхтоўчай канторы, халадзільнік у райцэнтры на 100 т, склад аптова-гандлёвай базы, універмаг у Міёрах, магазіны ў Павяцці, Кухцінцах, Наўгародах, Акунёве, Чапуках, Дворным Сяле, Ідолце, Волкаўшчыне, кніжны магазін у Язне, сталовыя ў Новым Пагосце і Ідолце. Усяго ў раёне дзейнічала 117 прадпрыемстваў гандлю і 43 — грамадскага харчавання. У 1971 г. Міёрскае, Дзісенскае, Язненскае, Новапа-

госцкае сельпо і Міёрскае гарпо аб'ядноўвалі 26 188 пайшчыкаў. Паступова колькасць спажывецкіх таварыстваў памяншаецца, райспажыўсаюз у 1995 г. пераўтвараецца ў райпа, а яго падраздзяленнямі становяцца аб'яднанні — рознічна-аптовае і гандлёва-прамысловае. Кааператары маюць уласную аўтагаспадарку, кандытарскі цэх, жывёлазабойны пункт з каўбасным цэхам, іншыя вытворчыя падраздзяленні. На ўсіх цэнтральных сядзібах гаспадарак ёсць магазіны. Агульная колькасць гандлёвых устаноў склала ў 1997 г. 97, з іх 60 дзейнічае на вёсцы. Гадавы рознічны тавараабарот дасягнуў 123 млрд руб. Патрэбы мясцовага насельніцтва ў значнай ступені забяспечваюцца за кошт уласнай прадукцыі, у першую чаргу кандытарскіх вырабаў, хлеба, штучнага мёду, макаронаў і інш.

Асабліва значныя сродкі адпускаліся на культурнае будаўніцтва. У 1962 г. быў узведзены раённы Дом культуры, у 1965 г. — раённая і дзіцячая бібліятэкі. Пабудаваны Камянпольскі (1966), Даўгінаўскі (1967) і Слабадскі (1964) сельскія клубы, Язненскі СДК (1965), Завуццеўскі Дом культуры, Дрыгуцкая і Новакрукаўская сельскія бібліятэкі. У 1967/68 навучальным годзе ў райцэнтры адкрылася дзіцячая музычная школа. Значна пазней яна стане школай мастацтваў, а музычныя школы з'явяцца ў Павяцці, Дзісне, Язне.

У 1967 г. адбыўся першы выпуск Міёрскай СШ № 2 на 536 месц, пачала працаваць Перабродская СШ на 320 месц, пабудаваны Цвецінская сярэдняя школа і Маляўская васьмігодка на 192 месцы кожная. Потым разгортваецца будаўніцтва школ у Дворным Сяле, Туркове, Павяцці, Дзісне, Мікалаёве, Сіцькове, Волкаўшчыне, Слабадзе, Даўгінаве, Язне, Завуцці, Новым Пагосце, СШ № 3 у Міёрах. Многія школы пашыраюцца, у некаторых узводзяцца спартыўныя залы.

Можна параўнаць некалькі лічбаў. У 1967 г. у раёне налічвалася 12 сярэдніх, 28 васьмігадовых і 55 пачатковых школ, школа-інтэрнат — усё на 7723 вучні. У сістэме адукацыі працавала 668 настаўнікаў. Яшчэ дзейнічалі 2 Дамы піянераў і 5 дзіцячых садкоў. Праз 30 гадоў сітуацыя крыху памянялася. У 1997 г. у сістэме адукацыі было 35 агульнаадукацыйных школ, у тым ліку 16 сярэдніх, 10 базавых і 9 пачатковых, школа-інтэрнат, дзіцячая спартыўная школа, Дом піянераў, Маляўскі вучэбна-вытворчы камбінат і 26 дашкольных дзіцячых устаноў. У школах і садках навучалася і выхоўвалася адпаведна 4720 і 712 дзяцей. У 8 школах дзейнічалі групы падоўжанага дня для 301 вучня, у трох школах захаваліся інтэрнаты. У школах раёна працуе 591 настаўнік, з іх 85,4 % маюць вышэйшую адукацыю, у садках і яслях — 106 педагагічных работнікаў.

Пасля 1960 г. за кошт дзяржаўных капітальных укладанняў пабудавана раённая паліклініка, 19 ФАПаў, бальніцы расшыраны да 290 ложкаў. У 1968 г. у сістэме аховы здароўя працавалі 32 урачы і 224 сярэднія медыцынскія работнікі. Па ініцыятыве калгасаў у пачатку 70-х гадоў на беразе возера ў Міёрах вырас новы трохпавярховы корпус бальніцы на 1100 ложкаў з комплексам дыягнастычных кабінетаў. Але хутка і гэтага стала недастаткова. У пачатку 90-х гадоў у райцэнтры распачата будаўніцтва новага бальнічнага комплексу, у Дзісне — новай паліклінікі.

Цяпер у сістэме аховы здароўя дзейнічаюць цэнтральная раённая бальніца на 260 ложкаў, раённая бальніца ў Дзісне на 95 ложкаў, участковыя бальніцы ў Язне і Новым Пагосце на 25 ложкаў кожная, аказваюць медыцынскую дапамогу насельніцтву ўрачэбная амбулаторыя ў Даўгінаве і 33 фельчарска-акушэрскія пункты. У сістэме аховы здароўя занята 640 чалавек, у тым ліку 60 урачоў і 310 сярэдніх медыцынскіх работнікаў. Кваліфікацыйныя катэгорыі прысвоены 29 урачам і 79 сярэднім медработнікам.

Сучасная сістэма бытавога абслугоўвання склалася ў 1965 г. А потым паступова ўступаюць у строй майстэрні па рамонту абутку, шыццю адзення, рамонту і вырабу мэблі, дзейнічалі 4 фотастудыі, 3 цырульні, 4 лазні. Спачатку было 38 такіх майстэрняў, у тым ліку 18 у сельскай мясцовасці, потым адпаведна 50 і 30, 54 і 34. Пазней вясковыя майстэрні пераўтвараюцца ў комплексна-прыёмныя пункты. У 1978 г. будаўнікі ўвялі ў строй Дом быту ў райцэнтры, а ў вёсках аказанне бытавых паслуг канцэнтруецца на цэнтральных сядзібах гаспадарак, у буйнейшых населеных пунктах раёна. Ствараюцца самастойныя службы па рамонту тэлевізараў і радыёапаратуры, складанай бытавой тэхнікі.

У 1967 г. 90 % гужавых паштовых трактаў пераведзена на абслугоўванне аўтатранспартам. На гэтыя мэты былі выдзелены 4 машыны. Жыхары раёна сталі атрымліваць цэнтральныя і рэспубліканскія газеты ў дзень іх выхаду. Да гэтага часу большасць аддзяленняў сувязі пераведзена ў добраўпарадкаваныя будынкі. Узведзены яны ў Дрыгучах, Лявонпалі, Ідолце, Язне. У 1981 г. новы будынак атрымалі сувязісты райцэнтра. А ўвогуле насельніцтва раёна абслугоўвае 30 аддзяленняў сувязі, у якіх занята 180 работнікаў.

Пасля рэарганізацыі сувязі ў раёне з'явіўся раённы вузел электрычнай сувязі. 60 работнікаў гэтай установы абслугоўвае 2 гарадскія і 31 сельскую аўтаматычныя тэлефонныя станцыі агульнай магутнасцю 6000 тэлефонных нумароў, больш 600 км паветраных і 2300 км кабельных ліній, 8,5 тыс. радыёкропак.

У канцы 80-х гадоў раённая будаўнічая праграма штогод перавыконвалася ў 2—3 разы. Справа ў тым, што шмат жылля і аб'ектаў сацкультбыту ўзводзілі гаспадаркі. Так, па 8—10 кватэр штогод засялялі калгасы імя Цітова, «Кастрычніцкая рэвалюцыя», «Парыжская камуна», імкнуліся не адставаць ад іх «Гігант», «1-е Мая», імя Гастэлы, «Маладая гвардыя», «Перамога». У райцэнтры дала цяпло кацельня «Паўночная», прыняла пасажыраў аўтастанцыя, адзін за другім здаваліся ў эксплуатацыю шматкватэрныя дамы.

У вёсцы рэальнасцю стала комплексная забудова. Напрыклад, на цэнтральнай сядзібе калгаса імя Дзяржынскага ў в. Туркова побач з новымі вуліцамі месцяцца новы клуб, школа, магазін, комплексна-прыёмны пункт камбіната бытавога абслугоўвання, фельчарска-акушэрскі пункт, непадалёку — сталовая, дзіцячы сад, агароднінасховішча. Прыкладна такія аб'екты ў Мікалаёве — цэнтры калгаса «Запаветы Леніна», Ідолце — цэнтры саўгаса «Міёрскі» і шэрагу іншых гаспадарак. Новыя будынкі школ атрымалі дзеці хлебаробаў калгасаў імя Гастэлы, «Маладая гвардыя». З'явіліся новыя Дамы культуры ў калгасах «Перамога», «Баявы партызан».

Калі раённы камбінат бытавога абслугоўвання не мог аказаць пэўныя паслугі насельніцтву вёсак, гэта сталі рабіць калгасныя кааператывы. Ініцыятарам іх стварэння выступіў калгас імя Кірава. За невялікую цану пенсіянеры атрымалі магчымасць апрацаваць агарод, пасадзіць і выкапаць бульбу, нарыхтаваць кармы.

Новае аблічча вёсак забяспечвае добраўпарадкаванне з асфальтаваннем. Толькі за 1989 г. цвёрдае пакрыццё атрымалі 122 км вуліц і дарог, пераважна сельскіх. Гэта больш, чым за пяць папярэдніх гадоў.

Апошнія гады асабліва шмат новага прынеслі ў вытворчасць. Ужо бачна, што калектыўныя гаспадаркі застануцца асноўнымі вытворцамі сельгаспрадуктаў. Не проста пераўзысці вытворчасць малака ў 1000 ц на 100 га сельгасугоддзяў, як зусім нядаўна ў «Кастрычніцкай рэвалюцыі», атрымаць больш 40 ц зерневых з кожнага гектара, як у «Парыжскай камуне». Але з'явіліся калектывы інтэнсіўнай працы, арэнд-

ныя калектывы, фермерскія гаспадаркі. За некалькі гадоў у раёне замацавалася 36 сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак (9 не вытрымалі выпрабаванняў). За імі замацаваны 574 га сельгасугоддзяў, у тым ліку 351 га занялі пасевы.

Добрых вынікаў на працягу шэрагу гадоў дабіваюцца фермеры Мікалай Іларыёнавіч Лагунёнак з Новага Пагоста, Генадзь Мікалаевіч Казак з Язненскага сельсавета, Ігнат Мяркур'евіч Каралькоў, Сяргей Мікалаевіч Грэцкі, Уладзімір Антонавіч Жабёнак і інш. Але тэхнічная аснашчанасць іх гаспадарак яшчэ недастатковая, тут мала статка.

У 80-я — пачатку 90-х гадоў у раёне пачалося стварэнне кааператываў, малых прадпрыемстваў, таварыстваў з абмежаванай адказнасцю, нават прыватных фірм. Выжылі з іх толькі тыя, што паспелі наладзіць вытворчасць ці заняліся гандлем. Так, кааператыў «Інком» пры будаўнічай арганізацыі МПМК-55 меў тры экскаватары і два бульдозеры. Ён зрабіў каналізацыю ў калгасе імя Цітова, на мясакамбінаце, кацельні «Паўночная», водаправод у калгасах імя Кірава, «Баявы партызан», «Шлях да камунізму», «Язна». З пагаршэннем фінансавай сітуацыі ў гаспадарках гэты кааператыў распаўся.

Падобны лёс, і нават менш аптымістычны, у кааператываў «Дзісна», «Мерыца», «Вясёлка», «Дзвіна», «Сузор'е», «Прамень», таварыстве з абмежаванай адказнасцю «Аграсервіс». Але змаглі выжыць вытворча-камерцыйнае прадпрыемства «Натхненне», малыя прадпрыемствы «Шанц», «Кісларод», «Дзісна-аўтасервіс», «Глобус», шмат жадаючых займацца прадпрымальніцтвам.

Л. А. Матэленак

Падзеі, лічбы, факты

1944 г., 10 ліпеня. Першае пасяджэнне Міёрскага райкама КП(б)Б пасля вызвалення раёна.

1944 г., 20 верасня. Дзісенскі і Міёрскі раёны ўключаны ў склад Полацкай вобласці.

1944 г., кастрычнік. У вёсцы Ідолта ўтворана Міёрская МТС. Адноўлены калгасы «Верны шлях» Барсукоўскага сельсавета, імя Кірава Валькаўскага, «17-е Верасня» Лявонпальскага, імя Жданава Барсукоўскага, імя Леніна і «Праўда» — Лявонаўскага сельсаветаў.

1944 г. У в. Язна пачала дзейнічаць Дзісенская МТС.

1944 г., 5 снежня. Адноўлены выпуск раённай газеты «Бальшавіцкая трыбуна».

1946 г. Адкрыта раённая бальніца на 30 ложкаў.

1947 г., 16 мая. Адкрыўся дзіцячы садок у Міёрах.

1948—1950 гг. Перыяд масавай калектывізацыі.

1949 г. У вёсцы Клётаў Двор ствараецца 2-я Міёрская МТС.

1950 г. У раёне ў асноўным ліквідавана непісьменнасць сярод дарослага насельніцтва.

1951—1956 гг. Перыяд узбуйнення калгасаў, са 145 застаўся 31.

1954 г., 8 студзеня. Ліквідавана Полацкая вобласць. Дзісенскі і Міёрскі раёны ўключаны ў склад Маладзечанскай вобласці.

1956 г., 1 студзеня. Пачаў перапрацоўку траста Міёрскі льнозавод.

1956 г.	Пачатак электрыфікацыі сельскай гаспадаркі раёна.
1957 г.	Міёры атрымалі статус гарадскога пасёлка.
1959 г.	На брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан на плошчы Загінуўшых барацьбітоў у райцэнтры замест стэлы пастаўлены помнік — скульптура воіна. У Дзісне на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан на плошчы Леніна пастаўлены помнік — скульптура двух воінаў.
1959 г.	Ліквідаваны Дзісенскі раён.
1960 г., 10 студзеня.	Ліквідавана Маладзечанская вобласць. Міёрскі раён уключаны ў склад Віцебскай вобласці.
1962 г.	Здадзены ў эксплуатацыю Міёрскі РДК.
1963 г.	Статус помніка прыроды рэспубліканскага значэння прысвоены Чыстай дубраве ля в. Язна.
1965 г.	Уведзены ў дзеянне мясакамбінат у Міёрах.
1965 г., лістапад.	На аснове раённага прамкамбіната ўтвараецца камбінат бытавога абслугоўвання.
1967 г.	У Міёрах пачала дзейнічаць музычная школа.
1968 г.	Утварэнне гідралагічнага заказніка «Ельня».
1969 г.	Утвораны аўтапарк у Міёрах на базе філіяла Браслаўскага аўтапарка.
1969 г.	У Міёрах пабудаваны спартыўны комплекс.
1970 г.	У Міёрах на паўвостраве насыпаны Курган Славы ў гонар 25-годдзя вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 50-годдзя БССР.
1971 г.	Калгас «Маладая гвардыя» ўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».
1971 г., снежань.	У Міёрах пачаў дзейнічаць камбікормавы завод.
1971 г., снежань.	У Міёрах пабудаваны хлебазавод.
1972 г., 15 студзеня.	Міёрам прысвоены статус горада.
1972 г.	Пачата эксплуатацыя нафтапрадуктаправода Наваполацк — Вентспілс, які прайшоў праз раён.
1973 г.	Заасфальтавана дарога на Новы Пагост, асфальт злучыў Міёры са сталіцай.
1975 г.	Адкрыццё ў Міёрах стэлы-помніка ў гонар воінаў і партызан, якія вызвалялі раён ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
1976—1978 гг.	Рэканструкцыя дарогі на Полацк. У выніку асфальт злучыў Міёры з абласным цэнтрам.
1978 г.	Завяршэнне электрыфікацыі населеных пунктаў раёна. Уведзены ў дзеянне Дом быту ў Міёрах.
1991 г., жнівень.	Спыніла дзейнасць раённая партыйная арганізацыя КПБ.
1992 г.	Пачата будаўніцтва новага бальнічнага комплексу ў Міёрах.

ВЫЗНАЧЫЛІСЯ ПРАЦАЙ

Героі Сацыялістычнай Працы

АНІСІМАЎ Іван Ерамеевіч. Нарадзіўся ў 1920 г. у в. Б. Сялец Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1945—1949 гг. знаходзіўся на гаспадарчай рабоце, з 1949 да 1959 г. — інструктар Крэцінгскага укома Кампартыі Літвы, сакратар Дзісенскага райкама КПБ. З 1959 г. — старшыня калгаса «Цвеціна», з 1970 г. — аб'яднанага калгаса імя Цітова Міёрскага раёна.

Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1976 г.

І. Е. Анісімаў

П. П. Кандрашоў

У. Ф. Крышталевіч

Я. А. Томка

ЗІМНІК Леакадзія Баляславаўна. Нарадзілася ў 1936 г. у в. Чарняўцы Дзісенскага павета Віленскага ваяводства.

С 1950 г. — калгасніца сельгасарцелі «Гігант», затым звеннявая льнаводчага звяна калгаса імя Чапаева Міёрскага раёна. Зараз жыве і працуе ў Віцебску. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1971—1975 гг.

Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1971 г.

КАНДРАШОЎ Пётр Пятровіч. Нарадзіўся ў 1924 г. у в. Дзямідавічы Клімавіцкага павета Гомельскай губерні.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1959 г. працаваў старшынёй ордэна «Знак Пашаны» калгаса «Маладая гвардыя» Міёрскага раёна. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай рэвалюцыі, Чырвонай Зоркі, баявой Славы III ступені, медалямі.

Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1966 г.

КРЫШТАЛЕВІЧ Ульяна Феакцістаўна. Нарадзілася 27.12.1923 г. у в. Зачарэўе Міёрскага раёна. Удзельніца партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З 1944 г. на камсамольскай, савецкай, партыйнай і гаспадарчай рабоце ў Міёрскім, Браслаўскім і Плісскім р-нах. З 1974 г. намеснік міністра сацыяльнага забеспячэння БССР. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1959—1967 гг., Вярхоўнага Савета СССР у 1970—1974 гг. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена за поспехі ў сацыялістычным спаборніцтве.

Герой Савецкага Саюза

ТОМКА Ягор Андрэевіч. Нарадзіўся ў 1935 г. у в. Лявонаўцы Перабродскага сельсавета ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння Міёрскай СШ паступіў у Вышэйшае ваенна-марское вучылішча падводнага плавання ў Архангельску. Служыў на Поўначы, з 30 гадоў мар-

ской службы 8 гадоў знаходзіўся пад вадой. Завочна закончыў ваенна-марскую акадэмію імя Жукава ў Ленінградзе. Удзельнічаў у групавым паходзе падводных лодак пад ільдамі Паўночнага полюса ў якасці камандзіра атамнай субмарыны, у час якога дзякуючы асабістым ведам, мужнасці і вопыту выратаваў падлодку, якая трапіла ў аварыю, і яе экіпаж. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 4 лістапада 1978 г. Віцэ-адмірал. Узначальваў Ленінградскае вышэйшае ваенна-марское вучылішча падводнага плавання імя Ленінскага камсамола. У адстаўцы, працуе ў праектным інстытуце. Жыве ў С.-Пецярбургу.

Р. Ц. Васілевіч

Ф. А. Камарова

Заслужаныя настаўнікі школ БССР

ВАСІЛЕВІЧ Роза Ціханаўна. Нарадзілася 6.12.1931 г. ва Уфе. З верасня 1946 г. жыве ў Міёрах. Выпускніца першага выпуску Міёрскай СШ у 1950 г. З кастрычніка 1952 г. пачала працаваць настаўніцай Шалцінаўскай сямігодкі, у 1955 г. закончыла Віцебскі педагагічны інстытут па спецыяльнасці выкладчыка гісторыі. Неўзабаве яе прызначылі дырэктарам Букаўскай сямігадовай школы. З верасня 1957 г. Роза Ціханаўна 24 гады працавала інспектарам раённага аддзела народнай адукацыі. У 1972 г. ёй прысвоена званне «Заслужаны настаўнік школ БССР». Яе праца адзначана ордэнам «Знак Пашаны», юбілейным медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна».

З 1981 да 1987 г. працавала завучам Міёрскай СШ № 3, затым настаўніцай да 1994 г. Зараз на пенсіі.

ДЗЯТЛАВА Марыя Пятроўна. Нарадзілася ў 1921 г. у в. Дзятлава. Увесь блакадны час вучылася ў Ленінградскім інстытуце замежных моў. Потым была эвакуіравана ў Казахстан, дзе працавала 15 гадоў у шпіталі. У 1960 г. прыехала ў Міёры, выкладала нямецкую мову спачатку ў сярэдняй школе № 1, потым у СШ № 2. Яе выхаванцы атрымлівалі трывалыя веды, а яшчэ — урокі дабрыні, спагады, актыўнасці. І сама М. П. Дзятлава — ініцыятар многіх пачынанняў у школах райцэнтра. Званне «Заслужаны настаўнік школ БССР» прысвоена ў 1971 г. З 1974 г. жыве ў Ленінградзе.

КАМАРОВА Фаіна Аляксандраўна. Нарадзілася ў 1929 г. у в. Дубавое Шаркоўшчынскага раёна ў сялянскай сям'і. У 1936 г. пачала вучобу ў Шаркоўшчыне ў польскай школе, працягвала яе ў савецкай школе, вучылася і ў час нямецкай акупацыі. Сярэднюю адукацыю атрымала ў 1948 г. Пасля заканчэння Гродзенскага педагагічнага інстытута працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў Друйскай сярэдняй школе. З 1953 г. працоўная дзейнасць Фаіны Аляксандраўны звязана з Новапагосцкай СШ. Менавіта тут яна набыла заслужаны аўтарытэт сярод вучняў, іх бацькоў і калег па працы, выкладаючы ў старэйшых класах. Прымала актыўны ўдзел у жыцці школы, рабоце мясцкама і педагагічнага савета, узначальвала секцыю выкладчыкаў мовы і літаратуры. З'яўлялася агітатарам у вёсцы, удзельніцай мастацкай самадзейнасці.

За выдатную пастаноўку вучэбна-выхаваўчай работы ўзнагароджана

значком «Выдатнік асветы БССР», Граматамі Вярхоўнага Савета і Міністэрства асветы БССР. У 1967 г. Ф. А. Камаровай прысвоена званне «Заслужаны настаўнік школ БССР».

КРАСІКАВА Марыя Пятроўна. Нарадзілася ў 1924 г. у в. Рай Манастырскага раёна Смаленскай вобл. Закончыла ў 1945 г. Мсціслаўскае педвучылішча. Працаваць у Міёрскім раёне пачала ў 1946 г., калі стала загадчыцай Кублішчынскай пачатковай школы. Але найбольш ярка педагагічны талент Марыі Пятроўны праявіўся пазней, калі выкладала пасля 1958 г. спачатку ў сярэдняй школе № 1, а потым у СШ № 2 райцэнтра. З 1986 г. — на заслужаным адпачынку. Званне «Заслужаны настаўнік школ БССР» прысвоена ў 1975 г.

ЛАГУН Серафіма Піліпаўна. Нарадзілася 2.3.1934 г. у в. Шыці Шаркоўшчынскага раёна ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сярэдняй школы працавала ў пачатковай. Праз год паступіла на завочнае аддзяленне ў Віцебскі педагагічны інстытут на факультэт хіміі і біялогіі і адначасова працавала культработнікам. У 1959 г. пасля трэцяга курса інстытута выкладала хімію і біялогію ў Сталіцкай няпоўнай сярэдняй школе ў Шаркоўшчынскім раёне, потым у Юдзіцінскай НСШ, нарэшце з 1965 г. — у Істаўскай васьмігодцы. Яна добрасумленны настаўнік, ведае свой прадмет і добра валодае методыкай. Шмат увагі надае самаадукацыі, вывучэнню перадавога вопыту.

У 1967 г. С. П. Лагун адзначана Ганаровай граматай Міністэрства асветы БССР, у 1968 г. — значком «Выдатнік народнай асветы БССР». У 1972 г. ёй прысвоена званне «Заслужаны настаўнік школ БССР». У 1973 г. узнагароджана медалём ВДНГ СССР.

У Міёрскім раёне многія новыя павевы ў сістэме адукацыі пачыналіся менавіта ад С. П. Лагун з Істаўскай школы. Тут было самае баявое Таварыства аховы прыроды з «зялёнымі патрулямі», секцыямі, вечарынамі, віктарынамі. Тут

С. П. Лагун

было ўтворана першае ў раёне школьнае лясніцтва, за якім замацавана 100 га лесу, створаны куток жывой прыроды і многае іншае. Выхаванцы школы рэгулярна займалі прызавыя месцы на раённых і абласных алімпіядах па хіміі і біялогіі.

Вышэйшая катэгорыя С. П. Лагун прысвоена ў 1991 г. Пры гэтым адзначана выдатнае афармленне школьных кабінетаў, выкарыстанне розных форм навучання і выхавання дзяцей.

Разам з гэтым нязменная грамадская праца: дэпутат Язненскага сельскага Савета з 1972 г., у свой час — агітатар, лектар, прапагандыст, пастаянна — удзельнік мастацкай самадзейнасці і нераўнадушны, няўрымслівы чалавек, які і цяпер не ведае стомы ў школе і за яе сценамі, нягледзячы на пенсійны ўзрост.

ЛАКОТКА Валянціна Мікалаеўна. Нарадзілася ў 1930 г. у мнагадзетнай сялянскай сям'і ў в. Латышы Даўгінаўскага сельсавета. Спецыяльнасць настаўніка біялогіі атрымала ў Даўгаўпілскім педінстытуце. Рана пачала самастойны працоўны шлях, прысвяціўшы яго педагагічнай і выхаваўчай рабоце з дзецьмі. Пакінула плённы след у душах былых выхаванцаў Александроўскага дзіцячага дома, Маляўскай, Чэраскай і Крукаўскай сямігадовых і васьмігадовых школ. Выхоўвала любоў да ведаў, працы і зямлі. Пры кожнай школе, дзе

яна працавала, стварала выдатныя доследныя ўчасткі, на якіх вырошчваліся рэдкія і экзатычныя пладовыя і дэкаратыўныя дрэвы і кусты, кветкі.

Узнагароджана значком «Выдатнік адукацыі БССР». Званне «Заслужаны настаўнік школ БССР» прысвоена ў 1973 г.

ЛАЎЧЫНОЎСКІ Фелікс Віктаравіч. Нарадзіўся 1.1.1919 г. у в. Міснікава Верхнядзвінскага раёна. Працоўную дзейнасць пачаў настаўнікам у Пачаевіцкай сямігодцы Чашніцкага раёна ў 1938 г. Служыў у арміі, спачатку курсант, потым намеснік палітрука роты ў Беларускай ваеннай акрузе. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пачынаючы з канца 1945 г. жыццё Ф. В. Лаўчыноўскага звязана з дзейнасцю на педагагічнай ніве на Міёршчыне. Ён працуе дырэктарам, загадчыкам вучэбнай часткі, выкладае гісторыю, Канстытуцыю СССР, геаграфію ў Новапагосцкай і Дзедзінскай няпоўных сярэдніх школах. З 1953 г. і да выхаду на пенсію ў 1979 г. Фелікс Віктаравіч з'яўляўся нязменным кіраўніком сямігадовай, а затым сярэдняй школы ў Новым Пагосце.

Ф. В. Лаўчыноўскі выхаваў не адно пакаленне школьнікаў, у памяці якіх застаўся ўмелым педагогам і кіраўніком, выдатным настаўнікам. Высокі аўтарытэт меў Фелікс Віктаравіч за прафесійныя веды і эрудыцыю сярод настаўнікаў, за вялікую грамадскую работу — сярод вясковых жыхароў. На працягу шэрагу скліканняў ён выбіраўся дэпутатам раённага і сельскага Саветаў, членам выканкама Новапагосцкага сельскага Савета, членам Міёрскага РК КПБ. Працоўная дзейнасць Ф. В. Лаўчыноўскага адзначана трыма медалямі, Граматай Вярхоўнага Савета БССР. Званне «Заслужаны настаўнік школ БССР» прысвоена ў 1968 г. Памёр 6.11.1993 г.

ЛЕБЕДЗЕВА Ніна Сямёнаўна. Нарадзілася ў 1931 г. у в. Лябёды Віцебскага раёна. Да вайны паспела закончыць

Ф. В. Лаўчыноўскі

М. І. Максіменка

толькі два класы. Пасля вызвалення родных мясцін працягвала вучобу адразу ў 4-м класе Старасельскай сямігодкі. У 1948—1952 гг. вучылася ў Віцебскім педвучылішчы. Уся яе працоўная дзейнасць звязана з Орцаўскай школай. Пачынала выкладчыцай пачатковых класаў у васьмігодцы. Кантынгент яе выхаванцаў быў своеасаблівы. За парты ў першы клас прыходзілі не толькі ціхія і паслухмяныя вясковыя дзеткі, але і пазнаўшыя гора, нават ваеннае ліхалецце выхаванцы суседняга Александроўскага дзіцячага дома. Гэта патрабавала асаблівага падыходу, асаблівай увагі. Вось і была Ніна Сямёнаўна для сваіх вучняў адначасова настаўніцай, выхавальніцай і маці.

У 1965 г. васьмігодка ў Орцах была ліквідавана, бо быў закрыты дзіцячы дом. Засталася пачатковая школа, гаспадыняй якой стала Н. С. Лебедзева. Да настаўніцкіх клопатаў прыбавіліся гаспадарчыя, арганізацыйныя. Але на ўсё хапала сіл і часу ў Ніны Сямёнаўны. Невыпадкова ёй прысвоена званне «Заслужаны настаўнік школ БССР».

МАКСІМЕНКА Мікалай Іванавіч. Нарадзіўся ў 1918 г. Настаўнік гісторыі з вышэйшай адукацыяй. У школах Міёрскага раёна пачаў працаваць з 1954 г., у 1960 г. стаў дырэктарам Крукаўскай васьмігодкі. Гэтую пасаду займаў да выхаду на пенсію. Выдатна ведаў свой

П. А. Марцінята

П. В. Сасноўская

прадмет, выкарыстоўваў на ўроках краязнаўчыя матэрыялы, наглядныя і тэхнічныя сродкі. Аказваў вялікую метадычную дапамогу настаўнікам, умеў працаваць з дзецьмі, карыстаўся аўтарытэтам сярод насельніцтва. Шмат зрабіў па ўмацаванні матэрыяльнай базы школы.

М. І. Максіменка актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці раёна, шмат гадоў працаваў прапагандыстам у калгасе імя Мічурына. Узнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР, значком «Выдатнік адукацыі БССР». Званне «Заслужаны настаўнік школ БССР» прысвоена ў 1967 г.

МАРЦІНЯТА Павел Аляксандравіч. Нарадзіўся на Расоншчыне ў в. Рудня ў 1915 г. Пасля заканчэння сямігодкі працаваў настаўнікам. Вучыўся спачатку ў Полацкім педвучылішчы, затым у Гомельскім лесатэхнічным інстытуце. Але там не дазволілі займацца матэрыяльныя ўмовы. Вярнуўся настаўнічаць у мясцовую школу, паступіў у Магілёўскі пединстытут. Неўзабаве ўжо быў дырэктарам сямігодкі. Развіцца яго таленту ў поўнай меры перашкодзіла вайна. У 1942—1943 гг. быў байцом партызанскага атрада імя Чапаева брыгады імя Сталіна, потым служыў у Чырвонай Арміі.

У 1945 г. П. А. Марціняту накіроўваюць на педагагічную працу на Міёршчыну, у Пераброддзе, дзе яшчэ не было ні школы, ні настаўнікаў. У 1952—1961 гг. узначальваў Лявонпальскую сярэднюю школу, а потым, ужо ў васьмігодцы, тут жа настаўнічаў. І не толькі выкладаў родную мову і літаратуру — выхоўваў сапраўдных людзей. Яго педагагічны стаж 43 гады. Званне «Заслужаны настаўнік школ Беларусі» прысвоена ў 1968 г.

Там жаўранкі вяртальныя смяюцца,
Звініць званок над борам выпускны.
Настаўнікі са школай застаюцца,
Удумлівей ад кожнае вясны.
А мы — ў адлёт, і будзе вечна святам,
Журботлівым здзіўленнем не ў пару,
Сівы мой настаўнік Марцінята,
Праменячы юнацкую іскру.

Сяргей Панізнік

МАЦКЕВІЧ Таццяна Пятроўна. Нарадзілася ў 1918 г. у Расонах. Там закончыла школу і пачала настаўнічаць. У час вайны і акупацыі родных мясцін была эвакуіравана ў Кіраўскую вобласць, дзе працавала ў дзіцячым доме. Яе педагагічны талент, уменне выхоўваць дзяцей найбольш яскрава праявіліся ў Дзісне, дзе працавала з 1946 да 1976 г., да выхаду на пенсію. Званне «Заслужаны настаўнік школ БССР» прысвоена ў 1968 г.

САСНОЎСКАЯ Любоў Васільеўна. Нарадзілася ў 1928 г. Настаўніца малодшых класаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Таленавіты педагог, яна ўсё жыццё прысвяціла дзецям, шмат гадоў працавала загадчыцай Папкоўскай пачатковай школы. Выкарыстоўвала сродкі наглядднасці, выраблены самімі дзецьмі. Старанна займалася пазакласнай работай. Яе выхаванцы атрымлівалі трывалыя веды.

Л. В. Сасноўская часта выступала з лекцыямі і дакладамі перад хлебаробамі калгаса «Гігант», абменьвалася вопытам з калегамі раёна. Узнагароджана Граматай Вярхоўнага Савета БССР, значком «Выдатнік асветы БССР». Званне «Заслужаны настаўнік школ БССР» прысвоена ў 1967 г.

Званняў не мае

Бадай, самай каларытнай фігурай не толькі ў педагагічным асяроддзі Міёраў, але і ўсяго раёна на працягу дзесяцігоддзяў заставаўся Аляксандр Іосіфавіч Капітанаў, выкладчык фізікі, завуч спачатку адзінай у райцэнтры сярэдняй школы, што стала пазней СШ № 1, потым — сярэдняй школы № 2. Настаўнічаць на Міёршчыне пачаў у 1949 г. пасля заканчэння Віцебскага педінстытута. А да гэтага было безбацькоўскае дзяцінства, няпростае жыццё ў акупацыі, фронт, цяжкае раненне, ампутацыя нагі. У парыве юнацкага максімалізму (у бацькі была другая сям'я) узяў дзедава прозвішча, аднак у далейшым жыцці яго як асобу вызначалі зусім іншыя рысы.

А. І. Капітанаў дасканала ведаў свой прадмет, меў шырокую эрудыцыю, быў таленавітым выхавальнікам не толькі вучняў, але і настаўнікаў. Усе, хто працаваў з Аляксандрам Іосіфавічам, адзначаюць яго віртуозную здольнасць дасціпна выйсці з самага вострага канфлікту. Словам, сказаным ў час (а гэта маглі быць афарызм, жарт, нават анекдот), ён умеў пагасіць напружанне паміж настаўнікамі ці вучнямі, умеў кожнага паставіць на сваё месца, не павышаючы голасу, тактоўна і спакойна. Школьным дырыжорам названы ён у адной з публікацый раённай газеты, і гэта характарызуе яго працу.

Свае веды ён умеў перадаць вучням, не прытрымліваючыся «жорсткай» лініі выкладання. З'яўляўся кансультантам і дарадцам абітурыентаў, студэнтаў-завочнікаў. Яго на працягу многіх гадоў запрашалі прымаць уступныя экзамены па фізіцы ў педінстытут. На базе школы традыцыйна праходзілі большасць семінараў, пасяджэнняў прадметных секцый, паказальныя адкрытыя ўрокі і іншыя мерапрыемствы, якія рыхтаваліся непасрэдна А. І. Капітанавым ці пад яго патранажам.

А. І. Капітанаў прымаў актыўны ўдзел у станаўленні драмкалектыву ў РДК, які потым стаў народным тэатрам, утварэнні раённага радыё. Займаўся рабселькораўскай дзейнасцю, заснаваў новыя рубрыкі ў раённай газеце, сабраў шматлікія тамы фотагісторыі школы (спачатку ў СШ № 1, потым — у СШ № 2).

Пра ўсё сказаць немагчыма. У адным чалавеку — талент педагога, выхавальніка, арганізатара, пачынальніка новых спраў, шматлікія іншыя здольнасці, у тым ліку мастака. І пры гэтым ніякіх высокіх званняў.

Л. А. Матэленак

А. І. Капітанаў

Памяці А. І. Капітанава

Жыў на зямлі вясёлы чарадзей,
У кругаверці радасцей і бедаў.
Удумліва на белы свет глядзеў
І формулу зямнога шчасця ведаў.
Вялікі фокуснік і добры маг,
У маскарадным быце, жалю вартым,
На ўроках і на школьных вечарах
Самоту разганяў дасціпным жартам.
Віншуючы з удачаю, не раз
Ён віншаванні новыя прарочыў,
Прадказваў выхаванцам зорны час,
Хітрынкаю іскрыстай ззялі вочы.
Яго не стала, стала нам цяжэй,
Над гарадком і ў сэрцы заімжэла,
Плячо сяброўскае, бо неба паніжэла,
Нясцерпна хочацца адчуць бліжэй.

Пятро Сушко

КАВАЛЕВІЧ Аляксей Пятровіч. Нарадзіўся ў 1929 г. у в. Мілявічы Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці у сям'і каваля. Закончыў Гродзенскі педагагічны інстытут, настаўнік беларускай мовы і літаратуры. У Міёрах з 1963 г. Спачатку працаваў выкладчыкам у школе, потым інспектарам раённага аддзела народнай асветы, з 1969 і да 1989 г., да выхаду на пенсію,— намеснікам рэдактара раённай газеты «Сцяг працы». Член Саюза журналістаў.

Вершы пачаў пісаць яшчэ ў школе, з'яўляўся членам літаратурнага аб'яднання «Нёман» пры абласной газеце «Гродзенская праўда» ў студэнцкія гады. Пазней сам кіраваў літаратурным аб'яднаннем «Ручаёк» пры міёрскай раённай газеце «Сцяг працы» на працягу многіх гадоў. Піша лірычныя вершы, байкі, апавяданні. Выйшла некалькі зборнікаў вершаў і нарысаў.

А. П. Кавалевіч

Вечар над Міёрамі

Вечар над Міёрамі
Лісцем шамаціць,
Люстрамі-азёрамі
Ў вышыню глядзіць.
Песні краю мілага
Ўдалячынь імчаць,
Пра жыццё шчаслівае
Радасна гучаць.
Дзесьці абудзіліся
Ў завадзях самы.
Тут мы нарадзіліся,
Тут мужнеем мы.
Тут жывуць з адкрытаю,
Шчыраю душой
Людзі працавітыя,
Знатныя сабой.
Вечар над Міёрамі
Лісцем шамаціць,
Люстрамі-азёрамі
Ў вышыню глядзіць.
Тут зямля, як рошчына,
А жыты, як гай...
Слаўся ты, Міёршчына,
Працавіты край!

А. Кавалевіч

Працаўнікі Міёрскага раёна, адзначаныя ўрадавымі ўзнагародамі

Ордэн Леніна

АЛЕСЬКА Ірына Якаўлеўна — даярка калгаса імя Кірава.

АНІСІМАЎ Іван Ерамеевіч — старшыня калгаса імя Цітова.

БРЫЦІКАЎ Уладзімір Васільевіч — механік калгаса «Запаветы Леніна».

ГРЭЦКАЯ Лідзія Андрэеўна — брыгадзір калгаса «Гігант».

ЗАШЧАРЫНСКАЯ Яніна Ігнатаўна — даярка калгаса імя Кірава.

ЗЭЙДЗІН Іван Дзмітрыевіч — брыгадзір калгаса «Іскра».

ІСАКОВІЧ Павел Якаўлевіч — камбайнер калгаса імя Гастэлы.

КАВАЛЕЎСКІ Аркадзь Антонавіч — брыгадзір калгаса імя Цітова.

КАЛАНДА Мікалай Сяргеевіч — трактарыст саўгаса «Дзісенскі».

КАРАВАЙ Мамерт Васільевіч — брыгадзір калгаса імя Мічурына.

КУЛЯНОК Мікалай Аляксандравіч — трактарыст калгаса імя Цітова.

ЛАЎРЫНОВІЧ Ядвіга Піліпаўна даярка калгаса «Маладая гвардыя».

МАЙДЗІН Іосіф Зіноўевіч — старшыня калгаса «Парыжская камуна».

МАРКЕВІЧ Уладзімір Пятровіч — брыгадзір калгаса «Сцяг перамогі».

ПІЛЕЦКІ Іван Адольфавіч — начальнік участка калгаса «Гігант».

СІНКЕВІЧ Іван Іосіфавіч — начальнік вытворчага ўчастка калгаса «Парыжская камуна».

ЦВЯЦЕНКА Надзея Данілаўна — галоўны аграном калгаса «Парыжская камуна».

Ордэн Кастрычніцкай Рэвалюцыі

АГЕЕЎ Васіль Анісімавіч — першы сакратар РК КПБ.

АЛЕСЬКА Іван Сяргеевіч — трактарыст калгаса імя Дзяржынскага.

АНІСІМАЎ Іван Ерамеевіч — старшыня калгаса імя Цітова.

ГЛЕБКА Аркадзь Аляксандравіч — трактарыст саўгаса «Дзісенскі».

ДУБРОЎСКІ Іван Кірылавіч — начальнік Дзісенскага будаўніча-мантажнага ўпраўлення.

ЖАБЁНАК Софія Іосіфаўна — даярка калгаса «Парыжская камуна».

ІВАНОВА Анастасія Піменаўна — даярка калгаса «Кастрычніцкая рэвалюцыя».

КАНДРАШОЎ Пётр Пятровіч — старшыня калгаса «Маладая гвардыя».

ЛЫСЁНАК Мікалай Паўлавіч — трактарыст калгаса імя Мічурына.

МАЙДЗІН Іосіф Зіноўевіч — старшыня калгаса «Парыжская камуна».

МАРКЕВІЧ Уладзімір Пятровіч — начальнік вытворчага ўчастка калгаса «Сцяг перамогі».

МАРОЗ Антаніна Іванаўна — даярка калгаса «Баявы партызан».

МАСЛА Софія Уладзіміраўна — свінарка калгаса «Гігант».

МІРОНЧЫК Вольга Аляксандраўна — даярка калгаса імя Цітова.

ПЯТКЕВІЧ Сцяпан Сцяпанавіч — загадчык фермы калгаса «Перамога».

СІНКЕВІЧ Іван Іосіфавіч — брыгадзір калгаса «Парыжская камуна».

СТАШУЛЁНАК Канстанцін Венідзіктавіч — брыгадзір калгаса «Перамога».

ФЕДАРОВІЧ Мікалай Канстанцінавіч — трактарыст калгаса «Язна».

ШАМРОВІЧ Антаніна Андрэеўна — начальнік цэха жывёлагадоўлі калгаса імя Цітова.

Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга

АВІН Іван Іванавіч — упраўляючы Асінаўскага аддзялення «Сельгастэхніка».

АКСЁНАК Любоў Сямёнаўна — звеннявая калгаса «Маладая гвардыя».

БАБАКА Генадзь Ігнатавіч — загадчык свінафермы калгаса імя Цітова.

БАКЕВІЧ Мечыслаў Вікенцьевіч — трактарыст калгаса «Рассвет».

БАЛАЙ Сямён Васільевіч — брыгадзір саўгаса «Дзісенскі».

БЕЛАЗОРЧЫК Міхаіл Раманавіч — майстар-наладчык калгаса «Шлях да камунізму».

БОРТНІК Леанід Мікалаевіч — начальнік участка саўгаса «Юбілейны».

БУБІНОВІЧ Іван Сямёнавіч — трактарыст калгаса «Парыжская камуна».

БУБЕЙ Надзея Іванаўна — даярка калгаса «Маладая гвардыя».

ВАЙСКОВІЧ Віктар Ігнатавіч — эканаміст калгаса «Парыжская камуна».

ВАЙЦЯХОВІЧ Пётр Ніканоравіч — вадзіцель аўтамабіля саўгаса «Юбілейны».

ВАЛЫНЕЦ Васіль Паўлавіч — трактарыст калгаса імя Цітова.

ВАРОНЬКА Валянціна Пятроўна — даярка калгаса «Баявы партызан».

ВІТКОЎСКАЯ Ніна Дзянісаўна — начальнік Дзісенскага аддзялення сувязі.

ВІШНЕЎСКІ Віктар Вацлававіч — токар Мёрскага аддзялення «Сельгастэхніка».

ВОРАНАВА Галіна Міхайлаўна — аператар свінагадоўчага комплексу калгаса «Гігант».

ГАЙДУКЕВІЧ Аркадзь Іванавіч — брыгадзір калгаса «Гігант».

ГПРДЖА Іосіф Ігнатавіч — аператар свінагадоўчага комплексу калгаса «Гігант».

ГРЭЦКАЯ Ганна Пракопаўна — даярка калгаса імя Мічурына.

ГУШЧЫН Анатоль Ісакавіч — старшыня калгаса «Іскра».

ДВАРЭЦКАЯ Ганна Іванаўна — свінарка калгаса «Кастрычнік».

ДОБРАНЬКІ Іван Нікадзімавіч — трактарыст Асінаўскага аддзялення «Сельгастэхніка».

ЖУРАЎСКІ Яўтен Антонавіч — трактарыст калгаса імя Дзяржынскага.

ЗАКРЭЎСКІ Іван Адольфавіч — брыгадзір калгаса «Перамога».

ЗАХАРЭВІЧ Зінаіда Рыгораўна — заатэхнік калгаса «Парыжская камуна».

ЗЭЙДЗІН Іван Дзмітрыевіч — брыгадзір калгаса «Іскра».

ІСАКОВІЧ Павел Якаўлевіч — камбайнер калгаса імя Гастэлы.

КАДУШКА Софія Рыгораўна — даярка калгаса імя Цітова.

КАДУШКА Уладзімір Паўлавіч — брыгадзір калгаса імя Цітова.

КАЗАКЕВІЧ Станіслаў Вацлававіч — качагар ільнозавода.

КАЛАНДА Мікалай Сяргеевіч — трактарыст саўгаса «Дзісенскі».

КАЛЕСНІК Міхаіл Мікалаевіч — галоўны механік калгаса «Баявы партызан».

КАРАБАНЬ Віктар Лявонцьевіч — старшыня райвыканкама.

КАРАВАЙ Вера Мікалаеўна — даярка калгаса імя Дзяржынскага.

КАСКЕВІЧ Аляксандр Аляксандравіч — даглядчык калгаса імя Мічурына.

КАШКУР Андрэй Іванавіч — трактарыст-камбайнер калгаса «Гігант».

КАШКУР Вальдэмар Пятровіч — трактарыст калгаса «Гігант».

КІСЕЛЬ Іосіф Вацлававіч — трактарыст калгаса «Язна».

КОРСАК Валянціна Гаўрылаўна — даярка калгаса «Парыжская камуна».

КРАМОК Фёдар Антонавіч — трактарыст калгаса імя Цітова.

КРАСЬКО Уладзімір Пятровіч — брыгадзір калгаса «Іскра».

КУЛЕШ Іван Іосіфавіч — трактарыст калгаса «Ленінскі шлях».

КУЛЯНОК Антаніна Мікалаеўна — брыгадзір калгаса імя Мічурына.

КУЛЯНОК Мікалай Аляксандравіч — трактарыст калгаса імя Цітова.

ЛАЎРЫНОВІЧ Аркадзь Аркадзьевіч — камбайнер саўгаса «Міёрскі».

ЛАЎРЫНОВІЧ Ядвіга Піліпаўна — даярка калгаса «Маладая гвардыя».

ЛЫСЁНАК Мікалай Паўлавіч — трактарыст калгаса імя Мічурына.

ЛЮДСКІ Мікалай Юльянавіч — калгаснік калгаса «1-е Мая».

МАКСІМОВІЧ Іван Іванавіч — шафёр калгаса «Маладая гвардыя».

МАЛАХОЎСКІ Часлаў Альгердавіч — трактарыст калгаса «Праўда».

МАЛЕЦКІ Яўтен Казіміравіч — вадзіцель аўтамабіля «Райсельгасхіміі».

МАЛЯЎКА Панцялей Самуйлавіч — брыгадзір калгаса імя Кірава.

МАНЯК Васіль Сцяпанавіч — трактарыст калгаса імя Пушкіна.

МАРОЗ Антаніна Пятроўна — трактарыст калгаса «За ўладу Саветаў».

МАСЛА Софія Уладзіміраўна — даярка калгаса «Гігант».

МАСЛЯКОЎ Іосіф Іванавіч — трактарыст калгаса «Кастрычніцкая рэвалюцыя».

МАСЬКО Канстанцін Аксенцьевіч — старшыня калгаса «Баявы партызан».

МАТЭЛЕНАК Мікалай Мікалаевіч — трактарыст калгаса «За мір».

МАТЭЛЕНАК Сяргей Пятровіч — старшыня калгаса імя Мічурына, 1971 г.

МАТЭЛЕНАК Сяргей Пятровіч — старшыня калгаса імя Мічурына, 1973 г.

МАЦУК Леаніда Ігнатаўна — даярка калгаса «Кастрычнік».

МІЛАШЭВІЧ Мацільда Іванаўна — свінарка калгаса «Гігант».

МЯДЗВЕДСКІ Аляксандр Іларыёнавіч — брыгадзір калгаса «Сцяг перамогі».

МЯЦЕЛІЦА Мікалай Пятровіч — трактарыст калгаса імя Гастэлы.

НАСАЛЬ Станіслаў Станіслававіч — даглядчык статка калгаса «Запаветы Леніна».

НАРЭЙКА Віталь Уладзіміравіч — вадзіцель аўтамабіля саўгаса «Дзісенскі».

НІКІЦІН Мікалай Нікіфаравіч — трактарыст калгаса «Кастрычніцкая рэвалюцыя».

ПАДАБЕД Яўген Рыгоравіч — галоўны ветурач саўгаса «Міёрскі».

ПАЛЬЧЭХ Міхаіл Фёдаравіч — брыгадзір Асінаўскага аддзялення «Сельгастэхніка».

ПАЛЬЧЭХ Пётр Барысавіч — даглядчык статка калгаса «За мір».

ПЯЛІК Віктар Зянонавіч — трактарыст калгаса «Светлы шлях».

РАГОЎСКАЯ Яўгенія Васільеўна — даярка калгаса «Маладая гвардыя».

РАЗУМЧЫК Мікалай Уладзіміравіч — трактарыст саўгаса «Дзісенскі».

РАМЗА Вера Іванаўна — даярка калгаса імя Кірава.

СВІРКО Надзея Мікалаеўна — даярка калгаса імя Цітова.

СІВІЦКІ Георгій Антонавіч — камбайнер калгаса «Маладая гвардыя».

СІНЯЎСКАЯ Любоў Ігнатаўна — звеннявая калгаса «Маладая гвардыя».

СКАВАРОДКА Іван Сідаравіч — муляр міжкалгасбуда.

СКРАБАТУН Алена Аляксееўна — старшыня калгаса «Запаветы Леніна».

СЛУЦКАЯ Браніслава Іосіфаўна — даярка калгаса «Гігант».

СМЕРЦЬЕВА Клаўдзія Кірылаўна — даярка калгаса «Кастрычніцкая рэвалюцыя».

СМЕРЦЬЕЎ Пётр Цярэнцьевіч — загадчык фермы калгаса «Кастрычніцкая рэвалюцыя».

СМУЛЬКО Эмілія Казіміраўна — даярка калгаса імя Чапаева.

СУШКО Мікалай Аляксеевіч — брыгадзір ПМК-34.

СУШКО Тамара Антонаўна — трактарыст калгаса імя Мічурына.

СЦЕПУЛЁНАК Васіль Міхайлавіч — трактарыст калгаса імя Мічурына.

СЦЕПУЛЁНАК Марыя Уладзіміраўна — сарціроўшчыца льновалакна Міёрскага льнозавода.

СЦЕПУЛЁНАК Мікалай Сяргеевіч — камбайнер калгаса імя Мічурына.

ТАЛКАЧ Гілярый Пятровіч — старшыня калгаса «Гігант».

ТАМАШЭВІЧ Марыя Ігнатаўна — звеннявая калгаса «Маладая гвардыя».

ТРУС Сцяпан Уладзіміравіч — трактарыст калгаса «Сцяг Перамогі».

УДОБКІН Сяргей Іванавіч — трактарыст спецаддзялення «Сельгастэхніка».

УРБАНСКАЯ Глафіра Міхайлаўна — даярка калгаса «Праўда».

Фёдараў Мікалай Максімавіч — галоўны ўрач райбальніцы.

ФІЛІПОВІЧ Ананій Мілецьевіч — трактарыст калгаса «Язна».

ФУРС Генадзь Аляксандравіч — трактарыст калгаса імя Пушкіна.

ХАМІЧ Аркадзь Аляксандравіч — даглядчык статка калгаса імя Дзяржынскага.

ЦВЯЦЕНКА Надзея Данілаўна — аграном калгаса «Парыжская камуна».

ЦІШАЛОВІЧ Фёдар Пятровіч — трактарыст калгаса «Кастрычнік».

ЦЯРЭШКА Ніна Іларыёнаўна — даярка калгаса «Маладая гвардыя».

ЧАБОК Часлава Яўгенаўна — даярка калгаса «Гігант».

ЧАБОК Ядвіга Станіславаўна — цялятніца калгаса «Ленінскі шлях».

ЧУВІКАЎ Акім Аляксеевіч — старшыня калгаса імя Чапаева.

ШАЛУХА Іосіф Ігнатавіч — шафёр саўгаса «Юбілейны».

ШАМРОВІЧ Антаніна Андрэеўна — заатэхнік калгаса імя Цітова.

ШАРАГ Валянціна Пятроўна — свінарка калгаса «Запаветы Леніна».

ШАРКЕЛЬ Альгерд Станіслававіч — старшыня калгаса імя Кірава.

ШАРКОВІЧ Зянон Міхайлавіч — брыгадзір міжкалгасбуда.

ШКЛЯР Мікалай Яўстаф'евіч — упраўляючы райаб'яднання «Сельгастэхніка».

ШУК Гаўрыла Канстанцінавіч — шафёр калгаса «Светлы шлях».

ШУК Генадзь Уладзіміравіч — трактарыст калгаса «Светлы шлях».

ШУК Надзея Фёдараўна — даярка калгаса імя Чапаева.

ШУЛЬГА Уладзімір Ануфрыевіч — начальнік участка калгаса імя Чапаева.

ШЧАРБАКОЎ Уладзімір Ігнатавіч — старшыня калгаса імя Заслонава.

ШЧАСНАЯ Марыя Клаўдзіеўна — свінарка саўгаса «Міёрскі».

ШЧАСНЫ Аркадзь Пятровіч — камбайнер калгаса «Баявы партызан».

ШЧАСНЫ Тадэвуш Іванавіч — трактарыст саўгаса «Міёрскі».

ЮРШЭВІЧ Сцяпан Ігнатавіч — трактарыст калгаса «Язна».

ЯКУБОЎСКІ Яўген Іосіфавіч — шафёр Асінаўскага аддзялення «Сельгастэхніка».

ЯНУКОВІЧ Іван Іванавіч — вадзіцель аўтамабіля калгаса «Парыжская камуна».

ЯНУКОВІЧ Іосіф Уладзіміравіч — качагар Міёрскага хлебазавода.

ЯНУШОНАК Алег Васільевіч — брыгадзір калгаса імя Кутузава.

Ордэн Дружбы народаў

ВАЛЫНЕЦ Вольга Іванаўна — свінарка калгаса імя Цітова.

БАБАРНЁВА Лідзія Андрэеўна — настаўніца Павяцкай СШ.

КАДУШКА Вікенцій Пятровіч — галоўны інжынер калгаса «Парыжская камуна».

ТАМАШЭВІЧ Таццяна Уладзіміраўна — цялятніца калгаса «Маладая гвардыя».

УРУБЛЕЎСКІ Мікалай Мікалаевіч — начальнік вытворчага ўчастка калгаса «1-е Мая».

ЯНЫ НАРАДЗІЛІСЯ Ў РАЁНЕ

АРЦІМОВІЧ Станіслаў Іосіфавіч, мастак і краязнаўца. Нарадзіўся 13.3.1897 г. у в. Орцы. Закончыў двухкласнае народнае вучылішча. З дзяцінства любіў маляваць. У 1910 г. разам з бацькам выехаў у Пецярбург, наведваў курсы малявання пры Акадэміі мастацтваў. Пасля грамадзянскай вайны вярнуўся на радзіму, працаваў у гміне, дзе складаў планы, схемы, карты. Пастаянна займаўся маляваннем, разьбой па дрэве. Яго мастацтву ўласціва шматжанравасць — ён ствараў партрэты, нацюрморты, пейзажы, карціны на біблейскую, міфалагічную і гістарычную тэматыку. Творчая спадчына складае каля 200 работ. У карцінах «Вясна», «Ранняя зіма», «Букет кветак» — цудоўнае пачуццё колеру, рэалізму, мяккі каларыт. У «Паляванні на львоў» адчуваецца ўплыў рамантызму, асаблівасці еўрапейскай мастацкай школы XIX ст. прасочваюцца ў карціне «Хрыстос у цярновай кароне». Псіхалагізм, паглыбленасць сюжэту ўласцівы скульптурам «Смуткуючы Хрыстос», «Сэрца Хрыста».

С. І. Арцімовіч займаўся краязнаўствам, запісваў мясцовыя легенды, паданні, склаў нарыс па гісторыі Міёршчыны (застаўся ў рукапісе). З 1944 г. жыў у Польшчы. Памёр 14 студзеня 1974 г. Карціна «Паляванне на львоў» знаходзіцца ў народным музеі СШ № 3 г. Міёры.

БУЙНІЦКІ Ігнат Цярэнцьевіч, беларускі акцёр, рэжысёр, тэатральны дзеяч, пачынальнік беларускага нацыянальнага прафесійнага тэатра. Нарадзіўся 10.8.1861 г. у фальварку Палевачы Дзісенскага пав. (цяпер Глыбоцкі раён). Са шляхецкай сям'і. Скончыў Рыжскае каморніцкае вучылішча, вучыўся ў прыватнай драматычнай студыі ў Вільні. Працаваў каморнікам, вёў гаспадарку ў Палевачах, што дало яму магчымасць мець пэўную матэрыяльную базу для стварэння тэатра. З дзяцінства

жывучы сярод простых людзей, Буйніцкі шчыра іх палюбіў, глыбока ўспрымаў усе радасці і нягоды іх жыцця, багаты духоўны свет. Гэта вызначыла прафесію Буйніцкага, які вырашыў сродкамі мастацтва садзейнічаць сцвярджэнню чалавечай і нацыянальнай годнасці свайго народа, развіццю яго культуры. Буйніцкі быў носьбітам перадавых настрояў, імкнуўся як мага паўней пазнаць народнае жыццё. Вывучаў беларускія песні і танцы, збіраў узоры народнага адзення, арнаменту, размалёўкі. Паводле сведчання Ч. Родзевіча, «рабіў сваю працу Ігнат Буйніцкі не дзеля гонару, не дзеля славы, а рабіў гэта дзеля таго, што любіў мужыка, рабочага, любіў яго загнаную, забітую культуру і звычаі; ён хварэў, мучыўся цемрай народа беларускага, якую сеяў царызм, хварэў тым здзекам, які ўчыняў пан, чыноўнік; аднак Буйніцкі, нягледзячы на перашкоды, ішоў у народ і сеяў насенне культуры і асветы» (Заря Запада. 1926. 21 нояб.). З 1905 г. Буйніцкі сістэматычна праводзіў у Палевачах і Празароках вечарынкі самадзейных танцораў, спевакоў, дэкламатараў, музыкаў; паказваліся і драматычныя сцэнкі з народнага жыцця. Паступова вакол Буйніцкага арганізавалася група аматараў сцэны, якая на працягу 1907 г. ператварылася ва ўстойлівы аматарскі тэатр. Яго ўдзельнікі часта выступалі перад мясцовымі жыхарамі. 12.2.1910 г. яны прынялі ўдзел у Першай беларускай вечарыне ў Вільні. Папоўненая таленавітымі драматычнымі акцёрамі, спевакамі, трупа стала прафесійнай і атрымала назву Першая беларуская трупа Ігната Буйніцкага. У яе рэпертуары былі песні, танцы, пастаноўкі п'ес «Па рэвізіі» і «Пашыліся ў дурні» М. Крапіўніцкага, «У зімовы вечар» паводле Э. Ажэшкі, «Міхалка» Далецкіх, «Сватанне» А. Чэхава, «Модны шляхцюк» К. Каганца, дэкламацыя твораў Я. Лучыны, К. Каганца, Я. Купалы, Я. Коласа, Цёткі, М. Багдановіча, А. Паўловіча, Старога Уласа і іншых беларускіх аўтараў. Рэпертуар быў разлічаны на масавага гледача, улічваў яго інтарэсы, патрабаванні. Царскія ўлады непрыхільна ставіліся да паказу са сцэны твораў на беларускай мове, асабліва на вострыя сацыяльныя тэмы, нярэдка забаранялі спектаклі. Буйніцкі быў сінтэтычным акцёрам, з поспехам выступаў у драматычных творах, выдатна чытаў прозу і дэкламаваў вершы, спяваў сола і ў хоры, па-майстэрску, з высокім прафесіяналізмам танцаваў. Першым на Беларусі ён звярнуў увагу на прыгажосць і невычэрпныя эстэтычныя магчымасці народнага танца, як пастаноўшчык вывеў «мужыцкі» танец на сцэну, узняў яго да ўзроўню высокага мастацтва. У 1910—1911 гг. тэатр Буйніцкага шырока гастраліраваў па Беларусі: пабываў у Дзісне, Свянцянах, Паставах, Полацку, Капылі, Нясвіжы, Клецку, Ляхавічах, Слуцку, Мінску і іншых гарадах і мястэчках. У час гастроляў Буйніцкі шмат дапамагаў мясцовым аматарам тэатра, чым спрыяў уздыму аматарскага тэатральнага руху на Беларусі. Газета «Наша ніва» сістэматычна публікавала матэрыялы пра творчасць Буйніцкага і яго трупы, папулярызавала дзейнасць артыстаў сярод народа. Буйніцкі карыстаўся падтрымкай прагрэсіўных дзеячаў беларускай культуры: Я. Купалы, Ядвігіна Ш., Цёткі, Ц. Гартнага, З. Бядулі, Л. і Ч. Родзевічаў і інш. Трупа двойчы выступала ў Пецярбургу: на вечарах беларускай моладзі (1911) і этнаграфічным, падрыхтаваным рэдакцыяй часопіса «Вестник знания» (1912), а таксама на вечары студэнтаў-беларусаў у Варшаве (1913). Часопіс «Вестник знания» назваў адным з самых цікавых момантаў вечара ўдзел у ім «піянера народнага беларускага тэатра», «гарачага сэрцам І. Буйніцкага, які спавядаў пачуцці беларуса», адзначыў, што «поспех яго быў каласальны» (Десять лет культурной работы журнала «Вестник знания», 1903—1913. СПб., 1913. С. 187, 199).

Уціск царскіх улад і матэрыяльныя цяжкасці прымусілі Буйніцкага ў 1913 г. закрыць тэатр. У маі 1914 г. ён рабіў намаганні стварыць новы тэатр, але 1-я сусветная вайна перашкодзіла ажыццяўленню гэтых планаў. З надзеяй на змены да лепшага ў нялёгкім лёсе беларускага народа сустрэў Буйніцкі лютаўскую рэвалюцыю 1917 г. Ён быў адным з ініцыятараў стварэння Першага беларускага таварыства драмы і камедыі (красавік 1917 г.). У апошнія месяцы жыцця знаходзіўся на вайсковай службе ў рускай арміі ў раёне Маладзечна, дзе займаўся мастацкай самадзейнасцю з удзелам салдат. Тут і памёр 9.9.1917 г. Пахаваны непадалёку ад в. Палачаны Вілейскага павета (цяпер Маладзечанскі р-н), пасля перазахаваны ў в. Палевачы, а ў 1975 г. астанкі перазахаваны на цэнтральнай плошчы в. Празарокі Глыбоцкага р-на. На магіле пастаўлены помнік (10.10.1975; скульпт. І. Міско, арх. М. Бурдзін). У Празароцкай сярэдняй школе створаны музей Буйніцкага (1982). Буйніцкі застаўся ў народнай памяці як выдатны дзеяч нацыянальнай культуры, якога яшчэ пры жыцці называлі «бацькам беларускага тэатра». У г. Глыбокае яго імем названа вуліца.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн., 1994. Т. 2. С. 118—119.

Ян Гушча

ГІРГЕЛЬ Мікалай Сяргеевіч. Нарадзіўся 1.8.1946 г. у в. Цімошкава Туркоўскага сельсавета ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння ў 1964 г. Туркоўскай сярэдняй школы паступіў на мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута. Пасля яго заканчэння ў 1969 г. нейкі час працаваў выкладчыкам малявання і чарчэння ў СШ № 4 г. Наваполацка, затым служыў у арміі. Наступны этап працоўнай дзейнасці — інжынер мастацкай эстэтыкі, адначасова дызайнер і мастак Наваполацкага хімкамбіната.

У 1973 г. пераехаў у Мінск, працаваў мастаком у БЕЛТА. Спецыялізаваўся на карыкатурах, гумарыстычных малюнках. Больш дваццаці гадоў супрацоўнічае з «Вожыкам», друкуецца ў іншых перыядычных выданнях. З 1991 г. працуе ў газеце «Рэспубліка». Член Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь з 1990 г.

ГУШЧА Ян. Нарадзіўся 24.12.1917 г. у фальварку Загасцінне Міёрскага раёна. Польскі пісьменнік і перакладчык. Скончыў Віленскі універсітэт (1939). Працаваў настаўнікам на Дзісеншчыне, потым у Маскве ў Саюзе польскіх патрыётаў, рэдакцыі часопіса «Новыя дагляды». З 1945 г. жыве ў Лодзі. Друкуецца з 1934 г. Аўтар кніг паэзіі («Балада пра падарожных», 1938; «Новыя вершы», 1963; «Вершы і байкі», 1969), прозы («Мястэчка над Альшанкай», 1948; «З далёкіх дарог», 1957; «Кругі», 1964 і інш.). Шэраг яго твораў тэматычна звязаны з Беларуссю (апавяданне «Лямпа», вершы «Да сябра-беларуса», «Вязынка»). Складальнік анталогіі «Беларускія вершы» (1971) і «Анталогіі беларускай паэзіі» (1978), для якіх пераклаў на польскую мову большасць вершаў. Пераклаў творы М. Багдановіча («Выбраныя вершы», 1973), зборнік апавяданняў «Мае мядзведзі» і іншыя беларускія апавяданні» (1975), кнігі У. Караткевіча «Блакіт і золата дня» (1976), Я. Брыля «Ніжнія Байдуны» (1979). У зборніку эсэ «Аповесці ў чорных рамках» (1979) апісаў сваё

Плакат на экалагічную тэму М. С. Гіргеля

падарожжа па Беларусі. Пераклаў вершы Ф. Багушэвіча, У. Дубоўкі, Я. Купалы, Я. Коласа, Я. Пушчы, М. Танка і інш. Вершы Гушчы ў перакладзе на беларускую мову змешчаны ў зборніку «Горад мільённы і мы» (1972). На беларускую мову яго творы перакладалі і перакладаюць П. Пестрак, М. Танк, Я. Брыль, Р. Барадулін, У. Караткевіч, А. Лойка, В. Зуёнак, М. Татур, Т. Зарыцкая, Я. Міско, Я. Семяжон, Я. Сіпакоў, А. Марціновіч, А. Клышка, Я. Бяганская, В. Сёмуха, К. Цвірка і інш.

Урывак з апавядання «Лямпа»

Міёры запомніліся мне па касцёле з чырвонай цэглы, блакітна-белай фігуры маткі боскай каля мястэчка і возера з плоскімі берагамі. І па казані ксяндза Бародзіча, вядомага з расказаў многіх людзей, аўтара ўспамінаў «На возе і пад возам», які апісвае розныя прыгоды, часам забаўныя, а часам і недарэчныя. Гэта быў ксёндз дэспатычны, упэўнены і ўпарты — з характарам, як звычайна гаварылі пра паважаных людзей. Ён не вагаўся, змагаючыся ўсялякімі спосабамі з царскай уладай, і нямала рабіў прыкрасцей прадстаўнікам польскіх улад. Калі справа датычыла патрэб касцёла, ён не прасіў, а загадваў. Пасля казані ў сувязі з нейкімі рамонтнымі работамі ён зачытаў спіс парафіян і вызначаў іх абавязкі на бліжэйшы тыдзень: хто і калі павінен даць фурманку ў яго распараджэнне.

Здаецца, усё працавала як гадзіннік. І калі нейкі засцянковы шляхціц не з'явіўся па выкліку і адразу пасля гэтага выпадкова даволі моцна пашкодзіў сабе саломінай вока, у бліжэйшую ж нядзелю веруючыя пачулі ў казані, што гэта няйнакш сустрэла яго боская кара.

Ці ж трэба дадаваць, што казань ксяндза Бародзіча слухалі ўважліва і часам са страхам. Зусім інакш было з казанямі іншых ксяндзоў...

Гадамі пазней... я бачыў сутычку з польскай паліцыяй. Ксёндз пачаў там будаўніцтва касцёла, не ўзгадніўшы з адпаведнымі ўладамі яго месца. Дайшло да бойкі. Адзін з прыхаджан быў паранены ў нагу штыком, праўда, лёгка. Ксёндз, каб зрабіць выгляд, што раненне сур'ёзнае, адразу намасціў пацярпелага намашчваннем паміраючага, пасля чаго той пайшоў на вячоркі.

У выдадзеных успамінах... быў апісаны заклад з нейкім наіўным папом. Ксёндз сцвярджаў, што поп не зрушыць з месца брычкі з ім. Заклаліся на пяць

рублёў. Як і можна было прадбачыць, нягледзячы на тушу ксяндза, бацюшка з лёгкасцю і задавальненнем павёз брычку, але фатограф, які прытаіўся ў кустах, увекавечыў гэта здарэнне, і здымак быў распаўсюджаны ў мностве экземпляраў.

Ян Гушча

В. Ю. Ластоўскі

ЛАСТОЎСКІ Вацлаў Юсцінавіч — адзін з буйнейшых дзеячаў беларускага Адраджэння. Нарадзіўся 20 кастрычніка 1883 г. у засценку Калеснікі пад Новым Пагостам у сям'і дробнага беззямельнага арандатара. Ён закончыў на радзіме народнае вучылішча, толькі адзін год «зайцам» слухаў лекцыі ў Пецярбургскім універсітэце, а шырокія веды беларускай гісторыі, літаратуры і мастацтва атрымаў шляхам самаадукацыі і самаўдасканалення.

У 1906 г. В. Ластоўскі ўступае ў Беларускую сацыялістычную грамаду, становіцца адным з галоўных яе ідэолагаў. З 1909 да 1914 г. ён працуе сакратаром рэдакцыі «Нашай нівы», тут і адбываецца станаўленне Власта (псеўданім В. Ластоўскага) як літаратара, крытыка і публіцыста. У 1910 г. выдае ў Вільні «Кароткую гісторыю Беларусі», першую працу на беларускай мове. Літаратурная дзейнасць нашага земляка, якая грунтавалася на народным гістарычным фальклоры пераважна родных мясцін, атрымала высокую ацэнку Максіма Багдановіча: «Власт надрукаваў усяго 3—4 рэчы, але кожную можна ўзяць за прыклад, як трэба пісаць. Асабліва харашо напісана апавяданне «Сож і Дняпро», вельмі прыгожая казка-легенда... «Дзень ружовай кветкі», што нагадвае лепшыя з апавяданняў, здабыўшых усясветную славу дацкаму пісьменніку Андэрсэну».

В. Ластоўскі ўдзельнічае ў выданні газеты «Гоман» у час нямецкай акупацыі, вітае Лютаўскую і Кастрычніцкую рэвалюцыі, спадзеючыся на стварэнне незалежнай Беларусі. Менавіта таму ён аказваецца разам з іншымі беларускімі дзеячамі, якія абвяшчаюць 25 сакавіка 1918 г. Беларускую Народную Рэспубліку. У снежні 1919 г. узначальвае Раду Міністраў БНР, бо не можа згадзіцца са стварэннем БССР на базе некалькіх паветаў Мінскай губерні, дзе жыло менш 10 працэнтаў усяго беларускага насельніцтва.

В. Ластоўскі выдае свае фальклорныя запісы, зробленыя на Дзісеншчыне, піша падручнікі для беларускіх школ, у эміграцыі ў Каўнасе выдае часопіс «Крывіч». Да сённяшняга часу захавала навуковую каштоўнасць яго праца «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі». Адным з найбольш дасканалых твораў у беларускай прозе многія навукоўцы лічаць навукова-фантастычную аповесць В. Ластоўскага «Лабірынты».

Пад уплывам змен, якія адбываліся ў Савецкай Беларусі, мяняюцца палітычныя погляды Вацлава Юсцінавіча Ластоўскага. У 1923 г. ён выходзіць з урада БНР, неўзабаве прызнае савецкую ўладу. Гэта дазваляе яму вярнуцца ў БССР паўнапраўным грамадзянінам.

У Мінску В. Ластоўскі працуе дырэктарам Беларускага дзяржаўнага музея, у 1927 г. выбіраецца неадменным сакратаром Беларускай Акадэміі навук, а праз год — акадэмікам.

На жаль, плённую навуковую дзейнасць Вацлава Юсцінавіча Ластоўскага перапыняюць першыя сталінскія рэпрэсіі ў 1930 г. Ён абвінавачваецца ў стварэнні контррэвалюцыйнай арганізацыі

Саюз вызвалення Беларусі і без суда высланы за межы рэспублікі. Паўторны арышт адбыўся ў 1938 г., за ім — расстрэл у Саратаўскай турме.

Рэабілітацыя В. Ю. Ластоўскага спазнілася роўна на паўстагоддзе. Але хоць цяпер з яго зняты ярлыкі нацыяналіста, контррэвалюцыянера і ворага народа. У 1989 г. афіцыйна прызнана, што Саюза вызвалення Беларусі таксама не існавала, што гэтая контррэвалюцыйная арганізацыя была выдумана для вынішчэння беларускай інтэлігенцыі.

Хоць і позна, але памяць пра Вацлава Юсцінавіча Ластоўскага вярнулася на родную зямлю.

Што трэба ведаць кожнаму беларусу?

БЕЛАРУС У ГРАМАДЗЯНСКІМ ЖЫЦЦІ

Беларускае грамадзянскае жыццё твораць грамады, суполкі, таварыствы, установы, а таксама наш тэатр, канцэрты, забавы, часопісы, промысел, гандаль — гэта ўсе мейсцы публічнага грамадзянскага жыцця і лучнасьці.

Дык і трэба, каб усюды ў грамадзянскім жыцьцю беларус выступаў з гонарам і развагай, а глаўнае — справядліва і слушна. На сабраньнях і нарадах — будзь то гаспадарскіх, купецкіх, духоўных, палітычных ці іншых — сьвядома беларус павінен судзіць аб усім, выходзячы з патрэб і карысьці беларускаго народу.

Выбіраючы людзей на ўрады і прэдстаўніцтвы, трэба пільнавацца, каб не выбіраць людзей чужых, ворагаў нашага народу і нашай справы. Наадварот, трэба заўсёды старацца на ўсякія ўрады выбіраць добрых, сумленных і сьвядомых беларусаў. Васьцерагайцеся даваць уласьць над сабою людзям чужым і нівядомым!

ЯК ПАСТУПАЦЬ У ЎРАДАХ?

У ўрадах, воласьці, судзе і ўсюды трэба нам гаварыць толькі па-беларуску і бараніць свайго на гэта нацыянальнаго права.

ЧЫМ МОЖЭМ ГАРДЗІЦЦА

Мы гардзімся, што мы беларусы. Бо мы народ здольны, з нашаго народу выйшло многа слаўных людзей, за якіх ніколі невыплачэны доўг маюць перад намі і палякі (Касьцюшка, Міцкевіч, Сыракомля, Крашэўскі і шмат інш.), і маскалі (Дастаеўскі, Сымон Полацкі і шмат інш.), і іншыя нашы суседзі. Пра нашу здольнасць сьведчаць такжэ нашы звычаі і абычаі, нашае будаўніцтво, усякія культурныя памяткі і інш.

Мы горды са свае мовы! Бо наша мова мэлёдыйная, багатая і вельмі надаецца да песьні і паэзіі. А да таго ж яна адна з найчысьцейшых славянскіх моваў.

Мы горды са свае песьні! Беларусы маюць вельмі многа песянь. Нота нашых песянь вельмі багата і адбівае ў сабе душу нашаго народу. Наша народная песьня займае адно з выдатнейшых месц між песьнямі ўсіх народаў сьвету. Ёю цікавяцца вучоныя людзі чужых народаў.

Мы горды са свайго народу! Усякі іншы народ, жывучы ў такіх цяжкіх варунках, якія выпалі на нашу долю, загінуў бы, а наш народ выказаў нізвычайную жыццёвую сілу. Ён ператрываў усякія злыбяды, ліхалецьце і напасьці ды перахаваў у сабе сваю родную мову і любоў да свае Бацькаўшчыны Беларусі. Наш народ любіць праўду і красу, — ён спакойны і разважны, а пры гэтым цьвёрды.

Мы горды са свае гісторыі! Наша гісторыя — гэта ніўпынная барацьба за волю, барацьба за захаванне свае нацыянальнае душы. Прытым, мы ніколі не галіліся на чужое. Наша гісторыя — гэта Гольгота нашаго народу, якая чыніць яму чэсьць і славу.

Мы горды за сваю родную зямлю! Наша Бацькаўшчына — пекны край. Многа ў ёй красы: пекная ў нас вясна і лето, восень і зіма. Нашы пушчы, лясы і абшары апавіты паэзіяй, з якой праглядае наша мінуўшчына.

Адным словам, мы горды, што мы беларусы.

В. Ластоўскі
Менск, 1918 г.
Выданьне «Вольная Беларусь»

МАЛЕЦКІ Язэп (Іосіф). Нарадзіўся 12.1.1906 г. у сялянскай сям'і ў в. Якужы. Закончыў гімназію імя Стэфана Баторыя ў Друі, атрымаў вышэйшую медыцынскую адукацыю ў Віленскім універсітэце. Працаваў лекарам з 1935 г., пераважна на чыгунцы, перад вайной спецыялізаваўся па акушэрству і гінекалогіі ў Варшаве. З пачаткам першай сусветнай вайны вярнуўся ў Вільню. Потым працаваў у Гродне, кіраваў медыцынскай школай у Баранавічах. Затым прымусовае прадстаўніцтва БЦР па Віленскай акрузе і вымушаная эміграцыя спачатку ў Нямеччыну, потым у Аўстралію.

Са студэнцкіх гадоў прымаў удзел у беларускім культурным і нацыянальным руху. У Германіі стаў ініцыятарам і галоўным арганізатарам «Аб'яднання беларускіх лекараў на чужыне», рэдагаваў часопіс «Медычная думка». У Аўстраліі быў сябрам першай управы Беларускага аб'яднання ў штаце Новая Паўднёвая Валія, пісаў матэрыялы і дапамагаў у выданні месячніка «Новае жыццё» ў Сіднеі. У 1965 г. сярод першых арганізатараў і сябраў першай управы Беларускага культурна-грамадскага клуба, на пакупку будынка для якога ў 1973 г. ахвяраваў значную суму. Узначальваў федэральную раду беларускіх арганізацый Аўстраліі. Актыўна дапамагаў уладкавацца беларускім і іншым эмігрантам, пры гэтым асабіста займаўся лекарскай практыкай. Заўсёды і ўсюды праяўляў сябе як беларус, выдаў у 1976 г. у Таронта кнігу «Пад знакам Пагоні», друкаваў успаміны, медыцынскія і публіцыстычныя артыкулы.

Памёр Я. Малецкі 6 чэрвеня 1982 г.

МЁЛЕР Герман. У біяграфіі славутага савецкага вучонага М. І. Вавілава ёсць наступныя радкі: «Мікалай Іванавіч сябраваў са знакамітым вучоным, прафесарам Тэхаскага універсітэта Германам Мёлерам... Эмігрыраваць у ЗША яго прымусіла пагроза арышту за ўдзел у нелегальнай дзейнасці супраць царскага рэжыму... Першапачатковую адукацыю Мёлер атрымаў у Дзісне».

Мне даводзілася сустракацца з Васілём Дуброўскім, які тры гады сядзеў за адной партай з Германам Мёлерам у Дзісенскім павятовым вучылішчы. Ён быў таленавітым хлопцам, у пятнаццацігадовым узросце паўтарыў класічны дослед Грэгара Мендэля па гібрыдызацыі розных гатункаў гароху.

Г. Мёлер часта наведваў Маскву, дзе ва Усесаюзным інстытуце раслін працаваў разам з М. Вавілавым. У 1931 г. пачаў праходзіць двухгадовую практыку ў лабараторыі Томаса Моргана савецкі вучоны А. Р. Жэбрак. У г. Пасадэне сустрэў ён і Германа Мёлера. Абодва яны былі з Заходняй Беларусі, абодва займаліся генетыкай. Невыпадкова тэму пры абароне доктарскай дысертацыі А. Р. Жэбракам у 1936 г. у Маскве ў якасці аднаго з апанентаў прысутнічаў і Г. Мёлер.

Цэласную тэорыю генетыкі стварыў амерыканскі вучоны Томас Морган. Ён і паставіў задачу перад біёлагамі свету — здзейсніць мутацыю, такую рэдкую ў прыродзе, штучна ў лабараторыі. Першым дамогся поспеху ў яе вырашэнні Г. Мёлер. Ён апраменьваў мушку-дразафілу рэнтгенаўскімі промнямі і атрымаў новы від насякомых. А ў далейшым падобным чынам былі выведзены новыя пароды свойскіх жывёл.

В. А. Высоцкі

НАКОЎНІК Мікалай Іванавіч. Нарадзіўся 8(20).5.1895 г. у в. Накоўнікі Дрысенскага павета Віцебскай губерні, савецкі геолаг і петраграф. Доктар геолага-мінералагічных навук (1947), прафесар (1952). З сялян. Скончыў Ленінградскі універсітэт (1930). Выкладаў у Ленінградскім горным інстытуце (1931—1938), Казахскім універсітэце (1950—1953), Беларускім дзяржаўным універсітэце (1953—1955). Праводзіў геалагічныя даследаванні ў Казахстане, на Урале, у Заходняй Сібіры. Заснаваў працы па вывучэнні руданоснай фармацыі другасных кварцытаў, працэсах каляруднага гідратэрмальнага змянення горных парод, метадах вызначэння прыносу-вынасу рэчыва пры метасаматозе. Узнагароджаны 2 ордэнамі, медалямі.

М. І. Накоўнік

Доктор наук

За околицей деревни Наковники, в русле реки Западной Двины, со времен полоцкого князя Бориса лежит огромный камень. Много чудесных дней в годы детства провел там Коля Наковник. Он часто взбирался на каменную глыбу и подолгу любовался догорающим закатом солнца, тихой гладью Двины. Богатое воображение уносило мальчика в сказочный мир, в котором непременно были камни самых диковинных форм и красок.

А позднее ученик Дисненского училища Коля Наковник пристрастился к прогулкам по берегам родной Дисны и Двины, среди валунов. Он подбирал особенно привлекавшие его камешки, показывал их учителям и настойчиво допытывался, откуда появились камни, как они «растут» и зачем нужны людям.

Так еще в детстве зародилась у Николая Ивановича Наковника любовь к минералам, страстное желание найти такие камни, которые людям очень полезны, но еще неведомы.

Прошли долгие годы, прежде чем мечта сбылась. Учеба в Дисненском училище, работа телеграфистом, служба в армии, затем опять телеграфный аппарат и занятия в Витебской школе взрослых. На все это ушло более десяти лет. Но мысль о горном деле никогда не покидала его. В 1922 г. он стал студентом Географического института, ректором которого был его любимый учитель академик А. Е. Ферсман. Через три года Наковник перешел на геологический факультет Ленинградского университета.

Еще будучи студентом, Николай Наковник участвовал в геологических экспедициях. Начал с рядового рабочего полевой партии, научился делать топографическую съемку, был и фотографом. Старание и упорство студента были замечены, и через год он уже стал коллектором — младшим научным сотрудником геологической партии.

Летом 1926 г. экспедиция ленинградских геологов искала в Центральном Казахстане месторождения меди. Во время одного из таких походов бродил Николай Наковник у горы Большой Семиз-Бугу. Усталый и мучимый жаждой молодой геолог напал на родничок.

Наклонившись, чтобы зачерпнуть воды, он поразился необычному цвету камней, усеявших дно родника. Взволнованный, достал один из камней, рассмотрел его поверхность, разбил молотком. В его руках находилось редкое сокровище: серый камень с синим отливом. Николай Иванович огляделся и увидел вокруг множество таких же камней. Склон горы, на которую он вскарабкался, также был покрыт россыпью синих пород. Исследовав образцы, ученые установили, что найденный студентом Наковником минерал представляет величайшую драгоценность. Это был корунд, волшебный камень, который так необходим для шлифовки и полировки наиболее точных стальных зеркальных поверхностей.

Два года молодой геолог тщательно разведывал месторождение корунда. Полагали, что запасы его не превышают 50 тысяч тон. Но эти прогнозы, к счастью, оказались ошибочными. Прошло уже более тридцати лет, за это время добыто двести с лишним тысяч тон синего камня, а его запасы еще не исчерпаны. Клад, найденный белорусским студентом, оказался неистощимым. По словам видного геолога члена-корреспондента Академии наук СССР П. М. Татаринова, Семиз-Бугинское корундовое месторождение «самое крупное на земном шаре».

Выдающееся открытие Н. И. Наковника освободило нашу страну от ввоза корундовых изделий из Греции и США. Молодая социалистическая промышленность стала получать в достатке свой отечественный корунд, за который прежде государство расплачивалось золотом.

Ко времени окончания университета Н. И. Наковник уже имел богатый опыт геологоразведчика. Его пригласили на кафедру петрографии Ленинградского горного института. Это было в годы первой пятилетки.

Его первое открытие вызвало у геологов интерес к изучению вторичных кварцитов, к поискам в них руд, до этого неизвестных. Два года спустя на пустынном берегу озера Балхаш известный знаток геологии Казахстана М. П. Русаков, ныне академик, сделал новое крупнейшее открытие — медное месторождение Коунрад; оно было не только огромное по запасам, но и совершенно оригинальное по своему происхождению. Тщательную разведку и глубокое исследование этого богатейшего месторождения поручили молодому геологу Николаю Наковнику. Результаты изложены им в монографии, изданной Российской Академией наук.

Там, где была пустыня, вскоре возник комбинат, прошла линия железной дороги, заработали рудники, вырос город.

По преданиям, на северном берегу Балхаша, у Саяка, много веков назад существовали медные рудники. Из поколения в поколение казахского народа переходила история о невиданных богатствах этих рудников. Но не многие знали к ним дорогу. Старый казах Сейкумбай Торубаев после десятидневного утомительного пути привел Наковника на место, где далекие предки добывали медь. Опытный геолог нашел почти занесенные песком штольни и причудливые рисунки зверей на скалах. Началась разведка, в итоге которой было установлено, что древние рудокопы не успели выбрать всех богатств подземной кладовой. На геологической карте страны появилось Саякское медномагнитовое титановое месторождение.

Замечательные открытия пытливого и неутомимого искателя природных богатств в Казахстане, на Алтае, Урале и Кавказе оказали неоценимую услугу стране. Это была сама лучшая научная рекомендация его многолетнего труда. И в 1938 г. талантливому разведчику недр Николаю Наковнику без защиты диссертации была присуждена ученая степень кандидата геолого-минералогических наук.

Двадцать лет своей созидательной работы отдал ученый изучению вторичных

кварцитов. Достойным вкладом стала докторская диссертация «Вторичные кварциты, их минеральные фации, генезис и практическое значение».

Через всю научную жизнь Николая Ивановича красной нитью проходят три основных качества советского ученого: открывая новые месторождения полезных ископаемых, он способствовал увеличению богатств своей Отчизны; вместе с тем свыше полсотни научных работ, написанных им, обогатили советскую геологическую науку; не менее ценный вклад сделал он и как преподаватель, подготовив много талантливых учеников. Николай Иванович возглавлял кафедру петрографии (науки о горных породах) в Казахском университете, работал профессором кафедры геохимии Минского университета. Грудь его заслуженно украшают высокие награды Родины: орден Трудового Красного Знамени, орден «Знак Почета» и несколько медалей.

...В Дисненской средней школе бережно хранится чудесная коллекция минералов, собранных за годы экспедиций, — подарок Николая Ивановича Наковника. Посылая ее, ученый писал своим юным землякам: «Именно там, на реках Дисненки и Двины, усеянных валунами, где я мальчиком рыбачил с отцом и собирал камни, зародилась мечта изучить горные породы — стать геологом. И мечта моя, как видите, сбылась».

Рассказы о наших земляках. Молодечно, 1959. С. 78—82.

ПАНІЗНІК Сяргей Сцяпанавіч, беларускі паэт. Нарадзіўся 10.5.1942 г. у в. Бабышкі Міёрскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Магілёўскае медыцынскае вучылішча (1962). Працаваў фельчарам Княжыцкай бальніцы каля Магілёва. У 1962—1975 гг. служыў у Савецкай Арміі. Пасля заканчэння факультэта журналістыкі Львоўскага вышэйшага ваенна-палітычнага вучылішча СА ВМФ (1967) быў ваенным журналістам. У 1976 г. працаваў фельчарам траўма-брыгады на станцыі «Хуткай дапамогі» ў Мінску. У 1977—1978 гг. — стыльрэдактар у газеце «Вячэрні Мінск», з 1980 г. — рэдактар Дзяржтэлерадыё БССР, з 1982 г. — рэдактар, а з 1984 г. — загадчык рэдакцыі выдавецтва «Юнацтва», з 1989 г. — вядучы рэдактар гэтай рэдакцыі. Член СП СССР з 1967 г. Узнагароджаны медалём.

Першы верш надрукаваў у 1959 г. (міёрская раённая газета «Зара камунізму» — цяпер «Сцяг працы»). Аўтар зборнікаў вершаў «Кастры Купалля» (1967), «Палявая пошта» (1972), «Крона надзеі» (1975), «Чало і век» (1979), «Слова на дабрыдзень» (1982), «Мацярык» (1985), «Стырно» (1989). Для дзяцей выйшлі кнігі паэзіі «Адкуль вясёлка п'е ваду» (1981), «Жыцень» (1986), «Мы — грамацеі!» (1989), дакументальныя аповесці «Браніслава» (1985), «Освейская трагедия» (1990). Выдаў кнігу публіцыстыкі «Пасля вогненных вёсак...» (1980).

Зара — зарука

Снег першы — як папера
на пісьмы для сустрэч.
У літар — лапкі звера,
які ўцякае прэч.

Кладзецца след — пазначыць
хаду ў снягах зімы.
...Нас нельга перайначыць:
калі ўжо мы, то мы!

І як бы ні гудзела
завейная гайня —
гісторыя хацела
заўсёды на каня.

Я не знікаў, не віўся
вужом,
не прападаў:
быў на кані — то біўся;
быў пад канём — канаў.

З мяне сцякалі кроплі
і поту і крыві.
А вільчыкі акропаляў
звінелі мне: «Жы-ві!»

І я жыву
у руху:
як сой той — ад камля...
Нясу зару — заруку,
што быць табе, Зямля!

Жыві нязводнай, вера,
след продкаў — не адпрэч!
...Снег свежы — як папера
для радасных сустрэч.

Гляджу: сляды ля дуба.
Я сам, як цішыня.
...А ў сэрцы тупат, тупат
прыдзвінскага каня.

Сяргей Панізнік

САВІЧ-ЗАБЛОЦКІ (Суліма-Савіч-Заблоцкі) Вайніслаў (Войслаў) Казімір Канстанцінавіч (псеўданімы Полацкі Гаўрыла, Завіша Павел, граф Суліма з Белай Русі, грамадзянін з Белай Русі). Нарадзіўся 3.3.1850 г. у маёнтку Панчаны Міёрскага раёна. Беларускі і польскі пісьменнік. Вучыўся ў Віленскай гімназіі, універсітэтах у Празе, Лейпцыгу і Страсбургу. З 1875 г. за мяжою, падтрымліваў сувязі з рускімі і польскімі дэмакратамі (П. Лаўроў, Б. Ліманоўскі), выдаваў газеты на польскай і французскай мовах. У 1887 г. вярнуўся на радзіму, быў пад тайным наглядам паліцыі. У 1888—1889 гг.— супрацоўнік газеты «Виленский вестник». Пісаў таксама на рускай і іншых мовах. Аўтар сатырычнай паэмы «Праўдападобная гісторыя», аповесці «Каракозаў», драмы «Капернік» і інш. (1870—1873). У 1873 г. прыслаў у часопіс «Вестник Европы» беларускія вершы («З чужбіны», «У роднай зямлі», «Да перапёлкі»). У паэме «Аповесць пра мае часы» (1876), аповесці «Полацкая шляхта» (1885) і нарысе «Шчаслівейшая Марыся» (1892) шмат беларускамоўных і этнаграфічна-фальклорных матэрыялаў. У рукапіснай спадчыне Савіча-Заблоцкага зборнік вершаў «Вязанка эпіграм», у якім ён шмат піша пра Беларусь. Збіраў беларускія народныя песні. Памёр у 1893 г.

«Чырвоны» граф з Міёршчыны

Бацька будучага пісьменніка Канстанцін Вікенцьевіч Суліма Савіч-Заблоцкі быў са знакамітага, але збяднелага роду. Маці — княгіня Станіслава Святаполк-Мірская, продкі якой здаўна валодалі маёнткамі ў нашай мясцовасці. Хлопчык з дзяцінства выхоўваўся побач з простымі сялянамі. Любімымі забавамі былі гульні на беразе Дзвіны. Ды яшчэ ў бедным маёнтку была багатая бібліятэка. Рана навучыўшыся чытаць, ён у хатніх умовах падрыхтаваўся да паступлення ў гімназію. Застаўшыся без бацькі, у 1860 г. адзінаццацігадовы хлопчык даў вольную сваім прыгонным сялянам. Далей ён вучыцца ў Віленскай гімназіі, пазней папаўняе веды ва універсітэтах Прагі, Лейпцыга, Страсбурга. У 19 гадоў пачаў друкаваць свае сатырычныя творы на польскай мове. У 1871 г. выходзіць «Жыццё М. Каперніка як грамадзяніна ў Польшчы», друкуюцца шматлікія артыкулы.

Аб дэмакратычным напрамку творчасці маладога пісьменніка сведчыць аповесць «Каракозаў». Не маючы магчымасці свабодна надрукаваць вершы на беларускай мове, ён спрабуе гэта зрабіць ускосным шляхам. Захаваўся ліст Савіча-Заблоцкага да вядомага рускага гісторыка, рэдактара часопіса «Вестник Европы» М. М. Стасулевіча ад 17 лютага 1873 г. У ім наш зямляк піша: «Іншыя дасылаюць у «Вестник Европы» навуковыя працы, якімі адукоўваюць Расію, я — некалькі вершаў на беларускай мове... Беларуская мова зараз на вуснах простага народа. У часы Ягелонаў — адміністрацыйная мова, якую называлі рускай. Ёй вучыліся так, як зараз вучацца французскай або англійскай. Размаўляць у той час на чэшскай у Польшчы, а ў Літве па-беларуску было вышэйшым гонарам... Зараз на ёй размаўляе толькі народ і складае свае песні». Войслаў піша, што ён хоча

вывесці беларускую мову з таго кутка, у якім яна да гэтай пары сябе хавала, піша, што, нарадзіўшыся ў Беларусі, ён пратэставаў там на народнай мове супраць апалячвання. І хоць у Варшаве ён (Савіч) пісаў на польскай, палякі не лічылі яго сваім. Да ліста Стасулевічу прыкладзены тры вершы на беларускай мове «З чужбіны», «У роднай зямлі», «Да перапёлкі».

У канцы ліпеня Савіч-Заблоцкі піша аб тым, што яго творы ў хуткім часе будуць выдадзены ў Белградзе або ў Празе. «Беларускіх песень, якіх у мяне многа, магчыма, пушчу ў свет божы». У гэтым жа годзе выходзіць яго драматургічны твор «Капернік». З лістоў Савіч-Заблоцкага да вядомага польскага пісьменніка Ю. Крашэўскага мы даведваемся аб яго перакладзе на польскую мову «Гісторыі разумнага развіцця ў Еўропе». Ён просіць польскага пісьменніка напісаць уступ пра славяншчыну. Падпісаўся наш зямляк псеўданімам «Грамадзянін Белай Русі».

За дэмакратычную і рэвалюцыйную дзейнасць супраць Расійскай імперыі Савіч-Заблоцкі вымушаны тэрмінова пакінуць царскую Расію і пакаштаваць горкі хлеб чужбіны. У 1875—1876 гг. ён знаходзіўся ў Львове, Празе, Кракаве. Тут займаўся рэвалюцыйнай і літаратурнай дзейнасцю, падтрымліваў сувязі з вядомым рускім рэвалюцыянерам П. Лаўровым, польскім рэвалюцыянерам Б. Ліманоўскім. У Празе пад псеўданімам «Граф Суліма з Белай Русі» напісаў у 1876 г. аўтабіяграфічны твор «Аповесць пра мае часы». Дзеянне твора адбываецца напярэдадні 1863 г. у беларускай вёсцы. Сяляне гавораць па-беларуску ў адрас польскіх рэвалюцыянераў: «Вольнасць хацелі нам даць, але ж ці вольныя, як яны самі!»

У цэнтры паэмы вобраз «чырвонага графа», які раздае сялянам сваю зямлю, сядзіць з імі за бяседным сталом. Герой паэмы лічыць, што звергнуць царскае самаўладдзе можна толькі сумеснымі намаганнямі народаў Расіі, Беларусі, Польшчы. Пацвярджае аўтар гэта словамі рускага чыноўніка: «І мы таксама церпім, дзе наша Айчына? Хіба рускія могуць прызнаць ёю Расію царскую? Расію, адкуль выгнаны народны дух, дзе трэба разам з палякамі цярпець удары бізуноў?»

У лісце сваім да польскага дэмакрата А. Гілера Савіч-Заблоцкі скардзіцца: «Сяджу ў Кракаве без грошай, начую з рамеснікамі ў адным пакоі». З наступных лістоў мы даведваемся, што «чырвонага графа» паліцыя высылае ў Прусію. Ён не ведае, куды дзецца. У Расіі яго чакае, як ён піша, толькі шыбеніца. У эміграцыйных дзеячах ён таксама расчароўваецца. Сілу, здольную вызваліць яго Радзіму, ён бачыць не ў эмігрантах, а ў беларускім селяніне, цёмным, пакінутым без кіраўніка.

Дзейнасць нашага земляка ў 1876—1887 гг. амаль зусім невядомая. Толькі з кароткага аўтабіяграфічнага запісу ў альбоме рускага гісторыка і выдаўца М. М. Стасулевіча мы даведваемся, што ён шмат вандраваў, быў у Егіпце, Германіі, Францыі, Швецыі. Займаўся літаратурнай дзейнасцю, пісаў у розныя заходнееўрапейскія газеты і часопісы. У 1878 г. у Парыжы рэдагуе газету «Звязда». Выдаў некалькі твораў на нямецкай і французскай мовах. Сябраваў і быў блізка знаёмы з вядомым грамадскім дзеячам Францыі, яе прэм'ер-міністрам Ляонам Галебетрай, італьянскім рэвалюцыянерам Дж. Гарыбальдзі, французскім паэтам Віктарам Рышарам, іспанскім пісьменнікам і гісторыкам Э. Кастэларам, вучоным-астраномам Віларам.

Шмат цікавых звестак можна даведацца аб нашым земляку з яго рукапіснага зборніка «Вязанка эпіграм». Ён быў падараваны полькаму вучонаму-мовазнаўцу Л. Нядзвецкаму 6 лістапада 1883 г. у Парыжы. Эпіграмы напісаны на польскай мове, але ў іх аўтар часта звяртаецца да краіны свайго маленства — Беларусі. Ён піша: «Мой верш не грэчаскі, толькі наш уласны, дзвінскі».

Дзвінскі, «таму што Дзвіне, гэтаму Дунаю маёй Айчыны... самай дарагой рэчцы ў свеце, я абавязаны рытмам маіх песень».

У вершы «Да пана К. О.» паэт палемізуе з тымі, хто лічыў беларускую мову грубай, не прыдатнай для літаратурнай творчасці. «Ты «цвёрдаю» мову завеш маю, яе «архаізмы» радуюць твой слых — ды я, прызнаюся шчыра табе, хацеў бы, каб яна яшчэ цвярдзейшаю стала». Са зборніка мы даведваемся, што ў 1860 г., даўшы вольнасць сваім сялянам, ён пісаў: «Не на таўстабрухіх сланах, што салам абраслі, пакутуючых, а на мужыку, — на ім будзе трымацца будучыні гмах». У чатырохрадкоўі «Да маскалёў» як «сын свабоды» аўтар звяртаецца да рускіх: «Я зусім не кідаю ў цябе каменем, о няшчасны народзе, я таксама хачу сарваць кайданы з тваіх ног», бо ва ўсіх народаў адна мэта, адзін шлях.

Усяго ў зборніку 210 эпіграм. Шкада, што мала знойдзена беларускіх вершаў «грамадзяніна з Белай Русі». Затое ў кожным з іх шчырасць пачуцця, любоў да Радзімы. Вось прыклад:

Люблю цябе, зямля радная,
Дзе ў глухой пушчы ветры дуюць.
І тучка слёзная такая,
Што цвяткі божыя гаруюць.

У аповесці, напісанай у 1885 г. пад назвай «Полацкая шляхта», нягледзячы на тое што піша яе далёка ад бацькаўшчыны, шмат беларускамоўнага матэрыялу.

У 1881 г. у Парыжы Савіч-Заблоцкі выдае газету на французскай мове. Пад псеўданімам Павел Завіша дасылае сваё апавяданне «Не тыя часы, не тыя людзі» вядомаму пісьменніку Ю. Крашэўскаму. У 1885—1886 гг. ён стаў супрацоўнікам газеты «Хвіля» (на польскай мове). А калі газета спыніла сваё існаванне, выдаў брашуру «Яшчэ Польска не загіне, пакуль жыва Расія». Галоўная мэта твора — прымірыць палякаў і рускіх для сумеснай барацьбы за свабоду. Толькі гэтае імкненне канчаткова пасварыла Савіча-Заблоцкага з польскай эміграцыяй, затое дала шанц вярнуцца на радзіму.

Аб падзеях, звязаных з вяртаннем нашага земляка ў Расію, мы даведваемся з яго прашэнняў да гродзенскага генерал-губернатара І. С. Коханава і пасланніка імператара Аляксандра І у Бельгіі князя Л. П. Урусава. Хаваючы сваю рэвалюцыйную дзейнасць, «чырвоны граф» тлумачыць выезд у 1875 г. за мяжу сваёй хваробай. Ён піша аб цяжкім матэрыяльным становішчы — «няма чым заплаціць нават за гербавую паперу». У яго не засталося маёнткаў, сядзіба Панчаны прададзена Яраславам Клотам. Ён піша: «Не маючы ніякай магчымасці знайсці сабе харчаванне ў Бруселі, сумуючы па Радзіме, дзе ў мястэчку Друі жыве мая састарэлая маці, нарэшце, жадаю атрыманыя мною веды прысвяціць роднаму краю». Ён просіць забяспечыць яго новым пашпартам, бо ўсе паперы згарэлі ў пажары на кватэры ў Бруселі ў 1884 г. Вось таму ён і не можа знайсці працу ў Бельгіі.

Савіч-Заблоцкі атрымаў часовы пашпарт на ўезд у Расію і вярнуўся на радзіму ў 1887 г. З ліста віленскаму генерал-губернатару М. С. Галалобаву вядома, што па прыездзе на Беларусь Войслаў працуе ў часопісе «Віленскі веснік» з 1 кастрычніка 1888 г. 11 верасня 1889 г. дрэнны стан здароўя прымушае яго пераехаць да цёткі ў маёнтак Губіна Лепельскага павета. У 1891 г. ён часова пасяляецца ў Мінску. З гэтага ж ліста мы даведваемся аб пажары ў Дзісне ў 1882 г., у якім згарэлі яго дакументы на дваранства. Войслаў просіць губернатара пасадзейнічаць ў выдачы пашпарта для выезду ў Пецярбург. Пашпарта ён, відаць, не атрымаў, але з яго аўтабіяграфіі ў альбоме М. Семаўскага вядома, што восенню 1891 г. ён ужо ў Пецярбургу. Тут піша нарыс «Шчаслівейшая Марыся», у якім таксама шмат беларускамоўнага і этнаграфічнага матэрыялу.

Як вядома з ліста прафесару славістыкі Варшаўскага універсітэта А. П. Кулакоўскаму, у Пецярбургу «грамадзянін з Белай Русі» працягвае займацца літаратурнай дзейнасцю, бо ў ім падзяка за ганарар у сто рублёў серабром прафесару А. С. Будзіловічу.

Далейшыя звесткі аб нашым земляку губляюцца. Энцыклапедыя таксама падае ўмоўную дату смерці — пасля 1893 г.

В. А. Ермалёнак

САНКОЎСКІ Іосіф, генерал-лейтэнант. Нарадзіўся 16.3.1897 г. у в. Падгуркі Міёрскага раёна. У 1905—1908 гг. вучыўся ў Мілашоўскім народным вучылішчы. У пачатку 1917 г. мабілізаваны на Паўночны фронт у раёне Дзінабурга (Даўгаўпілса). Накіраваны ў школу прапаршчыкаў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Чырвонай гвардыі. Удзельнічаў у баях супраць Калчака. Пасля грамадзянскай вайны камісар Чырвонай Арміі, камандзір палка, выкладчык, а затым начальнік Уладзімірскага пяхотнага вучылішча. З 1943 г. на фронце. Камандзір стралковай брыгады. Са снежня 1943 да жніўня 1944 г. — камандзір стралковай дывізіі. Вызваляў Баранавічы. З верасня 1944 г. — намеснік камандуючага, начальнік штаба 2-й Польскай арміі. З 1953 да 1958 г. — намеснік начальніка вышэйшых афіцэрскіх курсаў «Выстрал». Яго імем названа вуліца ў Баранавічах. Памёр 4 студзеня 1962 г.

Іосіф Санкоўскі

М. М. Смірын

СІЎКО Франц Іванавіч (псеўданім Францішак Анашка). Нарадзіўся 3.5.1953 г. у в. Вята. Скончыў Павяцкую сярэднюю школу. З 1970 да 1975 г. вучыўся на філалагічным факультэце Белдзяржуніверсітэта. Па сканчэнні працаваў настаўнікам і намеснікам дырэктара ў школах Верхнядзвінска і Віцебска, у Бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў Беларусі, у рэдакцыі абласной газеты «Віцебскі рабочы». Зараз — старшы выкладчык кафедры беларусазнаўства Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта.

Член Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1993 г. Аўтар кнігі прозы «З чым прыйдзеш...» (1991), цыкла дэтэктыўных аповесцей «Апошняе падарожжа ў краіну ліваў» (1997), шэрагу публікацый у штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», часопісах «Беларусь», «Маладосць», «Крыніца», «Полымя», апавяданняў для дзяцей.

СМІРЫН Маісей Мендзелевіч. Нарадзіўся ў Дзісне 4.11.1895 г. Тут прайшлі яго дзяцінства і юнацтва. У Дзісне атрымаў першапачатковую адукацыю, закончыў гімназію, дзе яго бацька працаваў выкладчыкам. Пасля рэвалюцыі віхуры грамадзянскай вайны памянялі яго месца жыхарства. Ён працуе загадчыкам РАНА на Смаленшчыне, адначасова з'яўляецца выкладчыкам у працоўнай школе. У 1921 г. М. М. Смірын паступае ў Смаленскі інстытут народнай адукацыі, потым пераводзіцца на факультэт грамадскіх навук Маскоўскага універсітэта. Захапленне гісторыяй выклікала ў яго жаданне прадоўжыць адукацыю ў Расійскай Акадэміі навук у аспірантуры на кафедры ўсеагульнай гісторыі. Паспяхова закончыўшы яе, працаваў у 1930—1934 гг. выкладчыкам усеагульнай гісторыі ў педагагічным інстытуце ў г. Горкі. Яго першыя навуко-

выя артыкулы з'явіліся ў 1927 г. Асноўная тэма навуковай дзейнасці была прысвечана гісторыі рэфармацыі і сялянскай вайны ў Германіі XVI ст. У 1935—1940 гг. М. М. Смірын узначальвае кафедры ўсеагульнай гісторыі ў Маскоўскім пединстытуце імя У. І. Леніна і пединстытуце імя К. Лібкнехта. У 1937 г. абараняе кандыдацкую дысертацыю на тэму «Аграрныя адносіны ў паўднёва-заходняй Германіі ў XV—XVI стст.» З 1938 г. Смірын з'яўляецца старшым навуковым супрацоўнікам сектара гісторыі сярэдніх вякоў Інстытута гісторыі Акадэміі навук СССР. З 1938 г. працуе дацэнтам, з 1946 г.— прафесарам кафедры гісторыі сярэдніх вякоў Маскоўскага універсітэта. У гэтым жа годзе абараняе доктарскую дысертацыю «Томас Мюнцар і Вялікая сялянская вайна ў Германіі». З гэтага года ён з'яўляецца адказным сакратаром навуковага зборніка «Сярэднія вякі». У шматлікіх навуковых часопісах друкуюцца яго артыкулы, прысвечаныя гісторыі Германіі XVI ст. У 1947 г. выходзіць фундаментальная праца «Народная рэфармацыя Томаса Мюнцара і Вялікая сялянская вайна», якая затым была перакладзена і выдадзена на польскай, нямецкай і 5-я глава на італьянскай мовах. У 1952 г. выходзіць яшчэ адна кніга нашага земляка «Нарысы гісторыі палітычнай барацьбы ў Германіі перад Рэфармацыяй», якая таксама была перакладзена на нямецкую мову. Асобнай брашурай у ГДР выйшла «Гістарыяграфія Вялікай сялянскай вайны».

М. М. Смірын з'яўляецца аўтарам шматлікіх артыкулаў, прысвечаных Германіі, у разнастайных энцыклапедыях як у СССР, так і за мяжой. Прымае ўдзел у напісанні і рэдагаванні шэрагу падручнікаў па гісторыі сярэдніх вякоў. Яго навуковыя працы выходзяць нават на венгерскай мове. Адна з апошніх кніг «Да гісторыі ранняга капіталізму ў Германіі» выйшла ў 1969 г.

У 1947 г. наш зямляк за высокія навуковыя дасягненні быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй 2-й ступені, а ў ГДР атрымаў ганаровае званне доктара філасофіі. Гісторык з Дзісны узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і шматлікімі медалямі.

Памёр вучоны ў 1975 г. Яго дзейнасць у медыявістыцы атрымала далейшы працяг у працах шматлікіх вучняў.

В. А. Ермалёнак

СУШКО Павел Міхайловіч (псеўданім Язэп Сяўня, крыпт. П. С.), паэт. Нарадзіўся 7.11.1909 г. у в. Сушкі Дзісенскага павета Віленскай губерні, цяпер Міёрскі раён Віцебскай вобласці.

Бацькі П. Сушко працавалі на сельскай гаспадарцы. Да ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР ён дапамагаў ім у працы, актыўна падтрымліваў гуманістычныя антыфашысцкія ідэі народнага фронту. Пасля ўз'яднання — адзін з арганізатараў першага ў Міёрскім раёне калгаса «Баявы партызан», старшыня Чэраскага сельсавета. У Вялікую Айчынную вайну — сувязны партызанскага атрада «Масква», потым партызан 4-й Беларускай партызанскай брыгады. Пасля вайны ўдзельнічаў у аднаўленні разбуранай гаспадаркі.

Друкавацца П. Сушко пачаў у 1938 г. у прагрэсіўных газетах і часопісах Заходняй Беларусі. У газеце «Кліч партызана» (орган Міёрскага падпольнага рай-

П. М. Сушко

кама КП(б)Б) у 1943 г. выступаў з нататкамі пад псеўданімам Язэп Сяўня. Пісаў вершы пра заходнебеларускае падполле, гераізм партызан, услаўляў радасць мірнай працы, апяваў харство родных краявідаў. Яго паэзія шчырая, непасрэдная, прасякнутая дабрынёй, еднасцю з людзьмі працы. Да ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР яго творы распаўсюджваліся сярод падпольшчыкаў і працоўных, заклікалі іх на барацьбу з нацыянальнымі прыгнятальнікамі. «Марш беларускіх партызан» на словы П. Сушко спявалі народныя мсціўцы. У пасляваенны час выступаў з вершамі і допісамі ў раённай газеце, абласным і рэспубліканскім друку. Вершы П. Сушко «Сцяжынка» і «Ой, ішла дзяўчына» пакладзены на музыку М. Пятрэнкам і А. Палонскім. У Вільнюсе, у акадэмічнай бібліятэцы, захоўваецца рукапісны зборнік яго вершаў «Адгалоскі» (1939). Памёр 26.9.1974 г.

Беларускія пісьменнікі. Біябібліяграфічны слоўнік: У 5 т. Мн., 1995. Т. 5. С. 453.

Не згасае полымя таленту

Павел Міхайлавіч СУШКО — першы паэт Міёршчыны — пражыў вялікае творчае жыццё: творчае — як патомнага хлебароба, творчае — як паэта-самародка, творчае — як старэйшага таварыша, дарадцы і настаўніка маладых паэтаў-землякоў. Сярод іх Сяргей Панізнік, Браніслаў Мароз, старэйшы сын Пятро Сушко і многія іншыя, хто не так часта друкуецца, але для каго літаратурная творчасць стала музыкай душы на ўсё жыццё.

Кніга вершаў Паўла Міхайлавіча Сушко ў выдавецтве, і землякі з вялікім нецярпеннем чакаюць сустрэчы з паэтам, хаця яму «жыццё даткала кросны». Ён памёр 26 верасня 1974 г. І да апошніх дзён на яго вуснах трымаліся словы сардэчнай удзячнасці Максіму Танку, які яшчэ ў маладыя гады, «сеючы, закінуў» са сваёй паэтычнай сяўні ў ягонае сэрца «залатыя шолахі вясны». З вялікім паэтам Паўлу Міхайлавічу так і не давялося ні разу сустрэцца асабіста. Затое колькі было сустрэч завочных, калі заходнебеларускія газеты даносілі з Вільні да вёскі Сушкі ў канцавую з 30 хатак гарачыя танкаўскія вершы. Час ад часу ў якім-небудзь нумары шчаслівіла яму адшукаць і свой верш.

Нарадзіўся Павел Міхайлавіч Сушко ў сям'і селяніна-бедняка. Рана страціўшы бацьку, яшчэ падлеткам вучыўся разам з крыху старэйшым братам Ігнасем і араць, і сеяць, і касіць. Вось толькі ў школе вучыцца давялося мала — толькі тры зімы. Аднак была да кніжак свая ахвота, і ўзятак ведаў усё ж паступова папаўняўся. Не песціла яго жыццё, але любіў чалавек заспяваць песню з начлежнікамі, палетуценіць пра шчаслівейшую долю.

Хто злічыць, колькі выплакала слёз маці, калі не стала дома абодвух сыноў? Старэйшага забралі ў астрог, малодшага — у войска. Вайсковая муштра падарвала здароўе юнака і яго камісавалі, прадракаючы раннюю смерць ад сухотаў. І толькі маці сваім сэрцам і рознымі зёлкамі выстаралася для яго працяглую адтэрміноўку. Адтэрміноўку для таго, каб змог чалавек спаткаць у сваім жыцці каханне, зведаць радасць бацькоўства, клікаць вершамі лепшае заўтра для сваіх дзяцей, роднай беларускай моваю сцвярджаць сваю чалавечую годнасць.

Вясной 1939 г. прыляцела з Вільні вестка-прапанова сабраць друкаваныя вершы разам і выпусціць асобным выданнем. Вірлівае жыццё перашкодзіла гэта зрабіць. Падзеі апярэджвалі адна другую. Водгулле ваеннага пажару на захадзе. Вызваленчы паход Чырвонай Арміі і ўз'яднанне Беларусі. Перабудова жыцця на былых «усходніх крэсах» на савецкі лад.

Павел Сушко — удзельнік гэтай пера-

будовы. Яго выбіраюць старшынёй сельскага Савета. Аб'яднанне сялянскай гаспадаркі ў калгасы не абыходзілася без супраціўлення заможнікаў.

Вераломны напад гітлераўцаў. Фашысцкая акупацыя. Прыпомніўшы старшынёўства пры Саветах, прадстаўнікі «новага парадку» адпраўляюць Паўла Міхайлавіча ў канцлагер. З дапамогай паплечніка па падпольнай барацьбе яму ўдаецца ўсё ж выбрацца з-за калючага дроту і заняць сваё месца ў радах народных мсціўцаў 4-й Беларускай партызанскай брыгады.

Пасля вызвалення Беларусі П. М. Сушко як нестраявога мабілізуюць на працоўны фронт. На некалькі гадоў яго месцам жыхарства становіцца Сібір, пакуль дазваляе стан здароўя. Вярнуўшыся дадому і крыху адпачыўшы, ён падтрымлівае калектыўную гаспадарку, што пачынае ўзнімацца пасля ліхалецця. Працуе ў паляводстве, потым у будаўнічай брыгадзе калгаса «Баявы партызан», будуе кароўнікі і жылыя дамы, муруе печы.

Не пакідаў і пісаць вершы. Яны даволі часта друкаваліся ў раённай і абласной газетах, а час ад часу і ў рэспубліканскіх выданнях. У лістападзе 1963 г. з падборкай твораў Паўла Сушко пазнаёміў сваіх чытачоў часопіс «Полымя». Нізка вершаў паэта ўвайшла ў калектыўны зборнік твораў паэтаў з былой Заходняй Беларусі «Сцягі і паходні».

Павел Міхайлавіч Сушко многае ўмеў у жыцці: шчыра працаваць і самаадданa змагацца, радавацца жыццю, пяшчотна любіць і хораша перадаваць у вершах свае пачуцці.

Слова пра паэта

Уладзімір Калеснік ў кнізе «Сцягі і паходні» пісаў: «Мастацкімі дакументамі перажыванняў заходнебеларускага перадавога селяніна з'яўляюцца вершы Паўла Міхайлавіча Сушко, зараз калгасніка сельгасарцелі «Баявы партызан» Міёрскага раёна. Гэта вершы пра заходнебеларускае падполле, драматызм антыфашысцкай барацьбы, пра гераізм партызан і радасці мірнага жыцця. Усё гэта створана на аснове асабістага вопыту аўтара».

С. П. Матэленак, кіраўнік літаратурнага аб'яднання пры раённай газеце ў другой палове 50-х гадоў:

«Я нарадзіўся і вырас у вёсцы Сушкі, пасуседству з Паўлам Міхайлавічам. А па-сапраўднаму пачаў сябраваць з паэтам у 1957 г., калі пасля службы ў Савецкай Арміі рэдакцыя раённай газеты даверыла мне кіраўніцтва літаратурным аб'яднаннем. З Сушкоў, часцей за ўсё пешшу, дабіраліся мы з Паўлам Міхайлавічам у рэдакцыю на пасяджэнні і разам вярталіся дамоў. Па дарозе завязваліся цікавыя размовы аб вершах, аб людзях, падзеях, жыцці. І адгалоскамі гэтых гутарак потым гучалі радкі з надрукаваных у газеце допісаў і вершаў аб вядомых земляках-хлебаробах, зменах у калгасным жыцці, асэнсаванні пераўтварэнняў у роднай вёсцы і ва ўсёй краіне. Яго, будаўніка, радавалі новыя дамы на старых ваенных папялішчах, і гэтая радасць прасілася выліцца на паперу вершаваным радком. Асабліва дарагі мне адзін з такіх вершаў пад назвай «Узнёсласць», напісаны пазней, калі я ўжо працаваў старшынёй калгаса імя Мічурына:

Дзе вайною было ўсё разбурана,
Пустазелле цвіло ажно жах,
Расцвітае калгас імя Мічурына
У наш час і у нас на вачах.

Багаты вопыт, веданне жыцця дазвалялі Паўлу Міхайлавічу востра адчуваць подых новага, патрэбы народа, клопаты селяніна. І гэта пачуццё ва ўвесь голас гучала ў вершах паэта са старонак заходнебеларускай «Нашай нівы», выдаваемай у Вільні, падмацоўвалася справай у час старшынёўства ў сельскім Савеце, на партызанскіх сцежках у час Вялікай Айчыннай, на будоўлях аднаўленчага перыяду.

1945 — ДА НАШЫХ ДЗЁН

Кожная сустрэча з Паўлам Міхайлавічам — сапраўднае свята. Ён заўсёды мог парадаваць новымі вершамі, здзівіць мелодыяй на балалайцы, развесяліць дасціпным жартам, прыгожа спяваў.

Такім жа працалюбівым, актыўным, дзейсным Павел Міхайлавіч заставаўся і ў апошнія гады свайго жыцця, ужо будучы на пенсіі. Паэт часта сустракаўся з вучнямі Чэраскай, Навакрукаўскай і Маляўскай школ, расказваў ім аб ваенным ліхалецці, выступаў на вечарах паэзіі перад хлебаробамі калгасаў «Баявы партызан» і імя Мічурына.

Да апошняй хвіліны свайго жыцця Павел Міхайлавіч заставаўся ў радах байцоў. І калі ўжо хворага яго запрасілі ў райцэнтр на святкаванне гадавіны вызвалення Міёршчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, былы партызан не ўседзеў дома. Сабраўшы апошнія сілы, ён у апошні раз прайшоў у страі сваіх таварышаў-ветэранаў па зямлі, за якую змагаўся.

Як правільна сказаў паэт К. Куліеў:

Нередко думаю я, став старее,
Что жизнь вершит неправый суд,
Что умирают лучшие скорее,
Ведь лучшие себя не берегут».

Сцяг працы. 1979. 14 крас.

Беларусі

Ну, з чаго б тыя словы мне выкаваць,
у гарніле якім гартаваць,
каб любоў сваю шчырую выказаць,
што табе я хачу перадаць.
Ты ж уся, як вясёлка квяцістая,
як сатканая з промняў кайма,
залатая, святая, агністая,
наша ясная доля сама.

Павел Сушко

СУШКО Пятро (Пётр) Паўлавіч (псеўданімы Пятрусь Абаранак, Ясь Ажынскі, Міхась Валашковіч, Цімох Дзераза, Халімон Клін, Яська Лысы, Апанас Парнаскі, Кастусь Паўлюковіч, Р. Рамянец, Пятрок Рамянец, Кірша Рымар, Раман Сітковіч, Тамаш Тутэйшы), паэт, перакладчык. Нарадзіўся 1.1.1937 г. у в. Сушкі Браслаўскага павета Віленскага ваяводства, цяпер Міёрскі раён Віцебскай вобласці, у сям'і заходнебеларускага сялянскага паэта Паўла Міхайлавіча Сушко. Паэтычная творчасць бацькі аказала непасрэднае ўздзеянне на выбар шляху П. Сушко. У час Вялікай Айчыннай вайны ён знаходзіўся з маці, Надзеяй Раманаўнай, у партызанскім атрадзе. У 1953 г. закончыў Чэраскую сямігодку, у 1956 г. Міёрскую сярэднюю школу. У 1956—1958 гг. працаваў выхавацелем Александроўскага дзіцячага дома ў Міёрскім раёне, лабарантам у сярэдняй школе. Адслужыўшы ў Савецкай Арміі (1959—1961), паступіў на факультэт журналістыкі БДУ, які скончыў у 1966 г. Працаваў загадчыкам аддзела ў міёрскай раённай газеце «Сцяг працы» (1966—1968), карэспандэнтам газеты «Віцебскі рабочы» (1968—1969). Пераехаўшы ў Мінск, быў літсупрацоўнікам газет «На страже Октября» (1969—1970), «Звязда» (1970—1973), часопіса «Вожык» (1973—1977). У 1977—1980 гг. — рэдактар аддзела літаратуры часопіса «Вожык», у 1980—1987 гг. — адказны сакратар штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва». Затым працуе старшым рэдактарам у выдавецтве «Полымя».

Друкавацца П. Сушко пачаў у 1954 г. у міёрскай раённай газеце «Зара каму-



П. П. Сушко

нізму» (верш «Цёплы дождж»). Аўтар гумарыстычна-сатырычных зборнікаў «Ганарлівы сучок», «Восці напагатоў», «Парнаская кузня», «Касіў Ясь каню-шыну», «Роздум ля Парнаса», кнігі «Паэтычнае веча» — першага ў беларускай літаратуры вянка парадыйных санетаў, якія вызначаюцца глыбокім філасофскім зместам. Для яго творчасці ўласцівы акрэсленасць аўтарскай пазіцыі, адэкватнасць выяўленчых сродкаў, афарыстычнасць, дасціпнасць. Плённа працуе і ў лірыцы. Яго зборнік «Пратокі» і вянок санетаў «Зямля гаючых траў» вызначаюцца глыбінёй пачуццяў, узнёсласцю думак, арыгінальнасцю вобразаў. Піша вершы для дзяцей (зборнікі «Вясёлы бай», «Чмялёва гушчалка»), перакладае з польскай і ўкраінскай моў. Песні на словы П. Сушко напісалі А. Палонскі, Л. Свердзел. Аўтар вершаваных подпісаў пад агітплакатамі. Член СП Беларусі з 1984 г.

Памёр у 1997 г.

Беларускія пісьменнікі. Біябібліяграфічны слоўнік: У 5 т. Мн., 1995 . Т. 5. С. 454.

Салдацкая сляза

Была няласкаваю доля,
Ды не губляў надзей юнак.
— Не буду хныкаць я ніколі, —
Сказаў, — бо гэта кепскі знак.

Паранены на ратным полі,
Шаптаў знядужаны юнак:
— Не буду плакаць і ад болю.
Салдацкі плач — нядобры знак.

Бездапаможным у няволю
Яго забралі, а юнак
Рашыў і тут:
— Не заскуголю,
Бо толькі ўсмешка — сілы знак.

Нялёгкі шлях пераадолеў,
У родны край прыйшоў юнак,
Сказаў:
— Не плакаў я ніколі,
А сёння — гэта проста так.

Пятро Сушко

Ф. Ф. Струй

СТРУЙ Фёкла Фёдараўна. Нарадзілася ў 1910 г. у Дзісне ў сям'і рабочага. Закончыла 7-класную польскую школу. Пасля прыходу Чырвонай Арміі ў верасні 1939 г. пачала працаваць настаўніцай пачатковых класаў Дзісенскай няпоўнай сярэдняй школы. Выбрана дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Працавала старшынёй гарсавета. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны эвакуіравана ў Тамбоўскую вобл. Пасля настойлівых просьб накіравана ў партызанскі атрад у тыл ворага. Паранена ў нагу ў час баёў з фашыстамі, моцна абмарозілася. Самалётам эвакуіравана за лінію фронту, працяглы час лячылася ў розных шпіталях, перанесла ампутацыю і рэампутацыю абедзвюх ног у Ташкенце.

Пасля вайны працяглы час працавала намеснікам старшыні Дзісенскага раённага Савета дэпутатаў працоўных, старшынёй Дзісенскага гарсавета. Персанальная пенсіянерка.

У апошнія гады жыве ў Мінску.

Пример служения Родине

...По пыльным дорогам войны вместе с отступающими войсками на Восток дни и ночи двигалась девушка из Дисны. На ее глазах самолеты с фашистской свастикой разрушали города и села, калечили и убивали детей, женщин, стариков. Фекла привыкла ко всему, перестала плакать, лишь взгляд стал более суровым. В Витебске она вступает

в отряд ополчения, роет окопы, учится стрелять, пренебрегая опасностью, тушит зажигательные бомбы во время налетов вражеской авиации. В деревне на Тамбовщине она, не зная сна и отдыха, трудится на колхозных полях, убирает хлеб. Из газет и радио т. Струй узнает о действиях первых партизанских отрядов в оккупированной Белоруссии. Всю ночь она не смогла уснуть, мысленно переносилась в родные края. Утром девушка пришла в обком партии.

— Помогите мне пробраться к партизанам, не могу в такое время сидеть в тылу,— просила Фекла секретаря.

Струй пишет письмо в ЦК Компартии Белоруссии, настаивает на отправке ее в партизаны. Желание девушки исполнилось. Ночью на самолете группу товарищей, в том числе и Феклу, доставили в глубокий вражеский тыл.

Фекла Федоровна показывает маленький кусок белого материала.

— Храню его, как реликвию,— говорит она.

Это удостоверение, выданное т. Струй подпольным Вилейским обкомом партии. Читаем: «Командируется для выполнения спецзадания».

— Послали меня,— продолжает свой рассказ Фекла Федоровна,— в партизанский отряд имени Сталина. Проводила политинформации, беседы среди бойцов, ходила с ними в разведку, на боевые задания.

Немало хлопот причиняли врагу белорусские партизаны. Внезапно ночью они врывались во вражеские гарнизоны и сеяли страх и смерть среди гитлеровцев, пускали под откос эшелоны с боеприпасами и фашистскими войсками, спасали советских людей от каторги на чужбине. Против партизан немцы бросили крупные регулярные части.

Отряд оказался во вражеском окружении. Несколько суток голодные, усталые партизаны пробирались по тайным тропам. Фекла Федоровна поднимала боевой дух бойцов, вселяла в них уверенность в победу.

Группа бойцов отправилась на разведку в ближайшую деревню. Среди них находилась и т. Струй. На улице и в домах ни души. Вдруг в деревню нагрянули полицейские. Завязалась горячая схватка. Фекла первой бросилась на врага. Меткий выстрел, и правофланговый полицай замертво упал на землю. Воодушевленные разведчики устремились вперед. Враг был смят, уничтожен, двое полицейских взяты в плен. Разведчики благополучно возвратились в отряд.

Сжималось вражеское кольцо блокады. Пятые сутки люди, измученные бессонницей, голодом, находились в густом лесу. Выход оставался один — с боем прорываться. Молча пошли партизаны в атаку. Плечом к плечу с бойцами шла Фекла. Самым трудным оказалось форсировать железную дорогу. Фашисты били из бронепоезда, минометов, встретили партизан стеной огня. На ходу стреляя, мелкими перебежками продвигалась Фекла. Слева и справа шли товарищи. «Еще рывок, вперед, вперед!» — подбадривала она партизан.

Рядом разорвалась вражеская мина. Обливаясь кровью и теряя сознание, упала Фекла...

Фекла пришла в себя, почувствовала страшные боли во всем теле и вновь потеряла сознание. Еще более тяжелое испытание ждало впереди. В примитивных условиях ей отняли обе ноги, трижды эвакуировали, а затем самолетом доставили в Ташкент. Врачи посмотрели раненую и немедленно сделали реампутацию. Часто ночью Фекла в горячке просыпалась, ощупью руками искала ноги, и там, где они должны быть, находила пустое место...

В госпитале т. Струй окружили вниманием и заботой. Ее навещали рабочие и крестьяне, фронтовики и ученые, приносили подарки и книги. Самым ценным и дорогим подарком оказался роман Н. Островского «Как закалялась сталь». Сколько раз, лежа неподвижно на госпитальной койке, перечитывала

Фекла Федоровна страницы этой незабываемой книги! Николай Островский научил ее бороться со страшным недугом, за право жить и трудиться.

Отважную белорусскую партизанку посетила в госпитале белорусская поэтесса Эди Огнецвет. Она вручила ей оригинал стихотворения «Лесная быль» с эпиграфом: «Посвящаю отважной дочери белорусского народа — Фекле Федоровне Струй». Поэтесса писала:

Слава чыстаму сэрцу! Такое нідзе не загіне.
Хай дазнаюцца ў свеце
аб гэтай маленькай дзяўчыне.

Вскоре т. Струй переводят в Москву. Вновь она переносит операцию — вторично производят реампутацию.

И в госпитале Ф. Ф. Струй старается быть полезной. Она проводит агитационную работу среди раненых солдат, читает им книги, воодушевляет тяжелобольных. Солдаты возвращались на фронт, домой и присылали в Москву Фекле Федоровне трогательные, душевные письма. Как драгоценный документ хранит т. Струй письмо солдата Киселева. «После операции, в те тяжелые и трудные минуты моей жизни, — писал солдат, — вы своей заботой и чутким вниманием вливали в мой организм силу и бодрость, возвращали меня к жизни, призывали бороться и побеждать».

В 1945 г. Фекла Федоровна возвращается в родную Дисну. Здесь она застает одни развалины. Ф. Струй принимает самое активное участие в восстановлении хозяйства района. Сначала работает заместителем председателя райисполкома, а затем семь лет — председателем городского Совета. Она помогает жителям города доставать строительные материалы, лес, по заданию райкома партии выступает в колхозах с политическими докладами. Более 350 индивидуальных домов построено жителями г. Дисны. Все застройщики получили государственный кредит. Председатель горсовета помогла построить жилые дома одинокой матери Фекле Иосифовне Прокопенко, Ольге Ивановне Косатой и многим другим. По инициативе Феклы Федоровны сессия райисполкома назначила ежемесячную денежную помощь престарелой, одинокой женщине Святогор Марии Казимировне. Многие жители Дисны тепло отзываются о т. Струй, благодарят ее за чуткость и внимание.

Рассказы о наших земляках. Молодечно, 1959. С. 110—114.

ТЫЧКА Галіна Казіміраўна. Нарадзілася 11.11.1955 г. у в. Сташулі. З 1963 г. вучылася ў Міжрэцкай пачатковай школе, потым перайшла ў сярэднюю ў в. Павяцце. Скончыла яе ў 1973 г. У тым жа годзе стала студэнткай філалагічнага факультэта БДУ. У 1978—1979 гг. працавала настаўніцай на Шклоўшчыне. У 1979 г. залічана перакладчыцай польскай мовы ў Бюро міжнароднага турызму моладзі «Спутнік». У 1987 г. стала супрацоўніцай аддзела крытыкі штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва». З 1993 г. працуе рэдактарам у часопісе «Полымя».

Першыя крытычныя артыкулы Г. Тычкі апублікаваны ў рэспубліканскім друку ў 1984 г. Асноўная іх тэматыка — сучасная беларуская проза, яе маральна-этычныя пошукі. Часта выступае з рэцэнзіямі на новыя кнігі, крытычнымі аглядамі.

Жыве ў Мінску. Крытык, літаратуразнавец. Кандыдат філалагічных навук (1987). Член СП Беларусі з 1993 г.

ЦІТОВІЧ Генадзь Іванавіч, беларускі савецкі харавы дырыжор, этнамузыказнавец, кампазітар. Нарадзіўся 25.7.1910 г. у в. Новы Пагост Міёрскага раёна. Народны артыст СССР (1968), народны артыст БССР (1955). Вучыўся ў Віленскім універсітэце (1936—1939). Скончыў Віленскую кансерваторыю (1939). У 1939 — 1941 і 1945—1951 гг. — рэдактар абласнога радыё, кансультант Дома народнай твор-

Г. І. Цітовіч

часці ў Баранавічах. У 1974—1975 гг. — старшы навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Стварыў у в. Вялікае Падлессе Ляхавіцкага раёна народны хор (1952), рэарганізаваны ў 1959 г. у Беларускі дзяржаўны ансамбль песні і танца, у 1964 г. — у Дзяржаўны хор БССР, якім кіраваў да 1974 г. Вёў вялікую збіральніцкую, навуковую, прапагандысцкую дзейнасць. Запісаў больш за 3 тыс. беларускіх (пераважна), рускіх, украінскіх, польскіх, балгарскіх, літоўскіх, латышскіх народных песень, танцаў, інструментальных найгрышаў. Зрабіў для хору шмат канцэртных апрацовак уласных запісаў. У зборніках беларускіх народных песень, складзеных на аснове крытэрыю мастацкіх якасцей іх напеваў і тэкстаў, раскрыў жанрава-стылявое багацце беларускага песеннага фальклору. Даследаваў міжславянскія і славяна-балцкія народнапесенныя сувязі, гістарычнае развіццё беларускай народнай музыкі, беларускае народнае шматгалоссе, традыцыйны і сучасны фальклор у музычным побыце вёскі. Зрабіў значны ўклад у станаўленне і развіццё самадзейнага музычнага мастацтва Беларусі. Актыўна выступаў у перыядычным друку, аўтар шэрагу цыклаў тэле- і радыёперадач. Дзяржаўная прэмія БССР у 1978 г. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі ў 1968 г. Памёр 21.6.1986 г.

Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1989. С. 521.

Как родилась песня

...Интересный и нелегкий жизненный и творческий путь прошел Геннадий Иванович. Он родился в семье сельских учителей в местечке Новый Погост. Родители мечтали дать сыну хорошее образование, но в условиях панской Польши осуществить это простому незажиточному человеку было почти невозможно. Единственным учебным заведением, где можно было рассчитывать хотя бы на маленькую стипендию, была семинария, и по настоянию отца в 1923 г. он поступает туда. Но изучение богословских «наук», схоластических и оторванных от жизни, не только не укрепило веру юноши в «бессмертие души», а, наоборот, сделало его убежденным воинствующим атеистом. Приезжая на каникулы домой в деревню, он хорошо видел, какими мыслями и надеждами живет угнетенный народ западных областей Белоруссии. Юноша сознавал, что не «слово божие» должен нести он своим односельчанам, а что-то другое — полезное и нужное. Увлеченный этими мыслями, он, несмотря на многочисленные препятствия и трудности, выдерживает приемные экзамены в Виленский университет и становится студентом естественно-математического факультета.

К этому же периоду относятся и первые записи белорусских народных песен, любовь к которым воспитала у Цитовича родная бабушка — лучшая песенница в округе. Собрав довольно значительное количество фольклорных записей, студент решает показать их профессору Виленской консерватории Шелиговскому. Заметив старание и хорошее знание дела, а также большие музыкальные способности юноши, профессор предложил ему стать студентом консерватории. Предложение это с радостью было принято. Немного позже студента консерватории Цитовича направляют одновременно на учебу в университет, где он под руководством про-

фессора Машинского начинает изучать общую и славянскую этнографию.

Уже через год после начала занятий в консерватории молодой этнограф сделал первый научный доклад — «Беларускія валачобныя песні», который в сокращенном виде печатался в Вильно. В последующие три года Цитович сдает в печать научную работу «Белорусская народная музыка», делает многочисленные доклады, которые отличаются не только хорошим знанием материала, но и интересными научными обобщениями («Значение мелиографии для диалектологического исследования», «Песни Виленщины», «Белорусские истоки «Литовской рапсодии» Карловича» и т. д.), готовит разделы о славянской народной музыке для третьего тома научного труда профессора Машинского «Народная культура славян», который был издан в 1939 г. в Кракове.

Параллельно с научной работой и занятиями в консерватории и университете молодой этнограф много сил и времени отдает сбору белорусского народного фольклора. В те времена это было делом не только нелегким, но подчас и опасным. Правительство панской Польши проводило в «кресах восточных» жестокую колонизаторскую политику принужденного ополячивания белорусского населения. Геннадий Иванович хорошо знал, что в таких условиях собранный им материал не сможет быть напечатан, а музыкальные записи никогда не будут исполнены на концертной эстраде. Однако, несмотря на все это, он с неутомимой энергией продолжает благородный труд. Не пользуясь никакой материальной поддержкой начальства консерватории, преодолевая многочисленные полицейские рогатки, он на страх и риск на сэкономленные за счет питания и одежды деньги ежегодно совершает все более продолжительные фольклорные экспедиции...

После воссоединения Западной и Восточной Белоруссии Цитовича приглашают на должность редактора музыкальных передач Барановичского областного радио, и этой работе он отдает все свои знания и опыт. Геннадий Иванович организует концерты белорусской музыки, привлекает к участию в них лучших артистов-профессионалов и любителей, читает лекции о белорусской музыке, организует по всей области многочисленные народные хоры, среди которых был и известный хор деревни Большое Подлесье, а вместе с этим продолжает свои фольклорные экспедиции.

К тому времени им было записано и систематизировано более полутора тысяч народных песен и танцев. После воссоединения Белоруссии в едином социалистическом государстве все эти записи, лежавшие раньше мертвым капиталом на рабочей полке этнографа, сделались действительно неоценимым сокровищем. Геннадий Иванович щедро делится им с композиторами, музыкальными коллективами, отдельными исполнителями, и вскоре записанные им песни зазвучали не только в Белоруссии, но и на концертных площадках Москвы и многих других городов Советского Союза.

После Великой Отечественной войны, временно прервавшей работу этнографа, Геннадий Иванович вновь возвращается на радио, работает в областном отделе искусства и консультантом Дома народного творчества, руководит многими самодеятельными коллективами. Он систематически продолжает заниматься сбором музыкального фольклора и участвует во всех без исключения фольклорно-этнографических экспедициях Академии наук БССР. Вместе с тем он неутомимо трудится в области музыковедения, читает доклады и лекции о музыкальной культуре белорусского народа, активно сотрудничает в печати, издает фольклорные сборники.

В 1946 г. Г. И. Цитович в Москве в Институте этнографии Академии наук СССР делает доклад «Белорусская народная музыкальная практика сегодня», на конференции по этнографии При-

балтики в Риге — «Из опыта творческого изучения современной народной песни», на сессии Института искусствоведения Академии наук Украинской ССР во Львове — «Украинско-белорусские связи в области народной музыки». Большую научную ценность имеют его искусствоведческие очерки и статьи: «Народная песня в современном быту белорусов» и «Песня счастья» (журнал «Советская музыка»), «Революционное народное творчество Западной Белоруссии» и сборники «Двухголосая белорусская народная песня» и «Песня счастья». Сочным и доступным языком написаны Геннадием Ивановичем цикл его популярных концертов-лекций «Белорусские народные песни календарного круга», концерт-очерк для радио «Песни борьбы» и многие другие статьи.

Для Цитовича-музыковеда характерны глубокий научный анализ, хорошее знание фактического материала, смелые обобщения, обстоятельный разбор, логическая последовательность и ясные выводы. Наиболее важное в работе музыковеда то, что он одним из первых сумел проследить и теоретически обосновать последовательность процессов развития народного музыкального искусства, последовательность перехода от старой традиционной до современной народной песни, расширение ее диапазона, ритмичные и мелодичные изменения.

Г. Цитовичу принадлежит также и приоритет в области исследования истории развития традиций двухголосого исполнения народной песни в Белоруссии. Являясь прекрасным знатоком музыкальной культуры славянских народов, Геннадий Иванович в своих трудах первый сделал обстоятельное исследование взаимных связей народной музыки трех братских народов — белорусского, русского и украинского.

Большая заслуга музыковеда в том, что он одним из первых этнографов посвятил себя собиранию и изучению современного народного музыкального творчества. Труд Г. Цитовича в этой области имеет чрезвычайно важное значение потому, что в современной песне, как в капле воды, отражаются гигантские социальные и культурные изменения, происшедшие в жизни народа за годы Советской власти.

Творческие успехи Геннадия Ивановича в значительной степени объясняются его огромнейшей эрудицией, глубоким и всесторонним знанием жизни народа. Это дает ему возможность затрагивать в своих исследованиях такие, казалось бы, далекие от фольклористики темы, как, например, «Рациональное в белорусской народной медицине».

Г. Цитович не только признанный авторитет в этнографии и ученый-музыковед. Он также неутомимый, пламенный пропагандист белорусской музыкальной культуры и требовательный музыкант. С 1952 г. он — художественный руководитель созданного им Белорусского народного хора. В репертуар хора входят кроме песен советских композиторов народные песни разных районов Белоруссии, часть из которых записана самим Цитовичем. Его перу принадлежат также и несколько оригинальных песен, созданных в народном стиле,— «Беларусь мая», «Зося», «Калгасны вальс», «Перамога» и др.

Занятый большой научной, исполнительской и общественной деятельностью, часто находясь в гастрольных поездках, Геннадий Иванович находит время для сбора нового фольклорного материала, и число песен, записанных им, превысило уже три тысячи.

Так возвращается народу лучшее, взятое у него, но в каком чудесном и богатом оформлении! Такое оформление может создать только действительно талантливый и чуткий художник, всей душой преданный искусству, каким является народный артист БССР Геннадий Иванович Цитович.

Рассказы о наших земляках. Молодечно, 1959. С. 65—72.

ШАМШУР Вячаслаў Вячаслававіч, беларускі мастацтвазнаўца, мастак, педагог, прафесар, член Саюза мастакоў Беларусі. Нарадзіўся 20.8.1942 г. у в. Пціцкія Чэраскага сельсавета. Закончыў сярэднюю школу ў Міёрах, мастацка-графічны факультэт Віцебскага педінстытута (1970), аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР (1978). Працуе ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце з 1970 г., дацэнт з 1984 г., прафесар з 1993 г. Загадчык кафедры методыкі прыкладнога выяўленчага мастацтва. Друкуецца ў перыядычных выданнях з 1977 г. Адзін з першых беларускіх даследчыкаў творчасці Малевіча, Шагала, Лісіцкага, Ермалаева і іншых мастакоў у паслярэвалюцыйным Віцебску. Аўтар манаграфіі «Аб агітацыйна-афармленчым мастацтве Беларусі» (1989), раздзела 6-га тома «Гісторыі беларускага мастацтва», шэрагу навуковых артыкулаў у перыядычным друку па этнаграфіі і мастацтву Беларусі, метадычных і навучальных дапаможнікаў. Актыўна займаецца творчай дзейнасцю. Удзельнік мастацкіх выстаў з 1986 г. Працуе ў станковай графіцы (пейзаж, партрэт, нацюрморт). Стварыў серыю графічных прац «Дарога на Міёры», «Віцебск і Віцебшчына», шмат асобных карцін — «Зімовыя карцінкі» (1986), «Хутка ў вырай» (1987), «Забавы дзяцінства. Калаўрот» (1987), «Акоціца» (1988), «Велікодная раніца» (1990), «Вячэрняя літургія» (1996) і інш. Творы вызначаюцца выразнасцю пластычнай мовы, нацыянальным каларытам, эмацыянальным настроем. У сваёй большасці яны скіраваны на адраджэнне нацыянальнай духоўнасці.

Вялікае месца ў творчасці мастака займаюць матывы роднай Міёршчыны.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства асветы БССР, значком «Выдатнік народнай асветы».

Жыве ў Віцебску.

В. В. Шамшур

ШУМАНСКІ Міхаіл Рыгоравіч, беларускі савецкі спявак (тэнар). Нарадзіўся 20.10.1920 г. у в. Пераброддзе ў сялянскай сям'і. Валодаючы прыроджаным талентам спевака і музыканта, рана пачаў спяваць у мясцовым хоры, самастойна асвоіў скрыпку, спрабаваў пісаць песні («Трактарыст», 1940). У 1940 г. прыняты разам з В. І. Юневічам у Дзяржаўную акадэмічную харавую капэлу БССР пад кіраўніцтвам Рыгора Шырмы. Выступаў у дуэце з В. І. Юневічам. У аснове рэпертуару ансамбля беларускія народныя песні і творы беларускіх кампазітараў (А. Багатырова, Р. Пукста, Ю. Семянякі, А. Туранкова і інш.). Заслужаны артыст БССР з 1955 г. Памёр 4.11. 1982 г.

ЮНЕВІЧ Васіль Іосіфавіч, беларускі савецкі спявак (бас). Нарадзіўся 25.16.1916 г. у сялянскай сям'і, што знаходзілася ў эвакуацыі ў Растове-на-Доне. Неўзабаве разам з бацькамі вярнуўся ў родныя мясціны — в. Пераброддзе. Закончыў духоўную семінарыю ў Вільні. З дзяцінства меў схільнасць да музыкі і песні. Як і бацька, працаваў псаломшчыкам у мясцовай царкве. Удзельнічаў у мясцовым хоры, а ў 1940 г. разам з М. Р. Шуманскім уліўся ў Дзяржаўную акадэмічную харавую капэлу БССР пад кіраўніцтвам Рыгора Шырмы. Удзельнік вядомага вакальнага дуэта з М. Р. Шуманскім; у рэпертуары ансамбля вялікае месца

належыць беларускім народным песням і творам беларускіх кампазітараў (А. Багатырова, Р. Пукста, Ю. Семянякі, А. Туранкова). Заслужаны артыст БССР з 1959 г., узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны». Памёр 17.2. 1977 г.

ЯЛЕНСКІ Пётр, аўтар карэспандэнцый у «Нашай ніве». Жыў у в. Міршчына Лявонпальскай воласці Дзісенскага павета. Яго матэрыялы пачалі друкавацца з 1913 г. — вершы, апавяданні, замалёўкі, жарты і інш. Змяшчаліся пад псеўданімам Пётра Беларус да сярэдзіны 1915 г. Апавяданне «Якім Бяздольны» выйшла ў славутай друкарні Марціна Кухты асобным выданнем. У творах «Чуткі з-пад Дзісны», «Убіўства», «У кузні», «Лякарства ад беднасці» і іншых выступаў супраць непісьменнасці і бескультур'я дарэвалюцыйнай вёскі, узнімаў тэму сацыяльнай няроўнасці, паказваў зараджэнне ў свядомасці сялян пратэсту супраць парадкаў царскай Расіі. Апавяданне «У кузні» ўвайшло ў хрэстаматыю «Беларуская дакастрычніцкая проза», выдадзеную ў 1965 г.

В. А. Ермалёнак

ІХ ШЛЯХІ ПРАЙШЛІ ПРАЗ МІЁРШЧЫНУ

Выдатны даследчык гісторыі Падзвіння

Усім, хто сур'ёзна займаецца даследаваннямі мінулага Браслаўшчыны, Міёршчыны, Шаркоўшчыны, Глыбоччыны, добра знаёма імя Отана Гедэмана — таленавітага краязнаўцы, гісторыка, аўтара шэрагу выданняў, заснаваных на багацейшым архіўным матэрыяле. Дзейнасць яго прыпадае на 20—30-я гады нашага стагоддзя, калі акрэслены рэгіён уваходзіў у склад Польшчы, з'яўляўся часткай Віленскага ваяводства. О. Гедэман пачаў з даследавання гісторыі Браслава і Браслаўскага павета. Аднак трэба мець на ўвазе, што гістарычны Браслаўскі павет у межах XVI — XVIII стст. ахопліваў не толькі сучасную Браслаўшчыну, але і большыя часткі Міёрскага і Шаркоўшчынскага раёнаў, суседніх земляў Літвы. Вось чаму ўжо ў першай яго манаграфіі «Гісторыя Браслаўскага павета» ўтрымліваецца шмат матэрыялаў і па гісторыі сучаснага Міёрскага раёна. Пазней даследчык займаўся даследаваннямі мінулага значна большай тэрыторыі, якую ў той час вызначалі як Польскае Падзвінне.

Отан Гедэман займаўся гістарычнымі даследаваннямі менш 10 гадоў. За гэты невялікі тэрмін ён здолеў падрыхтаваць да выдання сем кніг, восьмая, прысвечаная гісторыі Белавежскай пушчы, пабачыла свет ужо пасля смерці аўтара. Кнігі О. Гедэмана розныя па тэматыцы, аб'ёму, значнасці. Але ўсе яны напісаны жывой выразнай мовай на падставе глыбокага вывучэння велізарнай колькасці крыніц, перш за ўсё архіўных. Менавіта таму працы О. Гедэмана не страцілі сваёй значнасці і зараз. Яны з'яўляюцца трывалым падмуркам для далейшых даследаванняў.

Нарадзіўся О. Гедэман 29 сакавіка 1887 г. на Палессі, у Рэчыцкім павеце Мінскай губерні. Бацька яго — Магнус Ян — паходзіў з Данііі. Па прафесіі інжынер, прыехаў у Беларускае Палессе, дзе пачалі разгортвацца меліярацыйныя работы. О. Гедэман атрымаў адукацыю спачатку ў Гомельскай класічнай гімназіі, а пасля на гістарычна-філалагічным факультэце Кіеўскага універсітэта (праўда, універсітэт яму закончыць не удалося). Пасля аднаўлення польскай дзяржаўнасці О. Гедэман пераязджае ў Заходнюю Беларусь, адкуль была родам яго маці. Працаваў настаўнікам у вясковых школах Браслаўшчыны, а з 1922 г. — у агульнай школе Браслава. Працуючы з вучнямі, О. Гедэман звярнуў увагу на тое, што дзеці заўсёды больш уважліва слухаюць і лепш запа-

мінаюць расказы пра гістарычныя падзеі, якія адбываліся ў знаёмых ім мясцінах. Таму ён стаў імкнуцца падмацоўваць агульны матэрыял звесткамі з мясцовай гісторыі, якія ўдалося пачуць ад старажылаў ці дзесьці вычытаць. Аднак падобных звестак было яўна недастаткова. Паступова нарадзілася ідэя напісаць асобную кнігу па гісторыі краю. Гэтую думку падтрымаў тагачасны школьны інспектар Казімір Прухнік. Менавіта ён узяў на сябе асноўныя клопаты па арганізацыйных пытаннях, што ўзніклі на пачатку працы.

У 1928 г. О. Гедэман прыступіў да працы над задуманай кнігай. Для гэтага яму далі спецыяльны водпуск. Без яго была б немагчымай напружаная карпатлівая праца ў Віленскім і прыватных архівах. Часам даследчык праводзіў за сталом па 14 гадзін. Пазней дырэктар Віленскага дзяржаўнага архіва падлічыў, што тут Гедэман працаваў каля 400 дзён і начэй. Самаадданая праца не была марнай. Ужо ў 1930 г. пабачыла свет манаграфія «Гісторыя Браслаўскага павета» — грунтоўнае, амаль на 500 старонках, даследаванне. У межах старажытнага Браслаўскага павета даследчык прасачыў палітычныя, ваенныя, культурныя, рэлігійныя, гаспадарчыя, грамадскія працэсы, якія фарміравалі агульнае палатно мінулага рэгіёна. Асобная частка кнігі прысвечана гісторыі найбольш значных населеных пунктаў. Чытач знойдзе тут нарысы пра Міёры, Пераброддзе, Лявонпаль, Вяту, Чэрасы, Крыцавічы, Навалакі, Узмёны, Новы Пагост. Апрача гэтага шмат матэрыялаў, звязаных з сучаснай тэрыторыяй Міёршчыны, утрымліваецца ва ўсіх раздзелах кнігі. Выданне змяшчае 49 разнастайных ілюстрацый — фотаздымкаў, малюнкаў, карт. Многія з іх зараз маюць самастойную навуковую каштоўнасць. Велізарны фактычны матэрыял кнігі падмацаваны спасылкамі на крыніцы.

Манаграфія О. Гедэмана была надрукавана ў Вільні за сродкі, выдаткаваныя Браслаўскім соймікам — органам павятовага самакіравання. Амаль увесь наклад распаўсюджваўся на тэрыторыі павета. Зараз гэтую каштоўную кнігу можна сустрэць у старажылаў трох суседніх раёнаў — Браслаўскага, Міёрскага, Шаркоўшчынскага.

Пасля выдання «Гісторыі Браслаўскага павета» О. Гедэман перабіраецца ў Вільню, каб працягваць навуковыя даследаванні. Менавіта ў гэтай дзейнасці бачыў ён сваё прызначэнне. У 1934 г. выйшла з друку яшчэ адна грунтоўная праца О. Гедэмана — «Дзісна і Друя — магдэбургскія гарады», прычым большая частка выдання прысвечана Дзісне. На падставе архіўных крыніц падрабязна разглядаюцца ўсе аспекты гістарычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця двух прыдзвінскіх гарадоў, якія ў XVII — XVIII стст. былі значнымі рамеснымі і гандлёвымі цэнтрамі рэгіёна.

Багата матэрыяламі пра Міёршчыну яшчэ адна кніга О. Гедэмана — «Даўнія пушчы і воды» (1934). У ёй даследчык расказвае, як у старажытныя часы выкарыстоўваліся прыродныя багацці рэгіёна, як была арганізавана рыбная лоўля, паляванне і г. д. Гэты матэрыял надзвычай цікавы не толькі для гісторыкаў, але і для географаў, эколагаў.

У кнізе «Браслаўска-Дзісенскія завяшчанні XVII — XVIII стст. як гістарычныя крыніцы» (1935) чытач знойдзе багаты матэрыял аб маёмасным становішчы, звычаях прадстаўнікоў мясцовага шляхецкага саслоўя.

Пабачылі свет такія выданні О. Гедэмана, як «Граф Мануццы», «Глыбокае» (абедзве ў 1935 г.), «Школы Валяр'янаўскія Лужкоўскіх піяраў» (1937), артыкулы ў часопісах. 16 мая 1937 г. у росквіце жыццёвых і творчых сіл даследчык раптоўна памірае ў Вільні.

Кнігі О. Гедэмана выклікалі цікавасць у грамадскасці, прыхільна былі сустрэчы навукоўцамі. У водгуках адзначалася, што без урону навуковасці працы даследчыка вызначаюцца жывой

вобразнай мовай, утрымліваюць элементы публіцыстыкі. У 1936 г. Польскае краязнаўчае таварыства ўзнагародзіла О. Гедэмана Ганаровай граматай за выдатныя даследаванні на ніве краязнаўства. Дарэчы, ён быў заснавальнікам Браслаўскага аддзялення краязнаўчага таварыства, якое дзейнічала і пасля ад'езду даследчыка ў Вільню. Пакінуўшы педагагічную працу, О. Гедэман не ставіў сваёй мэтай зрабіць навуковую кар'еру. Усю энергію ён накіраваў на гістарычныя даследаванні і напісанне кніг, над якімі працаваў да апошніх дзён жыцця. І гэта лепшае, што ён мог даць людзям.

К. Шыдлоўскі

РЫПІНСКІ Аляксандр Феліксавіч, беларускі і польскі паэт, фальклярыст, мастак, кнігавыдавец. Нарадзіўся ў 1810 (?) г. у в. Кукавячына Віцебскага р-на. Скончыў Віцебскую гімназію. Вучыўся ў Дзінабургскай школе прапаршчыкаў, дзе пасябраваў з В. Кюхельбекерам. Удзельнік паўстання 1830—1831 гг. У будынку францысканскага кляштара ў Дзісне размяшчаўся штаб паўстанцаў Дзісенскага атрада пад кіраўніцтвам генерала А. Гелгуда. У складзе атрада змагаўся Аляксандр Рыпінскі, які пазней, ратуючыся ад катаргі, эмігрыраваў у Францыю. У Францыі зблізіўся з А. Міцкевічам. У Польскім літоўскім таварыстве ў Парыжы чытаў лекцыі па беларускай этнаграфіі і фальклору. У даследаванні «Беларусь» (Парыж, 1840) Рыпінскі першы зрабіў усебаковы агляд розных жанраў беларускага фальклору, апублікаваў шматлікія тэксты, у тым ліку і з Дзісеншчыны. Памёр у 1900 г.

СТАНКЕВІЧ Адам. Святар. У час службы ў Дзісенскім касцёле ў 1907 г. пачаў ужываць у богаслужэнні беларускую мову. Часта выступаў перад сялянамі.

ШПІЛЕЎСКІ Павел Міхайлавіч, беларускі этнограф, пісьменнік, публіцыст. Нарадзіўся 12.11.1823 г. у в. Шыпілавічы Бабруйскага р-на. Скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію (1847). Настаўнічаў у Варшаве. З 1853 г. у Пецярбургу. Серыя артыкулаў «Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках» у часопісе «Пантеон» (1853—1856) адзначана М. Чарнышэўскім, П. Пыпіным і інш. У «Падарожжы па Палессі і Беларускім краі» («Современник», 1853—1855) цікавыя звесткі з гісторыі гарадоў, мястэчак і вёсак Беларусі, апісанні побыту, павер'яў, абрадаў і звычаяў народа, становішча сельскай гаспадаркі і прамысловасці. Адзначаў сумленнасць, кемлівасць і працавітасць беларускага селяніна, самабытнасць беларускай мовы. У 1859 г. Павел Шпілеўскі пад час свайго падарожжа быў у Дзісне, спыняўся ў доме палкоўніцы Ваяводскай. Прыкладна тады быў напісаны ліст жыхароў Віцебскай губерні да пецярбургскага выдаўца Мюнстэра з просьбай уключыць партрэт Шпілеўскага ў выданне «Партрэтная галерэя выдатных людзей Расіі». Памёр 29.10.1861 г.

Воіны-інтэрнацыяналісты, якія прызваны на службу з Міёрскага раёна і загінулі ў Афганістане

БРЫНКЕВІЧ Пётр Веньямінавіч. Нарадзіўся 10.3.1968 г. у г. Міёры. Беларус. Маці, Ганна Антонаўна, пенсіянерка, бацька, Веньямін Пятровіч, рабочы раённай нарыхтоўчай канторы. У 1985 г. Пётр скончыў сярэднюю школу № 1 г. Міёры, да прызыву ў армію працаваў у гэтай школе лабарантам. У маі 1986 г. прызваны ў Савецкую Армію Міёрскім РВК. Службу праходзіў у Варонежскай вобласці, меў падзякі ад камандавання часці. У лістападзе 1986 г. накіраваны ў Афганістан. Загінуў 18.3.1987 г. Пахаваны ў г. Міёры.

З пісьма П. В. Брынкевіча бацьку

1 студзеня 1987 г.

Здравствуй, отец! С огромным приветом к тебе я. Ну, ты, в общем не удивляйся, что письмо пишу именно тебе. Понимаешь, что я писал вам раньше — это неправда. Служу я не в МНР, а в составе советских войск ограниченного контингента в Демократической Республике Афганистан. Конечно, если мать узнает об этом, ты сам знаешь, что будет. Хотя здесь, где я служу, место тихое. Служу я в г. Шинданд. Понимаешь, ты не подумай, что я тебя утешаю, но Афганистан — это совсем не то, что ты думаешь. Я, дома когда был, тоже думал, что там что-то страшное. Оказывается, это совсем не так. В Афганистане я уже с 14 ноября. Сначала были в г. Хайратоне, потом прислали сюда, был я в Кундузе, неделю жили в Кабуле, довольно интересно даже все. Да, вот еще, в начале 1988 г. наш батальон будут тоже выводить в Союз. Я даже не знаю, но, может, маме пока и не говори...

Пап, напиши, куда мне писать, через Ваньку или, может, домой, но чтоб ты точно их вынимал. До свидания. Пиши. И не надо сильно расстраиваться. Петя.

ЗАКРЭЎСКІ Сяргей Баляслававіч. Нарадзіўся 11.1.1967 г. у г. Міёры. Беларус. Бацька, Баляслаў Іосіфавіч, начальнік цэха Міёрскага РКБА, маці, Ала Пятроўна, пенсіянерка. У 1984 г. Сяргей скончыў сярэднюю школу № 3 г. Міёры і паступіў у сельскагаспадарчы інстытут у г. Вялікія Лукі Пскоўскай вобласці. У чэрвені 1985 г. прызваны ў Савецкую Армію Велікалуцкім РВК. Служыў у Афганістане. 25.1.1986 г. у складзе групы з 20 чалавек вяртаўся пасля выканання баявога задання. Трапілі ў засаду. У час бою загінуў замполіт роты. Сяргей узяў камандаванне на сябе і кіраваў боем, пакуль не абарвалася і яго жыццё... Пахаваны ў в. Пад'ельцы Міёрскага раёна. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Яго імем названа адна з вуліц г. Міёры.

З артыкула «Расчынім дзверы музея» ў міёрскай раённай газеце «Сцяг працы» ад 19 ліпеня 1988 г.

Можна гаварыць, што нядаўнія вучні нашай школы працягваюць гераічныя подзвігі сваіх землякоў. Гвардыі малодшы сяржант Сяргей Закрэўскі пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Камсамолец загінуў, абараняючы свабоду народа Афганістана. Яго аднакласнікі, наведваючы школьны музей, падоўгу затрымліваюцца ля стэндаў і стэлажоў, якія ўшаноўваюць памяць С. Закрэўскага. Тут сшыткі, падручнікі, асабістыя рэчы камсамольца, яго апошнія пісьмы дадому. У лістах, якія цяпер захоўваюцца ў музеі, Сяргей пісаў: «Мама, ты толькі зразумей, я — камандзір і, калі што здарыцца, за каменнем хавацца не буду. Тым больш, што я адказваю за сваіх людзей».

МЯЦЕЛІЦА Уладзімір Анатольевіч. Нарадзіўся 22.4.1968 г. у в. Янкава Полацкага раёна Віцебскай вобласці. Беларус. Маці, Алена Уладзіміраўна, пенсіянерка, бацька, Анатоль Пятровіч, палявод калгаса «Сцяг перамогі» Міёрскага раёна. У 1984 г. Уладзімір скон-

У. А. Мяцеліца

чыў Луначарскую васьмігадовую школу Верхнядзвінскага раёна. Працаваў трактарыстам у калгасе імя Ільіча. У каст-рычніку 1986 г. прызваны ў Савецкую Армію Верхнядзвінскім РВК. Служыў у Афганістане. 24.12.1987 г. Валодзя ехаў з сябрамі на брані БМП. Машыны пад'язджалі да кішлака. Тут душманы і зрабілі засаду. Агонь вялі якраз з таго боку, дзе сядзеў Валодзя. Куля трапіла ў шыю, і ён страціў прытомнасць. Памёр па дарозе ў шпіталь. Апошнія словы былі: «Сябры, не забывайце мяне...» Імем малодшага сяржанта Уладзіміра Мяцеліцы саслужыўцы назвалі адну з баявых машын. Пахаваны ў в. Чарапы Міёрскага раёна. Пасмяротна У. А. Мяцеліца ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

З пісем У. А. Мяцеліцы родным

14 чэрвеня 1987 г.

...Служба идет своим чередом, с каждым днем все ближе дом. 104 дня осталось до года. Этот Новый год встречу здесь, а следующий, 89-й, — дома, за большим столом. Как нормальные люди. Не скучайте, не расстраивайтесь, все будет хорошо. Живите мирно и друг другу помогайте. Берегите сад... Мама, я здесь не один. Со мной вместе Коля Шатеро, белорус из Городокского района, Сергей Суслов из Полоцка. Живем, как родные братья. Папа, если сможете, пришлите вашу районную газету. Интересно будет почитать... До свидания. Крепко вас целую. Вова. Не волнуйся, мама, все будет хорошо.

Снежань 1987 г.

...Уже осталось совсем немного быть нам в разлуке. 13 декабря будет год и два месяца. Останется всего лишь десять месяцев. Но, я думаю, и они пролетят быстро... У нас погода пока нормальная. Днем до 19° тепла, ночью до трех мороза. Меня повысили в должности. Теперь я командир отделения — в отделении у меня 10 человек... Уже зима на дворе. У вас, наверное, снег выпал. Пишите обо всем подробно... Мама, папа, за меня не переживайте, все будет хорошо. Крестик постоянно у меня на шее. А иконка в военном билете... И еще. Если хотите меня поздравить с Новым годом, пусть Зина запишет в звукозаписи пластинку. В ней поздравление и песня «Мозаика». Мне будет очень приятно услышать голос родных...

Скоро Новый год. В этом году я домой вернусь, этот год — мой...

Если бы вы знали, как я по вас соскучился!

СТАНКЕВІЧ Сяргей Уладзіміравіч. Нарадзіўся 20.5.1964 г. у в. Слабада Міёрскага раёна. Беларус. Маці, Тамара Іосіфаўна, хатняя гаспадыня, бацька, Уладзімір Іванавіч, манцёр тэхнічнага ўпраўлення сувязі. У 1979 г. скончыў Дрыгуцкую васьмігадовую школу, у 1982 — Відзаўскае ПТВ № 169. Працаваў трактарыстам у калгасе імя Дзяржынскага. У маі 1984 г. прызваны ў Савецкую Армію Міёрскім РВК. Служыў у Афганістане. 10.4.1985 г. сяржант Станкевіч з сябрамі вяртаўся з баявой аперацыі. Машына, на брані якой ён сядзеў, падарвалася на міне. Пахаваны С. У. Станкевіч у в. Грыгаравічы Міёрскага раёна. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

С. У. Станкевіч

З пісьма З. Ф. Станкевіч, настаўніцы Сяргея

В школе Сергей был застенчивым, никогда не был первым, но в труде на него можно было равняться... Вместе со своим братом Олегом он любил, как и их дедушка, Станкевич Иван, столярничать. Потом, когда Сергей подрос, они с Олегом устраивали соревнования на лучшую работу по строительству парников для выращивания овощей. Уже в 12 лет Сергей вместе с отцом косил сено. Сережа всегда сам видел, чем нужно помочь отцу, помогал и матери во всем. После окончания СПТУ Сергей работал в колхозе им. Дзержинского трактористом. Неоднократно награждался грамотами и премиями по окончании сезонных полевых работ. В мае, а точнее 9 мая, в День Победы, Сергей ушел служить в Советскую Армию. Возле памятника погибшим воинам в тот день был митинг... Сереже подарили памятные часы. Слово держал председатель колхоза Карл Митрофанович Гурин, который говорил, что Сергей был примером в колхозе для своих товарищей. Пожелал ему председатель счастливой службы. В первые месяцы службы родителям Сергея было прислано из воинской части, в которой он служил, благодарственное письмо. В армии Сергей был разведчиком и при выполнении боевого задания погиб. Ежегодно в день его гибели школьники бывают на его могиле, несут туда цветы — дань глубокой скорби и памяти о своем товарище...

С. М. Шляпаў

ШЛЯПАЎ Сяргей Мікалаевіч. Нарадзіўся 25.6.1965 г. у в. Забор'е Міёрскага раёна. Беларус. Маці, Ганна Фамінічна, хатняя гаспадыня, бацька, Мікалай Сцяпанавіч, жывёлавод саўгаса «Дзісенскі» Міёрскага раёна. У 1980 г. Сяргей скончыў васьмігадовую школу ў в. Іст, у 1984 г. — Боркавіцкае ПТВ № 170. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Дзісенскі». У кастрычніку 1984 г. прызваны ў Савецкую Армію Міёрскім РВК. Служыў у Афганістане. Радавы С. М. Шляпаў загінуў 24.3.1985 г. Пахаваны ў в. Іст Міёрскага раёна. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

...Калона аўтамашын, сярод якіх быў і «КамАЗ» С. М. Шляпава, дастаўляла авіябензін і боепрыпасы ў г. Кабул. У даліне каля перавала Саланг зрабілі прывал. І ў гэты час душманы агнём з гор накрылі калону...

МАТЭРЫЯЛЬНАЯ І ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА

Архітэктурныя помнікі

Сядзібна-паркавая архітэктура. Нашы продкі будавалі селішчы і гарадзішчы, фартэцыі і замкі, умацаваныя лагеры і манастыры. Але яны вядомы толькі па старажытных пісьмовых крыніцах і археалагічных раскопках. Больш пашанцавала культавым збудаванням, сядзібам мясцовых землеўладальнікаў, асобным помнікам і грамадзянскім пабудовам. Узведзеныя адно-два стагоддзі назад, многія з іх захаваліся, над імі злітаваліся час, войны, пажары, паводкі і чалавечая неахайнасць.

Самы старажытны будынак на тэрыторыі раёна — сядзібны дом у Лявонпа-

лі. Пабудаваны ён у 1750 г. з цэглы ў стылі барока. У час паўстання 1831 г. быў часткова разбураны і адноўлены ў першапачатковым выглядзе толькі ў 1898—1901 гг. Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя дома сіметрычна-восевая, трохчасткавая. Цэнтральны двухпавярховы аб'ём завершаны фігурным франтонам, бакавыя рызаліты галоўнага і дваровага фасадаў — трохвугольнымі франтонамі з авальнымі люкарнамі. Будынак мае масіўны цокальны паверх з лучковымі праёмамі. Да галоўнага ўвахода вядзе шырокая двухбаковая лесвіца з тэрасай. Цэнтральны і бакавыя рызаліты дэкарыраваны пілястрамі. Аконныя праёмы фасадаў прамавугольныя з прафіляванымі ліштвамі. Партал галоўнага ўвахода ўпрыгожаны канелюраванымі пілястрамі і балконам з ажурнай агароджай (не захаваўся). У 1919 г. анфіладная сістэма планіроўкі дома заменена калідорнай. Да перабудовы 1-ы паверх цэнтральнага аб'ёму займалі прасторны вестыбюль і квадратная ў плане парадная зала, на 2-м размяшчаліся жылыя пакоі.

Дом з'яўляўся цэнтральнай пабудовай сядзібы, размешчанай на паўночна-заходняй ускраіне вёскі, на левым беразе Заходняй Дзвіны. Яна сфарміравалася як комплекс ў 2-й палове XVIII — пачатку XIX ст., акрамя дома ўключае пейзажны парк і гаспадарчыя будынкі. З заходняга і паўднёвага бакоў частку сядзібы абгінае канал. На галоўнай планіровачнай восі была цэнтральная ўязная брама, пабудаваная ў пачатку XIX ст. у стылі класіцызму (не збераглася). Абапал курданёра сіметрычна размяшчаліся 2 аднапавярховыя флігелі. З паўднёва-заходняга боку ад дома захаваліся мураваныя гаспадарчыя будынкі. Пейзажны парк разбіты за палацам на 2 тэрасах.

За 0,8 км ад Лявонпаля па дарозе на Верхнядзвінск знаходзіцца яшчэ адзін архітэктурны помнік — мемарыяльная калона, устаноўленая ў канцы XVIII ст. у гонар Канстытуцыі 3 мая 1791 г. — асноўнага закона Рэчы Паспалітай.

У пачатку XIX ст. (1810—1820) сфарміравалася сядзіба ў стылі класі-

Палац у Лявонпалі. 2-я палова XVIII ст. Сучасны выгляд

цызму ў в. Дзедзіна, за 1 км ад населенага пункта, на пагорку. Яна ўключае сядзібны дом, перад якім часткова захаваўся пейзажны парк з сажалкай, гаспадарчыя пабудовы з бутавага каменю.

Двухпавярховы прамавугольны ў плане мураваны сядзібны дом, пабудаваны дзісенскім суддзёй Аляксандрам Рудніцкім па праекту вядомага архітэктара Віткоўскага, пакрыты вальмавым дахам. У цэнтры галоўнага фасада чатырохкалонны порцік з трохвугольным франтонам. У раскрапоўцы фасадаў выкарыстаны пілястры, рустоўка, прафіляваныя карнізы. Сцены 2-га паверха расчлянёны прамавугольнымі аконнымі праёмамі, 1-га — квадратнымі. 1-ы скляпеністы паверх мае анфіладную планіроўку, 2-і — змешаную анфіладна-калідорную. З вестыбюля на 2-і паверх вядзе лесвіца. Інтэр'ер будынка захаваў сляды былых камінаў, элементы дэкору ў неагатычным стылі.

Пра ўнутранае ўбранне гэтага сядзібнага дома ў тыя часы, калі ім яшчэ карысталіся па прамому прызначэнню, можна расказаць больш падрабязна. Апісанне палаца зроблена пляменніцай апошняга ўладальніка Зыгмунда Рудніцкага Аленай Стахурскай.

Праз галоўны ўваход мы трапляем у вузкі доўгі калідор, які шырокімі драўлянымі прыступкамі падымаўся на другі паверх. Па абодвух баках былі дубовыя дзверы, левыя вялі ў гардэроб, правыя — да скляпенняў у падвале. Яшчэ адны дзверы справа вялі да збраёўні, якая размяшчалася ў левым крыле калідора. Там захоўвалася ўся паляўнічая зброя, старажытныя стрэльбы, дзіды, якія перадаваліся па спадчыне. У падвале стаялі бочкі з мёдам, віно, гарэлка, сала, іншыя гаспадарчыя запасы.

У другім канцы калідора месціліся маленькія сені. Былі пакоі для слуг і адміністрацыі, лесвіца для прыслугі на другі паверх.

На першым паверсе хапала месца для лазні, пякарні, кухні. У многіх пакоях былі каміны з белай і каляровай кафлі.

На другім паверсе насупраць порціка знаходзілася вялікая зала, па правы бок яе — тры жылыя пакоі, першы з якіх быў кабінетам гаспадара. Упрыгожваў яго камін з зялёнай кафлі. Такога ж колеру была абіўка крэслаў і іншай мэблі. Сцены пафарбаваны ў попельны колер. На іх віселі паляўнічыя трафеі: ласіныя рогі, галовы дзікоў і рысі. Быў вялікай прыгажосці габелен, на якім вісела старая паляўнічая зброя. Яшчэ на сценах былі акварэлі на паляўнічыя тэмы. На падлозе знаходзіўся зялёны дыван з вялікімі кветкамі.

Здымак пачатку XX ст. сведчыць, што ў мінулым на ўзроўні другога паверха ў порціку быў пабудаваны пакой. У тыя часы палац меў двухсхільны гонтавы дах.

Другі пакой — спальня са старой мэбляй. Асабліва каштоўным быў камод з люстрам у стылі барока. У пакоі для гасцей знаходзіўся цікавы збор кілімаў з розных краін Заходняй Еўропы.

Галоўны пакой палаца — салон з трыма вялікімі вокнамі, які размяшчаўся па левым баку залы. Ён меў паркетную падлогу, камін з белага мармуру з цёмнымі пражылкамі і двума кандэлябрамі з бронзы, крыштальнай жырандоллю пад столлю. Вакол сцен стаялі крэслы і канапы, круглы столік. Зала была вытрымана ў стылі Людовіка XVI, мэбля паходзіла таксама з XVIII ст. Яна дасталася Яну Рудніцкаму ў спадчыну ад маці Касакоўскай. З новых часоў было толькі фартэпіяна. На сценах віселі вялікія партрэты Элеаноры з баронаў Клотаў, дачкі Леапольда Святаполк-Мірскага (1790—1878), і Яна Рудніцкага пэндзля вядомага мастака Яна Рустэма. Сцены ўпрыгожвалі пейзажы Вінцэнта Дмахоўскага з відамі наваколля Дзедзіна.

Суседні пакой з салонам быў бібліятэкай. У ім знаходзіліся кнігі на польскай, французскай, нямецкай і лацінскай мовах. Усяго некалькі тысяч тамоў, пераважна XIX ст. Тут таксама

месціўся радавы архіў Рудніцкіх, але ён быў растрэсены яшчэ перад першай сусветнай вайной.

Побач з бібліятэкай — більярдны пакой. У ім зялёны маёлікавы камін і мэбля ў стылі Бідмэер (падробка канца XIX ст. пад даўніну), старасельскія канапы і кандэлябр з парцалямі.

У анфіладзе левага крыла знаходзіўся маленькі пакой у блакітным колеры — будуар гаспадыні. Дзверы з яго вялі ў сталовую з трыма вокнамі. Мэбля яе складалася з доўгага стала, крэслаў, выраблены х з цёмнага дубу ў гданьскім стылі мясцовымі прыгоннымі сялянамі. Яшчэ ў сталовай знаходзіўся прыгожы шафавы гадзіннік таксама ў гданьскім стылі. Зязюля ў ім адлічвала гадзіны. Каля адной са сцен стаяла старажытная лава з багатай разьбой. Віселі партрэты роду Рудніцкіх, у тым ліку біскупа Шымона Рудніцкага. З вокнаў сталовай быў прыгожы выгляд на агарод і сад, на пагорак з магілай Марыі Далубоўскай-Рудніцкай у выглядзе гранітнай труны.

Тое, што цяпер успрымаецца як рэшткі пейзажнага парка, некалі было агародам-садам з алеямі для прагулак плошчай 8 га. Стварыў яго Аляксандр Рудніцкі (1785—1848), які спілаваў старадаўнія дрэвы ў парку Рудамінаў (Рудаміны валодалі Дзедзінам да 1768 г.). У цэнтры агарода насупраць порціка былі дзве сажалкі, да якіх вялі дарожкі, абсаджаныя з аднаго боку дрэвамі, з другога — чырвонымі ружамі. У сажалках, злучаных канавай з мосцікамі, плавалі лебедзі. У гушчары дрэў хавалася альтанка ў выглядзе амфітэатра. Сцежкі былі абсаджаны жывым плотам з дзікіх ружаў, жоўтых акацый і іншых экзатычных кустоў. У садзе раслі вішні, слівы, яблыні, грушы, парэчкі, агрэст, маліна, там жа былі пасека і аранжарэя. Увесь участак быў падзелены сцежкамі для прагулак. На іх перасячэнні стаяла высечаная з каменя мясцовым скульптарам фігура Маці Божай. У ліпавай алеі знаходзіўся стол са старых жорнаў. Сад акружалі ліпавыя, бярозавыя, каштанавыя алеі. У глыбіні стаяў старажытны свіран XVI ст., мясцовы каваль абкаваў яго дзверы, зрабіў замок.

Сядзіба ў в. Камянполле (заходняя частка вёскі) сфарміравана ў больш позні час — канец XIX — пачатак XX ст. Яна ўключае дом, гаспадарчыя пабудовы, сярод якіх асабліва вылучаецца стайня (1907), цікавы парк.

Галоўнай воссю сядзібнага комплексу з'яўляецца пад'язная дарога, якая ўпіраецца ў парк. Яго зялёны масіў абмяжоўваюць 2 каналы: знешні П-падобны, які ў далёкія часы злучаўся з возерам Асінаўскім, а праз яго і з Міёрскім, і ўнутраны прамавугольны. У парку прыгожыя ліпавыя алеі, альтанка на высокім насыпным кургане. У 1873 г. у паўднёвай частцы паркавага масіву пабудаваны цагляны сядзібны дом — аднапавярховы прамавугольны ў плане аб'ём з павышанай цэнтральнай часткай. Галоўны ўваход вылучаны ганкам з навіссю на шасці слупах. Планіроўка калідорнага тыпу. У доме захаваліся 2 кафельныя грубкі XIX ст.

Абапал пад'язной дарогі стаяць гаспадарчыя пабудовы пачатку XX ст. Кампазіцыя стайні сіметрычная, трохчасткавы фасад. Праезд па цэнтральнай восі будынкаў і бакавыя часткі галоўнага фасада афармлены шчытамі. У гаспадарчай зоне сядзібы — драўляная лядоўня (1873) і кузня (1907). Лядоўня — кампактны квадратны ў плане двух'ярусны будынак. Верхні яго ярус вертыкальны ашаляваны і аддзелены ад ніжняга карнізам. Дах чатырохсхільны, з заломам.

Культавая архітэктура. Найбольш старажытны з культавых устаноў, якія поўнасцю або часткова захаваліся, — францысканскі касцёл (1773) у Дзісне, які з'яўляўся часткай манастыра. Ён вельмі пацярпеў у гады Вялікай Айчыннай вайны і да гэтага часу не адрэстаўрыраваны.

Касцёл уяўляў сабой трохнефавы двухвежавы храм з паўкруглай алтар-

най часткай, з паўднёвага боку якога прыбудавана сакрысція. Узведзены з чырвонай цэглы ў псеўдагатычным стылі. Сцены патоўшчаны між вокнаў, звонку расчлянёны атынкаванымі і пабеленымі контрфорсамі. Аконныя праёмы паўкруглыя, акружаныя пабеленымі ліштвамі з тынкоўкі. Вежы і дах не захаваліся.

Да сённяшняга дня дзейнічае Троіцкая царква ў заходняй частцы в. Лявонпаль, пабудаваная ў 1774 г. з дрэва (спачатку была двухвежавая). З паўднёвага боку ад уваходу пастаўлена двух'ярусная званіца (ніжні ярус зрубны, верхні каркасны).

Кампазіцыя царквы двухчасткавая: асноўны прамавугольны ў плане аб'ём і пяцігранная апсіда з бакавымі прыбудоўкамі. Двухсхільны дах асноўнага аб'ёму і шматгранны над апсідай амаль адной вышыні, аб'яднаны агульным карнізам. Галоўны (заходні) фасад завершаны франтонам. Унутры асноўнага аб'ёму вылучаны невялікі бабінец з хорамі над ім. Сцены царквы брусчатыя, звонку вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі, унутры — гарызантальна.

Першапачаткова гэты культавы будынак узводзіўся як каталіцкі касцёл.

Масавае царкоўнае будаўніцтва ў ас-



Францысканскі касцёл у Дзісне. XVIII ст.

Троіцкая царква ў Лявонпалі. XVIII ст.

ноўным праваслаўных храмаў пачалося ў XIX ст. пасля нацыянальна-вызваленчых паўстанняў 1831—1832 і 1863—1864 гг.

У сярэдзіне XIX ст. у стылі позняга класіцызму ўзведзена царква ў в. Ідолта Павяцкага сельсавета. Гэта невялікі прамавугольны ў плане аб'ём з пяціграннай апсідай і бакавымі сакрысціямі. Накрыты двухсхільным дахам з трохвугольным франтонам з боку галоўнага паўднёвага фасада. Сцены расчлянёны пілястрамі і аперазаны зверху фрызам з трыгліфамі. Над франтонам узведзена квадратная ў плане драўляная вежа. Інтэр'ер зальны. Сцены гладка атынкаваны.

Храм працяглы час служыў усыпальніцай мясцовых буйных землеўладальнікаў.

Мікалаеўская царква ў псеўдарускім стылі ў канцы XIX ст. пабудавана

Крыжаўзвіжанская царква ў в. Цвеціна. 2-я палова XIX ст.



Царква ў в. Ідолта XIX ст.

ў в. Калінавае Язненскага сельсавета з цэглы. Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя храма ўключае двух'ярусную шатровую званіцу, нізкі бабінец, квадратны ў плане асноўны аб'ём, пяцігранную апсіду з невялікім гранёным прыдзелам. Вертыкальнымі дамінантамі збудавання з'яўляюцца званіца, завершаная макаўкай, і цыбулепадобны купал на васьмігранным барабане над пакатым чатырохсхільным дахам асноўнага аб'ёму. Фасады дэкарыраваны зубчастымі фрызамі, лапаткамі, кілепадобнымі ліштвамі арачных акон. У інтэр'еры трох'ярусны іканастас эклектычнай трактоўкі.

Мікалаеўская царква ў 2-й палове

XIX ст. узведзена таксама ў в. Новы Пагост, толькі акрамя цэглы на яе сцены выкарыстана бутавае каменне. Збудаванне ў псеўдарускім стылі мае традыцыйную аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю: трох'ярусная шатровая званіца, нізкі бабінец, квадратны ў плане асноўны аб'ём, паўцыркульная апсіда. Пакаты чатырохсхільны дах цэнтральнага аб'ёму завершаны цыбулепадобным купалам на васьмігранным светлавым барабане. У дэкоры фасадаў выкарыстаны формы старажытнарускага дойлідства: кілепадобныя ліштвы, аркатура, паўкалонкі і інш. Памяшканні царквы перакрыты скляпеннямі.

У 2-й палове XIX ст. у псеўдарускім стылі пабудаваны драўляная Пакроўская царква ў в. Сцефанполле, цагляныя Мікалаеўская ў в. Узмёны, Крыжаўзвіжанская ў в. Цвеціна, Мікалаеўская ў в. Чэрасы, Праабражэнская ў в. Язна.

Царква ў в. Грыгаравічы

XX стагоддзе прынесла ў культавае будаўніцтва новыя павевы, не толькі канфесійныя, але і архітэктурныя. Драўляныя храмы ўзводзяць стараверы. Так, на ўсходняй украіне в. Ніўнікі выросла царква — прамавугольны будынак пад двухсхільным дахам. Над уваходам невысокая вежа-званіца (васьмярык на чацверыку) з шатровым дахам. Над алтарнай часткай цыбулепадобная галоўка.

У гэты ж час пабудавана адно з самых манументальных культавых пабудоў — Успенскі касцёл у Міёрах (1907). Ён размешчаны на ўсходнім беразе Міёрскага возера. Храм з чырвонай цэглы ў неагатычным стылі падобны на многія іншыя, характэрныя для гэтага часу. Па сутнасці архітэктура касцёла ўяўляе сабой творчую кампіляцыю з прыёмаў, форм — дэталяў касцельнага дойлідства даўно мінулых часоў.

Гэта трохнефавы двухвежавы храм з пяціграннай алтарнай часткай, да якой з паўднёвага боку далучана сакрысція. Фасады будынка з высокім цокалем рытмічна расчлянёны ступеньчатымі контрфорсамі і стральчатымі аконнымі праёмамі. Вось сіметрыі галоўнага фасада падкрэслена ўваходным парталам і акном-ружай. Трох'ярусныя вежы завершаны высокімі шпілямі, умацаваны ступеньчатымі контрфорсамі, раскрапаваны вузкімі нішамі. Вежа-ліхтар завяршае цэнтральны шчыт. Нефы перакрыты стральчатымі скляпеннямі.

У 30-х гадах XX ст. у в. Ідолта быў узведзены касцёл у стылі мадэрн. Гэта аднавежавы прамавугольны ў плане будынак з паўкруглай апсідай і 2 сакрысціямі. Квадратная ў плане вежа асіметрычна прыбудавана да галоўнага фасада. Да вежы прымыкае арачная галерэя. Фасады храма падзелены на 2 ярусы. У муроўцы ніжняга яруса і вежы выкарыстаны шліфаваны камень — ва-

Праабражэнская царква ў в. Язна. Канец XIX — пачатак XX ст.

лун, верхняга — белая цэгла. Спалучэнне гэтых матэрыялаў надае будынку фактурную і колеравую выразнасць. Касцёл падзелены на 3 нефы дзвюма аркадамі, прасветы якіх адпавядаюць паўцыркульным аконным праёмам.

Грамадзянскія пабудовы. Жыллё вяскоўцаў і большасці гараджан узводзілася з дрэва. Гэта былі чатырохвугольныя ў плане будыніны пераважна пад двухсхільнай, радзей вальмавай ці чатырохсхільнай з заломам саламянай страхой. У залежнасці ад матэрыяльнага дабрабыту яны ўяўлялі сабой адназрубны дом з паветкай-сенямі, двухзрубны з сенямі між зрубамі, нават трохзрубны. Прычым другі і трэці зрубы маглі быць як жылымі, так і гаспадарчымі: хлявом, варыўнёй, клеццю і г. д. Вокны мелі традыцыйныя ліштвы, пазней у больш заможных сустракаліся аканіцы, хоць часцей яны з'яўляліся дэкаратыўнай аздобай і па прамому прызначэнню не выкарыстоўваліся.

Фундаменты хат выкладваліся з падкатнога каменя, замацаванага глінай, вапнавым, а пазней цэментным растворам.

Для прыгатавання ежы і абагрэву традыцыйна выкарыстоўваліся «рускія» печы, якія дапаўняліся прамавугольнымі шчытамі і плітамі з абагравальнікамі ці без іх. Толькі заможныя вяскоўцы мелі кафельныя печкі. Да сярэдзіны XX ст. у памяці старэйшага пакалення захаваліся ўспаміны аб курных хатах. У 2-й палове стагоддзя распаўсюдзілася выкарыстанне для ацяплення круглых печаў з бляшанымі кожухамі.

Працяглы час асноўная частка мэблі была самаробная або мясцовай вытворчасці з традыцыйнымі лаўкамі ля сцен, двухдзвярнымі ці трохдзвярнымі шафамі, плеценымі этажэркамі, вышытымі ручнікамі на абразах, папяровымі фіранкамі на вокнах.

Гаспадарчы двор фарміраваўся з хлявоў для кароў, свіней і іншай жыўнасці, стайні, свірна, пуні, аборы, крыху далей ад пабудоў размяшчалі восець і лазню.

Карчма — даволі распаўсюджаная ў мінулым грамадская пабудова. Тут спыняліся на начлег і адпачынак падарожнікі, тут можна было падсілкавацца і выпіць. У карчме часцей за ўсё адбываліся сходы мясцовага насельніцтва.

Будавалі карчму на скрыжаванні дарог ля ўезду ў мястэчка ці вёску. Спачатку корчмы ў большасці належалі мясцовым панам і здаваліся імі ў арэнду, як, напрыклад, карчма ў Бароўцы, непадалёку ад маёнтка Навалака, якая існавала да першай сусветнай вайны. З 2-й паловы XIX ст. павялічваецца колькасць самастойных карчмароў-яўрэяў і нават мясцовых сялян. Найбольш

звестак у нашай мясцовасці захавалася аб карчме, пабудаванай у 1892 г. селянінам в. Волкаўшчына Мацвеем Іванавічам Багдановічам і яго сынамі Піліпам, Аркадзем і Міхаілам. Размяшчалася яна ў канцы вёскі па левым баку дарогі на Новы Пагост. Будыніна Г-падобная ў плане. Карчма і жытло гаспадара — гэта драўляны дом на «чысты вугал» памерам 15×6 м пад саламяным дахам з лабякамі. Падмурак з каменя на вапнавым растворы. Унутраная планіроўка трохкамерная, прычым дзве камеры падзяляліся дадаткова дашчатымі перагародкамі. Дом меў двое ўваходных дзвярэй ва ўсходняй і заходняй сценах з вузенькімі акенцамі каля іх. Адны дзверы вялі з вуліцы праз калідор ў карчму і прызначаліся для наведвальнікаў, другія з двара (праз ганак з апорнымі слупамі і аднасхільнай страхой) у кухню, а праз яе — у жытло гаспадара і таксама ў карчму. У паўднёвай частцы дома, падзеленай амаль пасярэдзіне лядай (прылаўкам), размяшчалася карчма. У паўночнай частцы, падзеленай на тры невялікія пакоі, знаходзілася жытло гаспадара, у сярэдняй — кухня і калідор у карчму.

Ацяпляльная сістэма складалася з двух шчыткоў і «чыстай» печы, якая мела з адным са шчыткоў агульны комін. Столь ва ўсіх пакоях была пакладзена «ўразбежку», падлога — драўляная.

Незвычайным для тагачасных мясцовых пабудоў было размяшчэнне склепа пад падлогай у паўднёвай частцы дома з выхадам на панадворак і адводам для сцёку вады праз дарогу.

Да паўночнай часткі ўсходняй сцяны дома прыбудаваны пуня і хлеў. Уваход у хлеў быў не з панадворка, а праз пуню. Сам панадворак быў брукаваны і агароджаны плотам з брамай і брамкай, якія выходзілі на кароценькую дарожку, што вяла ля паўднёвай сцяны карчмы на дарогу.

Т. А. Альхімовіч

Спіс помнікаў архітэктуры

1. Сядзібы:

— Лапацінскага ў в. Лявонпаль, Даўгінаўскі сельсавет. Узведзена ў 2-й палове XVIII — пачатку XIX ст. Уключае дом, пейзажны парк, гаспадарчыя будынкі. З заходняга і паўднёвага бакоў сядзібы ўчастак агінае канал. Сядзібны дом пабудаваны ў 1750 г. з цэглы ў стылі барока;

— Мірскіх у в. Камянполле, Парабродскі сельсавет. Канец XIX — пачатак XX ст. У 1873 г. пабудаваны цагляны аднапавярховы дом. Гаспадарчыя будынкі пачатку XX ст.: стайня (1907), лядоўня (1873) і кузня (1907). Парк абмяжоўваюць 2 каналы — знешні П-падобны і ўнутраны прамавугольны;

— Рудніцкага ў в. Дзедзіна, Парабродскі сельсавет. 1810—1820 гг. Сядзібны дом мураваны, двухпавярховы, у стылі класіцызму. Гаспадарчыя пабудовы з бутавага каменю. Часткова захаваўся пейзажны парк з сажалкай.

2. Касцёлы:

— у в. Ідолта ў стылі позняга класіцызму, пабудаваны ў сярэдзіне XIX ст. Невялікі прамавугольны ў плане аб'ём з пяціграннай апсідай і бакавымі сакрысціямі;

— у в. Ідолта, Павяцкі сельсавет. Пабудаваны ў 1-й палове XX ст. з белай цэглы ў стылі «мадэрн». Уяўляе аднавежавы прамавугольны ў плане аб'ём з паўкруглай апсідай і 2 сакрысціямі. Квадратная ў плане вежа асіметрычна прыбудавана да галоўнага фасада, да яе прымыкае арачная галерэя;

— у г. Міёры, Успенскі касцёл, пабудаваны з чырвонай цэглы ў неагатычным стылі ў 1907 г. Трохнефавы двухвежавы храм з пяціграннай алтарнай часткай, да якой з паўднёвага боку далучана сакрысція;

— у в. Новы Пагост, Новапагосцкі сельсавет, драўляны касцёл Святой Тройцы, упершыню пабудаваны Львом Сапегам у 1593 г., адноўлены ў 1853 г.

3. Цэрквы:

— Адзігітрыі ў Дзісне. Пабудавана ў канцы XIX ст. з цэглы на могілках. Псеўдарускі стыль. Прамавугольны ў плане аб'ём з пяціграннай апсідай і вальмавым гонтавым дахам, завершаны цыбулепадобнай галоўкай на васьмігранным барабане. Побач двух'ярусная (чацвярык на чацверыку) шатровая званіца з цыбулепадобнай галоўкай;

— Крыжаўзвіжанская ў в. Цвеціна Завуццеўскага сельсавета. Пабудавана ў 1864—1867 гг. з цэглы. Псеўдарускі стыль. Мае трохчасткавую кампазіцыю: двух'ярусная шатровая званіца, прамавугольны ў плане двух'ярусны з шатровым дахам асноўны аб'ём і трохгранная апсіда. Званіца і дах асноўнага аб'ёму завершаны макаўкамі;

Ікона Маці Боскай Адзігітрыі з царквы ў Дзісне

— Мікалаеўская ў в. Калінавае Язненскага сельсавета. Пабудавана ў канцы XIX ст. з цэглы. Псеўдарускі стыль. Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя храма ўключае двух'ярусную шатровую званіцу, нізкі бабінец, квадратны ў плане асноўны аб'ём, пяцігранную апсіду з невялікім гранёным прыдзелам. Званіца завершана макаўкай, над пакатым чатырохсхільным дахам асноўнага аб'ёму цыбулепадобны купал на васьмігранным барабане;

— Мікалаеўская ў в. Новы Пагост Новапагосцкага сельсавета. Пабудавана ў 2-й палове XIX ст. з бутавага каменю і цэглы. Асвячона 10 снежня 1878 г. Псеўдарускі стыль. Традыцыйная аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя: трох'ярусная шатровая званіца, нізкі бабінец, квадратны ў плане асноўны аб'ём, паўцыркульная апсіда. Пакаты чатырохсхільны дах цэнтральнага аб'ёму завершаны цыбулепадобным купалам на васьмігранным светлавым барабане;

— Мікалаеўская ў в. Узмёны Узмёнскага сельсавета. Пабудавана ў 2-й палове XIX ст. з цэглы. Асвячона ў 1871 г. Псеўдарускі стыль. Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя чатырохчасткавая: шатровая званіца (васьмярык на чацверыку), нізкі бабінец, кубападобны асноўны аб'ём з чатырохсхільным дахам, пяцігранная апсіда з прыдзелам;

— Петрапаўлаўская ў в. Грыгаравічы Туркоўскага сельсавета. Пабудавана ў 1905 г. з цэглы. Псеўдарускі стыль. Мае трохчасткавую кампазіцыю: трох'ярусная шатровая званіца, нізкі бабінец, квадратны ў плане асноўны аб'ём, паўцыркульная апсіда. Пакаты чатырохсхільны дах цэнтральнага аб'ёму завершаны цыбулепадобным купалам.

Святагеоргіеўская праваслаўная царква у в. Пераброддзе. Пабудавана у цэнтры населенага пункта з дрэва у пачатку XX стагоддзя. Прамавугольны у плане зруб пад жалезным двухсхільным дахам. Над алтарнай часткай цыбулепадобны купал. Над галоўным фасадам,

Царква св. Адзігітрыі ў Дзісне

вылучаным высокімі прыступкамі, вежа-званіца.

— Мікалаеўская ў в. Чэрасы Чэраскага сельсавета. Пабудавана ў 2-й палове XIX ст. з цэглы. Псеўдарускі стыль. Шмат'ярусная аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя складаецца з шатровай званіцы, бабінца, асноўнага кубападобнага аб'ёму, пяціграннай апсіды з бакавымі прыдзеламі. Асноўны аб'ём завершаны цыбулепадобным купалам на васьмігранным барабане;

— Пакроўская ў в. Сцефанполле Мікалаеўскага сельсавета. Пабудавана ў сярэдзіне XIX ст. з дрэва, перабудавана ў пачатку XX ст. Да асноўнага аб'ёму з чацверыковым барабанам далучаны двух'ярусная з шатровым верхам званіца і пяцігранная апсіда;

— Праабражэнская ў в. Язна Язненскага сельсавета. Пабудавана ў канцы XIX — пачатку XX ст. з цэглы. Псеўдарускі стыль. Храм чатырохчасткавы, складаецца з шатровай званіцы, бабінца, асноўнага аб'ёму, пяціграннай апсіды з бакавымі прыдзеламі. Асноўны

Уваскрасенская царква ў Дзісне

крыжападобны ў плане аб'ём пакрыты чатырохсхільным дахам, які завершаны цыбулепадобным купалам;

— Троіцкая (стараверская) у в. Кублішчына Новапагосцкага сельсавета. Пабудавана ў пачатку XX ст. з дрэва. Прамавугольны адназрубавы будынак накрыты двухсхільным дахам. З боку галоўнага фасада двух'ярусная (васьмярык на чацверыку) званіца, завершаная макаўкай;

— Троіцкая ў в. Лявонпаль Даўгінаўскага сельсавета. Пабудавана ў 1774 г. з дрэва як уніяцкая, спачатку двухвежавая. Асобна пастаўлена двух'ярусная званіца. Кампазіцыя царквы двухчасткавая: асноўны прамавугольны ў плане аб'ём і пяцігранная апсіда з бакавымі прыбудовамі;

— Успенская (стараверская) у в. Ніўнікі Перабродскага сельсавета. Пабудавана ў пачатку XX ст. з дрэва. Прамавугольны ў плане будынак накрыты двухсхільным дахам. Вежа-званіца (васьмярык на чацверыку) з шатровым дахам. Над алтарнай часткай цыбулепадобная галоўка;

— Храм Уваскрэсення Хрыстова ў Дзісне. Асвячоны 12 мая 1870, пабудаваны на сродкі М. Н. Мураўёва. Разбураны ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Аднаўляецца;

— Царква ў в. Галомысла Завуццеўскага сельсавета. Пабудавана ў 2-й палове XIX ст. з драўляных брусоў. Трохзрубны храм уключае двух'ярусную званіцу (чацвярык на чацверыку), асноўны аб'ём і пяцігранную апсіду. Званіца завершана пакатым шатровым дахам з макаўкай. Асноўны аб'ём накрыты двухсхільным гонтавым дахам з вальмамі над апсідай і завершаны макаўкай.

З гісторыі касцёла ў Міёрах

У 1997 г. адбылося святкаванне 90-годдзя пабудовы касцёла ў Міёрах. Але міёрскі касцёл мае больш даўнюю гісторыю. Па ўскосных даных можна меркаваць, што ўжо ў XVI ст., хутчэй за ўсё ў апошняй чвэрці, ён дзейнічаў. Складанасці звязаны з тым, што ў даўнія часы было па меншай меры пяць паселішчаў з такой назвай, у якіх існавалі і царква, і касцёл, і капліца. Так, у тэстаменце Януша Пуцяты, маршалка Браслаўскага павета, у 1612 г. запісана патрабаванне «пахаваць яго на маёнтку Міры на полі, каля яго дзяцей і на гэтым месцы пабудаваць капліцу».

Касцёл у Міёрах не аднойчы згадваецца ў розных дакументах 1691, 1717, 1744, 1775, 1789 гг. Але найбольш цікавы дакумент выяўлены ў Гродзенскім гістарычным архіве ўдзельнікам Дзісенскіх чытанняў дацэнтам Г. Семянчуком. Інвентарнае апісанне міёрскага касцёла і яго маёмасці ад 14 кастрычніка 1823 г. складзена ў сувязі са смерцю міёрскага ксяндза Яна Клімашэўскага і ўступленнем на гэтую плябанію Ежы Чапулевіча. У дакуменце сказана, што касцёл размешчаны ад павятовага горада Дзісны за 7 міль, ад другога парафіяльнага касцёла за тры мілі. Касцёл стары, пабудаваны больш чым дзвесце гадоў назад, прадаўгаваты, з высокай франтальнай вежай. Памерамі невялікі, драўляны, клямарамі ўзмоцнены, дошкамі абабіты. Падмурак з камянёў і цэглы на вапне. Дах па дошках быў пакрыты гонтам. Толькі вялікая вежа і малая над прэсбітэрыем былі крытыя бляхай. На іх вялікі і малы жалезныя крыжы. Касцёл меў двайныя дзверы, першыя абабіты дошкамі, другія напалову шкляныя, але таксама падвойныя. Акрамя іх у касцёле і ў сакрысціі было 6 адзінарных дзвярэй. Вокнаў у будынку таксама было 6, чатыры з іх мелі жалезныя краты. Столь — драўляная, падлога — фарбаваны паркет.

Касцёл меў тры маляваныя і пазалочаныя алтары. У вялікім знаходзіўся абраз Святой Тройцы, а над ім — найсвяцейшай Дзевы Марыі Ружанцовай, побач — яшчэ чатыры абразы. У другім алтары — найсвяцейшай Дзевы Марыі

і святога Антонія. У трэцім была статуя пана Езуса, пад ім — абраз святога Яна Непамуцена. Пасярэдзіне касцёла на сценах змяшчалася сэрца Езуса ў выглядзе алтара. Амбон — сталярнай работы, пафарбаваны і пазалочаны. Пад будынкам знаходзіліся два мураваныя склепы, а ў памяшканні злева — восем лавак.

Агароджа ля касцёла і могілкаў была з усіх бакоў з каменя, але пераважна разбураная. Ля будынка знаходзілася званіца з драўляных брусоў на падмурку, пакрытая гонтам, з невялічкім бляшаным шпілем і старым жалезным крыжам.

У Міёрскай парафіі ў гэты час было некалькі капліц: дзве ў Камянполлі, адна ў Кацілаве, дзве ў Міёрах (напэўна, у гэтым выпадку пад Міёрамі трэба разумець сённяшнія Дубашынскі Двор і Клётаў Двор). У дакуменце 1823 г. пералічаны яшчэ населеныя пункты, якія адносіліся да парафіі. Прывесці іх тут неабходна хаця б таму, што многіх ужо няма на карце сённяшняга раёна. Ды яшчэ ўказана колькасць дамоў, трэба меркаваць, дамоў не ўвогуле, а вернікаў-католікаў.

Вось гэты пералік: Пад'ельцы — 11, маёнтак Міёры — 1, Міснікі — 8, Рызаўшчына — 5, Парчэлі — 3, маёнтак Кацілава — 1, Карпачова — 3, Крукаўка — 1, Войткава — 8, Жміндзіна — 1, Махіроўка — 3, маёнтак Любінова — 1, Лявонаўцы — 4, Чапукі — 4, маёнтак і вёска Гаране — 4, Барсучына — 1, Пазнякі — 2, маёнтак Міёры-Томкі — 5, Зажукі — 2, Востраў — 1, Жукі — 2, маёнтак Камянполь — 1, Святая Вада — 2, Янова — 5, Падліпкі — 2, Ніўкі — 2, Апанасёнкі — 3, Сякерка — 1, Гентава — 4, Гракава — 2, Даўгінаўка — 2, Асінаўка — 3, Арэхаўка — 3, Ігнацікі — 7, Слабодка — 8, маёнтак Станілава-Дворышча — 5, Шардзюкі — 5, Дзянісава — 5, Тэключын — 1, Букава — 8, маёнтак Міёры-Акулаўшчына — 1, Жукі — 2, Марцінаўцы — 1, Русачкі — 2, Мацюкі — 8, маёнтак Міёры — 1, Пячонкі — 8, маёнтак Шчоўна разам з Рускай Вёскай — 6, Барсучына — 2, Чэрава — 2, Мікелі — 3, Зарубежжа — 2, Лахоўцы — 1, Рыхіткі — 1, Яджэвічы — 1, Рубава — 3, Маразы — 3, Баркі — 3, маёнтак Загон — 1, Загоны — 12, Латышонкі — 5, Зубрава — 5, Пацава — 3, Салаўі — 2, Лапешчына — 2, Новы Двор — 1, Стрэтава — 4, Чурылава — 4, Дзехцярова — 3, маёнтак Багудзенькі з в. Орцы — 12, Найдава — 2, Александрова — 7, Гір'яты — 11, маёнтак Габрылеўшчына з в. Чарняўцы — 4, засценак Разаліна — 1, Папкі — 12, засценак Акунёва — 2, Лапаўшчызна — 2, Ліпліца — 2, Заскаў — 2, Сачнёва — 5, маёнтак Застаныш разам з вёскай — 8, Вільнова — 3, Баравыя — 2, маёнтак Блашкі і вёска — 11, маёнтак Чэрасы з трыма фальваркамі Франопаль, Селішча і Мазалеўшчына. Вёскі, якія належаць ім: Масеўцы — 6, Плейкі — 7, Сушкі — 3, Літоўчыкі — 1, Загаране — 3, Босіны — 3, Варонькі — 3, Мальцы — 2, Рабечына — 1, Гараўцы — 1, Пагары — 1, Палякі — 2, Грукі — 3, Крукі — 1, Чэрасы — 4, Дзядэк — 1, Канахі — 2, Картавыя — 3, Свярдлы — 2, Крыштулі — 2, Дворна — 6, Цілеўцы — 3, Дубровы — 3, Пестуны-Пальчахі — 1, Карпачовы — 1, Лаўкі — 3, Селязні — 1, Сілава — 2, Транцянава — абораў 6, дамоў 2, Міёры — дамоў 4, усяго дамоў 418, здольных да малітвы душ 2415, дзяцей 450.

Колькасць двароў і насельніцтва, напэўна, была значна большая, але ў асноўным гэта былі уніяты. А ўспомнены ў інвентары ксёндз Антоній Чапулевіч выконваў пастарскія абавязкі ў міёрскім касцёле на працягу амаль 20 гадоў, карыстаўся вялікай павагай прыхаджан. Выступаў супраць актыўнага праціўніка уніі мітрапаліта Сямашкі, за што і быў пакараны царскімі ўладамі: нягледзячы на пратэсты вернікаў, арыштаваны і высланы ў глыбіню Расіі. Мураўёў-вешальнік нават загадаў перарабіць гэты касцёл на праваслаўную царкву, толькі сам ён быў хутка пераведзены з ві-

ленскага генерал-губернатарства на іншую пасаду, а таму загад не выканалі. Праўда, касцёл некалькі разоў спрабавалі закрыць, таму што будынак сапраўды быў у аварыйным стане ўжо ў канцы XIX ст. Непагадзь у 1905 г. дакончыла справу. Дзякуючы ксяндзу Бародзічу ў гэтым жа годзе на тым жа месцы пачалося будаўніцтва новага цаглянага касцёла, у спадчыну якому ад старога будынка засталася маленькая вежа, пабачыць якую можна і сёння.

В. А. Ермалёнак

Сядзіба ў Забалацці

Забалацце — зараз цэнтр калгаса «Ленінскі шлях» у Перабродскім сельсавеце. У канцы XVII ст. належала небагатай шляхце Гірждаў, або Гірждавічаў. У 1742 г. яны пабудавалі тут сядзібу, якая з невялікімі зменамі захавалася амаль да нашага часу. У 1743 г. яе набывае сям'я Дмахоўскіх, якія жылі тут да 1939 г. Апошнім уладальнікам Забалацця быў Уладзіслаў Дмахоўскі. Зофія з Дмахоўскіх, па мужу Янушкевіч, якая жыве ў Польшчы, захоўвае купчую 1743 г.

Двор у Забалацці быў пабудаваны на высокім падмурку з вялікіх палявых валуноў. Перад парогам ляжала каменная пліта з надпісам «1742 год» — час будаўніцтва. Пад домам месціўся вялікі склеп для захоўвання розных запасаў. Драўляныя сцены звонку былі ашалёваны дошкамі, прыбітымі вертыкальна цвікамі мясцовага кавальскага вырабу. Чатырохсхільны дах спачатку быў пакрыты саломай, якая пазней заменена гонтай. У пачатку XIX ст. будынак упрыгожыў дабудаваны перад уваходам порцік на двух парах калон, высунутых перад галоўным фасадам, і двух танейшых пілонах пры сцяне. Перакрыццё порціка ўпрыгожыў карніз кубікамі, у трохкутным франтоне з'явілася паўкруглае акно ў выглядзе разыходзячыхся промняў.

Прыступкі былі зроблены з часаных валуноў, як і падмурак. Будынак меў адзін комін, да якога на гарышчы былі пракладзены дымаходы ад усіх печаў.

Дом па ўнутранай планіроўцы дзяліўся на дзве часткі, якія звязвалі вялікія сені. Справа ад уваходу быў самы вялікі пакой з двума вокнамі, які ў апошнія дзесяцігоддзі служыў сталовай. Прылягаючы пакой з адным акном быў спальняй. Квадратны пакой налева ад сяней — гульнёвы, побач з якім таксама месцілася спальня. З боку агарода ля сталовай знаходзілася вялікая спальня, а побач з ёй — жылыя памяшканні. Усюды столь перакрывалі бэлькі, сцены пабелены, падлога з лакіраваных дошак. Толькі ў сенях падлога была з цэглы.

Будынак ацяпляўся вялікімі мураванымі печамі. У левым гульнёвым пакоі знаходзіўся прыгожы камін з калонамі ў стылі класіцызму. Але ўжо ў сярэдзіне XIX ст. ён не выкарыстоўваўся па прызначэнні, а служыў замест алтара для адпраўлення імшы ў родным доме архібіскупам магілёўскім Казімірам Дмахоўскім (1780—1851).

Да 1908 г., да закладу маёнтка дзяржаве, у ім знаходзілася шмат прадметаў быту ў стылі ампір. Больш старадаўнія рэчы і каштоўнасці разрабавалі яшчэ французскія салдаты ў 1812 г. Захаваўся спіс вывезенага імі з маёнтка, які сведчыць аб тым, чым валодала заможная сям'я шляхты. Дык вось, французы тут нарабавалі 40 пудоў жалеза, 25 — солі, па 20 — вяндліны і сушанай рыбы, 10 — сала, 3 пуды тытуню, 1550 гарнцаў гарэлкі (гарнец — 3,7 літра), 140 гарнцаў піва, 240 — мёду, яшчэ некалькі сотняў гарнцаў воцату. У вялікай колькасці былі масла, сыры, воск і інш. Яшчэ французы прыхапілі куфэркі, старыя стрэльбы, шаблі, гадзіннік, люстру, футры, мэблю, сталовае срэбра, бялізну, бібліятэку, пасаг для дачкі ў 2000 злотых срэбрам, старыя французскія віны, прадметы даўніны. Усяго нарабавана на 60 500 злотых срэбрам.

Калі пад час знаходжання Напалеона ў Глыбокім Забалацце наведаў генерал граф Антоні Друт, ён застаў сядзібу цалкам спустошаную салдатамі арміі Мюрата. Засаромеўшыся ўчынку сваіх суайчыннікаў, ён пакінуў на дошцы цудам уцалелага пісьмовага стала наступны запіс: «З вялікім жалем знайшоў гэты будынак спустошаны маімі землякамі, бязмерна шкадую, што асобы, якія тут жылі, вымушаны былі пакінуць сваё паселішча — 20 ліпеня 1812 года».

У наступныя сто год пакоі сядзібы былі запоўнены новымі прадметамі хатняга ўжытку, мэбляй, партрэтамі роду Дмахоўскіх, іншымі мастацкімі каштоўнасцямі. Сярод партрэтаў знаходзілася скульптура Казіміра Дмахоўскага і іншыя творы Генрыха Дмахоўскага. Ганарыліся Дмахоўскія і аўтографам французскага генерала, які быў закансерваваны, а побач размясціўся яго партрэт.

Большасць рэчаў з сядзібы была вывезена ў Вільню, дзе і згарэла ў 1944 г. Частку фамільных каштоўнасцей украў лёкай яшчэ ў 1932 г., забіўшы свайго гаспадара Міхала Дмахоўскага. Да 1939 г. стаяў лямус, пабудаваны таксама ў 1742 г., аб чым сведчылі лічбы на адной з бэлек.

Вакол дома месціліся сад і агарод плошчай 4 гектары. Тут раслі старыя дубы, ліпы, клёны, бярозы. Асаблівай пашанай быў акружаны пірамідальны дуб, пасаджаны мітрапалітам Дмахоўскім. Насупраць гаспадарчых пабудоў усяго за 200 метраў пачынаўся стары яловы бор, у якім штогод чаплі закладвалі каля 80 гнёздаў. Гэта было практычна адно ва ўсёй Еўропе гняздоўе такіх памераў. Але пад час безуладдзя 1917—1920 гг. мясцовыя жыхары знішчылі лес, зніклі і птушкі.

Сядзіба ў Забалацці ў даваеннай Польшчы была аб'яўлена помнікам архітэктуры, дзе ўсялякія перабудовы забараняліся.

В. А. Ермалёнак

Сядзіба ў Міжрэччы

Паселішча Міжрэчча ў дакументах упершыню ўзгадваецца яшчэ ў XVI ст. Праўда, называлася яно тады Дуброўка, належала славутаму роду Сапегаў. Менавіта ад іх набыў у XVII ст. паселішча Багдан Валасоўскі. З таго часу і пачала называцца Дуброўка Міжрэччам. Другі набыты фальварак гаспадар назваў у свой гонар Багданавым. Яго ўладанні сталі спадчынай сыну Ігнату, жанатаму на Брыгідзе Мірскай. Паколькі ў іх не было дзяцей, то маёнткі перайшлі да сястры Ігната Валасоўскага Канстанцыі, якая выйшла замуж за Томаша Мірскага, і другой сястры Казіміры, жонкі Аляксандра Лапацінскага. Такім чынам, Багданавым сталі валодаць Лапацінскія, а Чамяры і Міжрэчча дасталіся Мірскім.

У 1852 г. Міжрэчча атрымаў у спадчыну Віктар Мірскі. Пасля яго смерці ў 1892 г. гаспадарыць тут засталіся пяць дачок. Адна з іх, Ядвіга, выйшаўшы замуж за Вацлава Аскерку, сплаціла сваім сёстрам кошт маёнтка і стала паўнаўладнай уласніцай Міжрэчча, дарэчы, апошняй. Муж яе памёр у 1905 г., а яна памерла ў Сібіры пасля высылкі ў 1940 г. Яе сын Альгерд Аскерка з'яўляўся членам Браслаўскага павятовага камітэта трох выбараў, быў добрым гаспадаром, асабліва любіў гадаваць коней. Па ўспамінах браслаўскага старасты З. Янушкевіча, ён заўсёды клапаціўся аб развіцці конегадоўлі ў павеце.

Старадаўняя сядзіба ў Міжрэччы была пабудавана са старога дуба. Месцілася яна на маляўнічым схіле, вакол якога бліскучай стужкай бруілася рака Вята. Будынак узводзіўся на працягу амаль двух з паловай стагоддзяў. Першы яго паверх быў закончаны яшчэ ў XVII ст., другі паверх і іншыя пабудовы закончаны ў канцы XIX ст. Ніжні паверх мураваны і атынкаваны, уваход у яго з боку ракі. Перад уваходам на значнай адлегласці адна ад другой стая-

лі дзве часаныя з каменю калоны. Напэўна, раней на іх трымаўся дах. А з дабудовай другога паверха яны сталі падтрымліваць рызаліт.

Будаўнічым матэрыялам для другога паверха былі дубовыя бярвенні. З яго ўзвядзеннем перанесены і галоўны ўваход на супрацьлеглы бок. На рызаліце другога паверха была галерэя з маленькіх калон, крытая дошкамі. З боку ракі, але на той самай вышыні, месцілася лоджыя. Дах быў высокі, крыты гонтай. Пасля пабудовы другога паверха ўнізе размясціліся кухня, пякарня, склеп, гаспадарчыя памяшканні. Паўз усе паверхі праходзілі два вялікія коміны. Наверсе знаходзіліся сталовая 8×5 м, салон 7×5 м. Па абодвух баках калідора месціліся па тры пакоі. Ля лоджыі знаходзіліся яшчэ два пакоі. Прыхожая была аздоблена пад натуральнае дрэва. Вокны выраблены нібы з двух частак: ніжняя простакутная, верхняя нагадвала паўкруглы вітраж. У даўнія часы пакоі былі абабіты тканінай, у міжваенны час іх аклеілі шпалерай. Цікавымі з'яўляліся вялікія грубкі з бронзавай, белай, жоўтай кафлі XVIII — XIX стст., упрыгожанай арнаментам. Падлога выкладзена з паркета рознымі ўзорамі. Жалезныя клямкі ў дзвярах пакояў былі цудоўнай кавальскай работы, такіх больш нідзе немагчыма сустрэць. Адзін з пакояў насіў назву масонскага, таму што Томаш Мірскі, колішні ўладальнік сядзібы, з'яўляўся членам Віленскай масонскай ложы, масонам лічыўся і яго швагра Канстанцін Валасоўскі. Сам Томаш Мірскі — генерал, адзін з кіраўнікоў віленскага ўрада пад час паўстання Тадэвуша Касцюшкі.

У пакоях было шмат старадаўняй мэблі, часткова выраблена мясцовымі майстрамі. Шмат прадметаў прывезены з Італіі. Захаваўся дакумент пачатку XIX ст., які пацвярджаў уплату ста дукатаў за карціны еўрапейскіх мастакоў. Частка каштоўных рэчаў была падзелена яшчэ ў канцы XIX ст., нейкая колькасць пад час рэвалюцыі вывезена ў Лявонпаль, дзе загінула пры пажары палаца Лапацінскіх. Асабліва шкада багатага архіва, дзе былі нават каралеўскія граматы і прывілеі ўладальнікам Міжрэчча, лісты XVII — XVIII стст., газеты часоў паўстання Т. Касцюшкі. Усё гэта знікла ў гады вайны, у пасляваенны час.

Паблізу дома, направа, знаходзілася



Сядзіба ў Міжрэччы



Лямус

яшчэ адна цікавая пабудова — лямус, напэўна, таксама XVII ст. Як і дом, ён двухпавярховы. У ніжнім, мураваным, былі лядоўня, склеп, а ў верхнім, драўляным, знаходзіўся склад для сушэння сыроў. Гэты будынак таксама быў крыты гонтам, існавалі сляды галерэі, якая акружала лямус на вышыні паўпаверха.

Перад домам знаходзіліся вялікія газоны. Дарога ад ракі была абсаджана дэкаратыўнымі кустамі. Да самой сядзібы вяла кіламетровая алея надвіслен-скіх таполяў. Пірамідальныя таполі і старыя каштаны вельмі прыгожа аздаблялі ўезд на сядзібу. Налева ад дома цягнуўся сад, абсаджаны бэзам. Дарога паміж домам і садам вяла ад ракі, па яе правым баку знаходзіўся парк для прагулак са шматлікімі сцежкамі, алеямі, абсаджанымі дэкаратыўнымі кустамі, серабрыстымі і бальзамічнымі таполямі, чаромхай. Адсюль вяла маляўнічая сцежка ў даліну векавых дубоў і ліп.

В. А. Ермалёнак

Сядзіба ў Крычаве

В. Крычава з'яўляецца адным з самых старажытных паселішчаў раёна. Упершыню ўзгадваецца яна ў дакументах пачатку XVI ст. як уладанне Зяновічаў. У 1522 г. Крыцовічы (так тады называлася Крычава) набывае Пётр Масальскі. Пад канец XVII ст. вёска перайшла да Міхала Рудаміны, які меў герб «труба». Але ўжо ў 1721 г. яго сын Аляксандр прадае набытыя бацькам землі Францішку Невянглоўскаму, які ўзначальваў войска Браслаўскага павета. Новы ўладальнік паходзіў з мазавецкіх князёў гербу «ястраб», жанаты быў на мясцовай княгіні Мірскай. Пасля маёнтак перайшоў да малодшага сына Тадэвуша, гусарскага харужага і дэпутата 1770 г. на літоўскі трыбунал. Ён быў жанаты на Багуміле Шаўман. Так як два старэйшыя сыны Тадэвуша не мелі нашчадкаў, Крычава дасталася самаму малодшаму Фердынанду, старшыні памежнага суда Дзісенскага павета. Ён быў жанаты на Ганне Левандоўскай. Іх сын Ігнат атрымаў у спадчыну не толькі маёнтак, але і пасаду старшыні памежнага суда. Ад яго шлюбу з Эдвінай Рудніцкай не было сыноў, таму Крычава ў другой палове XIX ст. пераходзіць ва ўладанне Федаровічаў, бо дачка Міхаліна выйшла замуж за Норберта Федаровіча. Апошнім уладальнікам Крычава стаў Уладзіслаў Федаровіч (1876—1943). Па ўспамінах браслаўскага старасты З. Януковіча, гэта быў вельмі паважаны ў павеце гаспадар, які карыстаўся павагай не толькі заможных жыхароў, але і сялян. Ён адзін з першых у гэтых мясцінах адмовіўся ад сервітутаў і бязвыплатна перадаў гэтыя землі крычаўскім сялянам. У гаспадарцы яму дапамагала вельмі энергічная і дзелавая жонка. Сам ён любіў займацца садам, кветкамі і развядзеннем дрэў, якімі былі абсаджаны ўсе дарогі маёнтка. Сядзіба заўсёды ўтрымлівалася ў чысціні і парадку, яе гаспадары славіліся добразычлівасцю і гасціннасцю.

Сядзіба, якая была разбурана пасля апошняй вайны, пабудавана, верагодна, у другой палове XVIII ст. Тадэвушам Невянглоўскім. Велічны, прасторны, выцягнуты з захаду на ўсход будынак

з дрэва ўвасобіў у сабе асноўныя рысы класіцызму. Праўда, галоўны жылы дом быў перабудаваны ў 1880 г. Бакавыя флігелі разабралі, але замест іх Федаровіч дабудаваў тры пакоі з аднаго боку, а з другога — кухню і службовую. У час археалагічнай разведкі юныя археолагі выявілі на месцы сядзібы падмурак склепа з надпісам «1898 год», які таксама складаў з будынкам адно цэлае.

Аб знешнім выглядзе пабудоў мы можам даведацца з запісаных у 1887 г. успамінаў Уладзіслава Мікеля і са здымкаў 30-х гадоў, якія захаваліся. Цэнтральная частка будынка была на высокім каменным падмурку. Фасад яго меў шырокі порцік з двума радамі калон і па абодвух баках невялікія верандачкі, якія таксама трымаліся на калонах. Сцены былі шаляваныя. Вокны, дзверы і калоны пафарбаваны ў белы колер. Дах шырокі чатырохсхільны, крыты гонтай. Дом змяшчаў гасціную, тры вялікія жылыя пакоі, налева шырокі калідор з зімовым садам дзяліў вялікі і малы салоны, пакой для гасцей, будуар, сталовую і буфет. Некалькі малых пакояў служылі для адміністрацыі і гаспадарчых патрэб. Сцены іх тынкаваныя, часткова паклеены шпалерамі. Падлога паркетная, печы з каляровай кафлі, былі два каміны, адзін з іх у сталовай з цэглы, атынкаваны і пафарбаваны ў белы колер, другі ў будуары, аздоблены гіпсам у стылі ракако.

Да 1914 г. у сядзібе было шмат антыкварыяту, мэблі. Спальня і будуар былі абстаўлены ў стылі ракако, пераважна мясцовымі майстрамі, у іншых памяшканнях — з чырвонага дрэва ў стылі ампір, у кабінеце — бідэрмеер (аўстра-германскі стыль першай паловы XIX ст., падабенства ампіру). Сустракалася мэбля з ясеню, інкруставаная чорным дубам. На сценах было шмат карцін, у тым ліку выдатныя копіі італьянскіх мастакоў XV—XVI стст., копія Смакоўскага карціны французскага мастака К. Маленэра «Першы пацалунак». Былі нават тры акварэлі славутага Дэлакруа. Выдатны партрэт Норберта Федаровіча ў дзіцячыя гады невядомага аўтара.

У кабінеце знаходзіўся кнігазбор літаратуры пераважна на гістарычную тэматыку XIX ст., але былі і рэдкія выданні папярэдніх стагоддзяў, старадрукі. Знаходзілася шмат вырабаў з парцэляны. Асабліва каштоўныя старадаўні французскі белы сервіз для снедання, упрыгожаны бурбонскімі лілеямі, для белай кавы, расійскі сервіз майстра Гарднера для чорнай кавы на 12 асоб, яшчэ больш старажытны, але разукамплектаваны чорны з кветкамі англійскі абедзенны сервіз. Асаблівае захапленне ў калекцыянераў выклікала ліловая масленіца са старой польскай парцэляны ў выглядзе галубка. Уладальнікі сядзібы падаравалі для народнага музея ў Варшаве старадаўні сярэбраны кубак на два літры з гербам Невянглоўскіх. У 30-я гады ў Браслаўскі музей падараваны слуцкі пояс, шыты залатымі і сярэбранымі ніткамі.

У наведвальнікаў выклікаў цікавасць французскі габелен і турэцкі дыван.

Частку старажытных рэчаў прывезлі ў свой новы маёнтак яшчэ Невянглоўскія, людзі высокай культуры. Шмат сабраў іх у час вандровак па Еўропе і Турцыі Норберт Федаровіч. Які лёс гэтых збораў? Частка была падзелена паміж дзецьмі. Бібліятэка згарэла ў часы ліхалецця 1917—1920 гг. Рэштка разрабавана і знішчана ў 1939 г.

Цікавым архітэктурным помнікам сядзібы быў свіран XVIII ст., пабудаваны на высокім падмурку з каменя, меў шырокія каменныя прыступкі, пад'езд упрыгожвалі шэсць калон, дах крыты гонтам. Будыніна нагадвала загадкавы палац.

Побач з сядзібай існавала капліца — шэдэўр драўлянага дойлідства. Але калі царскія ўлады захацелі перарабіць яе на царкву, па загаду Эдвіны Невянглоўскай будыніну разабралі за адну ноч. На яе месцы паўстаў пахавальны фамільны склеп. Зараз тут засталіся толь-

кі вялікія дрэвы ды адзінае надмагілле Невянглоўскіх.

Парка сядзіба ў Крычаве не мела, але былі кветнікі, алеі для прагулак, абсаджаныя ліпамі, грабам, дубамі, зараснікі бэзу, якія прыгожа глядзеліся над маляўнічымі сажалкамі.

В. А. Ермалёнак

Сучасная забудова раёна

Сучасная комплексная перабудова вёсак на аснове праектаў раённай планіроўкі вядзецца больш 20 гадоў. Ужо вызначыліся перспектывы сістэмы расселення і сеткі культурна-бытавога абслугоўвання. Паступовая канцэнтрацыя працоўных рэсурсаў у цэнтральных пасёлках гаспадарак дазволіла сканцэнтраваць там будаўніцтва жылых, грамадскіх і вытворчых памяшканняў. Адначасова выявілася, што ліквідацыя неперспектыўных населеных пунктаў у вызначаныя тэрміны эканамічна не абгрунтавана і нерэальная. З невялікіх вёсак людзі перасяліліся не толькі ў цэнтральныя, але і ў іншыя, дзе ў большай меры захоўвалася перспектыва не парушаць традыцыйны ўклад сялянскага жыцця. Развіццё дарог і транспарту дазволіла забяспечыць усе населеныя пункты паслугамі гандлю, быту, сувязі і медыцынскай дапамогі.

Планіровачную структуру раёна можна лічыць прыступкавай: ад хутароў, невялікіх паселішчаў і цэнтральных сядзіб гаспадарак да цэнтраў мясцовай сістэмы рассялення (Міёры, Дзісна, Язна) і раённага цэнтра.

Мясцовая сістэма з цэнтрам у г. Міёры займае тэрыторыю 0,71 тыс. кв. км з насельніцтвам 14,7 тыс. чалавек (у тым ліку ў райцэнтры — 11,6 тыс. чал.). Яна ўключае 15 калгасаў і саўгас з плошчай сельгасугоддзяў 53,9 тыс. га, дзе цэнтрамі ўнутрыгаспадарчых сістэм з'яўляюцца вёскі Даўгінава, Дворнае Сяло, Дрыгучы, Забалацце, Ідолта, Камянполле, Наўгароды, Новы Пагост, Павяцце, Паташня, Перабродцзе, Слабада, Узмёны, Чапукі, Чэрасы.

Мясцовая сістэма з цэнтрам у Дзісне займае 0,27 тыс. кв. км, тут жыве 6,8 тыс. чалавек (у тым ліку 3 тыс. у горадзе). Размешчана 8 калгасаў з 22 тыс. га сельгасугоддзяў з цэнтрамі ў вёсках Завуцце, Мікалаёва, Папшулі, Сіцькова, Туркова, Цвеціна, Шарагі.

Мясцовая сістэма з цэнтрам у Язне займае 0,14 тыс. кв. км з насельніцтвам 4 тыс. чалавек (у тым ліку 1,3 тыс. чалавек у цэнтры), уключае ў сябе калгас і два саўгасы з 10 тыс. га сельгасугоддзяў, у якіх цэнтрамі ўнытрыгаспадарчых сістэм з'яўляюцца вёскі Басянкі III, Іст, Канцэрава.

У забудове цэнтраў буйнейшых населеных пунктаў раёна пераважаюць узбуйненыя кааперараваныя і блакіраваныя аб'ёмы ўстаноў культурна-бытавога прызначэння (Дзісна, Завуцце, Іст, Канцэрава, Наўгароды, Мікалаёва, Туркова, Чэрасы, Шарагі, Язна). Яны дазваляюць не толькі выявіць значнасць грамадскага цэнтра ў структуры паселішча, але і палепшыць плошчу пад забудовай, скараціць затраты на будаўніцтва і добраўпарадкаванне, эксплуатацыйныя затраты. Акрамя таго, кааперацыя і блакіроўка грамадскіх будынкаў зручныя ў адносінах абслугоўвання насельніцтва.

На жаль, тыпавыя праекты грамадскіх будынкаў 70—80-х гадоў, нецікавыя ў архітэктурна-планіровачных адносінах, не змаглі стварыць запамінальныя вобразы цэнтраў паселішчаў. Адмоўную ролю адыгралі таксама недахоп сродкаў і адсутнасць добрых абліцовачных і дэкаратыўных матэрыялаў. Усё гэта на працяглы час затармазіла павышэнне якасці будаўніцтва і добраўпарадкавання.

Знешняе аблічча населенага пункта фарміруецца дзесяцігоддзямі і стагоддзямі. У 70—80-я гады ўзведзена шмат аб'ектаў: 16 сярэдніх і адна музычная школы, 167 грамадскіх будынкаў, тысячы квадратных метраў жылой плошчы,

з'явіліся прыватныя і фірменныя магазіны. Аднаўляюцца і будуюцца культавыя памяшканні (Дзісна, Міёры). Пабудавана паліклініка ў Дзісне і ўзводзіцца цэнтральная раённая бальніца ў райцэнтры.

У раёне два гарады — Дзісна і Міёры. Райцэнтр размешчаны на раўніне з невялікімі павышэннямі з агульным ухілам у бок возера. У ім склаліся два прамысловыя раёны на паўночным захадзе і ўсходзе. Пераважае аднапавярховая індывідуальная забудова ўздоўж паўночнага берага возера, акрамя цэнтральных вуліц. Новае прыватнае будаўніцтва ў асноўным двухпавярховае па індывідуальных праектах. Своеасаблівасць цэнтру горада надаюць будынкі Дома культуры з музычнай школай, універмага, гарсавета, Дома быту, кінатэатра, вузла сувязі, райвыканкама, Аграпрамбанка і ашчаднага банка, аўтобуснай станцыі, фірменнага магазіна малаказавода, трох сярэдніх школ. Своеасаблівую «браму» на пачатку вуліцы Дзяржынскага ўтвараюць перад плошчай два пяціпавярховыя жылыя дамы. Яшчэ вылучаюцца будынкі музея і рамбыттэхнікі, царква, касцёл, помнік на брацкай магіле воінаў і партызан, Курган Славы на паўвостраве.

Візітнай карткай райцэнтра з'яўляецца касцёл, размешчаны на перакрыжаваннях вуліц галоўнага напрамку.

Горад Дзісна мае вялікую гісторыю, вось толькі сляды яе сцёрла апошняя вайна. Цяпер ён займае 396 га, жыве тут 3 тыс. чалавек. Пераважае індывідуальная сядзібная забудова традыцыйнай местачковай архітэктуры. Грамадскі і гістарычны цэнтр размешчаны на ўзвышшы, дзе знаходзіцца большасць магазінаў. Дом культуры, Дом быту, школа-інтэрнат, дзіцячы сад, гасцініца і інш. У зарэчнай частцы ўзведзены школа, Дом культуры, асноўная частка шматпавярховага жылля.

Прамысловасць у Дзісне развіта слаба. Новае аблічча горада вызначае забудова апошніх дзесяцігоддзяў.

Вось як вызначыў горадабудаўнічую практыку нашых гарадоў У. А. Чантурыя: «Дзісна... Ад Дзісенскага замка, акружанага ў мінулым высокімі валамі з дзевяццю вежамі, цяпер засталіся толькі сляды былых умацаванняў або руіны, якія параслі хмызняком. Сам горад Дзісна, які размясціўся на паўвостраве насупраць замка, нягледзячы на разбурэнні, узяў у спадчыну многія рысы архітэктурна-планіровачнай пабудовы XVI ст. (план Гедэмана, канец XVI ст.).



Будынак сярэдняй школы ў Дзісне

Пасёлак работнікаў ЛПДС у Дзісне

Згодна з планам другой паловы XVIII ст. горад быў разбіты па рэгулярнай схеме, якая адпавядала становішчу Дзісны на паўвостраве. Шырыня апошняга знаходзіцца ў межах 500—750 м, што вызначыла кампактнасць гарадскога плана. Дзве асноўныя вуліцы — адна накіравана да Дзвіны — Замкавая (цяпер вул. Юбілейная), другая — да выгону Дзісны — Уваскрасенская (цяпер вул. Кірава), перакрыжаваліся пад вострым вуглом у сярэдзіне горада. У гэтым месцы развіўся ансамбль рынначнай плошчы з ратушай і гандлёвымі радамі.

Выцягнутыя прамавугольныя кварталы бралі свой пачатак ад гэтых двух асноўных вуліц горада. Уся астатняя



Плошча загінуўшых барацьбітоў у Міёрах

вулічная сетка склалася так, што атрымала арыентацыю на рэкі, якія паўкальцом апаясваюць Дзісну. Граніца горада з трэцяга боку была прарэзана земляным валам з драўлянымі венсамі. Такім чынам, Дзісна мела даволі буйную фартыфікацыйную сістэму.

Прынятая планіровачная структура горада паказала сваю жыццяздольнасць, апраўданасць на працягу стагоддзяў. Параўноўваючы план Дзісны канца XVI ст. з планавай дакументацыяй XVIII, XIX, XX стст., можна прасачыць захаванасць першаасновы горада і тэрытарыяльнае развіццё яго ўздоўж Заходняй Дзвіны, у бок Міёраў (вуліцы Пушкіна, Горкага, Новая, Першамайская і інш.). Працягваючы традыцыйныя вулічныя напрамкі ад Заходняй Дзвіны да Дзісны (вуліцы Піянерская, Арджанікідзе, Гагарына, Кірава, Суворава, Лермантава і інш.), склаліся вуліцы Леніна, Глыбоцкая, Камарова, Пралетарская, Дзвінская і інш.

Адной з галоўных вуліц горада стала вул. Леніна, траса якой у многім супадае з земляным абарончым валам XVI ст. Свой пачатак яна бярэ ад моста праз Дзісну. Да вуліцы прымыкае цэнтральная плошча. Ансамбль плошчы цяпер у стадыі фарміравання. Паблізу плошчы захавалася група цагляных жылых дамоў у 1—3 паверхі, якія адносяцца да другой паловы XIX — пачатку XX ст.

Да нашых дзён з гісторыка-архітэктурнай спадчыны ў цэнтры Дзісны захаваліся толькі адноўленая царква (канец XIX — пачатак XX ст.) і руіны францысканскага касцёла з манастыром (канец XVIII ст.). Таму ў культурнай спадчыне горада асаблівую каштоўнасць набывае сістэма планіроўкі вуліц — помнік горадабудавання XVI — XX стст.»

«Міёры ... Размяшчэнне паселішча ля падоўжанага і нешырокага возера вызначыла яго планіроўку, у якой асноўныя вуліцы трасіраваны ўздоўж вадаёма, супадаючы з напрамкам дарогі Браслаў — Полацк. Іншыя, больш кароткія, папярэчныя вуліцы супадаюць з напрамкам дарог на Друю і Верхнядзвінск. Гэтыя вуліцы ў сваёй большасці ўпіраюцца ў бераг возера. Утварылася геаметрычна правільная сістэма планіроўкі з прамавугольнымі кварталамі, звычайнымі для рэгулярнай планіроўкі канца XVIII — першай паловы XIX ст.

Міёры заўсёды былі невялікім паселішчам, дзе забудова ў асноўным прадстаўлялася драўлянымі дамамі сядзібнага тыпу. Цагляных пабудоў было мала, сканцэнтраваны яны ў раёне гандлёвай плошчы і прылягаючых да яе вуліц. Старыя цагляныя пабудовы, за невялікім выключэннем, амаль усе загінулі ў час вайны.

Новыя дамы па вул. Дзяржынскага ў Міёрах

Найбольш каларытным месцам горада

з'яўляецца тэрыторыя паміж вул. Кірава і дарогай праз дамбу ў бок Глыбокага. Гэта — і найбольш маляўнічы куточак Міёраў: ён абмываецца водамі возера, добра азяленены, бачны з набярэжнай і паўднёвых ваколіц горада. Невялікі паўвостраў з Курганам Славы і зялёным масівам, а таксама размешчаны паблізу касцёл з групай пабудоў (цяпер адносяцца да бальнічнага комплексу) робяць гэты раён запамінальным, характэрным гістарычным месцам Міёраў.

Успенскі касцёл — помнік архітэктуры пачатку XX ст. (1907). Гэта невялікая цагляная пабудова з дзвюма вежамі пад высокімі шатрамі і трохкутным шчынцом у сярэдзіне галоўнага фасада. Бакавыя фасады ўпрыгожаны абманнымі контрфорсамі, сцены прарэзаны стральчатымі аркамі-вокнамі. Па сутнасці, гэта архітэктура ўяўляе сабой творчую кампазіцыю з прыёмаў, форм і дэталей касцельнага будаўніцтва мінулых стагоддзяў. Цагляныя пабудовы ў 1—2 паверхі, што знаходзяцца побач, як і брама на вуліцы, выкананы ў такой жа мастацкай манеры. Як ужо адзначалася, у горадабудаўнічых адносінах гэты комплекс займае значнае месца ў горадзе.

Добра захавалася старая планіровачная сетка вуліц, якая пакладзена ў аснову новага цэнтра, атрымаўшы далейшае развіццё ў адпаведнасці з сучаснымі сацыяльнымі патрабаваннямі і нарматывамі.

На месцы знесенага квартала паміж вуліцамі Дзяржынскага і Кірава ўтворана новая плошча з раённым Домам культуры і школай мастацтваў, скверам, плошча, якая заняла цэнтральнае месца ў плане горада, атрымала шырокае раскрыццё ў бок возера. Паблізу яе выраслa новая забудова па вуліцы Камуністычнай, Кастрычніцкай, Дзяржынскага. Гэта будынкі былых райкама і райвыканкама, гасцініцы, універмага, кінатэатра, дома быту, жылыя дамы і інш. Атрымаўся другі, больш буйны сучасны маштаб забудовы Міёраў, прытым захоўваецца запаветны куток старой часткі на беразе возера» (Чантурыя В. А. Памятники архитектуры и градостроительства Белоруссии. Мн., 1986. С. 195—199, 201—203).

Застаецца сказаць толькі аб перспектыве развіцця гарадоў. У райцэнтры



Міёры. Вуліца Камуністычная



Сярэдняя школа ў в. Язна

капітальная забудова будзе працягвацца пераважна ўздоўж вуліц Камуністычнай і Дзяржынскага, індывідуальная — у паўночна-усходнім і паўднёвым напрамках, у Пад'ельцах, якія стануць часткай горада, — ля аб'язной дарогі. Гандлёвая зона прадугледжваецца ў раёне вуліц Камуністычная і Савецкая. Дадатковая паркавая зона размесціцца на берагах возера.

У Дзісне прадугледжваецца далейшая забудова цэнтра, рэканструкцыя гістарычных пабудоў, расшырэнне паркавай зоны.

Будзе развівацца Язна, дзе ўжо склаліся тры групы грамадскіх будынкаў (Дом культуры, сельсавет, царква, магазіны, школа, Язненская БЭП і пасёлак меліяратараў). У першую чаргу плануецца аб'язная дарога, якая разгрузіць ад транспарту цэнтральную вуліцу.

Т. А. Альхімовіч

Народныя промыслы

Насельніцтва Беларусі на працягу ўсёй гісторыі свайго існавання займалася рознымі рамёствамі і промысламі. Яны прайшлі тры гістарычныя стадыі — дамашняга рамяства, рамяства на заказ і рамяства на рынак. Народная традыцыя акумулявала шматвяковыя калектыўныя навыкі і вытворчыя веды, што арганічна ўваходзілі ў нацыянальны фонд народнай культуры. Паступова пачынала больш выразна акрэслівацца спецыялізацыя, з сельскага насельніцтва вылучаліся майстры, для якіх рамяство станавілася важнай ці нават асноўнай крыніцай існавання. Утвараюцца цэлыя пасяленні рамеснікаў пэўнай спецыяльнасці — цесляроў, бондараў, гарбароў, гутнікаў, ганчароў і інш.

Адным з асноўных відаў народных мастацкіх промыслаў на Беларусі здаўна было ганчарства. Сярод іх у XVIII ст. вылучалася дзісенская кераміка. Да нашага часу гэты промысел, на жаль, не захаваўся.

Дзісенская кераміка

У XVIII ст. кераміку выраблялі і майстры гаршэчна-мулярнага цэха. У 1936 г. працавала каля 25 чалавек. Выраблялі гаршкі, збаны, глякі, слоі, міскі, спарышы і іншы посуд, які ў залежнасці ад ёмістасці меў розныя назвы. Значнае пашырэнне мелі дэкаратыўная кераміка і гліняныя цацкі пераважна анімалістычнага характару (фігуркі бараноў, пеўнікаў, мядзведзяў і інш.). Посуд вызначаўся плаўнымі мяккімі абрысамі, што былі характэрны для промыслаў Паўночна-Заходняй Бе-

ларусі. Яго выраблялі спосабам выцягвання на нажным ганчарным крузе, выкарыстоўваючы фармовачную масу звычайна з гліны аднаго гатунку, зрэдку з дадаткам жарствы (для гаршкоў). У канцы XIX — сярэдзіне XX ст. пераважала вытворчасць паліванай керамікі (паліва на свінцовай аснове, празрыстая бясколерная, часам зялёная або карычневая). Аздаблялі традыцыйным лінейна-хвалістым контррэльефным арнаментам і раслінай або геаметрызаванай падпаліўнай ангобнай размалёўкай, нанесенай па чырвоным, часам белым фоне у 2—3 колеры (белы, зялёны, карычневы). У наш час промысел не існуе. Калекцыя дзісенскай керамікі зберагаецца ў Музеі старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1989. С. 171—172.

Фальклор Міёршчыны

Вусная народная творчасць — важная і неад'емная частка духоўнай культуры беларускага народа, у якой адлюстравалася яго гісторыя і працоўны вопыт, грамадска-палітычныя і эстэтычныя ідэалы, мары і спадзяванні.

Багаццем паэтычных фарбаў вылучаецца каляндарна-абрадавая і сямейна-абрадавая паэзія, пазаабрадавая паэзія.

Папулярныя ў народзе празаічныя эпічныя творы — казкі, легенды, паданні, анекдоты і жарты. Перадаюцца яны з пакалення ў пакаленне, каб не гублялася сувязь з роднай зямлёй. Дзеля гэтага пачынаючы з мінулага стагоддзя рупліўцы беларускага фальклору занатоўвалі і занатоўваюць усе скарбы народнай паэзіі, выдаюць у апрацаваным і неапрацаваным выглядзе. Шмат песень, балад і іншых жанраў вуснай народнай творчасці захавалася на Міёршчыне і Дзісеншчыне. Песня — душа народа. А яна ў нашых людзей багатая і шчодрая.

Даўнія песні Наддзвіння

Экспедыцыя наша, паволі пасоўваючыся ўніз па Дзвіне, удавалася ў межы Міёрскага раёна. Самі Міёры, прыгожа размешчаныя над возерам, акаймаваным задумлівымі вербамі, дóбра дагледжаны акуратны гарадок, былі нам каротким прыпынішчам. Пераначаваўшы ў школе (гасцініцу запаланілі сельскія спартсмены), мы рана выбраліся па маршруту. Трэба было шырока раскідаць групы, каб як мага паўней ахапіць рэгіён і не лішне паўтарацца ў запісах. Першую групу кінулі блізка, у Антаполлі: не шкодзіла праверыць, суаднесці сучасныя запісы з тымі, якія зрабіў тут у 90-я гады XIX ст. чэшскі славіст і, мяркуючы па публікацыях яго, неблагі знаўца нашай культуры, шчыры прыхільнік яе Адольф Чэрны.

Другую групу пакінулі значна далей, у азёрна-лясным закутку пад Язнам. Тыя ж, што яшчэ заставаліся неразмешчанымі, на чале з Міхаілам Грынблатам скалясілі паўраёна і нарэшце дабраліся да ваколіц Старога і Новага Пагостаў. У Старым Пагосце, што выцягнуўся ўздоўж тракту, зайшлі ў крайнюю хату. Дом Пучынскіх, сапраўдная хароміна, стаіць воддаль дарогі, на пагорку. Пры ім добра разрослася сад. Пучынскія даўно выгадавалі дзяцей, паставілі іх на ногі і цяпер жывуць адны. «Чаму не пусціць на пару дзён людзей, у нас цэлае лета жывуць людзі, але цяпер, можа, нязручна, — казала пажылая гаспадыня. — Узяліся трохі паправіць падлогу». З чыстай палавіны хата густа пахла свежай фарбай. Расчараваныя няўдачай, нехаця мы падаліся назад, да аўтобуса. У вушах яшчэ гучала добрая ў сваёй натуральнасці і непадробнасці народная гаворка гаспадыні. І калі з падворка адкрыўся від на возера, на хаты пагашчан, што туліліся да яго, я сказаў сабе: «Нікуды адсюль не пайду». Узяў рукзак, магнітафон і развітаўся з сябрамі. А яны заспяшаліся далей. З ганка Пучынскіх было відаць, як наш аўто-

бус, пахіставаючыся ад хуткай язды, мінаў калгасны сад за вёскай.

Пучынскія лёгка знайшлі мне куток у сваім вялізным доме. А неўзабаве ўдвух з гаспадаром мы пайшлі парадкаваць лазню. Яна ўжо была выпалена, і трэба было толькі выграбці жар ды прынесці некалькі вёдзер халоднай вады. Пакуль тупалі каля лазні, потым хвастáліся бярозавым маем і нетаропка плюскалі вадой, я даведаўся, што Пучынскі «пры панах» усмак зазнаў горкага парабкоўскага хлеба, з маладых гадоў прыслухоўваўся да слова праўды, якое з глыбокага падполля гаварыла працоўным Заходняй Беларусі кампартыя, несла Рабоча-сялянская беларуская грамада. У час вячэры ў прасторнай кухні са старым, на добрую сям'ю сталом пры акне, з вялікай белай печчу і драўляным ложкам з боку ля сцяны гутарка плыла паволі. Перажытае, успаміны мяшаліся з сённяшнім. Нясмела кідалася думка ў будучыню. Жыццёвы загад гэтых людзей, за плячамі якіх цяжкае працавітае жыццё, а сёння найбольшы клопат, каб на свеце быў спакой, азарае добрая чалавечая, бацькоўская радасць. Яны чакаюць у адпачынак на лета сына-афіцэра з нявесткай і ўнукам. Другі сын жыве ў Пагосце, мае свой дом. Добры работнік у калгасе. Не пакідае бацькоў. Лёгкі на ўспамін, хутка ён паказаўся на парозе, дужы, чырванашчокі здаравяк. Прыйшоў у лазню, пацікавіўся, ці трэба яшчэ абганяць бацькам бульбу на сотках...

Назаўтра з раніцы, закінуўшы за плечы магнітафон, я пачаў абходзіць Стары Пагост. Далёкія продкі сённяшніх пагашчан, а што гэта былі менавіта далёкія, можна меркаваць, мабыць, і па назве, якая ўзыходзіць ад агульнаславянскіх вытокаў, выбіралі месца пад сялібы пры бітым шляху ды пры вадзе. Адзін рад пагашчанскіх хат, асабліва сваёй гаспадарчай забудовай, лазнямі, прылягае да самага берага азярыны, невысокага, чароцістага. Сярод іх відаць шмат новых, добра дагледжаных. Хлявы ж, прыбудоўкі, лазні — шэрыя, пасівелыя ад часу. Забудавана густа: відаць, некалі былі скупыя надзелы. Прыпыніўся ля старых кабет, пры якіх гулялі дзеці. З краю на лаўцы сядзела мажная жанчына і пільна ўглядалася ў незнаёмага. Калі назваў прозвішча Любові Бортнік, яна ўзрушана ўстала і, як мне здалося, з трывогай глянула на мяне. Жанчыну бянтэжыла, што яе пытаў незнаёмы, нетутэйшага выгляду чалавек. Але не збянтэжыла, што ён пытаўся, чаго яшчэ, прыйшоўшы за блізкі свет, не пытаўся ніхто: пра песні. Прасіў праспяваць песні, якія яна спявае сабе дома пры рабоце і ў гасціне, спявала ў маладосці і ў сталым веку пры любой нагодзе і помніць сёння. Прасіў падзяліцца імі. Прыехаў аж з Мінска. Можа, і не ўсё было зразумела так адразу: як снег на галаву гэты збіральнік, але пець згадзілася. Раз людзі сказалі, што яна тут была пяюлліца на ўсю акругу, то нешта ж успомніць. Толькі б голас не падвёў, да душы.

Так гуртам і пайшлі ў хату да жанчыны, на падворку якой была прыпынілася Бортнік. «Да самой Бортнічыхі яшчэ далекавата», — казалі жанкі, не хочучы, відаць, прапусціць выпадку паслухаць песні і паглядзець, як гэта яны будуць пісацца на той магнітафон. Людзей набралася ладна, і я баяўся, што будзе цяжкавата запісваць. Адно толькі праспявалася першая песня ўжо з магнітафоннай стужкі, як усе прыціхлі, далей слухаліся і каманды, і самі песні лавілі ўважліва, нібы чулі іх першы раз. А песні ішлі па тых кругах, па якіх некалі ішлі жыццё і праца селяніна, усёй яго радзіны.

Пятрова ночка невялічка —
Спала Аленка, не выспалася:
Сучыла шнуркі шаўковыя,
Шыла кашулькі бялёвыя...

Песня шукала спагады ў людзей, пыталa яе для маладзіцы, якой загадана бель «на моры бяліць, а на лесе сушыць, на небе качаць».

Ці я вутачка на моры бяліць?
Ці я пташачка на лесе сушыць?
Ці я зорачка на небе качаць?

— заклікала ўсіх у сведкі маладзіца-пявуння. І заводзіла задуменна-маркотна «Пара, пара дамоў ісці» ды тую, «што гаспадара падвелічала»:

Хадзіў раёк па ўсім полі,
Цяпер ідзе дарогаю.
Дарогаю шырокаю.

І клікаў хлебароб да сябе спеўную жніўную талаку, як вяшчунню дабра, таго, што залатая збажына загосціць і на яго таку:

Хадзі, раёк, у мой дворык:
Мае сталы цісовыя,
Мае хлябы сітнёвыя,
Мае мяды салодкія,
Мае кубкі залатыя,
Будзем кубкі наліваці,
Будзем мяды выпіваці.

Паэзія ператварала мару земляроба ў залаты сон. Што ж, добра было хоць на нейкі час вырвацца думкай ад суровай рэчаіснасці, хоць у мары ўбачыць сябе ў дастатку, шчаслівым.

Спявачка яснела душой. Песні яе хораша адспеўвала назад «машына гэта», магнітафон. Усе слухалі песні ўважліва, пачціва. І гэты зайшлы чалавек, відаць было, радаваўся песням, на хаду лавіў іх, пераймаў словы. «Ведаеш, сынок, не знаю, як цябе ўзвышаюць, назаву па свайму веку... Жылі ў горы, а песні любілі. Даўней ці вяселле, ці хрысціны пачынай — гукаюць. Як толькі чарку вып'ю, мяне падымае. Не люблю, калі сядзяць, як грыбоў аб'еўшыся», — казала спявачка.

Як пушчу я чарачку раду па раду...
А хто гэту чарачку поўна наліець,
Ён з сваёю жаною суветна жывець...

«Як першую чарку на радзінах п'юць, спявалі», — кіўнула пявуння на магнітафон, адкуль гучала толькі што прапетая ёю песня. А мне за нечаканасць было гэта «суветна», такое ёмістае і паэтычнае, якім толькі можа быць народнае слова. Спытала, ці можна падскакухі-прыпеўкі, і, махнуўшы рукой (няхай знаюць, што бабка — чорт), заспявала:

Пайду я па гародзе,
Па дзявоцкім карагодзе,
Хустачкай махаючы,
Мілага шукаючы...

Потым, уздыхнуўшы, паскардзілася: «Прыстала я. Ох, каб вярнуць маладыя гады і песні — усё б, здаецца, аддала». Сабраўшыся з духам, вярнулася да вяселля:

Паедзем, мой братка, гуляя,
Будзіць нам гэта ночачка відная,
Будзіць нам ясен месяц свяціці,
Будзіць нам зараначка служыці...

Песня-размова на ад'езд маладога па маладую. Другая напамінала, гаварыла маладой пра маці, паддавала жалю дзяўчыне пры ад'ездзе яе з роднага дому:

Падумай сабе, ці не жаль табе, Марылька,
Пры кім жа ты сваю
родную мамку кідаеш:
Хто яе, старэнькую, дагледзіць?

«Трэба ўласць узяць над чалавекам, каб пець так каму», — лёгка, смяшліва ляпае мяне па плячы Любоў Бортнік. «Прыстала я, — паўтарае. — Не паспяю за новымі песнямі. Іншы раз у радзіве як завядуць, стараюся злавіць, запомніць. Кароткую запомню, а каторая не даецца. Вельмі ж мудрая». Углядаюся ў аблічча спявачкі. Не, ніяк не дасі ёй, равесніцы Максіма Багдановіча, усіх яе васьмідзесяці. Час не пераараў твару маршчынамі, не здушыў яе голасу, груднога, моцнага яшчэ. Ва ўсёй постаці, у вачах, у тым, як спявае, — шмат жыццёвай сілы, зямной трываласці працавітага чалавека, улюбёнага ў жыццё, людзей, песню...

Назаўтра я наведаўся яшчэ ў суседняе Забор'е. Пагашчане казалі (адвечная ісціна: няма прарока ў сваёй айчыне), што там спяваюць лепей, «надта ж прыгожа». Забор'е, можа, і ляжала некалі за борам. А цяпер толькі выйшаў

на пашу, што за Пагостам, і яно, атуленае дымкай-сінечай, — як на далоні. Пайшоў цераз пашу, цераз жытняе поле нацянькі. Сонца добра прыпякала, і на ўсім ляжала адзнака мляўкасці. Нават жаваранкі прыціхлі. Падышоўшы ўжо зусім блізка да вёскі, пачуў кволы п'янкі пах лубіну: за папарам рассцілаўся светла-мядовы кілім. Лагчына паступова пераходзіла ва ўзвышэнне, на якім, залітыя сонцам, задрамалі хаты, сядзібы. Гэты просты краявід раптам адгукнуўся ў сэрцы ўспамінамі маленства, яшчэ нечым невыказна дарагім. Па душы трывожна шуганула знаёмая мелодыя Ігара Лучанка, і ў каторы раз праяснеў сэнс паэтавых слоў:

Завецца спадчына мая
Усяго старонкай роднаю.

Не сказаць, каб мне ў Забор'і моцна пашанцавала на песню. Хоць добрых песень наспявалі і маладзейшая Часлава Трубіла, даярка калгасная, і старэйшая Ядвіга Шэўчук. З веснавой калыснай песняй Чаславы Трубілы на вуснах:

У майго татулькі сад над ракою,
Сад над ракою,
Двор на даліне...

— я і вяртаўся назад. Усю дарогу да Пагоста не пакідаў яе свабодны, раскалыханы матыў, які сам сабою западаў у сэрца. Але было яшчэ адно ў Забор'і, што ўразіла больш, чым песні. Калі пытаўся на вуліцы, хто з жанчын ведае песні, назвалі прозвішча Даргель і паказалі хату, дзе жыве. На мой стук у незамкнёныя дзверы ніхто не адазваўся. Маўчанне адказала і на мой знарокава звонкі «Добры дзень». Праз мінуту толькі нехта сонна-хворым голасам спытаў: «Хто там?» — і папрасіў прайсці далей. На ложку ляжала пажылая жанчына. Пажалілася на боль галавы. Спытала, хто ж мяне паслаў да яе па песні, і з жалем сказала, што ўжо прызабыла іх. Даведаўшыся, што я з Мінска, з Акадэміі навук, нечакана запыталася: «Як там другі том Беларускай энцыклапедыі? Скора выйдзе?» Я падумаў, можа, Даргель была настаўніцай. Ажно не.

Думаў пра гэтае простае здарэнне, не хочучы ўзводзіць яго ў ранг высокіх абагульненняў: прыемнае яно і само па сабе, — думаў па дарозе ў Новы Пагост, куды выбраўся, каб і там сабраць нейкую песенную даніну. Заадно карцела даведацца пра факт, не вельмі значны, але заўсёды цікавы і немалаважны для спецыяліста. Справа ў тым, што, будучы ў Ленінградзе, у архіве Геаграфічнага таварыства, я наткнуўся на запісы, зробленыя ў мястэчку Новы Пагост і яго ваколіцах амаль сто трыццаць гадоў таму назад. Рукапіс Аляксандра Любінскага невялічкі: усяго шэсць песень, але кожная — праменьчык, узор сапраўднай народнай лірыкі. Успомніўшы, як узрадавала мяне колісь у велічнай цішы апартаментаў былога Рускага геаграфічнага таварыства зберажонае невядомым чалавекам чыстае зерне роднай паэзіі, заспяшаўся ў Новы Пагост. Выйшаў на тракт, прагаласаваў матацыклісту, і праз дваццаць мінут замільгалі зялёныя вуліцы цэнтра мясцовага саўгаса. Дзяўчаты і жанчыны, медсёстры, што зграбалі сена на поплаве ля бальніцы, сказалі: «Калі хто ў нас тут спяе вам даўнейшыя песні, дык хіба Антаніна Цітовіч». Адна з маладых жанчын з марлевай павязкай на галаве замест касынкі гукнула сваю малодшую сястру, бела-малінавую Алінку, і загадала ёй паказаць, дзе жыве спявачка.

За ручайком быў дом сына Антолі Цітовіч. Мы прымасціліся спачатку на ганку, які залаціўся, як і ўвесь дом, свежай сасной. Бабуля палажыла спрацаваныя за доўгі век рукі на кіёчак і завяла голасам ціхім, растрачаным за свае восемдзесят сем вёсен і зім:

Я не буду свайго мужа гудзіць:
Ён мяне раненька не будзіць.
Пойдзіць на ток адзін малаціць,
Прыйдзіць змалаціўшы —
У мяне абед не зварыўшы...
— Спі, мая жана, спі, не лякайся:
Ты сёння цэлу ночку не спала,
Мало дзіця калыхала...

Ціха-ціха вядзе голасам старая пявулля. Падыме вочы, усміхнецца адным імі. У вачах лагода, дабрыня.

У Новым Пагосце сустрэў я і сваіх. Аказваецца, пасля таго як мы развіталіся, яны пакружылі ў наваколлі, вярнуліся і аселі тут. Выскоквалі пару разоў аўтобусам (ён быў пры іх) у суседнія вёскі. Настрой добры. Песень набралі многа, як ніколі. А Міхаіл Якаўлевіч Грынблат запісаў валачобную з прыпевам «Хай так будзе», якая малюнкамі сялянскай працы ў полі зусім напамінае тую, што ўжо сто трыццаць год ляжыць ў архіве ў Ленінградзе. А пяці ярынных, тых, што запісаў калісь невядомы Аляксандр Любінскі, не знайшлося. Ці не натрапілі, ці, можа, іх назаўсёды забралі з сабой мінулыя пакаленні спявачак, адыходзячы ад нас навекі,— цяжка сказаць.

Друкуецца па кн.: Ліс. А. Песню ў спадчыну: Мастацтвазнаўчыя артыкулы. Мн., 1989. С. 63—72.

Да шукання крыніц народнай творчасці

Чым сыціў сваю душу беларускі народ у часе доўгага і цёмнага ліхалецця, званага прыгонам, калі ўсе, хто кідаў касу і саху, адыходзілі ад яго назаўсёды; калі кожны, хто наўчаўся не толькі граматы, але нават самай благой мовы пануючых станаў, ужо староніўся вёскі і гаротнага мужыка-вяскоўца. Можна сказаць, што на працягу апошніх 200 гадоў беларусы не былі народам, а становілі тубыльчую сялянскую касту, у якую новыя сілы знікуль не прыбывалі, а лепшыя, здатнейшыя, адыходзілі. Важную ролю іграла тут не толькі бяспраўнае палітычнае і безвыходнае эканамічнае палажэнне сялянскай касты, але і псіхалогія, стыхійна панаваўшая. Усё, што добрае, што прыгожае, атрымала ў пануючых класаў названне іх, пануючай, касты — шляхетны, шляхетнасць... і, наадварот, што брыдкае, благое, насіла названне: гміннае, халопскае, простае. А найгорш, што сам наш гарапашнік паверыў у гэта, прымірыўся са сваім бяспраўным палажэннем, сваёй стыднай беднасцю і цемнатой і, не бачучы з яго выхаду, пастараўся замкнуцца ў сабе, у кругу такіх, як ён сам, «простых людзей» і простых, собскіх паняццяў. Пайшло доўгае жыццё ў замкнутай касце.

Замкнутасць і адарванасць ад іншых класаў, з адной стараны, спрыяла захаванню таго, што сваё, што здабыта і асвячона старыной, а з другога боку — пабуджала да новай, кастовай творчасці, якая да апошніх часоў не замірала.

Успамінаючы мае маладыя гады, акружаўшае мяне ў той час кіпучае і поўнае жыццё нашай вёскі, я пастараюся сваімі ўспамінамі падзяліцца, каб кінуць кроплю сваю да высвятлення пытання аб народнай творчасці. За аснову я вазьму адрыўкі ўспамінаў вёскі Стары Пагост (Дзіс. пав.) і яе аколіц.

Найбольш чаканым, найгучней святкаваным гадавым святам быў Вялікдзень. Святое Вялічка. Прычым трэба адмеціць, што названне гэтага свята разумелася ўсімі не як Вялікі Дзень, а як дзень велічання, слаўлення. Ад палавіны посту ўся вёска, уся ваколіца, ад старога да малога, дудзелі ўжо пад нос валачобныя, велічальныя песні, аж, здаецца, ад гэнага дудзення трымцела паветра. Але голасна, на ўсю волю, яшчэ гэтых песен пець нельга: іх запяюць першага дня Вялічка, адвячоркам:

Добры малойцы валачомнічкі,
Сабраўшыся, зшыхаваўшыся —

найперш пад вакном самага багатага ці самага шанаванага гаспадара ва ўсёй вёсцы ці ваколіцы, а пазней, у гарод, пад усімі вокнамі.

Быў у аколіцах старык, па прозвішчу «Кажэ» (праўдзівае яго прозвішча — Сянкевіч), жыў у засценку Гірсах, за вярсту ад Пагоста. Старому было звыш 80 гадоў; жыў на паўтары валоках, а знача багата, сам адзін, як палец. Ён

належаў да любіцеляў і знаўцаў слаўлення. Кожную грамаду валачомцаў выслухваў седзячы пры адчыненым акне. Калі слаўлельнікі прыйшлі падгатаваўшыся, з асобнымі ў яго чэсць, на канцы спеву, штрофкамі, частаваў усіх чаркай гарэлкі, выносіў кружок-другі каўбасы ці сыр на закуску і дзесятак-другі яец механошаму ў карзінку. За асабліва ўдатнае слаўленне запрашаў ў хату як гасцей. Калі ж прыходзілі такія, што чаўплі песню без разумення яе, стары злаваўся і нават лаяўся.

Рытуальная часць велічальнай песні складалася з уступу, у якім гаварылася: «Гаспадару, адкрый акно, адкрый акно, гляні на двор: на тваім дварэ стаіць шацёр навюсенькі, бялюсенькі (вясновае неба), а ў тым шатрэ сам Бог сядзіць, перад Богам усе святцы (сонца і гвёзды)». Да гэтага аддзелу ўключалася часць з апісаннем адзежы і двара гаспадарскага, у якой праглядалі не раз пракавечныя рысы гэтай абрадовай песні. Прыкладам:

А ці дома, дома сам пан гаспадар?
А хоць і дома, ды не кажацца
(не сядзіць пры акне),
Ён не кажацца, прыбіраецца,
Надзяе світу, шоўкам шыту,
Надзяе боты казловыя,
Боты казловы, шапка баброва!

А вось аб яго двары:

А Сымонаў двор на стаўпох стаіць,
На стаўпох стаіць на тачоненькіх.
А кругом маста пчолкі гудуць,
Пчолкі гудуць, у палёт ідуць.

Велічальныя песні любяць раўняць гаспадара да краснага сонейка, а гаспадыню да светла месіка, а іх дзетак да чыстых гвёздачак. Але гэта не правіла:

— Ай не ластавіца палётуе!
Сама гаспадыня то паходжуе...

Другая часць велічання гаспадара складаецца з апісання яго ратайскіх работ. Тут часам паэтычнасць вобразаў даходзіць да незвычайнай красы, як, прыкладам, размова жыта з гаспадаром:

— А хто ў полі рана пагукае?
— Ядраное жыта гаспадара кліча:
— Ня магу я, ня магу я ў полі стаяці,
У полі стаяці, калоссем махаці.
Толькі магу я, толькі магу я
У полі снапамі, у гумне тарпамі,
Толькі магу я!

У трэцяй, канцовай, часці ўжо пяецца велічанне не рытуальнае. Тут можна ўзяць штрофкі з бягучага жыцця, адзначыць выдатную рысу пана гаспадара, ці з яго паступкаў, ці дзейнасці. Во гэта апошняя часць і ўкладаецца валачомнікамі штогоду нанова і для кожнага гаспадара, гаспадыні і іх узрослых дзяцей паасобна.

У Старым Пагосце, у восень, калі наступалі цёмныя і доўгія вечары, а яшчэ вечарніцы не пачыналіся, маладзеж вясковая, збіраючыся разам, штогод, калектыўна, укладалі доўгую песню-сатыру. У 1894 годзе тэмай такой песні паслужыў чорны бык. Быка прывялі быццам у Пагост, і на нарадзе пастанавілі яго зарэзаць і падзяліць. Кожная часць быка даставалася камусь з гаспадароў, характэрызуючы яго, прыкладам: «Рыдзіку почкі, каб вяліся дочкі, а Дубчонку рогі, каб знаў дарогі, а Даніле вочы, каб не спаў у ночы» і г. д. Некаторым гаспадарам пасвячаліся чатыры і нават восем штрофак, рысуючых яго недастаткі. Гэткі верш штогод перамяняўся калектыўным сабраннем на новы. Апавядалі і нават пелі дасціпныя адрыўкі з даўнейшага аднаго такога-ж сатырычнага верша, тэмай да каторага была ўзята Бяда, якая прыйшла да Пагоста і схавалася пад мостам. Пачынаўся гэты верш словамі: «Сядзіць Бяда пад мастом, едуць людзі з хварастом; тут Бяда загуляла, усім калёсы паламала. Быў там Апанас, той Бядзе ў морду раз! Быў там і Пятрок, той у морду раз пяток!» і г. д. Кончылася справа тым, што выгнаная з-пад моста Бяда забралася ў вёску, тут яе ганялі бабы і дзеўкі, але без скутку.

Найцікавейшы час бываў пачынаючы ад першага дня Калядаў да Вадохрышча. У гэтым часе, ад захаду сонца,

пачыналіся святыя вечары, у якія нельга класціся спаць да «петухоў», а знача ад 4—5 вечара да 12-й ночы. У дадатку звычай вымагаў, каб у гэты вечар баяць басні. Тут выступалі на сцэну лепшыя гутарнікі і пачыналіся бесканечныя казкі і легенды, апавяданні традыцыйныя і нанова здуманыя ды прыкрашаныя. У тыя хаты, дзе бывалі добрыя, красамоўныя гутарнікі, народу набівалася ўшчэрць, ад старых да малых. Лепшым гутарнікам у вёсцы лічыўся Міхалка-гарбар, пасля яго Сцёпка-бондар, чалавек неакелзанай фантазіі, які ўмеў давясці да слёз смехам і да гістэрычнага смеху, апавядаючы страшное. Рэпертуар казак быў вечна новы і бесканечна багаты. Папаўнялі гэты рэпертуар валачомныя гутаркі, якіх у мае часы было нямала паміж перахожых убогіх, каторыя прыходзілі часам аж з-пад Бабінавіч (Магілёўск. губ.).

Акром гэтага, час ад часу, з прычыны кождага значнейшага здарэння ўкладаліся сатыры вершам, нават з прычыны нязначнага здарэння. Прыкладам: у Новы Пагост прыязджаў новы вучыцель, малады хлапец. Дарогай папасываў пры Стара-Пагосцкай карчме, выехаў ўжо змеркамі, па дарозе згубіў клунак з бялізнай. Гэта набудзіла некага злажыць сатыру, даволі дасціпную, якая пачыналася: «Ехаў Абрамчык (прозвішча вучыцеля, быў родам са Случчыны) у Пагоста, пілнуючы конскага хвоста...» Гэткія вершы сатыры скора тварыліся, скора і забываліся, а іх месца заступалі новыя падзеі і новыя сатыры. Рэдкія з гэткіх сезонных вершаў утрымліваліся ў памяці некалькі гадоў; гэта залежала ад меткасці слова і ад значнасці падзей. Вершы на звальненне ад паншчыны ў мае яшчэ часы пераказваліся з памяці, нават перапісваліся. Да гэткіх належалі «Гутарка Данілы са Сцяпанам», а также іншага характару: «Страшны суд», «Панскае ігрышча». Асаблівай увагай цешыўся «Страшны суд», які дапаўняўся і перарабляўся, устаўляліся ў яго штрофкі аб аколічных хлапцах, дзяўчатах, гаспадарах і гаспадынях з абазначэннем ім кар на тым свеце. Пачынаўся верш так: «Паслухайця толькі людзі, што на страшным судзе будзе, кары страшны за грахі, за хохаткі да за смехі...»

Акром свецкай песні, сатыры, казкі і пазмату існавала цэлая літаратура духоўная, якая пераказвалася з вусн у вусны або распявалася. Спецыялістамі ад гэтай літаратуры былі асобныя «старцы» — жабракі, якія хадзілі з музыкальным інструментам лірай, скрыпкай або гармонікай. Забраўшыся ў вёску, такі старац не выходзіў, пакуль не перапяваў усіх сваіх песень, слухаць якія збіраліся пераважна набожныя вясковыя кабеты. Старац гасціў у вёсцы ад 3 дзён да 2 тыдняў, залежна ад яго рэпертуару.

Словам, яшчэ гадоў 30 назад вусная беларуская літаратура была нечым саўсім жывым, што расло і кусцілася. Літаратура гэта абслугоўвала духовыя вымогі сялян і, падтрымліваючы традыцыі, давала сокі новай творчасці. Існаваннем гэтай літаратуры толькі і можна вытлумачыць тое, што наш народ мог сам у сабе замкнуцца і, жывучы сваім асобным жыццём, перахавацца дагэтуль.

Пагашчанін (В. Ю. Ластоўскі)
Крывіч. 1923. № 3.

Кукавала зязюлечка

Кукавала зязюлечка
На захадзе сонца,
Заплакала дзяўчынінка,
Глядзела ў ваконца.
— Чаму мяне, мамулечка,
Тады не будзіла,
Як першая кампанія
На двор усхадзіла?
— Ай, жалела, маё дзетка,
Я й цябе будзіці.
— Цяпер жалей мяне, мамка,
Як я буду жыці.
Па вуліцы па мяцёнай
Дзяўчына гуляла.
Хацеў казак зачапіці,
Мамулька стаяла.

— Мамулечка раднюсенькая,
Не паглядай крыва,
Да няпраўда твая будзець,
Каб ты нас разлучыла.

Зап. у 1972 г. у в. Дзямешкі ад Л. М. Янушонак, 1917 г. н., і А. М. Лакоткі, 1909 г. н.

Павейце, ветры!

Павейце, ветры,
Рана, рана ў чыстым полі.
Нясіце звесці
Рана, рана нашаму пану,
Што яго жнейкі
Рана, рана жыта дажалі,
Жыта дажалі,
Рана, рана пасад стаўлялі.

Зап. у 1972 г. у в. Дворышча ад Марыі Разумнік, 1901 г. н.

Ой, багат наш пан, багат

Ой, багат наш пан, багат
Над усімі панамі:
А што ў нашага пана
Маляваная брама,
Залатыя вароцейкі,
За тымі вароцейкамі
Плывуць тры ручаёчкі:
Першы жа ручаёчак —
Там салодкі мядочак,
Другі ручаёчак —
Краснае віно,
Трэці ручаёчак —
Горкая гарэліца.

Зап. у 1972 г. у в. Стары Пагост ад Любові Бортнік, 1891 г. н.

Зелянеюць, зелянеюць

Зелянеюць, зелянеюць
Лугі, сенажаці,
Пытаецца сын у мацеры,
Ды каторую ўзяці.
А ці тую багатую,
Што хораша ходзіць,
А ці тую сіраціначку,
Што ўсё добра робіць?
А ці тую багатую,
Што валы, каровы,
А ці тую сіраціначку,
Што чорненькія бровы?
Багатая, няўдалая
У садочку гуляла,
А бедная сіраціначка
Ужо тры копы нажала.
У багатай, нехарошай
Валы паздыхаюць,
А ў беднай сіраціначкі
Бровы не зліняюць.

Зап. у в. Пераброддзе.

Дачка-птушачка

Балада

Каліна-маліначка не парой цвіла,
Толькі мяне маменька парой радзіла.
Не ў шчаслівы дзянёчак да ў пятніцу.
Не сабрала розуму — замуж аддала.
І сказаў мне татулька ў госці не хадзіць.
Не йшла я адзін гадок, не йшла і другі,
А на трэцім годзіку зажурылася,
Мне да таткі ў госцікі захацелася.
Пайшла б я пяхотаю, знаю, не зайду,
Папрасіла б коніка, не дадуць.
Абярнуся, молада, шэрай зязюляй.
Палячу я з пташкамі ў татулькаў сад.
Сяду я на дзераўца, стану кукаваць,
Буду свайму татачку жалю задаваць.
Бадай табе, дзераўца, бог лісту не даў,
Як мне, маладзюсенькай, бог долі не даў.
Ці не ўчуець татулька, дроўцы секучы,
Ці не ўчуець мамулька, печку палячы,
Ці не ўчуець сястрыца, вулку метучы,
Ці не ўчуець брацетка, коней поючы?
Толькі ўчула мамулька, печку палячы.
— Калі мая дачушка, хадзі ка мне ў двор,
Калі шэра зязюлька, ляці ў цёмны бор.
І з вялікай жаласці ў бор паляцела.
Я сваёй бядою бары глушыла,
Я сваёй слязою лугі абтапіла.

Зап. у 1972 г. у в. Дзямешкі ад Лізаветы Янушонак, 55 г., Алены Лакоткі, 60 г.

Гісторыка-краязнаўчы музей Міёрскай СШ № 3

Заснаваны ў 1986 г. настаўнікам гісторыі Вітольдам Антонавічам Ермалёнкам. У зборы экспанатаў актыўна ўдзельнічалі вучні, члены археалагічнага гуртка «Арганаўты мінулага». Праз дзесяць гадоў меў 100 кв. м экспазіцый і больш 8 тыс. экспанатаў у 10 аддзелах.

У археалагічным аддзеле музея змешчаны прылады працы мезаліту, неаліту, бронзавага і жалезнага вякоў, знаходкі з курганных могільнікаў. Гэта

скрабкі, разцы, праколкі, шылы, нажы з крэменю, каменныя свідраваныя сякеры, цёслы. Сярод упрыгожанняў выявы з медзі і бронзы X—XIII стст.— бранзалеты, пацеркі, пярсцёнкі, шыўныя грыўні, конікі-амулеты. Яшчэ — рэшткі ўзбраення.

Сярод мясцовых нумізматычных знаходак рымская манета 280 г. н. э. імператара Максіміліяна, падробкі арабскіх дырхем IX ст., пражскі грош 1386 г., манеты ВКЛ XVI—XVIII стст., манеты Расіі XVII—XX стст., манетны скарб Рэчы Паспалітай, баністыка Расіі, Германіі, Польшчы, СССР.

Этнаграфічны аддзел прадстаўлены ткацтвам, ганчарствам, пляценнем, медным посудам, гадзіннікамі і абразамі.

У музеі захоўваюцца матэрыялы аб вайне 1812 г., паўстаннях XIX ст., рукапісныя і друкаваныя кнігі з XVII ст. на польскай, лацінскай, нямецкай, французскай, рускай і іншых мовах, часопісы, выданні В. Ластоўскага, П. Простага, А. Гаруна, Я. Фарботкі, С. Бірылы і інш.

Экспанаты наглядна расказваюць пра Міёршчыну XX ст., яе працавітых людзей, пра дзеячаў вызваленчага руху ў перыяд 1921—1939 гг. Я. Малецкага, П. Мятлу, К. Крука, Я. Драздовіча і інш. Шырока асветлена барацьба з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, партызанскі рух і дзейнасць падпольных груп, удзел ураджэнцаў раёна ў еўрапейскім Супраціўленні і баявых дзеяннях арміі Андэрса.

Дакументы і матэрыялы сведчаць аб развіцці адукацыі, сельскай гаспадаркі, прамысловасці, культуры, аб славутых земляках М. Машары, Пятру і Паўле Сушко, С. Панізніку, Ф. Сіўко і інш.

Званне народнага музею прысвоена ў лютым 1996 г.

В. А. Ермалёнак

Перабродскі хор

Аўтар гэтага матэрыялу А. Сяліцкі — кіраўнік Перабродскага народнага хору ў 1945—1989 гг. На працягу многіх гадоў ён выкладаў музыку і спевы ў Перабродскай СШ, паралельна займаўся і са школьным хорам. Ён упэўнены: песенныя традыцыі будуць і надалей працягвацца ў жыцці і творчасці яго землякоў.

Прынята лічыць, што хор у Перабродзі ўтварыўся ў 1939 годзе і сваімі першымі песнямі вітаў уступленне ў нашы мясціны савецкіх войск. Гэта праўда, але не ўся. Справа ў тым, што трывалыя песенныя традыцыі склаліся ў нашай вёсцы задоўга да таго. У мясцовай царкве ўжо даўно існаваў выдатны хор. Памятаю, што кіраваў ім рэгент Гагалушка. Гэты калектыў славіўся на ўсю Віленшчыну. Летам 1934 года ён песнямі вітаў прэзідэнта Рэчы Паспалітай Масціцкага, які праязджаў праз вёску. І атрымаў высокую ацэнку ганаровага госця.

Менавіта людзі, якія спявалі ў тым царкоўным хоры, сталі ядром нашага песеннага калектыву. Сярод іх трэба назваць Дзмітрыя Ігнатавіча Дварэцкага, больш вядомых у пазнейшыя часы Васіля Іосіфавіча Юневіча, Міхаіла Рыгоравіча Шуманскага і некаторых іншых. Моладзі ў вёсцы было шмат. Таму збіраліся, спявалі. Сярод тых першых спевакоў былі Любоў Фёдараўна Марковіч, Надзея Леанідаўна Марковіч, Наталля Ігнатаўна Лушчык, Вольга Венядзіктаўна Карцяновіч.

Першым кіраўніком Перабродскага хору стаў Васіль Іосіфавіч Юневіч. Але новая, савецкая, улада не вельмі прыязна ставілася да людзей, звязаных з царквой. Вось таму былы псаломшчык В. І. Юневіч і М. Р. Шуманскі адправіліся ў Беласток да Рыгора Шырмы, які менавіта ў той час стварыў сваю знакамітую капэлу. Абодва нашы спевакі хутка сталі вядучымі салістамі, стварылі дуэт. Потым атрымалі вядомасць ва ўсёй рэспубліцы, крыху пазней адзначаны высокімі званнямі.

1945 — ДА НАШЫХ ДЗЁН

Наш хор узначаліў Мечыслаў Іосіфавіч Пальчэўскі. Плённую дзейнасць перапыніла вайна. Калектыў зноў аднавіўся ў 1945 годзе. Менавіта тады на чале хору давялося стаць мне. За плячамі ў мяне, дваццацігадовага юнака, былі спевы ў школьным хоры ў Браславе, у якога быў добры кіраўнік. У свой час сам Васіль Іосіфавіч Юневіч навучыў мяне нотнай грамаце, даваў урокі сальфеджыо. Будучы псаломшчыкам, усё гэта ён ведаў выдатна.

У першыя пасляваенныя гады харавых калектываў, апроч нашага, у раёне не было. Таму і накіравалі нас на беларускую дэкаду самадзейнага мастацтва ў Полацк, прысвечаную 10-годдзю ўз'яднання беларускага народа ў адзінай савецкай дзяржаве. Было гэта восенню 1949 года. Там прыйшоў поспех, мы заваявалі першае месца. І не дзіва — дзе тады можна было сустрэць чатырохгалосы хор з высокім узроўнем выканаўчага майстэрства? Ды і цяпер такі калектыў пачуеш не вельмі часта. А пасля была паездка ў Мінск. І зноў з поспехам. Потым мне ў дапамогу накіравалі кансультантаў, памочнікаў, шэфамі сталі выкладчыкі музычнай школы. Былі выступленні на кожным святе ў родным калгасе, па ўрачыстасцях — у раёне, штогод на абласной сцэне, не так рэдка — у рэспубліцы. Рэгулярна ўдзельнічалі ва ўсесаюзных аглядах.

Шмат сіл аддадзена хору, бо ўсё рабілася на энтузіязме. Колькі адбылося рэпетыцый, колькі выступленняў, канцэртаў! У 60-я гады ў хоры спявалі Вольга Венядзіктаўна Карцяновіч, трактарысты Гедыён Паўлавіч Паўлоўскі і Аляксей Паўлавіч Паўлоўскі (аднафамільцы). Якія выдатныя ў іх былі гала-



Удзельнікі Перабродскага царкоўнага хору. Да 1939 г.

Перабродскі народны хор выступае

сы-басы! Рэгулярна ўдзельнічала ў рэпетыцыях і выступленнях медыцынскі работнік Валянціна Дзянісаўна Паўлоўская — другі голас. Меў выдатны голас і добры слых электрык Мар'ян Іосіфавіч Чапулёнак.

Спявалі ў хоры ўдзельнікі вайны Міхаіл Сяргеевіч Юневіч, Феафан Нікітавіч Іваноў, Фёдар Андрэевіч Шчая-Зубраў і многія іншыя.

Паступова побач з бацькамі ў хоры пачыналі спяваць іх дзеці. Гэта Оля і Віця Шчая-Зубравы, Барыс і Георгій Івановы, Таня Юневіч.

Не пакідалі нас без увагі нашы землякі, народныя артысты Васіль Іосіфавіч Юневіч і Міхаіл Рыгоравіч Шуманскі. Звычайна, як прыязджалі ў водпуск ці на адпачынак, яны праводзілі рэпетыцыі, давалі кансультацыі, а то і станавіліся побач з нашымі харыстамі. І заслугі нашы былі адзначаны. У 1975 годзе хору прысвоена званне народнага.

Асобная старонка нашай дзейнасці — удзел у конкурсах польскай песні на працягу больш дзесяці гадоў. І пастаянна — з поспехам. Гэтаму садзейнічала не толькі выканальніцкае майстэрства, вопыт. Харысты старэйшага пакалення добра ведалі польскую мову. А таму наша выкананне вызначалася і мілагучнасцю, і чысцінёй вымаўлення. Асаблі-ва запомніліся гледачам і журы «Лілія любімая», «Гэй, там, пад лесам». Асабіста мне двойчы ганаровыя ўзнагароды ўручаў польскі консул.

Былі запамінальныя паездкі ў Літву, калі праводзілася спаборніцтва раёнаў суседніх рэспублік.

У 1989 годзе мы ўрачыста святкавалі 50-годдзе хору. Дарэчы, гэты год стаў апошнім у рэгулярных выступленнях харыстаў, хоць база для калектыву была створана вялікая. Але наша праца не можа застацца без плёну, песенныя традыцыі Перабродскага хору будуць жыць.

А. С. Сяліцкі

Народны тэатр

Драматычны калектыў пры раённым Доме культуры ў Міёрах утварыўся ў першыя пасляваенныя гады. Спектаклі рыхтавалі культработнікі, мясцовая інтэлігенцыя, у першую чаргу настаўнікі, моладзь.

На пачатку 60-х гадоў рэжысёрам драмкалектыву стаў Іван Іванавіч Каспяровіч, вялікі энтузіяст тэатра, які абапіраўся на падтрымку і дапамогу завуча сярэдняй школы А. Капітанава, бібліятэкара Т. Капітанавай, З. Раманавай, В. Бышнева і А. Бышневай, К. Рачыцкага, У. Лаўца і многіх іншых. Менавіта тады спектаклі сталі падзеяй культурнага жыцця райцэнтра. За год ставілі да пяці спектакляў, а гэта паўсотні, нават больш сцэнічных вобразаў. У тэатры працавалі Марыя Гушча, Мечыслаў Абалевіч, Ала Лакотка, Тамара Мартыненка, Анатоль Вайсковіч, Уладзімір Мацюшаў, Зінаіда Вераценніка-ва, Алег Мацвееў, Уладзімір Мікель, Ілля Гогаль, Валянціна Іванова, Ірына Лаўрэнцьева, Ванда Канаховіч, Пётр Дзяменцьеў, Іван Каразееў і іншыя маладыя супрацоўнікі розных прадпрыемстваў і арганізацый горада.

Вялікую цікавасць гледачоў выклікалі спектакль «Яна выходзіць замуж» па п'есе Л. Сінельнікава, камедыя Тадэвуша Кажушніка «Цвыркун, ці Бюро добрых паслуг», вадэвіль-жарт М. Чарота «Мікітаў лапаць», драма М. Святлова «Праз дваццаць гадоў», навела А. Чэхава «Наўмыснік» і яго вадэвіль «Прапанова», камедыя Р. Каламійца і Н. Паўлоўскага «Алея шчасця» і інш.

Драмкалектыў выступаў не толькі на сваёй сцэне, але і ў сельскіх Дамах культуры і клубах, удзельнічаў у абласных аглядах. Большасць Дамоў культуры ў раёне мела свае драматычныя калектывы. У красавіку 1970 г. была праведзена першая раённая «Тэатральная вясна». Рэпертуар фестывалю быў сапраўды «веснавы»: Павяцкі СДК паказаў «Несцерку» В. Вольскага (кіраўнік — настаўнік У. М. Хаткевіч), Істаўскі — «Паўлінку» Я. Купалы, Язненскі — «Чэснае слова». Раённы Дом культуры таксама парадаваў гледачоў

Фінал спектакля «Трыбуна» па п'есе А. Макаёнка. Народны тэатр Міёрскага РДК

камедыяй Я. Купалы «Паўлінка». Галоўныя ролі ў спектаклі выконвалі работніца райкома камсамола Ія Шаўлюга і юрысконсульт райспажыўсаюза Ілля Гогаль. Усё было, як у сапраўдным вялікім тэатры: надрукаваная ў друкарні праграма, падвойны склад выканаўцаў, пераноўненая зала і працяглыя апладысменты. Цікавы штрых: калі ў адным са спектакляў не змаглі прыняць удзел некалькі сваіх артыстаў, іх замянілі, і не без поспеху, удзельнікі тэатральнага калектыву з в. Іст: рабочыя саўгаса «Дзісенскі», якія ў сябе дома паставілі гэты спектакль.

Склад драмкалектываў пастаянна абнаўляўся. З масавых сцэн пачыналі сваю акцёрскую кар'еру Юрый Батарчук, Сцяпан Забэла, Ларыса Карпенка, Мікалай Федуковіч, Эма Вераб'ёва, Ала Дарожка, Тамара Пукава...

Спектаклі ішлі адзін за другім — камедыя В. Позневай «Развітанне з каханнем», драма А. Ларчанкава «Трое», вадэвіль В. Баханава і Я. Касцюкоўскага «Суцэльныя непрыемнасці». У апошнім амаль усе ролі выконвалі самадзейныя артысты камбіната бытавога абслугоўвання.

Поспех «Паўлінкі» паўтарыў спектакль па драме А. Салынскага «Барабаншчыца». Галоўныя ролі ў ім выконвалі Ала Дарожка, Ліна Андрэева, Уладзімір Марцінкевіч, Віктар Батура, Міхаіл Пішчулёнак. Яго паглядзелі жыхары райцэнтра, слухачы універсітэта культуры, камсамольскія актывісты, выбаршчыкі саўгаса «Міёрскі» і інш.

Кіраўнік драмкалектыву РДК І. І. Каспяровіч арганізоўвае новыя «Тэатральныя вёсны», рыхтуе з удзелам культработнікаў злабадзённы для свайго часу спектакль «Лявоніха на арбіце». Набываецца вопыт, ідзе расшырэнне тэатральнага актыву, у раёне дзейнічала студыя рэжысёраў драматычных калектываў.

У 1978 г. на сцэне РДК пастаўлена камедыя Ініна і Асадчук «Галава кругам». Яе рыхтаваў новы склад тэатральнага калектыву. Ролі выконвалі Леакадзія Булаўская і Ігнат Сушко, Алег Туронак, Генрых Вішнеўскі, Франя Завадская, Мікалай Мятла, Віктар Шындзікаў, Раіса Арол і інш.

Затым былі «Лазня» У. Маякоўскага, «Недаростак» Д. Фанвізіна, «Чортаў млын» У. Штока, «Прымакі» Я. Купалы, «Саслужыўцы» Э. Брагінскага і Э. Разанава, «Блакітныя алені» А. Каламійца, «Пайсці і не вярнуцца» В. Быкава, «Гісторыя з метранпажам» А. Вампілава, «Хатынскі сцяг» Г. Бураўкіна...

У 1987 г. драматычнаму калектыву міёрскага Дома культуры было прысвоена званне народнага.

Традыцыі, якія склаліся ў калектыве пры кіраўніку і рэжысёру Івану Іванавічу Каспяровічу, развівалі і ўмацоўвалі кіраўнікі народнага тэатра Віталій Іванавіч Варонька, Ігар Германавіч Крат. Вось ужо дваццаць гадоў кожны трэці год калектыў рыхтуе спецыяльны спектакль для пацвярджэння перад аўтарытэтным журы свайго звання. Гэта яму ўдаецца. Вясной 1997 г. такім выпрабаваннем, таксама паспяховым, стаў спектакль па матывах п'есы Л. Радзевіча «Доля прымацкая». А на памяці самадзейных артыстаў і іх удзячных паклоннікаў «Трыбунал» А. Макаёнка, лірычная п'еса І. Яжова «Салаўіная ноч», трагікамедыя чэшскага драматурга С. Мрожака «Дом на мяжы» і іншыя спектаклі.

Л. А. Матэленак

Раённая газета

Больш года спатрэбілася для падрыхтоўкі паліграфічнай і матэрыяльнай базы раённай газеты. Пад назвай «Бальшавіцкая трыбуна» яна пачала выходзіць вясной 1941 г. На жаль, дата гэтай падзеі невядомая, бо з усяго даваеннага тыражу захаваўся адзін экземпляр № 3 за 29 мая. Ён знаходзіўся сярод дакументаў калгаса «17-е Верасня», схаваных на гарышчы сядзібы Лапацінскіх у Лявонпалі, дзе размяшчала-



Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Бальшавіцкая ТРЫБУНА

ОРГАН МІОРСКАГА РАЙКОМА КП(б)Б І РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 9 (13) | Нядзеля, 18 лютага 1945 г. | Цана 15 кап.

Аб'яднаныя Нацыі стаяць перад пабеданосным завяршэннем вайны супраць гітлераўскай Германіі.

Вайна з Германіяй будзе выйграна Аб'яднанымі Нацыямі, — у гэтым ужо не можа быць ніякага сумнення. І. СТАЛІН

ГІСТАРЫЧНЫЯ РАШЭННІ КРЫМСКАЙ КАНФЕРАНЦЫІ

Раённая газета

ся кантора гаспадаркі. Яе тыраж — 1500 экземпляраў, рэдактар Міхаіл Раманавіч Шляхценка. З архіўных дакументаў вядома, што нарадзіўся ён у 1909 г., працаваў загадчыкам парткабінета РК КП(б)Б.

У гады вайны на базе партызанскай брыгады імя Калініна, дзе была паходная друкарня, пачала выходзіць газета «Кліч партызана». Гэтай справай займаўся намеснік камандзіра брыгады па разведцы Пётр Акімавіч Клінаў. Менавіта яму ў пасляваенны час і было даручана першым сакратаром райкама партыі і былым камандзірам брыгады Фёдарам Нікіфаравічам Гаўрыленкам аднавіць выпуск «раёнкі».

П. К. Клінаў успамінаў:

— Партыйнае даручэнне атрымаў, трэба яго выконваць. З чаго пачынаць, і сам не ведаў.

Каб наладзіць выпуск газеты, патрэбен наборшчык. На гэту пасаду запрасіў Мікалая Іванавіча Гайдара, баявога партызанскага сябра. Ён ведаў друкарскі станок, прымаў самы актыўны ўдзел у выпуску партызанскіх лістовак, газеты. Мікалай Іванавіч згадзіўся. З ім мы на нашым партызанскім друкарскім станку ўручную 5 снежня 1944 г. выпусцілі першы пасляваенны нумар газеты. Назву захавалі ранейшую, даваенную, — «Бальшавіцкая трыбуна». Нумарацыю пачалі з пачатку, бо архіўных матэрыялаў, падшывак даваеннай газеты ў нас не было, і мы не ведалі, на якім нумары спыніўся яе выпуск. ВыраШылі пачаць з № 1.

Газета ў той час выходзіла два разы ў тыдзень вельмі малым фарматам — на адной восьмай друкаванага аркуша (гэта памер стандартнага ліста для пішучай машынкі). Так што і назваць яе газетай можна было толькі ўмоўна. Тыраж быў невялікі — 1000 экземпляраў. Тэкст размяшчаўся на абодвух баках.

Пазней, калі Вілейскі абкам партыі афіцыйна зацвердзіў газету, у штат рэдакцыі ўключылі адказнага сакратара, бухгалтара. Першым адказным сакратаром была Вашнёва. Наборшчыкамі некаторы час працавалі Кубліцкая, Удра. Трэба сказаць, што супрацоўнікі тады вельмі часта мяняліся, так што і ўспомніць усіх немагчыма.

Вялікія цяжкасці прыходзілася пераадольваць, каб выпусціць газету своечасова. На кані даводзілася ездзіць у Полацк за паперай, шрыфтамі. На гэта звычайна затрачвалася двое сутак. Ды ці многа на кані прывязеш? Паездкі былі даволі частымі.

Самому трэба было арганізоўваць і матэрыял для газеты, апрацоўваць яго, вычытваць, правіць. У асноўным факты перадаваліся з сельскіх Саветаў па тэлефоне.

П. А. Клінаў

М. І. Гайдар

Калектыў рэдакцыі газеты «Сцяг працы» і друкарні

Аб чым пісала ў той час газета? Шкада, што ў мяне не захавалася яе першых нумароў, але добра памятаю тую абстаноўку. На захадзе яшчэ ішла вайна, а ў нас ужо ўсталёўвалася мірнае жыццё. Ішло аднаўленне разбуранай вайной гаспадаркі. У газеце мы расказвалі аб першых кроках мірнай стваральнай працы людзей, аб ходзе выканання планаў лесанарыхтовак, закупцы сельгаспрадуктаў, рабоце савецкіх і партыйных органаў раёна па мабілізацыі людзей на вырашэнне задач гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Пазней расказвалі аб ходзе падпіскі на дзяржаўную пазыку аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі, калектывізацыі ў вёсцы.

Заўсёды раённая газета з'яўлялася своеасаблівым адлюстраваннем падзей і працэсаў, што адбываліся ў краіне і на Міёршчыне. І сама яна з нумара ў нумар набывала новыя рысы, сталела, абнаўлялася, імкнучыся задаволіць патрэбы чытачоў у мясцовай інфармацыі, у арыенцірах палітычнага і грамадскага жыцця, у канкрэтных вытворчых і прафесійных парадах. Яна інфармавала, арганізоўвала, клікала за сабой.

«Зара камунізму» — так называлася раённая газета з 25 снежня (№ 103) 1952 г. да 25 красавіка (№ 33) 1962 г. З 1 мая 1962 г. у яе цяперашняе «імя» — «Сцяг працы». Але калі да гэтага часу яна з'яўлялася органам Міёрскага РК КП Беларусі і раённага Савета дэпутатаў, то ў час рэформаў на працягу трох гадоў была газетай Віцебскага абкама і аблвыканкама пры Міёрскім тэрытарыяльным вытворчым калгасна-саўгасным упраўленні, затым проста газетай Віцебскага абкама КПБ і аблвыканкама (з 23 чэрвеня 1962 г.), органам парткама і Міёрскага вытворчага калгасна-саўгаснага ўпраўлення і раённага Савета дэпутатаў працоўных (з 12 сакавіка 1963 г.), органам Міёрскага сельскага вытворчага парткама КПБ і раённага Савета дэпутатаў працоўных (з 1 студзеня 1964 г.), з 14 студзеня 1965 г. — зноў органам Міёрскага РК КПБ і райсавета.

Наступны этап рэарганізацыі пачаўся ў пачатку 90-х гадоў, калі знік падзагаловак «орган Міёрскага РК КПБ і раённага Савета народных дэпутатаў» і пасля некалькіх прамежкавых этапаў

з'явіліся заснавальнікі — Міёрскі раённы Савет дэпутатаў, раённы выканаўчы камітэт, калектыў рэдакцыі.

У рэдакцыі пастаянна працаваў калектыў аднадумцаў, які ўмеў зацікавіць чытачоў. Шмат цікавых, змястоўных, злабадзённых матэрыялаў падрыхтавалі ў свой час, працуючы на розных пасадах, Герман Кірылаў, Яўгенія Бондар, Ананій Крупскі, Пётр Сушко. Працяглы час плённа выконвалі абавязкі адказнага сакратара А. Ф. Бабскі, намеснік рэдактара — Г. Д. Кухарэнка, А. Ф. Агурцоў, А. П. Кавалевіч, Л. К. Касаты, фотакарэспандэнта — П. А. Баброўскі. Пакінулі след ў гісторыі газеты рэдактары Гапееў, М. І. Латышаў, А. В. Карэнька, апошнія дзесяцігоддзі ўзначальвае калектыў Л. А. Матэленак.

У журналістаў «раёнкі» заўсёды былі надзейныя памочнікі — рабселькоры. Сярод іх А. І. Капітанаў, Ф. Л. Шымуковіч, В. І. Высоцкі, А. А. Тамашэвіч, І. Я. Русецкі, У. І. Радзішэўскі, Б. Ю. Мароз, Г. П. Дзямешка, Э. Ц. Мароз, В. А. Ермалёнак, М. Г. Парфяновіч, Г. М. Скавародка, П. П. Сяцко і многія іншыя.

Даведка. У былым Дзісенскім раёне з 1944 да 1959 г. выходзіла раённая газета «Новае жыццё», а ў час вайны ў партызанскіх атрадах — «Кліч партызана», «Народный мститель», «За Родину».

Палітаддзел Дзісенскай МТС у 1950—1953 гг. выдаваў газету «Па ленінскаму шляху». Усяго выйшлі 364 нумары. «Сцяг Леніна» — такую назву меў орган палітаддзела 1-й Міёрскай МТС, што выдаваўся з 27 мая 1950 г. да канца 1953 г. у в. Ідолта. Выпушчаны 371 нумар. 375 нумароў газеты «За камунізм» выдаў у в. Клётаў Двор палітаддзел 2-й Міёрскай МТС. Палітаддзельская газета друкавалася фарматам у палавіну раённай газеты 1 раз на тыдзень тыражом каля 1500 экземпляраў.

Л. А. Матэленак

З ГІСТОРЫІ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ

Міёршчына ў XVI ст.: хронікі паселішчаў

Гісторыя населеных пунктаў Беларусі, асабліва амаль усіх сельскіх, а таксама большасці пасёлкаў гарадскога тыпу, малых і сярэдніх гарадоў — важная, але недастаткова вывучаная праблема. Тлумачыцца гэта ў значнай меры тым, што савецкая гістарыяграфія ігнаравала вывучэнне дарэвалюцыйнага мінулага паселішчаў, якое прынцыпова лічылася менш злабадзённым альбо наогул неактуальным у параўнанні з савецкім перыядам.

Па нашаму меркаванню, найменш вывучана мінулае паселішчаў «літоўскага» перыяду (сярэдзіна XIII—XVIII ст.) гісторыі Беларусі, калі яе сучасная тэрыторыя знаходзілася ў складзе Вялікага княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага і інш. Асабліва важнай і актуальнай уяўляецца першапачатковая (да XVII ст.) гісторыя населеных пунктаў Беларусі, адлюстраваная ў розных пісьмовых крыніцах, адносна вялікая колькасць якіх захавалася пачынаючы толькі з XVI ст.

У гэтым артыкуле зроблена спроба ў своеасаблівай форме хронік часткова абагульніць сабраны ў выніку шматгадовых пошукаў значны фактычны матэрыял XVI ст., які адносіцца да населеных пунктаў сучаснай Міёршчыны.

Неабходна адзначыць, што звесткі XVI ст. аб некаторых населеных пунктах Міёршчыны ёсць у даследаваннях М. М. Аглобліна, М. К. Любаўскага, О. Гедэмана, С. Александровіча, З. Вайткавяка і іншых гісторыкаў.

Для стварэння гэтых хронік выкарыстана больш 80 архіўных адзінак захоўвання, галоўным чынам Метрыкі ВКЛ — архіву канцылярыі каралёў польскіх і вялікіх князёў літоўскіх, публікацый адпаведных крыніц і даследаванняў. У выніку іх аналізу выяўлена каля

150 розных фактаў пра 29 населеных пунктаў Міёршчыны. Калі ўлічыць, што ў гэтым рэгіёне ў 1977 г. налічвалася 735 населеных пунктаў, а ў 1995 г. — 594, высветліцца, што ўдалося выявіць звесткі толькі пра нязначную частку паселішчаў.

Звесткі розных крыніц аб населеных пунктах для хронік збіраліся і афармляліся па пэўнай праграме-схеме з мэтай максімальна магчымай характарыстыкі паселішчаў. У адпаведнасці з гэтай праграмай у выяўленых крыніцах высвятляліся і фіксаваліся ў хроніках кожнага населенага пункта на ўсе наяўныя гады наступныя асноўныя даныя: 1) назва ў адпаведнасці з напісаннем у крыніцы; 2) тып населенага пункта: горад («место»), мястэчка (аграрна-рамесна-гандлёвае паселішча), двор (панская сядзіба — адміністрацыйна-гаспадарчы цэнтр маёнтка), вёска («село»); 3) адміністрацыйна-гаспадарчая функцыя паселішча: цэнтр маёнтка (воласці), цэнтр войтаўства і г. д.; 4) адміністрацыйнае значэнне: цэнтр павета; 5) адміністрацыйна-гаспадарчая прыналежнасць пэўнаму маёнтку: назва маёнтка (воласці); 6) адміністрацыйна-тэрытарыяльная прыналежнасць пэўнаму павету: назва павета; 7) тып уласнасці: дзяржаўная, шляхецкая, праваслаўнай царквы, каталіцкай царквы; 8) уласнік ці ўладальнік: ініцыялы і прозвішча ці назва ўстановы; 9) кантэкст: падзея, у сувязі з якой успамінаецца паселішча: заснаванне, пажалаванне, падзел, завяшчанне, продаж, дарэнне, залог, канфлікт і г. д.; 10) наяўнасць звестак аб велічыні населенага пункта: «дымы» (адзінкі сялянскай гаспадаркі), «служба» (асноўныя аб'екты і адзінкі абкладання сялян павіннасцямі), валокі (асноўныя адзінкі абкладання сялян павіннасцямі пасля аграрнай рэформы — «померы волосной») і г. д.; 11) наяўнасць у населеным пункце асабліва важных аб'ектаў: замак, фальварак, царква, касцёл, манастыр, кляштар, карчма, млын і г. д.

Аналіз зместу крыніц сведчыць, што такі поўны комплекс даных, якія ўсебакова характарызуюць населены пункт, сустракаецца вельмі рэдка. Разам з адсутнасцю, як правіла, шэрагу істотных звестак прыкметным недахопам крыніц з'яўляецца таксама складанасць інтэрпрэтацыі пэўных звестак, якія ў іх змяшчаюцца. Найвялікшую складанасць уяўляе ідэнтыфікацыя і лакалізацыя названых у крыніцах паселішчаў, многія з якіх упамінаюцца без лакалізуючых прыкмет. Гэтая задача ўскладняецца як тым, што гістарычныя назвы многіх населеных пунктаў у выніку іх паланізацыі, затым русіфікацыі, а таксама масавых перайменаванняў у савецкі перыяд істотна адрозніваюцца ад сучасных, так і тым, што ў гэты ж перыяд знікла значная колькасць пасяленняў Беларусі.

Пэўную складанасць уяўляе таксама і высвятленне пытання пра тое, ці з'яўляецца названая ў крыніцы асоба ўласнікам або часовым уладальнікам паселішча. Аднак адпаведныя даныя іншых крыніц, як правіла, дазваляюць вырашыць гэтае пытанне адназначна.

Нягледзячы на ўказаныя спецыфічныя недахопы крыніц, пры наяўнасці некалькіх розных крыніц, што адносяцца да аднаго і таго ж паселішча, сукупнасць іх даных дазваляе скласці хронікі населеных пунктаў з рознай ступенню паўнаты.

Хроніцы кожнага населенага пункта папярэднічае загаловак, які дае яго сучасную характарыстыку па слоўніку назваў населеных пунктаў Віцебскай вобласці Я. Н. Рапановіча.

Гэтая праца абагульняе сабраны намі вялікі фактычны матэрыял па першапачатковай гісторыі населеных пунктаў Міёршчыны. Яна, на нашу думку, будзе садзейнічаць павышэнню навуковага ўзроўню вывучэння і асвятлення гісторыі населеных пунктаў Беларусі эпохі феадалізму, асабліва першапачатковай.

Басяныя, Босеныя, вёска Чэраскага сельсавета. *1513,* **Басіны.**

«Бедрыцо», не існуе. *1552,* **Бедрыцо,** двор, цэнтр маёнтка Полацкага ваяводства, уласнасць князя П. Б. Жыжэмскага; млын, путныя слугі — 3 дымы, вольныя людзі-дольнікі — 6 дымоў. *1573,* **«Бедрыца»,** сяло, уласнасць Л. Гарабурды.

Бірукі, Бируки, хутар Новапагосцкага сельсавета. *1567,* **«Бируки»,** маёнтак Браслаўскага павета, уласнасць А. Семяновіча, рыхтаваў 0,5 каня.

Блошнікі, Блошники, хутар Язненскага сельсавета. *1507,* **«Блошники»,** вёска маёнтка Пліса; пажалавана М. і А. Петухам. *1552,* двор, цэнтр маёнтка Полацкага ваяводства, уласнасць Г. І. Зяноўевіча Корсака; дамовыя слугі — 2 дымы, у іх людзі — 5 дымоў, слугі, якія людзей не маюць, — 3 дымы, вольныя людзі — 42 дымы. Двор, цэнтр маёнтка, уласнасць В. П. Епімаха, людзі-дольнікі — 23 дымы, людзі-кунічнікі — 2 дымы. Да *1560,* сяло Угольніцкага стана, пажалаваныя П. Епімаху путныя людзі пазбавіліся ад падданства гэтаму пану. *1563,* **«Блошники»,** сяло, цэнтр маёнтка (34 вёскі). Упамінаецца ў апісанні граніц («рубежей») Полацкага ваяводства дзякамі Рускай дзяржавы пасля захопу Полацка і большай часткі Полацкага ваяводства.

Ворцы, Ворцы, вёска Павяцкага сельсавета. *1513,* **Орцы.** *1588,* **«Ореч»,** сяло, цэнтр воласці Браслаўскага павета, уласнасць Сапегі; фальварак.

Вугольнікі, Угольники, вёска Язненскага сельсавета. *1522,* **«Угольники»,** сяло, цэнтр стана Полацкага ваяводства, уласнасць І. Г. Корсака; вызваленне пажалаваных путных баяр ад падданства І. Г. Корсаку. *1538,* **«Угольники»,** сяло, уласнасць І. Г. Корсака, *1545.* **«Угольники»,** сяло, пацвярджэнне ліста Жыгімонта 1522 г. *1552,* **«Угольники»,** сяло, цэнтр воласці і стана Полацкага ваяводства, дзяржаўная ўласнасць; путныя людзі — 22 дымы, іх сябра — адзін дым; рыхтавалі аднаго каня. *1560,* **«Угольники»,** сяло, цэнтр стана (сёлы «Куриловичи», «Истовляны», «Павловичи», «Тветино», «Задорожье» і «Олисеевичи»), дзяржаўная ўласнасць; спробы пажалаваных С. С. Давойне навечнасць путных слуг вызваліцца ад падданства пану. *1570,* пацвярджэнне ў пажыццёвае ўладанне С. С. Давойне. Да *1584,* **«Угольники»,** цэнтр стана, дзяржаўная ўласнасць; пажалавана ў часовае ўладанне Г. Гарнастаю. *1586,* **«Угольники»,** сяло Курылавіцкай воласці Полацкага ваяводства; пасля смерці С. С. Давойны вернута ў склад гаспадарскіх уладанняў; пажалавана ў пажыццёвае ўладанне М. М. Дарагастайскаму; путныя баяры.

Вялікае Завуцце, Великое Завутье, вёска Завуццеўскага сельсавета. *1552,* **«Заовуть», «Заутяне»,** сяло Полацкага ваяводства, дзяржаўная ўласнасць; путныя людзі — 2 дымы, іх сябры — 2 дымы; рыхтавалі 0,5 каня. *1557,* **«Завутье»,** сяло, пацвярджэнне пажалавання зямель «путнікаў» гэтага сяла гаспадарскаму зямяніну Ф. Філіповічу ў сувязі з іх спробай адстаяць сваю волю і землі. *1563,* **«Заустье»,** сяло, цэнтр маёнтка (19 вёсак). Упамінаецца ў апісанні граніц («рубежей») Полацкага ваяводства дзякамі Рускай дзяржавы пасля захопу Полацка і большай часткі Полацкага ваяводства. *1570,* **«Зовутье»,** сяло Полацкай зямлі, дзяржаўная ўласнасць. *1586,* **«Заутье»,** сяло Курылавіцкай воласці Полацкага ваяводства; пасля смерці С. С. Давойны вернута ў склад гаспадарскіх уладанняў; пажалавана ў пажыццёвае ўладанне М. М. Дарагастайскаму; путныя баяры.

Вята, Вята, вёска Павяцкага сельсавета. *1515,* **«Вята»,** маёнтак Полацкага павета, уласнасць І. Сапегі; прывілей — дазвол пабудаваць замак, заснаваць мястэчка, мець гандаль і корчмы. *1517,* **«Betha», «Wetta»,** «город». *1556,* **«Вята»,** двор, уласнасць Г. М. Сапежанкі і яе мужа князя А. Пронскага. *1566,* двор, цэнтр маёнтка, мястэчка Браслаўскага павета, уласнасць Г. М. Сапе-

жанкі і яе мужа М. М. Сіняўскага. *1567,* **«Вята»,** маёнтак Браслаўскага павета, уласнасць М. Сіняўскага, рыхтаваў прыкладна 8 коней. *1579,* **«Viviata».** *1580,* **«Wiata».** *1588,* **«Вята»,** двор, цэнтр маёнтка, мястэчка Браслаўскага павета, шляхецкая ўласнасць. *1592,* **«Вята»,** двор Браслаўскага павета, уласнасць Л. Сапегі.

Вята

Некалі назіральны пункт і невялікая крэпасць над р. Вята непадалёку ад Дзвіны. Сустракаем яе на картах XVI—XVII стагоддзяў. Іван Сапега атрымаў у 1516 г. прывілей ад Зыгмунта Старога на пабудову на Вяце крэпасці і закладку тут горада, шынкоў і рынкаў. У 1556 г. Вята належала князям Пронскім, а ў 1566 г. двор з мястэчкам перайшоў да рускага ваяводы Мікалая Сіняўскага. Далейшых звестак няма.

Відаць, мястэчка не развівалася, а крэпасць разбурылася або была знішчана ў маскоўскіх войнах. Да гэтага часу бачны сляды крапасных валоў. Цяпер належыць да фальварка Устраж Мірскіх.

Гедэман О. Гісторыя павета Браслаўскага. Вільна, 1930. С. 415—416.

Галомысла, Галомысло, вёска Завуцеўскага сельсавета. Да *1506,* **«Галомысль»,** цэнтр воласці Полацкага ваяводства, Аляксандр пажалаваў С. Глябовічу. *1528,* **«Голомысль»,** цэнтр воласці Полацкага павета; пацвярджэнне М. С. Глябовічу ў сувязі са спробай сялян адстаяць свае волю і землі. *1541,* **«Голомысль»,** маёнтак К. С. Глябовічаўны і яе мужа М. В. Яновіча; канфлікт з княгіняй І. К. Астрожскай і Я. Ю. Глябовічам. *1547,* **«Голомысл»,** маёнтак Полацкага ваяводства, уласнасць М. М. Глябовіча. *1552,* **«Голомысль»,** маёнтак, воласць Полацкага ваяводства, уласнасць М. Глябовіча і княгіні Я. Ю. Глябовіча — Г. Ф. Жаслаўскай. *1555—1558,* **«Голомысль»,** маёнтак княгіні Я. Ю. Глябовіча — Г. Ф. Жаслаўскай. *1563,* **«Голомысль»,** воласць (79 вёсак) Полацкага павета, уласнасць Я. Я. Глябовіча; царква Уваскрэсення. Упамінаецца ў апісанні граніц («рубежей») Полацкага павета дзякамі Рускай дзяржавы пасля захопу Полацка і большай часткі Полацкага ваяводства. *1565,* **«Голомысль».** Упамінаецца ў абмежаванні Браслаўскага павета. Да *1570,* **«Голомый»,** маёнтак, М. Глябовіч заклаў княгіні Г. Ф. Жаслаўскай. *1579,* **«Holomisla».** Да *1597,* **«Голомысль»,** маёнтак Полацкага ваяводства; Я. Я. Глябовіч на Дуброўне прадаў Л. Мамонічу. *1610,* **«Голомысль»,** двор, цэнтр маёнтка, мястэчка Полацкага ваяводства, уласнасць Л. Мамоніча; царква; інвентар.

Грыгаравічы, Григоровичи, хутар Туркоўскага сельсавета. *1551,* **«Григоровичи»,** маёнтак Полацкага павета, уласнасць П., І., М. і Д. Глебавічаў-Есьманаў; раздзел. *1552,* **«Грыгоровичы»,** двор, цэнтр маёнтка Полацкага ваяводства, уласнасць П., С., І., М., Г. і Х. Глябовічаў-Есьманаў; «айчызныя» людзі-дольнікі — 41 дым, вольныя людзі-дольнікі — 9 дымоў, кунічнікі — 3 дымы, агароднікі — 4 дымы.

Дарожкавічы, Дорожковичи, вёска Туркоўскага сельсавета. *1563,* **«Дорожковичи»,** сяло. Упамінаецца ў апісанні граніц («рубежей») Полацкага павета дзякамі Рускай дзяржавы пасля захопу Полацка і большай часткі Полацкага ваяводства.

Дзедзіна, Дедино, вёска Перабродскага сельсавета. *1517,* **«Dedina».** *1550,* **«Дедин»,** сяло, цэнтр войтаўства Браслаўскай воласці і павета, дзяржаўная ўласнасць; скарга Ж. Міцьковіча на дзедзінскага войта Ю. Андрэевіча, які прыняў на гаспадарскія землі двух пайшоўшых ад яго прыгонных («отчизных») сялян. *1567,* **«Дедин», «Дедино»,** маёнтак Браслаўскага павета, уласнасць князя Ф. Агінскага, С. Скопавай і Ж. Міткевіча, якія выдзялялі па адна-

му каню. *1595—1597,* **«Дедино»,** сяло Браслаўскага староства, дзяржаўная ўласнасць; пажалавана ў часовае ўладанне Р. Непітучаму; 18 валок. *1600,* **«Дедино»,** сяло, дзяржаўная ўласнасць; па просьбе Р. Непітучага кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт III дазволілі яму перадаць гэтую вёску ў пажыццёвае ўладанне Ю. Галянішчу.

Дзісна, Дисна, горад з 1940 г. *1559,* **«Дисна»,** замак, цэнтр воласці (староства), мястэчка («место»), дзяржаўная ўласнасць. *1564,* **«Дисна»,** замак, распараджэнне аб дастаўцы сюды жыта і аўса для польскага войска. *1566,* **«Дисна»,** «место», дзяржаўная ўласнасць; прадастаўленне мяшчанам ільготы («воли») у павіннасцях на 8 гадоў. *1566,* **«Дисна»,** замак, цэнтр староства, «место», дзяржаўная ўласнасць; назначэнне Б. І. Корсака дзісенскім старастам. *1567,* **«Дисна»,** «место», дзяржаўная ўласнасць; для належнага афармлення дакументаў мястэчку пажалаваны герб «тры вежы з муру». *1567,* **«Дисна»,** замак; просьба Б. І. Корсака дазволіць размясціць яго роту ў сёлах: «Мосера, Хвостово, Шарковщина, Михалцы, Верхнее, Козловское, Рудое, Олбее, Ожуничи». Вялікую колькасць сёл ён прасіў для пастою салдат таму, што «... веле ся написано, але Бог святок, ни в одном селе яловицы не знайдете, кроме жита або овса...» *1569,* 20 студзеня, **«Дисна»,** мястэчку пажалавана магдэбургскае права, а таксама герб «ладья». *1570,* **«Дисна»,** замак, «место», дзяржаўная ўласнасць; рэвізоры ўскрайкавых («украинных») замкаў ВКЛ І. Валовіч і С. Барташэвіч; вымярэнне зямлі на валокі. *1572,* замак, цэнтр староства. *1576,* **«Дисна»,** замак, цэнтр староства, «место», дзяржаўная ўласнасць; корчмы, «струговое» — падатак ад стругаў, якія праходзілі па Дзвіне. *1579,* «местечко» Полацкага ваяводства, дзяржаўная ўласнасць; рэвізор гаспадарскіх украінных рускіх замкаў М. Стравінскі. *1579,* пераправа войск Рэчы Паспалітай па мосце з лодак праз Дзвіну ў час паходу на Полацк. *1579,* **«Dzisna».** *1579,* «Дисна», «Копец», замак; агляд войска Стэфанам Баторыем. *1580,* **«Dzisna».** Да *1586,* «Дисна», цэнтр староства; Стэфан Баторый фундаваў касцёл, перадаўшы яму ў якасці матэрыяльнага забеспячэння 100 польскіх залатых з даходаў Дзісенскага староства штогод. *1589,* **«Дисна»,** цэнтр староства, дзяржаўная ўласнасць; порт. *1597, 1598, 1599,* **«Дисна»,** мястэчка Полацкага ваяводства, дзяржаўная ўласнасць. 1613, **«Dziesna»,** мястэчка Полацкага ваяводства.

Дзянісы, Денисы, вёска Новапагосцкага сельсавета. *1566,* **«Денисовичи»,** сяло Більдзюгскага войтаўства Браслаўскага староства, дзяржаўная ўласнасць, 10 валок. *1567,* **«Денисовичи»,** сяло Браслаўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць, пажалавана М. М. Сіняўскаму, 10 валок.

Казакова, Казаково, вёска Павяцкага сельсавета. *1559,* **«Казаково»,** маёнтак Браслаўскага павета.

Катавічы, Котовичи, вёска Язненскага сельсавета. *1533,* **«Котовичи»,** сяло Полацкага павета, уласнасць полацкага мешчаніна С. Савіча. *1552,* **«Котовичи»,** двор, цэнтр маёнтка Полацкага ваяводства, уласнасць полацкага мешчаніна М. Савіча; вольныя людзі-дольнікі — 4 дымы. **«Котовичи»,** сяло, дзяржаўная ўласнасць; путныя людзі — 5 дымоў, іх сябры — 5 дымоў; рыхтуюць аднаго каня. **«Котовичи»,** сяло, уласнасць Б. І. Корсака; людзі-дольнікі — 2 дымы. **«Котовичи»,** «сельцо» двара Блошнікі, уласнасць В. П. Епімаха; людзі-дольнікі — 2 дымы. **«Котовичи»,** двор, цэнтр маёнтка, уласнасць Ф. Камаровіча, яго жонкі і сястры апошняй; вольныя людзі-дольнікі — 3 дымы. *1570,* **«Котовичи»,** сяло Полацкай зямлі, дзяржаўная ўласнасць; пацвярджэнне ў пажыццёвае валоданне С. С. Давойне.

Крычава, Крычево, вёска Перабродскага сельсавета. *1559,* **«Крыцовичи»,** вёска Браслаўскага павета.

Крыцэвічы (Крычава)

Як частка маёнтка Шчоўна з'яўляліся дзедзіцтвам Зяновічаў, ад якіх набыў іх у 1522 г. Пётр Масальскі. У канцы XVII ст. перайшлі Крыцэвічы да Рудамінаў; адзін з іх, Аляксандр, прадаў у 1721 г. Францішку Невянглоўскаму.

На пачатку XIX ст. перайшлі Крыцэвічы як прыданае Міхаліны з Невянглоўскіх Федаровічавай у рукі яе мужа Норберта Федаровіча і ў гэтай сям'і знаходзяцца да гэтага часу.

Гедэман О. Гісторыя павета Браслаўскага. Вільна, 1930. С. 391—392.

Курылавічы, Куриловичи, вёска Язненскага сельсавета. *1533*, **«Куриловичи»,** сяло Язненскай воласці Полацкага павета, дзяржаўная ўласнасць; канфлікт з сялянамі іншых вёсак гэтай воласці ў сувязі з адмовай курылаўцаў несці цяглую службу. *1552*, **«Куриловичи»,** сяло, цэнтр воласці і стана Полацкага ваяводства, дзяржаўная ўласнасць; путныя слугі — 6 дымоў, іх людзі-дольнікі — 18 дымоў; рыхтавалі двух коней. **«Куриловичи»,** сяло, дзяржаўная ўласнасць; путныя людзі — 4 дымы, іх людзі-дольнікі — 5 дымоў; рыхтавалі аднаго каня. **«Курыловляне»,** сяло, дзяржаўная ўласнасць; путныя людзі — 21 дым, іх сябры — 25 дымоў; рыхтавалі двух коней. **«Куриловичи»,** сяло, дзяржаўная ўласнасць; путныя людзі — 7 дымоў, іх сябры — 23 дымы; рыхтавалі двух коней. **«Куриловичи»,** маёнтак, уласнасць С. Сцепановіча; вольныя людзі-дольнікі — 6 дымоў; стадола з карчмой на вялікай дарозе. **«Курыловичи»,** двор, цэнтр маёнтка, уласнасць В. Прасёлкавай; вольныя людзі-дольнікі — 5 дымоў, агароднік — 1; рыхтавала аднаго каня. *1558*, **«Куриловичи»,** сяло, цэнтр стана, дзяржаўная ўласнасць; пажалаванне ў пажыццёвае валоданне С. С. Давойне; путныя людзі. *1558*, **«Куриловичи»,** сяло, цэнтр стана, дзяржаўная ўласнасць; вызваленне путных слуг ад падданства С. С. Давойне без іх зямель. *1560*, **«Куриловичи»,** сяло, дзяржаўная ўласнасць; чарговая спроба путных слуг адстаяць свае волю і землі. *1570*, **«Куриловичи»,** сяло Полацкай зямлі, уласнасць праваслаўнай царквы. *1570*, **«Куриловичи»,** сяло, дзяржаўная ўласнасць; пацвярджэнне ў пажыццёвае ўладанне С. С. Давойне. *1582*, **«Курыловичи»,** маёнтак «на Руси», уладанне Г. Гарнастая. *1584*, **«Куриловичи»,** сяло, дзяржаўная ўласнасць; пажалаванне ў часовае ўладанне Г. Гарнастаю. *1586*, **«Куриловичи»,** сяло, цэнтр воласці Полацкага ваяводства, пасля смерці С. С. Давойны вернута ў склад гаспадарскіх уладанняў; пажалавана ў пажыццёвае ўладанне М. М. Дарагастайскаму; путныя баяры. *1594, 1595*, **«Курыловичи»,** двор, цэнтр воласці Полацкага ваяводства; пацвярджэнне ў пажыццёвае ўладанне К. М. Дарагастайскаму.

Мёры, горад з 1972 г., цэнтр раёна. *1514*, **«Мерэя»,** маёнтак Браслаўскага павета, дзяржаўная ўласнасць; пацвярджэнне Г. Каленіковічу раней пажалаванай яму групы сялян з іх землямі. *1561*, маёнтак, стадола на дарозе Друя — Іказнь — Браслаў. *1567*, **«Мёры»,** маёнтак Браслаўскага павета, уласнасць браслаўскага харужага Г. Мерскага і П. Б. Нарбута; рыхтавалі па аднаму каню.

Мёры

Першы ўспамін аб Мёрах знаходзім пад 1621 г. у тэстаменце Настасіі Мірскай, якая пажадала быць пахаванай у маёнтку Мёры над возерам у новазакладзенай праваслаўнай царкве. Пабудаваў тую царкву ў 1641 г. суддзя земскі браслаўскі Себасціян Мірскі, а ў 1644 г. той жа Себасціян заклаў тут праваслаўны манастыр. Сын яго Міхаіл у 1690 г. адабраў манастыр ад праваслаўных і аддаў яго уніятам. Ужо ў 1720 г. успамінае аб тым Пётр Вялікі, дамагаючыся

ад Аўгуста Моцнага вяртання манастыра праваслаўным. У 1728 г. царква перайшла ўжо на каталіцкі абрад і была аддадзена закону рэгулярных канонікаў, «абы павярнуць астылыя людскія сэрцы, якія памылкова былі адарваны ад св. каталіцкай веры». Канонікі ўтрымлівалі тут кляштар, які быў ліквідаваны ў 1832 г.

Незалежна ад яго існаваў закладзены ў 1691 г. Міхаілам Мірскім парафіяльны каталіцкі касцёл, аб якім далей знаходзім успаміны пад 1717 год і ў шэрагу іншых дат (1744, 1775, 1789, 1842, 1862).

Наогул пытанне касцёла, праваслаўнай царквы і уніяцкай, кляштара і манастыра мёрскіх мае шмат супярэчлівага і няяснага, магчыма, таму, што ў Браслаўскім павеце было некалькі Мёр, якія знаходзіліся ва ўладанні некалькіх сем'яў.

У час ліквідацыі уніі супрацьстаяў той акцыі Сямашкі ксёндз Чапулевіч, любімы парафіянамі, неўзабаве асланы з забаронай займацца выкананнем пастырскіх абавязкаў. Зацікавіўся мёрскім касцёлам сам Мураўёў і загадаў перарабіць яго на царкву. Неўзабаве аднак Мураўёва перамясцілі, і касцёл застаўся.

Мёры належалі некалі Рылам, ад якіх купіў іх у 1640 г. Себасціян Мірскі. У XVIII ст. маёнтак распаўся на часткі і належаў розным уладальнікам: Пересвет-Салтанам, Беліковічам, Клотам, Мірскім, Лапацінскім.

Што да самога мястэчка, то нічога не ведаем аб яго памерах, колькасці насельніцтва і т. п., бо не захаваўся ніводзін інвентар.

Гедэман О. Гісторыя павета Браслаўскага. Вільня, 1930. С. 394.

Мілашова, Милашево, вёска Павяцкага сельсавета. *1567*, **«Милашево»,** маёнтак Браслаўскага павета, уласнасць І. Рыжага; рыхтаваў аднаго каня.

Ноўгароды, Новгороды, вёска Новапагосцкага сельсавета. *1566*, **«Новгороды Большие»,** вёска Пагосцкага войтаўства Браслаўскага староства, дзяржаўная ўласнасць; 16 валок. **«Новгороды Малые»,** 15 валок. *1567*, **«Новгороды Большие»,** вёска Браслаўскай волаці, дзяржаўная ўласнасць, 16 валок. **«Новгороды Малые»,** 15 валок.

Новы Пагост, Новый Погост, мястэчка, цэнтр сельсавета. *1498*, магчыма, **«Погост»,** маёнтак Браслаўскага павета, дзяржаўная ўласнасць; пажалавана «у отчину» І. Сапежычу; 12 чалавек данніка. *1517*, **«Погост»,** маёнтак Браслаўскага павета, уласнасць П. І. Сапежыча і яго братоў; перададзена ў пажыццёвае ўладанне іх мачасе. *1554*, маёнтак князя А. Г. Пронскага і яго жонкі Г. М. Сапежанкі, а таксама Я. Ю. Камаеўскага і яго жонкі К. Я. Глебавічанкі. *1556*, **«Погост»,** двор, цэнтр маёнтка, мястэчка («место»), уласнасць княгіні Г. М. Сапежанкі, якая падарыла гэты маёнтак у складзе трэцяй часткі ўсіх сваіх маёнткаў свайму мужу князю А. Г. Пронскаму. *1565*, **«Погост».** Упамінаецца ў абмежаванні Браслаўскага павета. *1566, 1567*, двор, цэнтр волаці Браслаўскага павета, уласнасць Г. М. Сапежанкі і яе мужа М. М. Сіняўскага. *1567*, **«Погост»,** маёнтак Браслаўскага павета, уласнасць М. Сіняўскага; рыхтаваў прыкладна 9 коней. **«Погост»,** маёнтак В. Мікіцініча; рыхтаваў аднаго каня. *1578*, **«Погост»,** сяло, цэнтр войтаўства Браслаўскага староства, дзяржаўная ўласнасць. *1579*, **«Pochost».** *1580*, **«Pohist».** *1588*, **«Погост»,** двор, цэнтр воласці, мястэчка Браслаўскага павета, шляхецкая ўласнасць. *1592*, маёнтак з мястэчкам, уласнасць Л. Сапегі. *1593*, маёнтак Л. Сапегі, які ў мястэчку фундаваў касцёл Троіцы, драўляны. *1596, 1598.* **«Погост»,** сяло, цэнтр войтаўства Браслаўскага павета, дзяржаўная ўласнасць. *1613*, **«Pohost»**, мястэчка Браслаўскага павета.

Новы Пагост

Мястэчка тое і прыватныя ўладанні аддадзены ў 1499 г. Яну Сапегу каралём Аляксандрам. Аднак маёмасць была ў карыстанні не адной толькі сям'і Сапегаў; ужо ў 1500 г. знаходзім 10 «служб» у Пагосце, перададзеных прывілеем таго ж Аляксандра «Ежы Клоту, немцу». Пад 1517 г. знаходзім успамін, што Павел Сапега вымушаны быў выдзеліць са сваіх уладанняў маёнтак Пагост удаве Івана Сапегі. У 1556 г. княгіня Ганна Пронская перадае па завяшчанню свайму мужу трэцюю частку пагосцкіх уладанняў, а ў 1566 г. Зыгмунт Аўгуст зацвярджае прывілеем прыналежнасць двара і маёмасці пагосцкай Мікалаю Сіняўскаму, рускаму ваяводзе. У 1593 г. Пагост знаходзіцца ва ўладанні Льва Сапегі, які зрабіў ахвяравальны запіс на пагосцкі касцёл, а ў 1596 г. Зыгмунт III выдае другі акт ахвяравання на касцёл, пацвярджаючы першае дарэнне. У 1600 г. нейкая частка Пагосту належыць Ежы Галянішчу, яшчэ частку ў 1614 г. набывае той жа Леў Сапега. У час войнаў Яна Казіміра маскалі спалілі касцёл 1593 г.; новы паўстае ў 1656 г. Далей успаміны аб тым касцёле як філіяле іказньскага знаходзім у 1717 і 1744 гг.

Не маем дакладных звестак пра праваслаўную царкву, затое уніяцкая знаходзіцца побач каталіцкага касцёла ў 1775 г. З таго часу уніяцкая царква, пабудаваная на сродкі парафіян, існавала да 1839 г., да ліквідацыі уніі, калі была перададзена для выкарыстання праваслаўнага абраду. Успамінае аб ёй запіс праваслаўнай царквы Мінскай губерніі, прычым адзначаецца, што яна вельмі пацярпела ад часу. Пераход пагосцкіх уніятаў на праваслаўе не быў гладкім, патрэбна было па ўказанню губернатара энергічнае ўмяшанне іспраўніка і ўладальніка, які ў 1839 г. асабіста прыводзіў падданых да царквы і «пераконваў» іх, каб не забываліся выконваць свой «хрысціянскі абавязак». Старая царкоўка таксама бачыла ў сваіх сценах драматычныя сцэны.

Цяперашняя мураваная праваслаўная царква паўстала параўнальна нядаўна — ў 1879 г., касцёл адноўлены ў 1857 г.

Ад Сапегаў пагосцкія землі перайшлі да Ігнація Бужыньскага, потым да Юндзілаў, апошніх Канаплянскіх.

Што да самога мястэчка, то заклад-
ных звестак аб яго развіцці, станаўленні ў мінулым не маем. Зазначым у канцы, што такі недахоп агульны для ўсіх прыватных мястэчак.

Гедэман О. Гісторыя павета Браслаўскага. Вільна, 1930. С. 401—402.

Паўлавічы, Павловичи, хутар Язненскага сельсавета. *1552*, **«Павловичи»,** сяло Полацкага ваяводства, дзяржаўная ўласнасць; путныя людзі — 18 дымоў, іх сябры — 11 дымоў; рыхтуюць аднаго каня. **«Павловичи»,** двор, цэнтр маёнтка, уласнасць Б. І. Корсака; путныя слугі — 2 дымы, вольныя людзі — 4 дымы, агароднікі — 2 дымы. *1560*, **«Павловичи»,** сяло, дзяржаўная ўласнасць, пацвярджэнне ў пажыццёвае ўладанне С. С. Давойне; путныя слугі. *1563*, **«Павловичи»,** сяло, цэнтр маёнтка (6 вёсак), уласнасць Б. І. Корсака. Упамінаецца ў апісанні граніц («рубежей») Полацкага павета дзякамі Рускай дзяржавы пасля захопу Полацка і большай часткі Полацкага ваяводства. *1570*, **«Павловичи»,** сяло Полацкай зямлі, дзяржаўная ўласнасць; пацвярджэнне ў пажыццёвае ўладанне С. С. Давойне. *1584*, **«Павловичи»,** сяло Угольніцкага стана Полацкага ваяводства, уладанне Г. Гарнастая; путныя баяры. *1586*, сяло Курылавіцкай воласці; пасля смерці С. С. Давойны вернута ў склад гаспадарскіх уладанняў; пажалавана ў пажыццёвае ўладанне М. М. Дарагастайскаму; путныя баяры.

Перабродцзе, Перебродье, вёска, цэнтр сельсавета. *1571*, **«Перебродье»** «место» Браслаўскага павета. *1580*, **«Перебродье»,** сяло, цэнтр войтаўства Браслаўскага павета, дзяржаўная ўласнасць.

Пераброддзе

Пераброддзе з'яўлялася цэнтрам так званага войтаўства Перабродскага, якое ўваходзіла некалі ў склад вялікага княства Браслаўскага. Потым Браслаўскае княства распалася на меншыя два аб'екты. Адзін з г. Браславам і войтаўствамі Залескім і Укольскім (2352 дзес.) застаўся ў складзе Браслаўскага княства, другая частка — войтаўствы Друйскае, Заснудскае і Перабродскае (3 1/2 тыс. дзес.) выдзелены Аўгустам III на дзяржаўным праве для сям'і Касакоўскіх. У ліку тых уладальнікаў знаходзіўся ў 1789 г. Сымон Касакоўскі, вядомы барскі канфедэрат, а пазней гетман ВКЛ і гандляр, жыццё якога закончылася ў Вільні на шыбеніцы.

Само мястэчка Пераброддзе, аднак, было не пад уладай княства, яно было вольным горадам.

Аб заснаванні яго так расказвае легенда. Некалі два возеры Набіста і Абстэрна, што амываюць цяперашняе Пераброддзе, у адным месцы злучаліся вузкім пралівам. Знаходзілася тут беднае паселішча рыбакоў. Калі адзін з польскіх каралёў ішоў у ваенны паход, рыбакі яму дапамаглі, засыпаўшы брод, што злучыў азёры. Удзячны кароль даў паселішчу назву «Пераброддзе», а рыбакам выдаў прывілей на асабістую волю і абшар зямлі ў радыусе 10 км на поўнач і захад. Як сцвярджае мясцовая традыцыя, расійскія ўлады, жадаючы адабраць той абшар для каланізацыі, выманілі той прывілей каралеўскі і пасялілі тут стараабрадцаў з цэнтральнай Расіі. Перабродцы здабылі копію прывілею і ў 1792 г. пачалі судовую справу, якую, аднак, прайгралі.

Відаць, традыцыя тая не мае падстаў ужо хаця б таму, што ў XVIII ст. палітыка каланізацыі расійскаму ўраду была не ўласціва.

Так або інакш, у 1571 г. Пераброддзе існавала ўжо як горад, што пацвердзіў прывілей Зыгмунта Аўгуста. Дакумент той да нас не дайшоў, толькі спасылаецца на яго ў 1792 г. Станіслаў Аўгуст, надаючы гораду пацвярджаючы прывілей. Гэты вялікі дакумент сцвярджае, што жыхары Пераброддзя забяспечылі расшырэнне горада, які мае прыстойны выгляд, а з часам можа стаць прыгожым і вялікім горадам і тым спрыяць даходам для дзяржаўнай казны; вызваліў гараджан ад усялякіх павіннасцяў землеробчых, ваяводскіх, старасцкіх, дазволіў выбары бурмістра, войтаў, ратмана, лаўнікаў, будаўніцтва магазінаў, шынкоў, цагельнага завода, занятак рознымі рамёствамі, зацвердзіў нават герб горада з цудоўным надпісам: «Штандар свабоды і адзінства». Гэта было, адным словам, тыповае прысваенне магдэбургскага права.

Аднак былі б мы наіўнымі, надаючы вялікае значэнне прывілеям і на іх падставе ацэньваючы значэнне горада. Падобныя прывілеі раздаваліся налева і направа без погляду нават на тое, ці маюць магчымасць гарады іх выкарыстаць. Ужо вядома цана лічбаў і эканомікі гарадоў, якія на справе ледзь зводзілі канцы з канцамі, не маючы магчымасці для развіцця. Так было ва ўсёй Літве, што ж тады казаць пра Пераброддзе! Не захаваліся яго інвентары апроч адзінага за 1790 г., ды і той сведчыць толькі аб 23 дамах і адным доме для прыезджых. Улічваючы, што тут было некалькі яўрэйскіх сем'яў, аднак, падымныя не плацілі і ў інвентар не ўвайшлі, можам меркаваць аб колькасці жыхароў да 200 чалавек. Уласна ў той час і атрымаў горад прывілей. Няма ніякіх падстаў меркаваць, што былі для яго часіны больш шчаслівыя, — насупраць, ёсць кароткі ўспамін з 1629 г., што Пераброддзе было яшчэ меншым, мела 3 дамы «рынкавыя» і 7 вулічных, колькасць жыхароў не перавышала 70 чалавек.

Іншых звестак няма.

10 мая 1794 г. ішоў праз Пераброддзе маёр Стафеопуло, які назаўтра спаліў Браслаў. У тым жа годзе ў чэрвені стаяў тут расійскі генерал Талстой і некалькімі днямі пазней ген.-м. Герман.

У 1812 г. 26 чэрвеня адступаў перад Напалеонам праз Перабродцзе расійскі галоўнакамандуючы Барклай дэ Толі.

Нарэшце, даволі часта ўпамінаецца Перабродцзе як апора уніятаў. Уніяцкую царкву знаходзім у другой палавіне XVIII ст., ёсць пра яе шэраг успамінаў. У выніку скасавання уніі меў расійскі ўрад вельмі шмат клопатаў з перабродцамі. Адзін з агентаў Сямашкі сведчыць, што з імі цяжкая справа, бо гэта людзі вольныя, неспакойныя, непакорныя, не прывыкшыя да сляпога падпарадкавання. І ўсё ж управіліся з імі, да 1841 г. перабродская уніяцкая царква належала ўжо да праваслаўнага абраду.

У 1900 г. пажар знішчыў амаль усё мястэчка разам з драўлянай царквой, і ў 1908 г. пачата будаўніцтва новай.

Гедэман О. Гісторыя павета Браслаўскага. Вільна, 1930. С. 406—408.

Цвеціна, Цветино, вёска Завуццеўскага сельсавета. *1533*, **«Цветино»,** маёнтак Полацкага ваяводства, уладанне полацкага мешчаніна Т. Васковіча Цвецінскага. *1552*, **«Тветино», «Цветино»,** двор Полацкага ваяводства, уладанне полацкага мешчаніна В. Панкова; вольныя людзі-дольнікі — 14 дымоў; ставіць аднаго каня. **«Цветино», «Тветин»,** сяло, дзяржаўная ўласнасць; панцырныя слугі — 13 дымоў, іх «суседы» — 24 дымы; рыхтуюць двух коней. *1560*, **«Тветино»,** сяло Полацкага ваяводства, дзяржаўная ўласнасць; пажалаванне С. С. Давойне; путныя слугі. *1586*, **«Цветино»,** сяло Курылавіцкага стана Полацкага ваяводства; пасля смерці С. С. Давойны вернута ў склад гаспадарскіх уладанняў; пажалавана ў пажыццёвае ўладанне М. М. Дарагастайскаму; путныя баяры.

Сяло Цвецін (Тветіно, Цвецін)

В 1623 г. дана дакладная земянином Полацкого воеводства Яковицким жене его, в 80 копах грошей, на $^1/_2$ часть вотчиного имения его Тветина, в Полоцком воеводстве. В 1670 году, 15 января, явлена закладная, по коей земянин Полоцкого воеводства Захар Федорович Шантыр заложил в 300 копах грош. лит. земянам того ж воеводства Гавриле и Константину Садовским имение Цветин-Кизиковщину.

Ныне в селе живет тольки притч, село расположено 1,5 в. от р. Язенки.

Церковь упоминается уже в 1776 году, в 1820 г. вместо прежней деревянной построена каменная. Нынешний маленький храм каменный Крестовоздвиженский построен в 1877 г.

В храме весьма чтимое народом резное изображение Спасителя.

Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии / Изд. А. Сапунова и кн. В. Друцкого-Любецкого. Витебск, 1896. С. 168.

Чэрачы, Черасы, вёска, цэнтр сельсавета. *1529*, **«Тереса», «Тересов»,** маёнтак Браслаўскага павета; пасля смерці П. і І. В. Сапежычаў пажалаваны ў часовае ўладанне Мар'і — М. Басінай і яе сыну. *1537*, **«Тереса»,** маёнтак Браслаўскага павета, дзяржаўная ўласнасць; пажалавана смаленскаму шляхціцу І. М. Басу, маёнтак якога «скажоно московским неприятелем». *1542*, **«Тереса»,** маёнтак Браслаўскага павета, уласнасць І. М. Баса; пацвярджэнне ў сувязі са спробай сялян адстаяць свае волю і землі. *1567*, **«Тереса»,** маёнтак Браслаўскага павета, уласнасць І. Басінай, рыхтавала трох коней. *1578*, **«Терессово»,** двор, цэнтр маёнтка Дрыскага замка (староства); у сувязі з беспатомнай смерцю І. М. Баса маёнтак вернуты ў склад гаспадарскіх уладанняў («к столу господарскому»). *1583*, **«Тересе»,** маёнтак Браслаўскага павета, дзяржаўная ўласнасць; пажалаваны ў пажыццёвае ўладанне Ф. Скуміну-Цішкевічу.

Чэрас

Уладанні Чэрас — Селішча належалі некалі да каралеўскіх зямель. Яшчэ ў 1712 г. «Тарыф павета Браслаўскага» ўпамінае Чэрас — Селішча ў складзе ўладанняў яго каралеўскай вялікасці. У гадах 1505—1529 знаходзілася маёмасць ва ўладанні Сапегаў, а з 1530 да 1557 г. Басіны, жонкі Івана Баса, смаленскага баярына. Потым перайшлі Чэрасы да сям'і Кежгайлы Завіша, а пасля смерці апошняга з роду, надворнага маршалка ВКЛ Ігнація Завіша, прывілеем Аўгуста III аддадзены ў 1767 г. Мікалаю Радзівілу, знаходзячамуся ў шлюбе з Барбарай Радзівіл, — ужо на правах уласнасці «ў компенсацыю заслуг».

У сям'і Радзівілаў засталіся Чэрасы да 1886 г., ад іх пераходзяць ва ўладанне гр. Марыі Тышкевіч, а з 1890 г. — да сям'і Ялавіцкіх.

Не ведаем, як выглядала мястэчка Чэрасы ў мінулым; пазней акрамя царквы і школы яно складалася з 2—3 хат. У 1859 г. знаходзім ахвяраванне на уніяцкую чэраскую царкву княгіні Барбары Радзівіл, якая пацвердзіла свае старыя ахвяраванні, «здаўна ў карыстанні царквы знаходзячыяся». Упамінаецца тая царква як уніяцкая і ў 1811 г. Чэраскія парафіяне працяглы час давалі адпор прыняццю праваслаўя. У 1839 г. царква ўжо належала да пануючага веравызнання.

Вельмі характэрнай і каларытнай была справа 1866 г. уладальніка Чэрасаў князя Мікалая Радзівіла. Жанаты з Людвікай Святаполк-Мірскай, рашыў князь перайсці ў праваслаўе. Жонка выкарыстоўвала розныя сродкі, каб муж адмовіўся ад намеру. Аднак князь быў цвёрдым, а яшчэ больш праваслаўны поп, для якога такі неафіт быў вельмі патрэбны. Паміж папом і княгіняй завязалася вялікая дыскусія.

У адным з лістоў поп пісаў: «Не даваў бы параду, княгіня, з рацыі змены веры разрываць саюз з праваслаўным мужам, у іншым выпадку... Ах, калі б пані ведала, што яна за тое можа спаткаць! Пані з роспачы можа перапужацца!» У далейшым цытуе апосталаў, пералічвае ерасі католікаў, злачынствы пап, інквізіцыі і заканчвае: «Знаходзіцеся ў расійскім краі, сярод расійскіх людзей, тут вы госці, даўно закончыліся часы польскіх «фацэцый (анекдотаў)», насталі часы цвёрдых правоў расійскіх... а пані засудзіць суд Боскі, а таксама і людскі!»

2 пісьмы прысылае да губернатара і ваеннага начальніка!

Сутыкнуліся тут два светы — кахаючай жонкі каталічкі і прадстаўніка трыумфуючай веры і дзяржавы. Гэты апошні перамог.

У сакавіку Радзівіл прыняў праваслаўе, а ў красавіку таго ж года падаў прашэнне аб вызваленні яго ад спецыяльнага падатку, які накладваўся на католікаў. Жонка адраклася ад мужа, які праз два гады жаніўся на Дабашынскай з Міёр...

На пачатку гэтага стагоддзя, пасля смерці Адольфа Ялавіцкага, Чэрасы перайшлі ў рукі яго дачок — Станіславы і Губерты Любамірскіх, якія прадалі яго нямецкай фірме, у 1908 г. частку зямель Сялянскаму банку, а ў 1912 г. рэштак у колькасці 10 000 дзесяцін расіяніну Харчанку.

Гедэман О. Гісторыя павета Браслаўскага. Вільна, 1930. С. 380—381.

Шчоўна, Щёлно, хутар Перабродскага сельсавета. *1500*, **«Щовенская»,** зямля, **«Щолно»,** возера; пацвярджэнне Ю. Зеньв'евічу. *1524*, **«Щолно», «Ищолно»,** маёнтак, уласнасць М. Ю. Зеноўевіча; пацвярджэнне продажу князю П. Т. Масальскаму. *1567*, **«Щолна»,** маёнтак Браслаўскага павета, уласнасць С. Скопавай; рыхтавала прыблізна аднаго каня.

Шудзелеўшчына, Шуделевщина, хутар Новапагосцкага сельсавета. *1566*, **«Шудело»,** сяло Пагосцкага войтаўства

Браслаўскага староства і Браслаўскага павета, дзяржаўная ўласнасць; 12 валок. *1567*, **«Шуделовичи»,** сяло Браслаўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць; 19 валок.

Язна, Язно, вёска, цэнтр сельсавета. *1475*, **«Язно»,** сяло Полацкага павета, дзяржаўная ўласнасць; путны слуга пажалаваны О. Карсаковічу. *1533*, **«Язно»,** сяло, цэнтр воласці Полацкага павета, дзяржаўная ўласнасць; «гости москвитины». *1533*, **«Язно»,** сяло, цэнтр воласці; канфлікт з сялянамі в. Курылавічы, якія адмовіліся несці разам з імі цяглую службу. *1552*, **«Язно», «Езно»,** сяло, цэнтр стана Полацкага ваяводства, дзяржаўная ўласнасць; панцырныя слугі — 3 дымы; рыхтавалі аднаго каня. **«Язно»,** путныя людзі — 12 дымоў; рыхтавалі аднаго каня. **«Язно»,** путныя людзі — 10 дымоў, іх сябры — 5 дымоў; рыхтавалі аднаго каня. **«Язно»,** двор, цэнтр маёнтка, уласнасць Д. Б. Корсака; баяры — 5 дымоў, у іх людзей-дольнікаў — 15 дымоў, агароднікаў — 14 дымоў; баяры, не маючыя людзей, — 6 дымоў, царква Спаса; карчма мядова і піўная. **«Язно»,** двор, цэнтр маёнтка, уласнасць Ф. М. Прасёлка; вольныя людзі-дольнікі — 6 дымоў, агароднікі — 4 дымы. **«Язно»,** сяло, уласнасць полацкай царквы Пятницы. *1563*, **«Азас»,** вёска, цэнтр воласці (28 вёсак, у тым ліку 8 апусцеўшых), уласнасць Д. Корсака. Упамінаецца ў апісанні граніц («рубежей») Полацкага павета дзякамі Рускай дзяржавы пасля захопу Полацка і большай часткі Полацкага ваяводства. *1570*, **«Язно»,** сяло Полацкай зямлі, дзяржаўная ўласнасць; пацвярджэнне С. С. Давойне. *1579*, «Jasny».

М. Ф. Спірыдонаў

Сяло Язна

В «Ревизии Полоцкого воеводства» 1552 г. говорится: «Пан Дмитр Корсак маеть имение ойчизное двор Язню; того двора бояре напервей Фёдор Пинчук маеть людей своих дымов 6, а огородников 2; Богдан Иванович маеть дымов своих 4, а огородников 2. Олексей Васильевич маеть дымов 2, а огородников 2; с тых им со всякого збожа четвертая доля приходить, а на работу им в год по 12 толок ходят, то есть с клячами 8, а пешо 4, а с огородников серебщины, по чему на них положат. Бояре того же двора Язненского, которые людей своих не мають, тых бояр дымов 6, службы и платы за них нет, кроме где треба з листы ездити. На Язне церковь св. Спаса, попы в ней два Михайло, а Фёдор, а диакон Андеей мают пашни свое и два человеки».

Затем им. Язно переходило из рук в руки: к Галимским, Друцким-Соколинским, Козеллам-Поклевским, Коцеллам, наконец досталось опять Корсакам; ныне — село во владении крестьян собственников, а имение Корсака.

Село расположено на холмистой местности, окруженной с двух сторон небольшими озерами.

Язно в 312 в. от Вильны, в 15 в. от Дисны.

Храм основан в 1828 г. Корсаком вместо древнего, сгоревшего в 1828 г., он стоял там, где теперь кладбище. В храме находятся: древняя немецкая икона, серебряный вызолоченный потирь, Евангелие малинового бархата с серебряными изображениями, крест серебряный вызолоченный с буквами Е. П. Все эти предметы были подарены императорами.

Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии / Изд. А. Сапунова и кн. Друцкого-Любецкого. Витебск, 1896. С. 173—174.

Наўлак (Навалака)

Гэта вельмі старая сядзіба на паўднёвым беразе перабродскага возера, пра якую ўспамінаюць акты браслаўскага земскага суда ў 1618 г. як пра знаходзячуюся ва ўладанні сям'і Нагішкаў больш 150 гадоў, або з сярэдзіны XV ст. Удакладняе тыя даты іншы дакумент, сцвярджаючы, што Навалака ў самым пачатку XVI ст. была выдзелена з Перабродскага староства і перададзена Нагішкам, браслаўскім абшарнікам. Ёсць акт ахвяравання царкве Нагішкамі ў 1514 г. 120 дзесяцін зямлі для «папа Грыгорыя Іванавіча», настаяцеля навалацкай уніяцкай царквы.

У 1693 г. набыў ад Нагішкаў тыя ўладанні Ян Клот, і ў гэтай сям'і заставалася Навалака да апошняга часу. Праўда, геаграфічны слоўнік сцвярджае, што пазней Навалака знаходзілася пэўны час ва ўладанні Шчанновічаў, але, магчыма, гэта адносілася да нейкай часткі маёнтка.

У канцы XVIII ст. называў Навалаку Адам-Кларон. Пра навалацкую уніяцкую царкву знаходзім успамін у 1670 г., калі ёй належалі часткі азёр Важа і Абстэрна з правам лоўлі рыбы на тых азёрах на адлегласці «стрэлу з мушкету».

Відаць, першая уніяцкая царква разбурылася, таму што вядома, што уніяцкі арцыбіскуп Ясон Смагажэўскі даручыў у 1784 г. браслаўскаму ксяндзу Забароўскаму, каб той асвяціў уноў пабудаваную на навалацкіх землях браслаўскага суддзі Адама Клота уніяцкую царкву і далучыў як філіял да парафіяльнай царквы ў Перабродзі. Неўзабаве, аднак, Клоты ператварылі царкву ў касцёл.

Калі пачалася акцыя Сямашкі, пра тое ўспомнілі уніяты і пачалі супраць Клотаў шэраг працэсаў аб злоўжываннях і гвалтоўным выгнанні уніяцкіх папоў. Клоты абараняліся шэрагам дакументаў, сцвярджаючых, што гэта была іх хатняя капліца, у якой яны мелі права прызначэння святара, нарэшце, паказалі булу папы Пія VI 1791 г., што навалацкая царква ператворана ў касцёл правільна і адпавядае акту пасвячэння.

У рэшце рэшт урад стаў на баку уніятаў і царква ў 1844 г. апячатана. Супрацьдзейнічаў той акцыі навалацкі ксёндз Мішкевіч, за што наклікаў на сябе праследаванне ўлад.

Увогуле барацьба была вельмі зацятай, таксама вядома, што на пачатку XIX ст. навалацкі касцёл быў акружаны агульнай увагай і збіраў на 3 фэстах да 10 000 вернікаў і 30 ксяндзоў. І ўсё ж касцёл той заменены быў царквой праваслаўнай, чаму садзейнічаў сам Клот сваім удзелам у паўстанні 1863 г. Да месца сказаць, сям'я Клотаў актыўна ўдзельнічала і ў паўстанні 1831 г., чым ужо выклікала падазрэнне ўлад. Неўзабаве перад вераснёўскім паўстаннем у 1859 г. пачаў Клот працэс з праваслаўным сінодам аб вяртанні апячатанай капліцы і выйграў справу ў сенаце. Калі ж, аднак, Клоты прынялі ўдзел і ў паўстанні 1863 г., Навалака нейкі час знаходзілася пад секвестрам, — было бачна імкненне віленскага генерал-губернатара фон Кауфмана да ўзнаўлення працэсу: прысудам ад дня 20 мая 1864 г. «царква будовы 1514 г. пад назвай Св. Параскевы» засталася перададзенай духоўным уладам праваслаўных. Тады дзісенскі дэкан паспяшаўся забраць касцельны інвентар у іказненскі касцёл, у тым ліку старажытны абраз св. Параскевы, акружаны вялікай увагай вернікаў.

Улады тым часам паслалі ў Навалаку «эксперта» цудоўных навук у асобе начальніка дзісенскай жандармерыі, які сказаў, што абразы св. Параскевы, св. Барталамея, яшчэ разная фігура Хрыста індывідуальнай работы за выкананне «в духе» праваслаўнай царквы павінны быць вернуты праваслаўным. Фігура Хрыста засталася, аднак, у Іказні, што ў той час стала з абразамі — невядома.

У апошнюю хвіліну, калі гэты раздзел быў ужо ў друку, прыслаў п. Артур Клот сваю манаграфію пра навалацкі касцёл. Не маючы магчымасці больш падрабязна спыніцца на той цікавай працы, змяшчаем толькі кароткі нататак.

Паводле тых невядомых нам звестак, маёнтак Навалака належаў сям'і Клотаў ужо ў 1504 г., калі Якуб Клот пабудаваў тут касцёл (ёсць, дарэчы, контрверсія ўзнікнення). Касцёл той спалілі шведы ў час Паўночнай вайны. Вельмі цікавыя асаблівасці працэсу Клотаў з уніяцкім пастырам Карповічам у другой палове XVIII ст., а таксама сам працэс, які працягваўся ўвогуле каля 100 гадоў і закончыўся разборкай капліцы і будаўніцтвам з яе рэшткаў у 1895 г. «часовни» праваслаўнай.

Нарэшце даведаліся, што маёнтак Навалака, а яшчэ Укля і Загор'е былі ў Клотаў канфіскаваны за ўдзел у паўстанні Бенядыкта, Арнольда, Альфонса, Альфрэда і Адольфа Клотаў, з якіх два першыя паўсталі перад аўдытар'ятам паловым і былі высланы ў глыбіню Расіі, а маёнткі іх Навалака, Укля і Забор'е трапілі пад кіраўніцтва віленскай губернатарскай канцылярыі. У 1874 г. Навалака вернута, Укля і Забор'е прымусова прададзены.

З жалем сведчым, што не маем здымка званіцы ў Навалацы, каштоўнага збудавання пачатку XVI ст.

Гедэман О. Гісторыя павета Браслаўскага, Вільна. 1930. С. 398—401.

Лявонпаль

Ранейшыя назвы Лявонпаля былі: Чурылавічы і Лількі. Лявонпалем назваў яго ваявода брэсцкі Мікалай Лапацінскі ў гонар свайго бацькі Лявона, удзельніка паходу на Вену. Абшары тых чурылаўскіх зямель складалі некалі дзядзіцтва Масальскіх. У 1595 г. Масальская пакінула іх Лукашу Мірскаму. У 1604 г. становяцца ўласнасцю Дзевачкаў, а ў 1611 г. набыў іх Леў Сапега. Частку тых зямель у 1613 г. знаходзім ва ўладанні Дусяцкіх-Рудамінаў, а ў 1680 г. — Мірскіх. У 1687 г. належалі ксяндзу віленскаму, прэлату і біскупу смаленскаму Мікалаю Згерскаму, у годзе 1697 — Выгоўскаму, ад якога трапілі да Агінскіх. У актах указваецца, што ў 1700 г. была тут уніяцкая царква, якая абвалілася ў 1740 г.

У 1742—1745 гг. валодаў ім Кляч-коўскі, затым ён перайшоў ва ўласнасць ужо названага Мікалая Лапацінскага і пасля працягла знаходзіўся ў дзядзіцтве гэтай сям'і. Уладальнік Лявонпаля жыў тут у часы барскай канфедэрацыі і пакінуў нам пісьмы. У 1769 г. ахвяраваў ён на каталіцкую капліцу, а ў 1774 г. на уніяцкую царкву, так вядомай у часы ліквідацыі уніі, якая перайшла ў 1840 г. да праваслаўных. У 1842—1845 гг. знаходзіўся Лявонпаль пад урадавым кіраваннем у сувязі з адмовай вяскоўцаў прыняць новую веру.

Ахвяруе на уніяцкую царкву ў 1782 г. сын Мікалая Ян Нікодэм, каб даць магчымасць сваім аддаленым падданым наведваць набажэнства пасля адмежавання царквы ў Прыдруйску па першаму падзелу Рэчы Паспалітай.

У 1790 г. стаяла ў Лявонпалі брыгада польскіх войск як пагранічная ахова. Каля 1750 г. паўстаў тут прыгожы палац з тэрасамі над Дзвіной. З падобнай мэтай знаходзіліся ў 1831 г. тут казакі з-за удзелу ў паўстанні дзісенска-браслаўскіх сем'яў Лапацінскіх і непасрэдна начальніка таго узброенага руху Аляксандра.

У першай палове XIX ст. вядомыя былі лявонпальскія тканіны, палотны, сурвэткі і абрусы, выраблены з вельмі каштоўнага і карыстаючагася попытам «друйскага» льну. Тыя фабрыкі льну, відаць, працягвалі існаваць пасля спынення фабрыкі сукна і іншых прамысловых вытворчасцяў, якія ўспамінаюцца ў лявонпальскім інвентары ў 1803 г. У саракавых гадах вытворчасць палатна зменшылася, не будучы ў стане канку-

рыраваць з паўстаўшымі ў той час фабрыкамі. У час сусветнай вайны палац быў разбураны і цяперашні сродкамі ўласніка перароблены на касцёл. За кіламетр ад мястэчка пры дарозе на Грудзінава стаіць у лесе калона 12 м вышыні, пабудаваная ў 1791 г. у памяць канстытуцыі 3 мая.

Як сцвярджае мясцовая традыцыя, мястэчка раней было большым, расцягнутым ва ўсходнім напрамку. Аднак жаданых слядоў былой велічы не знойдзена.

Гедэман О. Гісторыя павета Браслаўскага. Вільна. 1930. С. 392—393.

З гісторыі вёскі Узмёны

Першыя звесткі аб жыхарах Узмёншчыны мы можам датаваць 7—8-м тысячагоддзямі да н. э. Знаходка наканечніка стралы таго часу вучнямі мясцовай школы — яскравы сведка таму. У музеі СШ № 3 райцэнтра захоўваецца сякера, якой пяць тысяч год, знойдзеная ў ваколіцы Узмён. Мясцовы селянін сто гадоў назад прыстасаваў яе пад бязмен.

Назва *Узмёны* славянскага паходжання і сведчыць аб тым, што першае паселішча ўзнікла тут у X—XI стст. Узмёны — азначае ўзвышша. Магчыма, тут, на стромкіх берагах Дзвіны, была створана ўмацаваная стражніца, якая ў XIII—XIV стст. папярэджвала жыхароў нашых мясцін аб набегах крыжакоў. Не аднойчы зямля зведала гэтыя набегі, бо шлях на Полацк з Дзінабурга ляжаў па Дзвіне праз Узмёны.

Пачынаючы з XVI ст. Узмёны належалі слаўнаму магнацкаму роду Агінскіх. У XVIII ст. часова яны пераходзяць у валоданне князёў Свірскіх. У музеі Узмёнскай НСШ захоўваецца цікавы дакумент — фотакопія інвентара маёнтка Узмёны ад 29 верасня 1795 г. У ім гаворыцца, што маёнтак Узмёны перайшоў пад спадчыну ад Юзэфы Свірскай з роду Шчытоў да Юзафа Свірскага — падчашага Мінскага ваяводства. Тут пералічваецца не толькі колькасць двароў, што належаць князю, але і называюцца прозвішчы мясцовых жыхароў, сялян, якія плацілі падатак за валоданне панскай зямлёй.

Першая сядзіба. Зямлі $^1/_4$ валокі (валока — памер зямлі ў 21,36 га. Чвэрць валокі — 5,3 га зямлі). Плацілі грашовы чынш у памеры 46 злотых. Жыў тут Мікіта Тарас. Сядзіба другая належала Прохару Шаму, таксама $^1/_4$ валокі зямлі, таксама плаціў 46 злотых. У 3—18-й сядзібах жылі Рыгор Шадурскі, Янка Баяра, Змітрок Тамашэвіч, Пархвен Тамашэвіч, Фёдар Тамашэвіч, Галіяш Тамашэвіч, Даніла Гушча, Пятрок Шадурскі, Базыль Тамашэвіч, Казімір Сахон, Васіль Сахон, Сцёпка Тамашэвіч, Сцяпан Таруцька, Янка Шыпіла, Якуб Шадурскі, Міледзій Каськевіч. Усе яны таксама мелі чацвёртую частку валокі і плацілі па 46 злотых чыншу.

У 19-й сядзібе жыў Даніла Шадурскі, які меў $^1/_2$ валокі і плаціў 23 злотыя. У 20-й сядзібе Лявон Разлом таксама меў паўвалокі і плаціў 23 злотыя. У 21-й жыў Юрка Маланка, меў $^1/_4$ валокі і плаціў 46 злотых. У 22-й сядзібе жыў Кузьма Шамялеўскі, меў паўвалокі і плаціў 23 злотыя. Сядзіба 23-я была пустой, займала паўвалокі зямлі. Сядзібы з 24-й па 33-ю належалі Янку Сахону, Андрэю Таруцьку, Самусю Таруцьку, Міколу Абрамаву, Янку Гайдамаку, Нікіфару Разлому, Хвёдару Неплаху, Марку Малатку, Янку Разлому, Юзэфу Разлому. Яны таксама мелі па чацвёртай частцы валокі і плацілі па 46 злотых.

34-я сядзіба была пустой, мела паўвалокі. У 35-й сядзібе жыў Яська Малаток, меў $^1/_4$ валокі. У 36-й жыў Хведзька Рамза, таксама меў $^1/_4$ валокі. У 37-й сядзібе жыў Гушча, меў паўвалокі, плаціў 23 злотыя. 38-я сядзіба была пустошай. 39—42-я сядзібы належалі Захару Таруцьку, Мікіту Скромнаму, Сёмку Казлу, Андрэю Малатку, мелі яны па палавіне валокі.

Да маёнтка Узмёны належаў таксама засценак Марынкі. Там жылі Мірон Якубовіч (сядзіба 43, меў паўвалокі зямлі), Янка Таруцька (таксама меў паўвалокі, плаціў 23 злотыя). На сядзібе 45 жыў Паўлюк Тамашэвіч, меў чацвёртую частку валокі.

Да фальварка Узмёны належала і в. Барсукі, таму пералік сялянскіх двароў працягваецца па парадку. Сядзібы 46 і 47 належалі Міхалу Неплаху і Якубу Маляўку, якія мелі па $^1/_4$ валокі. Сядзібы 48—51 — Грышку Маляўку, Гаю Неплаху, Лявону Шадурскаму, Янку Неплаху, якія мелі па палавіне валокі і плацілі па 23 злотыя. Тут знаходзілася карчма, якую трымаў Станіслаў Табола. Ён плаціў арэндную плату 20 злотых у год.

В. Ліпава таксама ўваходзіць у маёнтак Узмёны. Сядзібы 52—57 належалі Марціну Алеську, Міхалу Шадурскаму, Марціну Тамашэвічу, Янку Тамашэвічу, Марціну Ярмалоўскаму, Янку Прышчэпаву. Яны валодалі па палавіне валокі і плацілі па 23 злотыя.

У в. Волта сядзібы 58—61 належалі Андрэю Катку, Фёдару Лукашову, Якіму Рамзу, Сцяпану Разлому. Яны валодалі па $^1/_2$ валокі. Тут знаходзілася карчма, уладальнік якой Антон Шока плаціў пану арэнду 20 злотых.

Засценак Дубавыя адносіўся да ўладання Свірскіх. Сядзібы 62—65 належалі Адаму Бярозку, Андрэю Шымко, Захарку Цецеруку, Марку Тамашэвічу. Яны мелі па палавіне валокі.

Усяго князь Свірскі атрымліваў з Узмёнскага ўладання 2563 злотыя. У гэтых інвентарах не ўлічваюцца зборы з чэлядзі дворнай і іншыя падаткі. Гэты дакумент пацвярджае спадчыннасць для жонкі — княгіні Свірскай. Зацверджаны дакумент Томашам Лапацінскім, уладальнікам Лявонпаля, які з'яўляўся ваяводам Брэсцкім.

Свірскія ў 1866 г. пабудавалі дзве капліцы: уніяцкую і каталіцкую. Пададзеныя вышэй прозвішчы якраз нам і гавораць, што частка насельніцтва была уніятамі, а частка — католікамі. Менавіта ў XIX ст. з гэтай нагоды разгарнулася жорсткая рэлігійная барацьба. У сувязі з уваходжаннем часткі Польшчы і ўсяго Вялікага княства Літоўскага ў склад Расійскай імперыі пачалася русіфікацыя мясцовага насельніцтва. Галоўны ўдар пры гэтым наносіўся па уніяцкай царкве. У сваю чаргу мясцовыя апалячаныя паны хацелі замацаваць каталіцкую рэлігію як адзнаку польскасці краю.

Галоўную ролю ў падзеях, якія адбыліся ў сувязі з гэтай рэлігійнай барацьбой на Узмёншчыне, адыгрываў Клаўдзій Мірскі, які стаў уладальнікам маёнтка ў 1824 г. З мэтай папярэдзіць ліквідацыю уніі і ўмацаванне праваслаўя ён распачаў перавод уніятаў у каталіцкую веру.

У Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы захоўваюцца вялікія тамы па справе дзейнасці Клаўдзія Мірскага на Узмёншчыне. Так, 28 верасня 1836 г. біскуп Базыль Лужынскі, будучы архіепіскап праваслаўны Віцебскі і Полацкі, піша Віленскаму генерал-губернатару князю Далгарукаву: «Клаўдзій Мірскі патаемна звяртае сялян з уніі на каталіцызм. А уніяцкую царкву ў маёнтку Узмёны, якую трэба было звярнуць у праваслаўную веру, замкнуў і сцвярджае, што капліцы ён адбудаваў сваім коштам і таму асмеліўся аслухацца загаду генерал-губернатара. Прашу прыняць меры да князя Мірскага. А царкву уніяцкую перадаць праваслаўнаму духавенству з усёй царкоўнай маёмасцю, перарабіўшы яе па ўзорах царквы праваслаўнай. 9.1836 года».

Адказ князя Далгарукава быў кароткі і просты: «Адабраць царкву, асобаў, якія перапісаліся ў каталіцкую веру, вярнуць у веру продкаў. А самога Мірскага аддаць пад суд». 1 кастрычніка 1836 г. грамадзянскі генерал-губернатар піша генерал-губернатару Далгарукаму: «Выконваючы ваш загад, мною накіраваны ва Узмёны ваенны начальнік Курасоўскі. Разам з маршалкам дзісенскай

шляхты Абрэпальскім. Яны безвынікова імкнуліся пераканаць Мірскага, а ён не толькі не жадае перарабляць царкву на праваслаўны абрад, але і ключы не аддае. Выклікалі яго да Дзісны, але і там не пераканалі. Аддадзены загад перарабіць царкву за кошт Мірскага».

19.10.1836 г. ваенны начальнік Курасоўскі піша генерал-губернатару: «Ключы Мірскі ад царквы не аддаў, заявіўшы, што гэта яго прыватная ўласнасць і не паслухае таму ні самога ўрада, ні нават самога імператара. Таму Мірскі арыштаваны і пад наглядам унцер-афіцэра дастаўлены ў Вільню для выканання далейшага вашага рашэння».

24.10.1836 г. «Загадваю вашаму высокаправасхадзіцельству арыштаванага Мірскага трымаць так, каб ён не меў магчымасці падтрымліваць адносіны з ніякімі людзьмі».

6 лістапада 1836 г. У лісце грамадзянскага генерал-губернатара да князя Далгарукава: «Мірскі скончыў Віленскі універсітэт, характару ліберальнага, але не вар'ят, як гэта хочуць некаторыя прадставіць, каб вызваліць яго ад адказнасці. На маю думку, Мірскага патрэбна або судзіць з канфіскацыяй маёнтка, або прагнаць да ваяк. Аднак у першым выпадку суд павінен быць у Дзісне, куды высылаць Мірскага не зручна, бо ў Мірскага ёсць дакументы, пацвярджаючыя ўласнасць яго на царкву. Таму суд можа не прызнаць яго вінаватым. Лекары могуць прызнаць яго здаровым і тады яго нельга будзе трымаць. На маю думку, трэба было б загадаць вам, каб вы звязаліся з інспектарам Уражэбнай управы ў Пецярбургу, які б дазволіў накіраваць Мірскага ў Пецярбург. Так без шуму і на ўмовах, што тут няма ўмоў для лячэння, выслаць яго ў Пецярбург, дзе ёсць спецыяльная ўстанова. Ніхто не будзе супраць такога рашэння. Сціхнуць перасуды, а само падарожжа Мірскага ў сталіцу адбярэ ахвоту ў іншых супраціўляцца ўладам».

10.11.1836 г. Генерал-губернатар піша міністру ўнутраных спраў графу Блудаву аб тым, што пры асабістай размове Мірскі выказаў асэнсаваныя погляды ў справах рэлігіі, якія не паказваюць на яго псіхічнае расстройства. Мірскі ёсць ліберал, але не рэлігійны фанатык, яго рэлігійная дзейнасць толькі прыкрыццё для антыўрадавых дзеянняў. Далей генерал-губернатар просіць міністра даць дазвол на высылку Мірскага ў расійскую губернію пад наглядам паліцыі і дактароў.

21.11.1836 г. Міністр дае дазвол на высылку князя Мірскага ў Вятку пад суровы нагляд. Загад быў выкананы, але непакорны князь затрымаўся ў Мінску з прычыны хваробы і сасланы быў толькі 9 лютага 1837 г.

Ва Узмёны прыбыў палкоўнік Курасоўскі з салдатамі. Пачаліся сваволствы над людзьмі. Жонка Мірскага Брыгіда разам з дзецьмі пакінула маёнтак і выехала ў Вільню. Энергічная жанчына засыпала скаргамі ўсе вышэйшыя ўрадавыя ўстановы ў Расіі, каб выратаваць мужа і маёнтак ад канфіскацыі.

24 снежня 1836 г. Брыгіда піша ліст да генерал-губернатара, а копію яго дасылае міністру ўнутраных спраў Расіі, оберпракурору сінода графу Пратасаву, шэфу корпуса жандармаў графу Бенкендорфу і міністру справядлівасці. У лісце яна скардзіцца, што яе невіноўны муж аб'яўлены злачынцам і бандытам, што палкоўнік Курасоўскі апісаў жывёлу, інвентар, патрабаваў 80 рублёў на пераробку царквы і 165 рублёў на сваё ўтрыманне. Кожны дзень ён патрабуе для сваіх салдат па тры фунты мяса, а таксама гарэлкі і піва. Салдаты здзекуюцца з людзей, зневажаюць гаспадыню і яе дзяцей. Гучыць просьба аб справядлівасці.

Ліст да 20 студзеня 1837 г. генерал-губернатару ад палкоўніка Курасоўскага, у якім той хоча апраўдацца.

24 ліпеня 1837 г. Бенкендорф піша генерал-губернатару: «Да імператара дайшлі звесткі аб скаргах Мірскай аб праследаванні жыхароў Узмён, аб

здзеках над людзьмі, закінутых хатах, блуканні іх па лясах. Апекуны, назначаныя ў маёнтак, не паказваюцца, баючыся быць умешанымі ў справу». Але ні адзін ліст скаргі не быў задаволены. Мы знаходзім толькі аднаго, хто ў сваім лісце спрабуе дапамагчы Мірскім. Гэта начальнік 4-га корпуса жандармаў генерал Дрэбіш. Але яго ліст застаўся толькі рэхам у пустыні. Мірская зразумела, што пісаць скаргі безвынікова. І таму пачынае прасіць аб літасці да свайго мужа. У 1839 г., калі была скасавана унія, Мірская зноў піша генерал-губернатару аб невіноўнасці мужа і аб вызваленні яго з ссылкі.

